ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

СЛЯДЫ ДАЛЁКАГА МІНУЛАГА

Пісьмовыя крыніцы асвятляюць гісторыю чалавецтва толькі за апошнія 5—6 тыс. гадоў, ды і то першапачатковыя пісьмовыя звесткі адносяцца выключна да раёнаў Міжземнамор'я, Міжрэчча, Кітая, Егіпта. Землі ўсходніх славян, да якіх адносяцца беларусы, украінцы і рускія, ды і ўвогуле ўсе славянскія землі, трапляюць у поле зроку гісторыкаў значна пазней: асобныя, сціплыя звесткі пачынаюць з'яўляцца ў сярэдзіне 1 тыс. да н.э. Больш інфармацыі аб славянскіх землях пачынае трапляцца ў візантыйскіх аўтараў — з VI—VII ст., але гэта інфармацыя адносіцца ў асноўным да гісторыі паўднёвых славян.

Што ж тычыцца Пасожжа, то гэты раён, ды і то ўскосна, пачынае згадвацца на старонках пісьмовых крыніц толькі з канца IX ст. Пісьмовыя звесткі па гісторыі ўсходняй Беларусі, у тым ліку і Крычаўшчыны, значна папаўняюцца толькі з пачатку XVI ст., калі гэтыя землі апынуліся на літоўска-маскоўскім памежжы. А што было раней, як мы можам даведацца аб падзеях, што адбываліся тут намнога раней, 2,5—1 тыс. гадоў таму? Для гэтага служыць навука археалогія. Кожнае пакаленне людзей пакідае пасля сябе нашчадкам пэўныя сляды ў выглядзе рэчаў побыту, твораў мастацтва, рэштак пабудоў, паселішчаў, пахавальныя сляды мінулых тысячагоддзяў. І калі да іх прыходзяць археолагі, яны выяўляюць месцы паселішчаў, пахаванняў, і, вызначаючы час існавання археалагічных помнікаў, дапамагаюць нам уявіць падзеі, што адбываліся ў мінулым.

Калі пачалося засяленне тэрыторыі Крычаўшчыны чалавекам? Адказ на гэтае пытанне вучоныя не могуць дакладна даць да сённяшняга часу. На тэрыторыі раёна пакуль невядомы археалагічныя помнікі эпохі палеаліту, хаця паблізу раёна выяўлены асобныя сляды знаходжання першабытнага чалавека. Так, знаходкі асобных крамянёвых рэчаў ва ўрочышчы Канчанскі Роў каля в.Клеявічы на Касцюкоўшчыне дазваляюць з пэўнай доляй верагоднасці сцвярджаць, што пранікненне людзей на Пасожжа адбылося ў эпоху мусцье — прыблізна 70—35 тыс. гадоў таму. Аднак многія даследчыкі не згодны з такой даціроўкай гэтых

знаходак, бо сярод іх няма прылад працы і адсутнічае культурны слой паселішча — так археолагі называюць слой, які адкладваецца пад час жыцця людзей. На іх думку, нельга выключаць таго, што гэтыя знаходкі адносяцца да больш позняга часу і звязаны з часовай стаянкай людзей, якія прыходзілі сюды для збору крэменю. Вядомае месца на Пасожжы, дзе знойдзена прылада працы першабытнага чалавека — урочышча Каменная Гара на правым беразе р.Бесядзь каля вёскі Свяцілавічы Веткаўскага раёна, таксама размешчана недалёка ад Крычаўшчыны. Але і тут археолагі не знайшлі культурны слой, што сведчыла б аб больш-менш сталым пражыванні тут людзей. Справа ў тым, што ў гісторыі Зямлі геолагі вылучаюць не менш чым 4 ледавіковыя эры, якія складаліся з этапаў наступання і адступання ледавікоў. У максімальную стадыю свайго існавання ледавік заняў усю плошчу сучаснай Беларусі і нават прасунуўся па даліне Дняпра далёка на поўдзень. Эпоха прасоўвання ледавіка змянялася пацяпленнем, у выніку чаго з-пад ледавіка вызваляліся значныя плошчы. І так паўтаралася неаднаразова. На сваім шляху ледавікі знішчалі ўсё жывое, раўнавалі горы, засыпалі нізіны, рэкі, азёры, непазнавальна змянялі рэльеф і ландшафт. Безумоўна, што ледавікі знішчалі і паселішчы першабытнага чалавека з іх культурным слоем, калі такія існавалі.

А знаходкі асобных, выпадкова згубленых рэчаў першабытнага чалавека — вастраканечнікаў і скрэблаў — дазваляюць даследчыкам лічыць, што пранікненне чалавека на землі Беларусі магло адбыцца каля 130 — 100 тыс. гадоў таму.

Пад час аднаго з прамежкавых пацяпленняў людзі праніклі на берагі Сажа і Прыпяці і заснавалі тут свае паселішчы. Найбольш старажытныя стаянкі першабытнага чалавека, вядомыя на тэрыторыі Беларусі, размяшчаліся каля в. Бердыж у Чачэрскім раёне на Сажы і каля в. Юравічы на Прыпяці, і жыццё на іх існавала каля 27—25 тыс. гадоў таму. Эпохай мусцье датуюцца палеалітычныя стаянкі каля в. Бетава Бранскага раёна на р. Дзясне. Як бачна, Бердыжская і Бетаўская стаянкі размешчаны адносна недалёка ад Крычаўшчыны і магчыма, што і яе землі ў той жа час паціху пачыналі засяляцца насельніцтвам Сажа і Дзясны.

Прыкладна 25—14 тыс. гадоў таму адбывалася апошняе пахаладанне, калі вялізныя масівы льда прасунуліся ў Паўночную Беларусь. Большая частка ўсяго Еўрапейскага кантынента была пакрыта лёдам.

18—17 тыс. гадоў таму ледавік дасягнуў сучаснай Оршы. Перад ім шырокай паласой прасціралася пустэча — зона вечнай мерзлаты з халодным арктычным кліматам, дзе тэмпература ў студзені дасягала 40 градусаў марозу, а ў ліпені — ўсяго 3—4 градусаў цяпла. Лясы амаль поўнасцю адсутнічалі, ландшафт нагадваў сённяшнюю лесатундру Цэнтральнай Якуціі. Безумоўна, у такіх суровых прыродных умовах не магло быць сталых паселішчаў чалавека. Ледавік быў галоўнай прычынай таго, што басейн Сажа даволі павольна асвойваўся чалавекам.

Каля 15 тыс. гадоў таму ледавік паступова адступаў на поўнач, месца тундры займалі лясы. Рэкі прынялі сучасны выгляд. Людзі пачалі прасоўвацца на поўнач, дзе асвойвалі тэрыторыі, што вызваліліся з-пад ледавіка. Стаянкі эпохі позняга палеаліту —

жыццё на іх адбывалася каля 17—15 тыс. гадоў таму – вядомы недалёка ад Крычаўшчыны – каля в.Елісеевічы і Юдзінава, на правым беразе р.Судасць на Браншчыне. Верагодна, у гэты час Пасожжа таксама актыўна асвойвалася людзьмі. Каля 12 тыс. гадоў таму ледавік канчаткова растаў. Пачалася пасляледавіковая эпоха.

Канец ледавіковага перыяду супаў з пачаткам мезаліту — другой археалагічнай эпохі ў гісторыі чалавецтва, пад час якой адбыліся значныя змены ў жыцці людзей, выкліканыя перш за ўсё зменамі прыродных умоў. Пацяпленне клімату, пашырэнне лясоў, фарміраванне сучаснай фауны прывяло да неабходнасці змянення форм гаспадарання, што перш за ўсё мела адносіны да палявання. На новых жывёл – лася, зайца, кабана, ваўка нельга было паляваць з дапамогай агню і загонаў.

Аб'екты палявання перамяшчаліся значна хутчэй за паляўнічых і не заўжды статкам — патрэбна была новая зброя, з дапамогай якой можна было б паляваць. І людзі вынайшлі лук і стрэлы.

З іх вынаходніцтвам паляванне стала значна больш выніковым. Каб забіць жывёлу кап'ём пад час загоннага палявання, людзям неабходна было падыйсці блізка да жывёлы, а стралой можна было здалёку трапіць у звера. Лук і страла значна павялічылі колькасць відаў звяроў, на якіх палявалі людзі, адначасова адпала неабходнасць у калектыўным паляванні. У гэты ж час у чалавека з'явіўся надзейны і добры памочнік — сабака, першая жывёла, якую ў лясной зоне прыручыў паляўнічы.

Вынаходніцтва лука і стралы выклікала новае адкрыццё. На аснове лука была створана лучковая дрэль, а на аснове стралы — свердзел. Шырокае распаўсюджанне атрымала тэхніка «высверлівання» агню з дрэва.

У эпоху мезаліту хутка развівалася ўкладышавая тэхніка вырабу прылад працы. Дзякуючы ёй, у выпадку паломкі іх можна было хутка адрамантаваць, замяніўшы зламаную частку – укладыш. Калі раней прылада працы выраблялася цалкам з крэменю, то зараз з крэменю рабілі толькі рабочую частку, якую устаўлялі, «укладвалі» ў драўляную, рагавую ці касцяную аправу і ўмацоўвалі з дапамогаю смалы. У якасці ўкладыша выкарыстоўвалі невялікія крамянёвыя фрагменты — мікраліты (да 2 см) правільнай геаметрычнай формы. У выніку з'явіліся трывалыя і лёгкія прылады працы, для вырабу якіх ужо не трэба было шукаць буйныя крамянёвыя паклады. Мікралітычныя прылады працы дажылі да пачатку эпохі жалеза.

Яшчэ адно вельмі важнае дасягненне чалавека ў эпоху мезаліту — занятак рыбалоўствам, што было выкліканa вынаходніцтвам чаўна. Рыбалоўства стала адным з першых крокаў да аселасці, бо нагляд за рознымі рыбалоўнымі прыладамі патрабаваў хоць часовай прывязкі да мясцовасці.

На тэрыторыі Крычаўскага раёна вядома некалькі стаянак эпохі мезаліту. Адна з іх размяшчалася на поўнач ад в. Лабковічы, каля ўпадзення р.Чорная Натапа ў р.Сож, дзе археолагамі знойдзены скрэблы, разцы, якія па тэхніцы апрацоўкі адпавядаюць мезалітычнаму часу.

На мяжы VI—V тыс. да н.э. адбыўся пераход ад мезаліту да неаліту – новага каменнага веку. Яго аддзяляюць ад эпохі мезаліту таму, што ў гэты час адбываюцца значныя перамены ў

развіцці першабытнай тэхнікі апрацоўкі каменя. Акрамя крэменю, людзі пачалі выкарыстоўваць больш мяккія пароды камянёў, якія патрабавалі іншых тэхналагічных прыёмаў апрацоўкі – шліфавання, свідравання. Пашырэнне атрымалі рубячыя прылады працы – цёслы, далоты, сякеры. Апошнія, пры неабходнасці, маглі выкарыстоўвацца і як зброя. Эксперыменты, праведзеныя С. А. Сямёнавым, паказалі, што на выраб адной шліфаванай сякеры з мяккага каменя – сланца, якім можна было ссекчы дрэва, патрэбна было 2,5 – 3 гадзіны.

Эпоха неаліту ў гісторыі чалавецтва вылучаецца яшчэ адным адкрыццём, якое ўнесла важныя перамены ў жыццё першабытнага грамадства. Людзі стварылі кераміку. Заўважыўшы, што гліна мае ўнікальную ўласцівасць не прапускаць ваду пасля абпальвання, яны пачалі ляпіць з яе разнастайны посуд.

Найбольш старажытная кераміка ва Усходняй Еўропе датуецца канцом V тыс. да н.э. Самы ранні посуд істотна адрозніваецца ад сучаснага. Так, першапачаткова гаршкі мелі не плоскае дно, як у сённяшніх пасудзін, а круглае ці конусападобнае, завостранае , што было абумоўлена, верагодна, адсутнасцю спецыяльных прыстасаванняў для абагрэву і гатавання ежы – печаў. Вастрадонны посуд было зручней ставіць на вогнішча, замацаваўшы яго паміж камянёў.

Зараз ганчары выцягваюць гаршчок альбо місу з аднаго кавалка гліны. Аднак такая тэхніка вырабу посуду з'явілася не адразу. Першапачаткова з гліны выцягваліся жгуты, якія пасля размінання ператвараліся ў стужкі. Яны накладваліся адна на другую па спіралі, і такім чынам вылеплівалася начынне. Сцены посуду былі даволі тоўстымі – да 1,5 см, упрыгожваліся арнаментам па ўсёй паверхні з аднаго, двух радоў ямак, выкананых круглым стрыжнем альбо водціскамі дробназубчастага грабянца.

Яшчэ адным важным вынаходніцтвам эпохі неаліту быў пачатак вытворчасці тканіны. Аб гэтым можна меркаваць па адбітках тканіны на гаршках. Таксама даволі часта сустракаюцца ў археалагічных помніках і гліняныя праселкі, якія выкарыстоўвалі ў якасці махавіка для надання раўнамернага характара кручэнню верацяна. Валакно для ткацтва атрымлівалі з крапівы і канапель. Пазней людзі навучыліся рабіць прадзіва і тканіны з воўны.



Каменныя прылады працы, якія знойдзены на тэрыторыі Крычаўскага раёна.

Абследаванні, праведзеныя на тэрыторыі раёна, дазволілі выявіць больш за 20 помнікаў эпохі неаліту, якія адносяцца да верхнедняпроўскай археалагічнай культуры, што займала басейн верхняга Дняпра і яго прытокаў. Яны яшчэ чакаюць свайго даследчыка. Адно з вялікіх неалітычных паселішчаў існавала на дзюне ў пойме Сажа, насупраць мікрараёна «Сож». Матэрыялы эпохі неаліту выяўлены ва ўрочышчы Закоты каля в. Каменка, в. Паклады, пас. Крычаўскі, ва ўрочышчы Барок каля в. Лабковічы.

На пачатку II тыс. да н.э. на тэрыторыю Усходняй Беларусі з захаду прыйшлі новыя плямёны, якія археолагі вылучылі ў асобную археалагічную культуру — сярэднедняпроўскую. Гэта былі прадстаўнікі даволі шырокага кола культур шнуравой керамікі і баявых сякер, якія ахоплівалі абшары ад Швецыі на поўначы і да Карпат на поўдні, ад Рэйна на захадзе і да Прыуралля на ўсходзе. Большая частка даследчыкаў звязвае гэтыя плямёны з індаеўрапейцамі — продкамі славян, балтаў, германцаў.

З прыходам гэтага насельніцтва на Пасожжы пачаўся бронзавы век. У той час людзі зрабілі вялікае адкрыццё — навучыліся з руды выплаўляць волава і медзь, сплаўляць іх у бронзу і рабіць з яе прылады працы і ўпрыгожанні. Чалавек рабіў першыя крокі ў металургіі.

Аддаленасць Пасожжа і ўсёй Беларусі ад цэнтраў металургіі абумовіла панаванне тут на працягу ўсёй эпохі каменных прылад працы. Але ў гэты час апрацоўка крэменю дасягнула свайго росквіту. Старажытныя майстры навучыліся рабіць рэтуш – завастралі краі нажоў, кінжалаў, наканечнікаў стрэл. Адкрыццём стала і свідраванне ў каменных сякерах адтулін для насаджвання іх на дзяржанне. У бронзавым веку адбылося яшчэ адно вынаходніцтва. Людзі пачалі выраблять гліняны посуд новага тыпу. У адрозненне ад вастрадоннага посуду эпохі неаліту з'явіўся пласкадонны посуд, што сведчыць аб наступным: ежу пачалі рыхтаваць не на вогнішчы, а на агнішчы.

На жаль, помнікі эпохі бронзы на Крычаўшчыне пакуль не вывучаліся. Сякеры гэтага часу знойдзены каля в. Лабковічы і Каменка. Асобныя фрагменты керамікі, упрыгожанай арнаментам, характэрным для сярэднедняпроўскай культуры, знойдзены пад час раскопак на Гарадцы ў Крычаве, што сведчыць аб існаванні тут паселішча бронзавага веку.

Якое ж насельніцтва жыло тут раней, на якой мове яно размаўляла, з кім кантактавалі і з кім сутыкнуліся прышэльцы? Зараз лінгвісты ўсё больш схіляюцца да думкі, што Усходняя Беларусь у тыя далёкія часы была кантактнай зонай, дзе сутыкаліся перыферыі розных арэалаў фіна-вугорскіх (продкаў фінаў, эстонцаў, венграў), індаіранскіх і балцкіх (продкаў літоўцаў, латышоў) племянных груповак. Гэта гаворыць аб тым, што тут не было аднароднага насельніцтва, а існавалі паселішчы кожнага з указаных этнасаў.

Аб гэтым, на думку лінгвістаў, дазваляе сцвярджаць аналіз тапанімікі і гідранімікі (назваў населеных пунктаў, рэк і вадаёмаў). Так, аб іранска-вугра-фінскім сімбіёзе на гэтых землях сведчыць гідронім Іпуць. У складзе гэтай назвы лінгвісты вылучаюць старажытны іранскі кампанент «вада». Назву р. Жадунькі прапануюць шукаць у фіна-вугорскіх мовах і звязва-

юць яе з геаграфічным тэрмінам народа комі — «жуед», «жуод», што азначае «нізіна ў лесе».

Не знойдзена пакуль дастатковых аргументаў на карысць змешанага паходжання назвы р. Сож у сувязі з існаваннем кантактнай зоны. Спробы растлумачыць яе паходжанне абмяжоўваюцца асобнымі — «балцкай», «фінскай», «славянскай», «інда-іранскай» — гіпотэзамі.

У «фінскай» версіі супастаўляюць назву р. Сож з фінскім словам *susi*, эстонскім *suzi* — «воўк», што быццам бы пацвярджаецца наяўнасцю ў басейне Сажа «воўчага» гідраніма – р. Воўчас.

У «балцкай» версіі назва р.Сож мае той жа корань, што і прускае слова *suge* — дождж. Згодна з «інда-іранскай» гіпотэзай, назву р. Сож разглядаюць у адным радку з такімі «воднымі» назвамі як Судасць, Суджа, Судка, Судземка, якім знаходзяць аналогію ў старажытнаіндыйскай мове — «сунджати» — чысты. Паводле «славянскай» версіі Сож — гэта рака, якая мае сухія берагі, водмелі, пясчаныя наносы.

У першай палове І-га тыс. да н.э. практычна адначасова ў розных рэгіёнах, ад Егіпту да Кітая, людзі пазнаёміліся з жалезам. Не абмінула гэтая падзея і Пасожжа, багатае на мясцовыя радовішчы балотнай і лугавой руды. Лясы давалі паліва для выплаўкі жалеза – драўняны вугаль. Жалеза выплаўлялі ў сырадутных горнах, якія рабілі з камянёў, абмазаных глінай. У адтуліну печы ўстаўлялі трубы, па якіх падавалася ў горан сырое паветра (адсюль і назва спосабу выплаўлення — сырадутны) для павелічэння тэмпературы.

Горан засыпаўся слаямі вугалю і руды. Падаваемае па трубах паветра дазваляла павялічыць тэмпературу да 900 градусаў. У выніку выгарання кіслароду з руды выдзяляліся цестападобныя часціны жалеза, якія асядалі на дно горна ў выглядзе порыстага жалеза — крыцы. Потым крыцу некалькі разоў пракоўвалі, каб атрымаць неабходную загатоўку.

Асваенне працэсу выплаўкі жалеза азначала пераварот у гісторыі чалавецтва. У адрозненне ад волава і медзі, жалеза было больш распаўсюджаным металам, вырабы з яго — больш трывалымі, што значна павысіла сілы і магчымасці чалавека перад прыродай. Бронзавыя вырабы даволі хутка саступілі месца жалезным. Жалезная сякера і саха з жалезным наканечнікам давалі магчымасць значна павялічыць плошчу апрацоўваемай зямлі, дзякуючы чаму земляробства і жывёлагадоўля вылучыліся ў вядучыя галіны гаспадаркі. Паляванне, збіральніцтва, рыбалоўства пачыналі існаваць ужо ў якасці дапаможных промыслаў.

У сярэдзіне І тыс. да н.э. землі Крычаўшчыны насялілі днепра-дзвінскія плямёны (назву атрымалі ад міжрэчча Заходняй Дзвіны і Дняпра, дзе былі ўпершыню выяўлены падобныя старажытнасці.

На думку сучасных даследчыкаў, днепра-дзвінскія плямёны згадваюцца бацькам гісторыі Геродотам пад назвай андрафагаў. Ён адносіць іх да адных з самых дзікіх плямёнаў. Па яго звестках, з усіх народаў андрафагі маюць найбольш дзікія норавы; яны не ведаюць ні суда, ні закону. Згодна паведамлення Геродота, яны качэўнікі. Вопратка іх падобна на скіфскую, але Геродот адзначае, што ў іх іншая мова, а таксама тое, што андрафагі — адзінае племя, сярод якога быў распаўсюджаны канібалізм (людаедства).

Што яшчэ цікавага паведамляе нам

Герадот аб андрафагах і як увогуле яны трапілі ў поле зроку антычнага гісторыка? Справа ў тым, што яго вельмі цікавілі падзеі, звязаныя з паходам персідскага цара Дарыя на скіфаў у 512 годзе да н.э. Герадот сам прайшоў шляхам Дарыя, апісваючы новыя землі, народы, што іх насялялі, і збіраў звесткі аб падзеях скіфскага паходу. Безумоўна, землі, далёкія ад Понта Эўксінскага (так старажытныя грэкі называлі Чорнае мора), ён сам убачыць не змог, а карыстаўся апавяданнямі аб іх. Андрафагі звярнулі на сябе ўвагу Герадота таму, што яны ў 512 г. да н.э. адмовілі ў дапамозе скіфам, якія змагаліся з персідскім царом Дарыем.

Археалагічныя помнікі днепрадзвінскай культуры, якая была распаўсюджана з VI ст. да н.э., сутракаюцца ў розных канцах раёна. Гэта гарадзішча каля в. Ягораўка на беразе р. Асцёр, гарадзішча ў в. Сетнае. Ды і на Гарадцы ў Крычаве самыя ніжнія напластаванні адносяцца да гэтага часу.

Знаёмства чалавека з жалезам спрыяла распаўсюджванню падсечна-вагнявога земляробства. Жалезнай сякерай было лягчэй ссекчы лес, які, пасля таго як падсыхаў, падпальваўся. Такім чынам глеба ўгнойвалася і на ёй сеялі 2 — 3 гады. Пасля таго, як урадлівасць глебы падала, поле пакідалі, і рыхтаваўся да пасеву новы кавалак лесу.

Акрамя змяненняў у гаспадарчым жыцці, асваенне жалеза прывяло да змяненняў у грамадскіх адносінах. З'яўленне лішкаў прадуктаў пачало прыводзіць да дыферэнцыяцыі як сярод абшчыннікаў, так і сярод розных родаў і плямёнаў. Магчымасць хуткага абагачэння за кошт іншых людзей прывяла да рэгулярных набегаў з мэтаю рабункаў. І калі першапачаткова набегі былі рэдкімі, то з часам сталі важнай крыніцай абагачэння.

Неабходнасць абароны ад пастаянных набегаў прывяла да таго, што на паселішчах жалезнага веку, у адрозненне ад эпохі каменнага і бронзавага веку, пачалі ўзводзіць абарончыя збудаванні. Гэта добра прасочвалася пад час археалагічных даследаванняў на гарадзішчы Гарадзец у Крычаве. Першапачатковае паселішча днепрадзвінцаў на беразе невялікай рэчкі Крычавец не мела штучных земляных умацаванняў — абарончых валоў. Умацаваннямі паселішчу служылі стромкія схілы пагорка і драўляныя сцены ў выглядзе вастракола, укапанага па краях пляцоўкі паселішча. Што з сябе ўяўляла паселішча? Сёння цяжка даць больш-менш дакладны адказ на гэтае пытанне, бо рэчка амаль цалкам знішчыла гарадзішча. Мяркуючы па тым, што ў Крычаве яна працякае па глыбокай і вузкай даліне, хутчэй за ўсё гэта было невялікае гарадзішча, памерам прыкладна 50 м у дыяметры, на якім пражывала радавая абшчына з 50-60 чалавек.

З-за таго, што гарадзішча мела невялікія памеры, яго жыхары, дзеля таго каб захаваць зручную плошчу, прыдатную для ўзвядзення жылля, насыпалі вал з вонкавага боку пляцоўкі гарадзішча і такім чынам захавалі памеры пляцоўкі. Першапачатковы вал быў невялікім. У вышыню ён дасягаў 1 м, пры шырыні ў аснове каля 4 м.

На мяжы II—III ст. на землі Крычаўшчыны прыйшло новае насельніцтва. Гэта прадстаўнікі сярэдняга слою Тушамлінскай культуры (назву атрымала ад гарадзішча каля в. Тушамля на Смаленшчыне, дзе ўпершыню была выяўлена гэтая культура), якія засялялі значныя прасторы Верхняга Пад-



Знаходкі на тэрыторыі Крычаўскага раёна.

няпроўя. Тушамлінскае насельніцтва заняло тыя ж паселішчы, на якіх жылі папярэднікі — гарадзішча каля в. Ягораўка, Сетнае, Гарадзец у Крычаве.

У адрозненне ад папярэднікаў новае насельніцтва больш шырока выкарыстоўвала жалезныя рэчы — як зброю, так і прылады працы і рэчы хатняга побыту. На паселішчах гэтага часу даволі часта сустракаюцца імпартныя рэчы, якія сведчаць аб наяўнасці пэўных гандлёвых сувязей з паўднёвымі раёнамі. Яскравым сведчаннем падобных гандлёвых сувязей з'яўляецца скарб, знойдзены у 1804 г. недалёка ад Крычава, у Клімавічах, з 1815 рымскіх сестэрцыяў і дэнарыяў першых рымскіх імператараў, які, верагодна, быў зарыты ў XI стагоддзі.

У V—VII ст. Крычаўшчына ўваходзіла ў раён пашырэння культуры верхняга слою Тушамлі. Матэрыялы гэтага часу пакуль знойдзены толькі на Гарадцы ў Крычаве. Як і на іншых паселішчах гэтай культуры, жыццё тут спынілася пасля нейкага вялікага пажару, і на змену тушамлінцам прыйшло новае насельніцтва. Адносна этнічнай прыналежнасці тушамлінскай культуры даследчыкі пакуль не маюць аднолькавай думкі. Адна група даследчыкаў лічыць іх балтамі, іншыя бачаць у іх славян, некаторыя вучоныя, разглядаючы тушамлінцаў як балтаў, прызнаюць прысутнасць сярод іх пэўнай колькасці славян.

У апошняй чвэрці I тыс. н.э. (VI—IX ст.) землі Крычаўшчыны асвоілі роменска-боршчаўскія плямёны (археалагічная культура атрымала назву ад паселішчаў каля ўкраінскага г. Ромны і в. Боршчава Варонежскай вобласці



Касцяныя вырабы з гарадзішча Гарадзец у Крычаве, V—III ст. да н. э.: *1, 2, 4* — падвескі, *3* — муфтачка, *5, 7* — нарыхтоўкі стрэл, *6* — страла, *8—10* — праколкі, *11* — апрацаваная косць, *12* — ручка нажа.



Рэчы з гарадзішча Гарадзец у Крычаве, XII ст.: *1, 5* — брускі, *2—3* — сланцавыя праселкі, *4* — нож, *6* — крыж, *7* — падкоўка пад абцас, *8* — ключ.

ў Расіі), аб этнічнай прыналежнасці якіх сярод даследчыкаў ужо няма спрэчак – гэта славяне. Паселішчы гэтай археалагічнай культуры даўно вядомы на поўдзень і ўсход ад Крычаўшчыны: у Слаўгарадзе, Чачэрску, па берагах р. Іпуць на Браншчыне і Смаленшчыне, наяўнасць некалькіх паселішчаў гэтай культуры адзначана на Клімаўшчыне. На Крычаўшчыне паселішча з матэрыяламі роменска-боршчаўскай культуры знойдзена пакуль толькі ў адным месцы — на дзюне ў пойме Сажа, насупраць гарадскога мікрараёна «Сож».

Тут сабраны фрагменты характэрнай для роменска-боршчаўскага насельніцтва керамікі, упрыгожанай арнаментам з адбіткам вяровачкі, накручанай на палачку.

Канцом IX ст. датуюцца пісьмовыя звесткі аб насельніцтве, якое жыло ў басейне р. Сож. Летапісец згадвае, што Пасожжа насяляла славянскае племя радзімічаў, прычым падкрэслівае, што гэта не карэннае насельніцтва. Радзімічы прыйшлі сюды «з ляхаў». «Радимичи и вятичи отъ ляховъ. Бяста бо два брата в лясехъ, Радим а другыи Вятко



Рэчы з гарадзішча Гарадзец у Крычаве, XII—XIII ст.:
1 — суліца, *2* — наканечнік стралы, *3*— спражка, *4* — струг, *5, 9* — пярсцёнкі, *6, 7* — нажы, *8* — замок.

и пришъдша седоша Радимъ на Съжю и прозвашася радимичами. Бяше же радимичи от рода ляховъ». Сярод гісторыкаў і археолагаў даўно дыскутуецца пытанне, што значыць — «з ляхаў»: з земляў Польшчы, ці гэты выраз азначае проста накірунак — з захаду. Даследчыкі адзначаюць падабенства гідраніміі Сажа з гідраніміяй вярхоўяў Днястра ў Карпатах. У той жа час некаторыя радзіміцкія ўпрыгожанні вельмі падобны на севяранскія. Гэта дало падставу выказаць гіпотэзу, што летапісныя радзімічы — вынік змешвання роменска-боршчаўскага насельніцтва, якое асвойвала Пасожжа з VIII ст., і прыйшоўшых сюды з Падняпроўя заходніх славянскіх плямёнаў.

Верагодна, прычынай перасялення заходніх славян было перасяленне уграў (продкаў венграў) з міжрэчча Дняпра і Дона ў Цэнтральную Еўропу. Першыя звесткі аб іх нападах датуюцца 862 годам. Магчыма, у гэты час і адбылося перасяленне радзімічаў з Падняпроўя на Пасожжа. Ва ўсялякім выпадку пачатак гэтага працэсу

трэба шукаць не вельмі далёка ад 885 года, бо інакш для Кіева наўрад ці было б загадкай, каму плацілі даніну радзімічы. «В лъто 6393 (885). Посъла Олегъ къ радимичем, река «Кому дань даёте». Они же реша «Козарам». И рече имъ Олегъ: «не дайте козарам, нъ мънъ дайте». И вдаша Олгови по шьлягу, якоже и козаром даяху, И бъ обладал Ольгъ поляны и древляны и съверь и радимичи».

Летапісныя звесткі 885 г. паведамляюць, што радзімічы добраахвотна ўвайшлі ў ствараемую Кіевам канфедэрацыю ўсходнеславянскіх плямёнаў, захаваўшы пэўны «суверэнітэт», аб чым сведчыць наяўнасць у кіеўскіх саюзнікаў «великих и светлых князей», хаця летапісец і падкрэслівае, што яны «под Ольгом суще». Разам з палянамі і іншымі славянскімі плямёнамі радзімічы ўдзельнічалі ў 907 г. ў паходзе князя Алега на Канстанцінопаль і атрымлівалі з яго даніну. Але недзе ў другой палове X ст. радзімічы выйшлі з-пад апекі Кіева. Верагодна, гэта адбылося пры Святаславе, які больш увагі ўдзяляў барацьбе з Візантыяй і Хазарыяй, чым унутраным справам сваёй дзяржавы.

З прыходам да ўлады ў Кіеве Уладзіміра пачаўся новы этап у падпарадкаванні Кіеву ўсходнеславянскіх плямёнаў.

Хутка чарга дайшла і да радзімічаў. У 984 г. ваявода Уладзіміра Воўчы Хвост на рацэ Пясчані, на поўдзень ад Гомеля, які быў буйным племянным цэнтрам радзімічаў, разбіў іх. «В лето 6492 (984). Иде Володимеръ на радимичи. Бъ у него воевода Волъчий Хвостъ и посла пред собою Володимеръ Волчия Хвоста и сърьте радимичъ на ръцъ Пъсчанъ, и побъди Волчий Хвостъ радимичъ».

Летапіс захаваў апісанне звычаяў радзімічаў: «А радимичи и вятичи и север один обычай имеяху: живяху в лесе, якоже всякый зверь, ядуще все нечисто. И срамословие в них пред отши и пред снъхами. И браци не бываху в них, но игрища межо селы. И съхожахуша на игрища, на плясания и на вся бесовскыя песни и ту умыкаху жены собе, с нею же кто съвещавься. И мяху же дьве и по три жены».

Добра апісаны яшчэ адзін звычай, які існаваў у радзімічаў — пахавальны: «А аще къто умъряше — творяху тризну над нимъ и по семъ сътворяху краду велику и въложаху на краду мъртвъца и съжъаху. И по семь, събравъще кости, въложаху в судину малу и поставляху на стълпе на путъх...»

Зразумела, што знайсці сляды такога пахавання, калі нябожчыка спальвалі, а косці змяшчалі ў гаршчок і ставілі ў стоўп — невялікі драўляны домік, вельмі цяжка. Драўляныя домікі не маглі доўга захоўвацца на паверхні зямлі і таму да археолагаў яны не дайшлі. У зямлі радзімічаў ёсць толькі некалькі выпадковых знаходак такіх пахаванняў, якія адпавядаюць летапіснаму паведамленню; адно з іх было знойдзена недалёка ад Крычава, каля в. Гронаў Чэрыкаўскага раёна.

Археалагічныя помнікі IX—XIII ст. – гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі — раскіданы па ўсяму раёну, аднак яны пакуль слаба даследаваны. Гарадзішчы X—XIII ст. вядомы ў Крычаве — Замкавая гара, Гарадзец, каля в. Горкі. Селішчы (неўмацаваныя паселішчы) пакуль выяўлены толькі каля вёсак Воўчас, Горкі, і на дзюне ў пойме Сажа, насупраць Крычава. Малая колькасць вядомых селішчаў звязана з цяжкасцю іх выяўлення.

Крыж-энкалпіён з гарадзішча Замкавая гара, XIII ст.

Значна больш вядома курганных могільнікаў — мясцін, дзе хавалі памерлых. Яны выяўлены каля в. Вародзькаў-3, Бацьвінаўка, Зуі, Канцы, Коханаў, Воўчас, Кашаны, Лабковічы, Масціцкая Слабада, Паклады, Стаборшчына, Ягораўка, Рэпішча і каля піўзавода ў Крычаве. Усе курганныя могільнікі маюць аднолькавую форму — паўкруглы насып вышынёй 0,5—3 м, дыяметрам 4—15 м. Найлепш курганы захаваліся ў лясах, на адкрытай мясцовасці яны час ад часу разбураюцца ў працэсе сельскагаспадарчай вытворчасці. Знешне ўсе курганы аднолькавыя, адрозніваюцца яны толькі па абраду пахавання.

У X — пачатку XI ст. сярод радзімічаў яшчэ было распаўсюджана паганства. Нябожчыка клалі на вогнішча і спальвалі, потым зверху насыпалі курган. Звычайна раскапаны курган дае такую выяву. На пясчанай падсыпцы вышынёй 0,5–0,7 м ляжыць слой попелу, які атрымаўся ў выніку спальвання нябожчыка. Пасля насыпання кургана вакол яго ў невялікіх раўчуках распальвалі вогнішча. Сляды гэтых раўчукоў добра прасочваюцца вакол некаторых курганоў і да сённяшняга дня.

Аб падзеях, што адбываліся на зямлі радзімічаў у XI ст., нічога невядома. Летапісы абыходзяць гэты рэгіён сваёй увагай. Аднак улічваючы, што ў выніку міжусобіцы паміж Яраславам Мудрым і Мсціславам Уладзіміравічам Кіеўская Русь да 1036 г. была падзелена паміж імі па Дняпры, землі па яго левабярэжжу хутчэй за ўсё былі пад уплывам апошняга.

Важнейшай падзеяй у гісторыі ўсходніх славян было прыняцце імі хрысціянства. Першае знаёмства з ім адбылося даволі рана — пад час ваенных і гандлёвых паходаў на Канстанцінопаль, праз візантыйскіх місіянераў і гандляроў на працягу IX—X ст. Але афіцыйны хрост кіеўскага князя Уладзіміра ў 988 г. паклаў пачатак актыўнаму пашырэнню хрысціянства на ўсходнеславянскіх абшарах.

Прыняцце хрысціянства не прывяло адразу да яго поўнай перамогі. Паганства яшчэ доўга працягвала суіснаваць з хрысціянствам, нягледзячы на ўсе намаганні царквы. Зломленае на дзяржаўным узроўні, паганства працягвала існаваць у выглядзе розных перажыткаў, захаванні элементаў пахавальнага абраду, нягледзячы на жорсткія забароны царквы і ўладаў. Артадаксальнае праваслаўе не змагло канчаткова іх вынішчыць і было вымушана прыстасавацца да іх.

На змену трупаспаленню пад уплывам хрысціянства на пачатку XI ст.

прыйшло трупапалажэнне. Але да канца гэтага стагоддзя ў зямлі радзімічаў пахаванні нясуць на сябе сляды ўздзеяння агню. Болей таго, калі ў канцы XI ст. радзімічы цалкам адмовіліся ад спальвання нябожчыкаў, вера ў ачышчальную сілу агню працягвала ў іх захоўвацца. І ў XII ст. перад тым, як пахаваць нябожчыка пад курганом, месца будучага пахавання ачышчалася агнём — распальвалася вялікае вогнішча. Даволі часта ў радзіміцкіх курганах гэтага часу можна ўбачыць наступную карціну: нябожчык ляжыць на папялішчы магутнасцю да 0,7 м. Гэта традыцыя ў зямлі радзімічаў, з невялікімі адрозненнямі, захоўвалася даволі доўга. Так, яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя на Клімаўшчыне, у в. Куляшоўка, быў зафіксаваны звычай кідаць у магілу гарачыя вуглі, што спецыяльна прыносілі на могілкі ў гаршку, з якога абмывалі нябожчыка.

Раннехрысціянскія курганныя пахаванні ў зямлі радзімічаў даволі багатыя на бытавыя рэчы. Нябожчыка хавалі з яго любімымі рэчамі, упрыгожаннямі. У курганным могільніку каля в. Бацьвінаўка было даследавана некалькі пахаванняў па абраду трупапалажэння. У адным кургане знойдзена 20 бронзавых бразготак з лінейнай шчылінай, дзве петляпадобныя падвескі, білонавыя сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, сярэбраны бранзалет і каля 300 шкляных і бурштынавых пацерак. У другім кургане, таксама з жаночым пахаваннем, знойдзены гліняны гаршчок, праселка, дзве спражкі, бронзавае кольца, 30 бурштынавых і 20 шкляных пацерак, 22 языкападобныя падвескі і 3 арабскія дырхемы. Мужчынскія пахаванні значна бяднейшыя: трапляюцца спражкі, паясныя кольцы, нажы, гаршкі, часам сякеры і іншае.

На працягу XII ст. пахаванні пазбаўляюцца ўпрыгожанняў і іншага матэрыялу, што з'яўляецца сведчаннем паступовага распаўсюджвання хрысціянства. Аднак гэта адбываецца вельмі павольна; ва ўсялякім выпадку да сярэдзіны XII ст. ў радзімічаў паганскія перажыткі прасочваюцца даволі добра. Верагодна, толькі пасля таго, як у 1136 г. ў Смаленскім княстве была арганізавана самастойная епархія, справа хрысціянізацыі гэтых зямель пайшла хутчэй.

У такім стане знаходзілася Пасожжа да пачатку XII ст., якое крута змяніла павольную плынь гісторыі. У 1125 г. было ўтворана самастойнае Смаленскае княства. Родапачынальнік дынастыі смаленскіх князёў Расціслаў Мсціславіч (які, дарэчы, унесены ў пантэон беларускіх святых), унук Уладзіміра Манамаха, належаў да ліку самых энергічных палітычных дзеячаў свайго часу і здолеў значна пашырыць межы княства. Адным з накірункаў яго энергічных дзеянняў быў поўдзень. Расціслаў уважліва сачыў за падзеямі, што адбываліся ў Чарнігаўскім княстве, спадзеючыся далучыць да Смаленска слаба асвоеныя Чарнігавам паўночныя землі радзімічаў. І такая нагода хутка здарылася. У 1127 г. пачалася ўсобіца паміж чарнігаўскімі князямі. У яе вымушаны быў умяшацца кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч, бацька Расціслава Смаленскага. Яго абурэнне дзеяннямі чарнігаўскіх князёў было такім вялікім, што спатрэбілася ўмяшальніцтва царквы, каб замірыць Мсціслава з чарнігаўцамі. Менавіта гэтым складаным для Чарнігава момантам, верагодна, і скарыстаўся Расціслаў, каб за спіною бацькі далучыць да Смаленска паўночныя зем-

лі радзімічаў, на якіх стаялі былыя чарнігаўскія адміністрацыйныя цэнтры – на гарадзішчах Гарадзец у Крычаве і Замкавай гары ў Слаўгарадзе. Дадаткова Расціслаў пабудаваў новыя памежныя крэпасці ў Мсціславе і Расціславе (Рослаўлі).

Захоп у 1127 г. паўночных зямель радзімічаў не быў адзіным наступам Расціслава на Чарнігаўскае княства. У 1142 г. Расціслаў Мсціславіч, выкарыстоўваючы новую ўсобіцу паміж чарнігаўскімі князямі, рушыў свае дружыны супраць Ігара і Святаслава Ольгавічаў і захапіў землі паміж Сожам і Іпуццю.

Падзеі 1127 і 1142 гг. сталі на доўгі час незагойнай ранай у смаленска-чарнігаўскіх узаемаадносінах. На працягу ўсёй другой паловы XII ст. ў летапісах неаднаразова сустракаюцца паведамленні аб канфліктах паміж Смаленскам і Чарнігавам з-за гэтых зямель. Нават пасля смерці Ігара, у якога не засталося нашчадкаў, гэтае пытанне неаднаразова ўзнімалася. Летапісы нічога не гавораць нам аб гэтым пры жыцці Расціслава Мсціславіча,



Біклага з гарадзішча Замкавая гара.

аднак пасля яго смерці (1167) Святаслаў Ольгавіч, князь чарнігаўскі, узняў яго. У 1174 г., пры кіеўскім княжэнні Рамана Расціславіча, быў заключаны «Раманаў рад», які нейкім чынам рэгуляваў гэтыя спрэчкі. Аднак спроба Святаслава Ольгавіча ў 1190 г. перагледзець пагадненне не прынясло карысці Чарнігаву.

Рурык Расціславіч, сын Расціслава Мсціславіча, у адказе Святаславу падкрэсліваў, што выйсці «з Раманавага раду» ён яму не дазволіць, і вяртаў хросныя граматы, што азначала пачатак вайны. Чарнігаў апынуўся перад пагрозай новай вайны з аб'яднанай кааліцыяй Мсціславічаў. Але мяжа засталася стабільнай, і землі сённяшняй Крычаўшчыны былі ў складзе Смаленскага княства.

Аб падзеях, што адбываліся на землях Крычаўшчыны ў другой палове XII—пачатку XIV ст., з-за адсутнасці пісьмовых сведчанняў цяжка мяркаваць. Магчыма, Крычаўшчына ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства, сціплыя звесткі аб існаванні якога трапляюцца пад 1180 год.

У другой палове XIII ст. пачаўся ціск на Смаленскую зямлю дружын Вялікага княства Літоўскага. З пачатку XIV ст. ў барацьбу за Смаленскае княства пачало актыўна ўмешвацца і княства Маскоўскае. Смаленская зямля апынулася паміж молатам і кавадлам, адкуль яна так і не змагла выслізнуць. Масква захоплівала ўсходнія землі, Навагародак — заходнія. У 1359 г. Альгерд далучыў да Вялікага княства Літоўскага Мсціслаў — смаленскі фарпост на Пасожжы. Верагодна, тады ж былі далучаны да ВКЛ Крычаў, Прапойск, Папова Гара, Дрокаў. Ва ўсялякім выпадку ў 1365 г. ўжо і Бранск апынуўся ў складзе Вялікага княства Літоўскага.

Станаўленне

Гістарыяграфія ведае шмат прыкладаў, калі тое ці іншае аднойчы выказанае меркаванне становіцца тым пастулатам, на які ў далейшым пачынаюць абапірацца даследчыкі. Адной з такіх аксіём стала дата першага ўпамінання Крычава.

Агульнапрызнанай стала думка, што ўпершыню горад з'яўляецца на старонках пісьмовых крыніц у 1136 г. пад назвай Крэчют у Статуце Расціслава Мсціславіча Смаленскага. Пералічваючы воласці, з якіх Расціслаў Мсціславіч прызначаў дзесяціну на карысць утворанай ім епіскапіі, крыніца згадвае воласць Крэчют: «У Крэчюта дани 10 гривен, а с(вя)тъи Б(огороди)ци и еп(и)ск(о)пу грив(ну)».

Меркаванне, выказанае ўпершыню ў сярэдзіне XIX ст. расійскім гісторыкам І.Дз. Бяляевым, у далейшым знайшло падтрымку наступных даследчыкаў, а некаторыя нават зрабілі спробу падмацаваць думку І. Дз. Бяляева, хаця ў пісьмовых крыніцах пад назвай Крычаў горад упамінаецца ў складзеным прыкладна ў 1390-я гады «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» сярод літоўскіх гарадоў. Нягледзячы на тое, што аргументацыя аднадумцаў І.Дз. Бяляева на карысць атаесамлення Крычава і Крэчюта, мякка кажучы штучная, трэба адзначыць, што на сённяшні дзень няма іншых прапаноў па лакалізацыі Крэчюта, таму і мы не будзем аспрэчваць гіпотэзу І.Дз. Бяляева, тым больш, што гэта ўсяго толькі адзін штрых у гісторыі горада, які не ўносіць істотных перамен у яго лёс. Паспрабуем рэканструяваць гісторыю сярэдневяковага Крычава.

Адным з самых галоўных і цікавых момантаў у гісторыі любога горада з'яўляецца пытанне аб часе яго ўзнікнення і аб характары і ролі першапачатковага паселішча, бо, як вядома, дата першага згадвання населенага пункта ў пісьмовай крыніцы звычайна даволі далёка адстае ад часу яго ўзнікнення. Для вырашэння гэтай праблемы неабходна прасачыць развіццё паселішча не толькі з таго моманту, калі яно атрымала ўсе рысы феадальнага горада, а, па магчымасці, з таго часу, калі цікавая нам тапаграфічная кропка пачала вылучацца сярод сучасных паселішчаў і заняла адносна іх пануючае становішча.

Аналіз археалагічных помнікаў Крычава эпохі феадалізму паказвае, што найстаражытнейшым з іх з'яўляецца паселішча, узнікшае на гарадзішчы жалезнага веку Гарадзец, размешчанае на левым беразе ручая Крычаўца. Толькі на гэтым паселішчы выяўлена лепленая кераміка, падпраўленая на ганчарным крузе, кругавая кераміка X–XI ст., вочкавыя пацеркі, датуемыя гэтым жа часам. У X–XI ст. на поўнач ад гарадзішча пачало фарміравацца селішча, на якім знойдзены як ганчарная кераміка, так і пацеркі-«лімонкі».

Другое паселішча на тэрыторыі Крычава, таксама датуемае керамікай X—XI ст., зялёным рубленым бісерам, шыракарогай лунніцай, існавала на высокім правым беразе Сажа, на тым месцы, дзе потым узнікла гарадзішча Замкавая гара. Разам плошча паселішчаў раннефеадальнага часу на тэрыторыі Крычава — на беразе Крычаўца (болей 1,3 га) і на беразе Сажа (0,5 га) складала каля 2 га.

Хто заснаваў гэтае паселішча і адкуль пайшла назва Крычаў, на сён-

няшні дзень высветліць не ўяўляецца магчымым. Яно размешчана ў атачэнні радзіміцкіх курганных могільнікаў XI–XIII ст., але недалёка ад радзіміцка-крывіцкай мяжы (пахаванні з крывіцкімі скроневымі кольцамі былі знойдзены ў Бацьвінаўцы). Ды і ў самім горадзе яшчэ ў XIX ст. існавала паданне, што Крычаў быў заснаваны крывічамі і першапачаткова называўся Крывічаў.

Узнікненне аднаго з самых першых раннесярэдневяковых умацаваных паселішчаў на гарадзішчы жалезнага веку Гарадзец было абумоўлена геаграфічным размяшчэннем апошняга. Крыху на поўнач ад яго ў Сож з левага боку ўпадае Асцёр, і такім чынам Гарадзец кантраляваў шлях як уверх па Сажу, з якога ў раёне Смаленска быў выхад на Днепр, так і па Астру. Акрамя магістральных шляхоў па буйных рэчках — Сажу і Астру, на поўдзень ад Гарадца ў Сож з левага боку ўпадае р. Лабжанка, з якой праз волак па р. Перавалочні, каля сучаснай в. Ціманава, адкрываўся выхад у басейн р. Бесядзь і ў землі радзімічаў.

З-за дрэннай захаванасці Гарадца няма магчымасці даць дакладную характарыстыку сацыяльнай тыпалогіі гэтага першапачатковага паселішча. Безумоўна толькі, што адразу ж яно пачало выконваць функцыі ваеннага і адміністрацыйнага цэнтра пэўнай акругі. Аб гэтым сведчыць не толькі тое, што вакол яго ўжо ў гэты час пачалі фарміравацца селішчы. Паселішча VIII–XI ст. (з керамікай роменска-боршчаўскага тыпу) выяўлена на беразе старыцы Сажа, насупраць мікрараёна «Сож» г. Крычава (прыкладна за 1 км на паўночны усход ад Гарадца), матэрыялы X–XI ст. вядомы па паселішчах каля в. Ціхіль на Астры, каля в. Селішча на Сажы. Курганныя могільнікі з трупаспаленнямі і пахаваннямі па абраду трупаспалення і інгумацыі X—XI ст. вядомы каля в. Бацьвінаўка,у лесе, насупраць мікрараёна «Сож», на Астры каля в. Іванаўка, Куляшоўка, Пянькоўка. Адначасова паселішча на Гарадцы, верагодна, выконвала функцыю сакральнага цэнтра акругі. Ва ўсялякім выпадку ў горадзе яшчэ ў мінулым стагоддзі захоўвалася паданне аб існаванні калісьці на месцы Замкавай гары паганскага капішча, на якім пазней была ўзведзена Мікольская царква.

Узнікнуўшы як кропка на шляху радзіміцкай каланізацыі Пасожжа, гарадзішча Гарадзец даволі хутка стала адным з апорных пунктаў у гэтым працэсе, цэнтрам фарміруючай акругі і, верагодна, менавіта з гэтага моманту пачаўся паступовы рост паселішча, што ў рэшце рэшт прывяло да фарміравання на яго аснове горада.

У выніку падзелу Кіеўскай Русі ў 1024 г. паміж Яраславам Мудрым, які княжыў у Кіеве, і Мсціславам Уладзіміравічам, княжыўшым у Чарнігаве, зямля радзімічаў і паселішча на Гарадцы апынуліся пад уладай апошняга.

Гісторыя Крычава ў XI ст. была цесна звязана з лёсам Чарнігаўскага княства. Умацаванае паселішча на поўначы зямлі радзімічаў, верагодна, адначасова выконвала ролю чарнігаўскага фарпоста на паўночных межах княства і было цэнтрам невялікай акругі.

У такім стане Крычаў уступіў ў XII ст., якое ўнесла карэнныя змены ў яго лёс. Падзеі 1127 г. і 1142 г., аб якіх ўжо ішла размова, унеслі значныя перамены ў развіццё Пасожжа. Неабходна было замацаваць за сабой новыя землі і арганізаваць на іх надзейнае падаткаабкладанне. І гэта было хутка зроб-

лена. З дайшоўшага да нас Статута Расціслава Мсціславіча, князя смаленскага, мы даведваемся, што калі ў 1136 г. ў Смаленскім княстве была ўтворана самастойная епіскапская кафедра, на карысць якой Расціслаў Мсціславіч перадаў значныя ўладанні і дзесяціну з усіх падаткаў, Крэчют-Крычаў быў ужо цэнтрам воласці, з якой бралася даніна ў памеры 10 грывен, адна з якіх ішла на карысць епіскапіі. Увогуле, на Пасожжы тады была створана яшчэ воласць з цэнтрам у Прапоі (сучасны Слаўгарад), а горадаўтваральны працэс ахапіў усё новыя землі. На Пасожжы былі ўзведзены новыя гарады – Мціслаў, Расціслаў. У другой палове XII ст. згадваецца Зарой, сугучныя тапонімы якога вядомы на Клімаўшчыне. Пачалося будаўніцтва новых абарончых збудаванняў на гарадзішчы ў Прапоі і фарміраванне каля яго сцен пасада.

Не абмінуў гэты працэс і Крычаў. На беразе Сажа, на месцы неўмацаванага паселішча, існаваўшага ў X—пачатку XII ст., пачалося будаўніцтва новага ўмацаванага цэнтра — гарадзішча Замкавая гара, якое да канца XVIII ст. стала цэнтрам горада. Якія ж прычыны выклікалі перанос цэнтра паселішча на новае месца?

Адной з галоўнейшых прычын, верагодна, была малая плошча старога ўмацаванага цэнтра і немагчымасць яе павелічэння. Па-другое, магчыма, ужо ў гэты час пачалося разбурэнне Гарадца водамі Крычаўца, што таксама паспрыяла пераносу цэнтра паселішча. І, нарэшце, новы цэнтр зручней было заснаваць непасрэдна на беразе буйной воднай артэрыі, якой з'яўляўся Сож.

Ад берагавога плато глыбокім ірвом была аддзелена пляцоўка падтрохвугольнай формы памерам 90 х 60 м, умацаваная з напольнага боку абарончым валам вышынёй 1,5 м. Сюды, на бераг Сажа, на працягу XII –XIII ст. паступова перамяшчаўся цэнтр жыцця з Гарадца. Адначасова з пераносам дзядзінца на новае месца каля его сцен пачаў фарміравацца і пасад. Ён размяшчаўся за 70 м на поўдзень ад Замкавай гары – на Спаскай гары. Назву яна атрымала ад размешчанай тут у XVI – пачатку XX ст. Спаскай царквы. Археалагічна пасад прасочваецца даволі слаба – нешматлікія фрагменты керамікі XII – пачатку XIV ст. сустракаюцца на плошчы каля 1 га, абмежаванай руслам Сажа, вуліцай Сіраціна і вуліцай Талкачовай.

Безумоўна, што нанова адбудаваны ваенны адміністрацыйны цэнтр меў адпаведную акругу. Улічваючы, што вакол Крычава ў XII–XIII ст. знаходзіўся шэраг гарадскіх цэнтраў — Мсціслаў і Зарой, а з захаду, на р. Проні, існавалі, верагодна, самастойныя воласці, магчыма, адна з цэнтрам у Радамлі, дзе ёсць гарадзішча з матэрыяламі XII–XIII ст., а другая з цэнтрам на Чавускім селішчы, на якім прасочваюцца сляды наяўнасці прадстаўнікоў феадальнай знаці. Паспрабуем, карыстаючыся рэтраспекцыяй, прыблізна акрэсліць межы воласці Крычава XII–XIII ст. Мяжа ішла з балота Воўчага да р. Белая Натапа, а потым ёю да Сажа. Калі лакалізаваць былое балота Воўчае паміж сучаснымі вёскамі Забалоцце і Волкаўка, то бачна, што мяжа воласці 1604 г. супадае з сучаснай мяжой паміж Мсціслаўскім і Крычаўскім раёнамі. Картаграфуючы населеныя пункты Мсціслаўскага і Крычаўскага павета XV–XVIII ст., можна заўважыць, што яны таксама падзяляюцца рэкамі Белая і Чорная Натапа. Супадзенне

накірунку мяжы паміж двума гарадскімі цэнтрамі на працягу болей чым няцісот гадоў дазваляе меркаваць, што мяжа гэта ўстаноўлена з часоў іх узнікнення, з XII ст.

За Сажом мяжа ішла па ручаю Каменнаму, які зараз не лакалізуецца, а потым выходзіла на р. Асцёр. Але як далёка воласць XII–XIII ст. прасціралася на ўсход, зараз вызначыць немагчыма з-за значных пераменаў, што адбыліся тут у XIII – першай палове XVI ст.

Падобная ж карціна назіраецца і на заходняй мяжы, дзе Крычаўскі павет суседнічаў з Магілёўскім староствам. Мяжа ў 1604 г. ішла ад вытокаў р. Воўчас, якія блізка падыходзяць да верагоднай лакалізацыі Воўчага балота, да нейкай Сены, адтуль да р. Турэі, а адтуль у Сож. Але зараз ракі з такой назвай — Турэя, альбо Тур'е, у гэтым раёне няма. Існуе ў Чэрыкаўскім раёне толькі вёска Тур'е, якая размешчана на р. Вудога, што ўпадае ў Сож, і ў XVI–XVII ст. уваходзіла ў Магілёўскае староства. Картаграфуючы населеныя пункты Магілёўскага і Крычаўскага старостваў XVI–XVII ст., нельга не заўважыць, што мяжа паміж імі праходзіла паўз р. Вудога. Магчыма, сучасная р. Вудога — гэта вядомая па крыніцах XVI–XVII ст. р. Тур'я, і мяжа, вядомая па крыніцы пачатку XVII ст., устаноўлена ў XVII–XVIII ст.

Цяжэй лакалізаваць усходнюю і паўднёвую межы Крычаўскай воласці XII–XIII ст. На ўсход ад яе знаходзіўся дакладна не лакалізаваны летапісны Зарой, вядомы па падзеях 1154 г., які, безумоўна, меў сваю воласць, памеры якой немагчыма аргументавана рэканструяваць.

Паўднёвая мяжа воласці Крычава XII—XIII ст., верагодна, праходзіла прыблізна па адміністрацыйнай мяжы паміж Алучыцкім, Лабжанскім і Ушакоўскім войтаўствамі Крычаўскага староства XVII ст., па мяжы Лабжанскага войтаўства і Прапойскага «анклава» на тэрыторыі Крычаўскага староства — вёскі Чудзінавічы (сучасная назва Чудзяны) і Савінічы.

Падставай для падобнай лакалізацыі паўднёвай мяжы Крычаўскай воласці XII—XIII ст. служыць той факт, што Алучыцкая воласць (войтаўства) была далучана да Крычаўскага староства толькі ў 1529 г.

Пасля адзінага ўпамінання горада, калі яно сапраўды адносіцца да яго, Крычаў знік са старонак пісьмовых крыніц да канца XIV ст. Якія падзеі тут адбываліся, цяжка сказаць. Нават аб тым, ці быў татарскі пагром горада, дакладна сказаць нельга.

Да сённяшняга дня ў навуцы пануе думка, што землі Беларусі пазбеглі мангола-татарскага пагрому сярэдзіны XIII ст. Смаленскае княства, у склад якога ўваходзіў Крычаў, на думку Л.В. Аляксеева, толькі ў 70-я г. XIII ст. пачало прызнаваць уладу мангола-татарскіх захопнікаў. Аднак апошнія даследаванні ў Гомелі і Магілёве, дзе археалагічна прасочаны сляды штурму і знішчэння горада татарамі, пацвярджаюць дайшоўшае паданне аб разарэнні Крычава татарамі.

Падымалісь чорны хмары,
Неба пакрывалі, –
Прыхадзілі злы татары,
Пад Крычавам сталі.
Запалілі стары Крычаў, –
Канцы запалалі.
Наш Івашка падымаўся,
Людзі ў рады сталі.
Палілася кроў, змяшалась
З чорнаю зямлёю, –
Злы татары падаліся

Уцякаць гурбою.
А Івашка гоніць, гоніць,
Голасна смяецца,
Што татарва ўцякае,
Аж хахол трасецца.

Улічваючы тое, што раён старога Крычава, які згадваецца ў паданні, ізноў пачаў засяляцца з XVII ст., а татарскія прарывы пад Крычаў у гэты час у крыніцах не фіксуюцца, можна меркаваць, што паданне адносіцца да часу папярэдняга адначасовага існавання двух паселішчаў — старога Крычава — гарадзішча Гарадзец, і новага – Замкавая гара – у другой палове XII– на мяжы XIII– XIV ст. Верагодна, у XIII ст. адбыўся набег мангола-татараў на Смаленскія зямлі, у выніку чаго быў спалены стары Крычаў. Нельга выключыць магчымасць, што гэта адбылося ў 1242 г., калі мангола-татары, вяртаючыся з Венгрыі, пайшлі на Смаленск.

Яшчэ адна цікавая інфармацыя, якую можна атрымаць з невялікага вершаванага падання і якая знаходзіць археалагічнае пацвярджэнне — гэта наяўнасць у Крычаве таго часу тапаграфічнай структуры — канцоў, пасадаў, што існавалі каля Гарадца і на Спаскай гары.

У XIII–XV ст. пісьмовыя крыніцы амаль абыходзяць увагай Крычаў. Толькі ў канцы 90-х г. XIV ст. горад аднойчы трапіў на старонкі «Спісу рускіх горадоў далёкіх і блізкіх» у ліку літоўскіх гарадоў. Як і калі Крычаў апынуўся ў складзе вялікага княства Літоўскага (далей ВКЛ) ? Хутчэй за ўсё гэта адбылося ў 1359 г., калі вялікі князь літоўскі Альгерд захапіў смаленскі фарпост на Пасожжы — Мсціслаў. Верагодна, адначасова пад уладу ВКЛ перайшлі Крычаў, Прапошаск і іншыя смаленскія воласці на Пасожжы.

На пачатку XV ст. Крычаў зноў упамінаецца ў летапісе, у сувязі з падзеямі вайны 1432–1436 гг. Акрамя таго, захавалася паданне, што ў 1410 г. Крычаў наведаў кароль Ягайла.

У ноч на 01.09.1432 г. адбыўся замах на жыццё вялікага князя Свідрыгайлы. Змоўшчыкі пасадзілі на віленскі стол брата Вітаўта Жыгімонта, а Свідрыгайла ратаваўся ўцёкамі ў Полацк. Дзяржава аказалася расколатай на дзве часткі — Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае, аб чым паведамляе летапісец: «И Литва же посадиша великого князя Жигимонта Кесьтутевичь на великое княжение на Вилни и на Троцех мес. сентября 1 день. И приде Швитригаило на Полотескь и на Смоленскъ и князи руськыи и бояре посадиша князя Швитригаила на великое княжение на Рускоe». Крычаў, разам з астатнімі ўсходнімі гарадамі і землямі, падтрымаў у гэтай барацьбе Свідрыгайлу, аб чым сведчыць яго згадванне сярод гарадоў і зямель, што знаходзіліся ў залежнасці ад апошняга ў 1432 годзе.

Вайна закончылася ў 1436 г. паразай Свідрыгайлы, на баку якога выступалі Мсціслаўскія князі Юры і Яраслаў Лугвенавічы. Яраслаў загінуў у баі пад Вількамірам, а ў збеглага ў Ноўгарад Юрыя Жыгімонт канфіскаваў княства, у якое ўваходзіў і Крычаў. Аб гэтым паведамляе Наўгародскі летапіс за 1440 г., дзе гаворыцца, што пасля смерці Жыгімонта князь Юры вяртаецца ў Літву: «... князь великыи Казимирь дал ему очину его всю, Мстиславъ и Кричевъ, иных градов и волостей не мало...». Аднак Юры вырашыў ізноў пачаць актыўную палітычную дзейнасць, на гэты раз супраць Казіміра, падтрымаўшы мяцеж у Смаленску. Распачатыя Казімірам рашучыя дзеянні па падаўленню мецяжу вы-

мусілі Юрыя збегчы ў Маскву. Верагодна, менавіта пасля гэтых неабдуманых крокаў Юрыя ў мсціслаўскіх князёў быў адабраны Крычаў і некаторыя іншыя воласці. Ва ўсялякім выпадку, пасля 1440 г. Крычаў ужо ніколі не згадваецца як уладанне мсціслаўскіх князёў. А калі і з'яўляецца на старонках пісьмовых крыніц, то толькі ў якасці самастойнай вялікакняжацкай воласці, якая кіравалася спецыяльна прызначаным намеснікам.

Болей таго, калі ў 1444 г. Юры Лугвенавіч вярнуўся на Літву, чым ён валодаў, сказаць цяжка. У 1446 г. пасля асляплення ў Маскве вялікага князя Васіля II Дзмітрыем Шамякай, на ўсходзе сучаснай Беларусі была выдзелена на некаторы час «вотчына» уцёкшаму на Літву серпухаўскаму князю Васілю Яраславічу, якому кароль Казімір даў гарады Бранск, Старадуб, Гомель і Мсціслаў. На думку М. Любаўскага, Мсціслаўскае княства было адноўлена толькі ў 1446 г., але, верагодна, ужо без некаторых валасцей: ва ўсялякім выпадку вёскі Крычаўскага павета XV ст. не згадваюцца сярод раздач мсціслаўскімі князямі. Але нельга выключыць, што вылучэнне Крычаўскай воласці са складу Мсціслаўскага княства адбылося ўжо пасля смерці апошняга мужчыны з роду Лугвенавічаў — Івана Юрьевіча, які сканаў у 1483 г.

Археалагічныя матэрыялы сведчаць, што горад на працягу XIII–XV ст. павольна, але паступова рос. У XIII ст. ўмацаваны абарончы вал на Замкавай гары, ён узняты на вышыню 3,5 м. Прычым, як адзначаў М.А. Ткачоў, на мяжы XIII–XIV ст. знішчаны драўляныя ўмацаванні замка. Прыкладна ў гэты ж час вялікі пажар, датуемы перыядам паміж 1296 г. і 1307 г., фіксуецца на дзядзінцы Мсціслава. Магчыма, абодва гэтыя адначасовыя пажарышчы адлюстроўваюць нейкі незафіксаваны ў пісьмовых крыніцах вялікі паход на Пасожскія землі Смаленскага княства.

Паступова актывізавалася жыццё на Спаскай гары, будучым Забялышынскім пасадзе: кераміка XIV–XV ст. трапляецца тут на плошчы каля 1,5 га і значна часцей, чым матэрыялы папярэдняга часу. У гэты перыяд пачаў развівацца пасад і на заходнім ад Замкавай гары плато. Пакуль яшчэ нешматлікія фрагменты керамікі гэтага часу выяўлены на даволі вузкай, шырынёй да 50 м, але даўжынёй аж 300 м, берагавой паласе. Пад канец XV ст. Крычаў усё яшчэ ўяўляў сабою невялікі гарадок на ўсходзе Вялікага княства Літоўскага.

А. А. Мяцельскі.

Археалагічныя помнікі Крычаўшчыны

Горад КРЫЧАЎ

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадзец. У паўночнай частцы горада, на левым беразе ручая Крычавец, што ўпадае ў Сож. Пляцоўка амаль трохвугольнай формы, выцягнутая па лініі поўнач – поўдзень, памерам 51x16,2 м, мае моцны нахіл з поўначы на поўдзень (да 2,5 м) і меншы – з усходу на захад. З усходу, поўдня і захаду былі схілы вышынёй 18 м над узроўнем ручая. Умацавана ровам шырынёй 16 м, глыбінёй больш за 5 м і валам з усходняга боку вышынёй

1,5–1,6 м, які неаднаразова падсыпаўся, меў на вяршыні драўляныя абарончыя збудаванні. З паўночнага боку прымыкала селішча плошчай больш за 1 га. Абследавалі ў розныя часы В.В. Сядоў, Г.В. Штыхаў, П.Ф. Лысенка, даследаваў у 1974 г. М.А. Ткачоў. Ускрыта 46 м² плошчы на гарадзішчы і 16 м² на селішчы. Культурны пласт каля вала, у паўночным і ўсходнім баку 3–3,5 м. Знойдзены крамянёвыя прылады працы і сляды агнішчаў эпохі неаліту, абломкі ляпнога посуду зарубінецкай культуры, косці жывёл, абпаленыя камяні. У раннім жалезным веку сістэму абарончых збудаванняў двойчы ўмацоўвалі, знешні схіл вала быў забрукаваны. Да X– XIII ст. адносяцца наступныя знаходкі: пацеркі-лімонкі, шклянкі, бранзалеты, жалезныя наканечнікі кап'я, наканечнікі стрэл, скоблі, нож, кераміка, у т.л. з ганчарнымі клеймамі, косці жывёлы, птушак і рыбы. У X—XI ст. гарадзішча і селішча складалі аснову старажытнага далетапіснага Крычава, які спачатку размяшчаўся тут. У канцы XI – пачатку XII ст. цэнтр горада быў перанесены на правы бераг Сажа, на старым месцы ў XII–XIV ст. існавала вялікае паселішча.

Гарадзішча. Мясцовыя назвы Замак, Замкавая гара, Нікольская гара. На правым высокім беразе р.Сож, каля сутоку з ёй ручая. Займае выступ берагавога плато плошчай больш за 0,5 га, вышыня якога над летнім межанным узроўнем вады Сажа 15 м.

Гарадзішча абследавалі ў розныя гады А.М. Ляўданскі, А.Дз. Каваленя, П.Ф. Лысенка, Л.Д. Побаль і В.В. Сядоў. Даследавалі ў 1967 г. Г.В. Штыхаў, у 1974–77гг. М.А. Ткачоў. Ускрыта 360 м² плошчы. Выяўлены фрагменты драўляных жытлаў з печамі-каменкамі і печ на каменным апечку. Пабудовы, мяркуючы па ўскрытых участках, канцэнтраваліся ўздоўж вала. У культурных напластаваннях XII– XIII ст. знойдзены разнастайны ганчарны посуд, шыферныя прасліцы, шкляныя бранзалеты і пацеркі, гліняныя грузікі, металічныя ключы, дэталі замкоў, нажы, прабоі, цуглі, наканечнікі стрэл і коп'яў, шмать касцей дзікай і свойскай жывёлы. Характэрнай асаблівасцю культурнага пласта ў стратыграфічным плане з'яўляецца тое, што гарызонт XII–XIII ст. зверху перакрыты пластом вапны таўшчынёй 7–12 см. На мяжы XI–XII ст. сюды перанесена паселішча з Гарадца. Спачатку яно было ўмацавана вастраколам, пазней насыпаны кальцавы вал вышынёй 1,5 м з сценамі зрубнай канструкцыі, якія пазней згарэлі. У XIII–XV ст. вал падсыпалі не менш 5 разоў, у XVII ст. ён быў перароблены і расшыраны.

У XVII ст. на дзядзінцы пабудаваны замак. Паводле дакументаў XVII–XVIII ст., на абарончым вале стаялі драўляныя сцены-гародні, 4 шмат'ярусныя вежы – Сярэдняя, Рагавая, Тайнічная і вежа-брама. Пад адной з іх знаходзіўся патаемны ход у бок Сажа, падворак быў заняты жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. У цэнтры замка стаяла драўляная Мікольская царква. У культурных напластаваннях XIV–XVII ст. знойдзена шмат глінянага посуду, нажы, ключы, замкі, наканечнікі стрэл, арбалетныя балты, наканечнікі коп'яў, сякерка-клявец, меч пачатку XIV ст., каменныя і чыгунныя ядры, разнастайная кафля XV–XVII ст., каменныя жорны, калекцыя манет, разнастайны інструментарый і інш.

Захаваўся вал, які дасягае з заходняга боку вышыні 3,5 м.

БАЦЬВІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАЦЬВІНАЎКА

Курганы. Могільнік-1. На паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р.Жукаўка, уздоўж чыгуначнага палатна, каля будкі пуцявога абходчыка. 7 насыпаў добрай захаванасці, вышынёй 1 м, дыяметрам 5–12 м. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Знойдзены скроневыя кольцы, шкляныя пазалочаныя пацеркі, арабскія манеты дырхемы, шыферныя прасліцы. Належаў радзімічам.

Курганы. Могільнік-2. За 0,7 км на паўднёвы захад ад могільніка-1, на правым беразе р.Жукаўка, у густым хвойніку. 32 насыпы вышынёй 0,4–2,6 м, дыяметрам 5–12 м. Вядомы з 1873 г., абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў.

ВЁСКА ВАРОДЗЬКАЎ 3

Курганны могільнік.
За 0,1 км на паўночны захад ад калгаснай фермы, на правым беразе р. Волчас, у хвойніку, абапал лясной дарогі. 33 насыпы 0,3–1,7 м, дыяметрам 5–8 м. Выявіў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ГОРКІ

Гарадзішча. За 0,4–0,5 км на захад ад вёскі, за ровам, па якім працякае ручай. Пляцоўка плошчай 0,3–0,4 га, роўная, густа зарасла лісцевымі дрэвамі. Земляныя ўмацаванні знівеліраваны, прасочваюцца толькі з заходняга і паўночна-ўсходняга бакоў. Вядома з 1873 г., абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. У шурфе ў культурным пласце 0,8–1 м знойдзена ганчарная кераміка. Адносіцца да сярэднявечча. Датуецца XIV–XVI ст. Раскопкі не праводзіліся.

Селішча. Насупраць гарадзішча, па схілах левага высокага берага р.Любавічка, прытока р. Волчас. Займае вялікі (плошча 1–1,5 га) участак калгаснага поля. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. На паверхні сабрана ганчарная кераміка.

Адносіцца да сярэднявечча. Датуецца XV—XVII ст. Раскопкі не праводзіліся.

КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОЛЧАС

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 3 км на захад ад вёскі, побач з жывёлагадоўчай фермай.

Займае мыс паміж ярам і далінай ручая, які ўпадае ў р. Волчас. Пляцоўка памерам 50х40 м была ўмацавана з боку поля 2 валамі вышынёй 4–5 м і равамі глыбінёй каля 1 м. Вядома з 1873 г., у 1983 г. абследаваў С.Я. Расадзін. Пры шурфоўцы выяўлены культурны пласт каля 1 м, знойдзена кераміка V ст. да н.э. – I ст. н.э. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур.

Селішча. За 350 м на захад ад вёскі. На левым беразе р.Волчас. Плошча каля 0,5 га. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў. На паверхні сабрана ганчарная кераміка, шлакі. Адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі і да сярэднявечча.

Курганны могільнік. За 250 м на поўнач ад вёскі, на могілках і на полі. 41 насып вышынёй ад 0,4 да 2 м, дыяметрам 4–10 м. Асобныя курганы папсаваны ямамі. Адкрыў у 1893 г. Е.Р. Раманаў, абследавалі ў 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А.Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ПАСЁЛАК КАХАНОЎ

Курганны могільнік. За 0,1 км на паўднёвы ўсход ад пасёлка, каля фермы. 11 насыпаў вышынёй 0,3–1,2 м, дыяметрам 5–8 м. Адкрыў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ПАСЁЛАК КРЫЧАЎСКІ 1-ы

Курганны могільнік. За 0,5 км на паўночны ўсход ад пасёлка, на правым беразе р.Сож, за хвойнікам. 7 насыпаў вышынёй 1–2 м, дыяметрам 6–10 м. Захаванасць добрая. Абследвалі у 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ПАКЛАДЫ

Селішча. За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі. Вядома з 1873 г., абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў. У агаленнях яра, які перарэзае селішча, культурны пласт 0,4–0,6 м (у месцы разорвання 0,2 м). У ім знойдзена ляпная і ганчарная кераміка. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і да сярэднявечча.

Могільнік. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, уздоўж высокага правага берага р. Сож. 11 насыпаў вышынёй 0,8–2,2 м, дыяметрам 6–13 м. Курганы параслі кустамі, добра захаваліся (за выключэннем 2 насыпаў на тэрыторыі малочна-таварнай фермы). Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў.

Курган. На паўночны ўсход ад вёскі, сярод поля. Вышыня 0,6 м, дыяметр 5 м. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў.

ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАШАНЫ

Курганны могільнік. За 0,6 км на паўночны захад ад вёскі. 12 насыпаў вышынёй 0,5–1,2 м, дыяметрам 4–8 м. Адкрыў у 1967 г.

Г.В. Штыхаў, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ЛАБКОВІЧЫ

Курган. За 1,3 км на ўсход ад усходняй ускраіны вёскі (былая в. Бель-3), на поплаве правага берага р. Сож. Вышыня 2,5 м, дыяметр 13 м. Вядомы з 1873 г.

ВЁСКА СТАБОРШЧЫНА

Курганны могільнік. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р.Чорная Натапа, 21 курган добрай захаванасці, вышынёю 0,4–3 м, дыяметрам 5–12 м. Абследавалі у 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

Курган. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, за бярозавым гаем, на полі. Вышыня 1,5 м, дыяметр 10 м. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў.

ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЯГОРАЎКА

Гарадзішча. За 4 км на ўсход ад вёскі, за лесам, на нізкім забалочаным поплаве левага берага р.Асцёр. Пляцоўка авальнай формы, памерам 54х28 м. З усходу і захаду захаваліся два дугападобныя валы і роў. Яшчэ адзін вал і роў знаходзіцца ў заходняй частцы, каля падножжа гарадзішча. Вышыня валоў каля 2 м, глыбіня равоў 1,6–1,8 м. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. У шурфе памерам 1х1 м прасочаны культурны пласт 0,55 м, у якім знойдзена ляпная і ганчарная кераміка,абпаленыя камяні, вугалле і косці жывёл. Адносіцца да ранняга жалезнага веку, існавала і ў час позняга сярэднявечча.

Курганны могільнік. За 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на краі калгаснага поля, 7 насыпаў вышынёю 0,9–2,1 м, дыяметрам 5–9 м. Адкрыў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Друкуецца па кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Падрыхтавала да друку З.Г. Дзямешка.

Адкуль пайшла назва горада Крычаў

Так і засталося загадкаю, адкуль у гэтыя мясціны прыкаціў князь. Адны казалі, што прыбыў ён з-пад Полацка, другія – з-пад Кіева.

Пасяліўся князь на ўтравелым сухім узгорку і жытло сваё акружыў высокім парканам з тоўстых дрэў, дбайна ачышчаных ад сучча.

Быў ён невысокага росту, каржакаваты, з цёмным нахмураным тварам і заўжды жорстка падцятымі вуснамі. Вочы выпраменьвалі халоднае калючае святло, а ад сталёва-пагрозлівага голасу ўздрыгвалі не толькі слугі, палахліва дранцвелі нават коні і сабакі. Пэўна, за гэта, а можа і за што іншае празвалі князя Ледзяным сэрцам.

У яго была адзіная дачушка Аленка, прыгожанькая дзяўчынка, надзвычай чуллівая, добрая і вясёлая. Зноў жа казалі, што сваю жонку, яе маці, князь прадаў нейкаму татарыну за мяшэчак залатых дукатаў, але пакарыстацца імі яму не прыйшлося. Пакуль Ледзяное сэрца баляваў з татарынам у палацы, пілі там заморскае пітво, закусвалі смажанай дзічынай, начальнік княжацкай аховы пасадзіў яго жонку на каня, сеў сам на другога і абодва зніклі ў невядомым кірунку, прыхапіўшы той мяшэчак з дукатамі. Пагоня, што тыдзень прачэсвала лясы, палі, балоты, вярнулася ні з чым. Таму і з'ехаў князь з тых мясцін, што пасля гэтага выпадку над ім сталі пацяшацца яго багатыя суседзі .

Праўда гэта ці не, сцвярджаць не бяромся, бо ці мала чаго могуць наплесці чужыя і зайздросныя языкі, але тое, што звон золата здымаў з князя суровую змрочнасць і запальваў сярдзітыя вочы летуценным агнём, маною не назавеш. Толькі багацце давала асалоду яго сквапнаму і ачарсцвеламу сэрцу.

Аленка, яго дачушка, моцна здружылася, употай ад князя, з кухаркіным сынам Алёшкам. Яны былі аднагодкамі. Алёшка надта любіў прыроду, ужо дзіцем умеў прадказваць па прыкметах надвор'е, ведаў шмат карысных для здароўя зёлак у лугах, лясах і балотах, збіраўся вывучаць мову звяроў і птушак. Гэтыя веды, набытыя ад бацькоў, хлопчык пачаў перадаваць Аленцы, і тая палюбіла прыроду — лугавыя і лясныя кветкі, акропленыя расой, бляск зорнага неба, святло маладзіка, узыход і заход сонца, пунсовасць вечаровай зары.

Вядома, князь пра гэта нічога не ведаў, бо Аленка і Алёшка імкнуліся не трапляць яму на вочы. Не мог ведаць князь і таго, што як прайшло іх дзяцінства, у юнацкую пару трывалае пачуццё даверу і кахання моцна з'яднала яго дачку і сына кухаркі. Яны ўжо не маглі адзін без аднаго жыць, летняя ноч, што разлучала іх, абодвум здавалася годам.

Неяк на рацэ Сож спыніўся незнаёмы карабель.Са світаю прыслужнікаў з яго выйшаў апрануты ў расшыты залатам халат і няспешна накіраваўся да княжацкага дома тоўсты мужчына з скуластым тварам і вузкімі вачмі. Ніштo яго вакол не цікавіла, позірк быў сонны, абыякавы і лянівы.

Раптам на княжацкім двары незнаёмцу на вочы трапілася Аленка з букецікам лясных красак. І што зрабілася з чалавекам? Акамянела спыніўся і ўтаропіўся ў дзяўчыну. І куды дзелася санлівасць, абыякавасць? Вочы заіскрыліся, твар разружавеўся і, здавалася, аж рукі затрымцелі.

Бы ўспышкай маланкі, апякла незнаёмца Аленка блакітам прыязных вачэй, ружовай пяшчотай шчок, свежай юнай красою. Невядома, колькі б часу аслупянела стаяў чужынец і з захапленнем глядзеў услед дзяўчыне, калі б не з'явіўся князь і не павёў яго ў пакоі.

Цэлы тыдзень прабыў незнаёмец у княжацкім двары, цэлы тыдзень яны з гаспадаром аб нечым гаварылі, то гучна, то ціхім змоўніцкім шэптам. Ніхто не ведаў пра тэму іх гамонкі, але калі князь праводзіў чужынца на карабель, то не было звычайнай пагрозлівай змрочнасці ў яго абліччы, і вяртаўся ён з праяснеламі вачамі.

— Нешта нядобрае задумаў бацька, — тужліва гаварыла Аленка Алёшку. — Бяда нас чакае, чуе мае сэрца.

— Не бойся,—супакойваў яе кухарчын сын. —Ніхто нас не пакрыўдзіць і ніхто нас не разлучыць. Бо сам Бог наканаваў нам быць разам.

Праз колькі часу на рацэ зноў з'явіўся карабель. Той самы, з чорнымі ветразямі, і хвалі неслі яго да княжацкага палаца. Сонца ўжо хілілася да захаду. Угледзеўшы карабель, князь узрадавана сказаў дачцэ:

— Ідзі апраніся ва ўсё лепшае і чакай у святліцы. Плыве твой муж, ён забярэ цябе з сабою.

Збялела Аленка і ледзь прытомнасць не згубіла. Выскачыла з пакояў і да Алёшкі заплаканая прыбегла, прашаптала:

— Мяне бацька чужынцу прадаць хоча. Бяжым адсюль хутчэй!

Пабраліся яны за рукі і да Сажа

кінуліся. Селі ў човен і на той бок рэчкі пераплываць сталі. Данеслі дваровыя пра гэта князю. Той паклікаў сваіх стражнікаў і загадаў:

— Дачку прывядзіце сюды, а таму жабраку зрабіце так, каб ён ніколі больш белага свету не ўбачыў.

Пераправіўшыся на другі бераг Сажа, Аленка з Алёшкам пусціліся да лесу. Хоць да яго было і не надта далёка, але хіба ўцячэш ад хуткіх коней?

— Хавайся, Аленка — крыкнуў Алёшка. — Я іх хоць трохі затрымаю!

Але хіба схаваешся ў невысокай лугавой траве ды рэдкім лазовым кустоўі? Стражнікі скруцілі Алёшку і выкалалі яму вочы.

Аленку князевы слугі акружылі ўжо на ўзлеску. Бездапаможна азірнулася змарнелая дзяўчына па баках і зняможана пляснулася, раскінуўшы рукі, на зямлю. І анямелі ад жаху стражнікі: там, дзе ўпала Аленка, засерабрылася хвалямі ладная азярына. Коні панюхалі ваду і пачалі трывожна адступаць назад, палахліва іржаць і спалатнелыя ад жаху княжацкія слугі панесліся прэч з лугавіны.

Цэлую ноч блукаў Алёшка і безупынна клікаў Аленку. У яго быў моцны голас, і крык, поўны болю, трывогі, адчаю і любві, разносіўся далёка. Ад яго нават прачыналіся людзі ў наблізкіх селішчах. А потым аслаб, ахрып, знясіліўся і світанкам выйшаў да азярыны. І тут на яго, аслепленага, учарнелага, выпацканага тванню нечакана дыхнула нечым цёплым, радасным і да болю знаёмым. Быццам убачыў Аленчын твар, учуў яе голас, быццам узяў яе за руку...

І не захацелася Алёшку адсюль больш нікуды ісці. Супакоены, абмыў ён вадой азёрнай знявечаны твар і... стаў на беразе дубам. Магутным, тоўстаствolым, з навіслым над вадой голлем. Прастаяў дуб некалькі стагоддзяў, потым бура скрышыла яго, упаў ён у азярыну і хвалі схавалі дуб навечна...

З таго часу людзі сталі гаварыць:

— Там, дзе нехта крычаў ноччу, я учора ўпаляваў лася.

— За мясцінай, дзе нехта крычаў, надта крыніца гаючая.

— Збудаваў я сабе хаціну якраз насупраць лугавіны, дзе нехта крычаў калісьці.

З цягам часу сталі гаварыць адным словам: Крычаў. Так, калі верыць гэтай легендзе, узнікла назва горада.

А возера тое празвалі Чорным. Глыбокае і цёмнае, яно і цяпер плешча хвалямі на ўскрайку лесу, за кіламетры ад горада.

В. Ф. Куліненка.

Героі Грунвальдскай бітвы

Пачатак XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім быў неспакойным. На ВКЛ і Польскае каралеўства пасягалі рыцары Тэўтонскага ордэна, прыкрываючы свае захопніцкія планы імем і словам Бога. У 1409 г., калі крыжакі наважыліся захапіць землі Польшчы і Вялікага княства, князь Вітаўт пайшоў на саюз з каралём Польшчы Ягайлам, што давала магчымасць выступіць разам супраць агрэсараў.

У жніўні 1409 г. рыцары-тэўтоны захапілі абоз з хлебам, пасланы з Польшчы ў Вялікае княства Літоўскае. Такое нахабства ордэнцаў паскорыла падрыхтоўку да адпору крыжакам. І ў

Мальбарку, рэзідэнцыі ордэнскага магістра Ульрыха фон Юнгінгена, таксама рыхтаваліся да баявых дзеянняў. Ордэн звярнуўся па дапамогу да феадалаў Еўропы, і калі настаў час рашучай бітвы, да рыцараў ордэна далучыліся наёмнікі — з Францыі, Нідэрландаў, Англіі, нямецкіх зямель. Юнгінген меў лепшую ў Еўропе конніцу і новую на той час зброю — артылерыю.

...Усю ноч з 14 на 15 чэрвеня 1410 г. моцная навальніца з ліўнем палыхала над вёсачкамі Грунвальд і Таненберг у Прусіі. Раніцай неба ачысцілася ад хмар, яркія промні сонца дакрануліся зямлі, зазіхацелі на рыцарскіх даспехах крыжакоў, на сякерах і косах, мячах славянскіх вояў. Так пачынаўся дзень вялікай бітвы.

Аб'яднаныя войскі саюзнікаў мелі 91 харугву — каля 40 тысяч ратнікаў. Армія крыжакоў была меншай па колькасці, аднак лепш узброенай. У 4-й і 49-й харугвах польскага войска стаялі чэшскія і мараўскія воіны на чале з Янам Жыжкам. Палякі выстраіліся насупраць войска ордэнскага палкаводца Куна фон Ліхтэнштэйна, на левым фланзе. Правы фланг прыкрывалі беларускія, украінскія, літоўскія харугвы пад камандаваннем Вітаўта. У цэнтры занялі пазіцыі тры смаленскія палкі, насупраць якіх рыхтаваліся да бою войскі маршала ордэна Фрыдрыха фон Валенрода.

Выстраенае ў тры лініі аб'яднанае войска саюзнікаў размясцілася на ўскрайку вялікага лесу, флангі ўпіраліся ў топкае балота. Такая пазіцыя пазбаўляла цяжкую конніцу крыжакоў свабоды манеўра. У цэнтры сваіх пазіцый рыцары выставілі 100 гармат.

Чакалі каманды да бою харугвы беларускіх гарадоў – Полацка, Пінска, Навагрудка, Ліды, Бярэсця, Ваўкавыска, Драгічына. Стаяў пад баявымі штандарамі і асабісты полк маладога мсціслаўскага князя Юрыя. Яго бацька, Сямён Мсціслаўскі, у гэты дзень павінен быў камандаваць трыма палкамі, набранымі на Смаленскай зямлі.

Раніца была ў разгары, а кароль Ягайла не аддаваў загаду аб наступленні. Крыжакі спрабавалі выманіць аб'яднанае войска ВКЛ і Польшчы на раўніну, дзе можна было эфектыўна выкарыстаць артылерыю і цяжкую конніцу. Фон Юнгінген паслаў выклік Ягайлу і Вітаўту.

Нарэшце харугвы ВКЛ крануліся з пазіцый і першымі рушылі на ворага. Вітаўт накіраваў на ворага лёгкую, затым цяжкую конніцу. Ульрых фон Юнгінген падмацаваў сілы крыжакоў, што змагаліся супраць харугваў ВКЛ. Пасля гэтага войска Вялікага княства, манеўруючы, адступіла, тым самым парушыўшы баявыя парадкі крыжакоў, якія захапіліся пагоняй і паплаціліся за гэта, стаўшы ахвярамі ў жорсткай сечы.

У цэнтры, дзе ў другой лініі знаходзіліся таксама войскі Вітаўта, насмерць біліся палкі Смаленскага княства. У іх шэрагах мужнасць праявілі мсціслаўцы.

Поўнасцю знішчаны ворагам адзін смаленскі полк, аднак жывыя воіны двух другіх стаялі сцяною на шляху крыжакоў. Узмацнілі націск на рыцарскія шэрагі кіеўскія і полацкія воіны, берасцейцы і гародненцы, байцы Львоўскага і Старадубскага палкоў.

...Сонца пераваліла далёка за поўдзень. Бітва, аднак, не заціхала. Месцамі кроў не паспявала ўвабрацца зямлёю. І вось пачаў слабець напор крыжакоў. Конніца Вітаўта і ўкраінскія харугвы прабіліся да вёскі Таненберг. Трапіўшыя ў акружэнне рыцары

Фрыдрыха фон Валенрода загінулі разам з маршалам у жорсткай сечы. Сам магістр ордэна фон Юнгінген з рэзервовымі палкамі кінуўся ў бой, аднак хутка і яго напаткала гібель.

Высцілаючы забітымі поле бітвы, адступілі рэшткі рыцарскіх палкоў. Нямногім крыжакам удалося збегчы, уратавацца ад мяча і палону. Каля 18 тысяч ордэнцаў загінулі, каля 14 тысяч трапілі ў палон. Вялікае княства Літоўскае страціла пад Грунвальдам амаль 20 тысяч воінаў, 15 тысяч з іх — сыны беларускай зямлі.

Героямі Грунвальдскай бітвы называлі летапісцы і гісторыкі «вецязей трох смаленскіх палкоў» і князёў Сямёна Лугвеня і яго сына Юрыя. Большасць воінаў гэтых палкоў палегла ў баі. Плакалі маці і ўдовы, сёстры і дзеці ў гарадах і вёсках Смаленскага княства: у самім Смаленску і Рослаўлі, у Мсціславе і Крычаве, у сёлах па Сажу і Дабросці. Родныя іх загінулі, але спынілі ворага, закрылі яму дарогу на поўдзень і ўсход.

М.Ф. Мельнікаў.

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

Пачатак XVI ст. – драматычны перыяд у гісторыі горада. У выніку войнаў канца XV ст. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай мяжа ВКЛ падыйшла непасрэдна да Крычава. Горад апынуўся пад пагрозай удараў маскоўскіх войск і на працягу ўсяго пачатку XVI ст. ён фігуруе ў запісах летапісцаў. Ды і ўвогуле ўся гісторыя Крычава XVI— сярэдзіны XVII ст. прапітана парахавым дымам тых шматлікіх войнаў, што не абміналі яго сцен. Нават у канцы XVII ст., у 1690 г. гетман Вялікага княства Літоўскага Казімір Сапега, адзначаючы стратэгічнае значэнне Крычаўскага замка, падкрэсліваў, што апошні пастаўлены «как от Москвы, так и от казаков около входа в государство».

Першыя звесткі аб Крычаве звязаныя менавіта з войнамі і з'яўляюцца напрыканцы XV ст. У 1496 г. з Крычава выпраўлялася 100 чалавек з сякерамі на работы па ўмацаванню памежных замкаў.

Ужо пад час вайны 1500–1503 гг. сцены горада трымалі націск варожых сіл. Так, у 1501 г., калі пад Мсціслаў падыйшло рускае войска, яму насустрач выйшаў не толькі князь мсціслаўскі Міхаіл Іванавіч, але і ваявода Юры Дашковіч з вялікакняжацкаю заставаю і жаўнерамі. Бітва закончылася перамогай рускіх, і князь Міхаіл з Юрыем Дашковічам ледзь паспелі ўскочыць у горад. Гэтае паведамленне цікава таму, што згадваемы Юры Дашковіч быў у той час Крычаўскім старастай. Верагодна, і крычаўцы прыходзілі тады на дапамогу мсціслаўцам разам са сваім дзяржаўцам. Юры Дашковіч яшчэ раз згадваецца як крычаўскі намеснік летам 1503 г. У канцы 1503 — пачатку 1504 г. ён збег у Маскву, аб чым сведчыць ліст вялікага князя і караля Аляксандра да маскоўскага князя Івана Васільевіча, датуемы вясной–летам 1504 г. У ім Аляксандр абвінавачвае Дашковіча ў здрадзе і рабаўніцтве мясцовага насельніцтва і патрабуе ад Івана Васільевіча выдачы здрадніка.

Але на абвінавачанне ў здрадзе го-

раду і дзяржаве і ў рабаўніцтве насельніцтва, якое зноў прад'явіў Дашковічу ў 1511 г. крычаўскі староста Т.І. Капуста, Ю.Дашковіч прадставіў каралю Жыгімонту Казіміравічу даравальны ліст караля Аляксандра і сказаў, што «заежчаъ съ Крычова къ Москве ни которое шкоды замъку и панъству его милости не вчинивши...», што ён быў абылганы і проста хаваўся там, баючыся гневу караля. Ад'язджаючы да Масквы, крычаўскі замак ён здаў на кіраванне Пятру Епімаховічу. Гэтае паведамленне сведчыць, што крычаўцы пад час вайны 1500–1503 гг. не здрадзілі ВКЛ, засталіся вернымі сваёй дзяржаве.

Болей таго, хоць у 1503 г. было заключана перамір'е паміж ВКЛ і Масквой, крычаўцы ўвесь час не давалі спакою памежным маскоўскім валасцям. Захаваліся скаргі рускага князя Сямёна Старадубскага, што крычаўцы і лучычане толькі пасля Вялікадня 1503 г. двойчы «имели его волости Попову Гору и Стародубские сёла..., через перемирные грамоты наших людей и грабят и бьют». Асаблівую ўвагу звяртаў бранскі намеснік князь Васіль Сямёнавіч Рапалоўскі на дзеянні крычаўскага намесніка Дашковіча, які ўварваўся ў воласць маскоўскую Прыкладні. Падобныя скаргі паўтараліся: у сярэдзіне 1507 г. князь Сямён Старадубскі скардзіўся, што «Мстиславцы и Кричевцы и Чечаряне проходили во-первое на Страстной неделе, а в другие в Юрьев день, а в третьи после Николина дня, да имали Попову Гору да Стародубские сёла...» .

Перамір'е 1503 г. толькі прыпыніла барацьбу паміж двума дзяржавамі. Ужо ў 1507 г. пры новым маскоўскім цары Васілю III і пры новым вялікім князі літоўскім і польскім каралі Жыгімонце вайна ўзнавілася. Восенню таго года баявыя дзеянні адбываліся пад Мсціславам і Крычавам. Большасць летапісаў сціпла паведамляе аб пасылцы 14.09.1507 г. Васілём III ваяводаў, князёў В.Д. Холмскага і Якава Захар'іча, да Мсціслава. Летапіс тлумачыць, што тады ж пад Мсціславам спалілі пасады. Некаторыя ўдакладненні сустракаюцца ў польскіх хроніках: так, Бернард Вапоўскі паведамляе, што войска маскоўскага князя Васіля асадзіла і спрабавала захапіць крэпасці Мсціслаў і Крычаў; даведаўшыся аб гэтым, кароль паслаў туды ваяводаў на дапамогу. Пачуўшы аб іх падыходзе, маскавіты знялі асаду і адступілі. Падобныя паведамленні захаваліся і ў рускіх крыніцах. Аб баявых дзеяннях пад Крычавам згадвае наступны эпізод летапісу: пад яго сценамі «ис пищали застрелили» маскоўскага ваяводу Міхаіла Абразцова. Відаць, крычаўцы добра абаранялiся.

Апісваючы падзеі 1508 г., крыніцы зноў вяртаюць нас пад сцены Крычава, апавядаюць пра мяцеж М. Глінскага. Летапісы паведамляюць, што горад быў ім захоплены. Аднак дэталёвы аналіз гэтай падзеі паказвае, што летапісныя паведамленні аб узяцці М. Глінскім Крычава, Турава, Оршы, Гомеля і пераходзе на яго бок князя М. Мсціслаўскага не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Горад, нягледзячы на дапамогу М. Глінскаму маскоўскіх ваяводаў, застаўся верным дзяржаве.

«Вечны мір», заключаны ў кастрычніку 1508 г., пратрымаўся ўсяго 4 гады. У 1512 г. пачалася новая вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, у якой асноўная барацьба вялася за валоданне Смаленскам. Распачаўшы штурм Смаленска, Васіль III адначасова ў 1513 г. пасылаў свае войскі пад Оршу,

ВЁСКА ВАРОДЗЬКАЎ 3

Курганны могільнік.
За 0,1 км на паўночны захад ад калгаснай фермы, на правым беразе р. Волчас, у хвойніку, абапал лясной дарогі. 33 насыпы 0,3–1,7 м, дыяметрам 5–8 м. Выявіў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ГОРКІ

Гарадзішча. За 0,4–0,5 км на захад ад вёскі, за ровам, па якім працякае ручай. Пляцоўка плошчай 0,3–0,4 га, роўная, густа зарасла лісцевымі дрэвамі. Земляныя ўмацаванні знівеліраваны, прасочваюцца толькі з заходняга і паўночна-ўсходняга бакоў. Вядома з 1873 г., абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. У шурфе ў культурным пласце 0,8–1 м знойдзена ганчарная кераміка. Адносіцца да сярэднявечча. Датуецца XIV–XVI ст. Раскопкі не праводзіліся.

Селішча. Насупраць гарадзішча, па схілах левага высокага берага р.Любавічка, прытока р. Волчас. Займае вялікі (плошча 1–1,5 га) участак калгаснага поля. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. На паверхні сабрана ганчарная кераміка.

Адносіцца да сярэднявечча. Датуецца XV—XVII ст. Раскопкі не праводзіліся.

КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОЛЧАС

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 3 км на захад ад вёскі, побач з жывёлагадоўчай фермай.

Займае мыс паміж ярам і далінай ручая, які ўпадае ў р. Волчас. Пляцоўка памерам 50х40 м была ўмацавана з боку поля 2 валамі вышынёй 4–5 м і равамі глыбінёй каля 1 м. Вядома з 1873 г., у 1983 г. абследаваў С.Я. Расадзін. Пры шурфоўцы выяўлены культурны пласт каля 1 м, знойдзена кераміка V ст. да н.э. – I ст. н.э. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур.

Селішча. За 350 м на захад ад вёскі. На левым беразе р.Волчас. Плошча каля 0,5 га. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў. На паверхні сабрана ганчарная кераміка, шлакі. Адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі і да сярэднявечча.

Курганны могільнік. За 250 м на поўнач ад вёскі, на могілках і на полі. 41 насып вышынёй ад 0,4 да 2 м, дыяметрам 4–10 м. Асобныя курганы папсаваны ямамі. Адкрыў у 1893 г. Е.Р. Раманаў, абследавалі ў 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А.Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ПАСЁЛАК КАХАНОЎ

Курганны могільнік. За 0,1 км на паўднёвы ўсход ад пасёлка, каля фермы. 11 насыпаў вышынёй 0,3–1,2 м, дыяметрам 5–8 м. Адкрыў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ПАСЁЛАК КРЫЧАЎСКІ 1-ы

Курганны могільнік. За 0,5 км на паўночны ўсход ад пасёлка, на правым беразе р.Сож, за хвойнікам. 7 насыпаў вышынёй 1–2 м, дыяметрам 6–10 м. Захаванасць добрая. Абследвалі у 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ПАКЛАДЫ

Селішча. За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі. Вядома з 1873 г., абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў. У агаленнях яра, які перарэзае селішча, культурны пласт 0,4–0,6 м (у месцы разорвання 0,2 м). У ім знойдзена ляпная і ганчарная кераміка. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і да сярэднявечча.

Могільнік. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, уздоўж высокага правага берага р. Сож. 11 насыпаў вышынёй 0,8–2,2 м, дыяметрам 6–13 м. Курганы параслі кустамі, добра захаваліся (за выключэннем 2 насыпаў на тэрыторыі малочна-таварнай фермы). Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў.

Курган. На паўночны ўсход ад вёскі, сярод поля. Вышыня 0,6 м, дыяметр 5 м. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў.

ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАШАНЫ

Курганны могільнік. За 0,6 км на паўночны захад ад вёскі. 12 насыпаў вышынёй 0,5–1,2 м, дыяметрам 4–8 м. Адкрыў у 1967 г.

Г.В. Штыхаў, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ЛАБКОВІЧЫ

Курган. За 1,3 км на ўсход ад усходняй ускраіны вёскі (былая в. Бель-3), на поплаве правага берага р. Сож. Вышыня 2,5 м, дыяметр 13 м. Вядомы з 1873 г.

ВЁСКА СТАБОРШЧЫНА

Курганны могільнік. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р.Чорная Натапа, 21 курган добрай захаванасці, вышынёю 0,4–3 м, дыяметрам 5–12 м. Абследавалі у 1972 г. Я.Р. Рыер, у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

Курган. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, за бярозавым гаем, на полі. Вышыня 1,5 м, дыяметр 10 м. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А.Ткачоў.

ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЯГОРАЎКА

Гарадзішча. За 4 км на ўсход ад вёскі, за лесам, на нізкім забалочаным поплаве левага берага р.Асцёр. Пляцоўка авальнай формы, памерам 54х28 м. З усходу і захаду захаваліся два дугападобныя валы і роў. Яшчэ адзін вал і роў знаходзіцца ў заходняй частцы, каля падножжа гарадзішча. Вышыня валоў каля 2 м, глыбіня равоў 1,6–1,8 м. Адкрыў і абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. У шурфе памерам 1х1 м прасочаны культурны пласт 0,55 м, у якім знойдзена ляпная і ганчарная кераміка,абпаленыя камяні, вугалле і косці жывёл. Адносіцца да ранняга жалезнага веку, існавала і ў час позняга сярэднявечча.

Курганны могільнік. За 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на краі калгаснага поля, 7 насыпаў вышынёю 0,9–2,1 м, дыяметрам 5–9 м. Адкрыў у 1972 г. Я.Р. Рыер, абследаваў у 1978 г. М.А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Друкуецца па кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Падрыхтавала да друку З.Г. Дзямешка.

Адкуль пайшла назва горада Крычаў

Так і засталося загадкаю, адкуль у гэтыя мясціны прыкаціў князь. Адны казалі, што прыбыў ён з-пад Полацка, другія – з-пад Кіева.

Пасяліўся князь на ўтравелым сухім узгорку і жытло сваё акружыў высокім парканам з тоўстых дрэў, дбайна ачышчаных ад сучча.

Быў ён невысокага росту, каржакаваты, з цёмным нахмураным тварам і заўжды жорстка падцятымі вуснамі. Вочы выпраменьвалі халоднае калючае святло, а ад сталёва-пагрозлівага голасу ўздрыгвалі не толькі слугі, палахліва дранцвелі нават коні і сабакі. Пэўна, за гэта, а можа і за што іншае празвалі князя Ледзяным сэрцам.

У яго была адзіная дачушка Аленка, прыгожанькая дзяўчынка, надзвычай чуллівая, добрая і вясёлая. Зноў жа казалі, што сваю жонку, яе маці, князь прадаў нейкаму татарыну за мяшэчак залатых дукатаў, але пакарыстацца імі яму не прыйшлося. Пакуль Ледзяное сэрца баляваў з татарынам у палацы, пілі там заморскае пітво, закусвалі смажанай дзічынай, начальнік княжацкай аховы пасадзіў яго жонку на каня, сеў сам на другога і абодва зніклі ў невядомым кірунку, прыхапіўшы той мяшэчак з дукатамі. Пагоня, што тыдзень прачэсвала лясы, палі, балоты, вярнулася ні з чым. Таму і з'ехаў князь з тых мясцін, што пасля гэтага выпадку над ім сталі пацяшацца яго багатыя суседзі .

Праўда гэта ці не, сцвярджаць не бяромся, бо ці мала чаго могуць наплесці чужыя і зайздросныя языкі, але тое, што звон золата здымаў з князя суровую змрочнасць і запальваў сярдзітыя вочы летуценным агнём, маною не назавеш. Толькі багацце давала асалоду яго сквапнаму і ачарсцвеламу сэрцу.

Аленка, яго дачушка, моцна здружылася, употай ад князя, з кухаркіным сынам Алёшкам. Яны былі аднагодкамі. Алёшка надта любіў прыроду, ужо дзіцем умеў прадказваць па прыкметах надвор'е, ведаў шмат карысных для здароўя зёлак у лугах, лясах і балотах, збіраўся вывучаць мову звяроў і птушак. Гэтыя веды, набытыя ад бацькоў, хлопчык пачаў перадаваць Аленцы, і тая палюбіла прыроду — лугавыя і лясныя кветкі, акропленыя расой, бляск зорнага неба, святло маладзіка, узыход і заход сонца, пунсовасць вечаровай зары.

Вядома, князь пра гэта нічога не ведаў, бо Аленка і Алёшка імкнуліся не трапляць яму на вочы. Не мог ведаць князь і таго, што як прайшло іх дзяцінства, у юнацкую пару трывалае пачуццё даверу і кахання моцна з'яднала яго дачку і сына кухаркі. Яны ўжо не маглі адзін без аднаго жыць, летняя ноч, што разлучала іх, абодвум здавалася годам.

Неяк на рацэ Сож спыніўся незнаёмы карабель.Са світаю прыслужнікаў з яго выйшаў апрануты ў расшыты залатам халат і няспешна накіраваўся да княжацкага дома тоўсты мужчына з скуластым тварам і вузкімі вачмі. Ніштo яго вакол не цікавіла, позірк быў сонны, абыякавы і лянівы.

Раптам на княжацкім двары незнаёмцу на вочы трапілася Аленка з букецікам лясных красак. І што зрабілася з чалавекам? Акамянела спыніўся і ўтаропіўся ў дзяўчыну. І куды дзелася санлівасць, абыякавасць? Вочы заіскрыліся, твар разружавеўся і, здавалася, аж рукі затрымцелі.

Бы ўспышкай маланкі, апякла незнаёмца Аленка блакітам прыязных вачэй, ружовай пяшчотай шчок, свежай юнай красою. Невядома, колькі б часу аслупянела стаяў чужынец і з захапленнем глядзеў услед дзяўчыне, калі б не з'явіўся князь і не павёў яго ў пакоі.

Цэлы тыдзень прабыў незнаёмец у княжацкім двары, цэлы тыдзень яны з гаспадаром аб нечым гаварылі, то гучна, то ціхім змоўніцкім шэптам. Ніхто не ведаў пра тэму іх гамонкі, але калі князь праводзіў чужынца на карабель, то не было звычайнай пагрозлівай змрочнасці ў яго абліччы, і вяртаўся ён з праяснеламі вачамі.

— Нешта нядобрае задумаў бацька, — тужліва гаварыла Аленка Алёшку. — Бяда нас чакае, чуе мае сэрца.

— Не бойся,—супакойваў яе кухарчын сын. —Ніхто нас не пакрыўдзіць і ніхто нас не разлучыць. Бо сам Бог наканаваў нам быць разам.

Праз колькі часу на рацэ зноў з'явіўся карабель. Той самы, з чорнымі ветразямі, і хвалі неслі яго да княжацкага палаца. Сонца ўжо хілілася да захаду. Угледзеўшы карабель, князь узрадавана сказаў дачцэ:

— Ідзі апраніся ва ўсё лепшае і чакай у святліцы. Плыве твой муж, ён забярэ цябе з сабою.

Збялела Аленка і ледзь прытомнасць не згубіла. Выскачыла з пакояў і да Алёшкі заплаканая прыбегла, прашаптала:

— Мяне бацька чужынцу прадаць хоча. Бяжым адсюль хутчэй!

Пабраліся яны за рукі і да Сажа

кінуліся. Селі ў човен і на той бок рэчкі пераплываць сталі. Данеслі дваровыя пра гэта князю. Той паклікаў сваіх стражнікаў і загадаў:

— Дачку прывядзіце сюды, а таму жабраку зрабіце так, каб ён ніколі больш белага свету не ўбачыў.

Пераправіўшыся на другі бераг Сажа, Аленка з Алёшкам пусціліся да лесу. Хоць да яго было і не надта далёка, але хіба ўцячэш ад хуткіх коней?

— Хавайся, Аленка — крыкнуў Алёшка. — Я іх хоць трохі затрымаю!

Але хіба схаваешся ў невысокай лугавой траве ды рэдкім лазовым кустоўі? Стражнікі скруцілі Алёшку і выкалалі яму вочы.

Аленку князевы слугі акружылі ўжо на ўзлеску. Бездапаможна азірнулася змарнелая дзяўчына па баках і зняможана пляснулася, раскінуўшы рукі, на зямлю. І анямелі ад жаху стражнікі: там, дзе ўпала Аленка, засерабрылася хвалямі ладная азярына. Коні панюхалі ваду і пачалі трывожна адступаць назад, палахліва іржаць і спалатнелыя ад жаху княжацкія слугі панесліся прэч з лугавіны.

Цэлую ноч блукаў Алёшка і безупынна клікаў Аленку. У яго быў моцны голас, і крык, поўны болю, трывогі, адчаю і любві, разносіўся далёка. Ад яго нават прачыналіся людзі ў наблізкіх селішчах. А потым аслаб, ахрып, знясіліўся і світанкам выйшаў да азярыны. І тут на яго, аслепленага, учарнелага, выпацканага тванню нечакана дыхнула нечым цёплым, радасным і да болю знаёмым. Быццам убачыў Аленчын твар, учуў яе голас, быццам узяў яе за руку...

І не захацелася Алёшку адсюль больш нікуды ісці. Супакоены, абмыў ён вадой азёрнай знявечаны твар і... стаў на беразе дубам. Магутным, тоўстаствolым, з навіслым над вадой голлем. Прастаяў дуб некалькі стагоддзяў, потым бура скрышыла яго, упаў ён у азярыну і хвалі схавалі дуб навечна...

З таго часу людзі сталі гаварыць:

— Там, дзе нехта крычаў ноччу, я учора ўпаляваў лася.

— За мясцінай, дзе нехта крычаў, надта крыніца гаючая.

— Збудаваў я сабе хаціну якраз насупраць лугавіны, дзе нехта крычаў калісьці.

З цягам часу сталі гаварыць адным словам: Крычаў. Так, калі верыць гэтай легендзе, узнікла назва горада.

А возера тое празвалі Чорным. Глыбокае і цёмнае, яно і цяпер плешча хвалямі на ўскрайку лесу, за кіламетры ад горада.

В. Ф. Куліненка.

Героі Грунвальдскай бітвы

Пачатак XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім быў неспакойным. На ВКЛ і Польскае каралеўства пасягалі рыцары Тэўтонскага ордэна, прыкрываючы свае захопніцкія планы імем і словам Бога. У 1409 г., калі крыжакі наважыліся захапіць землі Польшчы і Вялікага княства, князь Вітаўт пайшоў на саюз з каралём Польшчы Ягайлам, што давала магчымасць выступіць разам супраць агрэсараў.

У жніўні 1409 г. рыцары-тэўтоны захапілі абоз з хлебам, пасланы з Польшчы ў Вялікае княства Літоўскае. Такое нахабства ордэнцаў паскорыла падрыхтоўку да адпору крыжакам. І ў

Мальбарку, рэзідэнцыі ордэнскага магістра Ульрыха фон Юнгінгена, таксама рыхтаваліся да баявых дзеянняў. Ордэн звярнуўся па дапамогу да феадалаў Еўропы, і калі настаў час рашучай бітвы, да рыцараў ордэна далучыліся наёмнікі — з Францыі, Нідэрландаў, Англіі, нямецкіх зямель. Юнгінген меў лепшую ў Еўропе конніцу і новую на той час зброю — артылерыю.

...Усю ноч з 14 на 15 чэрвеня 1410 г. моцная навальніца з ліўнем палыхала над вёсачкамі Грунвальд і Таненберг у Прусіі. Раніцай неба ачысцілася ад хмар, яркія промні сонца дакрануліся зямлі, зазіхацелі на рыцарскіх даспехах крыжакоў, на сякерах і косах, мячах славянскіх вояў. Так пачынаўся дзень вялікай бітвы.

Аб'яднаныя войскі саюзнікаў мелі 91 харугву — каля 40 тысяч ратнікаў. Армія крыжакоў была меншай па колькасці, аднак лепш узброенай. У 4-й і 49-й харугвах польскага войска стаялі чэшскія і мараўскія воіны на чале з Янам Жыжкам. Палякі выстраіліся насупраць войска ордэнскага палкаводца Куна фон Ліхтэнштэйна, на левым фланзе. Правы фланг прыкрывалі беларускія, украінскія, літоўскія харугвы пад камандаваннем Вітаўта. У цэнтры занялі пазіцыі тры смаленскія палкі, насупраць якіх рыхтаваліся да бою войскі маршала ордэна Фрыдрыха фон Валенрода.

Выстраенае ў тры лініі аб'яднанае войска саюзнікаў размясцілася на ўскрайку вялікага лесу, флангі ўпіраліся ў топкае балота. Такая пазіцыя пазбаўляла цяжкую конніцу крыжакоў свабоды манеўра. У цэнтры сваіх пазіцый рыцары выставілі 100 гармат.

Чакалі каманды да бою харугвы беларускіх гарадоў – Полацка, Пінска, Навагрудка, Ліды, Бярэсця, Ваўкавыска, Драгічына. Стаяў пад баявымі штандарамі і асабісты полк маладога мсціслаўскага князя Юрыя. Яго бацька, Сямён Мсціслаўскі, у гэты дзень павінен быў камандаваць трыма палкамі, набранымі на Смаленскай зямлі.

Раніца была ў разгары, а кароль Ягайла не аддаваў загаду аб наступленні. Крыжакі спрабавалі выманіць аб'яднанае войска ВКЛ і Польшчы на раўніну, дзе можна было эфектыўна выкарыстаць артылерыю і цяжкую конніцу. Фон Юнгінген паслаў выклік Ягайлу і Вітаўту.

Нарэшце харугвы ВКЛ крануліся з пазіцый і першымі рушылі на ворага. Вітаўт накіраваў на ворага лёгкую, затым цяжкую конніцу. Ульрых фон Юнгінген падмацаваў сілы крыжакоў, што змагаліся супраць харугваў ВКЛ. Пасля гэтага войска Вялікага княства, манеўруючы, адступіла, тым самым парушыўшы баявыя парадкі крыжакоў, якія захапіліся пагоняй і паплаціліся за гэта, стаўшы ахвярамі ў жорсткай сечы.

У цэнтры, дзе ў другой лініі знаходзіліся таксама войскі Вітаўта, насмерць біліся палкі Смаленскага княства. У іх шэрагах мужнасць праявілі мсціслаўцы.

Поўнасцю знішчаны ворагам адзін смаленскі полк, аднак жывыя воіны двух другіх стаялі сцяною на шляху крыжакоў. Узмацнілі націск на рыцарскія шэрагі кіеўскія і полацкія воіны, берасцейцы і гародненцы, байцы Львоўскага і Старадубскага палкоў.

...Сонца пераваліла далёка за поўдзень. Бітва, аднак, не заціхала. Месцамі кроў не паспявала ўвабрацца зямлёю. І вось пачаў слабець напор крыжакоў. Конніца Вітаўта і ўкраінскія харугвы прабіліся да вёскі Таненберг. Трапіўшыя ў акружэнне рыцары

Фрыдрыха фон Валенрода загінулі разам з маршалам у жорсткай сечы. Сам магістр ордэна фон Юнгінген з рэзервовымі палкамі кінуўся ў бой, аднак хутка і яго напаткала гібель.

Высцілаючы забітымі поле бітвы, адступілі рэшткі рыцарскіх палкоў. Нямногім крыжакам удалося збегчы, уратавацца ад мяча і палону. Каля 18 тысяч ордэнцаў загінулі, каля 14 тысяч трапілі ў палон. Вялікае княства Літоўскае страціла пад Грунвальдам амаль 20 тысяч воінаў, 15 тысяч з іх — сыны беларускай зямлі.

Героямі Грунвальдскай бітвы называлі летапісцы і гісторыкі «вецязей трох смаленскіх палкоў» і князёў Сямёна Лугвеня і яго сына Юрыя. Большасць воінаў гэтых палкоў палегла ў баі. Плакалі маці і ўдовы, сёстры і дзеці ў гарадах і вёсках Смаленскага княства: у самім Смаленску і Рослаўлі, у Мсціславе і Крычаве, у сёлах па Сажу і Дабросці. Родныя іх загінулі, але спынілі ворага, закрылі яму дарогу на поўдзень і ўсход.

М.Ф. Мельнікаў.

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

Пачатак XVI ст. – драматычны перыяд у гісторыі горада. У выніку войнаў канца XV ст. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай мяжа ВКЛ падыйшла непасрэдна да Крычава. Горад апынуўся пад пагрозай удараў маскоўскіх войск і на працягу ўсяго пачатку XVI ст. ён фігуруе ў запісах летапісцаў. Ды і ўвогуле ўся гісторыя Крычава XVI— сярэдзіны XVII ст. прапітана парахавым дымам тых шматлікіх войнаў, што не абміналі яго сцен. Нават у канцы XVII ст., у 1690 г. гетман Вялікага княства Літоўскага Казімір Сапега, адзначаючы стратэгічнае значэнне Крычаўскага замка, падкрэсліваў, што апошні пастаўлены «как от Москвы, так и от казаков около входа в государство».

Першыя звесткі аб Крычаве звязаныя менавіта з войнамі і з'яўляюцца напрыканцы XV ст. У 1496 г. з Крычава выпраўлялася 100 чалавек з сякерамі на работы па ўмацаванню памежных замкаў.

Ужо пад час вайны 1500–1503 гг. сцены горада трымалі націск варожых сіл. Так, у 1501 г., калі пад Мсціслаў падыйшло рускае войска, яму насустрач выйшаў не толькі князь мсціслаўскі Міхаіл Іванавіч, але і ваявода Юры Дашковіч з вялікакняжацкаю заставаю і жаўнерамі. Бітва закончылася перамогай рускіх, і князь Міхаіл з Юрыем Дашковічам ледзь паспелі ўскочыць у горад. Гэтае паведамленне цікава таму, што згадваемы Юры Дашковіч быў у той час Крычаўскім старастай. Верагодна, і крычаўцы прыходзілі тады на дапамогу мсціслаўцам разам са сваім дзяржаўцам. Юры Дашковіч яшчэ раз згадваецца як крычаўскі намеснік летам 1503 г. У канцы 1503 — пачатку 1504 г. ён збег у Маскву, аб чым сведчыць ліст вялікага князя і караля Аляксандра да маскоўскага князя Івана Васільевіча, датуемы вясной–летам 1504 г. У ім Аляксандр абвінавачвае Дашковіча ў здрадзе і рабаўніцтве мясцовага насельніцтва і патрабуе ад Івана Васільевіча выдачы здрадніка.

Але на абвінавачанне ў здрадзе го-

раду і дзяржаве і ў рабаўніцтве насельніцтва, якое зноў прад'явіў Дашковічу ў 1511 г. крычаўскі староста Т.І. Капуста, Ю.Дашковіч прадставіў каралю Жыгімонту Казіміравічу даравальны ліст караля Аляксандра і сказаў, што «заежчаъ съ Крычова къ Москве ни которое шкоды замъку и панъству его милости не вчинивши...», што ён быў абылганы і проста хаваўся там, баючыся гневу караля. Ад'язджаючы да Масквы, крычаўскі замак ён здаў на кіраванне Пятру Епімаховічу. Гэтае паведамленне сведчыць, што крычаўцы пад час вайны 1500–1503 гг. не здрадзілі ВКЛ, засталіся вернымі сваёй дзяржаве.

Болей таго, хоць у 1503 г. было заключана перамір'е паміж ВКЛ і Масквой, крычаўцы ўвесь час не давалі спакою памежным маскоўскім валасцям. Захаваліся скаргі рускага князя Сямёна Старадубскага, што крычаўцы і лучычане толькі пасля Вялікадня 1503 г. двойчы «имели его волости Попову Гору и Стародубские сёла..., через перемирные грамоты наших людей и грабят и бьют». Асаблівую ўвагу звяртаў бранскі намеснік князь Васіль Сямёнавіч Рапалоўскі на дзеянні крычаўскага намесніка Дашковіча, які ўварваўся ў воласць маскоўскую Прыкладні. Падобныя скаргі паўтараліся: у сярэдзіне 1507 г. князь Сямён Старадубскі скардзіўся, што «Мстиславцы и Кричевцы и Чечаряне проходили во-первое на Страстной неделе, а в другие в Юрьев день, а в третьи после Николина дня, да имали Попову Гору да Стародубские сёла...» .

Перамір'е 1503 г. толькі прыпыніла барацьбу паміж двума дзяржавамі. Ужо ў 1507 г. пры новым маскоўскім цары Васілю III і пры новым вялікім князі літоўскім і польскім каралі Жыгімонце вайна ўзнавілася. Восенню таго года баявыя дзеянні адбываліся пад Мсціславам і Крычавам. Большасць летапісаў сціпла паведамляе аб пасылцы 14.09.1507 г. Васілём III ваяводаў, князёў В.Д. Холмскага і Якава Захар'іча, да Мсціслава. Летапіс тлумачыць, што тады ж пад Мсціславам спалілі пасады. Некаторыя ўдакладненні сустракаюцца ў польскіх хроніках: так, Бернард Вапоўскі паведамляе, што войска маскоўскага князя Васіля асадзіла і спрабавала захапіць крэпасці Мсціслаў і Крычаў; даведаўшыся аб гэтым, кароль паслаў туды ваяводаў на дапамогу. Пачуўшы аб іх падыходзе, маскавіты знялі асаду і адступілі. Падобныя паведамленні захаваліся і ў рускіх крыніцах. Аб баявых дзеяннях пад Крычавам згадвае наступны эпізод летапісу: пад яго сценамі «ис пищали застрелили» маскоўскага ваяводу Міхаіла Абразцова. Відаць, крычаўцы добра абаранялiся.

Апісваючы падзеі 1508 г., крыніцы зноў вяртаюць нас пад сцены Крычава, апавядаюць пра мяцеж М. Глінскага. Летапісы паведамляюць, што горад быў ім захоплены. Аднак дэталёвы аналіз гэтай падзеі паказвае, што летапісныя паведамленні аб узяцці М. Глінскім Крычава, Турава, Оршы, Гомеля і пераходзе на яго бок князя М. Мсціслаўскага не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Горад, нягледзячы на дапамогу М. Глінскаму маскоўскіх ваяводаў, застаўся верным дзяржаве.

«Вечны мір», заключаны ў кастрычніку 1508 г., пратрымаўся ўсяго 4 гады. У 1512 г. пачалася новая вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, у якой асноўная барацьба вялася за валоданне Смаленскам. Распачаўшы штурм Смаленска, Васіль III адначасова ў 1513 г. пасылаў свае войскі пад Оршу,

Мсціслаў, Крычаў, Менск, Друцк. Аднак, як пад Смаленскам, так і пад іншымі гарадамі, ён не дабіўся жаданай перамогі.

Кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт удзяляў значную ўвагу арганізацыі абароны ўсходніх гарадоў і своечасовай падвозцы зброі, іншай вайсковай амуніцыі. На пачатку 1514 г. ў Крычаў дадаткова было прыслана ўзбраенне і за наём жаўнераў крычаўскаму дзяржаўцу была зроблена выплата: «...пану Юрью Немировичу на Крычовъ дано бочечка пороху ваги полтретя каменя... А на Крычовъ пану Ю. Немировичу даль есми 10 гаковниц». У 1519 г. ў Крычаве мелася 11 вялікіх гармат, 7 з якіх былі трафейныя «московские». У цэйхгаузе мелася таксама 33 гакаўніцы, 12 рушніц, 3 фуглірыкі, 7 дзежак пораху маскоўскага, 2 поўныя дзежкі старога пораху і 2 напоўныя дзежкі з порахам, «граховницы» з ключом і тры «гевары». У цяжкія для абароны Крычаўскага замка часы сюды прывозілі гарматы суседніх замкаў, у прыватнасці з Магілёва. У час вайны тут размяшчаліся значныя вайсковыя сілы.

У апошнія дні ліпеня 1514 г., пасля трэцяга штурму Смаленска, здзейснілася мара Васіля III – горад адышоў да Масквы. У сваю чаргу, гэта выклікала пераход памежных гарадоў пад уладу маскоўскага князя. Прычына была ў тым, што з далучэннем Смаленска да Масквы Падняпроўскія воласці ВКЛ засталіся без прыкрыцця. Ужо 7 жніўня Васіль III пасылаў ваяводаў М.Д. Шчанятава і І.М. Варатынскага на Мсціслаў. Тут нават не паспрабавалі арганізаваць абарону горада, а сустрэлі маскоўскіх ваяводаў, і мсціслаўскі дзяржаўца «бил им челом, чтобы государь ... взял его к себе на службу», што было выклікана наступным: «бояре его и люди мстиславскии ему в обороне помочни быть не хотели».

За Мсціславам пацягнуліся і іншыя гарады. 13 жніўня «мяшчане і чорныя людзі» Крычава і Дуброўны прыслалі ў Смаленск да Васіля III пасольства і прынеслі яму прысягу на вернасць: «И князь великий ихъ пожаловалъ, взялъ ихь въ свое имя и въ крестное целование велел ихъ привести». Але падзеі 1514 г. нельга разглядаць як здраду гарадоў ВКЛ. Іх прысяга на вернасць маскоўскаму ўладару была выклікана падзеннем Смаленска — цэнтра арганізацыі абароны ўсяго Падняпроўя. Да таго ж, пасля захопу Смаленска вызваляліся дадатковыя маскоўскія войскі, якім малыя гарады не маглі самастойна супрацьстаяць.

Пад уладай Масквы Крычаў заставаўся нядоўга. Не прайшоў і месяц, як 8.09.1514 г. маскоўскае войска было разбіта пад Оршай. Адразу ж Мсціслаў, Дуброўна і Крычаў вярнуліся пад уладу ВКЛ. Такія паводзіны гарадоў гавораць аб тым, што ўсе яны, наколькі гэта было магчыма, захоўвалі адданасць сваёй дзяржаве — Вялікаму княству Літоўскаму. Перад буйнымі сіламі праціўніка гараджане капітулявалі дзеля таго, каб захаваць сваё жыццё, але пры першай жа магчымасці вярталіся ў Вялікае княства.

Падзеі 1513–1514 гг., паходы маскоўскіх ваяводаў пад Крычаў не маглі не адбіцца на стане воласці. Яна была разрабавана і мяшчане і жыхары воласці адмовіліся выплочваць троцкаму цівуну штогадовую даніну — 10 рублёў «дубасных пенязей», спасылаючыся на «лист господарский», які вызваляў іх ад гэтага з-за значнага разарэння воласці. Пасля кампаніі 1514 г. вайна працягвалася да 1522 г., але аб

падзеях пад Крычавам нічога не паведамляецца. Толькі асобныя рускія крыніцы адзначылі паход 1515 г. пад Мсціслаў.

Вайна закончылася. Адзіным прыбыткам гэтай 10-гадовай вайны для Масквы стаў Смаленск. Нягледзячы на заключэнне перамір'я ў 1522 г., мяжа не стала мірнай. На працягу 20-х гг. XVI ст. крыніцы неаднойчы фіксуюць скаргі рускіх паслоў аб нападзе крычаўцаў на рускія землі і наадварот.

Пасля смерці маскоўскага князя Васіля III, у 1534 г. палыхнула новая вайна паміж Масквой і Вільняй. Крычаў быў адной з баз літоўскіх войск. Тут, акрамя мясцовых пушкароў, размяшчалася 200 коннікаў і 200 драбаў ротмістра Пясецкага. Але падзеі 1535 г. перанеслі вайну пад сцены Крычаўскага замка. Маскоўскія крыніцы адзначаюць у гэты год паходы ў студзені і летам пад Мсціслаў, Крычаў, Магілёў і іншыя гарады, адзначаючы, што «остроги имели, посады жгли и людей многих побили и живых имали». Верагодна, і крычаўскія пасады пацярпелі пад час гэтага паходу.

Увогуле, вайна паказала пэўную раўнавагу сіл. Хаця Вялікае Літоўскае княства і адваявала Гомель, вярнуць Смаленск яно не змагло. Больш таго, узніклі пэўныя праблемы з Лучыцкай воласцю Крычаўскага староства (сучасны Касцюковіцкі раён, частка Хоцімскага, усходняя частка Краснапольскага раёнаў). Некаторыя землі, разам з іншымі валасцямі, былі захоплены Масквой яшчэ пад час войнаў 1500–1503,1507–1508, 1512–1522 гг. На перамовах, што ішлі паміж Масквой і Вільняй у другой палове 20-х —пачатку 30-х гг. XVI ст., ніводзін з бакоў не збіраўся саступаць частку Лучыцкай воласці, і кожны бок прэтэндаваў на ўсю яе тэрыторыю. Нарэшце ў 1533 г. кароль Жыгімонт Стары пайшоў на сілавое вырашэнне гэтай праблемы. Па яго загаду крычаўскі дзяржаўца Чыж пачаў прыводзіць жыхароў Лучыцкай воласці да прысягі Вялікаму княству Літоўскаму і арыштаваў прызначаную там Масквою адміністрацыю.

Пад час мірных перамоў 1535 г. маскоўскія баяры ўзнялі гэтае пытанне. Жадаючы пакончыць з гэтай праблемай, літоўскія паслы прапанавалі перадачу Маскоўскаму княству за гэтыя землі горада Завалочча з валасцямі Няведра і Істцо, але першапачаткова баяры адмаўлялі іх прапановы, кажучы: «никакож государю нашаму тех волостей и сёл не поступитися, а королёвы ему волости в тех волостях место к Заволочью ненадобно». Але праз некаторы час яны пайшлі на размен: за Себеж, Завалочча і прыпісаную да Завалочча воласць Долыскую пагадзіліся прызнаць пераход пад уладу Літвы Гомія з воласцю і не пералічаных у грамаце нейкіх крычаўскіх і чачэрскіх сёл. У той жа час маскоўскія баяры адмаўляліся запісваць у якінебудзь бок Лучыцкую воласць, сцвярджаючы, што Літва трымае яе сілай. Але, нягледзячы на гэтае нявырашанае пытанне, перамір'е было заключана, Лучыцкая воласць засталася ў складзе Крычаўскага староства.

Вайна 1534–1535 гг. была апошняй паміж Масквой і Вільняй у першай палове XVI ст. Але на мяжы працягваліся сутычкі. Ад гэтага цярпелі памежныя воласці. У 1550 г. маскоўскі цар Іван Жахлівы папракаў Жыгімонта Аўгуста ў тым , што «кричевские казаки Олтушко Кривой с товарищи приходил в стародубский уезд в Тарасову деревню Верёвкина сына Цвиленва в Онкушино, да взяли из стада 4 коней

да 7 меринов; а цена конем и мерином 50 рублёв, да свели с собою чоловека его безвестно. Да литовские же казаки из Пропойска да из Кричева приходили в Стародубский уезд в Попову Гору да сёла и деревни разбивали и многие животы и статки поимали: и на том разбое поимали казака Янка Дмитрова и тот Янка сказывал, что их посылают воевати кричевские и пропойские и чечерские воеводы, а что ни добудут, и они с нами тою добычей делятся».

Перамір'е, якое цягнулася каля 20 гадоў, у 1562 г. скончылася. Пачалася Лівонская вайна. Ужо ў 1562 г. гарачы подых баявых дзеянняў апаліў наваколлі Крычава. Летам гэтага года маскоўскі ваявода Пётр Сямёнавіч Сярэбраны паліў Мсціслаў. Са Старадуба Рыгор Мяшчэрскі ваяваў Магілёў, Чачэрск і Прапойск. Першапачаткова гэтая вайна пачалася няўдала для ВКЛ — ужо ў 1563 г. Масква захапіла Полацк. У лістападзе 1563 г. пачаліся першыя перамовы аб перамір'і, пад час якіх Іван Жахлівы запатрабаваў перадаць яму ўсе землі Вялікага княства Літоўскага, размешчаныя на ўсход ад р. Бярэзіны, у тым ліку і Крычаў. Становішча ВКЛ у гэты перыяд было такім цяжкім, што пад час перамоў, каб не было якіх-небудзь новых зачэпак для маскоўскіх баяр, кароль Жыгімонт Аўгуст загадаў крычаўскаму старасце Андрэю Багданавічу Шалухе, каб той «за границу в землю Московскую сам не ходил и слугам своим и подданым и козаком нашим ходити не казал и никоторых шкод и зачепок чинити не велел». Адначасова Андрэю Шалухе даваўся загад набіраць людзей у войска, прычым запрашаліся за добрую плату як вольнанаёмныя, так і давалася разнарадка — з воласці «з десяти служб одного чоловека», мяшчанам горада – «з девяти чоловеков десятого выправити».

Прапанаваныя Масквой умовы былі непрыймальнымі для ВКЛ, і вайна разгарэлася з новай сілай. У студзені 1564 г. маскоўскі ваявода П.С. Сярэбраны заваяваў Магілёў, Радамль, Мсціслаў, Крычаў, « и королевские сёла и деревни жгли и в посылках во многих заставы Литовских людей побивали и языки имали и в полон многих людей з животы поимали». У ліпені–жніўні 1564 г. адбыўся новы паход маскоўскіх войск на землі ўсходняй Беларусі: «Того ж лета, июля в 25 день, ходил из Смоленска в Литовскую землю ко Мстиславлю воево-

Залаты ўгорскі дукат XV ст. з Крычава.

да Василий Ондреевич Бутурлин з детьми боярскими и с Татары служилыми и с Казанскими и с горными и с Чебоксарскими и с Мордвою, а воевали Мстиславские места и Кричевские и Радомльские и Могилёвские и многих людей побили и в полон взяли воинских людей, шляхтич, и з жонами и з детьми,и чорных людей всяких 4787 душ».

У сваю чаргу, жыхары памежных раёнаў Літоўскага княства адказвалі на маскоўскія напады сваімі набегамі на рускія землі. У 1565 г. «...Литовские же люди приходили Июня в 10 день в Ивановский стан, Мстиславцы и Кричевцы, в головах Мстиславский хорунжий и иные ротмистры, а с ними 1200 чоловек...». Праўда, гэты нападскончыўся для крычаўцаў і мсціслаўцаў паразай.

Нарэшце ў 1566 г. бакі зноў селі за стол перамоў. Але, як і раней, патрабаванні Масквы перадаць ёй усе землі да р. Бярэзіны, у тым ліку і Крычаў, былі непрыймальнымі для Вільні. Толькі праз год маскоўскія паслы прывезлі новыя прапановы, у якіх яны адмаўляліся ад некаторых прэтэнзій і прапанавалі на Падняпроўі правесці старыя рубяжы, па якіх Крычаў заставаўся за Вялікім княствам Літоўскім. На гэтых умовах было заключана перамір'е тэрмінам на 7 год.

У 1569 г. была заключана Люблінская унія паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польскай каронай, у выніку чаго нарадзілася новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Гэта падзея ўзмацніла сілы ВКЛ у барацьбе з Масквой, і хаця баявыя дзеянні не вяліся, дыпламатычныя перамовы працягваліся ўвесь час. Нягледзячы на дасягнутае перамір'е, мірнае пагадненне ніяк не ўдавалася заключыць з-за патрабаванння Масквы прызнаць яе права на захопленыя землі і на ўсе землі, размешчаныя на ўсход ад Бярэзіны. Іван Жахлівы абгрунтоўваў свае правы на гэтыя землі на той падставе, што калісьці гэта былі воласці Кіеўскай Русі, праваперaемнікам якой ён сябе бачыў. Паміж дзяржавамі па гэтых пытаннях вялася даволі інтэнсіўная перапіска, з якой можна даведацца, што ў свой час Крычавам валодаў збеглы з Масквы князь Андрэй Курбскі.

Пасля выбрання каралём Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя ваенныя дзеянні распачаліся з новай сілай і поспех быў на баку Рэчы Паспалітай. Аслабленая шматгадовай вайной і апрычнінай Масква сама шукала міру. У 1582 г. вайна скончылася Ям-Запольскім перамір'ем. У выніку Масква за шматгадовую вайну не змагла дабіцца пастаўленых мэтаў, а Крычаў застаўся за Рэччу Паспалітай.

Як і ў кожным сярэдневяковым замку, у Крычаўскім меліся пушкары — прадстаўнікі вайскова-служылага насельніцтва. Дзяржаўную службу яны неслі на пэўных умовах. У XVI ст. іх налічвалася 5. Як сведчаць крыніцы XVI–XVII ст., гэта былі ў асноўным прадстаўнікі двух крычаўскіх радоў — Карпачоў і Герчыкаў. У пацвярджальных граматах Стафана Баторыя, датаваных 1586 г., згадваюцца Мітка Іванавіч Карпач, Цішка Іванавіч Карпач, Федка Карпач, Іван Герчык і Сямён Іванавіч Карпач. Згадваюцца таксама Лех Кандратавіч Бочка, Васіль Шульга, Марцін Ісакавіч Шульга, Лявон Гаўрылавіч Азяровіч і Пархвен Карабан, меўшыя за спадчыну пушкарскую справу. «Спадчыннасць» пушкарскай службы добра адлюстроўвае чалабітная Івана Герчыка каралю Стафану Баторыю за 1586 г., аўтар

якой «про зошлые лета и старости досыть чинити не могучи», прасіў гаспадара, «абы-хмо сына его Семёна при этой службе нашой пушкарской захававши и земли от продков наших на тую службу ему наданыя» захаваў. Як сведчаць пісьмовыя крыніцы, «пушкары от давних часов на той службе пушкарское будучи, завжды ее пристойне и верне пильновали». Як і ў іншых гаспадарскіх замках, крычаўскія пушкары штогод атрымлівалі плату па 5 грошаў «лічбы литовское». Паводле інвентароў горада пачатку XVIII ст., у мірныя часы яны былі абавязаны даваць на патрэбы замка 120 фунтаў пораху, даглядаць і рамантаваць агнястрэльную зброю, а ў выніку ваеннай небяспекі з'яўляцца ў замак і быць гатовымі яго абараняць. Акрамя гэтых павіннасцей, крычаўскія пушкары «никаторое иншое дани и повинности... господаруи ниякіх пошлин и служб вряду... Кричовскому давати, чинити не повинны.» Між тым, на практыцы пушкароў, у выпадку ваенных дзеянняў за межамі замка, маглі прыцягваць і мабілізоўваць для нясення пушкарскай службы ў войску. Так, напрыклад, у 1610 г., у час паходу Жыгімонта III на Смаленск, у крычаўскіх пушкароў купілі порах, двое з іх прымалі ўдзел у вайсковым паходзе, атрымоўваючы за службу па 6 злотых у месяц.

Крычаўскія замкавыя пушкары за сваю «верную зычливую и пильную службу при той фортеции и на потребу Отчизне своей» неаднаразова атрымлівалі прывілеі і вызваляліся ад нясення розных павіннасцей, кантрыбуцый і вайсковых пастояў.

Усе прывілеі, якія даваліся крычаўскім пушкарам, каралі Стафан Баторый, Жыгізмонт III, Уладзіслаў IV на «поля, сеножати, леса с деревом, зера с певчим ограничением» неаднаразова падцвярджалі. Той, хто адважваўся замахнуцца на дадзеныя ўладанні, па скарзе пушкароў мог быць пакараны «виной» у памеры 100 коп грошаў. Землі крычаўскіх пушкароў у XVII–XVIII ст. размяшчаліся ў Дзягавічах, Друшневе, Дамамерычах, у ваколіцах Міхеевіч, Асмаловічах і ў іншых вёсках староства.

Ваенна-абарончае будаўніцтва ў Крычаве, як і ў іншых вялікакняжацкіх гарадах, цалкам трымалася на насельніцтве горада і воласці, абавязаным, акрамя таго, у ваенны час са зброяй абараняць горад і замак. У наказе Віленскага сойма дзяржаўцу Крычаўскаму князю Жылінскаму гаварылася, каб замак рамантаваўся «тамошними» людзьмі і на грошы, якія выдзяляліся са скарба. Узгадваецца аб неабходнасці назапашвання правіянту і «там мешкати в добром осмотреньи и осторожности».

Акрамя таго, Магілёўская воласць у ваенны час давала на ўтрыманне ў замку 400 драбаў і 800 злотых. Вядома, што ў час вайны баяры і князі Крычаўскага павета сумесна з прапойскім замкам павінны былі выстаўляць для абароны Крычава неабходную колькасць коннікаў з неабходным узбраеннем. У 1604 г. іх было 531 чалавек. Порахам, ежай, а таксама вайсковай службай у ваенны час Крычаўскі замак забяспечвала і магілёўская шляхта.

У першай чвэрці XVI ст. для аховы замка рэгулярна давалася з горада па 2 «клікуны», акрамя таго, «з веку» воласці Крычаўская, Лучыцкая і горад давалі вартавых. У прыватнасці, Крычаў і крычаўская воласць давалі іх «на недели по пяти» чалавек.

Замкавыя ўмацаванні Крычава не-

аднойчы паднаўляліся. Адно з такіх умацаванняў фартыфікацыйных збудаванняў горада адбылося ў другой палове XVI ст. Унутраная частка заходняга ўчастка вала была зрэзана і перамешчана ў бок абарончага рова. Гэта пашырыла пляцоўку замкавага двара, а магутная падсыпка з чырвонай гліны з пяском узняла вал на вышыню болей за 5 м над замкавым двором. Над дном абарончага рова насып вала ўзвышаўся на 15 м. Па грэбні вала ішлі ўмацаванні зрубнай канструкцыі. Дзякуючы дакладнаму і рэалістычнаму малюнку Крычаўскага замка 30-х г. з карты А. Веда і інвентароў XVII ст., магчыма сцвярджаць, што планавая схема драўляных абарончых збудаванняў складалася з 5 вежаў: вежы над брамай і 4 іншых, 3 з якіх былі з напольнага боку. Перад замкам меўся сухі абарончы роў шырынёй болей за 42 м. Цераз яго да брамы вёў драўляны мост, які ляжаў на палях, ці ізбіцах. Апошні пралёт маста быў пад'ёмны. У замку была царква Святога Міколы, жылыя і гаспадарчыя пабудовы, цэйхгауз, калодзеж.

Як і большасць гарадоў XVI–XVII ст., Крычаў, акрамя замка, меў яшчэ адзін пояс абароны — уласна гарадскія ўмацаванні. Гарадскі пасад размяшчаўся на высокім правым беразе ракі і складаўся з двух частак. Адна размяшчалася на Спаскай гары — Зубялышынскі пасад, а другая развівалася побач з замкам. Абедзве часткі пасада мелі самастойныя лініі ўмацаванняў, якія складаліся з валоў і драўляных сцен на іх. На Зубялышынскім пасадзе ў бок замка выводзіла Зубялышынская брама. А на астатняй частцы пасада, верагодна, існавалі яшчэ дзве брамы — Магілёўская і Мсціслаўская, якія выводзілі на дарогу да гэтых гарадоў. З поўначы, з боку Мсціслава, горад абаранялі высокія стромкія схілы і возера на ручаі Крычаўцы.

З крыніц сярэдзіны XVII ст. вядома, што на абарону горада, как «прежде сего бывало, шли доходы с корчмы в городе и с двух мельниц за рекой Сожем на реке на Духобыче стоячме», а таксама падаткі палужныя, памерныя і весавыя.

Як і іншыя гарады, з сярэдзіны XVII ст. Крычаў меў ваенную арганізацыю насельніцтва. Яно аб'ядноўвалася ў дзесяткі і сотні (па назвах вуліц) — Бочкава, Зубялышынская, Латынская, Пагаранская і Падбярозская. У сотні залічвалі ўсіх дарослых мужчын з кожнага «дыма», і яна аб'ядноўвала ў сабе розных па прававому статусу мяшчан — «мяшчан права магдэбургскага» і «мяшчан прысуду замкавага».

У выпадку ваеннай небяспекі горад апавяшчаўся аб ёй ударамі «в звон ратный, который ест завешоный при церкви Св. Миколы в замку Кричевском». Крыніцы падкрэсліваюць, што ў яго званілі «под час небеспеченства от неприятеля звычайного». Забаранялася званіць у звон без патрэбы, а парушальнікі гэтай забароны караліся. Ведаючы, што звычайна «в тот звон ратный на гвалт звонят..., яко на замку пограничном, з великим страхом з домов своих люде, которые живут за замком, до замку утекали, яко звыкли от неприятеля утекать».

Яшчэ ў 1667г. «звон ратный» вісеў на званіцы царквы Святога Міколы. Аднак у 1687г. ужо згадваецца «звон на браме замкавай для скарэйшай пабудки и збирання жыхароў места Кричевского».

Пэўны час, да другой чвэрці XVII ст., Крычаў заставаўся амаль па-за ўвагай летапісцаў, што было выклікана

адносна спакойнай сітуацыяй на ўсходніх межах Рэчы Паспалітай. У канцы XVI — пачатку XVII ст. Расія трапіла ў доўгую паласу «смутного времени», і ёй было не да актыўнай знешняй палітыкі.

Але ў 1632 г., выкарыстаўшы перыяд безуладдзя ў Рэчы Паспалітай, выкліканы смерцю караля Жыгімонта III Вазы, маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч распачаў вайну за вяртанне Смаленска, Чарнігаўскай і Северскай зямель, якія Масква страціла ў выніку Дэулінскага перамір'я 1618 г. У верасні 1632 г. 40-тысячнае рускае войска пад кіраўніцтвам ваяводы М.Б. Шэіна накіравалася пад Смаленск, адначасова ўдары наносіліся па іншых гарадах. Ужо ў гэтым годзе Масква захапіла Себеж, Невель, Рослаў, Ноўгарад-Северскі і іншыя гарады. У студзені 1633 г. войскі М.Б. Шэіна асадзілі Смаленск. Другія рускія аддзелы пачалі пранікаць у глыб Беларусі.

Як страшэнная маланка, пракаціўся па гораду сумесны паход ваяводы Івана Тарбеева і казацкіх атаманаў Івана Балаша і Сямёна Пірага. Крыніцы паведамляюць, што Іван Тарбееў «а с ним донские казаки и солдаты и охочие люди, Ивашка Балаш с товарищи, ходили за рубеж для языков и пришли под Кричев ночью и большой острог взяли и многих литовских людей побили, а в меньшем остроге литовские люди сели в осаде: и они приступили многожды до тех мест, покаместа пороху стало, и острог зажигали со многих мест, а в остроге взяли две пищали железных, знамена и барабан поимали, да языков взяли 4 человек шляхтичей, а иных де языков в те поры побивали, чаяли взять город; да из того же городу взяли полону мужеского полу и жёнами с 2000 человек». Сямён Пірог дадаткова паведаміў, што пад час паходу пад Сураж і Крычаў яго аддзелам было захоплена «5 знамён и пушечка». Адпіска маскоўскіх ваяводаў і атаманаў малюе страшэнную карціну штурму і вынішчэння горада. Маскоўскія войскі змаглі ўварвацца ў пасады і, як відаць з іх рэляцыі, у нейкі момант нават змаглі пранікнуць у замак, але абаронцы яго ўсё ж адстаялі. І як вынік таго, амаль поўны вывад жыхароў горада ў маскоўскі палон, бо наўрад ці ў той час яго насельніцтва намнога перавышала названую колькасць.

Значная частка крычаўскага палону, магчыма, была адпраўлена на пасяленне ў Сібір. Ва ўсялякім выпадку ў партыі са 150 чалавек, накіраванай у Томск не раней 1633 г., значыцца «Яска Петров сын кричевец». У той жа час некаторая частка жыхароў Крычава, якая, магчыма, добраахвотна перайшла на бок Масквы, звярталася ў гэтым годзе ў Разрадны прыказ з просьбай аб пасяленні ў Пачэпе.

Не паспелі загаіцца раны ад гэтага паходу, як праз два тыдні з Рослава пад Крычаў быў адпраўлены новы маскоўскі вайсковы аддзел пад кіраўніцтвам Івана Балаша, а разам з ім і аддзелы Пятра Тур'ева, Савелія Хітрова і Фёдара Тургенева. Па выніках паходу яны пісалі цару, што пад Крычавам «они побили пана Красинского, а взяли в бою литовских людей 2 человек, а побили литовских людей 90 человек». І гэта быў не адзіны разбой у наваколлях Крычава. У гэты ж час пад Мсціславам і Крычавам дзейнічалі атрады Б. Нагога, якія «воевали мстиславские и кричевские места, и полону взяли польских и литовских людей с женами и детьми с 3000 человек».

Адначасова крычаўцы таксама

рабілі паходы на землі чужыя, хаця і не заўжды яны заканчваліся для іх перамогай. Так, у лютым 1633 г. рускія шпегі паведамлялі ў Рослаў, што ў Крычаве шляхціц пан Бацьвінка збірае добраахвотнікаў, каб ісці на «брянские и рославские места в Жарынь». Рускае камандаванне правяло прэвенціўны паход. Пад Лапатавічамі адбылася бойка з добраахвотнікамі Бацьвінкі. Супраць 350 рускіх жаўнераў, як паведамляюць рускія крыніцы, дзейнічала 150 вершнікаў і 350 пешых добраахвотнікаў Бацьвінкі. Нягледзячы на колькасную перавагу, перамога была за маскоўскімі жаўнерамі, якія гналі крычаўцаў да сцен горада.

Пад час антыфеадальнай вайны 1648–1654гг. Крычаў неаднаразова выкарыстоўваўся ў якасці апорнай базы для войска Рэчы Паспалітай і як месца, адкуль арганізоўваліся набегі на рускія ўладанні. Крычаў у 1648 г. і 1651 г. вытрымліваў штурмы казакоў і паўстаўшых сялян, калі казакі, адышоўшы ад Рослава, беспаспяхова асаджвалі Крычаў. Горад і яго воласць вельмі пацярпелі ад такой навалы, і калі ў 1649 г. сойм зацвердзіў новыя падаткі на вядзенне вайны ў памеры «10 пабораў», то напрыклад, для Мсціслаўскага павета колькасць пабораў была паменшана да 7. Аднак Мсціслаў змог выплаціць толькі 3. А ў наступным годзе Мсціслаўскі і Старадубскі паветы ўвогуле былі вызвалены ад выплаты падаткаў і пастою жаўнераў на 6 гадоў, за выключэннем мытных збораў. У гэты ж час горад і кватараваўшае ў ім войска неаднаразова згадваюцца ў данясеннях маскоўскіх шпегаў.

Трыццаць гадоў не было вайны паміж Масквой і Вільняй. Але гэта не азначала, што паміж двума дзяржавамі няма пытанняў. Па-ранейшаму Маск-



Крычаўскі замак. План.

ва прэтэндавала на Смаленск, маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч марыў аб далучэнні ўсіх зямель Рэчы Паспалітай да Русі. Масква ўвесь час вяла падрыхтоўку да новай вайны і шукала толькі зручнага моманту. І ён хутка падвярнуўся. Рэч Паспалітая была знясілена вайной 1648–1654 гг. Казакоў падтрымлівала Расія. На перамовах паміж Масквой і Вільняй пытанне аб Украіне зайшло ў тупік. А тут яшчэ мсціслаўскі падкаморы Пётра Вяжэвіч прапусціў у сваім звароце да маскоўскага цара тытул «повелителя всея России». Толькі аднаго гэтага было дастаткова, каб распачаць вайну. Масква патрабавала пакараць смерцю вінаватага ў абразе цара і прыводзіла як прыклад адпаведныя дзеянні ў адпаведнай сітуацыі ў Персіі. Кароль Ян Казімір адмаўляўся пайсці на такі ўчынак, і 01.10.1653 г. Земскі Сабор, слухаючы справаздачу паслоў «о неправдах литовского короля», пастанавіў: «За честь царей Михаила и Алексея стоять и против польского короля войну вести, а терпеть того больше нельзя».

Пачалася самая страшэнная вайна паміж Расіяй і Рэчу Паспалітай, вайна 1654–1667 гг., да якой Рэч Паспалітая не была як след падрыхтавана. Рускія войскі рушылі з Масквы ў паход 15.05.1654 г. Адначасова пачалі дзеянні рускія арміі, сабраныя ў Бранску і ў Вялікіх Луках. 22.07.1654 г. войскамі князя Трубяцкога быў захоплены Мсціслаў: «Трубецкой с товарищи город Мстиславль взял и высек и выжег, а побил в нём больше пяти да десяти тысяч...». Вайна падыйшла пад сцены Крычава.

30 ліпеня цар Аляксей Міхайлавіч паслаў пад Крычаў сваіх стольнікаў і ваяводаў П.В. Шарамецева і князя Т.І. Шчарбатава, якія паведамлялі цару: «Город Кричев крепок, стоит на осыпи высокой, и ров глубок и въезд и выезд один, а пищалей затинных и винтовочных (гакаўніц і мушкетаў) в городе много». На іх думку, з тымі сіламі, што яны мелі, штурмаваць горад было немагчыма, на што атрымалі загад адыйсці ад горада, стаць у аблогу, а «над городом промышлять» — «зажогом, изождав ветру» і іншымі спосабамі. У жніўні цар загадаў перакінуць з-пад Дуброўны да Шарамецева «жилеци и татарские сотни».

Крычаўцы мужна абараняліся, і цар Аляксей Міхайлавіч, які не змог паслаць сюды вялікае войска, быў вымушаны шукаць іншыя шляхі для ўзяцця горада. Па яго загаду палкоўнік К. Паклонскі паслаў у Крычаў для вядзення перамоў аб здачы горада і яго прысягненні на вернасць маскоўскаму цару шляхціча Іваноўскага. Неаднаразова і сам К.Паклонскі прымаў удзел у перамовах з крычаўцамі, прычым аднойчы яго ледзь не забілі. Горад не здаваўся. Не дапамагаў і ўдзел у перамовах пакінутых жывымі жыхароў Мсціслава. Для паскарэння перамоў К. Паклонскі прасіў цара, каб ён напісаў гараджанам даравальную грамату з абяцаннем захавання іх маёмасці і прывілеяў.

Адначасова з перамовамі аб мірнай здачы горада маскоўскія войскі двойчы спрабавалі ўзяць яго штурмам — «...извоевал, только одними душами осталися есьма». Аднак крычаўцы знаходзілі ў сабе сілы не толькі абараняцца, але і самім рабіць вылазкі: «з немалым крыви своей пролитьем... в голоде и великой нэнде отпор давали, у ноч на неприятеля, шкоды чыничи, выходили». І толькі ў канцы верасня, калі да абаронцаў дайшлі весткі аб тым,

што ўжо палі Горы, Орша, Дуброўна, Смаленск, Мсціслаў, Магілёў, а ў горадзе пачаўся голад, мяшчане Крычава здалі яго рускім войскам.

У падзяку за гэта 9 кастрычніка цар Аляксей Міхайлавіч выдаў крычаўскай шляхце, мяшчанам і манастырам Крычава жалаваныя граматы, у якіх пацвярджаў захаванне ўсёй іх маёмасці і прывілеяў. Аднак, як кажуць, жалуе цар, а не жалуе псар. Рускія войскі, увайшоўшы ў горад, выгналі з замка ўсіх абаронцаў, не даўшы ім магчымасці забраць сваю маёмасць. А праз некалькі месяцаў, 13.05.1655 г., атрады казакоў Залатарэнкі, якому цар аддаў Крычаў, без якіх-небудзь падстаў спалілі сам замак і ўсю наяўную там маёмасць.

Як толькі паміж захопнікамі — казакамі і маскоўскім войскам – пачаліся сутычкі, гэтым адразу ж скарысталіся крычаўцы. Восенню 1658 г. палкоўнік Нячай перайшоў на бок Рэчы Паспалітай разам са сваім палком і гарадамі Старым Быхавам, Чавусамі, Рославам. Тады і крычаўцы і мсціслаўцы ўзнялі паўстанне, знішчылі царскія аддзелы і ўзялі ўладу ў свае рукі. Цар паслаў сюды ваяводу Івана Іванавіча Лабанава-Растоўскага, войскі якога «в року 1658, там-же мечом и огнём, без милосердия, людей секли и палили...». Восенню 1659 г. яму на дапамогу быў пасланы стольнік Лука Ляпуноў, які ўжо на пачатку сакавіка паведамляў, што яго войска разам з палкамі Івана Лабунава-Растоўскага аблажыла Мсціслаў. З Крычава на дапамогу выйшлі палкоўнікі Кміціч, Аскірка, Нячай і Выганоўскі, але самі пацярпелі. На пачатку красавіка яны зноў паспрабавалі дапамагчы Мсціславу, але з тым жа поспехам. У гэтай бітве маскоўскае войска «...побили 3000 ч. Да в языцехь взято 121 ч., да наряду взято 4 пушки да гоковница, 4 литавры, 32 знамени 114 древок гусарских, 4 барабана и обоз взяли...». Пасля гэтага Мсціслаў, застаўшыйся без дапамогі, паддаўся маскоўскаму войску.

У канцы ліпеня 1660 г. князь Б.А. Рапнін паведамляў цару, што ў Крычаве стаіць рускі гарнізон са 188 чалавек, але горад, як і астатнія гарады вакол Смаленска, ненадзейны. Цар Аляксей Міхайлавіч у адказ на гэтае паведамленне «..Мстиславль, Кричев, Рославль, Чичерск велел укрепить гораздо и осадным людем сидеть с великим бережением».

Ён як быццам бы прадбачыў небяспечнасць сітуацыі, што склалася на захопленых землях. Ужо ў канцы жніўня, калі пад Мсціслаў падыйшлі аддзелы палкоўніка Ліпскага, жыхары самі адчынілі ім гарадскую браму. Сюды ж прыбегла дэпутацыя з Крычава, якая прасіла Ліпскага як мага хутчэй ісці пад Крычаў « а чаять де кричевцы город польским людем сдадут вскоре». У канцы жніўня — пачатку верасня крычаўцы прысягнулі на вернасць Рэчы Паспалітай. Спробы маскоўскага ваяводы князя Ю.А. Далгарукага сілай вярнуць горад пад царскую руку не мелі поспеху. Гарадскія ўлады да восені вялі перамовы з царскімі ўладамі, падкрэсліваючы, што калі падыйдуць да горада рускія войскі, то крычаўцы будуць з імі біцца. У рэшце рэшт 23 лістапада мяшчане і шляхта здалі горад, але не маскоўскаму войску, а запарожскаму палкоўніку П.І. Раслаўчонку.

Праз 3 месяцы, у канцы лютага—пачатку сакавіка 1661 г., Крычаў ізноў вышаў з-пад улады Масквы. Прычым, як адзначалі маскоўскія крыніцы, у горадзе было шмат людзей, якія жадалі

вярнуцца пад уладу Рэчы Паспалітай. Гэтая партыя атрымала перавагу, і гараджане прысягнулі на вернасць каралю . У тым жа годзе рускае войска пакінула Крычаў, хаця вайна яшчэ працягвалася да 1667 г.

Фактычна вайна 1654–1667 гг. была апошняй вайной, у якой Крычаў выступаў як буйная ваенная крэпасць. Пад час Паўночнай вайны 1701–1721 гг., у якой Рэч Паспалітая выступала ў саюзе з Расіяй супраць Швецыі, горад як крэпасць страціў сваю ролю. Толькі ў сярэдзіне XVIII ст., пад час паўстання Вашчылы, замак яшчэ раз выканаў сваё ваеннае прызначэнне, калі яго спрабавалі ўзяць штурмам паўстаўшыя сяляне.

М.А. Ткачоў, А.А. Мяцельскі.

Крычаў — горад з правам магдэбургскім

У развіцці сярэдневяковага горада вялікую ролю адыгрывалі даравальныя граматы, якімі вярхоўная ўлада давала і правы і гарантыі, што забяспечвалі яго жыццядзейнасць як цэнтра рамяства і гандлю, вызначалі правы і абавязкі гараджан і іх месца як асобага саслоўя ў феадальным грамадстве. З цягам часу гэтыя правы і гарантыі выстройваліся ў даволі добра распрацаваную сістэму, рэгулюючую розныя бакі жыццядзейнасці горада і станавіліся прыкладам для іншых гарадоў. Так адбылося з горадам Магдэбургам, у якім у XIII ст. на падставе розных прывілеяў, атрыманых у XII–XIII ст., склалася сістэма правоў, што рэгулявала розныя бакі гарадскога жыцця. Яна даволі хутка распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе, і на землі Беларусі прыйшла ўжо ў канцы XIVст.: першым атрымаў магдэбургскае права ў 1387 г. горад Вільня, затым і іншыя. У 1390 г. магдэбургскае права атрымала Бярэсце, у 1441 г. Слуцак, у 1496 г. Горадня, у 1498 г. Полацк, у 1499 г. Менск, у 1577 г. Магілёў. На працягу XVI–XVIII ст. многія дзяржаўныя гарады Вялікага княства Літоўскага атрымалі права на самакіраванне.

Герб Крычава.

У чым жа была прывабнасць гэтага права, да атрымання якога імкнуліся гарады? Галоўным было тое, што яно мела універсальны характар — трактавала розныя віды дзейнасці гарадской улады, суда, яго кампетэнцыю і парадак судаводства, пытанні зямельнай



Свята-Ільінская царква. XV ст. Не існуе.

уласнасці ў межах горада, рэгуляваліся пакаранні за розныя віды правапарушэнняў. Граматы на магдэбургскае права давалі магчымасць гараджанам пазбавіцца ад самавольства феадалаў, усталёўвалі сістэму правоў і гарантый, адмяжоўвалі горад і гараджан ад вотчыннага суда, замацоўвалі асабістую незалежнасць гараджан. Асобае месца займалі пытанні, што рэгулявалі гандаль і рамёствы, дзейнасць цэхаў і інш.

Трэба адзначыць, што даволі хуткаму распаўсюджанню магдэбургскага права на ўсходнеславянскіх землях спрыяла існаваўшая тут традыцыя гарадскога самакіравання ў выглядзе веча, якая існавала ў X—XIII ст. Ды і ў больш позні час — у XV—XVI ст., да атрымання тым ці іншым горадам магдэбурскага права, па крыніцах прасочваецца існаванне ў гарадах пачаткаў гарадскога самакіравання, з якім вымушаны былі лічыцца як дзяржаўцы горада, так і каралеўская ўлада. Першыя прадстаўлены ў крыніцах пад назвай «мужы», «старцы», «старшыны», «дзесятнікі». Кароль Аляксандр у канцы XV ст. грамату аб перадачы ў арэнду мыта з Крычава накіроўваў не толькі намесніку, але і «старцам и всим мужом». Таму магдэбургскае права клалася тут на добра падрыхтаваную глебу, і яго распаўсюджанню спрыяла, верагодна, лепшая, чым у мясцовага права, распрацаванасць пытанняў.

23.08.1653 г. ў гісторыі горада адбылася важная падзея — кароль Уладзіслаў IV надаў гораду магдэбургскае права. У прывілеі падкрэслівалася, што магдэбургскае права надаецца Крычаву па просьбе яго жыхароў з мэтаю паляпшэння ўмоў яго развіцця, павелічэння яго багацця, што, бясспрэчна, будзе спрыяць паляпшэнню эканамічнага стану дзяржавы, і ў якасці своеасаблівай міласці за вернасць гараджан дзяржаве як у папярэднія гады, так і за мужную абарону горада. Магдэбургскае права Крычаву, як гэта падкрэслівалася ў прывілеі, давалася на тых жа ўмовах, што раней атрымала Орша. Згодна прывілея, у горадзе ліквідоўваліся ўсе юрыдыкі (як свецкіх, так і духоўных феадалаў), ён атрымоўваў выбарнае гарадское самакіраванне ў складзе войта, двух райцаў, шасці лаўнікаў, якія прызначаліся кожны год і выбіраліся як з ліку праваслаўных, так і з ліку каталікоў. У прывілеі падрабязна была распісана выбарчая сістэма гарадскога самакіравання. З ліку мяшчан, што пераходзілі на магдэбургскае права, выбіраліся 24

кандыдатуры ў гарадскі ўрад, які выбіраўся на тры гады, прычым падкрэслівалася, што такая колькасць (24) кандыдатур павінна быць заўсёды. І калі здарыцца так, што іх колькасць датэрмінова зменшыцца ў выніку смерці, ці з яшчэ якой нагоды, то гараджане абавязкова павінны дабраць патрабуемую колькасць урадоўцаў. Менавіта з іх ліку штогод выбіралася гарадская адміністрацыя, прычым у прывілеі вызначалася дакладная дата выбараў — Новы год – і падкрэслівалася, што яго адлік ідзе па каталіцкаму грыгарыянскаму календару, якім карыстаемся мы і зараз (у Рэчы Паспалітай грыгарыянскі каляндар быў уведзены, як і па ўсёй Еўропе, у канцы XVI ст., і расійскі цар Пётр I да гэтай падзеі на нашых землях не мае ніякага дачынення. Члены гарадскога ўрада прыносілі прысягу на вернасць гораду і толькі пасля гэтага прыступалі да выканання сваіх абавязкаў. Прысягу члены ўрада прыносілі толькі адзін раз, і калі месціча выбіралі ва ўрад паўторна, то ён вызваляўся ад паўторнай прысягі.

Магдэбургскае права не распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю горада. Гэта было выклікана тым, што сярэдневяковы горад, як у люстэрку, адлюстроўваў феадальны стан краіны. У кожным горадзе быў замак — адміністрацыйны і ваенны цэнтр, роля якога была асабліва вялікай на памежных землях. Дзяржава пакідала пад сваёй уладай пэўную частку насельніцтва горада, якое займалася ў першую чаргу абслугоўваннем некаторых функцый горада. Гэта былі пушкары, частка рамеснікаў, гандляроў. Яны складалі асобную юрыдыку — замкавую, альбо гродскую.

У кожным сярэдневяковым горадзе існавалі землі, якія належалі шляхце, князям. Яны складалі шляхецкія юрыдыкі. І хаця ўрад спрабаваў абмежаваць колькасць насельніцтва на панскіх і шляхецкіх землях у гарадах, фактычна гэтая палітыка не мела поспеху.

Пад магдэбургскім правам заставалася тая частка горада, якая не была пад іншымі юрыдыкамі. У Крычаве гэта выглядала так. У 1679 г. з 375 гарадскіх «дымоў» (гаспадарак) на праве «мейскім» — магдэбургскім — знаходзіўся 131 «дым», шляхецкімі былі 58 «дымоў», замкавую юрыдыку складалі 186 «дымоў». У 1720 г. з 477 «дымоў» толькі 139 было на магдэбургскім праве, а 39 — шляхецкіх. Але трэба ўлічваць, што ў той час у горадзе было 244 пустых «дымы» — такі быў для Крычава вынік Паўночнай вайны, у якой Рэч Паспалітая выступала ў саюзе з Расійскай імперыяй супраць Швецыі.

Як жа размяркоўвалася ўлада сярод членаў гарадскога самакіравання? Войт — галава самакіравання – звычайна выбіраўся магістратам, хаця даволі часта жыццё ўносіла свае карэктывы. Часта ён прызначаўся каралём і фактычна стаяў па-за гарадскім самакіраваннем. Так было і ў Крычаве. Першым войтам горада на праве магдэбургскім у каралеўскім прывілеі названы Крыштоф Весялоўскі, які ў той час быў дзяржаўцай Крычаўскім. Яго прызначэнне гарадскім войтам, верагодна, было выклікана жаданнем караля пазбегнуць супраціву Весялоўскага пераводу горада на магдэбургскае права. У выніку надання гораду магдэбургскага права дзяржаўца губляў вельмі значныя прыбыткі, якія пераходзілі ў казну горада. Прызначэнне войтам кампенсавала Весялоўскаму гэтыя страты.

У прывілеі адзначаецца, што пад

час надання гораду магдэбургскага права Крыштоф Весялоўскі ўжо быў гарадскім войтам, што яшчэ раз падкрэслівае пэўную падрыхтаванасць горада да пераводу яго на самакіраванне. Адначасова кароль падкрэсліваў, што пэўныя перамены з выбарамі войта магчымы толькі пасля смерці К. Весялоўскага. Аднак урад не выканаў сваіх абяцанняў і пазней абавязкі войта Крычава ўвесь час выконваў прызначаны ўрадам дзяржаўца старостава. Пасля К. Весялоўскага войтам горада з'яўляўся новы дзяржаўца крычаўскага староства Мікалай Пац, а пасля пераходу горада і староства ў арэнду да Радзівілаў войтам фактычна з'яўляўся арандатар, які кіраваў горадам праз лентвойта (намесніка войта). Кіраванне горадам войт ажыццяўляў з дапамогай лентвойта, якога мяшчане выбіралі, узгадняючы кандыдатуру з войтам. Аднак і тут у Крычава была свая асаблівасць — лентвойт таксама прызначаўся, толькі ўжо не каралём, а войтам. Такое становішча, верагодна, тлумачыцца невялікай колькасцю крычаўскіх мяшчан, у выніку чаго яны не мелі магчымасці цвёрда адстойваць свае правы. Іншымі выбарнымі членамі магістрата былі бурмістры, райцы і лаўнікі. У абавязкі бурмістраў уваходзіла загадванне гарадской казной, старшынства на пасяджэннях бурмістраўска-радзецкага суда, які разбіраў маёмасныя і крымінальныя справы гараджан, правапарушэнні мяшчан, цяжбы купцоў і рамеснікаў. Свае судовыя функцыі ў адносінах да гараджан, што не падпадалі пад магдэбургскае права, альбо феадала ці залежнага ад яго чалавека, войт выконваў з дапамогай лаўнікаў.

Адным з галоўнейшых абавязкаў органа гарадскога самакіравання быў нагляд за тым, каб землі горада не пераходзілі ў іншыя рукі. Падобны абавязак — ахоўваць мяшчанскія плацы — гарадскі магістрат пільна выконваў. Калі ў 1763 г. Марцін Круглік уступаў у мяшчанскае саслоўе, ён даваў абяцанне, што калі ў яго ўзнікне патрэба прадаць свой гарадскі плац, то ён мае права яго прадаць толькі месцічу альбо чалавеку, які збіраецца ўступіць у мяшчанскае саслоўе. У дадзеным выпадку магдэбургскае права выходзіла далёка за межы гарадскіх сцен і распаўсюджвалася на ўсе мяшчанскія землі, якія знаходзіліся пад кіраваннем горада. А яны (гарадскія землі) на пачатку XVIII ст. межавалі з «грунтамі» в. Варанёва, Дзягавічы, Касцюшкавічы, Сакольнічы.

Хаця фармальна членам гарадскога самакіравання мог стаць любы месціч, на самой справе на кіруючыя пасады, як правіла, выбіралі найбольш заможных мяшчан, і ў пэўнай ступені ўдзел прадстаўнікоў таго ці іншага роду ў гарадскім самакіраванні станавіўся спадчыннай справай. Так, сярод крычаўскіх бурмістраў на працягу другой паловы XVII – сярэдзіны XVIII ст. даволі часта сустракаюцца прозвішчы Бочка і Козел, прычым, мяркуючы па гадах знаходжання на пасадзе, яны займалі гэтую пасаду не адзін тэрмін запар. У канцы XVII ст. на пасадзе бурмістра Крычава быў Іван Бочка, а потым яго сын Кузьма Бочка.

У той жа час, за пэўныя праступкі, магістрат меў права зняць вінаватага з пасады. У 1753 г. за беспадстаўныя абвінавачванні былога бурмістра Фёдара Козела магістрат пастанавіў вызваліць з пасады райцу Міхаіла Губу. Акрамя таго, ён павінен быў атрымаць за нагавор на двух вуглах ратушы па дзесяць удараў бізуном.

Гараджане атрымлівалі права мець свой выбарны суд, які вырашаў усе пытанні. Прычым дзейнасць суда была падрабязна рэгламентавана. Каб пазбегнуць якіх-небудзь абвінавачванняў у прыняцці неправамоцных рашэнняў і атрыманні хабару, пасяджэнне суда павінна было адбывацца толькі ў прысутнасці ўсяго гарадскога ўрада і пад кантролем некалькіх іншых выбарных прадстаўнікоў гараджан. Падобная практыка пасяджэння гарадскога суда пацвярджалася больш познімі пастановамі гарадскога самакіравання. Так, напрыклад, у 1753 г. суд прыняў рашэнне, што яго пасяджэнні будуць адбывацца два разы на тыдзень – у панядзелак і суботу, у 9 гадзін раніцы, і на іх абавязкова павінны былі прысутнічаць усе члены магістрата і некалькі членаў «паспольства» — з астатніх 15 мяшчан, выбраных у гарадское самакіраванне. У выпадку, калі б бургамістры самастойна пачалі весці судовы працэс, гэта каштавала б ім штрафу ў памеры 10 талераў. Пошліны, атрыманыя судом, дзяліліся пароўну паміж лентвойтам і магістратам.

Але, нягледзячы на свой суд, паводле прывілею, жыхары горада захоўвалі права звяртацца з апеляцыяй і ў каралеўскі суд, калі яны былі незадаволены рашэннем мясцовых улад. Для органаў гарадскога самакіравання кароль дазваляў сваім прывілеем будаўніцтва ратушы на рынку. Адначасова з прывілеем на магдэбургскае права гораду надаваўся герб і пячатка.

Гэтым увага караля да Крычава, як памежнай фартэцыі, не абмяжоўвалася. У дадатак да прывілея аб наданні гораду магдэбургскага права 24.03.1634 г. кароль Уладзіслаў IV выдаў другі прывілей, якім не толькі пашыраў гарадскія вольнасці і пацвярджаў раней атрыманыя правы, але і ўскладваў на гараджан пэўныя абавязкі.

Паводле новага прывілею, кароль абавязаў усіх жыхароў горада выконваць гарадскія павіннасці, будаваць ратушу на рынку, а для пашырэння апошняга дазваляў выкарыстаць замкавы агарод.

Сваім прывілеем кароль абавязаў таксама гараджан абараняць войта, мець у замку клеці, у якіх яны хаваліся б пад час аблогі горада. Гараджане атрымлівалі права на будаўніцтва двух гасціных дамоў — адзін «за астрогам», а другі — над Сажом. Гораду на вечныя часы дазвалялася мець два кірмашы на год: першы на Тройцу, а другі — на дзень Святога Міколы (6 снежня) па каталіцкаму веравызнанню. Гараджанам дазвалялася секчы на ўласныя патрэбы дрэвы ў каралеўскім лесе, размешчаным за 10 км, яны атрымалі права вольнай рыбнай лоўлі на Сажы ад Прапойскай да Рослаўскай мяжы. Значная ўвага надавалася гарадскому гандлю: месцічы маглі ездзіць па краіне і гандляваць ва ўсіх валасцях. У той жа час прыезджым купцам забаранялася гандляваць у Крычаўскім старостве, акрамя як толькі на гарадскім рынку.

Каралеўскі прывілей распісваў памеры чыншу, які павінны былі выплочваць мяшчане, і былі дакладна ўказаны тэрміны выплаты падаткаў — ад свята Святога Міхала (29 верасня) да свята Святога Марціна (13 красавіка). Дзяржава і гарадскі скарб клапаціліся аб тым, каб мяшчане маглі спакойна выплаціць усе падаткі, і таму адводзілі для гэтага даволі доўгі тэрмін. У прывілеі падкрэслівалася, што гарадскія яўрэі павінны былі выконваць усе па-

віннасці (фактычна пераводзіліся пад замкавы прысуд), незалежна ад таго, на якіх плацах (замкавых ці гарадскіх) яны жывуць.

У прывілеі былі распрацаваны правілы, паводле якіх жыхары горада прымаліся ў мяшчанскае саслоўе — пераходзілі на права магдэбургскае. Прымаемы павінен быў даць на ратушы прысягу на вернасць гораду і ўнесці адпаведны ўзнос у гарадскую скарбонку, памеры якога не былі дакладна вызначаны – «па сваёй магчымасці». Марцін Круглік у якасці ўступнога ўзносу ўнёс у гарадскую скарбонку 20 бітых талераў. Толькі пасля гэтага ён мог атрымаць вольнасці права магдэбургскага.

Гараджане добра разумелі значэнне для іх магдэбургскага права. Звычайна пры ўступленні на княжацкі стол новага князя ці пры страце грамат гараджане звярталіся з прашэннем аб выдачы пацвярджальнай граматы. Так рабілі і крычаўцы, якія неаднаразова звярталіся да каралёў за пацвярджэннем даных іх папярэднікамі прывілеяў. Парушэнне вольнасцей, якія давала гараджанам магдэбургскае права, было адной з прычын, з-за якіх жыхары горада неаднаразова пад час вайны 1654–1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай выганялі з Крычава захопнікаў. Здаўся Крычаў маскоўскаму войску ў 1654 г. толькі тады, калі цар Аляксей Міхайлавіч пісьмова паабяцаў захаваць усе іх вольнасці і прывілеі. Мяшчане добра ведалі значэнне вольнасцей і ўсяляк абаранялі іх.

Магдэбургскае права існавала ў горадзе да 1772 г., да таго часу, як Крычаў, паводле першага падзелу Рэчы Паспалітай, увайшоў у склад Расійскай імперыі. Расія не ведала права на гарадское самакіраванне, таму адразу ж усе беларускія гарады, апынуўшыся ў складзе Расійскай імперыі, былі яго пазбаўлены.

А.А. Мяцельскі.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

ГРАМАТА КАРАЛЯ КАЗІМІРА МІНСКАМУ КУПЦУ ЦЕРАШКОВІЧУ АБ ДАЗВОЛЕ БЯСПОШЛІННАГА ГАНДЛЮ Ў ГАРАДАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

5 мая 1480 г.

Казимир божьею милостью.

Князем нашим, и паном, и наместником, и тивуном, и бояром, и мытником, и всим заказником тот наш чоловек, мещанин менский Лука Терешкович, торгуеть нашим дубасом бобруйским троцкое половины и нашими пенязьми; а от того нам прыбытку дает. И вы бы от нашого дубаса и от его комяги мыта не брали бы. Есте в Глуску, в Погосте, в Чорторыску, у Куликовичох, в Чет, в Ертни, в Луцку, у Востраве, в Степани, в Дубровицы... В Пропостку, в Крычове ... по всим нашим мытом, и по княжским и по панским, и по боярским, сухим и водою. А которыи бы хотели через наш лист силу ему чинити, а мыто взяти от нашого дубаса и от его комяг, тот нам великую вину заплатить.

Писан у Вильни мая 5 день, индикт 6.

Белоруссия в эпоху феодолизма, Мн., 1959. Т.1. Стр. 261.

СТАТУТНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ НАМЕСНІКАМ І ІНШЫМ УПРАВІЦЕЛЯМ КАРАЛЕЎСКІХ УЛАДАННЯЎ АБ ВІДАХ І ПАМЕРАХ ПАБОРАЎ, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЮЦЬ СПАГНАННЮ Ў ПАДНЯПРОЎСКІХ ВАЛАСЦЯХ

1500 г., чэрвень.

Наместником нашим и старцом и всим мужом Поднепровским и волостем нашим Свислоцким, Любошанским обема половицам — Виленское половицы и Троицкое,

Кричевским, Пропойским, Чечерским, Горвольским, Речицким, Брагинским, Мозырским, Бчицким.

Што есте дани нашое грошовое, бобров и куниц не отнесли до скарбу нашого и меду пресного не отвезли до ключов наших до Вилии, до Троков, а которые з вас хотя будуть и дань нашу до скарбов нашого грошовую и бобры, и куницы отнесли, и мед пресный до ключов наших привезли не сполна, где ся што будеть у волостех наших остало и мы для всих тых дел послали там до вас, на волости наши, писара нашого, намесника Перелайского, Богуша Боговитиновича, и казали есмо ему тую дань на вас сполна справити грошовую и бобры, и куницы, и мед пресный подлуг давного обычая: за рубль гр. по 2 копе гр., а за бобра чорного по копе гр., а за карого бобра по 40 гр., а за куницу по 6 гр., где не будеть — шерстью; а за встав меду пресного по 4 руб гр., а за колоду по 2 копе гр. И вы бы все сполна и з его доходом выдали конечно, потому как перед тым бывало. А которые у вас будуть земли пустовские або люди голтяйные, або по себе роскинули, на большого большей, а на меньшей, как здавна бывало, абы ни один грош дани нашое у вас не остал. Такиж, которые помеж вас дела обидные будут кому, о чем мы казали, ему ж о том промежи вас досмотрети и справедливость тому вчинити.

Писан в Менску июнь ... день, индикт 3 /1500/.

Любавский М.К. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства. М., 1892, прил. XII–XIII.

З ЛЕТАПІСУ РАЧЫНСКАГА

1508 г. Князь Костентин Иванович Острозский з везаня з Москвы прыбег до Литвы в лъто божого нароженя 1508.Того же году в Литве князь Михайло Глинский Заберезинского забил таким способом, иж видел Глинский, же был от всих опущон. С тое неласки королевское, маючы сэрцэ скрвавеное против Янови Заберезинскому, розумеючы, то з его прычыны быти. Скоро король выехал з Литвы на сэйм до Петрыкава, зостал в Литве: угледевшы свои час зъехал на Яна Заберезинскаго, маршалъка великого до двора его, который ест через рэку от мъста Городна концу мосту, о першой године в ночы взял его з ложа у одной кошули, и казал стяти турчыну, своему слузе. Голову его через мъсто Городно на древцу вести казал, потом у озера в колку милях укинено. Розумъл тому Глинский, иж порушыл короля и паны литовские, приятели небожчыковы, против собъ. Збирал прыятели одны кревные, другие за пенязи так з руси, яко з Литвы звлаща брата Василия Глинского, который ему подал замки королевские и свои люди, к тому за пънези прынявшы умыслил моцю королю отпирать. А потом обачылся, иж моцы такое мъти не мог, зъехал до Москвы з скарбом и з прыятели своими до князя великого московского Василия Ивановича. И много в тот час замков руских подали великому князю московскому, то есть князь Михаило Мъстиславски подался з городом своим Мстиславлем, князи Друцкие подалися з городом своим Друцкое, Оръшу, Крычев и Мозыр за прыводом Глинского Москва были осъли.

Король Жыкгимонт, будучы в тот час в Полшы,ослышавшы о том, и казавшыся собрати воиску литовскому и полскому люду служэбному жолнъром над которыми гэтманом полным был Фирлей з Яновъца, первей войско литовское выправил, а потом и сам пошол за Михаилом Глинским. О чом услышавшы Глинский, не смъючы ждати на замкох руских короля Жикгимонта, побег к Москве, а тые князи, князь Михайло Мстиславский и князи друцкие з городы своими, а к тому Оръша и Кричев, и Мозыр опят подалися королю Жыкгимонту.

Полное собрание русских летописей. Т. 35. М.,1980. С. 167.

З ЕЎРАІМАЎСКАГА ЛЕТАПІСУ

1508 г. Того и лъта князь Михайло Глинской Заберезынскага убил в Городнъ и поъхал к Москве з братом своим, с князем Василием Глинским. И многие люди пристали к нему и много городов передалося были к Москвъ: князь Михайло Мстиславич и з городом своим Друтцким, и Ршу, и Кричев, и Мозырь Москва была осъли. И корол Жикгимонт собрав войско литовское, послал за князем Михаилом Глинским, за ним пошол. И Глинский, услышав то, пошол из городов руских к Москвъ, а тъ князь Михаило Мстиславский и князь друтцкий з городами своими, Рша и Кричев и Мозыр отдалися королю Жикгимонту. И была

в Литвъ после Глинского замятня велми великая, панов имали, которые за Глинским в дружбе жили.

1534 г. Лъта божия нарожения 1534-го. Корол Жикгимонт Старыи и сын его король Жикгимонт Август послали Москвы воевати войско литовское, а с тым войском было панов, пан Юре Николаевичъ Радивил. В то время приехали с Москвы князь Бълский да Иван Луцкий, а с ними было четыреста коней, и стрътили воиско живущье литовское в Магилеве.Там же в Магилеве гетман литовский Юре Радивил с войском лежал пят дний и послал гетмана дворного пана Андръя Немировича, воеводу киевскаго и пана Василия Чижа, конюшего дворного, с войском на Севъру. И пришли под Стародуб, Овчину погромили, а с ним было 3000 людей, а сам Овчина утек, и много людей живых поимали. А от Стародуба пошли проч до Радогоща, и под Радогощем князя Борбошина побили и Радогощ город сожгли и много полону побрали, и оттоль ходили под Почан, замком не взяли и пошли во свою землю к Литву на Кричев.

Полное собрание русских летописей. Т. 35. М., 1980.

З ВАЛЫНСКАГА ЛЕТАПІСУ

Князю ж Костянтину бывши под Смоленъском и от Смоленска вьзвратившуся и взял грады тыи, которыми вже служили великому князю московскому: Мстиславль, Кричев, Дубровну и повелъ им по пръвому служити к Великому княжеству Литовскому, а сам поиде в Литовскую землю к господарю своему. великому королю Жикгимонту. Король же, услышавши приеханье его и вси вои своих литовских и руских вдатных витязей, принял их з великою честию у своем столечном грдъ Вилни декабря 3 день на святого пророка Софония. Великославному господарю королю Жикгимонту Казимировичу буди честь и слава на въки, побъдившему недруга своего великого князя Василия московского, а гетману его, вдатному князю Костянтину Ивановичу Островскому даи боже здоровье и щастье вперед лъпшее как нынъ; побил силу великую московскую, абы так побивал сильную рать татарскую, проливаючы кров их бесурменьскую.

Паведамляем тым лістом нашым, каму аб гэтым ведаць належыць, што вяльможны Крыштоф Весялоўскі, маршалак надворны Вялікага княства Літоўскага, староста наш тыкоцінскі, дзяржаўца і войт крычаўскі, схіліўшыся да прывілея месту крычаўскаму ад нас вернападданым не толькі пад час панавання светлай памяці караля яго міласці пана бацькі нашага, але і ў шчаслівае панаванне наша, пад час інтэрвенцыі непрыяцельскай, амаль знішчаныя агнём і мячом нам і Рэчы паспалітай утрыманага на права Магдэбургскае дадзеным у Варшаве дня 23 месяца жніўня року Божага 1633 уладай і правам сваім, якое над мяшчанамі крычаўскімі, судовымі і іншымі прывілеямі правам паспалітым звычайным меў, спецыяльным лістом адрокся, прасіўшы, абы такі ліст вялможнага маршалка надворнага Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўцы і войта крычаўскага, сілай і павагай зацвердзілі і ўзмацнілі, які так гучыць. Я, Крыштоф Весялоўскі, маршалак надворны Вялікага княства Літоўскага, цівун віленскі, тыкоцінскі, суражскі, крычаўскі староста, эканом гарадзенскі, ляснічы перстанскі, праломскі і навадворскі, чыню тым лістом маім, што мяшчане крычаўскія, менавіта Рыгор і Раман Кузмічы Быхаўцы і Яцко Аляксандравіч Казёл, пакладалі перада мной прывілей яго каралеўскай міласці, дадзены 23 жніўня 1633 года ў Оршы, якім яго каралеўская міласць з міласціцкай ласкі сваёй панскай, бачачы верныя і адважныя паслугі памянёных мяшчан, надаць права ім Магдэбургскае вырашыў, і пры гэтым асобна да мяне пісьмо прынеслі, абы звяртаючыся да волі яго каралеўскай міласці і права майго першага, якое маю з ласкі і шчодрасці светлай памяці караля яго міласці Жыгімонта III, пана і дабрадзея майго міласцівага, ухваліўшы, памянёныя грамадзяне места Крычава пад вольнасць і права Магдэбургскае выпусціў.

Просяць пры тым самі і браціі сваёй, ад імя ўсіх мяшчан крычаўскіх абы ім, паводле надання яго каралеўскай міласці, правам Магдэбургскім карыстацца дазволіў. Не жадаючы быць перашкодай волі яго каралеўскай міласці, пана майго міласцівага, а жадаючы тым людзям яго каралеўскай міласці і Рэчы Паспалітай здаўна, але асабліва пад час нядаўна вайны з народам маскоўскім добра заслужаны гонар свой паказаць, саступаю і тым лістом сваім добраахвотным права свайго першынства як у судах, так і ў іншых прывілеях з права паспалітага, звычайных над мяшчанамі тамтэйшымі мне саступаю і пад права Магдэбургскае не столькі, колькі ад мяне залежыць, выпускаю пры ўмове выканання імі выплат: якія як са старых рэвізій павінны былі даваць, так і якія ім пасля пацвярджэння караля яго міласці назначаны будуць, пакідаючы сабе тое, што яны згодна таго ж прывілея яго каралеўскай міласці і права паспалітага як войту тамтэйшаму будуць належаць. Але не меней тых умоў, якія кожнаму старасце згодна даўніх звычаяў і права паспалітага ва ўсіх гарадах караля яго міласці пад правам Магдэбургскім знаходзяцца належыць. Нарэшце, захоўваючы за сабою права заключыць з гараджанамі пагадненні на ўмовах, якія вышэй высказаны.

І на тое даў гэты ліст мой, з пячаткай маёй і з подпісам рукі маёй.

Пісаны ў Каменнай, дня 21 месяца жніўня 1634 года.

Крыштоф Весялоўскі.

Мы, Уладзіслаў чацвёрты, кароль, разглядзеўшы просьбу мяшчан крычаўскіх, да нас дашоўшую, ласкава схіліўшыся да іх просьбы, адзначаны ліст ва ўсіх яго пунктах, умовах і нормах сілай і павагай нашай каралеўскай узмацняем, зацвярджаем і на вечна ў адпаведным значэнні пакідаем і асобным гэтым прывілеем нашым абы сучасны ленвойт прызначаны вяльможным войтам, таксама і іншыя ленвойты, што будуць пасля, ніякіх спраў звычайных і крымінальных, па прыкладу места нашаго Аршанскага, без бурмістраў, райцаў і лаўнікаў места нашага крычаўскага, не судзіў. А той, хто набыў плац у месцы нашым крычаўскім, будзе ўсе павіннасці і цяжары мескія выконваць. Таксама і тыя, хто будзе займацца гандлем, рамяством і шынкарствам, неабходныя павіннасці аддаваць павінен.

Дазваляю тым жа мяшчанам крычаўскім два дамы гасціныя мець: адзін за астрогам, а другі над ракой Сажом на сваіх грунтах, і ратушу на рынку на плошчы пабудаваць. А для пашырэння рынку, з дазволу маршалка надворнага Вялікага княства Літоўскага, войта дазваляецца выкарыстаць замкавы агарод.

Клеці замкавыя, у якіх мяшчане пад час небяспекі ад ворага хаваюцца, павінны быць вольнымі.

Два, па прыкладу іншых мест нашых, адзін на Св.Тройцу, а другі на Св.Міколу свята рымскага месту нашаму Крычаўскаму на вечныя часы надаем. Пры гэтых кірмашах каноны сычэння мёду чатыры разы маюць мець мяшчане, а воску палавіна ад тых мёдаў каталіцкаму касцёлу рымскаму, а другая палавіна царкве павінна належаць. Паборы і кантрыбуцыю

месцічы самі выбраўшы, да скарбу нашага ўносіць павінны будуць, а таму замкавыя павіннасці – работы на патрэбу замка, пастаўка падвод – не падлягаюць, *акрамя тых выпадкаў, калі* ўзнікае патрэба для Рэчы Паспалітай паводле лістоў нашых.

Пры гэтым, дадаўшы месту нашаму крычаўскаму просьбы, на якія вяльможны маршалак наш надворны Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўца і войт крычаўскі ў лісце сваім вышэйпамянутым выкладае, жадаем каб мяшчане крычаўскія чыншы з вакол і маргоў палявых і сенажатных, таксама як і з прэнтаў мескіх – сядзібных і агародных па пяці пенязяў, а з маргоў палявых, сядзібных па тры грошы з кожнай валокі па капе літоўскай. З маргоў засценкавых, якія ў памеры валочнай не былі ўнесены, а за сценамі валаснымі праведзены з маргоў па тры грошы, з маргоў сенажатных па тры грошы ў замку Крычаўскім, пачаўшы ад Св.Міхаіла аж да Св.Марціна свята рымскага, аддавалі.

Маюць права па дрэва для гарадской будоўлі і для сваіх прыватных патрэб у пушчу нашу за дзве мілі ад горада ездзіць. Дазваляецца месцічам крычаўскім па валасцях нашых ездзіць, купляць усялякія тавары і на торг свой крычаўскі прывозіць і гандляваць. А калі бы на сваім таргу не прадаў, то тады на іншых таргах прадаваць можа. Маюць права вольнай лоўлі рыбы на Сажы ад граніцы прапойскай да граніцы рослаўскай. А іншыя пункты, умовы, абавязкі ў той жа рэвізіі апісаныя, якія тут слова ў слова былі ўпісаны, сілай і ўладай нашай каралеўскай зацвярджаем, падмацоўваем і апрабіруем. А пад канец жадаем, каб сённяшні вяльможны стараста крычаўскі і тыя, хто потым будзе, плацаў, валок мейскіх слугам сваім не раздаваў і ўсе тыя валокі і плацы навечна пры месцы павінны заставацца.

Прыезджыя купцы маюць права купляць тавары толькі на гарадскім таргу Крычава, а не ў воласці. Жыды, што жывуць у Крычаве, і тыя, хто потым жыць будзе, з асоб юрыдыкі замкавай, а з плацаў і грантаў, пад юрыдыкай мейскай будучых, да месца адносяцца і павіннасці ўсялякія выконваць павінны будуць. А для лепшых умоў і павагі таго места нашага Крычаўскага, па прыкладу гарадскога права Оршы, надаем на вечныя часы, абы кожны новы месціч, прымаючы аселасць і гарадскія правы, перш за ўсё павінен на ратушы прынесці прысягу і адпаведна сваёй магчамасці ўнесці ўзнос у гарадскі скарб, а потым мае права на гарадскія вольнасці і права гандляваць.

Пацвярджэннем таго, што гэты прывілей наш, падпісаны маёй уласнай рукою, на вечныя часы зацвярджаецца, загадваю змацаваць яго пячаткай Вялікага княства Літоўскага.

Дадзена ў Варшаве, дня 24 месяца лютага року Панскага 1634, панавання нашага польскага пятага, а шведскага шостага року.

Уладзіслаў, кароль.

Марцін Трызна, рэферэнт ВКЛ.

Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы, выпісаныя з кніг губерняў Віцебскай і Магілёўскай, якія захоўваюцца ў дзяржаўным архіве Віцебска. Выпуск 10. Віцебск, 1879. С. 307–315.

Пераклад з польскай мовы А. Мяцельскага.

Супраць шведскіх захопнікаў

Не паспела пакутная зямля Крычаўшчыны залячыць свае раны ад вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай (1654–1667 гг.), як зноў яе ахутаў парахавы дым. Пачалася цяжкая і крывапралітная вайна паміж Расіяй і Швецыяй (1700–1721 гг.).

Расійскія і шведскія войскі сышліся на беларускай зямлі. Салдатам патрэбна была ежа, коням – фураж, і ўсё гэта маглі ўзяць толькі ў мясцовага насельніцтва. Гэта абцяжарвала і без таго нялёгкае жыццё народа.

У 1706 г. армія Карла XII захапіла частку Беларусі, маючы намер праз Смаленск прарвацца да Масквы. Летам па Крычаўскай зямлі адступала пад націскам шведаў руская армія на чале з Пятром I.

Жыхары Крычаўшчыны не сустрэлі з хлебам-соллю шведскіх заваёўнікаў. Яны разгарнулі актыўную пар-

тызанскую барацьбу супраць іх. Менавіта ўзброенае мясцовае насельніцтва высачыла і ўшчэнт разграміла шведскі атрад, а аднаго з асноўных забеспячэнцаў варожай арміі, Фрэдэрыка Ексуса, узялі ў палон і перадалі войскам Пятра I. Сяляне паведамлялі рускім камандзірам пра рух праціўніка на поўнач, які, як потым высветлілася, пагражаў абходам рускіх пазіцый у напрамку Смаленска. Пётр I прыняў рашэнне даць бой ворагу. У ноч з 29 на 30 жніўня 1708 г. 8 батальёнаў генерала М. Галіцына, употай праведзеныя мясцовымі жыхарамі, атакавалі шведскі авангард каля вёскі Добрае (зараз Мсціслаўскі раён).

У выніку двухгадзіннага бою чужынцы былі разгромлены. Своечасова падаспеўшы эскадрон князя А.Меншыкава, які ўдарыў з фланга, прымусіў ворага пусціцца наўцёкі. Толькі прыбыццё на дапамогу галоўных сіл на чале з Карлам XII выратавала атрад ад поўнага знішчэння.

Аб ходзе гэтай бітвы Пётр I пісаў сваім блізкім: «По двухчасном непрестанном огне Голицын и Флюк неприятелей сбили и с 3000 трупов, кроме раненых, положили знамена и прочее подобрали. Потом Король шведский сам на сикурс пришел, однако же наши отошли от них, кроме разорения строю... Я как почал служить, такого огня и порядочного действия от наших солдат не слыхал и не видал».

Гэта была першая перамога рускай арміі над шведамі на тэрыторыі Беларусі. Поспеху яе садзейнічалі мясцовыя праваднікі, якія правялі ўброд праз паўнаводныя пасля моцных дажджоў рэкі Чорная і Белая Натапа войскі генерала М. Галіцына і конніцу князя А. Меншыкава. «Под Добрым русские впервые в Северной войне нанесли серьёзный удар войскам самого Карла XII, который до этого считал себя непобедимым».

Сяляне і гараджане не толькі нападалі на дробныя атрады шведаў. Выкарыстоўвалі яны і іншыя, не менш эфектыўныя спосабы барацьбы. Вось як апісваў гэта Андрэй Меер: «Кричевского староства жители... не только хлеб свой при походе шведа в землю зарывали, но и сами с пожитками своими из местечек и деревень в леса и болота удалялись, им кроме пустых полей и изб ничего не оставляли»

Уцякаючы з вёсак, жыхары здымалі з млыноў жорны і хавалі іх. Шведам не хапала харчу. Пра сваё становішча ў той час яны гаварылі, што ў іх тры дактары: «Гэта доктар Гарэлка, доктар Часнок і доктар Смерць».

Разлютаваныя шведы таксама не заставаліся ў даўгу. Калі да пачатку вайны ў Крычаве налічвалася 500 дамоў, то пасля адступлення засталося іх толькі 200. Разбураны былі суконнавальні, маслабойні, піваварні і іншыя прадпрыемствы горада. Радасць крычаўлян пасля паражэння шведаў была вялікая, яны не скарыліся ворагу, а актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з ім.

Н.М. Марозава.

Прыгнёт і бяспраўе сялян

Крычаўскае староства размяшчалася ў ранейшым Мсціслаўскім ваяводстве, на памежжы Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Старостваміў той

час называліся дзяржаўныя ўладанні, якія ў большасці сваёй знаходзіліся ў пажыццёвым трыманні таго ці іншага магната або шляхціца. Той кіраваў староствам і адказваў за яго цэласнасць, маючы пры гэтым поўнае права распараджацца прыбыткамі ад уладання, за выключэннем так званай «кварты» (чвэрці агульнага прыбытку, якую трымальнік павінен быў штогод уносіць у дзяржаўную казну на ўтрыманне войска).

У другой палове XVII ст. Крычаўскае староства было падаравана князю Каралю Станіславу Радзівілу. Пасля яго смерці ў 1719 г. яно было перададзена ў спадчыннае карыстанне жонцы магната Ганне Радзівілавай. Пасля староства доўгі час знаходзілася ў руках іх сына Гераніма Фларыяна і іншых прадстаўнікоў буйнейшага ў Рэчы Паспалітай магнацкага роду Радзівілаў. Тыя, у сваю чаргу, здавалі Крычаўшчыну на пэўны тэрмін у арэнду іншым трымальнікам (архіўныя крыніцы іх называюць «дзяржаўцамі»).

Арандатары – часовыя гаспадары – перш за ўсё клапаціліся аб атрыманні максімальных прыбыткаў для сябе. За кароткатэрміновую арэнду трымальнікі староства імкнуліся выбіць з сялян як мага больш грошай: спаганялі больш, чым прадугледжвалася інвентарамі; абкладвалі іх рознымі грашовымі паборамі (метамі); прымушалі працаваць на будах ці ў прыватнай гаспадарцы без інвентара; чынілі перашкоды сялянскаму гандлю; прымушалі на сваю карысць выконваць падводную павіннасць; рабавалі і няўвечылі сялян.

Толькі за адзін год такога «гаспадарання» ў Крычаўскім старостве (з 24.6.1719 г. да 24.6.1720 г.) арандатар Уладзімір Пятровіч выбраў чыншу ў сялян звыш інвентарных нормаў на 3500 талераў. Акрамя таго, ён забіваў сялян да смерці, накладваў на іх розныя штрафы. Як відаць з сялянскіх скаргаў, «жывадзёр збожжа рознае звыш інвентарнага, коней, мёд, футры розныя, гвалтоўна біючы, выбіраў»...

Больш за 100 злотых звыш інвентарных прадпісанняў на працягу 1725–1727 гг. спагналі з сялян дзяржаўцы муж і жонка Валкавіцкія. У сваіх скаргах Радзівілу на Валкавіцкага сяляне зазначалі, што ён патрабуе павіннасці ў 5 разоў вышэйшыя, чым прадугледжана інвентаром. Прыгонныя скардзіліся, што Валкавіцкі абыходзіцца з імі, як з рабамі. Ён прымушаў сялян задарма працаваць на будах, а тых, хто на хвілінку спазняўся на працу, жорстка збіваў.

Арандатары самавольна забіралі ў крычаўскіх падданых агароды, гумны, нават засеяныя землі і аддавалі іх шляхце. У такіх выпадках сяляне былі вымушаны шукаць пусташы ці лясныя нерушы і ствараць там гаспадарку нанова, ці, не вытрымаўшы здзекаў, бегчы ад рабаўнікоў у іншыя ўладанні.

Невыносным цяжарам клаліся на сялян Крычаўшчыны ўсялякія штрафы. Арандатары трымалі спецыяльных слуг, якія толькі і рабілі, што сачылі за прыгоннымі, каб знайсці абы якую зачэпку дзеля накладання і спагнання штрафаў. Дзяржаўца Валкавіцкі меў у вёсках Крычаўскага староства некалькі дзесяткаў падобных слуг. Іх дзейнасць у асобных месцах прыносіла для арандатара прыбытак утрая большы, чым усе грашовыя падаткі цалкам. Да таго ж гэтыя слугі знаходзіліся на ўтрыманні сялян, апошнія павінны былі ўлагоджваць іх рознымі «падарункамі», што яшчэ павялічвала сялянскія расходы.

Асабліва цяжкае, проста невыноснае для сялян становішча склалася ў 30-х г. XVIII ст., калі староства арандавалі браты Гдаль і Шмуйла Іцкевічы. Сваёй жорсткасцю ў адносінах да прыгонных гэтыя арандатары не ішлі ні ў якое параўнанне са сваімі папярэднікамі. Наколькі вялікімі былі іх вымаганні, можна ўявіць па наступных лічбах: толькі за 4 гады (1736–1740) Іцкевічы выбралі ў насельніцтва Крычаўскага староства звыш устаноўленых норм каля 700 тыс. злотых, а за ўвесь час іх дзевяцігадовай арэнды (1731–1740) з сялян і гараджан спагнана звыш належнага 1298909 злотых, 120270 коп пянькі, 39 вазоў мёду.

Па загаду арандатараў сяляне вымушаны былі вазіць на ўласных падводах паташ, пяньку, алей у Пецярбург, Невель, Вялікія Лукі, Свержань, Слуцк. Без дай прычыны слугі – наймітыІцкевічаў – збівалі простых людзей, забараняючы ім у той жа час скардзіцца Радзівілу на самавольныя расправы. Па гасцінцах староства снавалі прыслужнікі арандатараў, якія затрымлівалі тых, хто адважваўся несці скаргі да князёў Радзівілаў. Хадакоў-суплікантаў (так называліся сяляне, якія дастаўлялі гаспадарам скаргі-суплукі) жорстка каралі: катавалі, штрафавалі, кідалі ў турму.

Адным са шматлікіх суплікантаў, якія бясконца цярпелі ад слуг-наймітаў арандатараў, быў Васіль Вашчыла, войт вёскі Селішча.У кастрычніку 1731 г., вяртаючыся з Міра, куды хадзіў са скаргай сялян да Радзівіла, ён быў затрыманы слугамі Гдаля Іцкевіча, закаваны ў ланцугі, збіты і кінуты ў крычаўскую турму. Крыху раней Вашчыла быў пакараны 150 ударамі бізуна, зноў жа за тое, што асмеліўся хадзіць са скаргай да Радзівіла ў Варшаву. Пасля экзекуцыі Васіль Вашчыла доўгі час хварэў.

Наогул у шматлікіх скаргах адзначалася, што ад здзекаў слуг Іцкевічаў нямала сялян-скаржнікаў «не маглі падняцца з ложка, а некаторыя нават памерлі».

Самавольства арандатараў прывяло да таго, што ўвосень 1739 г. у сувязі з нястачай насення, якое са свірнаў выбралі слугі часовага гаспадара, у большасці сялянскіх гаспадарак азімыя не былі пасеяны. У той жа час трымальнік працягваў спусташаць двары прыгонных, з гэтай мэтай вясной 1740 г. у Крычаўскім старостве ім было згрупавана некалькі соцень конных наймітаў, якія пагражалі падданым шыбеніцамі, спаленнем, поўным вынішчэннем.

Дзікая жорсткасць арандатараў і іх прыслужнікаў у адносінах да насельніцтва Крычаўшчыны прывяла ў самы разгар палявых работ да масавых уцёкаў сялян у лясы. У старостве склалася катастрафічнае становішча. У суплікаў, якія бясконца ішлі да Радзівілаў, земляробы, рамеснікі пісалі, што ім нічога не застаецца рабіць, як «узяцца за рукі і выступіць, каб абараніць сябе ад пагібелі».

В.І. Мялешка, П.А. Лойка.

Крычаўскае паўстанне на чале з Вашчылам

Узброеныя выступленні працоўных супраць прыгнятальнікаў заўсёды былі вышэйшым выражэннем вольналюбівага духу народа. Да ліку такіх выступленняў адносіцца і Крычаўскае паўстанне 1740–1744 гг. пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы.

Крычаўскае староства, якім у пер-

шай палове XVII ст. валодалі князі Радзівілы, было адным з буйнейшых ва ўсходняй Беларусі. У склад яго ўваходзіла значная частка тэрыторый цяперашніх Крычаўскага, Клімавіцкага, Хоцімскага і Краснапольскага раёнаў.

Староства было здадзена Радзівіламі ў арэнду. Арандатара не хвалявaў той факт, што ўрадлівасць глеб катастрафічна падала, знішчаліся лясы, зняслеными празмернай фізічнай працай сяляне раней часу траціліпрацаздольнасць. Не рэагавалі на самавольства арандатараў улады, наадварот, абараняліх з дапамогай салдат.

Цікавым у гэтых адносінах з'яўляецца «указанне» княгіні Ганны Сангушкі-Радзівіл, накіраванае «пану Шышку», адміністратару Крычаўскага староства. Княгіня, ведаючы гаротнае становішча працоўных у старостве і баючыся іх актыўнага супраціўлення, вымушана была даць шэраг указанняў свайму намесніку для больш асцярожнай эксплуатацыі сялян і гараджан. Акрамя таго, княгіня была незадаволена, што частка грошай і прадукцыі сельскай гаспадаркі, якія адбіраліся ў сялян, ідзе не ў княжацкую казну, а намесніку і яго хаўруснікам.

З гэтага дакумента відаць, што ў Крычаўскім старостве, акрамя галоўнага арандатара, былі і больш дробныя. Яны бралі на водкуп корчмы, млыны, пераезды цераз рэкі і г.д. Селянін мог купляць неабходныя тавары толькі ў свайго арандатара. Арандатары мелі права прымушаць сялян той ці іншай вёскі малоць зерне толькі ў іх млынах.

Таму княгіня і нападае ў сваім «указанні» на арандатараў. Яна адзначае, што драпежніцтва арандатараў давяло жыхароў староства да таго, што тыя «падаткаў дзяржаўных і казённых княжацкай казне не могуць плаціць». Яна, напрыклад, патрабуе паменшыць колькасць пітных устаноў, якія знаходзяцца ў руках арандатараў, таму што яны «спайваюць халопа і яго жонку, забіраюць сабе з такоў хлеб, які ім толькі падабаецца».

У руках арандатараў знаходзіліся і ключы ад праваслаўных цэркваў: нарадзілася ў сям'і дзіця – трэба было плаціць арандатару, памірaў хто-небудзь – таксама плаці. А калі не будзеш плаціць, арандатар не дасць ключы ад царквы.

Пянька ў тыя часы была адным з асноўных тавараў, якія карысталіся значным попытам за мяжою. Таму княгіня загадвае сялянам прадаваць пяньку толькі княжацкім скупшчыкам пры ўмове, калі павіннасці селянінам ужо выкананы. Калі ж за ім меліся нядоімкі, то пяньку княгіня загадвала забіраць у лік павіннасцей. Безумоўна, княгіня і яе акономы ўсяляк занiжалі цэны на пяньку. Добра разумеючы, што калі-небудзь сяляне ўзбунтуюцца, яна рэкамендуе часцей пасылаць па старосту для збору падаткаў узброеных драгунаў. І яны павінны ездзіць па вёсках датуль, «пакуль усе падаткі не будуць сабраны да апошняга гроша». Адначасова ёю даецца ўказанне стварыць у Крычаве вайсковую часць, выдзеліць «для яе пляц» і пабудаваць за кошт жыхароў горада казармы для салдат. Тых, хто не мае магчымасці заплаціць падаткі, Ганна Сангушка-Радзівіл раіць браць «на работу з тапаром для пабудовы».

Багдан Шышка, які насіў тытул адміністратара Крычаўскага староства, лічыўся намеснікам княгіні. Праз яго ішлі ўсе княжацкія распараджэнні, ён карыстаўся вышэйшай уладай на месцы. І, вядома, пан Шышка выкарыс-

тоўваў сваё становішча ў карыслівых мэтах не менш, чым арандатары. Раз на год ён павінен быў аб'язджаць староства. Пры гэтым пажадана было, каб аб'езд яго супадаў са жнівом. У час такіх паездак яго суправаджала цэлая хэўра дробнай шляхты.

Была яшчэ адна форма эксплуатацыі – ліхвярства арандатараў. Яны заўсёды былі гатовы пазычыць збяднеўшаму селяніну грошы, аднак пры ўмове, «што за год нарастае 100 працэнтаў і больш». А княгіню хвалявала тое, што ліхвяры забіралі ў «халопаў» тыя прадукты, якія «належалі канфіскацыі ў княжацкую казну». Таму ў далейшым ліхвяр павінен спачатку паказаць адміністратару вопіс сялянскіх даўгоў з уласнымі распіскамі даўжнікоў і толькі з дазволу апошняга пачынаць збор. Гэты факт гаворыць аб двайной эксплуатацыі.

Здзекваліся над сялянамі прадстаўнікі адміністрацыі староства і салдаты. Суправаджаючы адміністратара ці галоўнага касіра, яны, нібыта зграя коршунаў, насіліся па крычаўскіх землях. Польскі гісторык Старавольскі пісаў: «наш жаўнер не ведае ні веры, ні айчыны: атрымае ад Рэчы Паспалітай жалаванне і прап'е яго ў адзін вечар, а потым дастае сабе адзенне, вупраж у бедных людзей, рабуе ў іх усяго і вязе ў абоз, а там раскіне палатку і прадае нарабаванае».

Сярод зямель Крычаўскага староства было шмат і шляхецкіх уладанняў. Шляхцічы таксама, карыстаючыся «залатымі вольнасцямі» і прывілеямі, забіралі не толькі дровы, лес, але і палі і сенажаці княжацкіх халопаў, пагражаючы ім забойствам.

За кошт народа жылі і святары, каталіцкія і праваслаўныя.

Галодны, напаўраздзеты, задаўлены нястачай і дзікім самаўпраўствам арандатараў селянін усё ж змог захаваць імкненне да свабоды. Невыпадкова княгіня біла трывогу, адзначаючы, што ўцёкі прыгонных з яе зямель пачасціліся.

Яна патрабавала лавіць і караць уцекачоў. Княгіню палохала тое, што ў яе вёскі часта заходзілі «сваявольныя людзі» з Расіі, якіх яна называла разбойнікамі. Баючыся ўплыву гэтых людзей на жыхароў староства, княгіня ў сваім «указанні» павучала:

«З прычыны таго, што Крычаўскае староства знаходзіцца ля самай маскоўскай казацкай мяжы, шмат розных людзей, зладзеяў і разбойнікаў выходзіць і на кватэру ў вёскі напрошваецца, то войты павінны па вёсках патрабаваць таго, каб такіх людзей у вёскі не прымалі, а заўважыўшы пасля такога чалавека нядобрыя справы, тут жа давалі вестку ў замак і прыводзілі разам з сабой вінаватых».

У 1732 г. арандатарам Крычаўскага староства стаў слуцкі багацей Гдалій, родны брат вядомага сваёй лютасцю галоўнага касіра Радзівілаў Шмуйлы Іцкевіча. Новы арандатар быў незадаволены тымі даходамі і падаткамі, якія атрымлівалі яго папярэднікі. Ён увёў новыя працоўныя павіннасці, зрабіўшы гэтым самым жыццё сялян невыноснай катаргай. А каб сяляне не парушалі ўстаноўленых правілаў, Гдалій загадаў сваім памочнікам «апісваць пяньку пад штрафам і ў продаж сабе ўсю без астатку забіраць, не пакідаючы ім на хатнюю патрэбу, а плаціць за гэтую пяньку вельмі мала».

Да ўсяго прыбавіліся і здзекі вайскоўцаў. У красавіку 1735 г. віцебскі ваявода Марцін Агінскі, яго браты Фадзей і Станіслаў сумесна з камандзірам памежнай варты Мсціслаўскага

ваяводства Антонам Пацеем арганізавалі рабаўнічы паход на Крычаўскае староства. Жыхары Крычава выслалі насустрач ім дэпутацыю. Але ротмістры Чарняўскі і Пачабут загадалі страляць ва ўдзельніккаў дэпутацыі. Крычаў быў разрабаваны і часткова спалены.

Далей у такіх умовах жыць было немагчыма. Па даручэнню жыхароў староства да Радзівілаў было накіравана некалькі ганцоў са скаргамі. Баючыся народнага бунту, Радзівілы адмовілі Гдалію ў арэндзе.

Праз некаторы час ад імя жыхароў староства сялянскі сын, «хоцімскі воскам купец» Васіль Мацвеевіч Вашчыла, Іван Карпач, Сцяпан Бочка і Іван Белка зноў звярнуліся да князя. Падзякаваўшы ў пісьме княжацкую сям'ю за адхіленне Гдалія ад кіравання староствам і «парадаваўшыся, што арандатары цяпер не будуць здзекавацца», яны настойліва патрабавалі адмены ўсіх тых падаткаў, што прыдумалі «драпежнікі-арандатары». Аўтары пісьма ўказваюць, што ў час выціскання падаткаў «у старостве ад здзекаў і непасільный працы загінула некалькі тысяч люду».

Указваючы на неабходнасць хутчэйшага палягчэння падатковага цяжару, аўтары пісьма адзначалі: «...адкуль жа нам, гаротным, узяць, калі з цяжкасцю можам пракарміць нашы душы; ужо мы зрабілі масу даўгоў, адны на падаткі невыносныя, другія – на хлеб, таму што нам забаранялі яго мець, заўсёды з гумна, не то што са свірна, забіралі арандатары».

Але дарэмна звярталіся крычаўцы да Радзівілаў.

Стаўшы ўладаром староства, сын княгіні Ганны Геранім Радзівіл, чалавек жорсткі і прагны, у адказ на пісьмо загадаў аддаць староства ў арэнду свайму галоўнаму касіру Шмуйле Іцкевічу, а вінныя водкупы, млыны і збор некаторых падаткаў – Шмуйле Лейзаровічу.

Самыя цяжкія часы, перажытыя пры Гдалію, пачалі паўтарацца яшчэ ў больш рэзкай форме. Цяпер ужо ўсе ўпэўніліся, што застаўся адзіны выхад – узброеная барацьба. Становішча ў Крычаўскім старостве было напружаным. У замак князёў сыпаліся скаргі.

П. Чалоўскі, удзельнік паўстання, успамінаў аб гэтым так. Для праверкі скаргаў сялян быў накіраваны ў Крычаў камісар Андрэй Шыяноўскі. Ён даведаўся аб фактах жорсткага гвалту над жыхарамі староства з боку арандатараў. Шмуйла Іцкевіч запатрабаваў адклікаць камісара з Крычава. Тады сюды прыслалі другога камісара – Самуіла Татарына. Але і гэты пад націскам галоўнага касіра вымушаны быў пакінуць горад. Жыхары староства ўзбунтаваліся.

Калі і як пачалося паўстанне ў Крычаўскім старостве? Ва ўсіх навуковых працах, дзе толькі закранаецца гэтае пытанне, названа адна дата – 1740 год. Прычынай паўстання гісторыкі лічаць праверку зямель Крычаўскага староства. Праверка праводзілася з мэтай адшукання лішкаў зямель і шляхоў новага павелічэння падаткаў. У пацвярджэнне такога даваду прыводзяцца часцей за ўсё дакументы з XVII выпуску «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», узятых з актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў (1888 г.).

Праверка зямель, як сведчаць гэтыя дакументы, праводзілася паводле распараджэння князя Гераніма Радзівіла ад 24.6.1740 г. Але на стар. 279 указанага выпуску дакументаў ёсць такое пісьмо князя да свайго намесніка:

«Пан намеснік майго Крычаўскага староства! З пісьма вашага я даведаўся пра якіясьці свавольніцтвы і бунты, што ўзнікаюць сярод сялян Крычаўскага старосцінства. Бачачы ў гэтым штосьці незвычайнае, даручаю і загадваю вам, у папярэджанне, усімі мерамі...граміць і дастойна караць свавольнікаў, адсылаючы бунтаўшчыкоў у Слуцкую маю крэпасць, для ўціхамірвання іншых незадаволеных бунтаўшчыкоў.

Аб гэтым яшчэ раз паўтараю.

Белая, 23 чэрвеня 1740 года.»

Выходзіць, што пісьмо аб падаўленні бунтаў князь напісаў раней, чым выдадзены загад аб праверцы зямель. Значыць, бунты пачаліся задоўга да ўзнікнення думкі аб праверцы зямель. А скарга шляхцічаў Кордаў, на якую звычайна робяць спасылкі даследчыкі, упісана ў крычаўскія магдэбургскія кнігі 1.8.1741 г. Загад жа аб праверцы зямель быў занесены сюды 3.1.1741 г. З гэтага дня і магла пачацца праверка (пасля атрымання загаду). Але ва ўмовах зімы правяраць землі цяжка. Трэба было чакаць вясны. Па гэтай прычыне праверка зямель не магла пачацца ў 1740 г. і нават у пачатку 1741 г.

Таму прычыну паўстання трэба шукаць не ў праверцы зямель, а ў эксплуатацыі, якой падвяргаліся жыхары Крычаўскага староства.

Гаворачы аб пачатку і прычынах паўстання, не лішнім будзе прывесці вытрымкі з пісьмаў Гераніма Радзівіла да сваёй сястры княгіні Яблоноўскай. У адным з іх чытаем:

«Падумай, Ваша светласць, дарагая сястрыца, сваім дапытлівым розумам, ці не знайшліся б і ці не знойдзецца ў мяне шмат такіх людзей, каб даць адпор бунтаўшчыкам і разбіць іх, не ўмешываючы ў гэта маю асобу».

Гэтае пісьмо некаторыя спецыялісты адносяць да 1740 г. Таму магчыма, што паўстанне ў 1740 г. ужо дасягнула вялікай сілы.

Князь рашыў патапіць яго ў крыві. У 1740 г. ён звяртаецца да гетмана М. Вішнявецкага з просьбай паслаць у Крычаў войскі. У тым жа годзе гетман загадаў мінскаму стольніку і гусарскаму паручніку Валадкевічу, вайсковая часць якога была размешчана на тэрыторыі староства, падаўляць паўстанне «любым чынам». Аднак гусарскі паручнік не змог апраўдаць даверу князя і гетмана. Паўстанне шырылася.

У XVII выпуску «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» ёсць некалькі скаргаў крычаўскіх багацеяў, адкуль відаць, што паўстаўшыя забівалі найбольш ненавісных арандатараў, ліхвяроў і княжацкіх слуг. Аб гэтым расказвае І.А.Меер. Сам Радзівіл у пісьме да магілёўскага архіепіскапа адзначыў, што ў час паўстання «больш за тысячу чалавек смяртэльна пабіта».

М.Скібнеўскі пра арганізацыю паўстаўшых пісаў: «Паўстаўшыя стварылі ўзброены атрад колькасцю ў 3000 чалавек, а правадыром выбралі сабе Вашчылу». Вашчыла ж «...выбраў сабе яшчэ чатырох памочнікаў: Карпача, Стэся з сынам і Мікіту».

Іван Карпач, міласлаўіцкі месціч, быў першым памочнікам Вашчылы, Стэсь кіраваў буйным Жабычанскім (Забычанскім) войтаўствам. Скібнеўскі ўспамінае яшчэ і пра сына Стэся. Ім, відаць, быў Вецер Папетышка, паколькі яго імя заўсёды стаіць пасля імя Стэся. Мікіта Бочка быў жыхаром Крычава.

Сяляне і гарадская беднота, з'яўляючыся галоўнай рухальнай сілай паўстання, патрабавалі ад яго кіраўнікоў рашучых мер па палягчэнню станові-

шча. Таму ўсе багацеі, каго не знішчылі паўстанцы, былі абкладзены падаткамі. Сабраныя сродкі размяркоўваліся сярод тых, хто меў патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе.

Радзівіл, напалоханы паўстаннем, накіраваў у Крычаў сваіх камісараў Корсака і Кулена, якія павінны былі спачатку выявіць «прычыны бунтаў», а затым паспрабаваць прымусіць паўстаўшых, каб тыя «прыйшлі да сваіх павіннасцяў». Але місія радзівілаўскіх камісараў не завяршылася поспехам. Паўстанне шырылася. Князь пачаў пасылаць у свае староствы войскі. Прыходзілі туды, накіраваныя Радзівілам, нават саксонцы, але яны не асмеліліся ўступіць у працяглую барацьбу з паўстаўшымі і абмежаваліся нязначнымі сутычкамі з імі.

Імкнучыся прыцягнуць на свой бок як мага больш змагароў, Вашчыла абвясціў сябе ўнукам Багдана Хмяльніцкага.

Вывучаючы дакументы, якія асвятляюць гісторыю паўстання, прыходзіш да вываду, што паўстанцы не лічылі Крычаў сваім пастаянным цэнтрам. Сярод месц, дзе базіраваўся штаб паўстанцаў, значыцца і вёска Свірэль (у цяперашнім Клімавіцкім раёне). Магчыма, калі горад часова займалі войскі карнікаў, штаб адыходзіў углыб староства, у лясныя вёскі.

Кіраўнікі паўстання імкнуліся падтрымліваць поўны парадак у старостве. З агентурай князя вялася барацьба. Так, шпіёна Радзівіла нейкага Ехіля, сына гандляра гарэлкай, прынародна ўтапілі ў Сажы.

Аб тым, што паўстанне ў Крычаўскім старостве атрымала шырокі размах, гаворыць ужо, напрыклад, той факт, што за развіццём яго сачылі нават правіцелі некаторых еўрапейскіх дзяржаў. Прускі кароль Фрыдрых II рэгулярна атрымліваў паведамленні аб ходзе паўстання ад свайго шпіёна палкоўніка Грышчынскага. Саксонскі прэм'ер-міністр таксама пастаянна атрымліваў данясенні ад свайго рэзідэнта Гофмана. Крычаўскае паўстанне набыло, такім чынам, міжнароднае значэнне. Фрыдрых II і Брул, бачачы, што паўстанне цягнецца некалькі год, западозрылі ва ўсім гэтым дзейнасць урада Расіі. Яны баяліся, каб Вашчыла не зрабіў у Беларусі таго, чаго дасягнуў Б. Хмяльнікі на Украіне.

Восенню 1743 г. Геранім Радзівіл, расчараваны няўдалымі спробамі расправіцца з паўстаўшымі, рашыў прымяніць самыя «крутыя» меры. Ён пачаў збіраць вялікае войска. Адміністратару староства былі дадзены адпаведныя інструкцыі. Апошні запатрабаваў ад Вашчылы выплаты нядоімак. Вашчыла падпарадкавацца адмовіўся. Тады князь паслаў у Крычаў новага намесніка – познаньскага каморніка Паўла Цалецкага. Але і Цалецкаму, як і яго папярэднікам, давялося хутка ўцякаць з Крычава. Войскі Радзівіла тым часам падыходзілі да горада. Дрэнная пастаноўка разведкі ў лагеры паўстанцаў перашкодзіла ім своечасова даведацца аб гэтым. Больш таго, калі да горада адначасова з некалькіх бакоў падыйшлі ўзброеныя артылерыяй войскі Пястржыцкага, кіраўнікі паўстання загадалі сабраць з кожнага двара ўсяго толькі па аднаму ўзброенаму чалавеку.

У студзені 1744 г. Крычаў быў захоплены войскамі. Вашчыла, Карпач і Вецер, збіраўшыя ў гэты час паўстанцаў, падыходзячы да горада, убачылі, як ён гарэў. Тыя з крычаўлян, хто выратаваўся ад войска Пястржыцкага, расказалі пра здзекі, якія чынілі

карнікі над гараджанамі. 15 лютага недалёка ад спаленага Крычава адбыўся бой. Гарматнай стральбой атрад Вашчылы быў разбіты. У гэтым баі загінулі 300 паўстанцаў, 76 чалавек былі паранены. У палон трапілі Стэсь, яго сын і Мікіта. За самім Вашчылам наладзілі пагоню.

16 лютага ў Крычаў заявіўся князь. Пачалася расправа, якая была настолькі лютай, што сам Радзівіл у пісьме да сястры прызнаваўся: «...крывавыя подзвігі зусім не да густу прыдуцца маім блізкім». Горад быў разбураны. У замку дзень і ноч катавалі людзей. П. Чалоўскі, таксама арыштаваны, пісаў рускаму царкоўнаму начальству, што да яго вушэй у тыя дні даносіўся «вялікі стогн тых людзей, якіх недалёка ад нас катавалі рознымі карамі... драўляныя спіцы, пакрытыя серай, за ногці забівалі і падпальвалі...». Іван Карпач быў зашыты ў скуру мядзведзя і кінуты сабакам, а Вецер пасаджаны на кол. Па ўсяму Крычаву і ўздоўж берагоў Сажа былі расстаўлены шыбеніцы.

Геранім Радзівіл і ўлады думалі, што лютая кара запалохае народ. Але здарылася наадварот. Насельніцтва Крычаўскага староства працягвала барацьбу. Больш таго, «у іншых уладаннях вялікі мяцеж учыніўся». Да ліку такіх уладанняў адносіліся землі магнатаў Агінскіх, Сапегаў, Шчытоў у Мсціслаўскім ваяводстве і ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. У замак да Радзівілаў не перастаўалі паступаць просьбы шляхты абараніць іх ад бунту сялян і гараджан. Князь пісаў у той час у пісьме да сястры, што «я здаволіў іх жаданне ўсмірыць бунты».

Але «усмірэнне» нялёгка далося князю. Сам ён у адным з баёў атрымаў рану.

Найбольш працяглай і настойлівай была барацьба на ўскраінах, якія знаходзіліся зусім блізка ля рускай граніцы. Рускія памежнікі не прапускалі польскіх жаўнераў на сваю тэрыторыю, у той час як паўстанцы маглі лёгка пераходзіць мяжу і вяртацца назад. Па суседству з Крычаўскім староствам, у памежным горадзе Мгліне, знайшоў сабе надзейны прытулак і Вашчыла.

Ход паўстання ў Крычаўскім старостве паказаў, што кіраўнікі яго дапусцілі шэраг сур'ёзных пралікаў. Яны не зрабілі Крычаў добра ўмацаваным цэнтрам, не мелі арганізаванай разведкі. Акрамя таго, Вашчыла не змог пашырыць раён паўстання, хоць і гаварыў, што пойдзе «на Магілёў і Шклоў».

Крычаўскае паўстанне было патоплена ў крыві. Жыхары Крычаўскага староства пакідалі родныя мясціны і шукалі паратунку за мяжой. Староства абязлюдзела. Напалоханы гэтым Радзівіл быў вымушаны праз 5 год падпісаць зварот да ўсяго народа староства. У звароце князь абяцаў даць сялянам вольнасці.

Трэба адзначыць, што ў гэты ж самы час на другой украіне Рэчы Паспалітай, у Прыкарпацці, зноў успыхнула шматгадовая барацьба пад кіраўніцтвам легендарнага Алексы Доўбужа. Беларускі і ўкраінскі народы змагаліся супраць прыгнёту. Барацьба гэта падрывала асновы дзяржавы і наблізіла час падзелу Рэчы Паспалітай.

М.Ф. Мельнікаў.

Лёс Васіля Вашчылы

Пасля паражэння пад Царковішчамі, калі Вашчыла зразумеў, што не зможа больш сабраць сялянскія атрады, каб супрацьстаяць радзівілаўскім наймітам, ён вырашыў ратавацца ўцёкамі ў Расію. Васіль здолеў вырвацца з Крычаўскага староства і дабрацца да Латакоўскага фарпосту, размешчанага на тэрыторыі ўжо Расійскай імперыі. Услед за сялянскім важаком імчалася пагоня – дзве харугвы жаўнераў.

Праследавацелі даскакалі да названага фарпосту, але схапіць Вашчылу не змаглі. На той час кіраўнік Крычаўскага паўстання быў перасланы з Латакоўскага фарпосту на Цімошынскую пагранічную заставу, а потым і далей – у Кіеў і Старадуб.

Радзівіл адразу накіраваў ліст у Кіеўскую губернскую канцылярыю з патрабаваннем выдаць яму важака прыгонных «бунтаўшчыкоў». Але расійскі бок адразу гэтага зрабіць не мог. Трэба было спачатку вызначыць паходжанне Васіля Вашчылы. Чаму? Ды таму, што калі б ён быў палічаны падданым Расійскай дзяржавы – маларасіянінам, то выдачы Рэчы Паспалітай у гэтым выпадку не падлягаў. Калі ж аказалася б, што ён беларус, ураджэнец Крычаўшчыны, то рускія ўлады павінны былі выдаць яго польскаму боку як уцекача. Паходжанне Васіля Вашчылы царскімі чыноўнікамі расследавалася вельмі старанна і вельмі доўга.

Кіеўскі генерал-губернатар Міхаіл Лявонцьеў пачаў справу з таго, што ў першыя дні сакавіка накіраваў у палкавую Старадубскую канцылярыю да палкоўніка Фёдара Максімовіча загад, каб той вызначыў паходжанне Ваш-

У Крычаве на 300-годдзі Васіля Вашчылы.

чылы і дэталёва разабраўся з месцам жыхарства родных Васіля. Аб выніках дазнання губернатар прасіў далажыць яму ў самы сціслы тэрмін.

Указ Лявонцьева начальнік Старадубскай канцылярыі атрымаў 6 сакавіка. У гэты дзень Максімовіч аддаў распараджэнне мясцовым уладам, у пыватнасці Аляксандру Карэцкаму, каб той паведаміў у канцылярыю, ці сапраўды ў вёсцы Вуношаве жывуць родныя браты Васіля Вашчылы Мацей, Ахрэм і Сямён. Калі жывуць, то з якога часу. І, канешне, Карэцкаму было загадана дазнацца, ці жыў у гэтай вёсцы сам Вашчыла.

Адначасова палкоўнік Максімовіч адаслаў почапскаму сотніку Івану Губчыцу загад пераканацца, ці сапраўды бацька і маці Вашчылы нарадзіліся і памерлі ў вёсцы Чамаданава Почапскай сотні Старадубскага палка.

Распараджэнне палкоўніка Максімовіча Аляксандр Карэцкі атрымаў 7 сакавіка. Ужо на наступны дзень ён накіраваў у Старадуб ліст, дзе паведамлялася, што браты Васіля Вашчылы Мацей, Ахрэм і Сямён «знаходзяцца ў ягоным падданстве, але адкуль яны родам, невядома, бо зайшлі сюды гадоў дзесяць назад. Бацька ж і маці Вашчылавы, таксама, як і ён сам, ніколі ў гэтых мясцінах не пражывалі і нічога пра іх тут ніхто не ведае.»

Почапскі сотнік Іван Губчыц ліст Максімовіча з паказаннямі Вашчылы аб сваім паходжанні атрымаў 9 сакавіка. Не марудзячы, ён пачаў наводзіць даведкі. І ў хуткім часе на стол начальніка Старадубскай палкавой канцылярыі лёг рапарт сотніка, у якім адзначалася, што, па паказаннях старажылаў вёскі Чамаданава і іншых навакольных вёсак, Васіль Вашчыла, а таксама ягоныя дзед, бацька і маці ніколі не жылі ў гэтай вёсцы. Пра іх тут ніхто не чуў.

Абодва рапарты палкоўнік Максімовіч адаслаў у Кіеўскую губернскую канцылярыю. Міхаіл Лявонцьеў атрымаў паперы са Старадуба 23 сакавіка. Азнаёміўшыся з рапартам Максімовіча, ён, у сваю чаргу, інфарміраваў Калегію замежных спраў аб усім, што датычылася Вашчылы, а таксама аб мерах па далейшаму высвятленню пытання аб яго паходжанні. Заканчвалася інфармацыя пытаннем: што рабіць з кіраўніком сялянскага руху, які знаходзіцца ў Кіеве пад вартай?

Калегія замежных спраў 24 красавіка 1744 г. выдала ўказ за подпісам графа Аляксея Бястужава-Руміна. Указ быў дастаўлены ў Кіеўскую губернскую канцылярыю. Ва ўказе гаварылася, што «у сувязі з немагчымасцю дакладнага вызначэння пытання, ці з'яўляецца Васіль Вашчыла сапраўды маларасіянінам і падданым яго імператарскай вялікасці, а абвінавачванні супраць яго настолькі сур'ёзныя, што заслугоўвае ён суровага пакарання, неабходна ў самыя сціслыя тэрміны даведацца аб ягоным паходжанні – адказаць на галоўнае пытанне, ці сапраўды Вашчыла маларасіянін, ці паляк. Але, маючы на ўвазе неаднаразовыя просьбы ўлад суседняй Рэчы Паспалітай, неабходна ў Кіеве ці ў якім іншым пагранічным горадзе правесці расследаванне справы Вашчылы змешанай камісіяй. З гэтай нагоды трэба звярнуцца з лістом да князя Радзівіла, каб той вызначыў са свайго боку некалькі асоб для ўдзелу у пасяджэннях гэтай камісіі». Ва ўказе асобна падкрэслівалася аб неабходнасці абнадзеіць «княжацкую міласць, што яе імператарская вялікасць непрыхільная патураць падобным, як з боку Вашчылы, самаволь-

ствам, таму і пайшла на стварэнне змешанай камісіі для правядзення следства».

Быў праведзены чарговы допыт Васіля Вашчылы, на якім высвятляліся падрабязнасці ягонага паходжання. Кіраўніку паўстання ў Крычаўскім старостве было прапанавана дэталёва выкласці свой радавод да трэцяга калена. Вашчыла пачаў з таго, што дзед ягоны – Пацэй – і бацька – Мацей Пацэевіч – сапраўды нарадзіліся ў Старадубскім палку, Почапскай сотні, у вёсцы Чамаданава. Бабка Васіля Ганна родам была з горада Почапа. У бабкі Ганны было двое братоў – Атрох і Іваška, па прозвішчу Лунянковы. Са слоў Васіля, дзед і бабка ягоныя разам з бацькам больш чым 70 год таму перайшлі на жыхарства з вёскі Чамаданава ў «Польшчу», у Крычаўскае староства, у вёску Лобжа. Там Вашчылавы продкі пражылі гадоў з дзесяць. Менавіта ў Лобжах і нарадзіўся Васіль Вашчыла...

Тут мы перарвем расказ Вашчылы, каб адзначыць, як даказанае ўжо, што кіраўнік Крычаўскага паўстання нарадзіўся на Крычаўшчыне, у вёсцы Лобжа. Праўда, аб месцы нараджэння Вашчылы ёсць і іншыя звесткі. Па словах старэйшага брата Васіля Мацея, ён нарадзіўся недалёка ад Лобжы, у вёсцы Мурын Бор. Беларуская, крычаўская зямля нарадзіла ў 1690 годзе свайго будучага героя – барацьбіта за справядлівасць, за лепшую долю для простых людзей.

А Вашчыла гісторыю сваёй сям'і працягваў апавядаць далей. Ён прыпамінаў, што ўся сям'я з Лобжаў пераехала на жыхарства ў маёнтак шляхціца Сваткоўскага, у вёску Мурын Бор Мсціслаўскага ваяводства. У Мурыным Бары, як сказаў Вашчыла, бабка Ганна, дзед Пацэй і бацька Мацей памерлі. Пасля страты ўсіх родных маці Васіля Вашчылы Марына разам з Васілёвымі братамі Мацеем, Ахрэмам і Сямёнам з апошняга месца жыхарства (маёнтка шляхціца Сваткоўскага) перайшлі ў вёску Селішчы Крычаўскага староства. Там яны пражылі 9 гадоў, пасля чаго пакінулі Селішчы і перайшлі ў Расію, у вёску Вуношава. Тут, па словах Вашчылы, гадоў дзевяць таму (прыкладна ў 1735 г.) маці ягоная Марына памерла. А што датычыцца братоў, працягваў Васіль, то яны дагэтуль жывуць у Вуношаве. Пра тое, як ён зноў апынуўся ў Крычаўскім старостве, Вашчыла расказаў наступнае: «Разам з жонкай сваёй і сынам Якавам хадзіў я да Селішчаў з Вуношава, каб забраць адтуль пажыткі. А вярнуцца хуткім часам неяк не выдалася. А там і жонка памерла. Так і застаўся жыць у Крычаўскім старостве».

Пакуль старадубская канцылярыя збірала звесткі аб паходжанні Васіля Вашчылы, канцылярыя губернскага горада Кіева 11 мая накіравала ў Калегію замежных спраў данясенне аб мерах, якія былі праведзены па расследаванню справы Вашчылы. У прыватнасці, паведамлялася, што вызначана месца работы змешанай рускапольскай камісіі – мястэчка Мглін, якое размяшчалася на аднолькава невялікай адлегласці як ад Старадуба, так і ад Крычава. Пра асобаў, якія ўваходзілі ў змешаную камісію з рускага боку, і плануемае месца яе работы быў інфарміраваны Радзівіл.

Для дакладнага высвятлення паходжання Васіля Вашчылы ён 10 мая пад аховай быў адасланы з Кіева ў Старадуб. Па распараджэнню кіеўскага генерал-губернатара М. Лявонцьева камандаванне фарпастоў, цераз якія

пралягаў шлях Вашчылы і яго ахоўнікаў, павінна было садзейнічаць таму, каб як мага хутчэй даставіць арыштанта да месца прызначэння.

Дзякуючы «клопатам» начальніка губернскай канцылярыі, падарожжа з Кіева ў Старадуб для Васіля Вашчылы не здоўжылася. Да месца прызначэння Вашчыла быў дастаўлены 18 мая. Там яго пасадзілі ў крэпасць. Але ад таго, што кіраўніка Крычаўскага паўстання перавялі з аднаго месца ў другое, расследаванне яго справы не паскорылася. Зноў перасылаліся лісты, указы, загады...

Пакуль круцілася гэтая папяровая карусель, Васіль Вашчыла, які ўвесь час знаходзіўся ў Старадубскай крэпасці пад асабістай аховай паручніка Сцяпана Грыгор'ева, цяжка захварэў. У прыватнасці, у рапарце да кіеўскага генерал-губернатара М. Лявонцьева паручнік адзначыў, што «арыштант Васіль Вашчыла, які знаходзіцца пад маёй аховай, дзён з дзесяць таму захварэў, ды і зараз ад хваробы не вызваліўся. А хвароба ў яго – крывавы мыт (дызентэрыя – *В. М., П. Л.*)»...

Не на жарт быў занепакоены хваробай Вашчылы і начальнік старадубскай канцылярыі. 25 жніўня, услед за рапартам Грыгор'ева, і Максімовіч накіраваў у Кіеў афіцыйны ліст, у якім просіць губернскую канцылярыю дазволіць змешанай камісіі пачаць следства па справе Вашчылы без ягонага ўдзелу, бо па загаду Генеральнай вайсковай канцылярыі ён павінен чакаць на станцыі Кралевецкай прыезду з Кіева імператрыцы Лізаветы Пятроўны.

Задаволіўшы просьбу палкоўніка Максімовіча, губернская канцылярыя ўказам ад 1 верасня дазволіла пачаць работу міждзяржаўнай следчай камісіі без удзелу ў пасяджэннях начальніка старадубскай канцылярыі.

Але дазвол гэты не спатрэбіўся. Пакуль ішла перапіска чыноўнікаў, хвароба Васіля Вашчылы прагрэсіравала. 26 жніўня стан здароўя вязня старадубскай крэпасці рэзка пагоршыўся. Палкоўнік Максімовіч інфарміраваў губернскую канцылярыю ў Кіеве: «Хворы вельмі слабы. Хоць лекар Капэ і прымяняе ўсе медыцынскія сродкі, але яны не дапамагаюць. Па закону хрысціянскаму Васілю Вашчыле была зроблена ўжо святая споведзь, і ён да боскіх святых тайнаў Хрыстовых быў далучаны. Няма ніякай надзеі, што ад хваробы сваёй Васіль Вашчыла вызваліцца і паправіцца».

У адказ на гэта паведамленне Кіеўская губернская канцылярыя вынесла загад, па якому палкоўнік Максімовіч павінен быў «вышэйазначанага Вашчылу», калі той памрэ, пахаваць. Аб гэтым жа трэба абавязкова інфармірваць польскі бок, каб у далейшым не было ніякіх сумненняў і дарэмных спрэчак. Але загад гэты спазніўся на 16 дзён. Падрыхтаваны ён быў 18 верасня, а Васіль Вашчыла памёр 28 жніўня 1744 года.

Так скончылася жыццё кіраўніка сялянскага руху на Беларусі – Васіля Вашчылы, які здолеў падняць працоўны люд на барацьбу супраць феадальнага прыгнёту. Вынікам мужнай барацьбы прыгонных стала паслабленне феадальнага прыгнёту ў старостве. Уладальнік Крычаўшчыны замяніў цяжкія работы на будах грашовым паборам, зняў шэраг абмежаванняў на сялянскі гандаль, адмовіўся ад здачы староства ў арэнду.

Галоўным жа вынікам Крычаўскага паўстання было тое, што сяляне атрымалі значны вопыт арганізаванасці, пэўнай свядомасці ў барацьбе супраць

сваіх прыгнятальнікаў. Упершыню ў гісторыі барацьбы сялянства супраць феадалаў на Беларусі прыгонныя стварылі нешта накшталт паўстанцкага войска, якое ваявала з радзівілаўскімі вайсковымі злучэннямі і часам нават перамагала.

В. І. Мялешка, П. А. Лойка.

Дакументы сведчаць

ЛІСТ БЕЛАРУСКАМУ ЕПІСКАПУ ГЕРАНІМУ ВАЛЧАНСКАМУ

1744 г., студзень

В генваре месяце (1744) около средних чисел прислан от князя полковник прозванием Пестрицкий с немалым числом воинских людей, который в городку Кричеве с командою своею остановился.

Купец Василий Вощило, видя своё нещастие, принудил людей простонародных того владения, чтобы по человеку с двора для отпору оного войску были в готовности, и пошел к показанному полковнику на встречу с разным ручным боем, с рогатинами и с пищальми, и с дубьём и с прочим, при котором случае людей его пушечною стрельбою и из мелкого ружья разбили, и многих мужиков, поймав, за рёбра на кручье, других по деревням перевешано, иных в полон забрано. Отчего не токмо в уезде Кричевском, но и в других владениях великий мятеж учинился; а оный Вощило едва бегством спасся и во область Малороссийскую скрылся.

После того скоро помянутой полковник Пестрицкий писал своим письмом к протопопу Кричевскому Михайле Волгу, дабы явился со всеми Кричевской протопопий к нему, полковнику, священниками для объявления королевских привилеев, княжих и комисарских презент, кто за чем живет, увещевая, а кто не явится, тыи за непослушание церкви лишены будут, а вместо их других определят. И вышеписанный протопоп, видя такое от полковника угрожание, писал до всех священников своим письмом, дабы в самой скорости явиться для приезду князя Радзивилла с помянутыми привилеями и поклоном.

Когда же явилися в помянутом городку, тогда застали и самого князя Геронима Радзивилла с большою партиею гусар, драгун, иноземцев; а пришед, около помянутого Кричева караулы найкрепчайшие поставил; а мы, священники, объявили вышеписанные привилеи и с презентами вся Кричевская протопопия при оном же объявлении сложили поклон и отдали 50 рублёв. Сим недовольствуяся, опять потому же велено собрать, а объявленные наши привилеи и презенты жид Шмуйло с княжим маршалком у себя удержал, в котором числе и от меня нижайшего презенты отобрано...а во омном мне нижайшему стало убытку рублёв с 30. Тогда же нас шести Засожских священников, именно: Григория Бруевича с сыном его Петром Саматеевских, Луку Савинича Милославского, Петра Страхановича Хотимского, Иоанна Стратановича Михайловского и меня нижайшего – за арестованы в неделю сыропустную в вечер и посажены в псарню между собак, где мы содержалися под крепким караулом через семь дней и ночей, перетерпевая лютость зимнюю, паче же того смрад и скаред собачей; другие же священники, видя такой страх, бегством спаслись. А мы были в отчаянии живота своего, слыша великий вопль людей, которые недалеко нас мучены разными муками: на тряску за руки и за ноги повешены, ломаны, огнем двумя палачами жгли; не токмо что тех их противных, и монахиню, которая жила в местечке Михалове, несколько нощей обнаживши жгли и в студни держали, а нам приказ был ничего друг с другом не говорить.

Против же второго на десять числа с субботы на воскресенье (1 неделя великого поста в 1744 году выпала не на 12, а на 11 февраля) первое великого поста по единому нас взято в полунощи в словесный допрос иноземцами; и розсажали нас всех порознь, иного в погреб, иного в трубу печную, иных при том мучении, завесив очи, водили мимо наготы женской, спрашивая у нас, есть ли чим откупитца и доправляя на нас по пяти рублёв штрафу. И при таком нашем бедствии мы им уступали всё без остатку, у кого какое ни было движимое и недвижимое наше имение. Они же паче того стращая в катовские руки отдать нас, спрашивали, что у кого есть готовых денег, хлеба, скота, пчёл и платия; ещё спрашивали по жидовских словесных доношениях, будто нас показали на пытки истязанные люди, якобы мы забрали

их жидовские оставленные пожитки; а те пожитки все разобраны были кто откуда прибывши из других владений, понеже в то время брать было оных не запрещено.

В том же выше означенном течении и тое ж нощи перед утрениею поведено нас из городка Кричева под караулом по одному к губернатору Павлу Телецкому, где мы, приходя на приуготованном челобитьи до князя Иеронима о помиловании и освобождении, принуждены подписаться; а писал оное доношение Кричевский писарь прозванием Папель. При том же обязано нас подписками на голой бумаге подписаться денежного штрафу с шести священников 850 рублей, с которого числа и мне нижайшему 100 рублёв платить было довелось, а сроку положено на две недели; и отпущено нас с позволительными письмами всякого по домам своим. Тем же временем кто сколько имел до последнего своего иждивения платился и не могли выплатить, иные разбежались кто где могли, и друг друга не знаем, кто где ныне живёт. И же нижайший, не имея чем платиться, также того на пути услышал, что в то время по местечкам, сёлам и деревням разослана была команда жолнер и гусар, которые те посланные, деревянные спицы, обмачивая в серку, за ногти забивали и зажигали и другими нещадными муками мучили, отбирая деньги и скот и хлеб, у кого что ни было, не доезжая до своего дому разстоянием вёрст за пятнадцать, с людми увёз тайно попадью свою с двоими своими малыми детьми, не забирая своих никаких пожитков, токмо душею и телом спаслись, проехали на одной подводе через форпост в деревне Борках, в вотчине князей Волохских, в команде Красно-Заборской волости; жил во владении, явясь господину Захарию Васильевичу Букольцову, в селе Розрытом при церкви рождества богородицы попа Ивана Петрова, питаяся по миру, христа ради прося милостыни; к тому же ещё ноги поморозил, сидя под неволею, и ходить было нельзя.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 632–635.

ПАСТАНОВА КРЫЧАЎСКАГА МАГІСТРАЦКАГА СУДА АБ ПАКАРАННІ АРГАНІЗАТАРАЎ ПАЎСТАННЯ

22 лютага 1744 г.

На уряде е.к.м. городском права молдебурского Кричевским перед мною, Павлом Телецким, подкоморием познанским, губернатором и ландвойтом Кричевским и перед нами, бурмистрами, райцами, лавниками по делам судовым городским, в этом году на ратуши заседающими, от прокурора это криминальное дело отдано для внесения в книгу Кричевской могдебургии такими словами писано: 1744 г., февраля 22 дня перед нами, Теодором Козлом, Яном Карабанем бурмистрами, а также райцами, лавниками и всем магистратом по делам судебным городским, в этом году в ратуше заседающими по реляции инстигатора из показаний Петрака Попла устенского, Ивана Клименка березковкого, Семёна Бочка олычского, Захарки Шляхтоки домамиричского войтов, а также мужей всего Кричевского староства, припала справа об обидах, причинённых разным лицам, бунтовщиков и спокойствие нарушителей – Ивана Карпача, Стеся Бочки, Васьки Ветра, Ивана Докуки, Мекиты с Боровков, Наума Буяна, Захорки Савтужонка, Ивана Грушенка, Иванушки с Баранкова, Микиты с Тупичына, Васьки Костина, Семёна Бороны, Васьки Почаёнка, Игната Молуёнка, Ивана Кривули, Яна Голонки – самых главных предводителей разбойников Фёдора Барана, Осипа Колесника, Кузьмы Ямченка, Курилы Рихлёнка, Атрохима Стриженка, Ивана Белохвошенко, Ивана Лыча, Кузьмы Гаврилёнка, Ивана Оверченко, Игната Максименка с Гослова, Михайла Кривули, Прокопа Ветра, помощников оных, Филата с Гроново, Васьки Медына, сына и парабка Стеся Бочки, парабка Докуки, Иванушки с Хоцимска и иных в допросах выраженных менее виновных, в то время пойманных.

Мы, уряд Кричевской молдебургии, выслушав обе стороны установили явное бунтовство, учинённое вышеписанными гловарями, продолжающееся в течение 4 лет, в которых бунтах упоминаемые бунтовщики, ордынансов к ним присылаемых от ясновельможного князя е. м. Радзивилла, подчашего Вел. кн. Лит., пана нашего милостивого, не признавали в оным не подчинялись, принимая их за вымышленные, с оными приезжающих к себе губернаторов, комиссаров и от них поставленных по фольварках подстарост и изгоняли, некоторых били, мордовали, имущество их забирали, на свой пожиток обращали; евреев, евреек и детей малых били, убивали, топили, добро их забирали и им пользовались, купцов, в месте Иеронимове проживающих, по имени Михайло Белавитеня и Семёна – тестя его, убили и тела их в Соже утопили и иных тамашних мещан также били, калечили, мордовали, имущество их движимое, деньги готовые, серебряные вещи, медь, олово и другое имущество забирали,

грабили и в свою пользу обращали и, наконец, на людей собственного пана ясновельможного князя е.м.Радзивилла подчашего Вел. кн. Лит., пана милостивого, с ордынансами прибывавших, дважды, один раз под Кричевом, другой – под Церьковищами, с оружием вступить отважились.

Поэтому мы, уряд Кричевской магдебургии, в соответствии с правом посполитым раздзела 1, артикула 3, статуса 1588 г. о таковых своевольных купах строго описанного, заботясь, чтобы в будущем такого не повторилось и не делалось, выслушав показания, данные под присягой жалующейся стороной, то есть Петрака Попла, Гришки Граневского, Захарки Демамирицкого, войтов, о том, что вышеуказанные предводители в течение четверти года целые волости бунтовали, о том, что их призывы привели к бунту, ордынансы ясновельможного князя за недействительные признавали...по исполнении присяги присуждаем и приказываем помененных разбойников Ивана Карпача, Стеся Бочку, Ваську Ветра, Микиту с Боровков, Ивана Труса, Наума Буяна, Ваську Пушенка, Ваську Костина живых посадить на кол; Ивана Докуку, Захарку Семашко, Иванушку и Микиту Ступичина на шибеницу повесить; Семёну Вороне, Игнату Молуенку, Ивану Кривулю, Яну Голонку отрубить голову; Фёдора Барана, Осипа Колесника, Кузьму Ячменка, Курила Рихлика, Атроха Стриженка, Ивана Белохвощенка, Ивана Сычёнка, Кузьму Гаврилёнка, Ивана Оверченка, Игната Максименка бить розгами у позорного столба, а затем отрезать по одному уху; Михаила Кривулю, Пракопа Ветра, Ваську Медынина, сына Стасевого и Ивашку с Хотимска наказать только розгами у позорного столба и изгнать из города.

И такое наказание, а также присягу стороны жалующейся назначаем на 26 февраля в г. Кричеве. Других же менее виновных, пойманных в это время и в допросах названных, так как вина их не была установлена, от наказания освобождаем.

Которое дело до книг магдебурских записано.

(Подпись)

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 632.

З ДАНЯСЕННЯ СВЯШЧЭННІКА в.БЯСОВІЦКІЯ КРЫЧАЎСКАЙ ПРАТАПАПІ ПЯТРА ЧАДЛОЎСКАГА БЕЛАРУСКАМУ ЕПІСКАПУ ГЕРАНІМУ ВАЛЧАНСКАМУ АБ ПАЎСТАННІ Ў КРЫЧАЎСКІМ СТАРОСТВЕ 1744 г. (НЕ РАНЕЙ ЛЮТАГА 4 – НЕ ПАЗНЕЙ МАЯ 24[1])

В прошедших годах назад тому лет з 12 и больше по некоторой своей нужде кн. Радзивиллова староство Кричевское изволило на урочные годы отдать во владение неверному жиду именно Гдале, жителю слуцкому. И как принял во владение помянутый жид Гдалий староство Кричевское в волость, начал не так, как другие, прежде бывшие владельцы поступать, но всякими отягощать безмерными денежными податьми тамошних крестьян, излишне вымыслив рабочие лесовые заводы, где построил поташние и гардашние заводы и под оный поташ и гордаш брал хотя с наймом с уезду подводы для поставки оных товаров, к пристани, от чего немалую излишнюю нужду и крайное разорение крестьяне претерпевали.

Также наложил откупные кабачные и прудовые денежные великие зборы и продажу пеньки, покупку соли и протчие несносные отягощения на крестьян...

И видя такое разорение и нападки, того уезду природной мужик Василей Матвеев по прозванию Вощило, который жительство имел в помянутом уезде Кричевском в дер. Селичах, согласяся с протчими того уезду Кричевского людьми, посылал многократно нарочных ходоков к помянутой кн. Радзивилловой просить на оного жида, но которому прошению отто владения оному жиду отказано...

В генваре месяце около средних чисел прислан от князя полковник прозванием Пестрицкий с немалым числом воинских людей, который в городку Кричеве с командою своею остановился.

И помянутой Василей Вощило, видя своё нещастие, принудил людей простонародных того владения, чтоб по человеку с двора для отпору оного войску были в готовности, и пошел к показанному полковнику встречю с разным боем, с рогатинами и с пищальми, и с дубьём и с прочим, при котором случае людей его пушечною стрельбою и из мелкого ружья разбили, и многих мужиков, поймав, за рёбра на крючье, других по деревням перевешано, иных в полон забрано, отчего не токмо в уезде Кричевском, но и в других владениях

[1] Дата атрымання данясення Сінодам.

великий мятеж учинился; а оной Вощило едва бегством спасся и во область Малороссийскую скрылся...

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 632–635.

КРЫЧАЎСКІЯ ДЗЯРЖАЎЦЫ

Андрэй Ковач, альбо Андрэйкавіч, 1483–1492 (?).
Занька Жаба, 1500.
Астафій Дашковіч, 1501–1503.
Пётр Епіхамовіч, 1503–1504 (?).
Ян Яновіч Забярэзінскі, 1507.
Васва Іванавіч Ошушысін, 1508–1509.
Цімафей Іванавіч Капуста, 1511.
Юры (Ян) Неміровіч, 1514.
Васілій Сямёнавіч Жылінскі, 1517–1529.
Васілій Багданавіч Чыж, 1530–1534, 1536.
Андрэй Нямірaў, 1535.
Андрэй Багданавіч Шалуха, 1544–1563.
Канстанцін Андрэевіч Шалуха, 1566–1572.
Мікалай Служка, 1572(?), 1578
Багдан Іванавіч Саламярэцкі, 1580–09.07.1602.
Фрыдрых Багданавіч Лукомскі, 1602–1620.
Багдан Багданавіч Саламярэцкі, 1620 (?)–1630.
Крыштоф Весялоўскі, 1633–1634.
Стафан Пац, ?–1640.
Ганна з Рудзямінаў-Дусяцкіх, удава Стафана Паца, 1640–1642.
Мікалай Стафан Пац, 1642–1670.
Міхал Казімір Радзівіл, 1670–1680.
Караль Станіслаў Радзівіл, 1680–1719.
Ганна Катарына Сангушкава Радзівіл, 1692–1746.
Геранім Фларыян Радзівіл, 1746–1759.
Ежы Аўгуст Мнішак, 1760–1776.

А.А. Мяцельскі. Старадаўні Крычаў. Мн., 2003. С. 151–152.

У складзе Расійскай імперыі

Паводле першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй усходнія беларускія землі, у тым ліку і Крычаўскае староства, адыйшлі да Расійскай імперыі.

Крычаўскае староства, адпаведна новаму адміністратыўна-тэрытарыяльнаму дзяленню, адносілася да Магілёўскай губерні. Крычаў з'яўляўся мястэчкам у Чэрыкаўскім павеце. У студзені 1776 г. Кацярына II перадала Крычаўскае староства, насельніцтва якога налічвала больш за 14 тыс. чалавек, графу Р.А.Пацёмкіну. Былыя дзяржаўныя ўладанні раздаваліся дваранам, у асноўным расійскім саноўнікам. З 1773 г. па 1796 г. імператрыца падаравала сваім прыбліжоным 180550 беларускіх сялян. У беларускіх землях, далучаных да Расійскай імперыі, было ўведзена такое ж кіраванне, як і ў Расіі. У Чэрыкаўскім павеце былі створаны: павятовы (акруговы) суд, дваранская апека і ніжні земскі суд. Працавалі спраўнік, павятовы казначэй, павятовы доктар і павятовы лекар, гараднічы. У кожным горадзе дзейнічаў славесны суд, гарадскі магістрат, пры якім быў сіроцкі суд. Парадак, функцыі і прынцыпы ніжэйшага адміністрацыйна-судовага і ваенна-гаспадарчага кіравання былі закладзены сенацкай пастановай ад 22.9.1773 г. «О должности уездных комиссаров». Паводле яе, кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтамі. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі. Сотнікі абіраліся ад 100–200 двароў, дзесятнікі – ад 1–25. Яны падпарадкоўваліся павятоваму камісару як прадстаўніку царскіх уладаў. Камісары прызначалі-

ся з расійскіх афіцэраў і зацвярджаліся ў сенаце.

Пасля далучэння да Расіі прыкметна ажывілася развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі, у тым ліку і на Крычаўшчыне. Гэта было звязана з тым, што добра забяспечваўся збыт зерня і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі за мяжу і ў буйныя гарады Расіі. У Крычаўскім старостве, напрыклад, павялічыліся плошчы пад лён і бульбу.

Але жыццё сялян пры феадальна-прыгонніцкай сістэме было гаротным, хаця пераважная большасць памешчыцкіх сялян мела сваю гаспадарку. Яны карысталіся зямельным надзелам з умовай выканання павіннасцей. У пачатку XIX ст. у некаторых памешчыкаў сяляне працавалі на паншчыне да 6 дзён на тыдзень. Працоўны дзень цягнуўся ад усходу сонца і да захаду, а з 15 мая па 15 жніўня – з 5 гадзін раніцы і да захаду сонца. Акрамя баршчыны, сяляне выконвалі шматлікія дадатковыя павіннасці (будаўніцтва, дарожныя работы, старажоўшчыну).

Большасць памешчыцкіх гаспадарак прытрымлівалася старых парадкаў – традыцыйнай трохпольнай сістэмы земляробства. Рост таварнасці такіх гаспадарак ішоў галоўным чынам за кошт павелічэння паншчынных павіннасцей сялян.

Цяжкім было становішча і аброчных сялян. Яны нароўні з баршчыннымі сялянамі плацілі даніну і выконвалі дадатковыя павіннасці ў маёнтках.

Аднак капіталістычныя элементы прасочваліся і ў сялянскую гаспадарку, якая паступова звязвалася з рынкам. У Крычаве і ў буйных населеных пунктах праводзіліся кірмашы. Сяляне прывозілі лён, збожжа, мёд, яблыкі, куплялі соль, жалезныя вырабы.

Сяляне займаліся і адыходнымі промысламі, рыбалоўствам, паляваннем, сплаўнымі работамі.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. адбываўся значны рост мануфактурнай прамысловасці. Спачатку гэта былі прыгонныя мануфактуры, паз-



Крычаў у канцы XVIII ст.

ней яны перарасталі ў капіталістычныя.

Тры мануфактуры дзейнічалі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. у мястэчку Крычаў. Першая парусінавая мануфактура існавала ў 1783 – 1845 гг. (уладальнік граф Р.А. Пацёмкін). Да 1790 г. на ёй працавалі сотні прыгонных, акрамя жанчын графства, якія пралі пяньку і лён: кожная за зіму па 1 пуду, а ўсе – па 6 пудоў пражы за год. За тыдзень выраблялася каля 100 кавалкаў (5 тыс. аршынаў) парусіны. У 1783 г. выраблена 820 кавалкаў паруснага палатна вагой 1120 пудоў. У 1786 г. зрасходавана каля 1200 пудоў пражы. У 1797 г. было 112 станкоў, працавалі 224 прыгонныя, выраблена 900 кавалкаў парусіны, большасць якой рэалізавана ў Херсоне. Прадукцыя мануфактуры ішла на Крычаўскую суднаверф, а таксама ў Херсон і Крамянчуг. З крычаўскай парусіны былі ветразі на караблях эскадры адмірала Ф.Ф.Ушакова. Другая парусінавая мануфактура існавала ў 1786 – 1831 гг. (уладальнік памешчык Галынскі). Вырабляла белае і шэрае палатно (50 тыс. аршынаў у 1796), брызентавую тканіну (33 тыс. аршынаў у 1797), суравое палатно (77 тыс. аршынаў у 1823). У 1786 г. было 170 ткацкіх станкоў (па станку на 1 ткача). У 1797 – 1814 гг. мелася 120 рабочых, акрамя сялянак-прадзільшчыц, якія працавалі ў вёсках у залік паншчыны. Большасць прадукцыі ішла на марскія і рачныя судны расійскай арміі ў Херсон, Крамянчуг, іншыя чарнаморскія порты, а таксама ў Рыгу і Пецярбург. Канатная мануфактура існавала ў 1785—1798 гг. Размяшчала-



План Крычава, 1778 г.

ся ў 2 будынках. Былі 24 колы, печ для варкі смалы з попелам. Попел здавалі сяляне ў залік аброку па чвэрці з душы, за што атрымлівалі дровы на паліва. Пражу скуплялі ў навакольных вёсках. Працавалі каля 300 прыгонных. У



Кафля XVI–XVII ст. з Крычава.

Палац Р.А. Пацёмкіна, XVIII ст.

1787 г. выраблялася па 1000 пудоў канатаў за тыдзень. У 1785 г. для Херсонскага адміралцейства выпушчана канатаў на 117,2 тыс. руб.

На Крычаўшчыне шырокае развіццё атрымалі кравецкая, шавецкая, ганчарная вытворчасці, апрацоўка дрэва, гарбарства і г.д. У в. Воранава Р.А. Пацёмкін стварыў буйны цагельны завод, вытворчасць якога дасягала 1 млн штук цэглы ў год. Дзейнічала Крычаўская суднаверф, а таксама вінакурны, шкляны, гарбарны, медналіцейны заводы, млыны.

З кожным годам пашыраўся гандаль з блізкімі і далёкімі рэгіёнамі Расіі, наладжваліся эканамічныя сувязі. Але працэс эканамічнай стабілізацыі быў, аднак, спынены пачаткам вайны з Напалеонам. У ліпені 1812 г. Крычаўшчына была акупавана французскімі войскамі. Французская акупацыя нанесла краю вялікія матэрыяльныя і значныя людскія страты. Шырокія памеры прыняло марадзёрства салдат. Яны забіралі коней, валоў, кароў, авечак, збожжа. Нярэдка сяляне самі знішчалі запасы прадуктаў, каб не даставаліся ворагу, тым самым свядома асуджалі сябе на галоднае існаванне.

В.Ф. Куліненка.

Дакументы сведчаць

Указ Сената аб падараванні Р.А. Пацёмкіну Крычаўскага староства

Указ Ея императорского величества самодержицы всероссийской из правительственного Сената Могилевской губернии канцелярии по имянному ея императорского величества указу данному сенату сего генваря 11 дня за подписанием собственныя Ея величества руки, в котором написано: генералу аншефу графу Григорию Потемкину за службу его Ея величеству и отечеству всемилостивейше показали Ея императорское величество в вечное и потомственное владение в Могилевской губернии местечко Кричев и все староство Кричевское со всеми селами, деревнями, крестьянами и со всякими к сему старосту принадлежностями. Правительствующий Сенат приказали: по сему Ея императорского величества всемилостивейшему указу учинить непременно исполнение могилевской губернской канцелярией, а тамошнему господину генерал-губернатору к учрежденному при юстиции коллегии лифляндской особо для белорусских губерний департаменту знать дано.

Генваря 15 дня 1776 года.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3268. Воп. 1. Спр. 6.

Крычаўская суднаверф

Ёсць у Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу акварэльны малюнак. На ім мастак Міхаіл Іваноў адлюстраваў горад Крычаў канца XVIII ст. На высокіх узгорках правага берага ракі ўзвышаюцца сцены і вежы замка, высокія зва-



Крычаўская суднаверф. З малюнка 1786 г.

ніцы цэркваў і шпілі касцёла, памяшканне гарадской ратушы, заводскія збудаванні. Злева бачны будынкі суднаверфі і адміралцейства. Над адміралцействам – сцяг, а самы верх суднаверфі ўпрыгожвае мадэль парусна-га карабля.

...У другой палове XVIII ст. Расіі неабходны быў выхад да Чорнага мора, як адзін з важнейшых гандлёвых шляхоў на Блізкі Усход і ў краіны Міжземнамор'я. Руская армія авалодала паўночным узбярэжжам Чорнага мора. Неабходна было тэрмінова будаваць гандлёвы і ваенны флот, узвесці партовыя гарады.

Работы па будаўніцтву флота ўзначальваў князь Р.А.Пацёмкін. Уладальнік буйных маёнткаў, падараваных яму Кацярынай II на поўдні Украіны, на Смаленшчыне і ў Беларусі, ён жа рашыў выкарыстаць прыродныя рэсурсы сваіх уладанняў. Тым больш, што навуковая экспедыцыя пад кіраўніцтвам акадэміка В.М.Севяргіна, якая вывучала прыродныя багацці ўсходняй Беларусі, канстатавала: Крычаўскае староства мае неабмежаваны запас карабельнай хвоі і дубовых гаёў. Былі тут і шырокія магчымасці для вырошчвання на вялікіх плошчах лёну і канаплі, так неабходных для вытворчасці парусіны і канатаў.



Макет першых караблёў, якія будавалі ў Крычаве.

На берагах Сажа шпаркімі тэмпамі разгарнулася будаўніцтва. Узводзіліся карпусы адміралцейства, суднаверфі, заводы для вытворчасці парусіны, цэглы, шкла і канатаў. Сож паглыбілі, а там, дзе ў яго ўпадала рачулка Крычаўка і дзе ўзвышаліся адміралцейства і суднаверф, збудавалі прычалы. Ад хваёвага бору да Сажа пракапалі каналы цераз заліўны луг, па якіх дастаўляўся лес.

У Крычаў з Пецярбурга былі накіраваны таленавітыя інжынеры і афіцэры (будучы адмірал Пустошкін, інжынер Фаленберг, палкоўнік Няфедзьеў і іншыя). Такі наплыў інтэлігенцыі не мог не паўплываць на духоўнае развіццё мясцовага грамадства. Многія гараджане набылі невядомыя ім дагэтуль спецыяльнасці, сталі выдатнымі майстрамі сваёй справы.

У лясах, як грыбы, выраставалі слабодкі, невялічкія паселішчы, у якіх жылі лесарубы, смалакуры, выпальвальшчыкі вугалю і спецыялісты па вырабу паташу, неабходнага для вытворчасці шкла. Энергію збудаваных вадзяных млыноў крычаўляне пачалі выкарыстоўваць для распілоўкі дрэў і нарыхтоўкі брусоў.

Цэглу для будаўніцтва выраблялі на мясцовым заводзе.

Прыкметна павялічылася колькасць насельніцтва горада, бо распачатае будаўніцтва патрабавала прытоку рабочай сілы.

Няспынна пацяклі па Сажу ў Днепр з Крычава, а з Дняпра – у парто-

выя гарады Чорнага мора баржы з будаўнічымі матэрыяламі. Расія будавала Чарнаморскі флот, няшчадна эксплуатуючы прыродныя багацці нашага краю і яго насельнікаў. У 1786 г. на ваду была спушчана першая яхта ў прысутнасці таленавітага інжынера, стрыечнага дзеда паэта А.С. Пушкіна, генерала Ганібала, адмірала Пушчына і іншых. Ёй далі назву «Дзясна».

Потым, калі на ваду былі спушчаны яшчэ 23 парусныя і вяслярныя судны, «Дзясна» стала флагманам эскадры адмірала Пушчына. З 1787 г. флатылія ўвайшла ў склад Чарнаморскага флоту.

Варта дадаць, што крычаўляне не толькі збудавалі судны, але многія з іх сталі матросамі. Яны прымалі ўдзел у марскіх баях пад камандаваннем адмірала Ф.Ф. Ушакова.

М.Ф. Мельнікаў.

Вуліцы Крычава

НАЧАЛО ИНВЕНТАРЯ КРИЧЕВА XVIII в.

Улица Слободская:

По левой стороне улицы 2 халупы – Мартина Шаповалова и Демы Москалевича, 4 свободных плаца.

По правой стороне – 13 плацев, 8 халуп (избушек, хижин). В одной Иван – сын Кузьмы.

Улица Юрьевская:

Правая сторона – один плац, две халупы и одна хата.

Переходя на улицу Латинскую, 4 избы. Три человека на юрисдике, среди них Исак Шип – гончар.

Левая сторона – четыре хижины, церковь св. Георгия с кладбищем и звоницей.

За церковью – опять 4 хижины и один дом.

Улица Жидовская, идущая от Рынка:

Правая сторона – 3 хижины. Еврейская школа.

Хозяйство О. Александра, церкви Замковой, хозяйство О. Кондрата, хозяйство О. Фёдора.

Левая сторона, идя от Рынка:

Хозяйство Героика Еврея.

Хозяйство пана Свадковского.

Семь хижин, 3 дома.

Улица Чериковская, идя от Замка:

Правая сторона – 7 хижин, два плаца.

Переходя к улице Латинской, 5 халуп, два плаца, дом Васьки Боровика с садом.

Левая сторона Чериковской улицы:

Хозяйство Олеся Ути.

Дом Якова Онисковича – кузнеца.

Два плаца, две хижины.

Поворотясь от рва к улице:

Дом Алеся Ути – Ратмана (советника).

Пять халуп, два плаца.

На Забелишине:

Идя от Замка вдоль над рвом при озере Фольварк к Замковой с броваром при гребне, через которую вода бежит...

Там же пруд, наполняющийся из криниц бегущих, небольшой, вроде сажалки.

Улица Спасская

Левая сторона, от Сожа идущая:

Под кладбищем старым св.Спаса, на котором церковь раньше стояла: 8 плацев, 6 халуп, хозяйство Михалки ... медника и еще 2 хозяйства.

Правая сторона улицы Спасской:

На Забелешине

Два хозяйства попадей церкви Спасской, 3 хижины.

Переходя к улице Росиной:

1 хижина, 1 плац.

Переходя заулок:

6 хижин, 1 плац.

Переходя переулок:

6 хижин, одно хозяйство, два плаца.

Церковь св. Спаса со звоницей.

Там же богадельня, 3 хижины. Одна из них Исака Рубина портного.

В переулке к Сожу

12 хижин, 2 плаца.

Поворачивая с переулка,

3 хижины.

Между улочкой и рвом

9 хижин, один плац.

Переулки над Сожем:

6 хижин, 3 плаца.

Переходя переулок, 3 хижины, два хозяйства, два плаца.

Улица Корецкая,

Идя с улицы Спасской

Левая сторона:

5 хижин, (из них Матея, Игната и Андрея Корецких), 6 плацов.

Правая сторона:

16 плацов, 2 хижины.

Сзади над рвом от Сожа:

4 плаца.

Улица Росина (идя от улицы Спасской)

Левая сторона:

5 хижин, 5 плацев.

Конец при плацах тех, что насквозь переходит с улицы Корецкой.

Правая строна:

3 юрисдики, две хижины.

Переходя переулок:

14 плацев.

За улицей Чериковской

16 плацев.

На Загородище за озером

Часть, лежащая с левой стороны – 1 халупа, 3 плаца.

На Подгородище

12 халуп и ещё 3.

Городище старое.

Церковь Пречистой Божией Матери с кладбищем.

15 плацев, 3 хижины.



Адна з вуліц Крычава.

Вторая часть на Загородище, идя от озера:

8 хижин, 3 плаца.

Сзади, свернув вправо – 6 плацев.

Церковь св. Ильи с кладбищем с плацем, где хозяйство протоиерея,там же и огород сбоку кладбища.

Назад поворачивая:

8 плацев.

За уличкой над Сожем:

4 плаца

3-я часть крайняя с правой стороны, лежащая от речки Сожа.

Идя от мельницы

Пруд с мельницей.

Дома О. Григория и О. Михаила из церкви Пречистенской.

6 хижин, 1 плац.

Улицы Кричева

Замковая.
Над рвом Бровэй (Броварная?).
Бочковая.
Побережанская.
Платницкая.
Лычовая.
Гончарская.
Сымоновичская.
Дрибинская.
Гуменная.
Гриневая.
Латинская.
Слободская.
Юревская.
Еврейская.
Чериковская.
Спасская.
Корецкая.
Росинка.
39 крам на рынке.

Церкви в Кричеве

1. Юрьевская.
2. Пятницкая.
3. Пречистенская.
4. Воскресенская.
5. Ризоположенская (9).
6. Вознесенская.
7. Никольская.
8. Дьяковская.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

Дакументы сведчаць

АБ КОЛЬКАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў м. КРЫЧАЎ У 1779 г.

Итого в местечке Кричеве дворов: христианских – 384, еврейских – 86; в них христиан мужеска 950, евреев мужеска 341, женска 362, цыган мужеска 36, женска 28.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 364. Воп. 1. Спр. 168. Л. 14.

АБ КОЛЬКАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА І КОЛЬКАСЦІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ, ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ, ЦЭРКВАЎ І КОРЧМАЎ У КРЫЧАЎСКІМ СТАРОСТВЕ Ў 1779 г.

И все вышеписанное староство мы, Герасимов и Танцов, со всеми издревле принадлежащими к нему угодьями, пашенной и не пашенной землею и лесами и сенными покосами по старым межам, граням, копцам и урочищам, не оставляя ничего, все без остатка отказали. А всего в онном старостве местечек 6, сел – 14, деревень – 130. В них церквей благочестивых – 21, униатских – 3, костелов римского исповедания – 1, школ еврейских – 3, дворов господских – 4, мельниц – 29, сукновален – 12, корчем – 104, заводов ордашных – 5, стеклянных – 2, железных – 1, винных – 3, озер стоячих – 3, дворов крестьянских – 3249, в них крестьян мужеска – 11057, женска – 10601, в бегах мужеска –1399, женска – 1115, дворов еврейских – 161, в них евреев мужеска – 775, женска – 815, цыган мужеска – 36, женска – 28 голов.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 364. Воп. 1. Спр. 168. Л. 134.

Славутыя землякі

ПАМЕШЧЫК-ДЭМАКРАТ

Пры знаёмстве з гістарычнымі матэрыяламі мне ў вочы кінулася прозвішча «польскага эмігранта» Аляксандра Вікенцевіча Галынскага. Спачатку я не звярнуў на яго асаблівай увагі, бо шматлікі род памешчыкаў Галынскіх на Крычаўшчыне меў нядобрую славу. Але ўспомніў пасля, што прозвішча А.В.Галынскага згадваецца ў кнізе А.Герцэна «Былое і думы». Захацелася даведацца пра нашага земляка. Зрабіць гэта было нялёгка. Шмат давялося папрацаваць у архівах, у бібліятэках. Паступова назапашваліся матэрыялы, якія даюць некаторае ўяўленне пра асобу нашага загадкавага земляка.

Аляксандр Вікенцевіч Галынскі нарадзіўся ў Крычаве ў 1816 г. Жыў у былым палацы князя Р.А. Пацёмкіна, які купіў яго дзед, і з'яўляўся спадчынным уладальнікам маёнтка Задабрасць. Скончыў медыцынска-хірургічную акадэмію ў Пецярбургу. Ён быў не толькі доктарам, але і здольным журналістам, друкаваўся на старонках парыжскіх, лонданскіх газет.

У канцы саракавых гадоў XIX ст. рускі палітычны эмігрант Сазонаў арганізаваў Парыжскі рэвалюцыйны клуб «Братство народов». У яго ўваходзілі палітычныя эмігранты з розных краін, а таксама некаторыя вядомыя французскія дзеячы, што былі нязгодныя з палітыкай урада. Галынскі стаў актыўным членам гэтага клуба. Французскія ўлады неўзабаве вымушаны былі спыніць дзейнасць клуба, а А.В.Галынскага і некаторых іншых яго членаў выслаць з Францыі.

Вось кароткая характарыстыка нашага земляка: «А.В.Голынский (1816) – польский эмигрант, литератор. На его средства была создана типография польского «Демократического товарищества» в Лондоне и издавалась газета «Польский демократ». С Герценом Голынский познакомился в 1849 году в Париже через Сазонова, в том же году выслан из Франции». (Литературное наследство. Изд. Академии наук СССР, Москва, 1955. Т. 62.С. 539).

Вядома нам і тое, што А.Галынскі шмат падарожнічаў. Быў у Егіпце, Палесціне, Сірыі, Швейцарыі, Амерыцы. У сваіх кнігах і артыкулах прапагандаваў ідэю дружбы народаў усіх краін, з абурэннем пісаў пра жорсткі прыгнёт людзей, усхваляў свабоду і незалежнасць. Але шмат яшчэ старонак жыцця нашага славутага земляка і яго дзейнасці, на жаль, застаюцца невядомымі і чакаюць свайго вывучэння.

М.Ф. Мельнікаў.

РЭВАЛЮЦЫЯНЕР-НАРОДНІК

КАВАЛІК Сяргей Піліпавіч, нарадзіўся 13 (25).10.1846 г. у маёнтку Свадкавічы. Рэвалюцыянер-народнік. З сям'і дробнага памешчыка. З 1863 г. юнкер Паўлаўскага вайсковага вучылішча. З 1864 г. вольны слухач Пецярбургскага, у 1868 г. – Кіеўскага універсітэтаў. У 1869 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па матэматыцы. У 1873 г. выязджаў у Цюрых (Швейцарыя), дзе сустракаўся з М.А. Бакуніным, П.Л. Лаўровым, П.М. Ткачовым. У 1874 г. вярнуўся ў Расію, арганізаваў 10 народніцкіх гурткоў, якія вялі агітацыю сярод сялян. У ліпені 1874 г. арыштаваны ў Самарскай губ. разам з М.К. Судзілоўскім, спачатку адбываў пакаранне ў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Пецярбургу. На працэсе 193-х (1877–1878) асуджаны на 10 гадоў катаргі (разам з І.М. Мышкіным, В.І. Вахоўскай). З 1880 г. адбываў высылку ў Якуціі.У 1898 г. некалькі месяцаў жыў у мяст. Блонь Ігуменскага пав. Мінскай губ. ў маёнтку нарадавольца А.В. Бонч-Асмалоўскага, да 1914 г. працаваў рахункаводам у Мінску. З 1915 г. прыкамандзіраваны да Земскага саюза, дзе працаваў разам з М.В. Фрунзе. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. нам. старшыні Мінскай гарадской думы, старшыня Мінскага губернскага зямельнага камітэта. Па палітычных поглядах быў блізкі да эсэраў. У 1918 г. у час германскай акупацыі прымаў удзел у дзейнасці Мінскай гарадской думы. У 1920–1922 гг. працаваў у народным камісарыяце сацыяльнай апекі БССР. З 1922 г. выкладаў вышэй-

шую матэматыку ў палітэхнікуме (Мінск). Старшыня Мінскага аддзялення таварыства паліткатаржан і высыльных пасяленцаў. Аўтар успамінаў «Рэвалюцыйны рух сямідзесятых гадоў і працэс 193-х», шэрага артыкулаў у часопісе «Былое» (1906), «Каторга и ссылка» (1924).

Памёр 26.4.1926 г.

Э.Ліпецкі.

Іх шлях пралёг

БЕЗ-КАРНІЛОВІЧ Міхаіл Восіпавіч. Беларускі гісторык, краязнавец і этнограф, вайсковы тапограф, статыстык, генералмаёр расійскай арміі. Пад яго кіраўніцтвам у 1831–1847 гг. праводзілася тапаграфічнае і вайскова-статыстычнае вывучэнне Мінскай, Наўгародскай, Віцебскай, Валынскай губерняў і Беластоцкай акругі. У час знаходжання на Беларусі збіраў гістарычныя і этнаграфічныя матэрыялы, на падставе якіх выдаў кнігу «Гістарычныя звесткі пра выдатныя месцы на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе ж адносяцца» (Спб., 1855), у якой разглядаў таксама пытанні этнічнай тэрыторыі, побыту і культуры беларусаў. Беларусамі лічыў толькі «нашчадкаў крывічоў», разам з тым гаварыў пра беларусаў як пра асобны народ і ставіў іх у адзін рад з суседнімі народамі. Апісаў яго цяжкае жыццё, аднак прапаноўваў ссяляць сялян у вялікія вёскі, захоўваць патрыярхальныя сем'і і нават злучаць у адну сям'ю (адзін двор) невялікія сем'і суседзяў. Асобныя раздзелы кнігі прысвяціў апісанню народных абрадаў, звычаяў, вытворчай дзейнасці, народнай метэаралогіі.

Аўтар кнігі «Віцебская губерня» (1852).

ДАМБАВЕЦКІ Аляксандр Станіслававіч (1840–пасля 1914), краязнавец і грамадскі дзеяч. У 1872–1893 гг. магілёўскі губернатар, з 1893 г. сенатар. Ініцыятар выдання і рэдактар калектыўнай працы «Вопыт апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах...» (кн. 1–3, Магілёў, 1882–1884), дзе дадзена характарыстыка асноўных заняткаў насельніцтва, матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў Магілёўшчыны. Змешчана каля 500 калядных (зімовых), веснавых, летніх, вясельных і рэлігійных песень. Апісаны абрады вяселля, хрэсьбін, пахавання, памінак, народныя святы і звычаі, дажынкі, талака, розныя гульні, павер'і, прымхі і забабоны, помнікі археалогіі, архітэктуры, адметныя мясціны губерні, гісторыя значных населеных пунктаў; прыведзены каляндар сямейнага народнага побыту на кожны месяц і на цэлы год, назвы лекавых раслін і іх прызначэнне. Ініцыятар стварэння губернскага гісторыка-этнаграфічнага музея ў Магілёве (1879). Садзейнічаў вывучэнню гісторыі і этнаграфіі Магілёўшчыны, правядзенню археалагічных раскопак у Падняпроўі.

КІРКОР Адам Ганоры Карлавіч (псеўд. Ян са Славіна, Ян Валігурскі, Сабары і інш.; 21.1.1818, в. Слівіна Манастыршчынскага р-на Смаленскай вобл.). Беларускі, польскі і расійскі грамадскі дзеяч ліберальнага накірунку, этнограф, публіцыст, выдавец, гісторык, краязнавец, археолаг, літаратуразнавец. Член-кар. Імператарскага археал. т-ва (1856), член Рускага геагр. т-ва (1857), Акадэміі ведаў у Кракаве (1873), член Віленскай археал. камісіі (з 1855), хавальнік Віленскага музея старажытнасцей, ахвяраваў яму ўласную археалагічна-этнаграфічную калекцыю, сабраную ў час экспедыцый на Мінскай і Віленскай губ. Вучыўся ў Магілёўскай (да 1834) і Віленскай (да 1838) гімназіях. У Вільні ў 1840–1860-я гг. выдаваў літ.-навуковыя альманахі «Radegast» («Радэгаст»), «Памятныя кніжкі Віленскай губерні», «Pismo zbiorowe Wilenskie» («Віленскі альманах») і інш., часопіс «Teka Wilenska» («Віленскі зборнік»), дзе змяшчаў свае працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы. Рэдактар газ. «Виленский вестник» (1860–1865), кіраўнік гуртка беларускіх, польскіх і літоўскіх літаратараў і дзеячаў культуры (Вільня, 1850–1860-я гг.).

З 1859 г. уладальнік друкарні ў Вільні, у 1868–1871 гг. адзін з выдаўцоў газеты «Новое время» ў Пецярбургу. З 1872 г. у Кракаве. Чытаў лекцыі па славянскіх, у т.л. беларускай, літаратурах у Кракаўскім тэхнічна-прамысловым музеі. Вывучаў, папулярызаваў гісторыю, антрапалогію, матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў, падкрэсліваў гіст.-этнічную самастойнасць і самабытнасць бел. народа, яго крэўнасць ці пэўнае падабенства з рускім, украінскім, польскім, літоўскім народамі. У працах «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі» (1839), «Аб этнаграфічнай мяжы літоўскай і славянскай народнасцей у Літве» (1857), «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857–1859), «Этнаграфічныя нарысы Сувалкскай губерні» (1873), у публікацыях «Літоўскае Палессе» і «Беларускае Палессе» («Жывапісная Расія», т. 3, ч. 1–2, 1882) даў этнічную і сацыяльна-бытавую характарыстыку тыпаў беларуса, адзначыў яго высокія духоўна-маральныя якасці (прывязанасць да зямлі, працавітасць, кемлівасць, дасціпнасць), падкрэсліў самастойнасць беларускай мовы, яе багатыя пісьмовыя традыцыі і інш. Падрабязна разгледзеў беларускую вусна-паэтычную творчасць: песні, прыказкі, прымаўкі, паданні на матэрыяле Ашмянскага, Лідскага, Свянцянскага, Вілейскага, Нясвіжскага паветаў, апісаў абрады і звычаі (дажынкі, вяселле, пахаванне), гульні і танцы («Жаніцьба Цярэшкі», «Падушачка», «Мяцеліца»), святы (каляды, купалле, вялікдзень) і інш. Праілюстраваў апісанні арыгінальнымі тэкстамі народных песень, у большасці запазычанымі (без спасылак) з ранейшых публікацый Я.Тышкевіча, Я.Чачота; для тлумачэння беларускіх тэкстаў склаў невялікі беларуска-рускі слоўнічак. У духоўнай культуры беларусаў вялікую ролю аддаваў міфалагічным крыніцам, недаацэньваў яе рэальнага, сацыяльна-бытавога кантэксту. У кнізе «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (1874) найбольш выразна праявіўся цэласны, пазбаўлены прымітыўнага этнаграфізму падыход да бел. культуры як да шматвяковай гістарычнай з'явы ў адзінстве пісьмовых і вусна-паэтычных, фальклорных відаў творчасці. Памёр 23.11.1886 г.

МЕЕР Андрэй Казіміравіч, беларускі краязнавец 2-й пал. XVIII ст. Аўтар працы «Апісанне Крычаўскага графства або былога староства», складзенай у 1786, у якой побач з характарыстыкай прыродна-геаграфічных умоў, стану сельскай гаспадаркі і мануфактурных прадпрыемстваў, складу насельніцтва па этнічнай і канфесіянальнай прыкметах апісаў традыцыйны побыт і культуру беларусаў, змясціў некалькі беларускіх фальклорных твораў. Яго праца – каштоўная крыніца для вывучэння гісторыі і культуры Беларусі. Рукапіс зберагаецца ў архіве Казанскага універсітэта.

РАМАНАЎ Еўдакім Раманавіч [30.8 (11.9).1855, мяст. Новая Беліца, цяпер у межах Гомеля – 20.1.1922], беларускі этнограф, фалькларыст, археолаг. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), Маскоўскага археалагічнага таварыства (1890, член-карэспандэнт — 1886), Віцебскага статыстычнага камітэта (1891). Скончыў Гомельскую прагімназію (1870), курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі (1872). Працаваў настаўнікам (1872–1886), інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў (1886–1906), член Часовай камісіі па ўладкаванню Віленскай публічнай бібліятэкі і музея (1906–1916). У 1897–1903 гг. рэдактар неафіцыйнага аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости»; у 1900 – 1903 г. пад яго рэдакцыяй выдадзены 3 выпускі «Могилевской старины». З 1910 г. загадчык секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства. З 1917 г. жыў у Стаўрапалі. Вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, адзенне, сямейны побыт, народныя абрады, вераванні, народны каляндар і медыцыну, дзіцячыя гульні. Апублікаваў больш за 200 прац па этнаграфіі, фальклору, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10 тысяч фальклорных твораў. Адстойваў права беларускага народа на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, навукі і літаратуры. Асноўная фальклорна-этнаграфічная праца «Беларускі

зборнік» (вып. 1–9, 1886–1912), своеасаблівая энцыклапедыя побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу. Сярод прац: «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (вып. 1 – 2, 1911 – 1912), «Крыніцы для гісторыі Магілёўскага краю» (вып. 1, 1916). У 1886 – 1894 гг. вёў археалагічныя раскопкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, адкрыў помнік эпіграфікі XII ст. Барысаў камень (каля в.Высокі Гарадзец Талачынскага раёна). Склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў. Сабраў звесткі пра 1000 гарадзішчаў Беларусі, выявіў шмат стаянак першабытнага чалавека, вёў антрапалагічныя даследаванні. У 1901 г. апублікаваў (са скарачэннямі) працу А.Меера «Апісанне Крычаўскага графства 1786 года». У 1900 г. выдаў зборнік «Тарас на Парнасе і іншыя беларускія вершы» .

СЕВЯРГІН Васіль Міхайлавіч (19.9.1765, Пецярбург – 29.11.1826), рускі мінералаг і хімік, асветнік. Акадэмік Пецярбургскай АН (1793). Ганаровы член многіх расійскіх і замежных навуковых таварыстваў, у т.л. Віленскага універсітэта (1803). Скончыў універсітэт у Пецярбургу, удасканальваў веды ў Гётынгенскім універсітэце ў Германіі (1785–1789). Адзін з заснавальнікаў рускай мінералагічнай школы. У пачатку XIX ст. двойчы пабываў у беларускіх губернях. Свае ўражанні адлюстраваў у «Запісках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы...» (1803) і «Працягу запісак...» (1804), дзе змешчаны звесткі пра беларускія гарады і пасёлкі, побыт насельніцтва, стан эканомікі і асветы, апісаны прыродныя, гістарычныя і бытавыя з'явы.

Друкуецца па кн.: Этнаграфія Беларусі. Мн., 1989. С.55, 166–167, 260, 314, 426, 456.

СЯМЁНАЎ-ЦЯН-ШАНСКІ (сапр. Сямёнаў) Пётр Пятровіч (14.1.1827, в. Урусава Раненбургскага пав. Разанскай губ. – 11.3.1914), расійскі географ, падарожнік, статыстык, батанік і энтамолаг, дзярж. і грамадскі дзеяч. Ганаровы член Пецярбургскай АН (1873). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1848). З 1849 г. удзельнічаў у рабоце Рус. геагр. т-ва, віцэ-старшынёй і фактычным кіраўніком якога быў з 1873 г. У 1856 – 1857 гг. здзейсніў падарожжа ў паўн. і цэнтр. раёны Цянь-Шаня, вывучыў асн. рысы геал. будовы і рэльефу гэтай горнай краіны. Пад кіраўніцтвам і з удзелам П.П.Сямёнава ажыццёўлены многія геаграфічныя выданні, у тым ліку «Расія. – Поўнае геаграфічнае апісанне нашай айчыны».

Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн., 1974. Т. 10. С. 173.

Падрыхтавала да друку З.Г. Дзямешка.

А.К. Меер аб Крычаўшчыне

Шмат старонак сваёй кнігі «Описание Кричевского графства 1786 года» А.К. Меер прысвяціў жыццю сялян. Прыехаць на Крычаўшчыну і заняцца глыбокім вывучэннем быту і абрадаў тутэйшых жыхароў яго прымусіла заданне князя Р.А.Пацёмкіна.

«...Земледельцы питаются единственно земляным своим рукоделием, плотничною работою... Жены крестьянские упражняются летом в жатве и других, как полевых, так и огородных работах, а зимою прядут на хозяйство пеньку и для себя лён и шерсть. Собираемая с них пенька немалую для Кричевской парусной фабрики составляет выгоду, ибо каждая взрослая женщина и девка по всему старосту спрясть должны в зиму по одному пуду пакли, из которой выходят полпуда и два тюка, или четырнадцать фунтов пеньки, так что в год вообще со всех женщин собирается около 3500 пудов пакульной и 2500 – пеньковой пряжи».

«Некаторые крестьяне и в летнее время, для сбережения своего запаса, принуждеными бывают употреблять из овсяной, со щавелем смешанной муки лепешки, прибавляя к ним для вязкости и несколько ржаной, или, в случае недостатка в хлебе, тол-

кут обмоченное в воде гнилое дубовое из середины дерево и пекут из оного с прибавлением муки хлебы...

В хатах печи без припечков...»

Выращивали цветы: «базилику, ноготки, барзатеп, желтую шапку, гвоздики, кавалерийские шпоры».

У кнізе прыводзяцца цікавыя даныя аб ураджайнасці сельскагаспадарчых культур за 1785 г.

Аналізуючы гэтыя лічбы, хочацца заўважыць, што ўмелі нашы продкі, нягледзячы на перашкоды прыроды, дабівацца нядрэнных паказчыкаў на зямлі.

	Пасеяна:	Намалочана:
Жыта	– 6354 чвэрці	— 11802 чв.
Пшаніцы	– 684 чв.	— 1093 чв.
Ячменю	– 1841 чв.	— 2726 чв.
Грэчкі	– 2413 чв.	— 4345 чв.
Аўсу	– 4554 чв.	— 8280 чв.
Каноплі	– 522 чв.	— 653 чв.
Гароху	– 388 чв.	— 614 чв.
Ільнасемя	– 233 чв.	— 607 чв.
Проса	– 42 чв.	— 76 чв.
Чачавіцы	– 48 чв.	— 80 чв.

А.Меер. Описание Кричевкого графства или бывшего староства в 1786 г. – Могилёвская Старина. Сборник статей Могилёвских губернских Ведомостей. Вып. II, Могилёв, 1901.

Падрыхтаваў М.Ф. Мельнікаў.

Вачыма расійскіх падарожнікаў

З кнігі «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества»(под ред. П.П. Семёнова, В.П. Семёнова). Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1905.

...Из Могилёва шла дорога в Чериков – (через ст.Петровичи, Чаусы, Рыминку) из Черикова эта дорога шла в Мстиславль) через Кричев и Лобковичи... Из Кричева от этой дороги отделялась ветвь в Климовичи... Из Кричева дорога шла в Чаусы..., из Кричева в Сураж...

Река Сож, приток Днепра, берет начало недалеко от Смоленска, течет в Южном направлении. Длина Сожа достигает 552 в, из них в верхней части, от м.Рославичи (415 в от устья), где река преграждена мельничной плотиной, начинается сплав по реке, а от м. Кричева – судоходство... Ширина реки колеблется между 15–70 саж., а глубина – между 7–20 фут. Берега крутые и извилистые, от м. Пропойска ходят пароходы, но правильное пароходное сообщение существует только от Гомеля до устья (у м. Лоева).

Более значительные пристани на Соже – Гомель, Ветка, Пропойск, Чериков и Кричев. Последние три преимущественно лесные: из них отправляется до 14,250 тыс. пудов лесных материалов, что составляет около 90% всех грузов, отправляемых по р. Сожу.

(Верста – старинная русская мера длины (путей сообщения) – 500 саженей – 1.0668 км. Упразднена после введения метрических мер. Сажень – прежняя русская мера длины, содержащая три аршина, или 7 футов. Сажень – 2,13 м. Фут – мера длины, содержащая 12 дюймов. Фут = 30,48 см. Применяется в Англии, США и др. странах с английской системой мер...)

В Могилёвской губернии постройка судов производилась в д. Поповке, Насте, в Могилёве и м.Дубровне (по Днепру), в с. Волчугове, Дятловичах, в д. Шарпиловке, в м. Ветке и Кричеве, в г.Гомеле и на некоторых других притоках (по р. Сожу). В этой губернии в 1897 году было построено судов меньше, чем в Витебской губернии, но подъемная их способность и первоначальная стоимость выразилась в больших цифрах, чем в Витебской губернии.

Что касается затем судов, то в Минской и Могилёвской губ. преобладает постройка берлин и балок, в Витебской губ. – лайб и лодок.

Главнейшим грузом на реках нашей области являются лесные строительные материалы и дрова. Пунктами отправления для леса и дров являются Полоцк – 5,4 милл. пуд.; Рогачев – 5,0 милл.; Пропойск – 4,6 милл.; Кричев – 2,6 милл.

В 24 км к востоку от Черикова по Мос-

ковско-Варшавскому шоссе на границе Климовичского у. расположено м.Кричев. Оно лежит на правом берегу р.Сож, при впадении речки Кричевки или Кривиченки, в 111 в от Могилева. Кричев под именем Кречют упоминается еще в уставной грамоте кн. Ростислава Мстиславича, данной им смоленской епархии в 1157 г. По народному же преданию, Кричев в незапамятные времена носил имя Кричев и был основан кривичами. До сих пор сохранились следы его укреплений в виде городища на возвышенном берегу Сожа. Природная малая доступность местности была еще усовершенствована руками человека; была сделана высокая насыпь и проведен ров, сообщавшийся с р.Сожем. По всей вероятности, на том месте, где некогда стоял идол Перуна, на крутом берегу Сожа возвышается церковь св.Ильи; здесь существуют подземные ходы: из окраин замка в подземелье проведен был ход в реку со сводами из прочного кирпича, сохранившийся поныне. В половине XIV века Кричев был завоеван кн. Ольгердом и присоединен к княжеству Мстиславскому. С конца XV века Кричев переходил под власть то московских, то литовских князей. В 1635 году городу было даровано магдебургское право. В 1708 году Карл XII переправлялся здесь через Сож со своей армией. Здесь же стояло лагерем и русское войско с Петром I во главе; место, где был расположен лагерь Петра, известно ныне под названием «Петрова луга». В половине XVIII в. с 1740 по 1743 г. в Кричеве происходило народное смятение: «мещанин Карпач и воском торговавший купец Вощила, вознамерившись истребить всех евреев, которые их, по причине своих откупов, без малейшего сожаления изнуряли, воздвигнули большую часть крестьян против правителей и евреев»... В конце концов против них предприняты были энергичные действия: Вощила спасся бегством, но Карпач был пойман, обшит в медвежью кожу и затравлен собаками. По присоединению к России Кричевское староство было пожаловано имп. Екатериной II кн.Потемкину. 19 января 1787 г. посетила Кричев имп. Екатерина II и ночевала здесь. Церквей православных в местечке 5, римско-католический костел, первоначально основанный еще в 1628 г. королевой Боною, с фундушем в 2 тыс. талеров; на месте старого костела, сгоревшего в 1855 г., построен нынешний. Жителей в Кричеве до 6 тыс. душ, в том числе евреев более 2100. Местечко торгует хлебом, пенькой, льном и мелочным товаром. В Кричеве два начальных училища, волостное правление, становая контора, мещанская управа и почтово-телеграфное отделение.

Ваенныя пасяленні ў Беларусі

Вядома, што ў пачатку XIX ст. выдаткі на армію ў Расіі былі выключна вялікія. Генерал-інтэндант паведамляў цару ў 1817 г.: «Армія адна забірае амаль усе даходы, а для грамадзянскіх патрэб застаецца вельмі мала». Але армія была неабходна, і тады ўзнікла ідэя стварэння ваенных пасяленняў. Ажыццяўленне гэтай каланізатарскай ідэі было даручана аднаму з яе ініцыятараў – генералу Аракчэеву...

Яшчэ перад вайной 1812 г. для гэтай мэты была аблюбавана Магілёўская губерня. Па ўсёй губерні пераважная большасць ворных зямель належала памешчыкам. Але ў Клімавіцкім павеце ў Бабылецкім старостве быў участак зямлі, які арандаваўся сялянамі згодна спецыяльнага дагавору. Дагавор быў адразу ж скасаваны і зямля аддадзена салдатам аднаго з батальёнаў Ялецкага палка. Было ўказана, што батальён салдат, які апрацоўвае зямлю, павінен утрамліваць два іншыя батальёны Ялецкага палка.

Цяжкі лёс напаткаў сялян-беларусаў. Згодна распараджэнню цара, яны павінны былі перасяліцца ў Новарасійскі край, у засушлівыя, неабжытыя стэпы паўднёвай Украіны. 4000 сялян, якія перасяліліся, прадалі за нішто сваю небагатую маёмасць і павінны былі пеша ісці ў далёкі Новарасійскі край. Іх касцямі ўслалася дарога выгнання.

Нават афіцыйныя крыніцы сведчаць, што палова сялян «загінула, не дайшоўшы да месца прызначэння».

Першы вопыт стварэння ваенных пасяленняў перарвала вайна Напалеона з Расіяй.

Пасля вайны, да жніўня 1818 г. (паводле ўказа цара ад 18 красавіка1817 г.) сетка ваенных пасяленняў ахапіла шэраг губерняў, у тым ліку і Магілёўскую. На Магілёўшчыне было паселена 12 батальёнаў салдат. Набіраліся яны з сялян, якія належалі «казне», г.зн. непасрэдна цару.

Вёскі разбураліся і на іх месцы вырасталі пасёлкі з вуліцамі, роўнымі, як салдацкі строй.

Работы на балотах і ў лясах, а таксама вучэнні, якія цягнуліся з 6 гадзін раніцы да 11 гадзін дня, а пасля з 2 гадзін дня да 10 гадзін вечара, пастаянныя прыдзіркі і зверствы начальства – усё гэта рабіла жыццё ваенных пасяленцаў сапраўдным пеклам.

Афіцэр ваенных пасяленцаў Маеўскі пісаў, што знешне дамы пасяленцаў добрыя, «але ўявіце сабе дом, у якім мерзнуць людзі і ежа, уявіце цеснае памяшканне, у якім спяць упокат мужчыны і жанчыны...» Па распараджэнню зверху рэчы, мэблю ў гэтых дамах жыхары не мелі права перастаўляць.

Кіраўнікі ваеннымі пасяленнямі былі заядлымі казнакрадамі. Ад'ютант начальніка ваенных пасяленняў маёр Ганчароў ухітрыўся прысвоіць і растраціць 229625 рублёў грошай, прызначаных для ўтрымання ваенных пасяленцаў. Генерал Юзэфовіч украў з казны 144418 рублёў.

Адзін з царскіх прыбліжаных вымушаны быў напісаць у сваім рапарце, што «ваенныя пасяленні маюць самы няшчасны выгляд».

Абураныя жудасным прыгнётам, пасяленні не раз узнімалі паўстанні. Па загадах Аляксандра II, Мікалая I гэтыя паўстанні падаўляліся са звярынай жорсткасцю. Сотні людзей забіваліся палкамі. Сведка пісаў аб ахвярах «усмірэння»: «Яны быццам мяса пасечанае ляжалі пабітыя – па адной галаве толькі было можна і пазнаць, што гэта людзі».

У 1857 г. ваенныя пасяленні былі ліквідаваны. Але яшчэ і цяпер калгаснікі вёскі Лабковічы Крычаўскага раёна расказваюць паданні сваіх дзядоў пра тыя часы, калі іх сяло было ваенным пасяленнем, у якім генерал Сомаў да смерці сек бізунамі сялян.

М.Мельнікаў.

Часопіс «Беларусь», 1956 г., №8.

Гэта было ў Кашанах

Цяжкім было жыццё працоўных у дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы, асабліва да адмены прыгоннага права. Не менш трох дзён на тыдзень сяляне павінны адбываць паншчыну, працаваць на палях памешчыка ад цямна да цямна. Звыш паншчыны яны выконвалі дадатковыя павіннасці: рабілі рамонт памяшканняў у маёнтках, вартавалі іх, пасвілі жывёлу, перавозілі на сваіх конях грузы. Жанчыны палолі агароды, пралі і ткалі для паноў.

Жорсткая эксплуатацыя прыводзіла сялян да разарэння і жабрацтва.

Яшчэ больш цяжка было жыхарам казённых маёнткаў, якія здаваліся царскім урадам у арэнду панам. Гэтыя часовыя ўладальнікі па-драпежніцку вялі гаспадарку і жорстка прыгняталі працуючых.

Прыгонныя сяляне былі пазбаўлены элементарных чалавечых правоў. За малейшыя праступкі паны білі іх бізунамі, садзілі ў калодкі, закоўвалі ў ланцугі.

Але сяляне не мірыліся са сваім становішчам. Яны падавалі скаргі на паноў, уцякалі з маёнткаў, адмаўляліся выконваць павіннасці.

У дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласці выяўлена справа аб хваляваннях жыхароў у сяле Кашаны Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні (зараз Крычаўскі раён) у 1804 г.

Казённае сяло Кашаны арандаваў мясцовы памешчык Галынскі, які давёў сялян да разарэння.

Ён высякаў іх лес для пабудовы вінакурняў, а саміх прымушаў, акрамя апрацоўкі палёў, гнуць спіну на гэтых вінакурнях.

Ратуючыся ад сваявольства пана, з маёнтка за некалькі год уцякло каля 100 чалавек, 13 сем'яў перасялілася ў суседнія вёскі. Хаты і зямлю гэтых людзей Галынскі забраў сабе.

Даведзеныя да адчаю, сяляне ў 1798 г. падалі на ўладара скаргу ў Чэрыкаўскі павятовы суд. Скарга разгледжана не была. У 1802 г. вяскоўцы падалі другую скаргу. І зноў безвынікова.

Тады сяляне адкрыта выступілі. 19 красавіка 1804 г. яны адмовіліся араць зямлю памешчыка.

Ні загады ўпраўляючага, ні ўгаворы мясцовага пана, ні пагрозы паліцыі не змаглі прымусіць іх прыступіць да работы.

У адказ на трывожнае паведамленне аб падзеях у Кашанах Чэрыкаўскі ніжні земскі суд пастанавіў: паслаць у маёнтак чыноўніка з чатырма радавымі воінскай каманды, якім даручалася «па прыбыццю на месца да прывядзення непаслухмяных у патрэбнае арандатару падпарадкаванне прыкласці ўзмоцненую стараннасць».

З дакументаў справы невядома, ці была выканана гэтая пастанова.

Далей падзеі разгортваліся так. Магілёўскі губернатар, атрымаўшы рапарт Чэрыкаўскага ніжняга земскага суда ад 23 красавіка 1804 г., распарадзіўся паслаць у Кашаны «для ўстанаўлення парадку» губернскіх чыноўнікаў, якія 2 мая прыбылі ў сяло. Жыхары аднадушна заявілі, што «не жадаюць быць у арэндным утрыманні Галынскага».

Факты збяднення сялян былі настолькі ўразлівымі, што нават чыноўнікі, якія праводзілі расследаванне, вымушаны былі зрабіць заключэнне, што тут людзі даведзены да галечы.

Нягледзячы на гэта, чыноўнікі загадалі сялянам «абавязкова працаваць на пана ў кожны тыдзень па тры дні». Сяляне на работу не спяшаліся выйсці.

Камісія па расследаванні справы ў Кашанах працавала больш месяца. 10 чэрвеня 1804 г. яна канстатавала: «сабраны былі сяляне для пацвярджэння ім абавязковага падпарадкавання арандатару і выканання па кантракту і інвентару павіннасцей, то ўсе крычалі, што яны арандатару падпарадкоўвацца не будуць па прычыне наносімых ім крыўд».

Сустрэўшы ўпартае супраціўленне жыхароў вёскі, чыноўнікі не толькі не пайшлі на ўступкі, але і жорстка пакаралі іх.

Дакументы расказваюць, што па загаду чыноўніка Кубліцкага 25-і сялянам звязалі рукі і на панскім двары іх бязлітасна білі кіямі. Жанчыны, што адмовіліся прасці пражу, былі пасаджаны ў хлеў на трое сутак, ім не давалі ежы, вады. 8 чалавек адпраўлены ў калодках у Чэрыкаўскую турму.

22 чэрвеня трое ўпаўнаважаных ад сялян сяла Кашаны падалі губернатару скаргу аб здзеках Кубліцкага з просьбай вызваліць іх ад арандатара Галынскага і перадаць пад уладу казны.

Як бачна з данясення магілёўскага губернатара ад 16 чэрвеня 1804 г., да гэтага часу не ўдалося « прывесці сялян у падпарадкаванне».

Губернскі суд у жніўні 1804 г. вынес рашэнне паступіць з удзельнікамі хвалявання «па ўсёй строгасці закона», што і было прыведзена ў выкананне. За гэтай фармуліроўкай хавалася надзвычай жорсткая расправа ўлад з паўстаўшымі сялянамі – цялесныя пакаранні і высылка на катаргу ў Сібір.

Так закончылася ўпартая чатырохмесячная барацьба жыхароў сяла Кашаны супраць уціску памешчыка.

Н. Гайшун, Н. Буракоўская.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ЗА 1804 г. АБ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН КАШАНСКАГА СТАРОСТВА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

24 лютага 1805 г.

Крестьяне Чериковского повета казенного ведомства Кашанского староства, всемилостивейше пожалованного по смерть г-ну ст.сов.Голынскому с платежом арендных

денег, имея от 1798 г. разные претензии к арендаторам их о излишних якобы противу контракта повинностях, о которых земскою полициею вообще с членами казенной палаты окончено исследование с 1803 г., и для получения по оному законного положения (передано) в Чериковский поветовый суд минувшего 1804 г. в апреле месяце, когда приказано было от арендатора, чтобы приступили к обрабатыванию полей, отозвались, что как они имеют разные претензии к нему, то никаких повинностей отправлять не будут, а о таковом отзыве донесено земской полиции, которая, тотчас отрапортовав губернскому начальству, командировала в то староство представителя своего для водворения тишины и послушания, который хотя объявлял им, что ежели требования их по рассмотрению суда окажутся справедливыми, то они получат следующее удовлетворение, и внушал им, чтобы уклонясь от таковых противузаконных поступков, оставались в послушании, но они всему тому не повиновались.

Между тем, по донесению полиции, был от меня командирован советник казенной палаты в помянутое староство для исследования вообще с нижним земским судом как о вновь причиненных обидах, так и об изыскании зачинщиков ослушания.

По съезде в то староство советника палаты и нижнего земского суда внушаемы были всем крестьянам обязанности их по контракту и инвентарю своему арендатору, но крестьяне оставались несколько дней в прежнем своём заблуждении, наконец, будто убедившись и раскаясь, объявили, что они будут повиноваться, и приступили некоторые из них к работе. Тогда командированный чиновник видя их успокоенными, приступил к формальному исследованию для открытия зачинщиков неповиновения, также и жалоб крестьян на притеснение; по исследовании открылось, что после произведенного в 1803 г. следствия никаких обид от арендатора крестьянам не было; относительно же непослушания, то крестьяне в допросах своих учинили показание, что имели в доме крестьянина Павла Авхимова 2 раза сходбище; в первом старостенский голова Корней Авхимов, поверенный от старостваВасилий Емельянов да крестьяне Павел Тарунь и Пётр Шарай присягали один за другого вступаться и даже целовали образ; истинная же цель их намерения была та, чтобы непременно выйти из подаренного владения; а во второй все вообще крестьяне сделали согласие не повиноваться своему арендатору.

Крестьяне, сделавшие клятвенные присяги, были взяты под стражу и отосланы с следствием для поступления по законам в поветовый суд.

Крестьянам подтверждено оставаться в повиновении и объявлено, что они в справедливых своих желаниях получат удовлетворение, но старостенские крестьяне, видя намерения свои ничтожными и что виновные преданы законному суждению, паки сделались ослушными и при отправлении подсудимых в поветовый суд вслед за ними шли, крича, чтобы всех их брали, а они повиноваться не станут; хотя ж командированный советник и члены полиции убеждали их к послушанию. Но старания их оставались тщетны. Получив о сем рапорт, я поехал сам в староство, где, собрав всех их вместе и войдя один в их круг, толковал им, как отец детям, их заблуждение, последствия которого потерпят за непослушание, растолковал им обязанность их по контракту и инвентарю, входил в рассмотрение всех их жалоб и доказал им, что после сделанного уже следствия и которое препровождено в суд, обид им никаких не сделано, но все единогласно мне отвечали, что в арендном содержании у Голынского оставаться не хотят и чтобы я отдал их другому.

Неудобство говорить с толпою 500 человек заставляло меня, избрав из них 3 человек благоразумнейших, которым, повторя все то, что говорил прежде, приказал им растолковать прочим крестьянам долг их повиноваться арендатору, которому высочайше пожалованы в пожизненное владение, что иначе за продолжение их неповиновения строго наказаны будут, за послушание же оставлю при них чиновника, который будет наблюдать, чтобы служба и повинности их исполнялись по контракту, но когда и сих 3 человек внушения над толпою действия не имели, то вторично входил я в их круг и почти поодиночке убеждал, дабы сим способом отделить волнующихся от покорных, но вообще всех нашел закоренелыми и твёрдыми в намерении своем не повиноваться арендатору.

Как же непослушание их имело сей действительно предмет, других же намерений не найдено, ибо впрочем, с трудолюбием занимались своими домашними работами, то рассудить, что для лучшего их вразумления должны они быть наказаны по судебному приговору, но с которым должно было поспешить, ибо известно мне было, что многие соседственные староства, в коих число душ до нескольких тысяч простирается, ожидали конца сего дела.

Оставя в сем староствe советника казенной палаты и члена земской полиции, дав им полное наставление, поехал в Чериков, где предложил тамошнему поветовому суду, чтобы о немедленном времени окончен был суд над представленными того староства крестьянами, и в то же время донес о всем подробно г-ну белорусскому военному губернатору по нарочной

эстафете, прося, что когда сие дело, поступив на ревизию к е.в.п., то по рассмотрении по эстафете же было возвращено для исполнения.

Вследствие моего предложения дело об ослушании крестьян было в нижней инстанции, обревизировано Главного Суда в 1-м департаменте, представлено на утверждение г-на военного губернатора и им утверждено.

Решением же приговорено: крестьян – голову Корнея Авхимова и Павло Вора, по наказании 20 ударами кнутом, сослать в Нерчинск на работу, а Павла Таруна, выборного Семена Родионова и Петра Щаря, по наказании кнутом 20 ударами оставить на прежнем жилище с тем, ежели б по таковом наказании прочие крестьяне не сделались послушными, то не отсылая их к суждению, наказать плетьми по мере преступления на месте; таковое решение и исполнено августа 30 дня.

При исполнении оного многие того староства не хотели еще повиноваться, но когда из них 7 человек наказаны плетьми от 1 до 20 ударов, то как сии, так и все прочие того староства крестьяне объявили, что будут послушны, что во всей точности исполнят, раскаиваясь в прежнем своем заблуждении.

В продолжение сего неустройства было от меня доносимо г-ну белорусскому военному губернатору: прочих же происшествий, нарушающих гражданский порядок, не было...

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 185–188.

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ЗА 1804 г.

... Винокурение в Могилевской губернии довольно знатное и полагать можно, что в год выкуривается хлеба на вино до 150000 четвертей здешнего урожая: для такого употребления приходит из Мало России р. Днепром и Сожем до 50000 четвертей, да привозится из Малороссии водою и сухим путем до 80000 ведер вина.

Пчеловодство в Могилевской губернии весьма изобильно, а особенно в Рогачевском, Белицком, Климовичском и Чериковском пов. Хозяйством сим в тех поветах упражняются многие. Мед и воск доставляются в немалом количестве в столичные гор. Петербург и Москву, а также к Рижскому порту и другие места. Полагать можно, что меда выходит в продажу из губернии до 40000 пудов, а воска до 2000 пудов. Лучший мед известен здесь под именем хипца и целительным свойством своим сравниваться может с нарбанским, употребляется здесь в аптеках и для такового же употребления вывозится в чужие края.

Промышленников, рыбною торговлею занимающихся, в Могилевской губ. не имеется, а какие рыбы в протекающих реках, речках и озерах чрез Могилевскую губернию ловятся, о том в подробности донесено в с. от 14 ноября 1804 года. В год ловится рыбы весом до 37000 пуд., но оная большей частью в губернии употребляется в расход свежею, а впрок поступает весьма малая часть. Занимаются ловлею рыбы по городам некоторые мещане, а в уездах крестьяне в свободное от работы время.

В Могилевской губернии порода лошадей нехороша и покупают большей частью из Мало России, ныне же многие помещики заводить стали конские заводы. Превосходнейшие из них у генерал-майора гр. Толстого, адмирала Чичагова и ст. сов. Галынскага: из некоторых сих заводов поступают уже в продажу и породы весьма хорошей.

Скотоводство не в том цветущем состоянии, в котором бы должно быть по местным удобностям и изобильному винокурению...

Как продажа леса, поташа, смольчугу, смолы, дегтя и прочего сего рода составляет по Могилевской губ. знатный доход владельцам и служит для многих способом к пропитанию... К Рижскому порту сплавлено в прошлом году мачт от 18 до 27 полен до 1500; шпиров для тонких мачт от 14 до 15 полен до 1500; дубовых брусов, здесь вангасом именуемых, длиною от 5 до 7 арш., толщиною от 11 до 14 дюймов от 7000 до 8000... Смолы выгоняется до 20000 ведер, дегтя выгоняется до 100000 ведер, вывозят в соседние губернии до 80000 ведер.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1281. Воп. 11. Спр. 79.

З ЗАПІСКІ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА АБ ПАДЗЕЯХ ВАЙНЫ 1812 г.

25 студзеня 1837 г.

...Во время кровопролитного сражения, ознаменовавшегося при дер. Салтановке, взят был неприятелем гор. Могилев и окрестные уезды. Пока не остановилось устройство, бурный

беспорядок был ужасом для каждого на целом пространстве сего края, которое занято уже было неприятелем, происходили разного рода неистовства, а некоторые малодушные крестьяне предавались волнению против власти помещиков (мародеры поселяли в них более такой дух), производили грабеж, разоряли помещичьи усадьбы, расхищали имущество, и, наконец, последнее стремление сделалось в губернии общим, число мародеров постепенно умножалось и алчность их к разорению помещиков немало пресекалась военною властью.

Пожертвования в отношении к подкреплению неприятеля никакога добровольного от Могилевской губ. не было, а даже всякое о том предположение отдалено было от образа ее верноподданнических мыслей. Доставление же отечественных припасов для неприятельских войск происходило...вынужденными военною силою мерами.

От внезапного похищения неприятелем драгоценных имуществ у помещиков, от разрушений строений, и разных коммерческих заведений и фабрик, кои до того были в цветущем состоянии, от истребления скотоводства, на полях хлеба и сенокосов Могилевская губ. понесла потери до 18000000, не говоря о потери той, которая и не могла войти в таковое примерное исчисление, и кроме потери значительного числа людей, подвергшихся в то время смертности.

Никаких частных подвигов от Могилевской губ. в отношении к неприятелю оказываемо не было, а достойно замечания то, что многие семейные фамилии, видев приближение пожара войны, оставляя свои жилища на произвол, удалялись во внутренние государства области, где могли иметь в виду для себя верное прибежище; прочие все, пребыв в верноподданническом непоколебимом духе преданности к законному своему государю императору, выполняли одно только то по воле неприятеля, чему власть его на тот раз их вынуждала...

Потери исчисленные примерно уездами: Могилевским, Сенненским, Чериковским, Рогочевским, Быховским, Бабиновичским, Копысским и Мстиславским, более потерпевшими от военных действий, показаны выше. Потеря их народонаселения показывается тем, что по ревизии 1811 г. состояло помещичьих и духовных крестьян по губернии мужеска пола 359946 душ, а по ревизии 1816 г. осталось 287149 душ, следственно, убыль в одном низшем классе людей, принадлежащих помещикам, состояла из 72797 душ, но сколько считалось домов до разорения и сколько их осталось после – по давности времени невозможно почерпнуть достоверных сведений...

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 51–52.

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ЗА 1847 г. АБ СТАНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ГУБЕРНІ

Положение крестьян Могилевской губернии относительно сельского их хозяйства находится в том же жалком состоянии, в коем я имел счастье в.и.в. во всеподданейшем отчете за 1846 г. быт их не может быть улучшен, до коле не будет обращено постоянно попечение об исправлении их нравственности искоренением излишнего употребления вина, которое при недостатке жизненных потребностей, происшедшем от частых неурожаев и упадка торговли лишает их последней возможности к благоустройству своего состояния.

... Картофель в губернии разводится в значительном количестве, который в неурожайные годы служит пособием крестьянину к прокормлению своего семейства, а владельцу во время урожаев – к возделыванию из него вина, но в прошлом 1847 г. при самом добывании из земли он большею частью подвергся гниению...

В губернии состоят крестьяне: помещичьи, казенные и свободные хлебопашцы: быт первых из них за исключением принадлежащих немногим владельцам, находится в жалком положении...

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1281. Воп. 5. Л. 32.

КРЫЧАЎСКІ КАСЦЁЛ (1840 г.)

Костел во имя Зачатия Святой Анны в местечке Кричеве в имении тайного Советника и кавалера Виктора Ивановича Голынского заложен королевой польской Марией Иозефою, но когда и кем выстроен, неизвестно, а в 1824 году самим владельцем покойным Голынским вновь исправлен. Сей костел деревянный в крижевой фигуре длиною 12 S, шириною 9 и

вышиною 7 саж. три аршина. Две главы с крестами между ими тоже одна поменьше и позади одна над большим алтарем с крестом. В левой главе на высоте зачеплен небольшой колокол. Фасад крашен, посредине коего изображено в круглых лучах Солнца Имя Марии, весь оный костел покрыт гонтом под гвоздь, которая кровля крашена темно-розовой краской, весь вокруг стены ошиты шалевками, окон с железными решетками 7, круглых 3 и без решеток вообще 14, все имеют сосновые рамы, с приходу в костел находится квадратное деревянное крыльцо, на котором четыре столба каменные с досками с сего же крыльца входя в костел двери большие створчатые, двойные, ошалеванные...в притворе имеет 5 дверей, 1-я посредине в половину стеклянная, над ним окно полуциркулярное стеклянное, по обеим сторонам сих дверей есть двое дверей в костел и по бокам стенам притвора суть по кривой дверь в темницу, а по левой ведущая на хор и верх костела под притвором вверху находится хор, где орган имеется 10 голосный, исправлен вновь, от органа по обеим сторонам около двух стен навес балясником токарской работы обведенный. Внутри костела по обеим сторонам лавки столярской работы, между которыми с правой стороны и левой по два столба ошиты шалевками для поддержания костельного верху; в костеле пять алтарей и два престола по каплицам. Первый алтарь резной работы о трех возвышениях на алтаре цимбориум крашенный с дверцами резной работы с замком на первом возвышении Зачатия Св.Анны в вызолоченных рамах резной работы сзади обит красным сукном. Ризу имеет серебряную двух ангелов и Духа Святого в виде голубя за малиновою и газовою занавесками, а по обеим сторонам сего образа стоят по три Апостола резной работы, на другом возвышении образ Св. Троицы на полотне рисован в серебряных коронах и сердцем закрывающим раны Иисуса Христа за шелковую занавескою, третье возвышение – образ распятого Иисуса Христа, по одну сторону изображена Матерь Божья, по другую сторону Иоанна резной работы. Весь...алтарь и возвышения покрашены темно-голубым цветом и в некоторых местах проведены золотые кривые линии.

Второй алтарь по правой стороне, шествуя от первого, Пресвятой Богородицы Рожанцевой в деревянных рамах...над ним образ Св.Станиславы...в деревянных рамах.

Третий алтарь с образом Св.Викентия в рамах деревянных на полотне...

Четвертый алтарь на левой стороне с образом Св.Доменика в рамах вызолоченных.

Пятый алтарь с образом Спасителя у столба резной работы, а над алтарем образ в рамах Св.Антония на холсте.

Оттоль каплица отделана стеною, в которой находится престол – изображение сидящего с тростью Спасителя покрыто шелковою ризою, наверху изображено распятие на кресте резной работы.

Напротив той же каплицы в ответственной фигурке другая в оном изображении Матери Божей на престоле держащей Спасителя резной работы все вызолоченные алтари имеют деревянные престолы резной работы.

...по правой стороне от Большого алтаря шествуют два образа: Св.Димитрия и Св.Феклы в рамах резной работы.

В костеле для проповеди амвон крашенный, над коим небольшой навес резной работы.

При баласнике в костеле по обеим сторонам стоят четыре памятника с надписями погребенной владельческой фамилии Голынских. При всех сказанных алтарях находятся картины, изображающие святых в вызолоченных рамах штук 35 и разного цвета рамах шт. 5 и исповедальниц крашенных 3.

Закристия по правой стороне от алтаря пустая, в которой двое дверей окованных с замком, с оной закристии сени на крыльцо ведущие на цвинтарь, которое покрыто шалевками.

Каменная колокольня, в которой находится три колокола. Вокруг костела и колокольни идет каменная ограда до половины и сверху штакет деревянный, вход под колокольней, двери створчатые двойные. По бокам колокольни суть изображение направо Распятие Спасителя, а с левой Иоанна Крестителя, оба под навесом.

КАПЛИЦЫ

Каплица во имя Св. Пророка Ильи в фольварке Бели, владения наследников покойного титулярного советника Иосифа Горбацкого, построена в 1816 году в расстоянии 12 верст от Кричева. Деревянная, длиною 20 арш., шириною 9 арш. на ней с фронта 3 главы...вся покрыта гонтом, окон больших 7, а малых круглых 3, с железными решетками, дверей трое с железными задвижками... Три алтаря.

Каплица во имя Провидения Господня в фольварке Низках владения помещика Фадея Михайловича сына Чудовского построенная и посвященная Деканам Мстиславльским в 1798 г. июля 4 дня...13 верст от м. Кричева. На каменном фундаменте, соснового распиленного дерева, длиною 11, шириною 6 $^{1}/_{2}$, а вышиною 6 $^{1}/_{2}$ от потолка аршин гонтом под гвоздь

железный покрыта, спереди небольшая башня, в ней небольшой колокол, а вверху крест железный, входя в такую каплицу с востока фронтом или крыльца в целую ширину каплицы на 1 арш. длины 4 колонная входя до притвора внутри двери простой столярской работы...

В притворе в стене лестница на хор...окошек в самой каплице четыре, а пятое на хорах полукруглое. ...с левой стороны алтаря двери в ризницу небольшую, имеющую форму половинную геометрического экзагона, пристроенную на крюках.

Слуги костельные:

1. Органист Николай Яковлев, крестьянин Викентия Голынского, тайного советника из местечка Кадина, веры римско-каталической, лет от роду 27 в должности 7 год.
2. Дмитрий Гапеев из крестьян оршанских ксензов доминиканов от роду 46 лет, веры римско-католической, в должности при кухне 9 год.
3. Иван Улазовский из дворян Чериковского уезда околицы Свинной, веры римско-католической, от роду 16 лет, в должности 1 год.
4. Николай Шипилко из дворян Могилевского уезда, веры римско-католической, от роду 11 лет, в должности 1 год.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 822. Воп. 12. Спр. 2853.

У парэформенны час

У першай палове XIX ст. паўсюдна адбываліся змены ў развіцці эканомікі. Наступалі капіталістычныя адносіны, аднак перашкодай на іх шляху стаяла прыгонніцтва. Патрэбны былі змены. Іх у пэўнай ступені прынесла рэформа 1861 г. Пачалася яна з адмены прыгоннага права. Царскі маніфест аб гэтым быў падпісаны 19 лютага 1861 г. Паводле «Агульнага палажэння» памешчык лічыўся ўласнікам зямлі, якая належала яму да рэформы. Сялянам давалася права са згоды памешчыка выкупляць зямельны надзел. За карыстанне надзельнай зямлёй сяляне абавязаны адбываць паншчыну або плаціць памешчыку аброк. Памешчыкам было дазволена складаць адпаведныя дакументы, у якіх вызначаліся памеры зямельных надзелаў і павіннасцей часоваабавязаных сялян.

Пазямельнае ўпарадкаванне ў Магілёўскай губерні праводзілася згодна «Мясцовага палажэння», якое ўстанаўлівала ў залежнасці ад мясцовых умоў парадак надзялення сялян зямлёй і выканання імі павіннасцей на карысць памешчыкаў. У Магілёўскай губерні былі ўстаноўлены дзве нормы душавых надзелаў – вышэйшая і ніжэйшая. Ніжэйшая норма была ў 3

Свята-Мікольская царква ў Крычаве, XIX ст.

разы меншая за вышэйшую. Атрымаць душавы надзел меў права толькі мужчына. У Чэрыкаўскім павеце памеры надзелаў былі наступныя: вышэйшы ад 4 да 5,5 дзесяціны, ніжэйшы – ад 1 дзес. 800 кв. саж. да 1 дзес. 2000 кв. саж.

У Магілёўскай губерні за вышэйшы душавы надзел сяляне павінны былі адпрацаваць на паншчыне 40 дзён мужчынскіх і 30 жаночых, або выплаціць 8 руб. аброку ў год. Паншчыну абавязаны былі выконваць усе мужчыны ва ўзросце ад 18 да 55 гадоў і жанчыны – ад 17 да 50 гадоў. Работы часоваабавязаных сялян на працягу працоўнага дня вызначаліся спецыяльным урочным палажэннем, скла-

Свята-Васкрасенска-Параскевінскі сабор.

дзеным Магілёўскім губернскім камітэтам па сялянскіх справах.

Большасць сялян не мела магчымасці прыдбаць ва ўласнасць зямлю. У Чэрыкаўскім павеце вышэйшы душавы надзел (4 дзес.) каштаваў 133 руб. 33 кап.

Атрымлівалася, што сяляне і пасля адмены прыгоннага права па-ранейшаму заставаліся ў вялікай залежнасці ад памешчыкаў, не маглі стаць самастойнымі гаспадарамі.

Большасць насельніцтва Крычаўшчыны складалі сяляне. Яны вырошчвалі жыта, авёс, грэчку, пшаніцу. Потым гэтыя культуры пачалі менш займаць пасяўныя плошчы, іх пацяснілі лён, канопля і бульба. Льнаводства, канапляводства і бульбаводства нейкі час лічыліся даволі прыбытковымі галінамі. Гэту прадукцыю можна было выгадна прадаць, ды і для сябе яна прыносіла нямала карысці.

Сярэдні ўраджай з дзесяціны ў Чэрыкаўскім павеце ў 1899 г. складаў: жыта – 35–40 пудоў, аўсу – 45–50, ячменю – 35–40, грэчкі – 15–25, бульбы – 350–500 пудоў.

Апрача вырошчвання збожжа і тэхнічных культур, сяляне займаліся авечкагадоўляй і пчалярствам. Мёд, сукно і воск вывозіліся на продаж не толькі за межы Крычаўшчыны, але і Магілёўскай губерні. Некаторыя сяляне Маляціцкай воласці, каб узбіцца на нейкую капейку, спрабавалі выраблять і драўняны вугаль.

Абставіны складваліся так, што з кожным годам значная частка сялян у сувязі з павелічэннем насельніцтва і двароў, абеззямельвалася. У Магілёўскай губерні былі чатыры асноўныя віды землеўладання: надзельныя, прыватнаўласніцкія, а таксама казённыя і царкоўныя. Калі, паводле перапісу па-

зямельнай уласнасці 1877 г., зямельная плошча губерні налічвала 3871113 дзесяцін, то надзельнае землеўладанне, што складала тады аснову сельскай гаспадаркі, раўнялася 1508274 дзес., гэта значыць 39 працэнтам усіх земляў. У той час на кожны двор Чэрыкаўскага павета прыходзілася каля 12 дзесяцін, а ў 1905 г. – толькі ад 6,8 да 7,9 дзесяціны.

Бяспраўе і беднасць прымушалі сялян шукаць выхад з цяжкага становішча. У Маляцічах, напрыклад, сяляне вырубалі панскі лес, пасвілі сваю жывёлу на памешчыцкіх лугах, спрабавалі самавольна захопліваць землі багацеяў. Рух гэты пакуль што не быў шырока арганізаваным і масавым.

Паступова развівалася прамысловасць. Першараднае значэнне надавалася будаўніцтву млыноў, у пачатку стагоддзя амаль на ўсіх млынах былі паравыя машыны. У 1897 г. у Крычаве было 3 гарбарныя і мылаварны заводы, 4 крупадзёркі, 4 маслабойні, 2 народныя вучылішчы.

У сувязі з капіталізацыяй гаспадаркі пашыраўся рознічны гандаль, выросла колькасць крамаў. На пачатку XX ст. у Крычаве дзейнічала 125 крамаў, запасны магазін, паштова-тэле-графная кантора.

З кожным годам абвастраліся сацыяльныя супярэчнасці, узмацнялася барацьба сялян супраць памешчыкаў. Барацьба сялян за зямлю зліваласа з барацьбой рабочага класа. Звесткі аб першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. дайшла і да Крычаўшчыны. У чэрвені 1905 г. у Крычаве было масавае выступленне жыхароў супраць царскіх улад. Актыўную работу ў Маляціцкай воласці праводзіла сацыял-дэмакратычная група, якой кіраваў Фёдар Сцяпанавіч Лаўрэнаў.

Сяляне Крычаўшчыны, як і ўсяго Чэрыкаўскага павета, секлі панскі лес, пасвілі сваю жывёлу на памешчыцкіх сенажацях, грамілі панскія маёнткі, аказвалі супраціўленне павятовай і сельскай адміністрацыі. З 26 снежня 1905 г. па 10 студзеня 1906 г. у Чэрыкаўскім і Клімавіцкім паветах было поўнасцю разгромлена 18 памесцяў. Для падаўлення сялянскага руху царскі ўрад накіроўваў казакоў і паліцэйскіх.

Першая руская рэвалюцыя не вырашыла пастаўленых перад ёю задач. Сяляне па-ранейшаму пакутвалі ад малазямелля, пераносілі здзекі ад памешчыкаў. Больш таго, захавалася шмат павіннасцей. У сялян пераважалі дробныя ўчасткі зямлі, цераспалосіца. Усё гэта патрабавала рэфарміравання старых парадкаў у вёсцы, што з'яўляліся тормазам пераходу да рынкавых адносін.

Ініцыятарам пераўтварэнняў у вёсцы выступіў міністр унутраных спраў П.А.Сталыпін. Рэформа ставіла задачы: стварацъ больш спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы, разбураць сялянскую абшчыну і замацаваць зямлю ў асабістую ўласнасць, насадзіць хутары і адрубы, перасяліць беззямельных і малазямельных сялян у Сібір і іншыя ўсходнія раёны краіны. За 1907 г. з пераселеных людзей 48,8 працэнта складалі жыхары Магілёўшчыны. Дзесяткі сем'яў выехалі шукаць лепшай долі і з Крычаўшчыны.

Рэформа ўмацавала сялянскую буржуазію, паскорыла рост капіталізацыі ў сельскай гаспадарцы, аднак не вырашыла аграрнага пытання і не спыніла нарастання новай рэвалюцыі. У вёсцы, як і ў горадзе, яшчэ больш абвастрыліся класавыя супярэчнасці.

В.Ф. Куліненка.

Дакументы сведчаць

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ АДНОСІНАХ ДА РЭФОРМЫ СЯЛЯН І ПАМЕШЧЫКАЎ ГУБЕРНІ

18 ліпеня 1862 г.

Объехав до настоящего времени более 50 вол. Могилевского, Чаусского, Чериковского и Быховского уу., я считаю долгом довести до сведения в.в.п. о результате моих поездок. Результат этот доныне один и тот же, т.е. везде крестьяне объявляют желание выкупить вместе с усадьбами и полевую землю, т.е., как говорят они, идти на царский выкуп. Нельзя, однако, сказать, чтоб согласившиеся крестьяне были приготовлены уже к этому роду бытового своего устройства, по большей части и в особенности в местах, отдаленных от губернского города, к границам Черниговской губ., мне стоило большого труда добиться этого результата, т.е. вообще побудить их высказать, чего они желают. Действия мои по-прежнему, как я имел честь доносить в.в.п. от 22 июня № 1119, ограничиваются подробным толкованием Положения и разъяснением возбуждаемых крестьянами вопросов, не указывая им на преимущество того или другого способа установления их отношений с владельцами. Эта осторожность в действиях, как я уже убедился, совершенно согласна с духом и характером крестьян: они стоят за свободу, желают, чтобы переворот в их быту совершился по их желанию, и на преждевременные советы смотрят вообще подозрительно. К барщинной повинности имеют полное отвращение и предпочитают выкуп, как действительно более для них выгодный и ставящий их в прямое соотношение с правительством. Общее их в этом отношении желание выражается в поговорке, не раз мною слышанной: «Одному богу молиться, одному царю служить, а на всех панов не наслужишься». Связь здешних крестьян с правительством, царем – сильна. Случалось, что слова: «Это царская воля, царский закон» – разрешали все недоразумения и колебания крестьян. Доверие крестьян губернатору, как царскому слуге, велико, зато связь их с владельцами и доверие к ним совершенно рушились. Лучшим этому доказательством служит то, что крестьяне охотнее верят и скорее готовы слушать всякого носящего звание или костюм чиновника, потому что он, рассуждают они, царский слуга. Скажу еще более, они готовы верить всякому, но только не помещику. Это недоверие крестьян, к сожалению, перешло и на мировых посредников, как помещиков. Мне случалось встречать, что те помещики, которые в прежнее время были любимы крестьянами и имели на них сильное влияние, ныне, как посредники, совершенно без влияния. Это грустное, но, быть может, выработанное временем убеждение крестьян о помещике сильно препятствует успешному ходу дела: парализуя действия мировых посредников и некоторых действительно благомыслящих владельцев, оно допускает прививаться в среде их самым нелепым толком, лишь бы они вышли не из помещичьих уст. Сильнее других распространены между ними слухи, что по истечении 2 лет царь подарит им землю: «Царь дал нам волю, царь даст нам и землю, без земли человек не родился. Прежде не верили, что будет воля, а она дана, быть может так и будет и с землею». Нужно при этом заметить, что хотя крестьяне не ощущают еще, так сказать, физически последствий дарованной им монархом свободы, но нравственно сознают и предвкушают ее блага и сердечное их в этом отношении благодарность и любовь к государю – беспредельны.

Действия мировых учреждений удовлетворительны. Несмотря на поспешность, с которой производился выбор сельских властей, и на новость этого дела, в посещенных мною волостях мне редко встречалось видеть сельских старост и волостных старшин, которые не отвечали бы своему назначению. Правда, встречаются между ними люди с слабым характером и без влияния, но между волостными старшинами встречались люди с прекрасным направлением, вполне уразумевшие сущность Положения и имеющие на крестьян огромное благодетельное влияние. К чести крестьян должно заметить, что при перемене мировыми посредниками порочных и вообще несоответствующих своему назначению старост и старшин, они не только не высказывают неудовольствия, но много помогают в этом посредникам.

Из разговоров моих с крестьянами я убедился, что они весьма мало знакомы с Положением, что также много вредит делу, и если встречается поэтому крайняя необходимость распространения между ними основных начал Положения, то тем не менее необходимость эта чувствуется и по отношению к помещикам. Между последними случилось мне встречать людей, не читавших Положения и знающих о нем только по слухам. Некоторые из них даже не верят в уничтожение крепостного права и убеждены в сохранении на долгое еще время прежних отношений их к крестьянам. Мне случилось иметь дело с помещиком, который не

соглашался на выкуп крестьян только потому, что не знал, что крестьяне и без его согласия будут иметь возможность перейти на оброк, и с другим, который весьма удивился, услышав, что выкупные свидетельства приносят проценты. Говоря о понятиях и действиях помещиков Могилёвского, Чаусского, Чериковского и Быховского уу. в крестьянском деле, я имею основания разделить в этом отношении помещиков на 3 категории. Одни из них, впрочем весьма малая часть, или охотно, или после долгого убеждения соглашаются на выкупную операцию, другие твердо стоят за барщинную повинность в уверенности, что как бы ни были тяжелы их требования по отношению к крестьянам, они найдут в будущем сильную поддержку со стороны правительства, наконец, третьи, самая большая часть – выжидающие, как это дело решится и пойдет у других, это последнее обстоятельство еще более убеждает меня в необходимости делать поездки по губернии с промежутками в той цели, чтобы начинающему выкупному делу дать более гласности и свободы...

Гражданский губернатор Беклемишев.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.). Док. и мат. Мн., 1959. С. 420–422.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МАГІЛЁЎСКАЙ ПАЛАТЫ КРЫМІНАЛЬНАГА СУДА ПА СПРАВЕ АБ МАСАВЫХ ВЫСЕЧКАХ ПАМЕШЧЫЦКАГА ЛЕСУ СЯЛЯНАМІ ВЁСКІ ВАРОДКАВА

30 ліпеня 1862 г.

По указу е.и.в. Могилевская палата уголовного суда слушала: записку из жалобного дела, представленного на ревизию палаты Чериковским уездным судом 16 июля, о казенных крестьянах дер. Вородково Демьяне Иванове, Иване Иванове, Фоме Демьянове, Трофиме Федосове и Петре Андрееве, судимых за порубку леса помещика Москевича.[1]

Обстоятельства дела сего следующие:

Объявление Батвинов – Ботвиновская помещица Алекской экономии, представляя 27 февраля 1861 г. в Чериковский земский суд лошадь с санями и упряжью, взятую у казенных крестьян дер. Ботвиновки по самовольной порубке дровяного леса, принадлежащего помещику Москевичу, просила лошадь по оценке с санями и упряжью выдать экономии, а с вырубившими до 6 десят. дровяного леса поступать, взыскав с них понесенные через то убытки.[2]

А поэтому палата полагает:

Подсудимых казенных крестьян Демьяна Иванова 50, Ивана Иванова 36, Трофима Федосова 44, Петра Андреева 33 и Фому Демьянова 20 лет за их вину на основании приведенных законов, первых 4 лишить всех особенных лично и по состоянию присвоенных им прав и преимуществ, а последних – без лишения сих прав наказать розгами при земской полиции 40 ударами каждого и потом отдать под особый надзор общества на 2 года. Кроме сего, взыскать поровну с их имущества, им принадлежащего, по оценке за вырубленный лес 60 руб., деньги эти обратить на удовлетворение помещика Москевича. Если же кто из подсудимых окажется несостоятельным к платежу упадающей на него части взыскания, то эту часть взыскать с имущества состоятельных (ст. 64 Уложения).

Григория Игнатьева, Льва Иванова, Петра Николаева, Ивана Иванова и Андрея Степанова, как не сознавшихся и не уличенных в порубке леса, согласно 304 ст. XV т. оставить от суда и взыскания свободными.

Находящуюся у управляющего Ботвиновской экономии дворянина Ронандзинского по поручительной расписке лошадь с упряжкой и санями подсудимого Демьяна Иванова возвратить Иванову в том лишь случае, если упадающее с него и его товарищей взыскание будет ими исполнено, в противном случае обратить ту лошадь с упряжкою и санями на удовлетворение присужденного взыскания с подсудимых.

Прогонные деньги, выданные кандидату судебного следователя взыскать с подсудимых, а в случае несостоятельности их принять на счет казны.

---

[1] Опущено перечисление документов по делу.

[2] Опущено 10,5 листа текста с показаниями подсудимых и свидетелей.

По делу этому допущена медленность становым приставом Буйвидом, заключающаяся в том, что земским судом поручено было ему произвести осмотр порубленному лесу 2 марта, а приступил едва 22 сентября, за что виновному на основании 455 ст. Уложения определяется замечание, или выговор, более или менее строгое, а потому медленность эту подать на положение губернского правления, согласно с. 255 ст. II т. Сводов губернских учреждений, но не приводя сие решение в исполнение, вместе с делом представить на рассмотрение г-на начальника губернии и когда будет утверждено, привести в исполнение.

За председателя
Заседатель Королев
Заседатель Абалалович

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.). Документы и материалы. Мн., 1959. С. 423-424.

ЦЭНЫ НА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ПРАДУКТЫ ПА КРЫЧАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА, 1899 г. (в копейках)

	за пуд у помещика	за пуд у скупщика	март		май	
Рожь яровая	65	65	66	69	50	55
Рожь озимая	60	65	66	69	50	55
Пшеница яровая	90	80	80	85	80	83
Пшеница озимая	93	85	90	93	80	83
Овес	53	55	58	60	52	56
Ячмень	60	63	60	61		
Гречиха	65	68	65	67		
Просо	55	58	55	58	55	57
Картошка	16	18	16	18	12	13
Горох	75	80	75	80	68	70
Лен семена	115	120	115	120	110	112
Лен волокна	200	210	210	220	200	210
Конопля семена	130	133	130	133	130	133
Конопля волокна	220	225	200	210	180	190
Сено	18	18	20	23	15	20
Солома	10	12	11	12	10	11

Податный инспектор Чериковского уезда Могилёвской губернии

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 2176. Воп. 1. Спр. 80.

ВОЛАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА І КЛІМАВІЦКАГА ПАВЕТАЎ, У СКЛАД ЯКІХ УВАХОДЗІЛІ ВЁСКІ ЦЯПЕРАШНЯГА КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА

Беліцкая воласць

Населеных месц 63: 2 сялы, 32 вёскі, 16 фальваркаў, 6 маёнткаў, 6 хутароў, ваколіца. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Беліцкае, Няжкоўскае, Слабодскае, Рабяткаўскае, Асінаўскае, Альхоўскае, Чарнасосенскае, Прыбярэжскае, Лыкінскае, Верхавецкае, Ратнаўскае, Касцюковіцкае, Вародзькаўскае 1-е, Вародзькаўскае 2-е, Асавецкае, Волкаўскае, Ракіцінскае, Забалоцкае, Баеўскае, Грабалоўскае, Петрынскае, Верамееўскае, Паходавіцкае, Каркаўшчынскае, Ляхаўскае.

Праваслаўных цэркваў 3: у Вярхоўцах, Вародзькаве, Забалоцці, рымска-каталіцкі касцёл у Вародзькаве. Вучылішчы знаходзіліся ў Беліцы, Няжкоўцы, Рабятках, Чорнай Сасне, Вярхоўцах, Вародзькаве, Забалоцці, Баеўцы, Верамейках. З лячэбных устаноў на тэрыторыі воласці быў адзін толькі прыёмны пакой у Беліцы. Працаваў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Беліцы, Вародзькаве, Паходавічах, млыны – у Беліцы, Вародзькаве, Рабятках, Ракіцінцы, Забалоцці, Баеўцы. У Беліцы працаваў дзягцярна-шкіпінарны завод.

Камаровіцкая воласць

Населеных месц 70: 3 сялы, 24 вёскі, 26 хутароў, 8 маёнткаў, 6 фальваркаў, 2 памесці, паштовая станцыя. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Камаровіцкае, Халоблінскае, Бліжнярэчыцкае, Дальнярэчыцкае, Волчаскае, Вудажскае, Вохарскае, Вусцеўскае, Гойкаўскае, Зорскае, Гліньскае, Балванаўскае, Лушчэеўскае, Юркаўскае, Прусінскае, Бацьвінаўскае, Сечыхскае, Горкаўскае, Глубіншчынскае.

Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Камаровічах, Волчасе і Бацьвінаўцы, вучылішчы – у Камаровічах, Бліжняй Рэчыцы, Волчасе, Вудазе, Вохары, Вусці, Зорах, Гліні, Лушчэеўцы, Прусіне, Бацьвінаўцы, Глубіншчыне, Дальняй Рэчыцы. Школ граматы ў воласці было 6.

Фельчарскі пункт знаходзіўся ў Камаровічах. Працаваў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Камаровічах, Дальняй Рэчыцы і Глубіншчыне. Млыны працавалі ў Камаровічах, Вусці, Лушчэеўцы, Юркаўцы і Глубіншчыне. З прамысловых прадпрыемстваў у воласці былі вінакурныя заводы ў наступных населеных пунктах: у Міхліне, Вусці, Лушчэеўцы і Халобліне.

Крычаўская воласць

Населеных месц 34: мястэчка, сяло, 12 вёсак, выселак, 2 маёнткі, 3 заезныя дамы, 4 фальваркі, 9 ваколіц, адна шашэйная будка. У воласці было 13 сельскіх таварыстваў: Крычаўскае, Варанёўскае, Галушнеўскае, Бельскае, Свінянскае 1-е, Свінянскае 2-е, Гарбацкае, Камароўскае, Замсовіцкае, Касцюшкавіцкае, Хацілавіцкае, Сакольніцкае, Новасакольніцкае. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Крычаве і Залесавічах; рымска-каталіцкі касцёл – у Крычаве, там жа былі яўрэйскія сінагога і малітоўныя школы. Вучылішчы працавалі ў Крычаве, Хацілавічах, Залесавічах, Камароўцы, Гарбатцы, Белі, Свіной, Сакольнічах і Макаўі. Акрамя гэтага, у воласці было 2 школы граматы. З лячэбных устаноў у воласці быў толькі прыёмны пакой у Крычаве. Запасных хлебных магазінаў было 3. Казённыя вінныя лаўкі працавалі ў Крычаве і Камароўцы. Млыны былі ў Крычаве, Варанёве, Камароўцы, Макаўі.

У Крычаве знаходзіўся мылаварны і 4 гарбарныя заводы. Праз воласць праходзіла Маскоўска-Варшаўская шаша.

Маляціцкая воласць

Населеных месц 64: 5 сёл, 30 вёсак, 3 ваколіцы, пасёлак, 7 маёнткаў, 10 фальваркаў, хутар, 5 засценкаў, Слабада. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Ананіцкае, Антонаўскае, Бельскае 1-е, Бельскае 2-е, Белазуйкаўскае, Беражысцянскае, Валаўніцкае 1-е, Валаўніцкае 2-е, Глупецкае 1-е, Глупецкае 2-е, Дабранскае, Ермакоўскае, Залачэўскае, Кашанскае, Лабковіцкае, Мышкоўскае, Паўлавіцкае, Палоніцкае, Сарачынскае, Сялецкае, Старасельскае, Целяткоўскае, Шчарбацкае.

Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Маляцічах, Добрым, Паланіцы, Кашанах, Белі 1-й, Ануфрыеве. Яўрэйская сінагога была ў Маляцічах. Вучылішчы працавалі ў Маляцічах, Кашанах, Ануфрыеве, Добрым, Лабковічах, Белі 1-й, Паланіцы, Сяльцы, Глупіках 2-х. Працавала адна школа граматы.

Аўтар В.Л.Насевіч

Крычаўская воласць у XVII–XVIII ст.

У Маляцічах знаходзіўся прыёмны пакой. У воласці былі два запасныя хлебныя магазіны. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Маляцічах, Добрым і Ануфрыеве. Млыны працавалі ў Маляцічах, Залачове, Добрым, Мышковічах, Большах, Ануфрыеве, Глупіках, в.Белі, с.Белі.

Список населённых пунктов Могилёвской губернии. Могилёв, 1910.

СПІС ПАМЕШЧЫКАЎ КАТАЛІЦКАГА ВЕРАВЫЗНАННЯ ПА ЧЭРЫКАЎСКАМУ ПАВЕТУ, МАЁНТКІ ЯКІХ АБКЛАДЗЕНЫ ПАДАТКАМІ. 1890 год

Голынский Станислав Дмитриевич – им.Гайдуковка.
Голынский Михаил Иванович и сестра его София, в замужестве Ващ – им.Холоблин.
Голынский Владислав Степанович – им.Кричев.
Голынский Иван Степанович – лесная дача Боровка.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2176. Воп.1. Спр.1. Л.3.

Шлях да ведаў

Пасля адмены прыгоннага права пад націскам грамадскага руху царскі ўрад вымушаны быў правесці некаторыя рэформы і ў галіне асветы. Адкрываліся народныя вучылішчы. Асноўнымі прадметамі былі: Закон Божы, руская і царкоўнаславянская мовы, арыфметыка, гісторыя, геаграфія. Выкладаліся ўрокі царкоўных спеваў. У 1897 г. у Крычаве працавалі 2 народныя вучылішчы.

У 1880 г. у Крычаве было 5 царкоўнапрыходскіх і 4 малітоўныя школы. У Прусіне, Бацьвінаўцы, Волчасе, Маляцічах і ў іншых населеных пунктах працавалі школы граматы. У 1888-1889 гг. у Чэрыкаўскім павеце, у які ўваходзіла і Крычаўшчына, налічвалася 15890 дзяцей школьнага ўзросту. З гэтай колькасці 12860 хлопчыкаў і дзяўчынак нідзе не вучыліся. Царкоўнапрыходскія школы наведваў 481



Крычаўская двухкласная школа, пач. XX ст.

вучань (463 хлопчыкі і 18 дзяўчынак), школы граматы – 1689 вучняў (1560 хлопчыкаў і 120 дзяўчынак). У павеце дзейнічала 16 царкоўнапрыходскіх школ і 85 школ граматы. Адна школа прыходзілася на 1107 чалавек, а з улікам навучальных устаноў Міністэрства народнай асветы – на 924 чалавекі. Большасць дзяцей не мелі магчымасці іх наведваць з-за адсутнасці ў бацькоў грошай. Таму пісьменнасць у павеце была даволі нізкая. Паводле перапісу 1897 г. яна складала толькі 12,8%.

У 1888 г. у Крычаве вырашана было адкрыць пры 1-м народным вучылішчы рамесныя класы для сялянскай моладзі. Вучыліся тут у асноўным дзеці беднякоў. Рамесныя класы праіснавалі нядоўга. Пажар знішчыў будынак з усім абсталяваннем і заняткі спыніліся.

Між тым неабходнасць у кваліфікаваных спецыялістах з кожным годам узрастала. Валасны старшына Пракопаў 13 кастрычніка 1901 г. пісаў губернскаму начальству:

«Вследствие малоземелия у крестьян Кричева, так же равно и прилегающих к нему селений, уходили в другие губернии для заработка, но не имея специальной подготовки к определенному занятию, отхожий промысел мало приносил пользы местному населению. Ввиду этого желательно бы было иметь в Кричеве хотя низшую ремесленную школу, которая дала бы специальную подготовку.

Фабрик в окрестностях м.Кричева не имеется. Заводы хотя и есть: три винокуренных, один стекольный и 4 кожевенных, но они мало приносят материальной поддержки местным жителям, сельское хозяйство находится в плачевном положении. Земли мало и та обрабатывается первобытным способом, так как местное производство усовершенствованных земледельческих орудий не имеет, а таковые должны выписываться из отдаленных торговых пунктов, что вовсе не по средствам крестьянам, да и приобретенные орудия прописанным способом при малейшей порче их должны бездействовать, ибо в окрестностях наименее хороших мастеров, которые могли бы привести их в надлежащий порядок».

Пачалося будаўніцтва двухпавярховага будынка пад рамесную школу. У 1908 г. у гэтай школе адкрылася два аддзяленні: слясарна-кавальскае і сталярна-такарнае. На першым аддзяленні налічваліся 52 вучні, на другім — 8.

Па тым часе адкрыццё ніжэйшай рамеснай школы ў Крычаве з'явілася важнай падзеяй. Тут пачалі рыхтаваць спецыялістаў, неабходных як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Вывучалі тут арыфметыку, Закон Божы, рускую мову, тэхналогію, чарчэнне, рахункаводства, фізіку і механіку, маляванне, слясарнае, такарнае, кавальскае і сталярнае рамёствы. У час вучобы вучнямі ў майстэрнях выраблялiся кронцыркулі, вугольнікі, ключы, розныя замкі і г.д. У магазіне гатовых вырабаў, які існаваў пры вучылішчы, жыхары ахвотна набывалі зробленыя навучэнцамі рэчы. Рыхтуючы кваліфікаваных спецыялістаў, рамесная школа адыграла станоўчую ролю ў справе развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі Крычаўшчыны.

У 1912 г. працавала Крычаўская народная школа. У ёй займаліся 113 хлопчыкаў і 11 дзяўчынак.

В.Ф. Куліненка.

Ахова здароўя

Застаючыся звычайным мястэчкам у складзе Чэрыкаўскага павета, Крычаў не мог пахваліцца добрым санітарным станам. Умовы жыцця насельніцтва тут былі надзвычай дрэннымі. І гэта не магло не адбіцца на здароў'і людзей.

З кожным годам у мястэчку няспынна ўзрастала колькасць інфекцыйных хворых. Шырока распаўсюджанымі хваробамі сярод жыхароў сталі сухоты, шкарлятына, дыфтэрыя, брушны тыф, дэзентэрыя і адзёр.

Адной з крыніц інфекцыйных захворванняў з'яўлялася самая звычайная вада. Большасць местачкоўцаў бралі яе са студняў, зробленых наспех і з парушэннем санітарных норм. Вада не заўсёды была прыгоднай для ўжывання, бо студні не мелі стрэшак і бруку вакол, у іх з бліжэйшых памыйных і смеццявых ям траплялі нечыстоты.

Да пагаршэння стану здароў'я крычаўлян таксама прыводзілі цяжкія ўмовы працы. Так, рабочы дзень на прадпрыемствах і ў майстэрнях доўжыўся да 12—14 гадзін у суткі. Ды і дамашнія ўмовы жыцця не садзейнічалі ўмацаванню здароў'я, была вельмі нізкай заработная плата.

Медыцынскае абслугоўванне як у Крычаве, так і ва ўсім павеце знаходзілася ў самым горшым стане. Не было кваліфікаваных урачоў, якія б своечасова змаглі прыйсці на дапамогу хворым людзям, ім даводзілася звяртацца ў большасці выпадкаў да бабак-шаптух ці дамарослых, без адпаведнай адукацыі, лекараў-саматужнікаў.

У канцы XIX ст. у павеце працавалі 2 бальніцы ў Чэрыкаве (па 36 ложкаў) і тры сельскія прыёмныя пункты – у Маляцічах (12 ложкаў), Краснаполлі (20 ложкаў). У павеце хворых лячылі 6 урачоў, 13 фельчараў, 6 бабак-павітух.

Пра тое, што захворваемасць насельніцтва з кожным годам узрастала, сведчыць такі факт. Калі ў 1893 г. да медыцынскіх работнікаў звярнулася за дапамогай 30788 жыхароў павета, то ў 1911 г. іх колькасць узрасла да 104240 чалавек. На даволі высокім узроўні трымалася смяротнасць людзей, як з-за недахопу медыцынскіх устаноў, так і з-за адсутнасці ўрачоў высокай кваліфікацыі, якія б беспамылкова маглі вызначыць дыягназ захворвання і прапісаць эфектыўныя лекі.

Крычаў, як бачым, па-ранейшаму пакутаваў без бальніцы. Ніхто не клапаціўся аб здароў'і тысяч яго жыхароў. У 1908 г. тут працаваў толькі адзін прыёмны пакой. Медыкаменты людзі набывалі ў 3 аптэках павета, 4 аптэчных лаўках. Адна аптэка з гэтай колькасці дзейнічала ў мястэчку, дзе правізарам у 1899 г. быў Баляслаў Дамброўскі.

В.Ф. Куліненка.

Дакументы сведчаць

АБ ДРЭННЫМ СТАНЕ БУДЫНКАЎ ЗЕМСКІХ ВУЧЫЛІШЧАЎ У ПАВЕЦЕ

Протокол заседания Чериковской уездной управы по делам земского хозяйства 1909 г. ноября 6.

СЛУШАЛИ: Непременный член Управы доложил, что открытые в прошлом 1908 году земские училища в деревнях Бирюлях, Гнилице и Веприно находятся в невозможных условиях в смысле помещений: Гнилицкое училище ютится в избушке размерами 7 х 7 аршин, с небольшими окошечками, дающими мало света; избушка эта не осмотрена и не защищена от холода. Помещение Бирюльского училища еще в худших условиях. Подыскать в этих селениях помещения, хотя бы несколько лучше, не представляется возможным, за неимением таковых вовсе в этих деревнях. Ближайших селений, куда можно было бы перевести эти школы с таким расчетом, чтобы они могли обслуживать эти деревни, нет. Вепринское земское училище помещается в несколько лучшей крестьянской избе, но далеко не пригодной для помещения школы, если же принять в расчет число учащихся в этом училище 15-20 человек и наличность в дер.Веприне церковноприходской школы в благоустроенном помещении, то существование там школы является бесполезным и не оправдывающим тех затрат, которые приходится нести по содержанию училища.

Представляя изложенное на усмотрение управы, непременный член полагал бы перевести эти школы в другие пункты, нуждающиеся в училищах. Такими пунктами непременный член указал: дер. Костяговщину Самотеевичской вол., хут.Высокий Борок Полужской вол. и дер.Бель 2-ю Малятичской вол., где школа существовала до текущего учебного года и переведена в Белю 3-ю, отстоящую в 1-й версте.

Выслушав настоящий доклад и соглашаясь с заключением непременного члена, Управа определяет: Гнилицкое, Бирюлинское и Вепринское земские училища ныне же перевести в указанные непременным членом пункты или другие деревни, где возможно будет подыскать подходящие помещения для училища.

Подлинный за надлежащими подписями.
С подлинным верно: председатель Управы Оболенский

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 497. Воп.1. Спр. 631. Л. 33.

АБ ПАБУДОВЕ ПАМЯШКАННЯ НІЖЭЙШАЙ РАМЕСНАЙ ШКОЛЫ Ў м.КРЫЧАЎ

В дополнение на предложение от 18 текущего декабря за №15819 препровождаем при сем плане две сметы 1) на постройку каменного двухэтажного здания для низшей ремесленной школы 2) на постройку каменного сарая при этой школе...

Кондиции

Сумма на сказанный подряд исчислена в 31270 рублей 92 коп. Назначенные для этих работ материалы и вещи обязан поставить самого лучшего достоинства в числе и размере, обозначенных в смете, а именно: а) камень булыжный должен быть твердых пород, для фундамента не менее одного кубического фута, а для мостовых и канавок по оси длинны камня, от 2-х до 2. б) щебень кирпичный чистый, без примеси землистых частей.

В 1896 году у младшего нотариуса г. Горок господина Лопича была совершена помещиком И.С.Голынским дарственная запись на упомянутый в моем представлении от 18 февраля за №83 меной участок в 30 десятин, в пользу бывших, ныне сгоревших, ремесленных классов, при 1-м Кричевском народном училище. Старший же нотариус эту дарственную утвердить не смог, так как означение сменил рядовое и на основании статьи 967 закона гражданского дарить его господин Голынский помимо наследников не может.

Распределение уроков в Кричевской ремесленной школе на 1910/11 г.

I класс
понедельник – рисование, русский язык
вторник – черчение
среда – арифметика
четверг – русский язык
пятница – арифметика
суббота – закон божий

II класс
понедельник – рисование
вторник – черчение
среда – нет уроков
четверг – рисование
пятница – нет уроков
суббота – арифметика, закон божий

III класс понедельник – рисование
вторник – черчение
среда – технология счетоводства
четверг – технология
пятница – черчение
суббота – технология, закон божий
IV класс суббота – сведения из физики и механики

Преподававший общеобразовательными предметами вверенной мне школы учитель 1-го Кричевского народного училища Игнатий Макаревич с 1 числа будущего октября переводится на новую должность в город Мстиславль. На место Макаревича в Кричевское народное училище назначен учителем Владимир Седлецкий... окончивший Учительскую семинарию.

Формулярный список октября 1 дня 1909 года

Учителя 1-го Кричевского народного училища Чериковского уезда Владимира Седлецкого.

21 год, из крестьян, окончил учительскую семинарию.

Формулярный список учителя Кузьмы Осиповича Галковского

36 лет; мещанин, в 1893 году окончил курс Милославичской школы и получил свидетельство на звание начального учителя.

Декабрь 15 дня 1908 года

Введенная мне школа открыта на два отделения: слесарно-кузнечное и столярно-токарное. В настоящее время на слесарно-кузнечном отделении числится 52 ученика и на столярно-токарном 8 учеников.

Л.113/об/. Число учащихся предполагает увеличение до 80–85.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф.2254. Воп.2. Спр.258. Л.5, 7, 52, 74, 79, 101, 113.

АБ ПЛАЦЕ ЗА НАВУЧАННЕ Ў КРЫЧАЎСКАЙ НІЖЭЙШАЙ РАМЕСНАЙ ШКОЛЕ

Директору народных училищ
Могилевской губернии.
Февраля 11 дня 1909 года.

Уведомляю, что я разрешаю установить в Кричевской низшей ремесленной школе плату за учение в размере трех рублей в год с каждого ученика.

Попечитель.

Сентября 9 дня 1909 года.

... принять в 1 класс вверенной мне школы четыре ниженаименованные ученика, выдержавшие приемные испытания, но перешедших установленный 16-тилетний возраст (предельный):

Шарикова Максима Ивановича, родившегося 23 января 1893 года
Козлова Андрея Ивановича, родившегося 17 октября 1892 года
Поклада Ивана Егоровича, родившегося 21 июня 1892 года
Серникова Нила Илларионовича, родившегося 10 ноября 1891 года

Заверил князь Георгий Николаев.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 258. Л. 57, 73.

РАПАРТ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА СПРАЎНІКА МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

2 кастрычніка 1895 г.

Его превосходительству
Господину Могилевскому губернатору
Чериковского уездного исправника рапорт.

В исполнении циркулярного предписания от 9 сего октября за №62 представлял при сим копию устава о ремесленных классах при Кричевском 1-м народном училище и ведомость о приказе и расходе денежных средств.

Л.18/об./ сумма за 1894 год, а также копию приговора Кричевского сельского общества от 26 октября 1886 года за №7 об открытии в м. Кричеве 2-го народного училища, имею честь донести Вашему Превосходительству, что названное училище открыто с 1887 года в помощь первому Кричевскому народному училищу, для обучения одних лишь крестьянских детей м. Кричева, на содержание которого ежегодно отпускается Кричевским сельским обществом 200 рублей. Из них 180 рублей на жалованье учителю и 20 рублей на училищные расходы, в нем обучалось крестьянских детей м. Кричева, за последний 1899 год 69 человек, заведывает же этим училищем как и первым Могилевская дирекция народных училищ. Более частных обществ, комитетов и т.п. учреждений, имеющих целью содействовать развитию народного образования или грамотности вообще в Чериковском уезде нет.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 2001. Воп.1. Спр. 1579, Л.18–19.

ПАТРАБАВАННІ ДА ЯКАСЦІ БУДАЎНІЧАГА МАТЭРЫЯЛА, З ЯКОГА ПАВІННА ЎЗВОДЗІЦЦА КРЫЧАЎСКАЯ НІЖЭЙШАЯ РАМЕСНАЯ ШКОЛА

в) кирпич должен быть хорошо выжженый, иметь поверхность ровную, с прямыми углами и ребрами, без стекловидного блеска в измеле однородной массы, без мергеля, указанной меры и при ударе издавать чистый металлический звук.

г) изразцы поверхности совершенно ровной, без вышибов и выпуклостей, углы и края ровны и звук при ударе чистый металлический.

д) алебастр должен быть калужский, в камнях в сыром виде лучшей доброты, раствор известковый хорошо перемешанный с песком в пропорции, определенной после предварительного и совершенного гашения извести посредством спуска её в жидком состоянии в особое творило через проволочную сетку, не пропускающую мергель для образования массы, способной удержать 7 кирпичей, положенных на этом растворе по прошествии 4 дней.

е) глина должна быть смочена водой и размята, прилипать к рукам.

ж) песок... для фундамента крупный, для кирпичной кладки средний, а для штукатурных работ непременно зернистый.

з) бревна, пластины, доски, бруски должны быть сосновые, драницы осиновые без червоточин и табочин, в заболонях здоровые, суковатые без синевы.

и) железо кровельное, полосовое, брусковое и резное, проволоки, скобы, железные хомуты, болты и гвозди, брусковые, корабельные, костыльковые,... должны быть лучшей работы.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 384, Л. 7.

РАПАРТ ЗАГАДЧЫКА ШКОЛЫ ДЫРЭКТАРУ НАРОДНЫХ ВУЧЫЛІШЧАЎ АБ НАВЕДАННІ ШКОЛЫ ГУБЕРНАТАРАМ

Июня 15 дня 1911 года

Его превосходительству
Господину Директору Народных Училищ.
Заведующий школой.

Имею честь донести Вашему Превосходительству, что сего числа вверенную мне школу посетил Г. Могилевский Губернатор статский Советник Пильц.

Его Превосходительство прибыл в м. Кричев в волостное правление в 12 часов дня. В половине первого дня я имел честь представиться Г. Губернатору и просить Его Превосходительство посетить школу. Г. Губернатор выразил на это свое полное согласие.

Ровно в 1 час дня Г. Губернатор в сопровождении участкового земского начальника и других лиц прибыл в школу, где был встречен мною и прямо проведен в мастерские школы.

Его превосходительство обошел учеников, подробно расспрашивал каждого из них, какого класса, фамилию и что именно в настоящее время он работает. По осмотру работы в мастерских Его Превосходительство прошел в остальные помещения школы и затем в магазин готовых изделий. Здесь Г. Губернатор подробно осмотрел почти все работы, выразил одобрение и отобрал понравившийся ему раздвижной гаечный ключ попросил меня выслать ему в Могилев.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 288, Л. 32.

Рэвалюцыйныя падзеі на Крычаўшчыне

У першыя гады XX ст. у Беларусі, таксама як і ва ўсёй Расійскай імперыі, рэвалюцыйны рух нарастаў у гарадах і вёсках. Сведчаннем гэтага можа служыць распараджэнне Магілёўскага губернатара ад 28 снежня 1901 г., якое было даслана ў павятовыя цэнтры.

«Воспрещаются всякие сходбища и собрания на улицах, площадях и других общественных и частных местах, дворах и домах для совещаний и действий, клонящихся к нарушению спокойствия, а также всякие невызываемые необходимостью остановки и сборища толпы на тротуарах, улицах и площадях, независимо от цели таковых сборищ. Лица, виновные в нарушении сего постановления, равно и отказывавшиеся в подобных случаях исполнять законные требования полиции, привлекаются к ответственности...»

(«Могилевские губернские ведомости» №1 от 2.1.1902 г., стр. 1.).

Сяляне грамілі панскія маёнткі, пасвілі жывёлу на памешчыцкіх сенажацях, секлі панскі лес.

У 1903 г. у Магілёўскай губерні было створана некалькі новых арганізацый РСДРП. Такая арганізацыя была створана і ў Крычаве. Актыўным удзельнікам яе быў камуніст Павел Сідаравіч Ільін.

Члены групы дзейнічалі нелегальна: збіраліся на нарады ў лесе, у полі, у сваіх знаёмых. Абмяркоўвалі арганізацыйныя пытанні. Сярод насельніцтва распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, лістоўкі, адозвы.

У склад групы РСДРП, па сведчанні яе ўдзельнікаў, уваходзілі паштовыя работнікі Кутас і Кожанаў, настаўнік Макарэвіч, маладыя сяляне. Некаторыя з іх скончылі Крычаўскае гарадское вучылішча – Кірыла Крыванасаў, Казлоў, Прохараў, Зайцаў, Уцянкоў і іншыя.

Неабходна адзначыць, што гэта была адна з самых масавых арганізацый на Магілёўшчыне. Крычаўскія сацыял-дэмакраты мелі сувязь з іншымі арганізацыямі: магілёўскай, а таксама растоўскай, адкуль прысылалася падпольная літаратура, адозвы, лістоўкі.

«Крывавая нядзеля», расстрэл мірнай дэманстрацыі 9 (22) студзеня 1905 г., паказала працоўным, што царызм з'яўляецца іх злейшым ворагам.

Крычаў у пачатку XX ст.

Крычаўская сацыял-дэмакратычная група прыняла рашэнне арганізаваць масавае выступленне. Пачаць яго было намечана ў чэрвені, калі сяляне з'едуцца ў Крычаў на кірмаш.

Каля адзінаццатай гадзіны дня на перапоўненую людзьмі рыначную плошчу прыбылі ўсе члены сацыял-дэмакратычнай групы. Тэлеграфіст Кожанаў, стаўшы на трыбуну, пачаў гучна чытаць адозву сацыял-дэмакратычнай партыі, заклікаючы да звяржэння цара, да знішчэння паноў, да барацьбы за перадачу зямлі сялянам, за свабоду для ўсіх працоўных. Прысутныя з вялікай увагай слухалі прамоўцу. Паліцэйскія спрабавалі арыштаваць Кожанава, але члены арганізацыі РСДРП акружылі свайго кіраўніка і не далі гэта зрабіць жандарам. Адзін з сялян вывернуў аглоблю і кінуўся на паліцэйскіх. Яго падтрымалі іншыя. Паліцэйскія былі разагнаны.

Па распараджэнні прыстава на плошчу прыбыло 37 конных і шмат пешых паліцэйскіх. Мітынгоўшчыкі, узброіўшыся кіямі, уступілі ў бой, забілі коннага паліцэйскага. Але быў застрэлены і брат удзельніка сацыял-дэмакратычнай групы Уцянкова.

Паліцэйскія змаглі арыштаваць некалькі чалавек. Аднак хутка арыштаваным удалося збегчы. Большасць з іх эмігрыравала ў іншыя гарады Расіі.

У гэты час актыўную работу ў Маляціцкай воласці праводзіла сацыял-дэмакратычная група, якой кіраваў бальшавік Фёдар Сцяпанавіч Лаўрэнаў. Па ўспамінах камуніста Пятра Аляксеевіча Сінсолікава, маляціцкая група таксама ўзяла курс на ўзброеную барацьбу. У адзін з жнівеньскіх вечароў у Маляцічах былі забіты двое стражнікаў, а праз некалькі дзён — ураднік і яшчэ адзін стражнік. Маляціцкая сацыял-дэмакратычная група таксама вымушана была прыняць рашэнне аб выездзе ўсіх членаў з Магілёўскай губерні. Ф.С. Лаўрэнаў, якому пагражала смяротная кара, выехаў за мяжу.

Рэвалюцыйныя выступленні жыхароў Крычаўшчыны працягваліся. Актыўны ўдзел у іх прымалі шахцёры Данбаса, ураджэнцы нашых мясцін, Л.В. Анішчанка, С.В. Перабіла, М.І. Забялышанскі і іншыя. Яны вярнуліся на радзіму ў сувязі з закрыццём шахт ці былі звольнены з работы за ўдзел у рэвалюцыйным руху.

Абстаноўка з кожным месяцам ускладнялася і асабліва пасля таго, як быў забіты начальнік Крычаўскай паліцыі.

Прыведзеныя факты сведчаць аб тым, што ў нашым краі працоўныя актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях, змагаліся за лепшы лёс.

М.Ф. Мельнікаў.

Змагаўся на барыкадах

Вяршыняй першай рускай рэвалюцыі 1905 г. было снежаньскае ўзброенае паўстанне ў Маскве. У ім прынялі ўдзел многія нашы землякі. У Крычаўскім краязнаўчым музеі ёсць нямала матэрыялаў аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці тых, хто ўступіў у партыю бальшавікоў яшчэ да 1905 г.

Адзін з іх — Яўген Пятровіч Талсціковіч. Ён нарадзіўся ў 1883 г. у вёсцы

Зайцава Слабада на Крычаўшчыне. Бацька яго ўдзельнічаў у паўстанні 1863-1864 гг. і збег на Украіну, адкуль праз многа год вярнуўся ў родныя мясціны. А вярнуўшыся, пражыў нядоўга. Сям'я засталася без сродкаў для існавання.

Яўген стаў вучнем рамеснага вучылішча. Закончыўшы яго, працаваў на прадпрыемствах Кіева. У 1902 г. пераехаў у Маскву, уладкаваўся на Маскоўска-Казанскай чыгунцы.

Талсціковіч працаваў памочнікам машыніста. Ён адразу ж пасябраваў з рабочымі-бальшавікамі. У 1903 г. прыняты ў бальшавіцкую арганізацыю. Калі пачалася рэвалюцыя, маладому хлопцу было даручана захоўваць і распаўсюджваць пракламацыі, збіраць зброю для баявых дружын. У кватэры на Дамінікоўскай вуліцы, дзе ён пражываў, праходзілі нелегальныя сходы і важныя сустрэчы.

8 снежня 1905 г. пачалося снежаньскае паўстанне ў Маскве. Супраць рабочых і студэнтаў былі накіраваны рэгулярныя войскі. 9 снежня ў будынку рэальнага вучылішча Фідлера сабраліся прадстаўнікі многіх баявых дружын. Рабочыя вырашылі змагацца да канца.

Сярод герояў абароны дома Фідлера быў і Яўген Талсціковіч. Ён доўга адстрэльваўся, а затым, калі салдаты пачалі страляць па будынку з гармат, саскочыў з трэцяга паверха. Страшэнны боль пазбавіў свядомасці. Калі ачуняў, схаваўся да раніцы ў нейкім старым памяшканні.

10 снежня член Маскоўскага камітэта партыі бальшавікоў Шастакоў і Яўген Талсціковіч арганізавалі будаўніцтва барыкад. Іх дружына змагалася на Чырванапруднай вуліцы, на Таганцы, вяла бой у раёне Чырвонай Прэсні.

Пасля падаўлення паўстання многіх яго актыўных удзельнікаў расстралялі. Шукалі і Яўгена Талсціковіча, якога чакала пакаранне смерцю.

Сябры-чыгуначнікі арганізавалі яму выезд у Кіеў, забяспечыўшы неабходнымі дакументамі, але і там было небяспечна. Яўген Пятровіч вярнуўся ў родную вёску Зайцава Слабада. А праз год ён зноў быў у Маскве, стаў адным з арганізатараў рэвалюцыйнага рабочага руху ў трамвайным парку Масквы.

У 1911 г. паліцыя схапіла Яўгена Пятровіча. Яго адправілі ў высылку. Да 1914 г. быў у Валагодскай губерні пад наглядам паліцыі. Жыў там з жонкай і двума малымі дзецьмі. Праз некаторы час яго адправілі далей на поўнач. Лютаўская рэвалюцыя прынесла вызваленне.

Талсціковіч працаваў на будаўніцтве мурманскай чыгункі, калі прыйшла вестка аб перамозе кастрычніцкага паўстання ў Петраградзе. Потым ён ваяваў з белагвардзейцамі, узначальваў асобны тэхнічны атрад. Яго выбіралі членам ЦК прафсаюза чыгункі.

Вярнуўся ён з грамадзянскай вайны цяжка хворым. У 1929 г. пайшоў на пенсію. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

М.Ф. Мельнікаў.

Юныя крычаўцы

У 1905 г. у Крычаве ўзнікла сацыял-дэмакратычная маладзёжная група. Кіраваў ёй тэлеграфіст Іван Кожанаў. У групу ўваходзілі мясцовыя жы-

хары, што пабывалі на шахтах і заводах Данбаса і ў іншых прамысловых цэнтрах. Гэта Маркіян Казлоў, пазней герой грамадзянскай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, Лука Анішчанка, які, ратуючыся ад арышту, выехаў у 1906 г. у Растоў-на-Доне, і іншыя. Сувязі Крычава з рэвалюцыйным Растовам былі моцныя. Таму ў 1905 г. распаўсюджваліся ў Крычаве лістоўкі як Палескага камітэта РСДРП, так і Данскога камітэта сацыял-дэмакратаў.

Усё пачалося з таго, што ў паліцыю паведамілі: па мястэчку нейкія падлеткі раскідваюць і расклейваюць лістоўкі. Адзін з паліцэйскіх агентаў намагаўся затрымаць хлопчыка, але яго ахоўвалі некалькі падлеткаў і не далі ў крыўду свайго сябра. Шпік заўважыў на адным з хлопцаў форменную фуражку вучня рамеснай школы.

Вышукам рашыў заняцца старшы святар Крычава Васіль Яновіч. І сродак дазнання ў яго — царкоўная споведзь. Хіба хто рызыкне маніць на споведзі, тым больш нявопытныя 14–17-гадовыя навучэнцы? Усіх вучняў прывялі да дзвярэй Пятніцкай царквы. Хлопцаў па адным выклікалі да святара Васіля, які патрабаваў, каб кожны прызнаўся і пакаяўся. Калі апошні з вучняў выйшаў ад святара, прыстаў Галкоўскі спытаў у Яновіча:

— Ну, як?

— А ніяк, пан Галкоўскі. Не прызнаюцца.

— Добра. Зараз мы выб'ем у іх прызнанне, — і прыстаў загадаў паліцэйскім гнаць усіх у паліцыю.

Падлеткаў загналі на двор паліцэйскага ўчастка. Прыстаў пагражаў ім катаргай, турмой, краем вечнай мерзлаты. Адказ вучняў быў адзін і той жа: «Нічога не ведаю».

Нечакана на двары з'явіўся дырэктар школы Георгій Факіч Нікалаеў, чалавек даволі ліберальных перакананняў і запатрабаваў усіх адпусціць, інакш прыгразіў звярнуцца да міністра народнай адукацыі. Паліцыі давялося адпусціць вучняў.

Аднойчы паліцыянтам стала вядома, што ў навучэнцаў рамеснай школы Пруднікава і Афанасенкі захоўваюцца лістоўкі і што яны іх распаўсюджваюць. Абодвух арыштавалі. Раніцой пра арышт даведаліся ў школе. Нехта з вучняў крыкнуў: «Пойдзем у паліцыю, усе пойдзем!»

У «халоднай» паліцэйскага ўчастка сядзелі іх арыштаваныя таварышы. Ахоўвалі іх узброеныя паліцэйскія. Прыставу Галкоўскаму стала не па сабе, калі ён убачыў такую вялікую колькасць падлеткаў. Ён пачаў іх угаворваць разыйсціся.

Афанасенка і Прудніка ў былі адпушчаны.

Няраз імкнуліся вучні выгнаць святара-шпіёна з рамеснай школы, у якой ён выкладаў закон божы.

Аднойчы яму падклалі запіску. У ёй было некалькі слоў: «Не пойдзеш — заб'ем». Яновіч палічыў гэта за жарт. Аднойчы нехта ў цёмным калідоры запусціў у яго цяжкім кавалкам жалеза, збіў капялюш з галавы. Ён узяўся высвятляць, хто такое зрабіў. Але Яновіча зноў папярэдзілі запіскай. І святар вымушаны быў пакінуць вучэльню.

У 1916 г. навучэнцы рамеснай школы пад кіраўніцтвам Мацвея Кісялёва і Аляксандра Азарава, будучага камісара чырвонай дывізіі, аб'явілі забастоўку. Яны адмовіліся працаваць на вайну, выконваць заказ на выраб падкоў для коней царскай арміі. Кісялёў і Азараў былі адпраўлены ў дзеючую армію на фронт.

М.Ф. Мельнікаў.

Дакументы сведчаць

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН У ЧЭРЫКАЎСКІМ ПАВЕЦЕ

...В некоторых местах восстания проявлялись в разгромах и сожжении усадеб. Во время разгрома Силичей во многих экономиях крестьяне объявили забастовку, потребовав увеличения заработной платы в 3–4 раза. В большинстве случаев помещики удовлетворяют эти требования до прихода войск. Стражники с полицией во главе ничего сделать не могут. В Забычаньи арестовали пристава, отняли саблю, револьвер и заперли в собачью конуру, где он просидел несколько часов. Помещики сбежали в города.

...В м. Кричев Чериковского у. 9 января после панихиды по убитым 9 января прошлого года в Петербурге толпа около 300 человек, состоявшая в большинстве из крестьян м. Кричева и окружающих деревень, слушала ораторов. Первый оратор выяснял политическое положение России в связи с историческим событием 9 января... Второй оратор, по-видимому, социал-демократ, подчеркнул необходимость бойкота Государственной Думы...

Могилевский голос. 15 января 1906 г.

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ТАВАРЫШУ МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ АГРАРНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯХ СЯЛЯН І ЗАБАСТОЎКАХ БАТРАКОЎ У ЧЭРЫКАЎСКІМ І ІНШЫХ ПАВЕТАХ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

16 чэрвеня 1905 г.

Представляя при сем в копии только что полученное мною донесение чериковского уездного исправника, имею честь доложить, что ввиду увеличения в Чериковском у. случаев самовольных потрав помещичьих лугов, захвата разных угодий и пр., а также открытого сопротивления крестьян местным властям, о чем свидетельствует и уездный предводитель дворянства, мною сделано распоряжение об отправке в гор. Чериков в распоряжение исправника роты солдат. Необходимо сделать это теперь же еще и потому, что от Могилева до Черикова 5 дней перехода. Рота должна прийти в Чериков заблаговременно, чтобы в случае серьезных самоуправств возможно было быстро вызвать войсковую часть на место беспорядков...

Революционное движение в Белоруссии. 1905–1907 гг. Мн., 1955. С.155–156.

ТЭЛЕГРАМА ПРАЎЛЕННЯ ТАВАРЫСТВА БР. ЦЯРЭШЧАНКАЎ МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ ВЫСЕЧКАХ ЛЕСУ І РАЗГРОМЕ ПАМЕШЧЫЦКІХ МАЁНТКАЎ ШАХЦЁРАМІ І СЯЛЯНАМІ Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

5 студзеня 1906 г.

Могилевской губ. Климовичского и Чериковского уу. им. Студенец товарищества бр. Терещенко угрожает опасность разгрома. Началась рубка крестьянами леса, смежные имения Бишевской, Цехановецкого, Россетера, Марютина, Комара разгромили и продолжаются разгромы других имений, громилы – преимущественно вооруженные шахтеры, были убийства служащих. На требования войск губернатор отказал по неимению, телеграфировали просьбу командующему войсками Виленского округа, ответа нет, убедительно ходатайствуем о распоряжении принятия мер охраны.

Правление товарищества бр. Терещенко.

Революционное движение в Белоруссии. 1905–1907 гг. Мн., 1955. С.487.

З РАПАРТА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА СПРАЎНІКА МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

студзень 1906 г.

25 декабря мною были получены сведения об агитаторской деятельности некоторых лиц Палужской вол. и одновременно с тем личное заявление помещика им. Веприн Василевского о готовящемся у него насилии...[1]

Утром 27 декабря мне [было] доложено о разбитии и разгромлении дома кн. Оболенского в дер. Припечине Лобановской вол., и я тогда же отправился в указанную деревню для ареста громил и зачинщиков, взял с собою наличный состав стражников 11 чел., но арестовать [их] мне не удалось, [ибо] к этому я встретил полное противодействие поголовно со стороны всех жителей дер. Припечина, начиная от стариков и кончая женщинами и малыми детьми. Последние высылались своими родителями в первые ряды противодействующих. Заручившись, однако, обещанием отцов громил и сих последних, что они сами явятся в гор. Чериков, я уехал с целью вернуться в Припечино с усиленным конвоем стражников, которых имел вызвать из мест. Кричева, но вечером этого же дня я застал у себя управляющего им. Горы Стоша, который сообщил мне, что утром 27 сего декабря в им. Горы явились крестьяне окрестных дер. Горы, Бирюль, Дерново и Стаек в количестве до 1000 чел., главным образом молодежь и шахтеры, сняли рабочих с винокуренного завода и экономии, обязали его, управляющего, подпиской немедленно оставить службу и, не оставив в фольварке ни одного человека прислуги, заявили, что если что и нужно делать в имении, то пусть делают сами владельцы, а слуг они не допустят работать, какие бы деньги этим слугам ни платили и откуда бы их ни брали. На заявление же управляющего, что скот в имении может погибнуть голодной смертью, пришедшие заявили, что они скот разведут по домам. Что же касается сена, находящегося на лугах в стогах, то его брать они не позволят. Разговоры эти продолжались с 11 ч. утра до 7 ч. вечера. Требования предъявляли и диктовали условия главным образом шахтеры. По окончании разговоров люди ушли, не причинив никакого разгрома.

28–29 и 30 декабря я лежал в постели больным и за это время сделано следующее:

Получив донесение пристава об установлении агитаторской деятельности 4 лиц Палужской вол., выразившейся во внушении крестьянам не платить податей, не повиноваться начальству, не признавать никаких требований властей и не работать у помещиков, а также, зная, что по наговору этих лиц была собрана тысячная толпа, снявшая рабочих у Стоша, я рано утром 28 декабря отослал в им. Стоша на лошадях 30 стражников, что в составе команды, находящейся в Краснополье, создавало силу в 50 чел., с каковой силой было приказано приставу произвести арест агитаторов и предупреждать дальнейшие насилия, а в то же время в продолжение этих дней [я] получил до 12 телеграмм с разных концов уезда, сообщавших о готовящихся разгромах, с мольбой о помощи. Среди этих телеграмм получил 30 декабря и телеграмму о разграблении и сожжении им. Силичей Вишевской, а земский начальник Бекман телеграфировал о широком распространении волнений, указывая на необходимость присылки войск. Тогда же получил и я донесение Братьковичского волостного правления о снятии рабочих в им. Забычанье Комара Климовичского у., на границе Чериковского [у.], об арестовании там местного пристава и об отнятии оружия у стражников. В свою очередь земский начальник 2-го уч. Чериковского у. сообщил мне о сильных беспорядках, для подавления которых необходимы войска, о чем я и послал 2 телеграммы в. п.

31 декабря я отправился с приставом Голковским в им. Горы Стоша, где узнал, что утром того числа стражники в полном своем составе во главе с местным приставом Сорокалетовым ходили в дер. Дерновую для ареста одного из главных агитаторов Николая Бориськина, но там им было оказано вооруженное сопротивление. Толпа, собранная по условным знакам из ближайших деревень в количестве до 5000 чел., многие вооруженные ружьями, находясь в засадах, из домов и из гумен начали стрелять в стражников, задержавших Бориськина, причем отняла его и едва не отняла оружие у одного из стражников, урядники и 1 стражник начали стрелять и, ранив 3 чел., 1 смертельно, начали отступать к отряду пеших стражников,

[1] Опущено описание предпринятых полицией мер для предупреждения крестьянского движения.

оставшихся позади конных. Толпа, не обращая внимания на предупреждение стрелять, выставив впереди детей и женщин, а сами прячась за последних, начала кольцом сжимать стражников, но последние успели отступить к им. Горы. Этот случай показал полную невозможность каких бы то ни было арестов, т. к. народ поголовно восстает против этого и оказывает самое упорное сопротивление, а борьба с ними не возможна, т. к. из деревни народ не выходит, а при появлении туда стражников для действий народ начинает стрельбу из засад. При аресте Бориськина урядник Чернов легко ранен дробью в щеку, а 2 стражникам пробиты шинели.

На требования мои местных десятских и сельских старост последние не явились, объясняя, что если они пойдут, то будут убиты однообщественниками, а из добытых сведений установлено, что дер. Дерновая, Бирюли, Стайки и Горы делают почти ежедневные сходки и [действуют] агитаторы, которые уже насчитываются десятками...

2 января мною был собран сход в дер. Горах, [на который] собрались крестьяне и других деревень. В долгих рассуждениях с ними я вынес самое твердое убеждение в непреклонной, преступной воле всех собравшихся. Почти все говорившие со мною являлись открытыми агитаторами. ...Говорят о всеобщей забастовке, что они действуют по указаниям комитета под красным флагом и этим только путем и добиваются своих прав, затем перешли на требование объяснений по поводу ареста их же агитатора Гомарова и о сделанных выстрелах в дер. Дерновой при задержании Бориськина. Требования начали переходить в дерзости, и одно время я был близок к тому, что надо мною и бывшим со мною приставом Галковским народ совершит насилие, до того явно сказывалось их возмущение.

Получив сведения, что Бориськин после неудачного ареста спешно уехал в Гомель, будто за содействием к боевой организации, я телеграфировал гомельскому полицмейстеру о задержании его и выслал на дорогу для той же надобности 3 стражников и урядника, но стражники, прождав его 1,5 суток, возвратились без результата...

2 января разгромлен фольв. Ведуйцы Бенедиктовича теми же силичевскими и другими шахтерами, где был сильно избит приказчик Кружаев, который находится на излечении в больнице. Того же числа разгромлен дом в фольв. Ясинке Стоша...

У помещиков Голынских в им. Холоблине и Гайдуковке производится крестьянами рубка леса и в последнем имении сожжена лесная контора с заготовленным ободом.

В настоящее время, наряду с относительным идейным движением в округе им. Горы Стоша, грозной является чисто разбойницкая шайка шахтеров дер. Силичей, которая день ото дня растет и превращается в грозную массу диких необузданных людей, каждый из шайки вооружен револьвером, топором, кистенем. Имея динамитные патроны, они наводят панику на всех окружающих, производя залповые динамитные и револьверные выстрелы. В организации этой же разрастающейся шайки видна полная система, у них существуют свои разведчики и шпионы. Больших трудов стоит передать какое-либо распоряжение за несколько верст без опасений, чтобы распоряжение это не было перехвачено, а, кроме того, немало осложнений и со стражниками. Народ отказывается отпускать им за деньги продовольствие, а передвигать их приходится пешком, т. е. подвод не дают.

Более подробное донесение об убытках и виновных я буду иметь честь доставить в. п. дополнительно по окончании дознаний по всем делам.

Подписал уездный исправник Журавлев.

Революционное движение в Белоруссии. 1905–1907 гг. Мн., 1955. С.463–466.

МІНІСТЭРСТВА
ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

Начальніку С.Пецярбургскага
ахраннага аддзялення
Дэпартамент паліцыі
па асобаму аддзелу

19 жніўня 1906 г.

Упомянутый в донесении от 14 минувшего 1 июля за №12760 Парамон Михайлович Воронов, по сведениям начальника Могилевского Губернского Жандармского Управления,

проживая в местечке Кричев, Могилевской губернии, устраивал митинги и организовывал сборы денежных пособий для поддержки противоправительственной пропаганды и вообще находился в сношениях с политически неблагонадежными лицами.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 102. Воп.1906. Спр. 976. Л. 10.
№ - ф. – 102.
№ - оп. – 1906.
№ - д. – 976.
№ - л. – 10

З ДАНЯСЕННЯЎ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ НАЧАЛЬНІКУ САНКТ-ПЕЦЯРБУРГСКАГА АХРАННАГА АДДЗЯЛЕННЯ

Асобы аддзел
Начальнік Магілёўскага
губернскага жандарскага ўпраўлення

4 жніўня 1906 г.

Крестьянин м. Кричева, Чериковского уезда Парамон Михайлович Воронов, 31 года от роду, холост, среднего образования, за время проживания в м. Кричев определенных занятий не имеет, посвящая себя исключительно наблюдению за текущими событиями России и обсуждению среди населения разных государственных вопросов, особенно в отношении улучшения быта крестьян, для чего устраивает митинги. Для материальной поддержки, пропаганды рекомендовал своим единомышленникам производить денежные сборы, угрожая лицам не разделяющих его мнений. Сношения Воронов имел с лицами вообще сомнительной благонадежности, с которыми продолжает сношения и выбытия своего в Марте месяце сего года в С. Петербурге, как например, с исключенным за бывшую забастовку в Декабре 1905 г. из Почтово-Телеграфного ведомства надсмотрщиком Кожановым, устроившим в Кричеве 4 июля сего года, по инициативе Воронова, крестьянский митинг, разогнанный полицией.

Справка: донесение 6-го июля сего года №3679.

Полковник Поляков.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 102. Воп. 1906. Спр. 976. Л. 11.
№ ф. – 102.
№ оп. – 1906.
№ д. – 976.
№ л. – 10.

АБ ПАДПАЛЕ СЯЛЯНАМІ КАРДОННАЙ ФАБРЫКІ ПАМЕШЧЫКА ГАЛЫНСКАГА

З данясення начальніка
Магілёўскага жандарскага
ўпраўлення ў Дэпартамент паліцыі

1911 г. лютага 23

Сакрэтна

15 сего декабря, в 9 часов вечера, при дер. Хотимск Самотеевичской волости Чериковского у. сгорела деревянная картонная фабрика, принадлежащая помещику С.Д.Голынскому, находившаяся в аренде у купца Ш.Я.Зайса. Фабрика была застрахована в Минском страховом обществе в 33000 руб. Убытка насчитывается до 75000 руб. Пожар вспыхнул из нежилого отделения фабрики. В поджоге подозреваются крестьяне дер. Хотимск, которые имеют с Голынским три судебных тяжбы за запруду для нужд фабрики воды р. Бесяды (в результате чего) залито около 1 1/2 дес. крестьянского луга, о чем дело по

апеляции Голынского находится в Киевском окружном суде, и два дела – за самоуправную переправу крестьян через реку на пароме Голынского и за пастьбу крестьянами скота на его владениях, каковые дела решены в пользу Голынского.

Полковник

З фондаў Крычаўскага краязнаўчага музея.

Падзеі і факты

В ночь с 5 на 6 августа 1894 года с целью ограбления близкими родственниками был убит ксендз Вородьковского костела Павел Габранич. Убийцы похитили 3000 рублей денег, заключающиеся в билетах Виленского Земельного банка, карманные золотые часы с такою же цепочкою, стоящие около 150 рублей, шерстяную материю черного и зеленого цвета по 20 аршин на сумму около 44 рублей, дюжину столовых серебряных ложек, бочонок водки около двух ведер, чаю три фунта, квитанцию Белицкого волостного правления на вклад в кассу 1300 рублей, сахар в головке и колотый, револьвер.

* * *

4 марта 1912 г. Могилевским губернатором было удовлетворено ходатайство крестьянки Марины Азаровой об открытии ею в м. Кричеве курсов кройки и шитья, и изящного рукоделия.

* * *

4 июня 1912 г. Чериковский уездный исправник сообщал Могилевскому губернатору: «В деревнях Слобода, Сычеве, Юшновичах, Усполье и Киселевке Долговичской волости, Зорях и Глине Комаровичской волости, Мирогоще, Горках и Журавле Должанской волости, Антоновке, Сарочине и Воловниках 1-х и 2-х Малятичской волости, выпавшим 23 и 24 мая сего года градом повреждено до 596 десятин озимой ржи и в имении Горках княгини Оболенской повреждено 6 десятин хмеля. Кроме того, в дер. Воловниках 1-х градом убито 87 штук овец и искалечено до 100 штук овец. Сумма убытка исчисляется в 23700 рублей».

* * *

25 июля 1912 г. в м. Кричеве от поджога при значительном ветре сгорело 118 обывательских домов с надворными постройками, в том числе: частная аптека, земский приёмный покой, еврейская школа и богадельня. Кроме того, уничтожено огнем 9 торговых лавок. Убытка причинено на 74800 рублей.

НАЧАЛЬНІКУ ГАЛОЎНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ПОШТ І ТЭЛЕГРАФАЎ МУС

3 лютага 1909 г.

26 сего января окончился срок контракта на наем двухэтажного дома Иосифа Голынского под помещение Кричевской почтово-телеграфной конторы и Чинов, с планом всего 475 рублей в год.

Поверенная названного домовладельца Михаила Голынского прислала 17 ноября минувшего года заявление о том, что она согласна заключить контракт всего лишь на один год за оплату 600 рублей в год и без производства в доме ремонта, а затем вторичным заявлением, поданным 16 декабря, категорически отказалась от заключения контракта на условиях прежде заявленных, находя таковые невыгодными для себя.

Хотя на основании пункта 11 контракта возможно возобновить с Голынским на прежних условиях контракт, но принимая во внимание запущенность этого дома, в котором без производства капитального ремонта оставаться на дальнейшее время нельзя, я распорядился приискать другое помещение...

Так как в Кричеве свободных домов, располагающих достаточным помещением, не оказалось, то приискан дом Иохи Генькиной лишь с помещением для контор и квартиры начальника оной за плату 360 рублей в год.

Начальник Кричевской почтово-телеграфной конторы,
надворный советник Лянге.

З фондаў Крычаўскага краязнаўчага музея.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

У Петраградзе 24 кастрычніка 1917 г. пачалося ўзброенае паўстанне рабочых і рэвалюцыйных салдат, і да раніцы 25 кастрычніка Часовы ўрад быў звергнуты. Дзяржаўная ўлада перайшла да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта – органа Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Вечарам 25 кастрычніка адбыўся II У серасійскі з'езд Саветаў, які прыняў Дэкрэт аб міры, Дэкрэт аб зямлі і ўтварыў урад – Савет Народных Камісараў на чале з У.І. Леніным.

Рэвалюцыя, якая перамагла ў цэнтры Расіі, стала пашырацца на ўсю краіну.

12—14 лістапада 1917 г. па Магілёўскай выбарчай акрузе адбыліся выбары ва Устаноўчы сход. Унушальную перамогу атрымалі на іх эсэры і сялянскія дэпутаты. За іх прагаласавала 87,7% ад агульнага ліку грамадзян, што ўдзельнічалі ў выбарах, а за Палескую арганізацыю РСДРП(б) – толькі 0,92%. Гэта яскравае сведчанне таго, што тады падтрымкай насельніцтва карысталіся ідэі эсэраў, якія ўваходзілі ў той час разам з меншавікамі ў рэвалюцыйную партыю сацыялістычнай арыентацыі.

Марудна ўстанаўлівалася савецкая ўлада ў Чэрыкаўскім павеце. Доўгі час побач са ствараемымі саветамі дзейнічалі існаваўшыя пры Часовым урадзе думы, земствы і інш. Тлумачылася гэта тым, што ў Магілёве пэўны час знаходзілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, якую спачатку ўзначальваў А.Ф. Керанскі, а потым – генерал М.М. Духонін. Тут групаваліся ўзброеныя сілы антыбальшавіцкага напрамку. Яны не давалі ўкараніцца парасткам новай улады, устойліва падтрымлівалі буржуазны рэжым. На Магілёўшчыне дыслацыраваліся легіёны былога царскага генерала Ю.Р. Доўбар-Мусніцкага, які таксама знаходзіўся на антыбальшавіцкіх пазіцыях.

20 лістапада (3 снежня) 1917 г. рэвалюцыйныя войскі на чале з М.В. Крыленкам разагналі Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Гэта дало магчымасць паскорыць умацаванне ўлады Саветаў.

5—10 студзеня ў Магілёве адбыліся 2-і губернскі з'езд Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў і 4-ы губернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў. Дэлегаты абодвух з'ездаў падтрымалі савецкую ўладу. Губернскі з'езд рабочых і сал-

дацкіх дэпутатаў пастанавіў: «Уся ўлада на месцах належыць Саветам...». Тэлеграма з такім тэкстам паступіла ва ўсе паветы губерні.

19 студзеня 1918 г. Чэрыкаўскі павятовы Савет падтрымаў рашэнне губернскага з'езда і прыняў пастанову аб пераходзе ўлады да Савета. У яго пастанове таксама ўказвалася, што кожны, хто акажа супраціўленне савецкай уладзе, будзе падвяргацца ваенна-рэвалюцыйнаму суду. Да мая 1918 г. у Чэрыкаве існавала таксама гарадская дума. 22 студзеня 1918 г. адбыўся 1-ы павятовы з'езд Саветаў, на якім былі сфарміраваны новыя органы кіравання, выбраны прэзідыум выканкома. Кіруючы склад быў такі: старшыня, два таварышы старшыні, два сакратара. Першым старшынёй Чэрыкаўскага Савета быў выбраны М.Ф.Шашко. У Крычаве ў студзені 1918 г. быў створаны першы бальшавіцкі Савет на чале з камуністамі М.С. Кісялёвым і М.А. Казловым. Умацоўваліся Саветы ў валасцях. Акрамя Саветаў, у вёсках ствараліся камітэты беднаты. На Крычаўшчыне яны дзейнічалі ў вёсках Міляцічы, Касцюкавічы, Баеўка і іншых. Камітэтам беднаты вялікую дапамогу аказваў Чэрыкаўскі павятовы зямельны аддзел, якім кіраваў Шаўцоў. У павеце норма падзелу панскай зямлі існавала такая: на кожнага працаздольнага члена сям'і – 2,5 гектара, непрацаздольнага – 1 гектар. Гэта не задавальняла заможных сялян. Яны імкнуліся як мага больш расшырыць уласныя зямельныя ўгоддзі, атрымаць найбольш урадлівыя кавалкі. Нярэдка здараліся выпадкі самавольнага захопу зямель. Паміж малазямельнымі і заможнымі сялянамі разгараліся спрэчкі, якія часта заканчваліся бойкамі.

Камітэты беднаты праводзілі актыўную барацьбу з кулацтвам у вёсцы, бралі на ўлік і канфіскоўвалі лішкі збожжа ў кулакоў, вялі барацьбу са спекулянтамі і самагонакурэннем. Памешчыцкі інвентар быў узяты камбедамі на ўлік, а затым рэалізаваны сярод бяднейшага сялянства. Але пастаяннымі былі канфлікты паміж беднымі і багатымі сялянамі. І прычынай амаль заўсёды была зямля. У павеце пачалі арганізоўвацца пракатныя пункты, каб забяспечыць сялян сельскагаспадарчымі прыладамі. Створана было 10 пракатных і зернеачышчальных станцый. Селянін мог узяць малатарню, заплаціўшы за тыдзень яе эксплуатацыі 40 руб., за сеялку – 5, плуг – 1,5 руб. Для заможных сялян устанаўлівалася плата ўтрая вышэйшая.

Камбеды праводзілі культурна-асветніцкую работу: садзейнічалі адкрыццю школ, народных дамоў, хатчытальняў, распаўсюджвалі сярод насельніцтва газеты і літаратуру.

Камуністы, камсамольцы, бяднейшыя сяляне часта збіраліся разам, арганізоўвалі чытанні газеты «Красный клич» – орган Чэрыкаўскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якая выдавалася з 1918 г. Пытанні, хто больш прыхапіў зямлі, а хто менш, чаму адным дасталіся ўрадлівыя плошчы, другім – пясчаныя і зарослыя кустоўем, хвалявалі вяскоўцаў, і за кожную сотку ішло змаганне, былі спрэчкі і абвінавачванні. Так, на адным з пасяджэнняў камбеда ў Маляціцкай воласці ўгневаныя вяскоўцы пастанавілі пазбавіць кулакоў лішніх земляў і жывёлы. Камбедаўцы не палічыліся нават з тым, што ў кулакоў мелася не толькі надзеленая з памешчыцкіх плошчаў зямля, але і куп-

леная некалі імі за грошы, якая была іх уласнасцю.

Узмацнялася барацьба ў павеце і паміж палітычнымі партыямі. 5 верасня 1918 г. у Чэрыкаве адбыўся чарговы VI з'езд Саветаў. Гаспадарамі на ім адчувалі сябе эсэры. Яны крытыкавалі бальшавікоў за палітыку і метады кіравання, выступілі супраць стварэння камбедаў, патрабавалі разрыву Брэсцкага міру. Несуцяшальнымі для бальшавікоў аказаліся вынікі галасавання. За іх прапановы прагаласавала толькі 70 чалавек, у той час як эсэраў падтрымалі 300. У павятовы выканком у той час уваходзілі 9 эсэраў, 4 бальшавікі і 3 беспартыйныя.

Бальшавікі пакінулі з'езд, сабраліся ў іншым будынку і аб'явілі сябе часовай уладай у павеце. З'езд быў распушчаны.

У вёсцы Сакольнічы на Крычаўшчыне мясцовы жыхар Іван Кашура разам з удзельнікам барацьбы за ўладу Саветаў у Петраградзе, Нясвіжы, Мінску А.П. Пузырэўскім стварыў камітэт сялянскай моладзі. У яго ўвайшлі Іосіф Кашура, Андрэй Вяржбіцкі, настаўніцы з Крычава Соф'я Барцэвіч і Варвара Азарава, а таксама Марфа Свадкоўская, Таня Язерская, Ганна Вішнеўская і іншыя актывісты. Камсамольцы выступалі перад насельніцтвам з лекцыямі, растлумачвалі першыя законы савецкай улады, арганізавалі мастацкую самадзейнасць. Імі нават была пастаўлена п'еса «Улада цемры» Л.М.Талстога.

Юнакі і дзяўчаты ўзялі кавалак зямлі, апрацавалі яго, вырасцілі багаты ўраджай лёну і здалі яго ў фонд Чырвонай Арміі.

10 верасня 1918 г. у Крычаве быў створаны раённы партыйны цэнтр. У сувязі з гэтым газета «Звязда» 12 верасня паведаміла, што ў Крычаве адбыўся «першы сход членаў Расійскай Камуністычнай партыі бальшавікоў».

Камуністы аднагалосна пастанавілі арганізаваць партыйны раённы цэнтр у мястэчку Крычаў, які і возьме ў свае рукі кантроль за дзейнасцю Саветаў, кіраўніцтва камітэтамі беднаты і правядзенне ў жыццё ў спешным парадку дэкрэтаў і пастаноў Рабоча-сялянскага ўрада.

22 верасня 1918 г. Крычаўскі камітэт РКП(б) накіраваў Паўночна-Заходняму абласному камітэту партыі пісьмо аб стане работы ў мястэчку. У ім гаварылася: ...»Во главе партии идет комитет. Во главе комитета – президиум из трех человек. При президиуме имеются отделы: культурно-просветительский с подотделами – школьным, агитационно-организационным, театральным и библиотечным; отдел по вооружению и обучению членов; хозяйственный и отдел финансов.

Работа партии идет быстрым темпом вперед. Кричевский комитет признает, что спасать завоевания свои нам нужно не только вооруженным путем и бронированным кулаком бедноты, но также и путем переубеждения масс.

В этом направлении вся тяжесть падет на партийную школу, которую должен пройти в течение месяца каждый член организации, дабы он мог везде, где только это будет нужно, агитировать за партию. Кроме того, все без исключения члены партии обязаны по окончании школы пойти в деревню, дабы еще шире и еще больше разнести повсюду «большевистскую заразу», чтобы путем агитации суметь перевести на свою сторону колеблющихся и сомневающихся. Общее руководство лекций поручено т.Азарову, но ввиду того, что всякий коммунист

должен быть прежде всего хорошим солдатом революции, комитет партии уделяет также много внимания отделу по вооружению и обучению членов партии. Производятся в известные дни учения и стрельба из ружей и пулеметов, а также все товарищи должны изучать, разбирать свое оружие. Всем этим делом заведует военком т.Киселев.

10 сентября 1918 года в только что организовавшееся временное бюро поступили жалобы местной бедноты, что ее комитет плохо работает и что в нем засели бывшие жандармы и чиновники. Тогда бюро удалило весь состав комитета бедноты, временно назначило трех коммунистов в комитет, созвало через 2 дня съезд деревенских комитетов бедноты, где и выделен новый комитет, куда прошли только коммунисты. Нынче комитет работает под бдительным надзором Коммунистической партии. Далее партия взялась за местный волостной кулацкий совет. Туда были назначены члены партии в качестве реорганизаторов, но с кулаками работать не представлялось возможным, в ближайшее время созывается нами новый съезд для того, чтобы волостной Совет состоял только из бедноты, а нынешний комитет бедноты – только как его отдел под названием «ревизионно-контрольно-учетная коллегия» для учета и реквизиции хлебных и иных запасов у буржуазии и кулачества.

Обращено внимание на деятельность профессиональных союзов, и, благодаря поддержке партии, устраиваются коммунистические мастерские, частью из национализированных, частью из открываемых самостоятельно предприятий. Партия на днях открывает свой пролетарский театр имени Луначарского. Школа уже работает. Сегодня состоится обложение буржуазии. Словом, просвещенное давление коммунизма здесь, в самой глуши болот и лесов белорусских, видно говорит само за себя.

Здесь на партию смотрят как на правительственную единицу, и, безусловно, все учреждения подчиняются партии, а насколько все это благоприятно и полезно – покажет ближайшее будущее».[1]

Па прапанове Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) у павеце пачалі ствараць камуны і іншыя калектыўныя гаспадаркі. Рабілі гэта без згоды сялян, якія, прыдбаўшы зямлю, мелі цвёрдае жаданне працаваць індывідуальна. Але працэс стварэння калектыўных гаспадарак ужо нельга было прыпыніць. У лютым – сакавіку 1919 г. камбеды, якія выканалі сваю місію, былі аб'яднаны з Саветамі – паўнаўладнымі органамі ўлады на месцах.

25 мая 1919 г. адбыўся Гомельскі губернскі з'езд Саветаў. На ім было вырашана пытанне аб стварэнні Гомельскай губерні і пераносе губернскага цэнтра з Магілёва ў Гомель. Чэрыкаўскі павет увайшоў у Гомельскую губерню, а губерня ўвайшла ў склад РСФСР.

Спусташальны подых грамадзянскай вайны востра адчуваўся ў павеце. Урэшце незадаволенасць часткі насельніцтва новай уладай выбухнула ў антысавецкае паўстанне, якое адбылося ў пачатку 1920 г. Яно ахапіла Быхаўскі, Прапойскі і Чэрыкаўскі паветы. Паўстанцы грамілі пасялковыя

[1] Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Мн., 1968. Т. 1. С. 243—244.

і валасныя Саветы, расстрэльвалі актывістаў, былі няблага ўзброены і падрыхтаваны. На падаўленне яго прыбыло некалькі вайсковых атрадаў, пачаліся сапраўдныя баі. Паўстанцы былі разгромлены, 600 чалавек арыштаваны.

Нялёгкімі аказаліся першыя паслярэвалюцыйныя гады ў павеце, людзей даймалі голад і галеча, узрасла спекуляцыя, злачыннасць. Апрача гэтага на франтах грамадзянскай вайны гінулі ўраджэнцы вёсак і мястэчкаў, сіротамі засталіся дзеці, з'явілася шмат няпоўнагадовых бяздомных бадзяг. Аднак жыццё не стаяла на месцы. Улады прымалі меры па ліквідацыі непісьменнасці, адчыняліся дзіцячыя садкі, выдзяляўся бяднейшай частцы насельніцтва насенны матэрыял для пасеву, аказвалася дапамога і калектыўным гаспадаркам. Перад заканчэннем грамадзянскай вайны ў павеце налічвалася 25090 сялянскіх гаспадарак у мястэчках, дзейнічала 11 камун, 241 арцель, 6 саўгасаў і 2193 іншыя гаспадаркі.

Падрыхтаваў да друку
В.Ф. Куліненка.

Камбеды на вёсцы

З успамінаў І.Паўлючэнкі

Я нарадзіўся і жыў у Хацілавічах. Рана пачаў прымаць удзел у грамадскім жыцці. Абстаноўка ў вёсцы тады была складанай, ішла класавая барацьба.

Я ўзначальваў камітэт беднаты. Што ён уяўляў сабой? У яго склад уваходзілі старшыня, сакратар і тры члены. Абмежавалі ўладанні памешчыкаў, астатнюю зямлю раздалі сялянам.

Уся работа па забеспячэнні вёскі самым неабходным ускладвалася на камітэт. Дапамога патрабаваляся ўсім: ад дзіцяці да дарослага. У аднаго плуга няма, у другога хамута, у трэцяга — насення, у чацвёртага дзеці босыя. Куды ні глянь – усюды беднасць, галеча. Людзям дапамагалі як маглі.

Займаўся камітэт і размеркаваннем рэчаў першай неабходнасці: прадуктаў харчавання, адзення, абутку, лішкі забіралі ў багацеяў і раздавалі бедным. Каму патрабавалася, камбед выдаваў лес для будаўніцтва жылля. Набывалі сельскагаспадарчы інвентар: плугі, бароны. Малатарні, жняяркі, адабраныя ў паноў, выкарыстоўваліся калектыўна. Камітэт беднаты ствараў фонды збожжа і грошай і аказваў дапамогу бедным сем'ям.

У 1923 г. мяне выбралі членам сельскага Савета, які ўзначальваў старшыня Савета Яфрэм Пятровіч Васілевіч, энергічны і дзелавы камуніст. Пазней ён быў вылучаны на партыйную работу ў Віцебску і Расонскім раёне. Тады ў сельсавет уваходзілі вёскі Задабрасць, Паклады, Прыгаўка і Свадкавічы.

Актыўную работу праводзілі камсамольцы. Наша камсамольская ячэйка знаходзілася ў вёсцы Сакольнічы. Мы пастаянна праводзілі сходы, дапамагалі бедным сялянам у апрацоўцы зямлі. Амаль кожны камсамольскі актывіст удзельнічаў у гуртках мастацкай самадзейнасці, у ліквідацыі не-

пісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. У 1929 годзе я працаваў старшынёй Сакольніцкага сельсавета. Гэта быў час актыўнага стварэння калгасаў. Было арганізавана 6 калектыўных гаспадарак.

Памятаю, як нам даставілі трактары «фардзоны». Першымі трактарыстамі былі Аляксей Каменеў, Васіль Чавусаў, Таццяна Гіндзіна. Пазней мне давялося працаваць старшынёй Варанёўскага, Паланіцкага і Касцюкаўскага сельскіх Саветаў, быў загадчыкам вытворчага ўчастка машынна-трактарнай станцыі.

Памятаю ўсё да драбніц.

У фонд Чырвонай арміі

У нялёгкі 1918 год у нашай краіне пачалі стварацца так званыя ленінскія палеткі. Гэтыя ўчасткі зямлі апрацоўваліся маладымі энтузіястамі, а вырашчаны ўраджай здаваўся ў фонд Чырвонай арміі.

Вясковы хлопец Іван Кашура і былы салдат-франтавік Анісім Пузырэўскі звярнуліся з просьбай у Крычаўскі валасны Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў выдзеліць для моладзі сяла ўчастак зямлі пад ленінскі палетак. Просьба іх была задаволена. Такі палетак памерам у 2 гектары знайшлі паміж вёскамі Сакольнічы і Свадкавічы. Хлопцы звярнуліся да агранома Рыгора Труханоўскага, каб ён ім расказаў аб агратэхніцы вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Аграном пастаянна сустракаўся з маладымі людзьмі, раіў, як лепш апрацаваць участак, дапамог набыць насенне. Міхаіл Попель з вёскі Свадкавічы на сваіх конях узараў палетак, потым пасеялі лён. Ураджай здалі ў Крычаўскі валасны Савет. Падкарміўшы ўчастак арганічнымі ўгнаеннямі, на наступны год пасеялі жыта. Азіміна ўрадзіла добра. Усё зерне было здадзена ў фонд Чырвонай арміі. Міхаіл Попель першым уступіў у калгас. Іван Кашура паехаў вучыцца на агранома. Справу працягвалі Кузьма Кашура, Іосіф Кашура, Васіль Вяржбіцкі, Яўген Поклад.

Іван Кашура.

М.Ф. Мельнікаў.

Партызанскі полк

РОЗЕ Вальдэмар Рудольфавіч (11.3.1897, Рыга – сакавік 1938), удзельнік грамадзянскай вайны на Беларусі, адзін з арганізатараў партызанскіх атрадаў у Магілёўскай губерні, у тым ліку і ў нашым краі.

Калі ў першыя месяцы Савецкай улады над Беларуссю навісла страш-

ная небяспека, і большую частку яе тэрыторыі занялі войскі Германіі і Польшчы, на дапамогу мясцовым чырвонагвардзейскім атрадам прыйшлі латышскія стралкі.

Па старадаўняму шляху, што цягнецца ўздоўж р.Сож, з Мсціслава на Крычаў ішоў атрад узброеных людзей... Вось і Крычаў. Яшчэ 25 кіламетраў, але ўжо па шашы Масква – Варшава, і будзе павятовы цэнтр Чэрыкаў. Паступілі звесткі, што да яго ваколіц дабраўся вораг і што ў гэтых мясцінах ёсць дзесяткі паўтара разрозненых чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў.

Губком партыі і губвыканком, якія знаходзіліся ў эвакуацыі ў Мсціславе, у сувязі з тым, што Магілёў быў захоплены германскімі войскамі і польскімі легіянерамі, паставілі задачу: стварыць полк з партызанскіх атрадаў. Паслалі чырвонагвардзейскі атрад, камандзір якога латышскі стралок Вальдэмар Розе павінен быў узначаліць новае фарміраванне.

Ажыццявіць гэту задачу было не так проста: у Чырвонай арміі камандзіры выбіраюцца. Той, каго рэкамендуюць губком партыі і губвыканком – чалавек бездакорны, выйшаў з сям'і рабочых-металістаў, быў салдатам, за адвагу накіраваны ў ваенную школу, пасля сканчэння якой атрымаў чын прапаршчыка. Чын невялікі, але афіцэрскі. На гэтым могуць сыграць анархісты. Вось чаму хвалявaліся ў губкоме. Спакойным быў толькі камандзір-латыш. Ён быў упэўнены, што людзі, якія здзейснілі рэвалюцыю, стварылі Саветы, знойдуць правільнае рашэнне.

В.Р. Розе.
Здымак 1920-х гадоў.

У Крычаве камандзір пазнаёміўся з двума мясцовымі актывістамі – намеснікам старшыні валаснога Савета Мацвеем Кісялёвым і камандзірам чырвонагвардзейскай роты Маркіянам Казловым (удзельнікам рэвалюцыі 1905 г.). Не трацячы часу, трое заселі за карту. Трэба было па магчымасці дэталёва ўнікнуць у сітуацыю. А сітуацыя была складаная.

На наступную раніцу кіраўнік Крычаўскага Савета і чырвоныя камандзіры праводзілі атрад Вальдэмара Розе. Разам з ім пайшла ў Чэрыкаў і Крычаўская чырвонагвардзейская каравульная рота.

Вясной 1918 г. у павятовы г. Чэрыкаў сцякаліся чырвонагвардзейскія і партызанскія атрады Чэрыкаўскага, Мсціслаўскага, Клімавіцкага, Чавускага і Рагачоўскага паветаў. Выконвалася рашэнне Магілёўскага губернскага камітэта партыі аб хуткім стварэнні палка партызанскіх атрадаў.

Як толькі Розе і яго атрад увайшлі ў Чэрыкаў, павятовы камітэт партыі, якім кіраваў былы вясковы настаўнік Мікалай Шчарбітаў, вырашыў у цэнтры горада склікаць мітынг.

І вось на плошчы стаяць 22 групы ўзброеных людзей. Самую небяспечную з іх узначальвае анархіст Храмянкоў. Ён абкладваў кантрыбуцыяй цэлыя вёскі, парушаў савецкія законы. Мясцовыя ўлады не ў сілах былі заклікаць яго да парадку. Нямала было і

такіх, хто збіўся з правільнага шляху, хаця адкрытым ворагам улады яшчэ не стаў. Яны таксама былі небяспечнымі. Тут жа – паплечнікі матроса Ламянкова. Атрад яго невялікі, аднак чырвонагвардзейцы да апошняга дыхання гатовы абараняць Савецкую ўладу. Побач – чырвонагвардзейцы Крычава, якія прыйшлі з Маркіянам Казловым і Міхаілам Чыжом, чырвоныя партызаны Міхаіла Шаблакова, атрад Вальдэмара Розе. Стаяць моўчкі, плячо ў плячо. Толькі людзі з атрада анархіста Храмянкова размаўляюць. Храмянкоў прахаджваецца гогалем. Ён упэўнены, што стане камандзірам палка.

Каля трыбуны невялікая група: сакратар Чэрыкаўскага павяткома партыі Мікалай Шчарбітаў, старшыня павятовага выканкома Шашкоў, малады камуніст Аляксандр Кавалёў, Вальдэмар Розе. Шчарбітаў паклікаў Храмянкова. Каля трыбуны аб нечым доўга спрачаліся. Нарэшце ўсё вырашана: перад мітынгоўцамі першым выступіць Храмянкоў, за ім – Розе. Кожны павінен растлумачыць сваю праграму, коратка расказаць сваю біяграфію, а таксама аб тым, як ведае ваенную справу. Толькі тады, усё абдумаўшы, чырвонагвардзейцы і партызаны вырашаць, каму быць камандзірам палка.

Дабіўшыся права выступаць першым, Храмянкоў ускочыў на трыбуну. Што мог сказаць чалавек, які прапаведаваў «маці-анархію» як аснову жыцця? Калі ты дужэйшы – рабуй, п'янствуй, гуляй, забівай. Свабода без усялякіх абмежаванняў. У канцы прамовы ён усклікнуў, што менавіта дзеля гэтага «змагаліся» яны і «пакутавалі». Для маскіроўкі дадаў, што рабаваць трэба буржуазію і заможных людзей (а рабавалі ў асноўным працоўны народ). На гэтым Храмянкоў скончыў сваю прамову і сышоў з трыбуны. Плошча загула. Хтосьці абураўся, хтосьці крычаў у падтрымку.

На трыбуну падняўся Розе. Абвёў поглядам плошчу – мора галоў і вінтовак. Ён павінен перамагчы анархіста, чаго б гэта не каштавала, у імя рэвалюцыі, у імя людзей, што сабраліся на плошчы.

— Не правы Храмянкоў,— загаварыў Розе.— Не для таго, каб рабаваць і п'янстваваць, каб страляць у сялян-працаўнікоў, гадамі, дзесяцігоддзямі пакутавалі ў царскіх турмах бальшавікі. Краіна ў небяспецы, ворагі з усіх бакоў, а Храмянкоў і яго дружкі, замест таго, каб ваяваць супраць легіянераў, рабуюць працоўнага селяніна, бясчынствуюць, разбураюць наш тыл. Дык на каго ж працуюць гэтыя людзі, на рэвалюцыю ці яе ворагаў? Цяпер, таварышы чырвонагвардзейцы і чырвоныя партызаны, рашайце, як быць,— скончыў Розе і сышоў з трыбуны.

На плошчы стала ціха. На трыбуну падняўся сакратар павяткома партыі Мікалай Шчарбітаў, абвёў позіркам атрады і запытаў:

— Хто хоча бачыць камандзірам палка Храмянкова?

Над натоўпам, там, дзе стаяў атрад Храмянкова, паднялося рук 20, але некаторыя тут жа апусціліся.

— Хто за тое, каб камандзірам быў таварыш Вальдэмар Розе?

Натоўп зашумеў, перапоўніўся гулам адабрэння. Сотні рук падняліся ўверх, магутнае «ура» пракацілася над плошчай.

Камандзір палка Вальдэмар Розе на сваім белым кані прыўстаў у стрэмёнах і аддаў загад строіцца.

І байцы пайшлі абараняць маладую рэспубліку Саветаў.

Па дарозе полк папаўняўся. У яго ўліліся атрады і групы Букетава, Ламянковых, Шаблакова, Рабцава, Вераб'ёва, Варанцова, Сарокіна, Карпава і іншых. Чырвонагвардзейцы рухаліся на захад. Першы цяжкі бой адбыўся каля Доўска, мястэчка, дзе скрыжоўваліся важнейшыя шасейныя дарогі: Кіеў – Петраград і Масква – Варшава. Тут полк панёс першыя страты. У гэтым баі Розе звярнуў увагу на смелага конніка Герасіма Цярэшчанку. Спадабалася камандзіру палка, што Герасім быў не толькі храбрым, але і змагаўся з розумам, не горш, чым бывалы салдат. Таму і ўзяў да сябе камандзір палка ардынарцам адважнага юнака з в. Волчас. Потым былі баі на Рагачоўшчыне. Часова полк спыніўся ў Рагачове.

Спачатку гэта воінскае фарміраванне называлася палком партызанскіх атрадаў Вальдэмара Розе, затым – 153-м стралковым палком 17-й Ніжагародскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі.

Усёй рэарганізацыяй кіраваў В.Розе і камісар палка, былы данецкі шахцёр Цімафей Піліпавіч Купрэеў.

Першы батальён палка, які быў створаны з ураджэнцаў Чэрыкава, Крычава і суседніх мястэчак і вёсак, узначаліў Журомскі. Камандзірамі батальёнаў, рот і ўзводаў у 153-м палку былі Міхаіл Чыж, Аляксандр Худанка, Анатоль Шышко, Сямён Партноў з Чэрыкаўскага павета, Варончанка і Чаброў з Чэрыкава, Скібін і Сянкевіч з Сенненскага, Бацанаў з Рагачоўскага, Ксяндзоў і Карпаў з Быхаўскага паветаў, Адман Эдгар – латыш.

З Рагачова полк з баямі прайшоў на Жлобін, Бабруйск, Асіповічы, Слуцк.

Да пачатку 1919 г. полк Розе выйшаў на лінію Калінкавічы – Мазыр. Пачаліся жорсткія баі з пятлюраўцамі. Цягнуліся яны два месяцы.

Праціўнік пераўзыходзіў колькасцю, быў добра ўзброены.

Ведаючы, што да Пятлюры павінна падысці падмацаванне, Розе імкнуўся заняць лепшыя пазіцыі. На савеце камандзіраў было прынята рашэнне – аб'явіць Пятлюру ультыматум, каб прымусіць яго адступіць.

Каму даручыць небяспечную ролю парламенцёра? Калі ўдасца схіліць Пятлюру да адступлення, будзе выратавана жыццё соцень чырвоных салдат. А калі Пятлюра не прыме ультыматум, то ён можа расправіцца з пасланцам.

Погляд камандзіра затрымаўся на ардынарцу.

— Табе даручаю перадаць ультыматум,— сказаў камандзір.— Дваіх дам для аховы. Спадзяюся, што ты не пасароміш Чырвоную армію.

Вальдэмар Рудольфавіч перадаў Герасіму пакет, хвіліну памаўчаў, а потым абняў і пацалаваў.

...Пятлюра разарваў канверт, прачытаў, падняў вочы на Герасіма. Той стаяў побач і ледзь прыкметна ўсміхаўся. Пятлюра ўскіпеў. Яму прапануюць здацца, і хто? Нейкі камандзір палка! А ультыматум перадаў хлапчук.

— Будзеш у мяне служыць,— сказаў Пятлюра.

— Калі рак на гары свісне!— пачуў у адказ.

Герасіма доўга катавалі. Яму звязалі рукі, завязалі вочы.

— Героем хочаш памерці! Памрэш сляпым.

Пятлюраўцы шашкамі пасеклі героя.

У палку чакалі Герасіма. Цудам удалося выратавацца аднаму з чырвонаармейцаў, што суправаджалі Цярэш-

Крычаўскія байцы 153-га стралковага палка. 1918 г.

чанку. Ён і расказаў, як загінуў Герасім. Розе слухаў моўчкі, нахмурыўшы бровы.

А назаўтра пачаўся бой. 153-і полк многа разоў хадзіў у атаку, цясніў пятлюраўцаў. Чырвонаармейцы адбілі цела Герасіма Цярэшчанкі. Пахавалі яго пад Корасценем.

Пасля перамогі ў баі за Корасцень, дзе нашы землякі нашчэнт разбілі ўкраінскіх нацыяналістаў, полк атрымаў загад павярнуць на поўнач і вызваліць раёны, захопленыя войскамі Германіі і Польшчы. Байцы палка разграмілі праціўніка пад Бабруйскам і ўварваліся ў горад. Жыхары радасна сустракалі калоны пераможцаў. Спераду пад чырвоным сцягам ехалі В. Розе і камісар Купрэеў. Атрад вызваляў Мінск, іншыя гарады і вёскі.

Прыйшоў дзень, і полк уступіў у Вільню. Там сабраліся крычаўскія і чэрыкаўскія воіны – Сямён Партноў, Сцяпан Карагодаў, Мікалай Іўкін, Анатоль Шышко, Дзяніс Халондыраў і сфатаграфаваліся з сябрамі каля станковага кулямёта.

Потым была гераічная абарона Вільні ад палякаў. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў час абароны, камандзір 153-га стралковага палка В.Розе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

М.Ф. Мельнікаў.

Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

БАСІН Меер Вэлькавіч, нарадзіўся ў 1890 г. у г.Чэрыкаў. Скончыў рамеснае вучылішча ў Магілёве (1909). З 1911 г. працаваў у Баку. З 1912 г. чл. РСДРП. Член праўлення прафсаюза рабочых нафтавай прамысловасці Баку. У 1917 г. дэпутат Бакінскага Савета, член Бакінскага гарадскога камітэта РСДРП(б), адзін з кіраўнікоў стачкі бакінскіх рабочых. З лістапада

1917 г. сакратар прэзідыума выканкома і рабочай секцыі Бакінскага савета народнай гаспадаркі. Расстраляны англійскімі інтэрвентамі і эсэраўскім урадам 20.9.1918 г. у ліку 26-і бакінскіх камісараў.

КІСЯЛЁЎ Мацвей Сямёнавіч, нарадзіўся 18.11.1896 г. у г. Крычаў. Герой грамадзянскай вайны.

Мацвей вучыўся спачатку ў царкоўнапрыходскай школе, а потым у Крычаўскім рамесным вучылішчы – асвойваў такарную, слясарную, кавальскую справы. У вольную хвіліну дапамагаў бацьку па гаспадарцы.

У 1915 г. ён быў прызваны ў армію. Пасля заканчэння мінскіх курсаў сувязістаў накіраваны на фронт. Зблізіўся з рэвалюцыйна настроенымі салдатамі. У ваенны час Мацвей Сямёнавіч экстэрнам здаў экзамены за курс гімназіі. У чэрвені 1917 г. скончыў школу прапаршчыкаў у Жытоміры і быў накіраваны ў Сярдобскі полк начальнікам сувязі. У лістападзе 1917 г. стаў камуністам.

На пачатку 1918 г. вярнуўся ў Крычаў. А неўзабаве яго выбралі намеснікам старшыні Крычаўскага бальшавіцкага савета. Ён актыўна ўдзельнічаў у стварэнні атрадаў Чырвонай гвардыі.

Вясной 1918 г. М.С.Кісялёў – інструктар-арганізатар у Чырвонай арміі на Харкаўшчыне, затым начальнік тэхнічнага аддзела сувязі ваеннага аддзела Варонежскага губвыканкома.

М.С. Кісялёў.

У жніўні 1919 г. белагвардзейскі корпус генерала Мамантава прарваў лінію фронта і пачаў хутка прасоўвацца па савецкіх тылах. Сур'ёзнай перашкодай на шляху Мамантава стала група войск у Задонску, начальнікам штаба якой быў М.С.Кісялёў.

З красавіка 1920 г. у Кіеве: ваенком інжынернага ўпраўлення, потым камандзір брыгады асобага прызначэння, камендант Кіева, начальнік стралковага корпуса. У 1926—1929 гг. начальнік Маскоўскай гарадской і губернскай міліцыі, потым працаваў у будаўнічых арганізацыях Масквы. Памёр у 1942 г. Яго імем названа вуліца ў Крычаве.

М.Ф. Мельнікаў.

МАГІЛЁЎКІН Васіль Мікітавіч, нарадзіўся на Крычаўшчыне.

Гэта былі неверагодна цяжкія дні для чырвонага Петраграда. Войскі Юдзеніча падыйшлі да самага горада. Белыя генералы разлічвалі праз некалькі сутак пераможцамі праехаць на конях па Неўскім праспекце.

Найбольш цяжкі ўчастак дастаўся чырвоным курсантам. На чале іх зводнага атрада быў пастаўлены былы афіцэр царскай арміі Яжоў. Камісарам прызначылі дваццацічатырохгадовага камісара камандных курсаў Петраградскай ваеннай акругі Магілёўкіна. Сярод байцоў атрада быў сувязіст Анісім Пузырэўскі, зямляк Магілёўкіна. Калісьці яны разам вучыліся ў Крычаўскім рамесным вучылішчы. Васіль Магілёўкін прыехаў у Петраград у 1914 г. Працаваў на заводзе «Айваз». Там прайшоў школу рэвалюцый-

най барацьбы. Не выпадкова гераічная Выбаргская старана паслала Васіля ў ліку найбольш адважных і стойкіх сваіх чырвонагвардзейцаў браць Зімні...

Потым ён стаў курсантам артылерыйскага вучылішча, камісарам гэтай ваеннай навучальнай установы, камісарам камандных курсаў Петраградскай ваеннай акругі.

Пасля грамадзянскай вайны Васіль Мікітавіч Магілёўкін скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Ён займаў адказныя пасады ў Чырвонай арміі, быў выкладчыкам ваеннай акадэміі.

М.Ф. Мельнікаў.

ПАРШУКОЎСКІ Іван, нарадзіўся ў в. Слабада Свіная. Працаваў на шахтах Данбаса. Нярэдка прыязджаў у сваю родную вёску. Прывозіў лістоўкі, расказваў аб рэвалюцыйным настроі рабочых і шахцёраў. На Кацярынаслаўшчыне (цяпер Днепрапятроўская вобласць) быў адным з кіраўнікоў рабочай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі. Праводзіў значную агітацыйна-масавую работу сярод рабочых. Але хтосьці са здраднікаў выдаў яго царскім уладам.

Аднойчы ў вёску прыйшла вестка аб тым, што Іван Паршукоўскі за рэвалюцыйную дзейнасць быў павешаны.

У пачатку 1918 г. жыхары Слабады Свіной звярнуліся ў вышэйшыя інстанцыі з просьбай перайменаваць гэтую вёску ў Іванаўку ў гонар Івана Паршукоўскага. Аб лёсе іх просьбы доўгі час не было вядома. Аднак пошук працягваўся. І вось у Крычаўскі краязнаўчы музей прыйшла фотакопія вёсак Крычаўскай воласці 1-й палавіны 1918 г. У гэтым спісе адзначаецца «Свіная – узбуджана хадайніцтва аб перайменаванні ў Іванаўку.

У 1976 г. на будынку клуба ўстаноўлена мемарыяльная дошка, прысвечаная перайменаванню вёскі і прысваенню ёй імя Івана Паршукоўскага.

М.Ф. Мельнікаў.

ПОПЕЛЬ Адам Іванавіч, нарадзіўся ў 1895 г. у в.Сакольнічы.

Скончыў Крычаўскае рамеснае вучылішча. У 1913 г. працаваў у Пецярбургу на заводзе «Айваз». Потым быў прызваны ў армію. Тут праводзіў палітычную агітацыю. За гэта Часовы ўрад адправіў Попеля ў Дзвінскую турму. Пасля вызвалення служыў у гарнізоне Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі А.І. Попель быў памочнікам каменданта і камендантам Петрапаўлаўскай крэпасці, начальнікам службы тылу 15-й арміі. У мірныя дні наш зямляк вучыўся, кіраваў прадпрыемствам, аддзелам Акцябрскай чыгункі, праявіў сябе добрым арганізатарам у суднабудаванні.

За працоўныя подзвігі ў гады фашысцкай блакады Ленінграда быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Працоўныя раёна захоўваюць памяць пра свайго земляка.

М.Ф. Мельнікаў.

А. І. Попель.

ПУЗЫРЭЎСКІ Анісім, нарадзіўся ў в.Сакольнічы.

У 1912 г., закончыўшы рамеснае вучылішча ў Крычаве, паехаў у Пецярбург. Тут на заводзе пазнаёміўся з рабочымі-рэвалюцыянерамі. Ён удзельнічаў у дэманстрацыях, забастоўках. У хуткім часе яго прызвалі ў армію.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Анісім Пузырэўскі вярнуўся ў родную вёску.

Аднойчы маладыя хлопцы сабраліся разам. Былі тут Анісім Пузырэўскі, Іосіф Кашура, Васіль Вяржбіцкі, Іван Поклад, Фёдар Севасціцкі, браты Якубенкі. На гэтай сустрэчы быў створаны камітэт камсамольскай арганізацыі ў Сакольнічах. Старшынёй камітэта выбралі Іосіфа Кашуру. Адказнасць за культурна-масавую работу была ўскладзена на Анісіма Пузырэўскага. У арганізацыі работы па-новаму юнакам і дзяўчатам дапамагалі крычаўскія камуністы. Настаўніцы Варвара Барцэвіч і Софія Азарава часта чыталі лекцыі, ды і самі камітэтчыкі праводзілі цікавыя гутаркі.

Аднойчы камсамольцы запрасілі аднавяскоўцаў на канцэрт. Прыйшлі паслухаць самадзейных артыстаў сяляне з Задабрасці, Пакладоў, Свадкавічаў. Са сцэны гучалі песні роднай Беларусі, рускія народныя песні. Камсамольцы выступалі завадатарамі добрых спраў. Яны актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні камітэтаў беднаты. Анісіма Пузырэўскага выбралі ў крычаўскі камбед. У Крычаў неаднаразова прыязджаў важак камуністаў Чэрыкаўскага павета Мікалай Дарафеевіч Шчарбітаў. Ён растлумачваў членам камбедаў іх задачы.

Ішоў час напружанай барацьбы. Нялёгкі быў перыяд для маладой Савецкай Рэспублікі, якую з усіх бакоў сціскалі белагвардзейскія арміі і арміі замежных інтэрвентаў. Пайшлі на фронт Іосіф Кашура, Анісім Пузырэўскі, Іван Поклад, Васіль Вяржбіцкі.

Пузырэўскі змагаўся пад Петраградам, удзельнічаў у вызваленні Баку, іншых гарадоў. У мірны час працаваў сакратаром райкома партыі ў Беларусі, дырэктарам саўгаса, узначальваў школьны педагагічны калектыў. Памёр Андрэй Паўлавіч Пузырэўскі ў Людзінаве, пад Калугай, дзе быў дырэктарам школы.

М.Ф.Мельнікаў.

ШЧАРБІТАЎ Мікалай Дарафеевіч, нарадзіўся ў 1893 г. ў в.Кляпіна Чэрыкаўскага павета.

Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Беларусі. З сялян. Член партыі бальшавікоў з 1917 г. З 1916 г. у арміі. У ліпені 1917 г. – лютым 1918 г. старшыня Рэчыцкага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Удзельнік устанаўлення Савецкай улады ў Рэчыцы, барацьбы з левымі эсэрамі ў Чэрыкаўскім павеце і стварэння Чэрыкаўскай павятовай арганізацыі РКП(б), сакратар павятовага камітэта партыі, загадчык аддзела Магілёўскага, потым Гомельскага губвыканкомаў. З мая 1919 г. у Чырвонай арміі: начальнік палітаддзела 17-й (Заходні фронт) і 3-й (Паўднёвы фронт) дывізій, удзельнік штурма Перакопа. Памёр у 1921 г.

Чырвонагвардзеец Іван Поклад

У нашым музеі экспануецца атэстат Івана Ягоравіча Поклада з вёскі Сакольнічы аб заканчэнні Крычаўскай рамеснай школы для дзяцей бедных сялян. Слаўны жыццёвы шлях прайшоў гэты чалавек.

Іван рана стаў зарабляць сабе на хлеб. У рамесную школу паступіў яшчэ падлеткам, закончыў яе, паказаўшы выдатныя здольнасці ў сталярнай справе. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі з іншымі вясковымі хлопцамі — Іванам і Іосіфам Кашурамі, Андрэем Вяржбіцкім, Анісімам Пузырэўскім прымаў удзел у стварэнні камітэта сялянскай моладзі (Камола).

Калі прагучаў заклік: «Моладзь, у рады Чырвонай арміі!», Іван Поклад уступіў у рады легендарнага 153-га стралковага палка 17-й чырванасцяжнай дывізіі. Служыў пад камандаваннем героя грамадзянскай вайны Вальдэмара Рудольфавіча Розе. Прымаў удзел у баях каля Рагачова і Корасценя, Мазыра і Нясвіжа, за Бабруйск і Вільню. Камандаванне адзначала мужнасць і адвагу маладога байца.

Адгрымелі апошнія залпы грамадзянскай вайны, і Іван Поклад пайшоў працаваць у прафтэхшколу, якая была створана ў Крычаве на базе рамеснай школы. Быў майстрам, потым загадчыкам гаспадаркі. Працаваў будаўніком. Я быў добра знаёмы з Іванам Ягоравічам. Ён часта расказваў аб падзеях грамадзянскай вайны. Мяне захаплялі яго сціпласць і вытрымка, сардэчная дабрата.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна, і стары чырвонагвардзеец папрасіў накіраваць яго на фронт. Ён з гонарам выканаў свой салдацкі абавязак. Раны, атрыманыя ў час грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, падарвалі здароўе ветэрана. Нягледзячы на гэта, ён амаль да апошняга свайго дня працаваў.

М.Ф. Мельнікаў.

Загартаваны ў баях

12 сакавіка 1918 года былы батрак Васіль Галаўчанскі добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную армію. Хлопцу было ўсяго 17. Па краіне кацілася грамадзянская вайна.

Кавалерыйскі ўзвод, якім камандаваў Васіль Галаўчанскі, прымаў непасрэдны ўдзел у баях з войскамі Дзянікіна, Урангеля, Краснова, удзельнічаў у штурме Перакопа ў 1920-м, а потым да мая 1924-га вёў барацьбу з басмачамі ў Сярэдняй Азіі. Няраз маладому камандзіру даводзілася глядзець смерці ў вочы. Афіцэры белай гвардыі і казакі добра валодалі зброяй, секліся не на жыццё, а на смерць.

Пасля баёў было мірнае жыццё, вучоба, праца на адказных пасадах. Не ўсё аказалася бязвоблачным для партыйнага работніка. З 1933 года, пасля вучобы ва ўніверсітэце, Васіль Галаўчанскі быў на партрабоце. Працаваў другім, а потым першым сакратаром Бабруўскага райкома партыі ў Варонежскай вобласці. За перыяд да 1938 года ў раёне не было выяўлена ніводнага «ворага народа». Гэта не задавальняла абласное кіраўніцтва.

Змянілі начальніка НКУС. На змену вопытнаму вайскоўцу, удзельніку грамадзянскай вайны, прыйшоў малады энергічны лейтэнант, які ў кожным іншадумцы бачыў ворага савецкага ладу. Першым быў асуджаны старшыня райвыканкома.

Калі раён наведаў начальнік НКУС вобласці, Галаўчанскі не стрымаўся і ў час вячэры пацікавіўся, за што арыштавалі яго добрага сябра. Начальнік задаў толькі адно пытанне:

— А чаму гэта цябе так цікавіць?

— Ну як жа, пяць гадоў працавалі побач...

Гэтага было дастаткова. Першым сакратаром райкома партыі зайшоў Васіль у кабінет першага сакратара абкома, а выйшаў беспрацоўным. «Вызваліць ад займаемай пасады за недастаковую пасіўную барацьбу з ворагам народа і за прытупленне палітычнай пільнасці» – такой была рэзалюцыя бюро абкома. А мог бы і за турэмнымі кратамі апынуцца.

А потым была Вялікая Айчынная вайна. Камісар палка Васіль Галаўчанскі прымаў удзел у вызваленні Беларусі, Прыбалтыкі, Польшчы, Усходняй Прусіі, быў паранены пад Ноўгарадам. Пасля Перамогі год служыў у Германіі, а ў студзені 1948-га прыехаў у Крычаў. Да 1964 года працаваў на розных пасадах.

Ордэн Чырвонай Зоркі і тры ордэны Айчыннай вайны I ступені атрымаў падпалкоўнік Галаўчанскі за ўдзел у баявых аперацыях апошняй вайны, ордэнам «Знак Пашаны» адзначана яго праца ў мірныя пасляваенныя гады.

А. Балдоўскі.

Клятва ў Маляцічах

Ішоў сакавік 1919 г. У Чавускім штабе ЧОН было мнагалюдна. Набіралі добраахвотнікаў у атрад, які тэрмінова павінен быў выступіць на падаўленне белагвардзейскага мецяжу ў Гомелі. Да стала падыйшоў падлетак.

— Прозвішча?—запытаў чонавец.

— Сапега Улас.

— Колькі ж табе гадоў, Улас?

— Шаснаццаць, таварыш начальнік.

— Ранавата ў армію. Ды і экіпіроўка ў цябе не ваенная.

— Я займаўся ў прафтэхшколе ваеннай падрыхтоўкай. Запішыце мяне ў атрад, таварыш начальнік.

— Не, Улас, ты вельмі малады.

Так і вярнуўся Улас Сапега ў сваю родную вёску Даленшчына. Заняткі ў Чавускай прафтэхшколе, дзе ён вучыўся, спыніліся.

Сакратаром валаснога камітэта партыі бальшавікоў у Беліцы быў Ільянкоў. Ён прыкмеціў Сапегу, які часта і горача выступаў на сходах сялян. Неўзабаве старшыня Беліцкага валрэўкома Палякоў і кіраўнік камуністаў Ільянкоў выдалі юнаму актывісту мандат, у якім значылася, што Улас Сапега рэкамендаваны Чэрыкаўскаму павятоваму камітэту РКП(б) для накіравання ў губернскі горад Гомель на курсы па падрыхтоўцы культасветработнікаў для вёскі.

У Гомелі даведаўся шмат новага. Там быў вялікі калектыў рэвалюцыйнай рабочай моладзі. У Гомелі ён вучыўся, як трэба весці работу сярод моладзі, як праводзіць камсамольскія сходы.

А калі вярнуўся ў сваю вёску, адра-

зу ўзяўся за стварэнне маладзёжнай арганізацыі. У Беліцу прыехаў прадстаўнік Чэрыкаўскага павятовага камітэта камсамола. На першым сходзе была створана ячэйка з 12 чалавек. Яе сакратаром выбралі Уласа Сапегу.

Як піша ў сваіх успамінах Улас Сцяпанавіч, камсамольцы вучыліся ў партыйцаў, часта звярталіся за дапамогай да старэйшых таварышаў. Вельмі вялікая работа вялася па збору прадуктаў для галадаючых дзяцей Паволжа. Атрымаўшы мандаты валрэўкома, камсамольцы пайшлі па сёлах. Толькі за 10 дзён у воласці былі сабраны 72 пуды збожжа, 18 камплектаў адзення, 60 тысяч рублёў. Народ імкнуўся дапамагчы галадаючаму Паволжу.

Камсамолец Фядос Свірыдзенка сабраў чатыры пуды збожжа, але не змог знайсці фурманку і на ручной цялежцы шэсць вёрст вёз яго ў Беліцу. Быў вечар, і Фядос убачыў на дзвярах крамы замок. Так і прасядзеў камсамолец да раніцы на мяшках.

Чэрыкаўскі павятовы камітэт камсамола накіраваў Уласа Сапегу на курсы палітасветы. Калі вярнуўся, было ўжо новае дзяленне – на раёны. Крычаўскі райвыканком прызначыў Уласа загадчыкам хаты-чытальні ў Маляцічах. У гэтай вёсцы было шмат камсамольцаў, была партыйная ячэйка. Сапега разам з камсамольцамі сабраў чатырыста кніг, чатыры крэслы, дзве лаўкі, люстэрка і раяль, вывезеныя з памешчыцкага дома. На першым сходзе ў хаце-чытальні было поўна народу. Сакратар мясцовай партячэйкі Лужкоў зрабіў даклад, а потым за поўнач ішла гутарка з сялянамі. Кожны вечар свяціліся вокны чытальні. Выступалі дырэктар школы Хадыка, прадстаўнік сельпо Мове, старшыня сельсавета Аўраменка, мясцовы ўрач. Хата-чытальня стала цэнтрам агратэхнічнай прапаганды, растлумачэння савецкіх законаў.

Але моладзь патрабавала, каб у вёсцы быў адкрыты камсамольскі клуб. У мясцовага святара канфіскавалі дом. Камсамольцы выкінулі перагародкі, зрабілі сцэну, адрамантавалі сцены, развесілі плакаты і перанеслі туды раяль. Хутка паявілася аб'ява: «У клубе моладзі адбудзецца грандыёзны вечар – пастаноўка вадэвілю, выкананне песень пад акампанемент раялю, чытанне вершаў і апавяданняў».

Улас Сапега ўзняўся на сцэну і ўбачыў у перапоўненай зале хлопцаў і дзяўчат з суседніх вёсак. Толькі пазнаёміў з праграмай вечара, як з залы нехта выгукнуў: «А на раялі хто іграць будзе?»

Чатыры камсамольцы бягом кінуліся да доміка на ўскраіне Маляціч, дзе жыла выселеная туды мясцовая памешчыца. Яна была з сям'і Палонскіх, адзін з якіх шмат дапамагаў рэвалюцыянерам у 1905 і 1906 гг., а пасля Вялікага Кастрычніка працаваў у савецкіх установах.

Калі раскрылася заслона і на сцэне за раялем убачылі памешчыцу, зала ахнула ад здзіўлення...

У 1925 г. Улас Сапега стаў загадчыкам народнага Дома ў Крычаве. У сяле яго месца заняў камуніст Прудзікаў. Пазней Улас служыў у Чырвонай арміі. У 1926 г. Улас Сцяпанавіч стаў членам партыі. З 1927 г. па 1930 г. працаваў сакратаром партыйнай ячэйкі ў Касцюковіцкім раёне. Пазней скончыў камвуз у Мінску. Працаваў сакратаром партарганізацыі Крычаўскай МТС, сакратаром партыйнай ячэйкі калгаса «На варце» і рэдактарам шматтыражнай калгаснай газеты.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Улас Сцяпанавіч Сапега – сакратар партыйнага бюро часці, работнік палітаддзела вайсковага злучэння. Пасля вайны зноў працаваў у Рэчыцы, быў на пасадзе загадчыка вытворчасці саўгаса «Добрушскі» Гомельскай вобласці.

М.Ф. Мельнікаў.

Першыя камсамольцы

З успамінаў С.Т. Стызіка

Рэвалюцыйныя падзеі ў лютым і кастрычніку 1917 года ў Петраградзе настроілі крычаўлян аптымістычна. У тыя часы тут знаходзілася вялікая колькасць салдат і матросаў, якія пасля раненняў на фронце і лячэння ў шпіталях прыбылі на пабыўку дамоў. Усюды кіпелі мітынгі. Шмат было выступоўцаў. Яны гаварылі аб тым, што трэба спыніць вайну, даць людзям шчаслівае жыццё. Больш за ўсё размоў было пра зямлю. Неабходна бало адабраць яе ў памешчыкаў і раздаць беднякам. Такая думка выклікала ў мітынгоўцаў ажыўленне, адабрэнне.

1918–1920 гады не з'яўляліся для крычаўлян спакойнымі, хоць ваенных дзеянняў у горадзе і вёсках не вялося. Па шашы Масква–Варшава безупынна рухаліся бежанцы з акупаваных Польшчай тэрыторый, вайсковыя часці. Аднойчы прайшла вялікая калона кубанскіх казакоў з песнямі. Твары кавалерыстаў былі вясёлыя. Вайскоўцы трымалі шлях на захад. Часцяком многія воінскія часці спыняліся ў Крычаве на адпачынак, які працягваўся тыдзень, а то і больш. Напоўнілі мястэчка і бежанцы. Іх крычаўляне не пакідалі без увагі, давалі прытулак, ежу і вопратку.

С.Т. Стызік.

З ліку моладзі ў 1918 годзе ў мястэчку быў сфарміраваны добраахвотны атрад і на санях адпраўлены ў Магілёў, дзе ўступіў у бой з польскімі легіянерамі. Ішоў час і нёс з сабой пэўныя змены ў жыцці людзей.

Першая ячэйка РКСМ у Крычаве была арганізавана ў 1921 годзе. Спачатку ў ёй налічвалася 15—20 чалавек. Першым сакратаром стаў Любан (імя не памятаю). Ён прыехаў з Чэрыкава ў Крычаў як прадстаўнік павятовага камітэта камсамола. Прыём у ячэйку праводзіўся па заяве. Памятаю прозвішчы першых камсамольцаў нашай ячэйкі: Балоцін, Левін, Шуб, Яша, Давід, Раскін, Лявон Кісялёў, Таненбаум, Раброў, Аліеўскі, Рыгор Бейнусаў. Сходы праводзіліся раз на тыдзень, вечарам.

Пазней, у 1923–1924 гадах у камсамол былі прыняты Фёдар Шахрай, Андрэй Шахрай, Андрэй Дудзін, Леў Шуфер, Фёдар Токін, Павел Рубека, Іван Рубека, Аляксей Грабніцкі, Міхаіл Кісялёў, Міхей Кісялёў, Вольга Чауса-

ва і іншыя. Ячэйка стала налічваць больш за сорак чалавек.

Хто былі гэтыя камсамольцы? Рабочая моладзь розных спецыяльнасцей, у асноўным з бедных сем'яў. Сакратаром партячэйкі ў 1921 годзе быў рабочы з Архангельска па прозвішчу Чубаў. Стройны, у паўкажушку, з рэвальверам на поясе, ён прыходзіў на нашы сходы. Даваў каманду, колькі камсамольцаў адправіць у вёску для выканання заданняў па харчразвёрстцы, для барацьбы з самагонаварэннем, правядзення сходаў беднаты, для мабілізацыі сялян, што мелі коней, на вывазку лесаматэрыялаў, дроў і іншых грузаў.

Такія паездкі працягваліся 1–2 тыдні. Многім з нас трапляла, як кажуць, на арэхі ад бацькоў за доўгую адсутнасць, ды лаянку мы пераносілі з пакорлівай маўклівасцю. Неслі камсамольцы ў начны час і патрульную службу ў горадзе. Патрулі ахоўвалі памяшканні партыйнай і камсамольскай ячэек, пошту, тэлеграф. Час быў неспакойны, па воласці разгульвалі ўзброеныя банды.

Мелася ў нас зброя: два дзесяткі вінтовак, карабінаў, бярданак. А патронаў было малавата: усяго 15–20 штук на адзінку зброі. У старэйшых па ўзросту камсамольцаў былі наганы. У 1922 годзе арганізаваўся атрад ЧОН у колькасці 50 чалавек. Былі ў ім як члены нашай ячэйкі, так і бальшавікі. За горадам, на полі, рэгулярна праводзіліся вайсковыя заняткі пад камандаваннем суддзі Котусева.

З 1928 года наша ячэйка прымала самы актыўны ўдзел у арганізацыі сходаў сялянскай моладзі, наладжвалі тэатралізаваныя пастаноўкі, даклады аб веснавой пасяўной кампаніі, дапамагалі абсталёўваць хаты-чытальні. Дзякуючы нашым намаганням узніклі камсамольскія ячэйкі ў вёсках Міхеевічы, Бацьвінаўка, Бель-1, Маляцічы, на чыгуначнай станцыі Крычаў, у камуне «Свісток» і многіх іншых месцах.

Калі Крычаў стаў цэнтрам раёна, былі арганізаваны райкомы ВКП(б) і ВЛКСМ. За перыяд з 1922 па 1928 гады сакратарамі РК ВКП(б) працавалі: Дзюндзікаў, Лазараў, Купцэвіч, Якіменка, Шумілін, Смялкоўскі, сакратарамі РК ВЛКСМ з'яўляліся Дземянкоў, Маркевіч, Сырамятнікаў.

Падрыхтавала Н.М. Марозава.

Яны змагаліся за ўладу Саветаў

АСТАПЕНКА Іван Яфімавіч, н. у 1890 г. у в.Волчас. Удзельнічаў у баях супраць польскіх інтэрвентаў.

БАРОДЗІЧ Восіп Апанасавіч, н. у 1897 г. у в.Дзягавічы.

БАРЦЭВІЧ Ігнат Уладзіміравіч, н. у 1893 г. у в.Добрае. Удзельнічаў у абароне Петраграда ў 1919 г. ад войск Юдзеніча. Прапаў без вестак у час падаўлення Кранштацкага мецяжу.

БУБНОЎ Ларывон Віктаравіч, н. у 1898 г. у в.Шчарбачы. Удзельнік абароны Петраграда.

БУКЛАКОЎ Іван Аркадзевіч, н. у 1892 г. у в.Сычык. Удзельнік абароны Петраграда.

ВАЙЛУПАЎ Мітрафан Юр'евіч, н. у 1891 г. у в.Вародзькаў. Ваяваў супраць палякаў, прымаў удзел у вызваленні Нароўлі, Мазыра, Турава і г.д.

ВОЛКАЎ Макар Фёдаравіч, н. у 1892 г. у в.Асінаўка. Ваяваў у Дняпроўскай ваеннай флатыліі супраць дзянікінцаў, войск генерала Урангеля.

ГАЛОЎЧАНСКІ Васіль Міхайлавіч.

ГАРНАКОЎ Барыс Ніканавіч, н. у 1897 г. у Крычаве.

В.М. Галоўчанскі з піянерамі.

ДАНІН Васіль Кірэевіч, н. у 1889 г. у в. Ермакоўка.

ДРАЧОЎ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1894 г. у в.Валымер. Ваяваў супраць дзянікінцаў, палякаў на Дняпры, Прыпяці, на Украіне.

ДУБЯГА Сямён Канстанцінавіч, н. у 1898 г. у в.Іванаўка.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Стафан Сазонавіч.

ЕРАФЕЕЎ Пётр Ераставіч, н. у 1897 г. у в.Касцюшкавічы.

ЖАЛОННІКАЎ Лявон Нічыпаравіч, н. у 1895 г. у в.Губеншчына. Удзельнічаў у баях з палякамі і дзянікінцамі.

ІЗАХВАТАЎ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1891 г. у в.Дзягавічы.

ІСАКАЎ Ісідар, н. у в.Бель-2. Удзельнік абароны Петраграда.

КАВАЛЕНКА Архіп Стафанавіч, н. у 1895 г. у Крычаве.

КАВАЛЁЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1898 г. у в.Губіна. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе.

КАЖАМЯКА Даніла Ягоравіч, н. у 1896 г. у Крычаве.

КАРАГОДАЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1897 г. у Крычаве.

КАСТЫЧКА Кузьма Фёдаравіч, н. у в. Бель. Удзельнічаў у абароне Петраграда.

КУЛЯШОЎ Андрэй Трахімавіч, н. у 1896 г. у в. Зарубец.

КУЛЯШОЎ Андрэй Фядосавіч, н. у 1896 г. у в. Чырвоны Бор.

КУРЗА Даніла Аляксеевіч, н. у 1895 г. у Маляціцкай воласці. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе, ваяваў з палякамі.

ЛАРЫН Іван Рыгоравіч, н. у 1899 г. у в. Малявічы.

ЛІТОХІН Міхаіл Андрэевіч, н. у 1892 г. у в. Бель-1.

МАКСІМЕНКА Іван Мяленцевіч, н. у 1904 г. у в.Сычык.

МАРАЗЕВІЧ Максім Савельевіч, н. у 1896 г. у в. Шчэрбачы.

ПІСАРАЎ Канстанцін Фаміч, н. у 1895 г. у в. Бацьвінаўка.

ПЫТАЛЬ Антон Кандратавіч.

ПЫТАЛЬ Дзям'ян Кандратавіч.

РУБАНАЎ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1891 г. у в.Іванаўка.

САПІКАЎ Уладзімір Кузьміч, н. у 1898 г. у в. Маляцічы.

СЕРДЗЮКОЎ Ягор Васілевіч, н. у 1894 г. у в. Каменка.

С.С. Емяльянаў.

А.К. Пыталь.

Дз.К. Пыталь.

СЁМІН Восіп Елісеевіч, н. у 1898 г. у в.Міхеевічы.

СКАЧКОЎ Яфім Васілевіч, н. у 1896 г. у Крычаве.

СТАСЕЎ Якаў Васілевіч, н. у 1891 г. у в.Зарубец.

СУГАКОЎ Фёдар Захаравіч, н. у 1886 г. у в.Асавец.

ТАРАБАЗА Сцяпан Паўлавіч, н. у 1898 г. у в.Красны Ручэй.

ЦІМАШЭНКА Іван Арцёмавіч, н. у 1897 г. у в.Мірнае.

ШЭПЕЛЕЎ Акім Андрэевіч, н. у 1897 г. у в.Маляцічы.

Дакументы сведчаць

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ ВА ЎСТАНОЎЧЫ СХОД ПА ЧЭРЫКАЎСКАМУ ПАВЕТУ

		тыс.человек	%
Список №1	Губернский Совет крестьянских депутатов и губернская организация социалистов-революционеров	57320	87,74
Список №2	РСДРП (объединенная) и БУНД	847	1,29
Список №3	Объединенная Еврейская социалистическая рабочая партия (ОЕСРП)	139	0,27
Список №4	Еврейская социал-демократическая рабочая партия	103	0,15
Список №5	Союз земельных собственников	1559	2,38
Список №6	Партия народной свободы	616	0,94
Список №7	... и внепартийный демократический комитет	42	0,06
Список №8	Белорусские организации	15	0,02
Список №9	Еврейский национальный избирательный комитет	2786	4,26
Список №10	Губернская Польская рада	1291	1,97
Список №11	Полесский комитет РСДРП(б)	607	0,92

Всего действительных голосов – 65325

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.863. Воп.1. Спр.3. Л.52–52 ад.

ВАЛАСНЫЯ САВЕТЫ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

Название волостных советов	Местонахождение
1. Братьковичский	ст.Братьковичи
2. Белецкий	ст.Лобановка
3. Должанский	ст.Лобановка
4. Долговичский	ст.Малятичи
5. Дубровицкий	ст.Кричев
6. Краснопольский	ст.Краснополье
7. Кричевский	ст.Кричев
8. Комаровичский	ст.Чериков
9. Лобановский	ст.Лобановка
10. Малятичский	ст.Малятичи
11. Мхиничский	ст.Выдернка
12. Ново-Ельнянский	ст.Краснополье
13. Полужский	ст.Краснополье
14. Стеринский	ст.Краснополье
15. Самотевичский	ст.Гайдуковка
16. Студенецкий	ст.Костюковичи

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 813. Воп. 1. Спр. 1. Л. 73

СА ЗВОДКІ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА ПАДАДДЗЕЛА АДДЗЕЛА ЎПРАЎЛЕННЯ АБЛВЫКАМЗАХА АБ АРГАНІЗАЦЫІ КАМБЕДАЎ У ЧЭРЫКАЎСКІМ ПАВЕЦЕ

После того, как на Чериковском съезде большинством была принята резолюция левых эсеров, фракция коммунистов покинула съезд. Тогда за отсутствием кворума съезд прекратил свою работу. Фракция большевиков объявила себя временной властью в уезде. Новый съезд назначен на 15 сентября.

По вопросу об организации комитетов бедноты революционной частью съезда было постановлено: немедленно приступить к повсеместной организации комитетов сельских, волостных и уездных. С 25 августа по 10 сентября все волостные Советы должны созвать волостные сходы комитетов бедноты, на которых избираются комитеты бедноты от 3 до 5 лиц. На 15 сентября созвать уездный съезд комитетов бедноты, который избирает уездный комитет бедноты от 5 до 9 лиц.

Для самообороны от нападения кулацкой буржуазии на комитеты бедноты и партийные организации поручить военному комиссариату принять меры к немедленному вооружению комитетов бедноты и обезоружению кулаков, согласно приказу Высшего военного Совета.

В продовольственном вопросе съезд стоит на безусловном проведении в жизнь хлебной монополии во всероссийском масштабе и взятии на учет фабрично-заводских продуктов производства и также немедленном установлении на них твердых цен...

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 198–199.

ТЭЛЕГРАМА ВЫКАНКОМА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА КАМІСАРУ АДДЗЕЛА МЯСЦОВАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў г. ПЕТРАГРАДЗЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕТАЎ У ГУБЕРНІ

22 студзеня 1918г.

Советы имеются в уездных городах: Быхове, Гомеле, Горках, Климовичах, Мстиславле, Орше, Рогачеве, Сенно, Чаусах, Черикове; кроме того, местечковые: Пропойский – постовая ст.Пропойск Быховского у.; Чечерский – Чечерск Рогачевского у.; Костюковичский – Костюковичи Костюковичского у.; Жлобинский – Жлобин Рогачевского у.; Ляднянский – Ляды Горецкого у.; Копысский – Копысь Горецкого у.; Дубровенский – Дубровно Горецкого у.; Руднянский – Рудня Оршанского у.; Бабиновичский – Бабиновичи Оршанского у.; Толочинский – Толочин Оршанского у.; Шкловский – Шклов Могилевского у.; Крупчанский – Крупки Сенненского у.

В Могилеве имеются губернский и уездный Советы.

Председатель губисполкома Журавлев
Секретарь Пеньевский

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т.2. С.816.

ПАСТАНОВА НАДЗВЫЧАЙНАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА АБ ПАДТРЫМЦЫ І АХОВЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

26 чэрвеня 1918 г.

Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд, обсудив вопрос о текущем моменте и о власти постановил: горячо приветствовать Советскую власть за ее преданность интересам трудового народа.

Чериковский съезд заявляет, что трудовое крестьянство будет стойко и верно поддерживать власть Советов рабочих, солдатских и крестьянских депутатов, вместе с тем съезд заявляет, что и впредь власть должна быть создана только из представителей тех партий, которые показали свою непоколебимую преданность революции и народу не на словах, а на деле. Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд ни на минуту не

сомневается, что рабочая и крестьянская власть, опирающаяся на могучие плечи всего трудового народа, быстро сумеет одолеть всех врагов революции, которые бесстыдно предают интересы всего народа своим саботажем и стараются подорвать власть Советов. Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд клеймит несмываемым позором партии соглашателей – правых эсеров и меньшевиков – эти партии прислужников буржуазии, окончательно смешавшиеся с рядами самых откровенных черносотенцев. Съезд с пренебрежением отмечает жалкий выкрик этих обанкротившихся политиканов по адресу демократической власти Советов Народных Комиссаров.

Да здравствует всемирная социальная революция!

Да здравствует беспощадная борьба с вековыми угнетателями!

Да здравствует Российская Социалистическая Федеративная Советская Республика!

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С.68.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА САВЕТА АБ ДАПАМОЗЕ ХЛЕБАМ ЖЫХАРАМ г. МАСКВЫ

3 жніўня 1918г.

Слушали о посылке хлеба в Москву для довольствия населения и рабочих гор. Москвы.

Постановили: заслушав телеграмму Народного Комиссариата внутренних дел, переданную в копии из Облисполкомзапа за № 1062, о необходимости посылки хлеба для рабочих гор. Москвы и Петрограда, учитывая тот серьезный момент, когда костлявая рука голода хватает за горло Советскую власть, которая стоит только в защиту бедного класса и дала ему землю и волю, и что враги этой власти – капиталисты и помещики направляют все свои силы, чтобы путем голода задушить эту власть и повернуть рабочих и крестьян опять под свое владычество...

Поручить тов. Орлову немедленно приступить к уборке хлеба в имениях, засеянного бывшими помещиками, где это будет возможно, при помощи сельскохозяйственных машин, привлечь население и немедленно все собранное отправить в гор. Москву.

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С.90–91.

З ПРАТАКОЛА ПЛЕНАРНАГА ПАСЯДЖЭННЯ КРЫЧАЎСКАГА ВАЛАСНОГА САЎДЭПА АД 30 верасня 1918 года № 53.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О распределении отделов между вновь избранными членами Волостного Совдепа.
2. О даче отзыва об учителях, назначенных в Кричевскую гимназию.
3. Доклад по снабжению Кричевского гарнизона войск продовольствием и фуражем.
4. Доклад заведующего земельным отделом.
5. О переименовании Комитета бедноты в учетно-контрольную Продовольственную Комиссию.

По первому вопросу, по выслушании предложения членов Совдепа постановили: председателем Совдепа избрать т. Прохорова, которому поручить заведывание общим отделом. Заведывание продовольственным отделом поручить т.Зайцеву, которого уполномочить председательствовать в Совдепе, при отлучках т.Прохорова. Заведывание хозяйственным отделом поручить т.Рыбчинскому, заведывание земельным отделом поручить т.Усаткину, товарищем его назначить т.Галковского. Заведывание нотариальным отделом – т.Киселеву, заведывание отделом Народного образования временно поручить председателю Совдепа т.Прохорову.

По второму вопросу, по выслушании доклада начальницы гимназии постановили: изъять согласие на занятие должностей преподавателей в Кричевской Гимназии городской указанными в отношении за № 19 лицами, именно: А.Цветковой, М.С.Дементьевой, М.Леонович, И.Зыков, В.Колокольников, Н.Целуевский и М.Пехонович и ходатайствовать перед Чериковским уездным отделом по народному образованию об утверждении их в этих должностях.

По третьему вопросу, выслушав доклад заведывающего пулемётной командой т. Шишко, постановили: предложить земельному отделу удовлетворить нужды пулемётной команды и 7-й роты красноармейцев продовольствием – хлебом, согласно представленной сметы Комиссариата, а в дальнейшем урегулирование этого вопроса возложить на Учетно-Контрольную Комиссию.

По четвертому вопросу, выслушав доклад уходящего из земельного отдела т.Толпыго, постановили: доклад т.Толпыго принять к сведению и исполнению.

По пятому вопросу по докладу председателя Комитета бедноты т.Жолудева постановили: Комитет бедноты переименовать в Учетно-Контрольную Комиссию.

Подлинный за надлежащими подписями.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф.393. Воп.3. Спр.213. Л.118.

З ПРАТАКОЛА VII ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА КАМБЕДАЎ ПА ЗЯМЕЛЬНАМУ ПЫТАННЮ

28 лістапада 1918г.

По сообщению мандатной комиссии на съезд прибыло 193 делегата с правом решающего голоса, что составило кворум...

По земельному вопросу возникают довольно продолжительные прения. Высказывается целый ряд ораторов, говорящих против общественной обработки земли и за таковую. Причем несколько проникших на съезд кулаков поднимают шум, выражая этим нежелательность коммунистической обработки земли. Председатель неоднократно призывает (их) к порядку.

После прений заключительное слово предоставляется тов.Щербитову. Щербитов говорит: «Товарищи, я внимательно проследил за словами всех выступавших ораторов по земельному вопросу и убедился, что большинство из них, прибывших на съезд чистейшей воды бедняков, завтра согласны приступить только к коммунистической обработке земли. Но здесь есть наверное не меньше дюжины и больше кулаков, которые, видя, что все равно их столыпинская обработка земли на этом съезде принята не может быть, стараются сорвать съезд. Им не хочется стать наряду с каждым тружеником-бедняком и крайне нежелательно распрощаться с тем, что они за 5 руб. прошлое лето нанимали себе поденщика, а потом сбывали хлеб по 80 руб. за пуд.

Подобных явлений, где маленькая кучка кулаков против большинства беднейшего крестьянства старается провести свою политику, чтобы и в будущем нанять поденщика за 5 руб. – это недопустимо.

Вы, товарищи бедняки, собрались сюда на съезд, чтобы (вы) сказать свое пожелание, свою нужду, а эти 10 кричал-горлопанов хотят своими сильными голосами заглушить вас. Так чего же с ними церемониться? Известно, что меньшинство должно подчиниться большинству. Поэтому я предлагаю следующую резолюцию: Чериковский уездный съезд комитетов бедноты из опыта последних 2 лет отмечает наступающее тяжелое истощение земли. Оно наступает потому, что в уезде до сих пор ведется чересполосная мелкособственническая обработка земли, кроме того, все бывшие помещичьи земли в уезде в этом году почти не были удобрены. Вместе с тем как растет население, как земля в уезде все больше и больше дробится на мелкие полоски, крестьянство не в состоянии повести правильную обработку земли и неизбежно придет к пропасти.

Съезд комитетов бедноты единственным выходом из этого положения считает общественную обработку земли. Съезд поручает земельному отделу принять меры к скорейшей организации сельскохозяйственных коммун и трудовых артелей, а также повести сильную агитацию среди обществ уезда в том направлении, чтобы убедить население в необходимости и неизбежности общественной обработки земли. В отношении же вопроса относительно социализации земли того населения, которое не войдет в коммуны, земельный отдел должен работать в том же направлении, чтобы правильно учесть землю и по возможности равномерно распределить таковую между населением трудовой республики. Это же население общественными силами должно обрабатывать оставшиеся от распределения земли».

Означенная резолюция большинством голосов 148 против 45 принимается...

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 491–492.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПРАДСТАЎНІКА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА НА МАГІЛЁЎСКАЙ ХАРЧОВАЙ НАРАДЗЕ*

Очень частая сменяемость комиссаров не дала возможности поставить дело продовольствия как следует. В имениях хлеб был снят волостными советами и разделен между крестьянами. Комитеты бедноты учет урожая произвели неправильно, сильно сократив цифру урожайности, а потому излишки по уезду выразились: в хлебе 38541 пуд, в фураже 16183 пуда, в масленичных семенах 2843 пуда, а нехватка по уездам выразилась: хлеба 59870 пуд., фуража 63925 пуд. Таким путем получается, что уезду для собственного пропитания не хватает хлеба 21329 пуд., фуража 47742 пуда. С 36 водяных мельниц уезда и 4-х паровых собрано за полугодие замола 8940 пудов. Собрано пожертвованием 1920 пудов хлеба. На плечах уездпродкома все время сидело огромное количество красноармейцев, как проходящих, так и находившихся на постоянных квартирах. С ними была масса трений и недоразумений. В уездпродкоме полное отсутствие финансовых средств. Кооперация работает хорошо, но распределение производит по паям. Товарообмен проводить затруднительно из-за несочувствия населения. Классовый паек среди сельского населения не проведен.

Могилевское губернское продовольственное совещание. Могилев, 1919.

АБ ПЕРАХОДЗЕ Ў СКЛАД ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

ШТАМП:
Могилевский
Совет
Народного хозяйства

управлен. Дел
августа 5 дня
№ 4736

Всем отделам совнархоза
Президиум Могилевского
Окружного Совета Народного
Хозяйства передает для
сведения и руководства

Народный Комиссариат Внутренних Дел 9 июля 1919 г. утвердил следующий состав Гомельской губерн.: 1. Быховский, 2. Гомельский, 3. Могилевский, 4. Рогачевский, 5. Чаусский, 6. Чериковский, Мглинский и с Почетским районом, 8. Новозыбковский, 9. Климовичский, 10. Стародубский, 11. Суражский, Речицкий, 12. Горецкий, Оршанский.
Последние три уезда входят в состав Гомельской губернии полностью.
Подлинное за надлежащими подписями.
С подлинным верно:

Секретарь: подпись

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф.6. Воп.1. Спр.137.

ЗАГАД АРМІЯМ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АБ ЗНЯЦЦІ ВАЕННАГА СТАНОВІШЧА І РОСПУСКУ РЭЎКОМАЎ

11 студзеня 1920 г.
гор. Смаленск

Во исполнение постановления Совета Рабоче-Крестьянской обороны от 2 января с.г. приказываю:

1. Снять военное положение во всех уездах Смоленской губ., Велижском и Суражском уездах Витебской губ., Оршанском, Горецком, Чаусском, Климовичском и Чериковском

* Нарада прадстаўнікоў харчовых і кааператыўных органаў Магілёўскай губерні адбылася 2—5 сакавіка 1919 г. у г.Магілёве.

уездах Гомельской губ. с освобождением учрежденных на этой территории губернских, уездных и местечковых ревкомов от исполнения обязанностей ревкомов.

2. Распускаемым ревкомам представить отчет о своей деятельности начальнику тыла Западного фронта, сдав все дела в соответствующие исполкомы, а остатки чрезвычайных авансов, отпущенных на расходы, связанные с обороной и поддержанием революционного порядка – начальнику тыла Западного фронта с представлением авансовых отчетов на израсходованные суммы.

3. Освобождающимся членам ревкомов обратиться к исполнению своих прямых обязанностей.

4. О времени роспуска ревкомов донести начальнику тыла Западного фронта.

Командующий армиями фронта Гитис.
член Революционного Военного Совета фронта
И.Уншлихт.
Начальник Генерального штаба
В.Лазаревич.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Інв. №3918. Загады арміям Заходняга фронту, загад № 56.

ДАКЛАД СТАРШЫНІ МАГІЛЁЎСКАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА АБ ВЫДЗЯЛЕННІ САМАСТОЙНАЙ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

Прадстаўляецца паводле распараджэння Саварма 16.

Бывшая Могилевская губерния по своим географическим границам была ненормальна, так как представляла из себя чрезвычайно удлиненную территорию с севера на юг, плохо обслуживаемую путями сообщения, почему отдельные ее уезды не были связаны между собой. Могилев (север) не мог себе подчинить Гомеля (юга), что приводило к ряду конфликтов и тормозило работу. В силу этого возник вопрос об изменении границ губернии и ставился он в двух плоскостях: 1) разделение на две губернии (Могилевскую и Гомельскую) и 2) перенесение Губцентра в Гомель, так как условия жизни губернии (только что происшедшее освобождение от оккупации, польская угроза и т.д.) требовали скорейшего разрешения вопроса, то и было решено перенести Губцентр в Гомель, что было значительно легче. Новая Гомельская губерния, образовавшаяся из бывш. Могилевской (без уездов Сенненского и Мстиславского) и нескольких уездов Черниговской и Минской губерний, оказалась совершенно измененной, так как территория губернии еще больше увеличилась, связь же между отдельными уездами нарушалась совершенно. В финансово-экономическую и административную жизнь ряда северных уездов, особенно оторванных от Губцентра, была внесена полная дезорганизация. Эти условия неминуемо вызвали в указанных уездах сильнейшую тенденцию к выделению самостоятельной губернии, которая завершилась совещанием северных уездов, состоявшемся 6-го апреля с.г. в Могилеве.

На совещании в докладе по вопросу о выделении новой губернии главным образом отмечалось следующее:

1) Гомельская губерния делится на две резко очерченных части – северную и южную – сильно различающиеся характером промышленности. На юге преобладает сравнительно развитая фабрично-заводская промышленность, на севере при наличии некоторого числа предприятий заводского типа сильно развита кустарная промышленность. Губцентр, географически находясь в центре южных уездов, естественно все свое внимание уделяет им, совершенно почти не интересуясь кустарной промышленностью севера, в силу чего последняя не только не имеет возможности развиваться, но и замирает. При обращении надлежащего внимания на северные уезды из них можно было бы извлечь очень много для нужд народного хозяйства, так как здесь развита деревоперегоночная, деревообделочная, кожевенная, гончарная и проч. кустарная промышленность, имеющая все данные для широкого развития. Серьезного внимания требует также Шкловская писчебумажная фабрика, Яковлевичская и Дубровенская мануфактуры, Выдрицкий деревоперегоночный завод – один из первых в России, и др. заводские предприятия. Кроме того, совершенно не обращено внимания на разработку таких богатств, как огнеупорная глина, известь и т.п. В условиях, ныне переживаемых Советской Россией, когда в области развития Народного Хозяйства требуется использование всех сил и возможностей, замирание северных уездов губернии является абсолютно недопустимым, но для того, чтобы они могли экономически нормально жить и

развиваться, необходимо обращение на них серьезного внимания, чего нынешний Губернский Центр сделать не в состоянии.

2) Связь между частями губернии чрезвычайно слаба, ввиду того, что все пути сообщения заключаются в железной дороге, реке Днепр и шоссе, идущих параллельно друг другу с севера на юг и занимающих полосу шириной верст не более 50. Все уезды, лежащие в стороне от этих трех линий, совершенно оторваны от главных центров губернии. Подъездные пути сообщения чрезвычайно плохи. Но и уезды, через которые проходит железная дорога, слабо связаны друг с другом и с Губцентром, ввиду транспортной разрухи. При выделении новой Могилевской губернии это обстоятельство было бы устранено, так как: А) протяжение губернии значительно сокращается. Б) вновь строящаяся железная дорога Орша—Унеча связывает между собой ряд северных уездов и В) подъездные пути достаточно связывают между собой и с Могилевом вокруг лежащие уезды. Это положение еще улучшится с проведением шоссе Минск—Могилев, Чаусы—Мстиславль, к которому теперь приступают.

3) В административном отношении северные уезды губернии в последний год жили почти совершенно самостоятельно, не получали из Губцентра никаких указаний, не подвергались надлежащему контролю и фактически представляли ряд самостоятельных республик. Это положение, естественно, пагубно отразилось на всей работе, вызвало сильный денежный кризис, ввиду плохого финансирования, породило нездоровые проявления местничества и сепаратизма и вообще сильно расстроило весь Советский аппарат.

Из всего вышеизложенного ясно вытекает необходимость создания из северных уездов Гомельской губернии новой самостоятельной губернии, которая, будучи однородной по характеру промышленности, населению, состоя из тесно связанных уездов, сможет развиваться вполне нормально.

На вышеуказанном совещании были представлены или заранее присоединились к решению о выделении губернии уезды: Могилевский, Оршанский, Горецкий, Чаусский, Мстиславский (ныне Смоленской губ.), Быховский, Чериковский, Климовичский, Рогачевский, вопрос о выделении был решен в положительном смысле всеми голосами против одного представителя Чериковской кооперации, который считал нежелательным отделение от юга, так как это порывает связь с Украиной.

При рассмотрении вопроса о новом Губцентре опять таки всеми голосами, против одного, при одном воздержавшемся, было признано необходимым образовать в Могилеве, как наиболее подходящем со всех точек зрения городе: а) наиболее промышленный и пролетарский город в упомянутых уездах, б) находится в центре предполагаемой губернии, в) лучше других связан со всеми путями сообщения, г) как бывший губернский центр наилучше отвечает всем предъявленным требованиям. Кроме того, он является и более крупным и хлебным культурным центром.

Предложение образовать Губцентр в Орше было всеми отвергнуто, причем и представитель Оршанского исполкома заявил, что на состоявшемся 26 марта с.г. Съезде Советов было единогласно постановлено ходатайствовать о выделении губернии с центром в Могилеве. Надо, однако, отметить, что Орша не тверда в своих решениях и этот вопрос неоднократно разрешался ею то в пользу Губцентра в Могилеве, то в Орше, то вообще решалось присоединиться к Смоленской или Витебской губернии.

Постановления Совещания были представлены в Наркомвнудел, в административную комиссию ВЦИК, в которых в принципе были одобрены, но вопрос не был разрешен ввиду польского наступления, которое отвлекло внимание как центра, так и губернии к более серьезным задачам.

Заместителю председателя Гомельского Губвоенревкома тов.Пестунову, бывшему в Москве, также было там указано,что в принципе выделение губернии признается необходимым, но что в настоящее время этот вопрос может быть разрешен только в том случае, если расположенные в районе губернии Реввоенсоветы армии и фронта найдут это своевременным и нужным. Насколько удалось выяснить, ныне и Губцентр, прежде колебавшийся, признает такое выделение необходимым.

В губернском масштабе этот вопрос должен разрешиться в средних числах августа на Губконференции Р.К.П. и Губсъезде Советов, почему желательно было бы получить возможно скорее заключение и мнение по тому вопросу Реввоенсовета 16 и Реввоенсовета Запфронта.

В дальнейшем вопрос о выделении северных уездов бывш. Могилевской губ. в самостоятельный район – не возбуждался согласно указаниям Губцентра.

№ 1374
июля 21 дня 1920 г.
Могилев на Днепре.

Дзяржаўны архіў Магілёўская вобласці. Ф. 769. Воп. 1. Спр. 1. Л. 39—40

АБ БАРАЦЬБЕ З БАНДЫТЫЗМАМ У ПАВЕЦЕ

Для борьбы с развивающимся бандитизмом в Чериковском уезде губком в начале ноября выдвинул командиром всеми вооруженными силами по борьбе с бандитизмом в Чериковском уезде тов. Фернебок, которому также должен подчиняться штаб уездтройки и милиции. Особому отделу 16 армии было предложено работать в контакте со штабом и тов. Фернебоком. Тов. Чернявский, находящийся как уполномоченный губкомом по продкампании, был утвержден как политический уполномоченный губкома по борьбе с бандитизмом. Ему также было поручено принять меры к привлечению местной организации к активной борьбе и помощи отряду.

Чериковскому укому было указано на недостаточно энергичную работу по борьбе с бандитизмом. В Черикув послан отряд 4380 чел. слушателей губпартшколы.

Известия Гомельского губернского комитета РКП(б). 1920 г. № 5, С.32

ЗВОДКА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАСЯЎКОМА АБ НАСЕННАЙ ПАЗЫЦЫ НАСЕЛЬНІЦТВУ ПАВЕТА

Отпущено семенного материала на осеменение полей в весеннюю кампанию текущего 1921г.: овса 15500 пуд., ячменя 4198 пуд., гречихи 1677 пуд., проса 200 пуд., льняного семени 3509 пудов.

Семена распределены между населением Черикова и уезда в нижеследующем порядке:

№ п.п.	Название населенных мест	Овса	Проса	Ячменя	Гречихи	Льна
1	Белицкая	754	12	150	50	120
2	Братъковичская	1000	12	200	95	420
3	Долговичская	507	12	100	50	120
4	Должанская	1014	12	320	150	120
5	Дубровичская	1000	12	250	100	120
6	Комаровичская	754	12	215	80	200
7	Краснопольская	754	12	250	80	220
8	Кричевская	754	12	150	80	200
9	Лобановская	845	12	240	65	300
10	Малятичская	754	12	100	50	200
11	Мхиничская	1000	12	300	100	150
12	Ново-Ельнянская	754	12	240	100	150
13	Полужская	1000	12	250	120	500
14	Самотеевичская	1000	12	200	80	300
15	Старинская	1000	12	200	80	120
16	Студенецкая	1000	12	205	85	220
17	г.Чериков	300	8	30	25	49

Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921—1925 гг.), Гомель, 1960. С.117.

У складзе Калінінскай акругі

Першае ўзбуйненне БССР адбылося ў сакавіку 1924 г. Тады Калінінскі павет Гомельскай губерні ўвайшоў у БССР. На другой сесіі ЦВК было прынята рашэнне аб новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэспублікі. Скасаваны былі паветы і воласці, установлены акругі і раёны.

Рэспубліка падзялялася на 10 акруг: Слуцкую, Барысаўскую, Калінінскую, Мазырскую, Магілёўскую, Полацкую, Аршанскую, Бабруйскую, Віцебскую, Ленінскую.

Крычаўскі раён разам з Краснапольскім, Касцюковіцкім, Клімавіцкім, Бялыніцкім, Хоцімскім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім, Міласлаўіцкім, Расненскім увайшоў у склад Калінінскай акругі. Яе цэнтрам стаў г. Клімавічы. Тэрыторыя акругі налічвала 7534 квадратныя вярсты, зямлі ў ёй мелася 856982 дзесяціны.

У акрузе існавала 65082 сялянскія гаспадаркі. Працавалі як дзяржаўныя прадпрыемствы, так і прыватнаўласніцкія. Пражывала тут (дадзеныя на 1924 г.) 401101 чалавек. Колькасць беларусаў – 277677, рускіх – 87223, яўрэяў – 32756, палякаў – 1547, каля дзвюх тысяч налічвалася ўкраінцаў, літоўцаў і людзей іншых нацыянальнасцей.

Цікавы такі паказчык. Сельскае насельніцтва складала 91,1 працэнта. Гэта быў час, калі людзей не вабіў падмецены брук гарадоў, яны ўчэпіста трымаліся зямлі, любілі яе і пяшчотна шанавалі.

У акрузе выдавалася газета «Наш працаўнік», выходзіў рэгулярна літаратурны часопіс «Маладняк Калініншчыны».

У 1927 г., паводле пастановы ЦВК і СНК БССР ад 9 чэрвеня, Калінінская акруга, разам з Рэчыцкай, Слуцкай, Барысаўскай, была скасавана. Адбылося ўзбуйненне акруг. З 10 раёнаў, што ўваходзілі ў склад Калінінскай акругі, 8 – у тым ліку і Крычаўскі, былі далучаны да Магілёўскай акругі. Мсціслаўскі і Расненскі раёны сталі часткай Аршанскай акругі.

Акругі праіснавалі да 1930 г. Пасля іх ліквідацыі раёны сталі самастойнымі адзінкамі ў складзе БССР.

Крычаўскі раён у час свайго ўтварэння (1924 г.) меў: 635 квадратных вёрст зямлі, насельніцтва – 34904 чалавек і 162 населеных пункты.*

Вёска ў надзвычайных умовах

Хоць Крычаўшчына і не з'яўлялася ў грамадзянскую вайну арэнай баявых дзеянняў, але разбуральны подых гэтай вайны дайшоў і да нашых мясцін. Тут зменшыліся пасяўныя плошчы ўсіх сельскагаспадарчых культур з-за недахопу рабочых рук, інвентару і цяглавай сілы, у выніку значна знізіўся валавы збор зерня. Вёска знаходзілася ў бядотным стане. Сялянам стала лягчэй пасля замены ў 1921 г. харчразвёрсткі харчпадаткам. Новая эканамічная палітыка давала стымул атрымліваць больш прадукцыі, якую, пасля выплаты харчпадатку, можна было прадаць. Дзяржава дапамагала бяднейшым сялянам, выдаўшы ім зерневую пазыку. На палетках закіпела работа, працаўнікі вёскі павялі рашучы наступ на зарослыя быльнягом і крапівой, дробным кустоўем палі, ачышчалі іх і засявалі.

У 1921–1922 гг. голад ахапіў Паволжа. На Крычаўшчыне ішоў збор прадуктаў харчавання, вопраткі, абутку. Усё гэта пасылалася галадаючым. Станоўча ацаніў дапамогу пацярпеламу ад голаду насельніцтву Паволжа Чэры-

* Статистический ежегодник БССР. Мн. 1926. С.82–83.

каўскі павятовы камітэт РКП(б) у сваім звароце да насельніцтва ў снежні 1921 г. У ім гаварылася: «Стогны галодных нашлі гарачы водгук у Вашых сэрцах, і Вы добраахвотным ахвяраваннем аказваеце ім дапамогу і падтрымку». Трэба адзначыць, што рабілася гэта ў даволі цяжкі для жыхароў павета час. Сялянам самім не хапала хлеба, бульбы.

Вялікім тормазам у правядзенні веснавых палявых работ з'яўлялася адсутнасць коней і сельскагаспадарчых прылад. Таму для дапамогі сялянам у павеце пачалі арганізоўвацца пракатныя пункты сельгасінвентару. За пэўную плату вясковец мог узяць патрэбны яму інвентар і карыстацца ім у час сяўбы або малацьбы ўраджаю. У пачатку трыццатых гадоў такі пункт быў створаны і ў Крычаве. Узначаліў яго Кузьма Старадымаў. Пракатны пункт сельгасмашын удзяляў увагу патрэбам сялян, сем'яў чырвонаармейцаў – яны абслугоўваліся ў першую чаргу.

Як сведчыць сельскагаспадарчы перапіс 1920 г., у Чэрыкаўскім павеце на той час налічвалася 6 саўгасаў, 11 камун, 241 арцель. Вяскоўцы з недаверам адносіліся да стварэння калектыўных гаспадарак, абагульнення ўласнай маёмасці. Незадаволенасць дзяржаўнай палітыкай калектывізацыі ўзрастала, актыўна падтрымліваемая эсэрамі і меншавікамі, выхадцамі з заможных сем'яў. У павеце тамсям пачалі ўспыхваць сялянскія бунты, назіралася непадпарадкаванне мясцовым уладам, ігнараванне іх указанняў.

Трывожны неспакой ахапіў 16 жніўня 1922 г. Маляціцкую воласць. Хваляванні сялян тут перараслі ва ўзброенае паўстанне, у якім удзельнічала больш за 300 чалавек. Вяскоўцы выступалі за адмену харчразвёрсткі, супраць стварэння калектыўных гаспадарак і абагульнення ўласнай маёмасці. Накіраваны супакоіць бунтаўшчыкоў атрад чырвонаармейцаў у колькасці 100 чалавек не змог спачатку выканаць пастаўленай перад ім задачы. Узброеныя вяскоўцы аказалі вайскоўцам упартае супраціўленне. Завязаўся самы сапраўдны бой з прымяненнем агнястрэльнай зброі. Перавага была на баку паўстанцаў. Уціхамірыць іх удалося толькі з дапамогай дадаткова выкліканага атрада чырвонаармейцаў. Канфлікты сялян з мясцовай уладай у той час назіраліся і ў іншых вёсках Крычаўшчыны.

Згодна з пастановай другой сесіі ЦВК БССР (1924 г.) «Аб адміністрацыйна-гаспадарчым дзяленні БССР» быў утвораны Крычаўскі раён. Крыху пазней пастановай ЦВК БССР і СНК БССР (17 снежня 1931 г.) Крычаву нададзены статут горада.

Паступова ў райцэнтры пачала развівацца прамысловасць. Наладзіў выпуск прадукцыі лесазавод, дзейнічалі арцелі «Чырвоны панчошнік» і «Агнябронь», што выпускала дахоўку, дымавыя трубы, чаны для вады і інш., быў пушчаны ў эксплуатацыю паравы млын «Мурамец». Станоўчую ролю ў развіцці прамысловасці, у гаспадарчым і культурным будаўніцтве, павышэнні эфектыўнасці сельскай гаспадаркі адыграла ўвядзенне раённага бюджэту (1924–1925 гг.). Мясцовыя ўлады атрымалі магчымасць самастойна распараджацца грашовымі сродкамі, выкарыстоўваць іх з найбольшай аддачай.

Сельская гаспадарка перажывала цяжкія часы. Спустошаная ў вайну і дрэнна ўгоеная зямля давала мізэрныя

ўраджаі. У сярэдзіне трыццатых гадоў з кожнай дзесяціны (дзесяціна роўная 1,09 га) крычаўскія земляробы атрымлівалі толькі крыху больш за 30 пудоў жыта, каля 40 – аўса, 45 – ячменю і 600 – бульбы. Пры такой нізкай ураджайнасці цэны на прадукты харчавання былі высокія. Не змяншалася ў вёсках колькасць бедных сем'яў, якім патрэбна была дзяржаўная дапамога. Да ліку іх адносіліся пагарэльцы, інваліды, сем'і чырвонаармейцаў.

XV з'езд ВКП(б) у 1927 г. прыняў праграму калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Дзяржава лічыла, што для павышэння ўрадлівасці сельскагаспадарчых угоддзяў і паляпшэння дабрабыту вяскоўцам неабходна аб'яднацца ў калектыўныя гаспадаркі, сумеснымі намаганнямі дабівацца высокіх паказчыкаў у працы.

У вёсках павета разгортвалася работа па стварэнню калгасаў і саўгасаў. Галоўнай умовай уступлення селяніна ў калектыўную гаспадарку лічылася абагульненне яго ўласнай маёмасці. Вясковец павінен быў перадаць у распараджэнне арцелі ўсю цяглавую сілу, сельскагаспадарчы інвентар, запасы насення, пабудовы і г.д. Ён пазбаўляўся ўсяго таго, што было нажыта цяжкай працай. Беднякі ўступалі ў калектыўныя гаспадаркі без ваганняў і пакутлівага роздуму. А тым сялянам, што мелі жывёлу і кавалак няблага апрацаванай і ўгноенай зямлі, было неймаверна цяжка развітацца з нажытым дабром, трывожыла невядомасць і няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Таму яны не спяшаліся абагульняць сваю маёмасць. Заможныя вяскоўцы, якіх зямля і ўласнае падвор'е кармілі і давалі грошы, разгарнулі актыўную агітацыю супраць калгасаў і саўгасаў.

Становішча ў вёсках абвастралася. Сялян улады спачатку ўгаворвалі добраахвотна ўступаць у арцелі, а потым, бачачы марнасць угавораў, пачалі прымаць жорсткія меры. У заможных сялян і сераднякоў забіралі жывёлу, інвентар, нават вопратку і абутак і высылалі непакорных у паўночны край. Раскулачаных называлі ворагамі народа. Такім чынам з вёсак высялялі працавітых людзей, якія любілі зямлю, не баяліся цяжкасцей, сваёй працай кармілі самі і кармілі іншых. Перагібаў у час калектывізацыі назіралася шмат. Не апошнюю ролю адыгрывалі на месцах чалавечыя адносіны: даўняя крыўда, глыбока затоеная злосць бяднейшага селяніна на багацейшага, нядобрая зайздрасць.

На дапамогу мясцовым саветам для арганізацыі калектыўных гаспадарак было накіравана 25 тысяч рабочых з розных прадпрыемстваў краіны. Над Магілёўшчынай узяў шэфства завод «Чырвонае Сормава». Пасланцы гэтага прадпрыемства з'явіліся і на Крычаўшчыне. Захавалася тут памяць аб А.А. Манахаву, М.Я. Сусіну, С.І. Мансураву, П.А. Бяляеву, М.Д. Кічову і іншых сормаўцах, многія з якіх не толькі дапамагалі ствараць калгасы і саўгасы, але потым і ўзначалілі іх.

Перабудова сельскай гаспадаркі на новы лад адбывалася ва ўмовах актыўнага супраціўлення сялян, што не хацелі ўступаць у калгасы і саўгасы. Нягледзячы на рэпрэсіўныя меры, сяляне змагаліся супраць калектывізацыі. У стайнях, дзе стаяла абагуленая грамадская жывёла, нярэдка ўспыхвалі пажары, псаваліся жняяркі, малатарні і іншы сельскагаспадарчы інвентар, загараліся склады з насеннем. У вёсцы Міхеевічы забілі актывістку, камсамолку Дуню Пасканную. Арганізоўваліся замахі на жыццё старшынь-двац-

цаціпяцітысячнікаў С.І.Мансурава і М.Т.Скопіна. Аднак супраціўленне вёскі ва ўмовах рэпрэсій не магло доўга працягвацца і тым больш змяніць сітуацыю.

Узяты бальшавікамі курс на суцэльную калектывізацыю прыкметна паскорыў тэмпы стварэння калгасаў і саўгасаў. І адбылося гэта не за кошт добраахвотнага ўступлення сялян у грамадскія арцелі. Прымушалі іх абагульняць уласную маёмасць па-ранейшаму сілавымі метадамі. Існавалі і эканамічныя метады ўздзеяння. Так, па ўказанню Магілёўскага акруговага камітэта партыі, былі зніжаны на 25 працэнтаў нормы карыстання зямлёй для вяскоўцаў, якія не ўступілі ў калектыўныя арцелі. Аднаасобнікаў гнеўна кляймілі на кожным сходзе, ім дзяржава не выдавала крэдыты, насенне і неабходны інвентар, аднаасобныя гаспадаркі абкладваліся даволі адчувальным падаткам. Прыходзілася не салодка не толькі ім, але і іх дзецям. У школе настаўнікі дакорлівымі ўшчуваннямі часам даводзілі іх да слёз.

На Крычаўшчыне меліся людзі, якія да скону свайго жыцця не абагулілі ўласную маёмасць, не аддалі перавагу калектыўнай працы. Такім у вёсцы Баяры быў Ігнат Новікаў. Негаваркі, вечна засцяроджаны і пахмуры, ён умеў і чаравік адрамантаваць, і лапаць сплесці, і змайстраваць адмысловую бочачку для засолкі агуркоў. Меў ён толькі 0,15 га зямлі і трымаў дзесяткі са два вулляў з пчоламі. Долю аднаасобніка выбраў і Рыгор Качанаў з вёскі Ананічы, працавіты і руплівы чалавек.

Між тым распрацаваны ўрадам план пераходу ад дробных сялянскіх гаспадарак да буйной сельскагаспадарчай вытворчасці паступова ажыццяўляўся. Пад націскам вышэйстаячых інстанцый, ды і па ініцыятыве мясцовых кіраўнікоў у 1929 г. Магілёўская акруга разам з 15 іншымі раёнамі была аб'яўлена зонай суцэльнай калектывізацыі. Узмацніліся сілавыя метады ўздзеяння на сялян – надзвычайшчына, рэпрэсіі, адміністрацыйна-камандны гвалт. У далёкую Сібір пацягнуліся эшалоны з людзьмі, што не хацелі ўступаць у калгасы і саўгасы. Многія з жыхароў Крычаўшчыны не даехалі да месца высылкі, загінулі ў дарозе ад голаду і холаду, некаторыя дачасна памерлі ў незнаёмым і чужым краі ад журбы па родных мясцінах. Для паскарэння тэмпаў калектывізацыі пачалася «ліквідацыя кулацтва як класа».

У канцы жніўня 1929 г. праводзіўся Усебеларускі дзень калектывізацыі. У гэты дзень датэрмінова збіралі сельгаспадаткі, распаўсюджвалі трохпрацэнтную пазыку індустрыялізацыі, ажыццяўлялі меры па ўнясенню сялянскіх грашовых зберажэнняў у ашчадныя касы, паявых узносаў ва ўсе віды кааперацыі, прымушалі выконваць план нарыхтовак. Больш чым грандыёзная праграма на адзін дзень у сапраўднасці была падобна на абабранне селяніна.

Самым складаным часам для сялянства Крычаўшчыны былі 1929–1930 гады, калі тут у масавым парадку ствараліся калгасы і саўгасы.

У канцы 1929 г. і пачатку 1930 г. у Крычаве быў арганізаваны калгас «Сацыялістычны шлях», у в. Сычык – імя Калініна, у в.Дзягавічы – «Май», у в. Міхеевічы – «Чырвоны сцяг», у в. Прудок – «Ударнік», у в. Чырвоны Ручай – «Чырвоны партызан», у в. Шаеўка – «Запаветы Леніна» і г.д.

Спачатку гэта былі невялікія грамадскія арцелі, якія аб'ядноўвалі не-

Супрацоўнікі Крычаўскай міліцыі. 1927 г.

калькі дзесяткаў сялянскіх гаспадарак. У некаторых вёсках ствараліся і нейкі час існавалі па два і больш калгасы. Так, у в. Сакольнічы дзейнічалі калектыўныя гаспадаркі «Запаветы Ільіча» і імя Сталіна, у в. Лабковічы – «Парыжская камуна», «Ударнік», «Новы свет», у в. Бель-1 – «Шлях сацыялізму» і імя Сталіна.

На абагуленых землях калгаснікам прыходзілася шчыраваць ад цямна да цямна. Знясіленыя коні ў гарачы сезон сяўбы ледзь валакліся з палеткаў, на іх апалых баках выпіналіся рэбры. Нельга не адзначыць тое, што абагуленую жывёлу сяляне шкадавалі і клапаціліся пра яе, быццам яна па-ранейшаму заставалася ў іх уласнасці. Так, жыхар в. Кашаны Кузьма Зайцаў некалькі гадоў у зімовы час насіў у грамадскую стайню колішняму свайму каню з асабістага двара сена, уласнаручна яго паіў разам з сынам Максімам. Любоў бацькі да жывёлы перадалася сыну – Максім усё жыццё працаваў конюхам.

Новая форма гаспадарання на зямлі спачатку не прыносіла жаданай эфектыўнасці, не павышала шчодра абяцаны арганізатарамі калгасаў дабрабыт селяніна. Адсутнасць матэрыяльна-тэхнічных сродкаў адмоўна адбівалася на эканамічным росце калгасаў. У некаторых гаспадарках з вялікімі стратамі ўбіраліся збожжавыя культуры, нявыкапанай заставалася бульба, яе засыпала снегам. Патрабавалася тэхніка. Лягчэй стала, калі ў 1930–1931 гг. арганізавалася Крычаўская МТС. У раёне ўжо дзейнічала 85 калгасаў, тры саўгасы, таму 45 трактараў МТС выкарыстоўваліся з поўнай нагрузкай.

Неўзабаве створана была яшчэ адна МТС, калгасы і саўгасы раёна абслугоўвалі 80 трактараў і 14 камбайнаў. Прыход тэхнікі на калгасныя і саўгасныя палеткі не только аблегчыў працу хлебаробаў, але і спрыяў эканамічнаму развіццю гаспадарак. У пачатку 1931 г. у гаспадарках Крычаўшчыны налічвалася 11326 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 4493 каровы, 5658 свіней, 5151 авечка.

З кожным годам умацоўваліся гаспадаркі раёна, павышаўся матэрыяль-

Г.І. Гердзій.

Першамайская дэманстрацыя ў Крычаве. 1927 г.

ны і культурны ўзровень насельніцтва. Актыўную работу па ўмацаванні калгаснага ладу праводзілі сельскія Саветы. І сярод іх Іванаўскі сельсавет, які ўзначальвала Ганна Іванаўна Гердзій.

Адбываўся пералом у свядомасці людзей. Яны імкнуліся да ведаў, да новага. Тыя гады характэрны не толькі трагедыямі многіх чалавечых лёсаў, але і высокім працоўным энтузіязмам.

На прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах змагаліся за высокія паказчыкі. Узнікла сацыялістычнае спаборніцтва як паміж асобнымі людзьмі, так і паміж прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі. З мэтай пашырэння стаханаўскага руху ў раёне праводзіліся злёты перадавікоў вытворчасці, на якіх лепшым уручаліся грашовыя прэміі і каштоўныя падарункі. У даваенны час у раёне налічвалася 500 ударнікаў працы, дасягненні многіх дэманстраваліся на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

31 студзеня 1931 г. у Крычаве пачала выходзіць газета «Сацыялістычны шлях» – орган РК КП(б)Б і раённага Савета. Жыхары раёна цікавіліся новым выданнем, бо газета расказвала аб падзеях у раёне, аб лепшых працаўніках, выкрывала недахопы ў рабоце асобных калектываў. Яна была люстэркам усіх падзей, што адбываліся ў раёне.

Праз многа гадоў стала зразумела, якую ахвяру прынесла вёска на карысць сацыялістычнага развіцця грамадства. Індустрыялізацыя, рост ваеннай магутнасці СССР былі забяспечаны ў значнай ступені калектыўным метадам гаспадарання на зямлі, што

Удзельніцы злёту жанчын-актывістак Крычаўшчыны.

даваў магчымасць дзяржаве забіраць у селяніна прадукцыю, не лічачыся з яго ўласнымі інтарэсамі.

У 1939 г. у раёне было 72 калгасы, 2 МТС, 10 прамысловых прадпрыемстваў, 14 кааператыўных арцеляў і дробных майстэрняў. Адкрываліся новыя школы, далейшае развіццё атрымала мастацкая самадзейнасць. Значныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні мянялі аблічча краю, ствараліўмовы для далейшага паступальнага развіцця. Але напад гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз і акупацыя Беларусі нямецка-фашысцкімі войскамі перарвалі гэты працэс.

В.Ф. Куліненка.

Насуперак цяжкасцям

З успамінаў І.І. Вацуры, аднаго з першых трактарыстаў раёна

Са сваёй роднай вёскі Касцюшкавічы пасля заканчэння школы я нікуды не паехаў. Не вабіў мяне горад з яго асфальтавымі вуліцамі, высокімі камяніцамі і добрымі па тым часе заробкамі на заводах і фабрыках. Застаўся працаваць будаўніком у саўгасе «Барацьбіт». Узводзілі жывёлагадоўчыя памяшканні. Аднойчы выклікае мяне дырэктар саўгаса і пытае:

І.І. Вацура.

— Хочаш стаць трактарыстам?

— Канешне,— узрадаваўся я. — Вельмі хачу.

— Паедзеш на курсы ў Чэрыкаў. Глядзі ж, добра вывучай тэхніку, веды спатрэбяцца, як станеш працаваць.

Курсы дзейнічалі пры мясцовым Чэрыкаўскім саўгасе. Сюды з'ехалася моладзь з суседніх раёнаў. Вучыліся ўсе з натхненнем, цікавасцю і настойлівасцю. Скончыў я курсы і дамоў вярнуўся.

Вясной, недзе ў 1931 годзе, прыйшла радасная вестка: саўгасу выдзяляюць пяць фардзонаў-пуцілаўцаў. За імі давялося ехаць у Ленінград. Не буду расказваць, як зачараваў сваёй прыгажосцю мяне горад, надоўга запамятала ся і сустрэча з завадчанамі.

Трактары давезлі па чыгунцы да Крычава, потым перагналі да Залесавічаў. І вось першы раз выехалі на саўгасныя палеткі. Людзей сабралася шмат. І старым, і малым цікава было глядзець, як працуе машына. Папрыходзілі нават жыхары з навакольных вёсак. Усе задаволена ківалі галовамі, хвалілі новую тэхніку. Нас, трактарыстаў, вяскоўцы тады залічвалі ледзь не ў героі.

Але, па праўдзе кажучы, хапала таду клопату з гэтымі фардзонамі. Недасканалыя яны былі. Буксавалі і не маглі адолець гразкія мясціны. Цяжка заводзіліся. Прыходзілася бабіны насіць за пазухай, каб былі яны ў цяпле. Адзін наш механізатар прыдумаў заводзіць трактар з дапамогай пары коней. Аднойчы пацягнулі яны фардзон, той неўзабаве зачмыхаў, загрукатаў, а коні з перапугу так пусціліся ўскач, што ледзь трактар не перакулілі.

Калі ў вёску прыбыў першы ХТЗ, мы, агледзеўшы яго, узрадаваліся. Машына гэта была больш дасканалай і прадукцыйнай, і не такой капрызнай. Працавалася на ХТЗ лёгка, кожны дзень перавыконвалі нормы выпрацоўкі. Прыходзілася араць, малаціць не толькі ў сваім саўгасе, але і дапамагаць суседзям.

Газеты Крычаўшчыны

Першы нумар газеты «Сацыялістычны шлях» – орган Крычаўскага райкома КП(б)Б, райвыканкома і райпрафсавета – выйшаў 1 студзеня

1931 г. Рэдактарам яе быў Семянкоў. Газета выходзіла адзін раз у пяцідзёнку, друкавалася ў Клімавічах, а з 1932 г. пачала друкавацца ў Крычаве, выходзіла 3 разы на тыдзень.

У 1932 г. заснавана шматтыражная газета «За цэмент» – орган партыйнай арганізацыі, заводакіраўніцтва і прафкома цэментнага завода. Тыраж яе складаў 1000 экземпляраў, выходзіла адзін раз у пяцідзёнку. 19-ы і 20-ы нумары шматтыражкі былі выпушчаны на торфазаводзе «Калектыўная праца» і мелі назву «За торф».

З 1934 г. райгазета «Сацыялістычны шлях» пачала выходзіць штодзённа, а шматтыражка «За цэмент» 4 разы на месяц. У гэтым жа годзе ў калгасе «На варце» Бацьвінаўскага сельсавета выйшла шматтыражка «Заможнае жыццё». Чытачы атрымлівалі яе 3 раза ў месяц. Друкаваным органам палітаддзела МТС з'яўлялася газета «Ударнік». Першым рэдактарам газет «Ударнік» і «Заможнае жыццё» была Волгіна. У гэты ж час стала выходзіць яшчэ адна шматтыражка --«Беларускі фарватар», якую выдаваў «Сожбуд».

Падрыхтавала да друку
Н.М. Марозава

Дакументы сведчаць

ПАСТАНОВА КРЫЧАЎСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б АБ ХОДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Бюро Крычаўскага райкому КП(б)Б ад 13/4 1931 г. аб ходзе калектывізацыі і папярэдніх выніках падрыхтоўкі да вясенняй пасеўкампаніі.

Бюро РК адзначае, што ў выніку паслядоўнага правядзення генэральнай лініі партыі, рашучай барацьбы з «правым» і «левым» апартунізмам, рашучага наступу і барацьбы з кулацтвам і разгортвання баявой падрыхтоўчай работы да 2-й бальшавіцкай вясны, райпартарганізацыя ў асноўным дабілася мабілізацыі шырокіх колаў калгаснікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў раёна на выкананне галоўнейшых задач сучаснага перыяду работы на вёсцы. На 10-е красавіка г/г дасягнута 40,5% калектывізацыі, у асноўным скончана стварэнне семянных і страхавых фондаў у калгасах, скончана давядзенне пасяўных планаў да калгасаў і індывідуальных бядняцка-сераднякоўскіх гаспадарак у парадку самаабавязацельстваў, і дадзены цвёрдыя заданні па пасеву кулацка-заможным гаспадаркам. 60 калгасаў пераведзена на здзельшчыну, праведзена вялікая работа па ачыстцы калгасаў ад кулацкіх і шкодніцкіх элементаў., кантрактацыя яравых і тэхнічных культур у асноўным скончана ў тэрмін і выканана на 136%. І нарэшце, праведзены з 1 па 10 красавіка раённы спробны выезд у поле, які забяспечыў яшчэ ў значна большай ступені арганізацыйна-гаспадарчае замацаванне калгасаў, у тым ліку і зноў арганізаваных.

Тэмпы нездавальняючыя

Побач з гэтым Бюро РК канстатуе, што апошняя дэкада дала значнае паніжэнне тэмпаў калектывізацыі ў раёне. У той час, калі Бацьвінаўскі сельскі савет дасягнуў 90% калектывізацыі, Баеўскі – 64%, Маляціцкі – 61%, Касцюшкавіцкі – 58%, зусім нездавальняюча праходзіць калектывізацыя па Зарубецкаму, Варанёўскаму, Кашанскаму, Бельскаму сельскім саветам, у якіх працэнт калектывізацыі хістаецца ад 11 да 20%. У шэрагу выпадкаў ня знішчаны самацечныя настроі, а ў некаторых сельсаветах (Міхеевічы, Кашаны) адсутнічае сістэматычная ўпорная работа па арганізацыі калгаснага прыліву...

На рашаючых участках – прарывы

Найбольш небяспечнымі вучасткамі ў падрыхтоўцы да вясенняга севу ў раёне застаюцца: слабае стварэньне фуражных фондаў, а ў асобных калгасах («Заветы Леніна», «Камінтэрн», «Чырвоны Луч») справа з кармамі знаходзіцца зусім у пагражаючым становішчы. Маецца

некаторая размычка паміж тэмпамі калектывізацыі і абагульненнем коней (абагулена ўсяго 1170 галоў, альбо 46,6% да агульнага ліку коней, якія павінны быць абагулены).

У часткі калгасаў («Пабеда», «Камінтэрн») недаацэньваецца важнасць падрыхтоўкі каня да севу. Маецца зусім недапушчальнае з'явішча з нарыхтоўкай і стварэннем насенфондаў кармавых траў і тэхнічных культур, значнае адставанне ў стварэнні насенфондаў бульбы (71%), а таксама і ў ачыстцы насення (71%), асабліва па Крычаўскаму местсавету, Варанёўскаму, Кашанскаму, Міхеевіцкаму сельсаветах.

Выходзячы з гэтага, бюро РК высоўвае перад партарганізацыяй, савецкімі, прафесіянальнымі, камсамольскімі органамі, калгасна-кааперацыйнай сістэмай асноўныя задачы па дальнейшай калектывізацыі і павышэнню тэмпаў падрыхтоўкі да пасеўкампаніі.

Упорна, па-бальшавіцкаму праводзіць калектывізацыю

1. Працягваць далейшую работу па арганізацыі калгаснага прыліву, падвысіць тэмпы калектывізацыі ў раёне, асабліва па Зарубецкаму, Варанёўскаму, Кашанскаму, Бельскаму с/саветах, Крычаўскаму местсавету з такім разлікам, каб да пачатку вясенняй пасеўкампаніі калектывізаваць 55% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну. У мэтах выканння гэтай задачы партарганізацыі з асаблівай бальшавіцкай настойлівасцю працягваць шырокую палітычную масавую работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас, звярнуўшы асаблівую ўвагу на растлумачэнне рашэнняў 6-га з'езду Саветаў і новага закону аб сельскагаспадарчым падатку, вядучы рашучую барацьбу з рознымі манэўрамі кулацтва ў барацьбе супраць калектывізацыі. Ухваляючы ініцыятыву Бацьвінаўскай і Маляціцкай ячэек КП(б)Б, якія ўзялі на буксір і высылаюць брыгады калгаснікаў у Зарубецкі, Міхеевіцкі і Кашанскі сельсаветы, раіць Баеўскай, Касцюшкавіцкай ячэйкам таксама ўзяць на буксір іншыя адстаючыя сельсаветы, вылучыўшы брыгады калгаснікаў у апошнія. Камандыраваць на 1,5 дэкады ў адстаючыя сельсаветы 20 чалавек райпартактыву.

Праз пяць дзён абагульваць сродкі вытворчасці

2. Побач з работай па колькаснаму росту калектывізацыі неад'емлемай часткай з'яўляецца работа па арганізацыйнаму і гаспадарчаму замацаванню ўноў арганізаваных калгасаў і новага прыліву. Як правіла, праз 5 дзён пасля арганізацыі новага калгаса, альбо прыліву, павінны быць абагулены сродкі вытворчасці (сельскагаспадарчыя машыны, інвентар цягавай сілы, ссыпаны насенныя і створаны фуражныя фонды). Падкрэсліваючы гэту выключна важную задачу перад усёй партарганізацыяй, бюро РК абавязвае партячэйку, упаўнаваж. РК, Фракцыю РВК і РКС, забяспечыць практыч. выкананне гэтага.

3. Прапанаваць фракцыі РКС, партячэйкам, упаўнаважанаму па пасеўкампаніі, у калгасах, у якіх яшчэ няскончана ссыпка насенных і стварэнне фуражных фондаў, у пяцідзённы тэрмін скончыць ссыпку зерназбажжавых і тэхнічных культур і не пазней 25 красавіка ссыпку насенных фондаў бульбы. Асаблівую ўвагу звярнуць на збор кармавых траў у калгаснікаў. Фракцыі райпо і Каапсаюзу ўзмацніць нарыхтоўку кармавых траў. Персанальную адказнасць за выкананне гэтага ўскласці на тт. Банчыкава (РКС), Папова, Манахава і Хацеўскага – па Бацьвінаўскаму сельсавету; Свадкоўскага, Кузьміцкага – Баеўскаму сельсавету; Скопіна, Есіна – Маляціцкаму сельсавету; Шэндарава, Карагодава – местсавету; Дзем'янчанка, Чумакова – Кашанскаму с/с; Міхневіча, Шыткова – Касцюшкавіцкаму с/с; Кастрычка, Шахрая – Міхеевіцкаму с/с; Сілкіна, Карпекіна – Варанёўскаму с/с; Цітава, Дзядзева – Зарубецкаму сельсавету; Таратынава, Невінскага – Бельскаму с/с; Міхневіча, Смелакова – Паланіцкаму с/с; Рапіловіча, Паўлючэнка – Сакольніцкаму с/с. Вышэйпамянёным таварышам 25-4 прадставіць дакладную запіску Райкому аб выкананні гэтага.

Судзіць за патраву насенфондаў

4. У сувязі з заўважаемымі выпадкамі патраў у асобных калгасах насенных фондаў («Чырвоны Луч»), а таксама патравы насення ў аднаасобным сэктару, прапанаваць фракцыі РВК, РКС, сельсаветам павесці рашучую барацьбу з гэтымі з'явішчамі, прыцягваючы віноўных да судовай адказнасці. Судаваследчаму апарату ў нечарговым парадку разглядаць гэтыя справы. Нагляд за правядзеннем у жыццё гэтай пастановы ўскласці на КК РСІ. Бюро РК падкрэслівае перад усёй партарганізацыяй, савецкімі органамі і калгаснай сістэмай аб тым, што адной з распаўсюджаных форм барацьбы кулацтва і іх агентаў супраць калгаснага

будаўніцтва і вясенняй пасеўкампаніі ў сучасны перыяд, з'яўляецца агітацыя за разбазарванне і патраву насення.

Супраць гэтага манэўру кулацтва павінны быць мабілізаваны ўсе калгаснікі, беднякі і серадняк і. Патрэбна дабіцца, каб да аднаго бедняка і серадняка, сённяшняга аднаасобніка, а заўтрашняга калгасніка, ведалі, што гаспадаркі, якія разбазарваюць насенне і фураж, у калгас ня будуць прымацца.

Выправіць скрыўленні калгаснай лініі

Разам з гэтым Бюро РК паказвае на недапушчальныя скрыўленні ў асобных мясцовых адносінах да беднаты, што мае свой выраз у выключэнні і прыёме асобных беднякоў, якія ўступілі і ўступаюць у калгасы і сапраўды не маюць свайго ўласнага насення і фуражу. Гэтыя скрыўленні павінны быць тэрмінова выпраўлены.

Партчастцы РайКСУ пад асабістую адказнасць т.Зяньковіч тэрмінова даць паказанні СельКСУ, каб апошнім беднякам, уступіўшым і ўступаючым у калгасы, якія сапраўды не маюць насеннага матэрыялу, аказвалі дапамогу і выдачу пазык. Партчэйкам, фракцыям сельсаветаў тэрмінова праверыць работу СельКСУ у гэтым напрамку.

Рэгуліраваць пасяўнымі матэрыяламі

5. Прапанаваць фракцыі Райкалгассаюзу, Райкаапсаюзу, партчэйкам у тым выпадку, калі ў асобных калгасах будзе сабрана ўсё сваё ўласнае насенне і фуражныя фонды, а таксама насенне і фуражныя фонды калгаснікаў, і пасля сапраўднай мабілізацыі ўсіх унутраных насенных і фуражных рэсурсаў усё ж будзе недахоп насення па асобным культурам альбо па фуражу, дазволіць узяць гэтым калгасам узаемаабразна ад калгасаў, у якіх маюцца лішкі. Стварыць тройку дзеля рэгулявання і практычнага правядзення гэтай пастановы ў жыццё ў складзе тт. Лаўрэнава, Купрыянава, Папова.

Рашэнні гэтай тройкі лічыць канчатковымі і абавязковымі для выканання ўсімі арганізацыямі, калгасамі.

6. Канстатуючы шэраг выпадкаў дачы звестак калгасамі па насенню і фуражу, не адпавядаючых сапраўднаму становішчу (Прыўменьшаныя), што не дае магчывасці ацэнкі рэальнага становішча з забеспячэннем насеннем і фуражом асобных калгасаў і наяўнасці насенных і кармавых рэсурсаў у раёне, Бюро РК катэгарычна прапануе пад асабістую адказнасць сакратароў ячэек, старшынь сельсаветаў, старшынь калгасаў – камуністаў, даваць звесткі, якія адпавядаюць сапраўднасці. Разам з гэтым даручыць тройцы па рэгуляванню насення і фуражу праверыць частку калгасаў у гэтым напрамку.

Выключную ўвагу каню

7. Абавязаць партчэйкі, фракцыю РКС у дэкадны тэрмін забяспечыць у адпаведнасці з прынятым статутам абагуленне рабочай жывёлы, застаўляя толькі ў асобных выпадках часова рабочую жывёлу ў дварах калгаснікаў. Партчэйкам, фракцыі райкалгассаюзу і ўсёй калгаснай сістэме звярнуць выключную ўвагу на падрыхтоўку каня да вясенняга севу. Фракцыі райкалгассаюзу ў дэкадны тэрмін вырашыць пытанне аб паляпшэнні цягавай сілы ў тых калгасах, у якіх маецца асаблівая небяспека ў гэтым (замен каней, закупка каней, дапамога кармамі і інш.).

Выправіць паніжаныя планы

8. Прызнаць зусім недапушчальным з'явішчам невыкананне ўпаўнаважаным па пасеўкампаніі і фракцыі райкалгассаюзу пастаноў Бюро РК ад 19-1-31 г. і ад 1-4 аб выпраўленні дапушчаных зніжэнняў пасеву тэхнічных культур асобнымі калгасамі, у асаблівасці па калгасах «Чырвоны Араты», «Чырвоны Барацьбіт», «Чырвоная Горка», «Звязда», «Чырвоны Луч». У трэцці рашаючы год, бюро РК расцэньвае невыкананне ранейшых пастаноў як ігнараванне пастаноў РК. Папярэджваючы ў апошні раз, Райком прапануе тав.Лаўрэнаву, Купрыянаву, сакратарам ячэек, старшыням сельсаветаў узяць пад асабістую адказнасць у пяцідзённы тэрмін.

Пастанова надрукавана ў Крычаўскай райгазеце «Сацыялістычны шлях», 1931 г., № 21, Мова і стыль публікацыі захавана.

АБ ЧЫМ ПІСАЛА ГАЗЕТА «САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ШЛЯХ»

Зверскі замах на класавага ворага

Кулакі хацелі забіць стойкага бальшавіка т.Мансава.

Наш адказ: Мацней націск на кулацка-заможныя элементы – вышэй тэмпы калгаснага будаўніцтва.

Сутнасць замаху на т. Мансава

У ноч на 17 верасня злая рука класавага ворага зрабіла замах на актыўнага камуніста 25-тысячніка, рабочага Сормава, т.Мансава.

Таварыш Мансаў, будучы старшынёй аднаго з буйнейшых калгасаў «На стражы» Бацьвінаўскага сельсавета, узяў цвёрды курс на гаспадарчае замацаванне калгасу, на ачыстку яго ад класава-варожых элементаў.

Кулацкія элементы, заўважыўшы гэту бальшавіцкую цвёрдасць т.Мансава, парашылі пакончыць з ім шляхам забойства. І вось, калі т.Мансаў у цёмную ноч звярачаўся з Крычава ў калгас, яго ўжо на дарозе недалёка ад калгасу чакалі тэарысты. Ад удару калом па галаве т.Мансаў заваліўся, але дзякуючы таму, што ўслед за ім ехалі людзі, т.Мансаў быў выратаваны.

Аналагічны акт адбыўся 20-9 г.г. у в.Зарубецах. Кулацкія элементы на сходцы зрабілі замах на інструктара райкалгассаюзу 25-тысячніка т.Сусінава і на члена Зарубецкага с/с. Ухапіўшы за грудзі, кулацкія элементы імкнуліся пабіць гэтых таварышаў, але гэта не ўдалося.

Гэты кулацкі тэарыстычны акт над т.Мансавым і замах класавага ворага ў Зарубцах павінны стаць урокамі для партыйнай арганізацыі і ўсёй савецкай грамаднасці.

Адтачыць класавую пільнасць, яшчэ больш жорстка змагацца з ліквідуемым кулацтвам як класам і іх агентамі, узмацніць націск на кулацка-заможныя элементы па выкананні цвёрдых заданняў – такая баявая наша задача.

Калгаснікі, беднякі і сераднякі-аднаасобнікі павінны рашуча пратэставаць супраць вылазак класавых ворагаў і ў адказ на гэтыя вылазкі ўзмацніць работу па замацаванні калгасаў, па стварэнні буйной жывёлагадоўлі і па хутчэйшаму сканчэнню суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа на яе аснове.

Жорстка пакараць тэарыстаў

З вялікім абурэннем калгаснікі калгасу «На стражы» сустрэцілі паведамленне аб замаху з боку кулацкіх элементаў на іх старшыню праўлення т.Мансава. Сход рашуча пратэстуе супраць кулацкіх вылазак і патрабуе ад судова-следчых органаў прыняць усе захады да выяўлення злачынцаў, выезду суда ў калгас і суровага пакарання тэарыстаў.

У адказ на тэарыстычны выбрык класавага ворагу калгаснікі абвясцілі сябе ўдарнікамі і абавязаліся да 20 верасня скончыць пасеў азімых і ўборку яравых, скончыць да 1-га кастрычніка будаўніцтва свінарніка і яго поўнае ўкамплектаванне.

Сілкоў.
«Сацыялістычны шлях»,
1931 г., № 21.

З ПРАТАКОЛА ПАРТБЮРО АБ КАНТРАКТАЦЫІ ЦЯЛЯТ

арт./29/V-30 г.

Рэзалюцыя

Па дакладу аб выкананьні плянаў кантрактацыі ўсіх відаў.

1. Адзначыць, што кантрактацыя зерневых, асабліва тэхнічных культур, жывёлы і іншых відаў, па абагуленаму сектару ў раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву, а ў індывідуальным сектару зусім сорвана.

2. Партячэйкі, Сельсаветы і Партчасткі кантрактуючых арганізацый не зьвярнулі належнай увагі на важнасць гэтай кампаніі як у індывідуальным так і ў абагуленым сектарах, дзякуючы чаму да гэтага часу яшчэ не ўсе калгасы закантрактавалі зернавыя і тэхнічныя культуры.

Выходзячы з чаго бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць Фракцыі РВК прыцягнуць да судовай адказнасці вінаватых у зрыве кантрактацыі.

2. Адказнасць за выкананьне плянаў кантрактацыі ўскласць на Фракцыю РВК, партчасткі кантрактуючых арганізацый, сакратарэй парт'ячэек і ў Сельсаветах на старшынь апошніх.

3. Даручыць Фракцыі РВК тэрмінова склікаць нараду кантрактуючых арганізацый, на якой вызначыць мерапрыемства забясьпечываючыя пералом у гэтай працы, вызначыць і накіраваць у Сельсаветы працаўнікоў па кантрактацыі, партчасткам кантрактуючых арганізацый забясьпечыць выезжаючых т.т. на кантрактацыі неабходнымі сродкамі для заключэньня ўмоў кантрактацыі на мяйсцох.

4. Прапанаваць парт'ячэйкам, пад адказнасць сакратарэй апошніх, праверыць выкананьне планаў кантрактацыі і вызначыць мерапрыемства, забясьпечываючыя пералом у гэтай рабоце на тэрыторыі абслугоўваньня ячэйкамі, адначасова пасіліць растлумачыцельную працу сярод бядняцка-серадняцкай часткі насельніцтва аб пастановах Ураду па лініі вытворчага крэдытаваньня індывідуальных гаспадарак, аб палёгках, якія даны калгасам і індывідуальным гаспадаркам.

5. Фракцыі РВК тэрмінова прыняць меры, забясьпечываючыя забарону забоя маладняка, якій да гэтага часу яшчэ працягіваецца на тэрыторыі раёна.

6. Лічыць неабходным праверыць становішча выкананьня плянаў кантрактацый, па аддзельным Сельсаветам шляхам заслуховываньня на бюро РК інфармацый па гэтаму пытанню сакратарэй парт'ячэек, Фракцыі РВК і старшынь (партыйцаў) Сельсаветаў.

7. Партчастцы Райкалгассаюза за зрыў кантрактацыі ў індывідуальнам сэктарэ, за слабае выкананьне кантрактацыі па абагуленнаму сектару, вынесці ВЫМОВУ.

8. Абязаць партчастку Райкалгассаюза і Спажывецкай Кааперацыі разьмеркаваць і прыблізіць фонды прэміраваньня па кантрактацыі да кантрактоўшчыкаў, даць магчымасць прэміраваць апошніх на мяйсцох.

9. Давясці да ведама АК КП(б)Б, што працаўнікі, пасылаемые на раёны Акрпаляводсаюзам і Днепрасаюзам (Уткоў і Слукін) па ўзмацненьню кантрактацыі займаюцца гастралёрствам (зборам вед) з неканкрэтнай дапамогай нізбука па выкананьню плянаў кантрактацыі.

Сакратар Крычаўскага Райкама КП(б)Б ЧУМАКОЎ.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці.Ф.6574. Спр.164. Л.68.

АБ ХОДЗЕ БУДАЎНІЦТВА ЦАГЕЛЬНАГА ЗАВОДА

8 красавіка 1931 г.

СЛУХАЛІ: Аб ходзе будаўніцтва цагельнага завода.

ПАСТАНАВІЛІ: Вызначаны ўчастак для пабудовы цагельнага завода, і генеральны план завода, складзены Піконам і Вышатрскім, зацвердзіць.

Працу, праробленую згодна ўмовы ізыскацельнай групай горнага кіраўніцтва ВСНГ БССР, лічыць выкананай не поўнасцю і прапанаваць правесці шэраг дадатковых работ па ўказанням т.Пікона, пасля чаго апрадзяліць межы неабходнага ўчастка для завода.

Прыгласіць у якасці кансультантаў і для кіраўніцтва будаўнічымі работамі старшага прараба Крычаўскага пункта «Будаб'яднату» т.Вышатрскага, усёй тэхналагічнай часткай завода галоўнага інжынера будаўніцтва цэмзавода т.Пікона, зацвердзіў прадстаўлены тав.Вышатрскім і Піконам трудавы дагавор.

Старшыня РВК Сямашка.
Сакратар Рося.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.1. Воп.1. Адз. 2489. С.36.

АБ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ м. КРЫЧАЎ

ПРАТАКОЛ №8
пасяджэння Прэзідыума Крычаўскага райвыканкома
ад 15 красавіка 1931 г.

ПРЫСУТНІЧАЛІ:

Сябры Прэзідыума: Роскін, Шаланаў, Краскін, Купрыянаў, Лаўрэнаў, Краскін і Карагодаў.

Ад устаноў і арганізацый: Губчэўскі, Кейлін, Абабкаў, Сілкоў, Шоўцеў, Данілаў, Левін, Зеньковіч, Папоў, Бужара, Пікон і Барон.

СЛУХАЛІ:
Аб электрыфікацыі м.Крычаў.

ПАСТАНАВІЛІ:
Прымаючы пад увагу, што кіраўніцтва цэмзавода згадзілася адпусціць не меньш як 100 кілават электраэнергіі для асвятлення м.Крычаў, і што ў 1931 годзе па бюджэту вызначана ўсяго 30000 рублей на гэту мэту, а пагэтаму работу па электрыфікацыі м.Крычава разгарнуць толькі па пабудове пяці трансфарматарных будак, для асвятлення цэнтра м.Крычава, установы і акраіну, прылягаючую к месцу знаходжання прамысловасці ў план пабудовы 1931 года, уключыць трансфарматарныя будкі пад №№ 2, 4, 5, 6 і 8.

Будаўніцтва для высакавольтнай сеці праізвадзіць капітальнае, каб мець магчымасць на працягу 1932 года поўнасцю закончыць будаўніцтва і абарудаванне ўсіх астатніх трансфарматарных будак, неабходных для асвятлення ўсяго мястэчка і акраін.

Прыняць да ведама заяву інжынера БЭО т.Барона, што папярэднія сметы і спецыфікацыі на чарговую работу па прыёму электраэнергіі ад электрастанцыі цэмзавода будуць пасланы апошнім на працягу сямідзённага тэрміну райвыканкаму, на прадмет своечасовага выканання заявак на неабходнае абарудаванне для прыёму электраэнергіі.

Прасіць Галоўнае Кіраўніцтва Камунальнай Гаспадаркі БССР уключыць у план снабжэння будаўніцтва электрасеткі м.Крычава жалезам, меднымі і жалезнымі правадамі і другімі неабходнымі матэрыяламі.

Прасіць УСНГ БССР узбудзіць хадатайства перад ВСНГ СССР на прадмет атрымання 120 кілават электраэнергіі для асвятлення м.Крычава, усіх установ і арганізацый ад электрастанцыі цэмзавода.

Прасіць энергабюро ВСНГ БССР зацвердзіць план электрасеці м.Крычава.

Старшыня РКВ Роскін.
Сакратар Рося.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.1. Воп.1. Адз.2489. С.22

АБ ШЛЮЗАВАННІ РАКІ СОЖ

ПРАТАКОЛ №7
пасяджэння Прэзідыума Крычаўскага райвыканкома
ад 8 красавіка 1931 г.

Старшыня: Сямашка
Сакратар: Рося

м.Крычаў

ПРЫСУТНІЧАЛІ:
Сябры Прэзідыума тт.Сямашка, Хацятоўскі, Краскін, Іваноў, Коскін, Шыцік, Шульгіна, Лаўрэнаў.

Ад установ і арганізацый тт.Абабкаў, Хесін, Зеньковіч Н., Лукшын, Рапіловіч, Бужара, Саўкіна. Набойкін, Аляў, Кабанаў, Старадынаў, Карпекін, Чумакоў, Вертліб, Дзядзей, Сляпцоў і Баброўнікаў.

СЛУХАЛІ:
Аб шлюзаванні ракі Сож (Баброўнікаў).

ПАСТАНАВІЛІ:
Адзначыць, што шлюзаванне ракі Сож мае выключна гаспадарчае значэнне як у развіцці прамысловасці, так і ва ўздымку сельскай гаспадаркі Крычаўскага раёна. Прапанаваць усім сельсаветам ужыць захады да папулярызавання сярод насельніцтва, што будаўніцтва па рацэ павінна быць пастаўлена ў першую чаргу перад усімі будаўніцтвамі нашага раёну, прылягаючым сельсаветам зараз жа ўключыць будаўніцтва Сожбуда ў план сваей працы і заслухоўваць перыядычна даклады аб хадзе будаўніцтва на прэзідыумах сельсаветаў. Адзначыць адсутнічанне лесаматэрыялаў да навігацыі ракі Сож, што намечаныя работы па плану будаўніцтва ў тэрмін не распачаты, што пагражае парушэнню ўсяго плана работ па шлюзаванню ракі Сож.

Прапанаваць Сожбуду тэрмінова ўжыць захады да выканання намечаных планаў будаўніцтва.

Прапанаваць Учлеспрамгасу адпусціць заімаабразна за лік фондаў РВК, які яшчэ не атрымаў 200 кубаметраў лесаматэрыялу, адначасова Сожбуду дагутарыцца з Росмадзорам на прадмет атрымання заімаабразна лесу, які знаходзіцца на лесакамбінаце і не будзе скарыстан Росмадзорам на працягу двухмесячнага тэрміну.

Прапанаваць сельсаветам – Крычаўскаму, Сакольніцкаму і Касцюшкаўскаму – і Сожбуду тэрмінова прыступіць да вярбоўкі рабгужсілы, дамацаваць да Сожбуда адзначаных сельсаветаў усе кулацка-заможныя гаспадаркі і лішоных права голасу на пастаянную працу, абавязаўшы іх своечасова засеяць свае землі.

Прапанаваць дарінспектару тав. Сляпцову ўжыць захады тэрміновага насцілу камянямі падз'язных шляхоў да прыстаней Сожбуда.

Прапанаваць Райспажыўсаюзу і воднай кааперацыі ўжыць усе захады да бесперабойнага снабжэння рабочых, разгарнуўшы грамадскае харчаванне.

Прапанаваць інспектарам нарасветы распрацаваць мерапрыемствы па абслугоўванню рабочых Сожбуда культасветнай працай.

Прапанаваць м/савету ўжыць усе захады забяспячэння камунальнымі паслугамі за лік 30% фонда жылплошчы местачковага насельніцтва, супрацоўнікаў Сожбуда.

Прапанаваць дырэктару лесакамбіната ўжыць захады, каб лесазавод пераключыць на трохдзённую працу, а Сожбуду прыняць захады да ўсавяршэнствавання тэхнічнага абслугоўвання лесакамбіната.

Старшыня РВК Сямашка.

Сакратар Рося.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 6. Воп.1. Аддз. зах. 2489. С. 34.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ МТС У РАЁНЕ

ПРАТАКОЛ №25

Крычаў **27 кастрычніка 1931 г.**

СЛУХАЛІ: Аб арганізацыі МТС у раёне.

ПАСТАНАВІЛІ:

Згадзіцца з абраным месцам для сядзібы МТС у Варанёўскім сельсавеце і адведзены ўчастак зацвердзіць. Для першапачатковага забеспячэння МТС будынкамі перадаць пяць кулацкіх будынкаў Варанёўскага сельсавета. Устанавіць на першы год працы МТС тэрыторыю абслугоўвання: Варанёўскі, Бельскі, Паланіцкі, Касцюшкаўскі, частку Бацьвінаўскага сельсавета, на раку Жукаўку калгас «Барацьбіт» Баеўскага сельсавета, астатнюю тэрыторыю ахапіць пры далейшым разгортванні працы МТС.

У сувязі з тым, што ў раёне зараз маюцца ўсяго тры асобы сумесна з заатэхнікам, прасіць Наркамзем і Беладдзяленне Трактарацэнтру забяспечыць МТС аграномамі.

Прапанаваць Райза, Райкалгассаюзу і сельсаветам разгарнуць працу па рэалізацыі акцый Трактарацэнтра.

Старшыня РВК Лаўрэнаў.

Сакратар Зяньковіч.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.Ф. 6. Воп.1. Адз. 2489. С.174

АБ ПЕРАТВАРЭННІ м. КРЫЧАЎ У г. КРЫЧАЎ

ПРАТАКОЛ

Крычаў **ад 10 лістапада 1931 г.**

СЛУХАЛІ:

Аб ператварэнні м.Крычаў у г.Крычаў і аб утварэнні пры г.Крычаве гарсавета.

ПАСТАНАВІЛІ:

Даручыць сакратару РВК скласці дакладную запіску на імя ЦКВ БССР аб ператварэнні м.Крычаў у г.Крычаў і аб утварэнні пры г.Крычаве гарсавета.

Пры ўтварэнні гарсавета ў м.Крычаве лічыць неабходным і мэтазгодным в.Іванаўку – 182 гаспадаркі і в.Гарбатку – 82 гаспадаркі далучыць да Паланіцкага сельсавета, які зараз мае 478 гаспадарак; вёску Глушнева – 69 гаспадарак і вёску Зуі – 39 гаспадарак далучыць да Бельскага сельсавета, які зараз мае 515 гаспадарак, а вёску Варанёва, на тэрыторыі якой існуюць прадпрыемствы, далучыць да Крычаўскага гарсавета. Прасіць ЦВК БССР зацвердзіць гэту пастанову і вынікі паведаміць РВК да часу складання каштарысу.

Старшыня Сямашка.

Сакратар Зяньковіч.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.6. Воп.1. Адз.2489. С.181

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА КРЫЧАЎСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б ад 4 чэрвеня 1936 года

Аб становішчы работы з непісьменнымі і малапісьменнымі па раёну.

Заслухаўшы даклад загадчыка райана т.Калошкі аб становішчы работы з непісьменнымі і малапісьменнымі па раёну, Пленум РК КП(б)Б адзначае, што важнейшае рашэнне ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б не знайшло належнага пераламлення і што гэта работа па раёну разгорнута нездавальняюча.

Пярвічныя партарганізацыі да гэтага часу не ўзначальваюць кіраўніцтва работай па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, работа гэта пушчана на самацёк, у выніку чаго арганізаваныя школы (50 школ непісьменных і 63 м/пісьменных), большая частка з якіх не працуюць.

Пленум адзначае, што прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі яшчэ не зразумелі ўсёй палітычнай важнасці работы ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і што з боку райана адсутнічае штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва гэтай важнейшай работай.

Зыходзячы з азначанага, пленум РК пастанаўляе:

1. Катэгарычна папярэдзіць сакратароў парткомаў і парторгаў пярвічных партарганізацый аб тым, што яны асабіста нясуць адказнасць за поўнае выкананне рашэнняў партыі па навучанню непісьменных і малапісьменных, Дабіўшысь каб на працягу 1936–1937 гг. згодна рашэння ЦК ВКП(б) поўнасцю ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць сярод усяго дарослага насельніцтва да 50 гадоў.

Усім пярвічным партарганізацыям прыняць неадкладныя меры к наладжванню работы школ і заўлячэння ў іх усіх непісьменных і малапісьменных, маючы штодзённы нагляд за работай гэтых школ, сістэматычна на сходах пярвічных арганізацый заслухоўваць даклады аб рабоце школ, аказваючы канкрэтную дапамогу ў рабоце іх.

2. Адзначаючы, што созданыя секцыі па навучанню непісьменных і малапісьменных пры гарсавеце і сельскіх Саветах ніякай работы яшчэ не разгарнулі.

Даручыць партгрупе райвыканкома прыняць неадкладныя меры па разгортванню работы секцыі пры сельсаветах.

Лічыць неабходным на бліжэйшы час склікаць спецыяльную нараду старшынь сельсаветаў па пытанню разгортвання работы з непісьменнымі і малапісьменнымі.

3. Прапанаваць райкому ЛКСМБ пад асабістую адказнасць т.т.: Баранавай і ўпаўнаважанаму ЦСПСБ т. Краўцову прыняць меры па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

4. Пленум РК, адзначаючы зусім нездавальняючае кіраўніцтва работаю школ непісьменных і малапісьменных з боку загадчыка райана т.Калошкі, абавязвае яго прыняць усе неабходныя меры, забяспечваючыя работу школ і ахоп імі ўсіх непісьменных і малапісьменных, і каб скончыўшыя школы сапраўды ўсвоілі б праграму навучання.

5. Пленум РК даручае бюро РК сістэматычна на пасяджэннях бюро заслухоўваць даклады сакратароў парткомаў і парторгаў пярвічных партарганізацый, ЛКСМБ і прафсаюзныя арганізацыі аб рабоце з непісьменнымі і малапісьменнымі.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. Ф. 27. Воп/ад. 312. Л.11

КРЫЧАЎСКІ РАЁН

Разьмяшчаецца паміж 53°37' — 53°52' паўночнай шырыні і 31°13', і 31°56' усходняй даўжыні. Раённы цэнтр – г.Крычаў. Бліжэйшая чыгуначная станцыя – Крычаў па чыгункі Ворша – Унеча.

Раён падзяляецца на 12 сельсаветаў і мяжуе з раёнамі: на поўначы – з Мсьціслаўскім, на паўночным усходзе – з РСФСР, на ўсходзе і паўднёвым усходзе – з Клімавіцкім раёнам, на захадзе і паўднёвым захадзе – з Чэрыкаўскім. Агульная тэрыторыя раёну – 68.248 га, у тым ліку зямель с.-г. прызначэння – 81%, лясоў – 19,0%. З зямель с.-г. прызначэньня ўжыткоўнай 92,3%, няўжыткоўнай – 7,7%.

Усяго насельніцтва ў процантах: беларусоў – 96,19%, яўрэяў – 2,70, палякаў – 0,25, рускіх – 0,48, літоўцаў – 0,02, латышоў – 0,04, іншых – 0,32.

Па тытульнаму сьпісу за 1931 г. у раёне налічвалася 54 прадпрыемствы з агульным лікам рабочых – 870. Тарфяных заводаў – 1, тарфяных арцеляў – 5, кузьняў – 8, кавальскіх арцеляў – 2, фасфарытных заводаў – 1, цагельняў – 1, цагельных арцеляў – 1, чарапічна-бэтон. арц. – 1, крэйдавых заводаў – 1, вапнавых млыноў – 1, райкамбінат – 1, воўначосак –2, шавецкіх арцеляў – 2, кравецкіх арцеляў – 2, крупарушак – 3, паравых млыноў – 3, вадзяных млыноў – 5, ветраных млыноў – 6, маслабойняў – 3, арц. газавых вод – 1, вінакурных заводаў – 2.

У 1932 г. па раёне было 8 дзяржаўных і 15 коопэрацыйных, а ўсяго 23 прамысловых прадпрыемствы. З іх знаходзілася ў падпарадкаваньні Наркомцяжпрому – 1, Наркомлегпрому –1, Наркомснабу – 2, Наркомзему –2, РВК і Гарсавету – 2, прамкоопэрацыі – 8, калгасаў – 6, іншых коопэрацыйных – 1. Пэрсонал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1/XII-32 г. налічваў 1.282 адзінкі, у тым ліку рабочых (бяз вучняў і МАП) – 1.135 і служачых – 113. Сярэдняя колькасць рабочых за першае паўгодзьзе 1932 г. была 954. Сума асноўных фондаў складала 1.273.118 р. Калі валавая продукцыя ў аптова-адпускных цэнах адпаведнага году за 1931 г. складала 1.745.159 р., то толькі за першае паўгодзьзе 1932 г. яна ўжо складала 1.143.400 р. 10 прадпрыемстваў мелі рухавікі.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёну зьяўляюцца: Торфазавод «Колектыўная праца», з лікам рабочых у сярэднім за паўгодзьзе 1932 г. – 240 і валавой продукцыяй за гэты ж час у цэнах 1926–27 г. – 76,32 тыс. р. Торфарцель «Правда», з лікам рабочых 52 і валавой продукцыяй – 30,00 тыс. р. Фосфарытны завод, з лікам рабочых 147 і валавой продукцыяй 116,41 тыс. р. Цагельны завод, з лікам рабочых 63 і валавой продукцыяй 140,00 тыс. р. Крэйдавы завод, з лікам рабочых 48 і валавой продукцыяй – 51,94 тыс. р. Лесазавод, з лікам рабочых 28 і валавой продукцыяй 270,00 тыс. р. Швэйная арцель імя «1-га Мая», з лікам рабочых 37 і валавой продукцыяй 82,00 тыс. р. Арцель «Чырвоная панчошніца», з лікам рабочых 47 і валавой продукцыяй 42,09 тыс. р. Вінзавод, з лікам рабочых 34 і валавой продукцыяй 91,85 тыс. р. Вінзавод, з лікам рабочых 46 і валавой продукцыяй 93,11 тыс. р. Торфазавод, з лікам рабочых 350 і валавой продукцыяй 20,00 тыс. р.

Спажыўкоопэрацыя раёну мае 11 сельпо з гандлёвай сеткай у 25 адзінак. Пайнікаў спажыўкоопэрацыі 6.994 чал.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: гліны – у м.Крычаве, в. Нанаскова, Варанёўскіх хутарох, ур. Зуй, ур. Крамянка; суглінкі – у м. Крычаў, в. Касьцюшковічы; пяскі – у в. Варанёва і гор. Крычаве; вапнякі пластовыя – у м. Крычаве; крэйды – у в. Лабковічы, в. Нанаскова, ур. Крэйдаўка, ур. Варанёва, г. Крычаве, в. Задобрасьць, в. Паклады, Варанёўскія хутары, паміж в. Задобрасьць і Пакланы; фосфарыты – у. в. Глушнёва; крэмні – у в. Задобрасьць; жалезьнякі – у в. Бель II і г. Крычаве.

Сельская гаспадарка раёну спэцыялізуецца ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку. У раёне 6 саўгасаў: «Барацьбіт» – са сьвінагадоўчай спэцыялізацыяй, з плошчай сенапахаці ў 1.119,5 га і 254 рабочымі; «Победа» – са сьвінагадоўчай спэцыялізацыяй, з плошчай сенапахаці ў 838,7 га, і «Крычаў» – са сьвінагадоўчай спэцыялізацыяй, з плошчай сенапахаці ў 370,9 га і 102/71 рабочымі; «РСТ» з зернав. спэцыялізацыяй, з плошчай сенапахаці ў 330 га; «Колектыўная праца» з плошчаю сенапахаці ў 28 га; Крычаўская прыгарадная гаспадарка.

У раёне 5.779 гаспадарак, з іх на 1/I-33 г. колектывізавана 3.878, што складае 67,1%. Усяго колгасаў у раёне 88, якія па плошчы сенапахаці займаюць 66,5%. У колгасах раёну маюцца наступныя фэрмы: СКТФ – 68, з агульнай колькасьцю пагалоўя на 20/XII – 4.651; МТФ – 9, з агульнай колькасьцю пагалоўя на 20/VII – 978; цялячых фэрм – 14, з агульнай колькасьцю пагалоўя на 20/VII – 667; каняводных фэрм – 2, з агульнай колькасьцю пагалоўя – 36.

У колгасах раёну налічваецца наступная колькасць складаных с.г. машын: сенакасілак – 17, конных грабляў – 61, жняярак-самаскідак – 62, снопавязалак – 3, бульбакапалак – 30, сеялак радковых – 54, трактараў – 1, складаных малатарняў – 2.

Пасеўная плошча раёну ў 1932 г. складала 33.854 га, у тым ліку было: збожжавых культур – 61,4%, бульбы – 18,7%, тэхнічных культур – 2,5%, траў – 8,2%, іншых культур – 9,2%.

Загатоўкі 1932 г. па раёне на 1/II-33 г. далі наступныя лічбы ў тонах: ільнавалакна – 199, пянькі – 30, ільнасемя – 208, канапель – 34.

Плян веснавой сяўбы па раёне на 1933 г. быў наступны:

Назва сэктараў	Яравы клін	Збожжа-ярав. культур	Тэхнічных культур		
			Агул. плошча	У т.л. ільну	Бульбы
Саўгасны	2.096	1.053	—	—	378
Колгасны	14.000	6.570	1.740	1.400	3.700
Аднаасобны	8.104	3.927	800	800	2.522
Разам	24.200	11.550	2.540	2.200	6.600

Сетка навучальных устаноў раёну на 1/I-33 г. налічвала 4-годак – 43, у іх настаўнікаў – 80, вучняў –3.782; ФЗС – 1, у ёй настаўнікаў – 11, вучняў – 327; ШКМ – 12, у іх настаўнікаў – 87, вучняў – 3.030; тэхнікумаў – 1, настаўнікаў – 10, студэнтаў – 80.

Процант пісьменнасьці раёну 94,6.

Парторганізацыя раёну складаецца з 27 ячэек, з агульнай колькасьцю комуністаў 437, з іх членаў КП(б)Б – 249 і кандыдатаў – 188. Комсамольская організацыя складаецца з 44 ячэек, з агульнай колькасьцю комсамольцаў 533 (па зьвестках на 1/IV-33 г.).

У раёне выходзіць газэта «Соцыялістычны Шлях».

Усе раёны БССР. Менск. С.295–297.

Падрыхтаваў да друку У.П. Паўлаў.

КАЛГАСЫ РАЁНА (1935 г.)

Бацьвінаўскі сельсавет: «Барацьбіт», «Бязбожнік», «На варце», «Маяк», імя Леніна.

Баеўскі сельсавет: «Бальшавік», «Гігант», «Краіна Саветаў», імя Кірава, імя Молатава, «Перамога».

Бельскі сельсавет: імя Кірава, «Малады ўдарнік», імя Молатава, імя Сталіна, «Чырвоны прамень», «Чырвоны араты», «Шлях сацыялізму».

Гарсавет: «Ільіч», «Праўда», «Сацыялістычны шлях», «Сацыялістычны паказчык», «Ударнік».

Зарубецкі сельсавет: «Колас», «Май», «Чырвонае Сормава», «Чырвоны Асцёр», «Чырвоны бор».

Касцюшкавіцкі сельсавет: «Камунар», імя Леніна, Імя Маркса, «Новае Сормава», «Прыгажосць», «Свабода», саўгас «Чырвонаармеец».

Кашанскі сельсавет: «Іскра», імя Карла Маркса, «17-ы партз'езд», імя Молатава, «Праўда», «Пралетарскі араты».

Маляціцкі сельсавет: імя Варашылава, імя Гікалы, «Заветы Леніна», «Першае мая», «Перамога», імя Сталіна, «Чырвоны лётчык».

Міхеевіцкі сельсавет: «Колас», «Пралетарская перамога», «Ударнік», «Чырвоны партызан», «Чырвоная Буда», «Чырвоны сцяг».

Паланіцкі сельсавет: «Вялікі Кастрычнік», «Звязда», « Камінтэрн», «Краіна Саветаў», «Ленінскія дні», «2-я пяцігодка», «7-ы з'езд Саветаў», «Ленінскі прызыў», імя Чарвякова, «Чырвоны май».

Сакольніцкі сельсавет: імя Блюхера, імя Варашылава, «Заветы Ільіча», імя Кагановіча, «Сталінскі заклік», «Чырвоны шлях».

З фондаў Крычаўскага краязнаўчага музея.

ПАГАЛОЎЕ ЖЫВЁЛЫ

Жывёла	на 01.01.1937 г.		на 01.01.1940 г.	
	Усяго	У тым ліку ў калгасах	Усяго	У тым ліку ў калгасах
Коні	5747	4795	5167	4573
Каровы	7015	1324	7963	1845
Свінні	14801	3216	10982	2574
Авечкі	4951	2017	9001	4290
Козы	13	—	30	—
Валы старэй 2 гадоў	30	4	81	34
Цяляты старэй 1 года	1796	1028	900	566
Свінаматкі старэй 9 месяцаў	4053	1027	2053	783
Быкі старэй 1 года	330	157	316	150
Жарабяты да 1 года	462	436	532	520
Нецелі старэй 1 года	858	326	865	307
Парасяты да 4 месяцаў	4298	759	3273	493

З фондаў Крычаўскага краязнаўчага музея.

КАПІТАЛАЎКЛАДАННІ Ў 1939 г.

Назва прадпрыемстваў і ўстаноў	сума (у тыс. руб.)
Цэментны завод	1515,0
Ільнозавод	33,4
Задабрасцянскі спіртзавод	274,4
Фосфарны завод	174,0
Райздраў	125,8
Райана	35,0
Корпус дашкольнага вучылішча	473,9
Райкамгас	149,0

Усе 10 памяшканняў сельскіх Саветаў раёна у 1939 годзе былі тэлефанізаваны. А з 72 калгасаў тэлефоны мелі толькі 2 гаспадаркі.

У той час у раёне налічвалася 1161 радыётрансляцыйная кропка, 13 паштова-тэлеграфных прадпрыемстваў. Насельніцтва абслугоўвалі 63 паштальёны.

ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫЯ НАРЫХТОЎКІ АСНОЎНЫХ СЕЛЬГАСПРАДУКТАЎ ЗА 1939 г. У РАЁНЕ

Назва прадуктаў		У тым ліку нарыхтаваны		
	Усяго	Калгасамі	Калгаснікамі	Аднаасобнікамі
Бульба	4861т	2989т	857т	72т
Гародніна	127т	127т	—	—
Малако	100065л	9038л	884л	—
Мяса	3064цнт	1918цнт	1011цнт	70цнт
Шэрсць	2265кг.	1802кг.	449кг.	14кг.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

ПАСЯЎНЫЯ ПЛОШЧЫ ПАД УРАДЖАЙ 1940 г. (у гектарах)

Культуры	па ўсіх катэгорыях гаспадарак	Дзяржкапсектар	Калгасы	Калгаснікі	Аднаасобнікі	Рабочыя і служачыя
Усяго:	25319	61	22418	2348	56	436
Жыта	6609	1	6556	41	11	—
Пшаніца азімая	226	—	226	—	—	—
Яравая	1912	—	1830	81	1	—
Ячмень	2444	5	1925	497	5	12
Авёс	2406	18	2382	4	—	2
Грэчка	1937	—	1933	1	3	—
Лён	1947	—	1882	62	2	1
Канапля	316	—	307	9	—	—
Кок-сагыз	224	—	224	—	—	—
Бульба	4701	18	2805	1450	28	400
Кармавыя караняплоды	64	—	64	—	—	—
Канюшына і цімафееўка	1779	5	1742	32	—	—
Апрача гэтага, падпакроўныя пасевы	1568	1	1567	—	—	—

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

КАДРЫ КАЛГАСНІКАЎ НА 1.1.1940 г.

Старшынь калгасаў	- 72
Намеснікаў старшынь	- 63
Старшынь рэўкамісій	- 72
Бухгалтараў і рахункаводаў	- 83
Брыгадзіраў паляв., агароднін, садав.брыгад	- 144
Заатэхнікаў і ветфельчараў	- 12
Загадчыкаў ферм	- 79
Пастухоў	- 129
Даярак	- 155
Свінарак	- 108
Конюхаў	- 313
Шафёраў	- 6
Звеннявых па раслінаводству	- 65

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

КОЛЬКАСЦЬ РАБОЧЫХ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ РАЁНА І МЕСЯЧНАЯ ЗАРПЛАТА ЗА ВЕРАСЕНЬ 1939 года (у рублях)

Галіны працы	Колькасць рабочых	Заробак за верасень
Прамысловасць	1786	294
Будаўніцтва і мантажныя работы	658	289
Водны транспарт	37	476
МТС	211	157
Сувязь	229	238
Гандаль і нарыхтоўкі прадуктаў	984	290
Камунальныя прадпрыемствы	36	202
Адукацыя	533	293
Дзяржаўны і ўпраўленчы апарат	138	262
Аўтагужавы і іншы транспарт	359	216
Чыгуначны транспарт	486	377
Медыцына	291	158
Падрыхтоўка кадраў	98	355

У 1939 годзе ў раёне налічвалася 54 школы, з іх колькасці пачатковых – 35, няпоўных сярэдніх – 10. Працавала 6 дзіцячых садкоў, якія наведвалі 338 дзяцей. Іх абслугоўваў 21 выхавальнік.

У тым жа годзе ў раёне працавала 16 бібліятэк з агульнай колькасцю кніг 28,2 тысячы, 10 хат-чытальняў.

У 1940 годзе насельніцтву аказвалі медпаслугі 10 урачоў, 3 зубных урачы, 12 фельчараў, 40 медсясцёр. Працавала 3 бальніцы на 99 ложкаў, 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 калгасныя радзільныя дамы на 6 ложкаў і 21 акушэрскі пункт, адзін здраўпункт.

З фонду Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

Удзельнікі усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве ў 1940 г.

КАЛГАСЫ:

імя Варашылава – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 34 каровы, авечкагадоўчая – 65 авечкаматак і свінагадоўчая – 17 свінаматак;

«Запаветы Ільіча» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 109 кароў, авечкагадоўчая – 66 авечкаматак і свінагадоўчая – 23 свінаматкі;

«Запаветы Леніна» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 20 кароў, авечкагадоўчая – 33 авечкаматкі і свінагадоўчая – 6 свінаматак;

імя Кагановіча – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 54 каровы, авечкагадоўчая – 36 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Ленінскія дні» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 42 каровы, авечкагадоўчая – 30 авечкаматак і свінагадоўчая – 10 свінаматак;

«Ленінскі заклік» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 25 кароў, авечкагадоўчая – 40 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

імя Кірава – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 51 карова, авечкагадоўчая – 78 авечкаматак і свінагадоўчая – 31 свінаматка;

«Малады ўдарнік» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 20 кароў, авечкагадоўчая – 41 авечкаматка і свінагадоўчая – 7 свінаматак;

імя Молатава – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 283 каровы, авечкагадоўчая – 63 авечкаматкі і свінагадоўчая – 27 свінаматак;

«Новае жыццё» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 14 кароў, авечкагадоўчая – 30 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Новае Сормава» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 57 кароў, авечкагадоўчая – 58 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«І Мая» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 21 карова, авечкагадоўчая – 32 авечкаматкі і свінагадоўчая – 4 свінаматкі;

«Перамога» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 21 карова, авечкагадоўчая – 58 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Пралетарская Перамога» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 30 кароў, авечкагадоўчая – 35 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Пралетарскі пахар» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 24 каровы, авечкагадоўчая – 32 авечкаматкі і свінагадоўчая – 20 свінаматак;

«Шлях да камунізму» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 28 кароў, авечкагадоўчая – 32 авечкаматкі і свінагадоўчая – 20 свінаматак;

імя XVII партз'езда – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 34 каровы, авечкагадоўчая – 50 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Савецкая Беларусь» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 14 кароў, авечкагадоўчая – 28 авечкаматак і свінагадоўчая – 8 свінаматак;

імя Сталіна – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 26 кароў, авечкагадоўчая – 33 авечкаматкі і свінагадоўчая – 8 свінаматак;

«Ударнік» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 83 каровы, авечкагадоўчая – 83 авечкаматкі і свінагадоўчая – 18 свінаматак. Калгас за 1937—1939 гг. з плошчы 301 гектар атрымаў у сярэднім па 11,2 ц збожжавых з гектара;

«Чырвоная Буда» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 26 кароў, авечкагадоўчая – 30 авечкаматак і свінагадоўчая – 13 свінаматак;

«Чырвоны май» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 24 каровы, авечкагадоўчая – 30 авечкаматак і свінагадоўчая – 13 свінаматак;

«Чырвоны партызан» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 37 кароў, авечкагадоўчая – 50 авечкаматак і свінагадоўчая – 15 свінаматак;

«Чырвоны пахар» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 41 карова, авечкагадоўчая – 70 авечкаматак і свінагадоўчая – 12 свінаматак;

«Чырвоны Прамень» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 25 кароў, авечкагадоўчая – 60 авечкаматак і свінагадоўчая – 13 свінаматак;

«Чырвоны Сцяг» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 24 каровы, авечкагадоўчая – 30 авечкаматак і свінагадоўчая – 11 свінаматак;

«Чырвоны шлях» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 40 кароў, авечкагадоўчая – 39 авечкаматак і свінагадоўчая – 10 свінаматак;

«Шлях сацыялізму» – 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочная – 32 каровы, авечкагадоўчая – 66 авечкаматак і свінагадоўчая – 14 свінаматак.

Калектывы авечкагадоўчых ферм калгасаў: імя Варашылава, імя Кірава, «Ленінскі заклік», «Май», «Малады ўдарнік», «Новае жыццё», «Новае Сормава».

ПЕРАДАВІКІ ВЫТВОРЧАСЦІ:

АБУХОВІЧ Кузьма Іванавіч, даглядчык авечак калгаса імя Варашылава.

АНТОНАЎ Панас Антонавіч, загадчык авечкагадоўчай фермы калгаса «Чырвоны прамень».

БАЛДЭСАЎ Даніла Андрэевіч, загадчых жывёлагадоўчых ферм калгаса «Пралетарскі пахар».

БЕЛАКУРСКІ Іван Данілавіч, палявод калгаса імя Стаханава.

ДАЛЕЦКІ Міхаіл Мікалаевіч, старшыня калгаса «Шлях сацыялізму».

ДЗІВАКОЎ Сцяпан Іванавіч, памочнік ветурача Крычаўскай ветлячэбніцы.

ДУБЯГА Сямён Вікенцевіч, даглядчык авечак калгаса «Ленінскі заклік».

ЕРМАКОЎ Кліменцій Мікітавіч, старшыня калгаса «Чырвоны партызан».

ІЛЬЮШЫН Пётр Агеевіч, старшыня калгаса імя Сталіна.

КАВАЛЁЎ Павел Мікалаевіч, загадчык авечкагадоўчай фермы калгаса імя Кірава.

КАНЦАВЫ Васіль Сцяпанавіч, рабочы Крычаўскага зематрада.

КРЫЖЭВІЧ Андрэй Сямёнавіч, трактарыст 2-й Крычаўскай МТС.

ЛОБЦАЎ Іван Барысавіч, участковы заатэхнік Крычаўскага райземаддзела.

МАЛАХАЎ Рыгор Фёдаравіч, трактарыст 1-й Крычаўскай МТС.

МАХАНЁК Міхаіл Сцяпанавіч, супрацоўнік Крычаўскага райзематрада.

МІЛІЦКАЎ Спірыдон Максімавіч, загадчык авечкагадоўчай фермы калгаса «Чырвоны пахар».

МІХНЕВІЧ Антон Васілевіч, загадчык авечкагадоўчай фермы калгаса «Новае Сормава».

ПАСКЕВІЧ Арына Яфімаўна, жывёлавод Задабрасцянскага адкормачнага пункта.

ПАЎЛАЎ Піліп Іванавіч, загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса «Савецкая Беларусь».

ПЯСКОЎСКІ Іван Гаўрылавіч, старшыня калгаса імя Кагановіча.

САЛДАЦЕНКА Дар'я Міхайлаўна, загадчыца авечкагадоўчай фермы калгаса «Малады ўдарнік».

САЛАЎЁВА Саламаніда Вавілаўна, звеннявая калгаса «Пралетарскі пахар».

САПІКАЎ Пракоп Кузьміч, звенняявы калгаса «Новае жыццё».

СІДАРЭНКА Сідар Майсеевіч, старшыня калгаса «Ленінскі заклік».

СІМКІН Леў Абрамавіч, бухгалтар калгаса «Ударнік».

СКАЧКОЎ Сямён Васілевіч, загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса «Запаветы Леніна».

ЦЯРЭНЦЬЕЎ Самсон Іванавіч, старшыня калгаса «Новае жыццё».

ЧЫГУНКОЎ Рыгор Аляксеевіч, трактарыст 1-й Крычаўскай МТС.

ШЧУРА Іван Мікалаевіч, загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса «Шлях да камунізму».

ЯГОРАНКА Варвара Цярэнцьеўна, цялятніца калгаса «Пралетарская Перамога».

ЯКІМАЎ Панас Сямёнавіч, трактарыст 1-й Крычаўскай МТС.

ЯШЧАНКА Васіль Анісавіч, загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса імя Варашылава.

Падрыхтаваў да друку *І.І. Гаўрылаў.*

З фондаў Крычаўскага краязнаўчага музея.

Крычаў перадваенны

За ўвесь час свайго існавання ў якасці мястэчка Крычаў меў не надта прывабны выгляд. Вузкія вуліцы з глыбокімі выбоінамі, у якіх пасля веснавога разводдзя цвілая вада стаяла ледзь не да восені, пахілыя збуцвелыя агарожы. Хаціны нізкія з мутнымі невялічкімі вокнамі, урослыя ў зямлю, усюды кучы смецця і бруду.

Канешне, узвышаліся тут і дабротныя забудовы багатых жыхароў, але колькасць іх была мізерная, і яны не маглі палепшыць агульнага ўражання. Справы пачалі паляпшацца з 1924 года, калі Крычаў стаў райцэнтрам. На больш людных вуліцах з'явіўся брук, сталі будавацца двух- і трохпавярховыя дамы для дзяржаўных установ, паменшала, асабліва ў цэнтры мястэчка, смецця.

У 1931 годзе Крычаў стаў горадам. Менавіта ў гэты час ён пачаў мяняць сваё аблічча. Былі ажыццёўлены электрыфікацыя, тэлефанізацыя, радыёфікацыя як горада, так і бліжэйшых населеных пунктаў. Ад Крычава да вёскі Варанёва, дзе ўзводзіўся цэментны завод, пачалі хадзіць аўтобусы.

Значнай падзеяй у жыцці райцэнтра з'явілася адкрыццё дзяржаўнага педагагічнага тэхнікума ў 1931 годзе. Густой плынню сюды хлынула моладзь як з Крычаўшчыны, так і з бліжэйшых раёнаў. Тэхнікум стаў своеасаблівай кузняй педагагічных кадраў, бо ў той час у школах, асабліва вясковых, не хапала настаўнікаў.

Рамеснае вучылішча было перайначана ў Рэспубліканскую школу механізацыі сельскай гаспадаркі, дзе навучэнцы набывалі прафесіі брыгадзіра трактарнай брыгады, шафёра, аўтамеханіка і г.д. Выпускнікі гэтай школы сталі працаваць у калгасах і саўгасах раёна, на прамысловых прадпрыемствах, дзе таксама адчуваўся востры недахоп спецыялістаў.

Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў Крычаве дзейнічалі: 4 сярэднія, 2 няпоўныя сярэднія і 2 вячэрнія школы, у горадзе і раёне налічвалася 12 дамоў сацыялістычнай культуры, дзіцячая тэхнічная станцыя, бібліятэка, два кінатэатры, тры кінаперасоўкі, працавалі драмгурткі.

Расшырылася сетка і медыцынскіх

устаноў. Працавала раённая бальніца на 75 ложкаў, тэрапеўтычнае, хірургічнае, радзільнае, інфекцыйнае аддзяленні, паліклініка, дзіцячая і жаночая кансультацыі, аптэка, бальніца на цэментным заводзе і санэпідэмстанцыя. Паспяхова лячылі хворых у Маляціцкай сельскай бальніцы, Бацьвінаўскай, Паланіцкай і Зарубецкай амбулаторыях, у Кашанскім і Сакольніцкім фельчарска-акушэрскіх пунктах.

Прыкметна павышаўся і дабрабыт насельніцтва. Людзі верылі ў лепшае жыццё і яго будавалі.

В.А. Жучкевіч, А.Я. Малышаў, М.Е. Рагозін.

Города и сёла Белоруссии. Л., 1959. С.19.

Браты Грыгор'евы

Іх было пяцёра – братоў Грыгор'евых з Зайцавай Слабады. Усе яны сталі танкістамі. Адзін з экіпажаў нават называўся экіпажам Грыгор'евых.

...У доме сельскага настаўніка Грыгор'ева было шумна, весела і радасна. У госці з'ехаліся адразу тры сыны – Георгій, Міхаіл і Барыс. Клапатлівая маці завіхалася на кухні, рыхтуючы святочны абед.

— Але чаму няма Мікалая?—прагаварыў бацька.

— Відаць, нельга яму,— адказаў Барыс.

Мікалай прыехаў на наступны дзень. Вясёлы, упэўнены, падцягнуты.

— Цяпер не хапае толькі Віталя. А то б увесь мой полк быў у зборы,— жартаўліва заўважыла маці.

— У яго, мама, зараз падрыхтоўка да залікаў. Дні і ночы займаецца. Гэта, дарагая, не школа, а акадэмія.

За сталом разгаварыліся. Міхаіл расказваў аб сваіх поспехах у газеце. Георгій падзяліўся ўражаннямі ад сталіцы. Барыс гаварыў аб тым, як яго піянерская арганізацыя праводзіла алімпіяду самадзенасці.

— Ну, а ты аб чым раскажаш, танкіст?—звярнуўся бацька да Мікалая.— Як твае справы?

— Справы, бацька, нядрэнна. Мой узвод на першым месцы па баявой падрыхтоўцы. Падзяку і прэмію атрымаў.

— Чытаў, чытаў пра цябе. Малайчына! Так і трэба.

— А як ты глядзіш, бацька, на такую вось справу? Я даўно пісаў аб гэтым у пісьме Мікалаю і Віталю. У мяне ўзнікла ідэя стварыць брацкі экіпаж танкістаў Грыгор'евых,— сказаў Георгій.

Мінута маўчання. Аб гэтым раней ніхто не задумваўся.

— На самой справе, бацька, прапанова выдатная. Глядзі, якія арлы,— усхвалявана сказаў Мікалай, паказваючы на братоў.

...Праз некалькі дзён у Маскву пайшла просьба патрыётаў Грыгор'евых аб стварэнні сямейнага танкавага экіпажа. У маі Нарком абароны Варашылаў выдаў загад аб залічэнні Георгія, Міхаіла і Барыса ў Н-скую танкавую часць, дзе ўжо служыў чацвёрты брат.

17 верасня 1939 года – памятны дзень для беларускага народа. У гэты дзень Чырвоная армія ступіла на зямлю Заходняй Беларусі. Браты Грыгор'евы прымалі ўдзел у гэтым паходзе.

Вільня. Чырвонаармейскія часці імклівым націскам занялі горад. Афі-

цэры праціўніка, адступіўшы на паўночную ўскраіну горада, імкнуліся арганізаваць абарону. Камандаванне даручыла Георгію разведаць мясцовасць, занятую праціўнікам. Танкісты тэрмінова адправіліся на выкананне баявой задачы.

Рэчка. Узвод варожай пяхоты мітусіцца ля маста.

— Падпаліць думаюць, сволачы,— гаворыць братам Георгій і падае каманду падрыхтавацца.

— Але нам і выстрала не давялося зрабіць,— успамінае Георгій цяпер.— Варожыя салдаты, як толькі ўбачылі нас, тут жа здаліся. Дваццаць шэсць малойчыкаў.

...Нядаўна Грыгор'евы сабраліся ў ленінскім пакоі свайго падраздзялення. Да іх прыйшлі камандзір і камісар часці.

— Ну, якія ў вас навіны, таварыш парторг?—звярнуўся да Георгія камісар.

— Сабраліся падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, таварыш камісар,— адказаў камандзір машыны.

Ішла задушэўная таварыская гутарка. Вынік падвёў камандзір часці.

— Так, у Мікалая Грыгор'ева ўзвод па-ранейшаму на добрым месцы.

— Цікава б ведаць, як наш акадэмік вучыцца,— сказаў вежавы стралок Барыс.

У той жа вечар у Маскву, у акадэмію матарызацыі і механізацыі Чырвонай арміі, дзе вучыўся пяты брат, было адпраўлена пісьмо. Браты расказвалі Віталю аб сваіх поспехах і прасілі паведаміць, як ён выконвае брацкі сацыялістычны дагавор. А ў роднае сяло – Зайцаву Слабаду – у любімую Беларусь ішло другое пісьмо на імя настаўніка сельскай школы Грыгор'ева. Сыны паведамілі бацькам, што іх наказ яны выконваюць з гонарам.

Я. Шынгароў.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Гэтыя часы можна без перабольшвання назваць жорсткай і бязлітаснай вайной сталінскага рэжыму супраць свайго народа. Мільёны людзей Савецкай краіны сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій 1930—1940 гг. У лік іх трапілі і тыя, хто, не шкадуючы жыцця, ваяваў на франтах грамадзянскай вайны, і меў за адвагу высокія ўрадавыя ўзнагароды, хто прымаў самы актыўны ўдзел у пабудове новага жыцця. Нават заслужаных рэвалюцыянераў абвінавацілі ў здрадніцтве.

Многія афіцэры, у тым ліку генералы, пісьменнікі, вучоныя, міністры, рабочыя і калгаснікі былі арыштаваны і асуджаны калі не на расстрэл, то на зняволенне ў нетрах Гулага, спецпасяленне ў бязлюдных, невыносна спякотных або марозных мясцінах. Шмат людзей не вытрымала здзеклівых умоў, у якіх яны ўтрымліваліся. Зняволеныя паміралі ад голаду, холаду, спякоты, пабояў і маральнага прыніжэння.

Здзіўляе абясцэненасць чалавечага жыцця, бязлітаснасць і жорсткасць, нежаданне высветліць праўду з боку тагачасных органаў дзяржбяспекі. Павяргае ў шок размах рэпрэсій і метады работы з тымі, хто трапіў пад следства: прымяняліся здзекі і ката-

ванні, абвінавачваемых прымушалі агаворваць знаёмых, начальства, сваіх жа блізкіх. Множылася колькасць «ворагаў народа» – супрацоўнікі органаў дзяржбяспекі атрымлівалі ўзнагароды.

Дзейнасць гэтага жахлівага механізма рэпрэсій мела ідэалагічнае забеспячэнне. Краіна жыла ў атмасферы страху і падазронасці.

Пакутвалі не толькі ў большасці сваёй ні ў чым не вінаватыя асуджаныя – жахлівыя пакуты цярпелі і іх сем'і. Нямала асірацела дзяцей, калі іх бацькоў арыштоўвалі. Злавесна-ганебнае кляймо дачкі або сына «ворага народа» надоўга прыліпала да дзяцей пацярпелага. Амаль немагчыма было членам сям'і асуджанага знайсці добрую работу, паступіць вучыцца ў прэстыжны інстытут або тэхнікум.

З шырокім размахам працавала рэпрэсіўная машина і на Крычаўшчыне. Асуджана больш як 700 чалавек. Дакладнай лічбы пакуль што ўстанавіць нельга. На вялікі жаль, лёс многіх нашых землякоў невядомы і па сённяшні дзень. Многае ў архівах не захавалася, і тым не менш, ідзе работа па вяртанню незаслужана пацярпелым людзям іх сумленных імён. Будзем спадзявацца, што ніводнае імя без віны загінуўшых не застанецца без увагі.

Ніжэй прыводзіцца спіс жыхароў Крычаўскага раёна, якія сталі ахвярамі рэпрэсій і былі рэабілітаваны на момант стварэння нашай кнігі.

Ураджэнцы і жыхары г.Крычава і Крычаўскага раёна, якія падверглісяпалітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваны

АБУХОВІЧ Іван Восіпавіч, н. у 1886 у в.Паклады, справавод калгаса імя Варашылава. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

АДАМІК Восіп Пятровіч, н. у 1908 у в.Глінск Львоўскай вобл., жыў у в.Плешчына Крычаўскага раёна. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

АЗІКАЎ Ізраіль Беніямінавіч, н. у 1907 у Крычаве, кравец. Арыштаваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЯКСЕЕНКА Карп Раманавіч, н. у в.Каранец, загадчык фермы ў мясцовым калгасе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

АЛЯХНОВІЧ Яфім Кузьміч, н. у 1884 у в.Дарлівае, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

АНДРЭЕЎ Васіль Сямёнавіч, н. у 1916 у в.Глупікі, чырвонаармеец 32-га стралковага палка. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1964.

АНІКЕЕЎ Яўсей Апанасавіч, пражываў у в.Дзягавічы, чырвонаармеец 32-га стралковага палка. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1992.

АНІШЧУК Максім Пракопавіч, н. у 1891 у в.Нова-Карніна Гродзенскай вобл., фельчар медучастка пры ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1960.

АНЦІПАЎ Мікалай Андрэевіч, н. у 1889 у в.Зуйкава Калінінскай вобл., жыў у Крычаве, настаўнік чыгуначнай школы. Арыштаваны ў 1937.

АРКАДЗЬЕЎ Емяльян Пятровіч, н. у 1892 у в.Маляцічы, намеснік начальніка аддзела забеспячэння на фабрыцы «Магвалакно». Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1980.

АРЛОЎ Дзмітрый Фядосавіч, н. у 1912 у в.Бель-1, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1993.

АРЦЁМАЎ Павел Іванавіч, н. у 1906 у в.Паўлавічы, пуцявы рабочы на чыгунцы. Арыштаваны ў 1946. Рэабілітаваны ў 1959.

АРЦЁМАЎ Якаў Яўлампіевіч, н. у 1894 у в.Шаёўка, старшыня калгаса ў в.Антонаўка. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1946.

АСМАЛОЎСКЯ Лідзія Паўлаўна, н. у 1907 у в.Макаўе. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1994.

АСМАЛОЎСКАЯ Марыя Аляксандраўна, н. у 1907 у в.Макаўе. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1994.

АСМАЛОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1896 у в.Макаўе, калгаснік. Арыштаваны і асуджаны. Рэабілітаваны ў 1962.

АСМАЛОЎСКІ Іван Уладзіміравіч, н. у 1910 у в.Макаўе. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1994.

АСМАЛОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у в.Макаўе. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1994.

АСТАНЬКОВІЧ Антон Восіпавіч, н. у 1879 у в.Цыганава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1991.

АТРАШКЕВІЧ Сямён Мацвеевіч, н. у 1872 у в.Баранцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎСЯННІКАЎ Іван Маркавіч, н. у 1909 у м.Пухавічы Мінскай вобл., механік Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1945.

АЎЧЫННІКАЎ Сямён Яўсеевіч, н. у 1884 у в.Глупікі. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1992.

АХАРЦАЎ Фрол Мітрафанавіч, н. у 1885 у в.Кашаны, рабочы цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БАБЫЛЁЎ Кузьма Макаравіч, жыў у в.Маляцічы. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1993.

БАБЫЛЁЎ Пётр Сяргеевіч, н. у 1888 у г.Спас-Дземінскі Смаленскай вобл., жыў у в.Каменка. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1946.

БАГЛАНОЎСКІ Пракоп Арсенавіч, н. у 1908 у в.Нікольчына Арлоўскай вобл., слесар, жыў у в.Макаўе. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

БАДЗЮРКЕВІЧ – БУСЬКО Андрыян Фаміч, н. у 1907 у в.Чэміраўка Гродзенскай вобл., старшыня Касцюшкаўскага сельсавета. Арыштаваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

БАШКОЎ Якаў Рыгоравіч, н. у 1908 у в.Гарбатка, стрэлачнік на ст. Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1939.

БАЛАШ Ганна Канстанцінаўна, н. у 1908 у пас.Вілейка Мінскай вобл., прадавец у Крычаве. Арыштавана ў 1958. Рэабілітавана ў 1959.

БАЛЯНКОЎ Максім Рыгоравіч, н. у 1874 у в.Глушнева, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

БАЛЯНКОЎ Фёдар Васілевіч, н. у 1874 у в.Варанёва, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

БАНДАРЭНКА Раман Іванавіч, н. у 1903 у в.Нова-Грыгораўка Мікалаеўскай вобл., (Украіна), рахункавод на фасфарытным заводзе Крычаўскага раёна. Арыштаваны ў 1939. Рэабілітаваны ў 1939.

БАНЬКОЎСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1907 у в.Кашаны, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1944.

БАНЬКОЎСКІ Павел Аляксеевіч, н. у 1873 у в.Стаборшчына, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРАВІКОЎ Емяльян Рыгоравіч, н. у 1915 у Крычаве, начальнік тэхаддзела ўпраўлення кінафікацыі. Арыштаваны ў 1946. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1946.

БАРАВІКОЎ Рыгор Дзянісавіч, н. у 1903 у Крычаве, дзе і пражываў. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1945.

БАРАДЗІЧАЎ Георгій Васілевіч, н. у 1907 у в.Настасіна Рызаўскага раёна Маскоўскай вобл., ваеннаслужачы. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1944.

БАРАНАЎ Аўтаном Фёдаравіч, н. у 1896 у в.Усце, кладаўшчык калгаса «Другая пяцігодка». Арыштаваны і асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

БАРАНАЎ Даніла Ермалаевіч, н. у 1870, жыў у в.Дзягавічы, калгаснік калгаса «Чырвоны партызан». Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1961.

БАРЫСАВА Настасся Лявонаўна, жыла у в.Стараселле. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1992.

БАРЫСАЎ Антон Лявонавіч, жыў у в.Стараселле. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРЫСАЎ Канстанцін Лявонавіч, жыў у в.Стараселле. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРЫСАЎ Лявон Фёдаравіч, жыў у в.Стараселле. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРЫСАЎ Піліп Мартынавіч, н. у 1898 у в.Стараселле, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫСЕНКА Мікіта Міхайлавіч, н. у 1889 у в.Балванаўка Чэрыкаўскага раёна, жыў у в.Ноўкі. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРКОЎ Васіль Сілівестравіч, н. у 1912 у в.Вербіж Чэрыкаўскага раёна, грузчык на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

БАРЦЭВІЧ Арсен Фаміч, н. у 1906 у в.Шашова Горацкага раёна, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРЦЭВІЧ Павел Апанасавіч, н. у 1908 у Крычаве, сувязіст. Арыштаваны ў 1938. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1957.

БАРЭЙША Ігнат Ігнатавіч, н. у 1887 у в.Міхеевічы, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

БЕЙЛІН Гірша Якаўлевіч, н. у 1903 у в.Варанёва, грузчык на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1991.

БАКАРЭВІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1896 у с.Вусць Гомельскай вобл., святар царквы ў в.Залесавічы. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛАВЕЛЬЦАЎ Парфен Фёдаравіч, н. у 1899 у в.Карасільнікі Рослаўскага раёна Заходняй вобл.,

машыніст на ст. Крычаў.Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1937.

БЕЛАВІНСКАЯ–РУБАН Лідзія Захараўна, н. у 1924 у в.Добрае Мсціслаўскага раёна. Хатняя гаспадыня. Арыштавана ў 1948. Рэабілітавана ў 1964.

БЕЛЯКОЎ Анісім Усцінавіч, н. у 1925 у г.Крычаў, шафёр. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1958.

БЕРАЗКОЎ Яфрэм Раманавіч, н. у 1910 у в.Язерніца Ляхаўскага раёна, работнік Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1958.

БІРУКОЎ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1878 у в.Бель-1, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1993.

БІРУКОЎ Леанід Пятровіч, н. у 1911 у г.Рызе, старшы ветурач Крычаўскай нарыхтоўчай канторы. Арыштаваны ў 1941. У гэтым жа годзе вызвалены.

БІРУКОЎ Цімафей Аляксандравіч, н. у 1911 у в.Бель-1, калгаснік. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1992.

БОРТНІКАЎ Мікалай Васілевіч, н. у 1911 у Крычаве. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

БРАНДЗІЛАЎ Іван Яўменавіч, н. у 1908 у в.Міхеевічы, калгаснік. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БРАНДЗІЛАЎ Яўмен Лаўрэнавіч, н. у 1881 у в.Міхеевічы. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

БРУЕВІЧ Ганна Піліпаўна, н. у в.Пратошнае Быхаўскага раёна, жыла ў в.Паланіца. Арыштавана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

БУБНОЎ Рыгор Мікітавіч, жыў у пас.Кіслаўка. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1993.

БУГАЁЎ Іван Якімавіч, н. у в.Губеншчына.

БУГАЁЎ Якаў Якімавіч, н. у в.Губеншчына.

БУДАЕЎ Дзяніс Васілевіч, н. у 1892 у в.Першамайская, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

БУДАНАЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1882 у г.Маскве, рахункавод ветпункта ў Крычаве. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

БУКЕТАЎ Цімафей Васілевіч, жыў у в.Дарагая. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1993.

БУЛГАКАЎ Сігізмунд Станіслававіч, н. у 1884 у в.Сячыха Чэрыкаўскага раёна, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

БУНЕВІЧ Рыгор Андрэевіч, н. у 1910 у в.Мокрае Лунінецкага раёна, муляр Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1958.

БУРКУНОЎ Васіль Ігнатавіч, н. у 1902 у в.Дзягавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

БУСЕНКА Васіль Мікалаевіч, н. у 1893 у в.Паланіца, цясляр калгаса «Чырвоны май». Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БУСЕНКА Герасім Апанасавіч, н. у 1877 у в.Паланіца, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БУСЕНКА Пётр Фёдаравіч, н. у 1903 у в. Паланіца, рабочы цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БУСЕНКА Сілівестр Мікалаевіч, н. у 1902 у в.Паланіца, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БЯЗВОЦКІ Яфім Іванавіч, н. у 1898 у Крычаве, цясляр. Арыштаваны ў 1943. У гэтым жа годзе рэабілітаваны.

БЯЗРУЧАНКА Марыя Восіпаўна, н. у 1912 у в.Сарочына, калгасніца. Арыштавана ў 1944. Рэабілітавана ў 1991.

ВАЙЛУПАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1876 у в.Вародзькава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932.Рэабілітаваны ў 1989.

ВАЙЛУПАЎ Цімафей Якаўлевіч, н. у 1912 у в.Прусіна, вайсковец, камандзір узвода. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1958.

ВАЙШВІЛА Мікалай Восіпавіч, н. у 1890 у Ковенскай губ. (Украіна), начальнік ст. Крычаў. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАЛЕТАЎ Мікалай Кузьміч, н. у 1898 у в.Бель-2, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1933. Высланы ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1956.

ВАЛЮЖЭНІЧ Аляксандр Васілевіч, н. у 1887 у в.Глупікі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАНЦОЎСКІ Васіль Мікалаевіч, н. у 1917 у в.Цыганава, калгаснік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1939.

ВАНЦОЎСКІ Іван Сямёнавіч, н. у в.Цыганава, цясляр калгаса «Прыгажосць». Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАНЦОЎСКІ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1876 у в.Цыганава, калгаснік. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЕРАБ'ЁЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1872, селянін-аднаасобнік, жыў у в.Каменка. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЬЕЎ Іван Іванавіч, н. у 1875 у в.Міхеевічы, рабочы Эмануілаўскага спіртзавода, жыў у в. Чырвоная Буда. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў зняволення ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1961.

ВАСІЛЬКОЎ Павел Паўлавіч, н. у 1876 у в.Касцюшкавічы, брыгадзір калгаса. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЬКОЎ Фядос Паўлавіч, н. у 1908 у

в.Касцюшкавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЬКОЎ Якаў Паўлавіч, н. у 1888 у в.Касцюшкавічы, брыгадзір калгаса.Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСОКАЎ Іван Лук'янавіч, н. у 1873 у в.Паланіца, селянін. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1958.

ВАЦУРА Іван Іванавіч, н. у 1897 у в.Касцюшкавічы, рабочы калгаса «Чырвонаармеец». Арыштаваны ў 1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ВАШЧАНКА Аляксей Савельевіч, н. у 1895 у в.Слабада, старшыня калгаса імя Леніна. Арыштаваны ў 1943. Вызвалены ў 1944. Рэабілітаваны.

ВАШЧАНКА Ціт Васілевіч, н. у 1903 у в.Мясніцкая Слабада, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАШЧЫЛЕНКА Іван Фядотавіч, н. у 1880 у в.Мышкавічы. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1966.

ВІЖЫНІС /ВЕЖЫНІС/ Восіп Казіміравіч, н. у 1897 у в.Малькоўка Мсціслаўскага раёна, цясляр МТС, жыў у в.Іванаўка. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІНАКУРАЎ Іван Андрэевіч, н. у 1919 у в.Бель-1, вайсковец. Арыштаваны ў 1949.Рэабілітаваны ў 1989.

ВІШНЕЎСКІ Лявон Анісімавіч, н. у 1874 у в.Залесавічы, земляроб. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІШНЕЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1926 у в.Паклады, з сялян. Арыштаваны ў 1943. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1944.

ВЛАЗОЎСКІ Ігнат Андрэевіч, н. у 1875 у в.Іванаўка, жыў у в.Антонаўка. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЛАСАЎ Максім Сяргеевіч, н. у 1895 у в.Стараселле, рабочы Крычаўскага харчпрамгандлю, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1941. Вызвалены і рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ВОРАНАВА Марыя Майсееўна, н. у 1880 у Крычаве, манашка. Арыштавана ў 1933. Расстраляна. Рэабілітавана ў 1960.

ВОРАНАЎ Макар Аляксеевіч, н. у 1898 у Крычаве, слесар-інструментальшчык Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны. Рэабілітаваны ў 1958.

ВЫРВА Фёдар Захаравіч, н. у 1905 у Крычаве. Начальнік гідравузла № 6. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1992.

ВЯРЖБІЦКАЯ Настасся Мікалаеўна, н. у 1865 у в.Сакольнічы, манашка, жыла ў в.Залесавічы. Арыштавана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

ВЯРЖБІЦКІ Ягор Васілевіч, н. у 1887 у в.Сакольнічы, рахункавод калгаса «Запаветы Ільіча». Арыштаваны ў 1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРЖБІЦКІ Яўген Васілевіч, н. у 1887 у в.Сакольнічы, рахункавод калгаса. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1937.

ГАЛАЎНЁЎ Васіль Навумавіч, н. у 1893 у в.Зайцава Слабада, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАЎНЁЎ Мікалай Аўрамавіч, н. у 1902 у в.Ціманава Клімавіцкага раёна, калгаснік калгаса «Барацьбіт». Арыштаваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1935.

ГАЛЕНКА Аляксей Захаравіч, н. у 1887 у в.Бель, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛЕНКА-ЧЫЖ Антаніна Мікалаеўна, н. у 1891 у в.Дрожжаніцы. Арыштавана ў 1937. Рэабілітавана ў 1958.

ГАЛКОЎСКАЯ Марыя Платонаўна, н. у 1908, жыла ў в.Пескавічы. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1992.

ГАЛКОЎСКІ Аляксей Міхайлавіч, н. у 1899 у в.Пескавічы, рабочы леспрамгаса. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛКОЎСКІ Анатоль Кандратавіч, н. у 1930, жыў у в.Пескавічы. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1992.

ГАЛКОЎСКІ Кандрат Міхайлавіч, н. у 1906, жыў у в.Пескавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1992.

ГАЛКОЎСКІ Кузьма Восіпавіч, н. у 1875 у в.Судзіла Клімавіцкага раёна, жыў у Крычаве, намеснік старшыні калгаса «Сацыялістычны шлях». Арыштаваны ў 1933. Вызвалены і рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ГАЛУБЕНКА Фларыян Аляксеевіч, н. у 1864 у с.Ласянка Падольскай губерні (Украіна), жыў у Крычаве, святар. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛЬВІДЗІС Станіслаў Людвігавіч, н. у 1892 у в.Бацьвінаўка, калгаснік, Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛЬДУС Станіслаў Людвігавіч, н. у 1890 у в.Бацьвінаўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1935. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ГАРБАТОЎСКІ Іван Алімпіевіч, н. у 1894 у в.Бель-2, работнік фасфарытнага завода ў Крычаве. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1956.

ГАРБАТОЎСКІ Іван Піліпавіч, н. у 1903 у в.Іванаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАРБАТОЎСКІ Міхаіл Алімпіевіч, н. у 1876 у в.Бель-2, з сялян. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1956.

ГАРБАТОЎСКІ Пётр Алімпіевіч, н. у 1876 у в.Бель-2, з сялян. Арыштаваны ў 1933.Рэабілітаваны ў 1956.

ГАРБАТОЎСКІ Піліп Піліпавіч, н. у 1897 у

в.Іванаўка, старшы кандуктар на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Вызвалены і апраўданы ў тым жа годзе.

ГАРБАТОЎСКІ Піліп Якаўлевіч, н. у 1874 у в.Іванаўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАНЧАРОЎ Барыс Аляксандравіч, н. у 1899 у Маскве, галоўны бухгалтар на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ГАРЫЦКІ Кузьма Емяльянавіч, н. у 1912 у в.Чарнастаеўка Чарнігаўскай вобл., майстар на цагельным заводзе ў Крычаве. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1939.

ГАРНАДУД Павел Рыгоравіч, н. у 1916 у в.Охар Чэрыкаўскага раёна, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1942. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАСПАДАРОЎ Якаў Восіпавіч, н. у 1897 у в.Вербеж, цясляр на цэментным заводзе. Асуджаны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

ГАТОЎЧЫК Емяльян Данілавіч, н. у 1887 у в.Дзягавічы, працаваў у Крычаўскім лясніцтве. Арыштаваны ў 1944. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ.Рэабілітаваны ў 1962.

ГАЎРЫЛЕНКА Сямён Сідаравіч, н. у 1892 у в.Кашаны, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЕЛЬБЕРТ Якаў Давыдавіч, н. у 1893 у Варшаве, рабочы на цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЕНРЫХАЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1881 на ст.Салтанаўка, тэлеграфіст на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1934. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ГЕРДЗІЙ Гаўрыла Сцяпанавіч, н. у в.Іванаўка, старшы стрэлачнік на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Вызвалены і апраўданы ў тым жа годзе.

ГЕРДЗІЙ Сцяпан Цімафеевіч, н. у 1883 у в.Іванаўка. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1933.

ГЕРДЗІЙ Фёдар Ільіч, н. у 1903 у в.Іванаўка, рахункавод. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

ГЕЦ Якаў Мікітавіч, н. у 1898 на ст.Каламейцава Палтаўскай губерні (Украіна), начальнік цэха Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1955.

ГЛАДКОЎСКІ Іван Цітавіч, н. у 1882 у в.Макаўе, калгаснік калгаса «Прыгажосць». Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1934.

ГЛАЗУНОЎ Яфім Іванавіч, н. у 1887 у в.Кібаршчына, цясляр калгаса «Чырвоны сормавец», жыў у в.Зарубец. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАБАРАЎ Барыс Якаўлевіч, н. у 1901 у в.Прусіна, калгаснік. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1957.

ГРАБНІЦКІ Сямён Мікітавіч, н. у 1906 у Крычаве, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ГРАФ Лея Ашэраўна, н. у 1897 у г.Брэст-Літоўску, старшыня трыкатажнай арцелі «Прагрэс». Арыштавана ў 1938. Рэабілітавана ў 1939.

ГРЫБАНАЎ Захар Айрамавіч, н. у 1889 у в.Каменка, вартаўнік Каменскай школы. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1946.

ГУЗАЎ Яфім Васілевіч, н. у 1881 у Крычаве, загадчык гаспадаркі. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1992.

ГУРКО Аляксандр Кузьміч, н. у 1900 у Мсціславе, працаваў у Крычаўскай школе. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1956.

ГУРЭВІЧ Любоў Львоўна, н. у 1912 у в.Юркаўка, сакратар на эксплуатацыйна-дарожным участку. Арыштавана ў 1937. Вызвалена і рэабілітавана ў 1938.

ДАБРАВОЛЬСКІ Рыгор Сідаравіч, н. у 1920 у в.Бель-1, рабочы торфазавода «Калектыўная праца». Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1993.

ДАВІДОВІЧ Іван Антонавіч, н. у 1912 у в.Гліно, рабочы Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАВЫДЗЕНКА Апанас Міхайлавіч, н. у 1896 у в.Прыгаўка, стралок. Арыштаваны ў 1942. Рэабілітаваны ў 1992.

ДАВЫДЗІК Вера Нічыпараўна, н. у 1905 у в.Падбагоннікі Гродзенскай вобл., работніца Крычаўскага цэментнага завода. Арыштавана ў 1932. Рэабілітавана ў 1989.

ДАЛБАНОСАЎ Васіль Давыдавіч, н. у 1898 у в.Прохараўка, работнік завода «Камінтэрн». Арыштаваны ў 1931. Вызвалены ў тым жа годзе.

ДАЛЕЦКІ Пётр Восіпавіч, н. у 1906 у в.Каменка-1 Віцебскай вобл., электразваршчык. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАМАРАЦКАЯ Антаніна Сцяпанаўна, н. у 1930 у в.Свадкавічы. У 1930 разам з бацькамі выслана, памерла на этапе.Рэабілітавана 30.8.1991.

ДАМАРАЦКАЯ Кацярына Сямёнаўна, н. у 1881 у в.Пірагова Мсціслаўскага раёна, жыла ў в. Свадкавічы. Сялянка-аднаасобніца. У 1930 выслана як жонка кулака ў Чыцінскую вобл. Вярнулася з высылкі ў 1949. Рэабілітавана 30.8.1991.

ДАМАРАЦКІ Валерый Сцяпанавіч, н. у 1928 у в.Антонаўка. Селянін-аднаасобнік. У 1930 як сын кулака высланы ў Чыцінскую вобл. Памёр 5.7.1948. Рэабілітаваны 30.8.1991.

ДАМАРАЦКІ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1910 у в.Антонаўка, жыў у в. Свадкавічы. Селянін-аднаасобнік. У 1930 як сын кулака высланы ў Чыцінскую вобл. 21.11.1937 асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Памёр 20.9.1940 у пас.Адзінокі Ягаднінскага раёна Магаданскай вобл. Рэабілітаваны двойчы: 14.5.1962 і 30.8.1991.

ДАМАРАЦКІ Сцяпан Парфіравіч, н. у 1876 у в.Антонаўка, жыў у в.Свадкавічы. Селянін-аднаасобнік. У 1930 як кулак высланы, памёр на этапе да месца высылкі. Рэабілітаваны 30.8.1991.

Лёс сям'і Дамарацкіх

СЕМІНЕНКА Лідзія Іванаўна, н. у 1930 у в.Вародзькава. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1993.

СЕМІНЕНКА Марыя Кузьмінічна, н. у 1891 у в.Вародзькава. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1993.

СЕРБЯНКОЎ Сяргей Іванавіч, н. у 1911 у в.Беражыстае, стрэлачнік на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

СЕРГІЕВІЧ Міхаіл Сямёнавіч, н у 1910 у в.Любань Лунінецкага павета, токар на цэментным заводзе. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1957.

СІВАДЗЕДАЎ Цімафей Елісеевіч, н. у 1902 у в.Іванаўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1958.

СІВАКОЎ Іван Піліпавіч, н. у 1902 у в.Нізкі, настаўнік Іванаўскай школы. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1958.

СІДАРЭНКА Сідар Майсеевіч, н. у 1896 у в.Іванаўка, старшы стрэлачнік на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Апраўданы ў тым жа годзе.

СІМАКОВА Марыя Ермалаеўна, н. у 1908 у в.Камароўка, афіцыянтка ў сталовай. Арыштавана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

СІМАКОЎ Ціхан Ігнатавіч, н. у 1909 у в.Камароўка. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

СІНЕЛЬНІКАЎ Андрэй Васілевіч, н. у 1896 у Крычаве, настаўнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1957.

СКАЛЬСКІ Уладзіслаў Восіпавіч, н. у 1896 у в.Дзедаўшчына Кіеўскай губ., механік на Крычаўскім цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1961.

СКРАЖАНКА Фёдар Фаміч, н. у 1900 у в.Баеўка, вайсковец.Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1944.

СЛІВА Якаў Мікалаевіч, н. у 1873 у в.Кулачы Сядлецкай губ., персіянер. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

СЛІЗКОЎСКАЯ Васіліса Аляксееўна, н. у 1873 у в.Стаборшчына, хатняя гаспадыня. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана ў 1958.

СЛІЗКОЎСКІ Васіль Андрэевіч, н. у 1903 у в.Бель-1, камандзір узвода.Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1958.

СЛІЗКОЎСКІ Сцяпан Андрэевіч, н. у 1908 у в.Бель-1, рабочы на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

СОБАЛЕЎ Якаў Вікенцевіч, н. у 1883 у в.Пячное былога Плешчаніцкага раёна, цясляр на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1931.

СТАПАЛЯНСКІ Васіль Мікітавіч, н. у 1971 у в.Лабковічы, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

СТАНКЕВІЧ Аляксандр Раманавіч, н. у в.Нізкі. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1994.

СТАНКЕВІЧ Антаніна Раманаўна, н. у 1919 у в.Нізкі. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1994.

СТАНКЕВІЧ Васіль Яфімавіч, н. у 1907 у в.Іванаўка, стрэлачнік на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Апраўданы ў тым жа годзе.

СТАНКЕВІЧ Венядзікт Яфімавіч, н. у 1889 у в.Іванаўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1958.

СТАНКЕВІЧ Іван Раманавіч, н. у 1902 у в.Нізкі. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1994.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, н. у 1886 у в.Іванаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1958.

СТАНКЕВІЧ Раман Паўлавіч, н. у 1864,жыў у в.Нізкі. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1994.

СТАРАВОЙТАЎ Якаў Мікітавіч, н. у в.Першамайская, калгаснік калгаса «Чырвоны колас». Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1988.

СТАРАДЫНАЎ Елісей Захаравіч, н. у 1887 у в.Маляцічы, калгаснік калгаса «Другая пяцігодка», жыў у в.Луты.Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

СТУКАЛІН Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1874 у Вільні, таварны касір на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СЦЕБІХАЎ Ілля Антонавіч, н. у 1887 у Крычаве. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

СЦЕБІХАЎ Міхаіл Абрамавіч, н. у 1912 у в.Прудок, тэхнік-дарожнік ДЭУ. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1938.

СЦЕСЕЎ Стафан Іванавіч, н. у 1879 у в.Касцюкоўка Чэрыкаўскага раёна, цясляр на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СЦЯБЛЁНКА Іван Майсеевіч, н. у 1900 у Бесарабіі, памочнік машыніста на Крычаўскім цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

Сямёнава Марыя Іванаўна, н. у 1921 у в.Шчарбачы, рахункавод калгаса. Арыштавана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

СЯРГЕЕВА Праскоўя Дзмітрыеўна, н. у 1876 у в.Дубраўка Клімавіцкага раёна,жыла ў в.Глушнева. Арыштавана ў 1932. Рэабілітавана ў 1989.

СЯРГЕЕЎ Павел Савельевіч, н. у 1907 у в.Гарбатка, служыў у 878-м стралковым палку ў Крычаве. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены 2.07.1946. Рэабілітаваны.

СЯРГУНІНА-УМБЕЯ Іда Густаваўна, н. у 1902 у Эстоніі, працавала на ст.Крычаў. Арыштавана ў 1938. Рэабілітавана ў 1989.

СЯРОЖКІН Мікалай Васілевіч, н. у 1907 у г.Вольску, жыў у Крычаве.Арыштаваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1946.

ТАКАРЭЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1898 у в.Тур'ева Аршанскага раёна, жыў у Крычаве, інжынер сувязі на тэлефонным вузле. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

ТАЛПЫГА Вера Міхайлаўна, н. у 1920 у в.Іванаўка, рабочая вугальнага склада дэпо ст.Крычаў. Арыштавана ў 1944. Рэабілітавана ў 1944.

ТАЛПЫГА Апанас Восіпавіч, н. у 1903 у в.Сакольнічы. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ТАЛПЫГА Максім Антонавіч, н. у 1893 у в.Іванаўка, стрэлачнік на ст. Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Апраўданы ў 1933.

ТАЛПЫГА Фёдар Іванавіч, н. у 1904 у в.Іванаўка, малодшы кандуктар на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1933. Апраўданы ў тым жа годзе.

ТАНЕНБЕРГ Эдуард Францавіч, н. у 1891 у Латвіі, слесар райваенкамата Крычава. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

ТАПТУНОЎ Васіль Агеевіч, н. у 1892 у в.Сенькава Магілёўскага раёна, дзяжурны паравознага дэпо ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ТАРАБОРА Лявон Майсеевіч, н. у 1911, жыў у в.Стараселле. Арыштаваны ў 1935. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ТАРАДЭЙКА Фёдар /Фядос/ Пятровіч, н. у 1906 у в.Камароўка, старшыня калгаса ў в.Камароўка. Арыштаваны ў 1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

ТАРАТУШКІН Аляксей Міхеевіч, н. у 1902 у в.Шчарбачы, цясляр. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1990.

ТАРАТУШКІН Рыгор Пятровіч, н. у 1912 у в.Шчарбачы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937.Рэабілітаваны ў 1968.

ТКАЧОЎ Кузьма Емяльянавіч, н. у 1889 у в.Бель-3, рабочы. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОЎ Міхаіл Яўменавіч, н. у 1904 у в.Бель. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1933.

ТКАЧОЎ Рыгор Ігнатавіч, н. у 1879 у в.Цінькава, рабочы на чыгуначнай ст. Цінькава. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ТОМАШ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1908 у м.Мікашэвічы, рабочы Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ТОПАНАЎ Нестар Максімавіч, н. у 1888 у в.Ананічы, калгаснік калгаса «Пралетарскі араты». Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ТОПАНАЎ Тарас Максімавіч, н. у 1931 у в.Ананічы, калгаснік калгаса «Пралетарскі араты». Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ТРАСЦЯНКА Соф'я Кліменцеўна, н. у 1886 у в.Дарлівае, настаўніца. Арыштавана ў 1929. Рэабілітавана ў 1991.

ТРЫНЧАНКА Андрэй Емяльянавіч, н. у 1897 у в.Кашаны, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ТЫМ Ян Юльянавіч, н. у 1887 на ст.Страбля Гродзенскай губ., жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

УДАКОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у в.Вярхоўцы. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

УДОВІН Міхаіл Максімавіч, н. у 1905 у в.Уласаўцы Івацэвіцкага раёна, возчык. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

УДОДАЎ Дзяніс Парфірафіч, н. у 1874 у в.Марозаўка Чарнігаўскай вобл., калгаснік калгаса «Чырвоны сцяг», жыў у в.Каменка. Арыштаваны ў 1931.Рэабілітаваны ў 1989.

УДОЎКІНА Марына Барысаўна, н. у 1895 у Крычаве, повар у сталовай спецгандлю. Арыштавана ў 1944. Рэабілітавана ў 1961.

УЛАЗОЎСКАЯ Палагея Цімафееўна, н. 1878 у в.Іванаўка, калгасніца. Арыштавана ў 1932. Рэабілітавана ў 1958.

УЛАЗОЎСКІ Ігнат Андрэевіч, н. у 1875 у в.Іванаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932, асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

УЛАСАЎ Мікіта Лявонавіч, н. у 1879 у в.Глупікі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1992.

УМЕЦКІ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1915 у в.Язва-Валасень, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

УНУКОЎСКІ Антон Восіпавіч, н. у 1879 у в.Далбені Ашмянскага павета, домработнік. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1937.

УСАЦІКАЎ Антон Іванавіч, н. у 1910 у в.Кіслаўка, саставіцель цягнікоў на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

УСАЦІКАЎ Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1910 у в.Варанёва, дзе і пражываў, грабар на фасфарытным заводзе. Арыштаваны і асуджаны ў 1938 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1940.

УСАЦІКАЎ Іван Дзмітрыевіч, жыў у в.Варанёва. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1993.

ФЕЛЬЧАРАЎ Фёдар Піліпавіч, н. у 1884 у в.Кашаны, аб'ездчык у Крычаўскім лясніцтве. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1962.

ФЛАРЫЯНОВІЧ Раман Іванавіч, н. у 1884 у в.Слабада, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929.Рэабілітаваны ў 1991.

ФРАЛОЎ Фама Піменавіч, н. у 1903 у в.Забачоў, пастух калгаса «Сацшлях». Арыштаваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1993.

ФРУЗІН Лявон Ананьевіч, н. у 1882 у в.Варанёва, калгаснік калгаса «Чырвоны араты». Арыштаваны ў 1937. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957.

ХАДЫКА Іван Іванавіч, н. у 1888 у в.Пескавічы, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ХАДЫКА Ілля Іванавіч, н. у 1894 у в.Пескавічы, настаўнік Маляціцкай СШ. Арыштаваны ў 1938.Рэабілітаваны ў 1939.

ХАНЕЎСКАЯ Еўдакія Лаўрэнаўна, жыла ў в.Мышкавічы. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1992.

ХАНЕЎСКАЯ-ВЫБАРНАЯ Алена Іванаўна, жыла у в.Мышкавічы. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1992.

ХАНЕЎСКІ Іван Панцеляймонавіч, селянін-аднаасобнік, жыў у в.Мышкавічы. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

ХАРКЕВІЧ Апанас Каліст ратавіч, н. у 1879 у в.Баёўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

Па даносу нядобразычліўца

Нашага брата, Дзмітрыя Мікалаевіча Усацікава, забралі ўначы. Яго жонка Еўдакія, а таксама дзеці, Леанід і Раіса, спалохана плакалі, дапытваліся – за што арыштоўваюць, але міліцыянеры маўчалі. Калі Дзмітрыя выводзілі з хаты, яны пагрозліва крыкнулі «не выходзіць!» і моцна ляснулі дзвярыма.

Не толькі сям'я, але ўсе, хто ведаў нашага брата ў вёсцы Варанёва, не маглі зразумець, за што забралі бяскрыўднага і стараннага працаўніка. Усе шкадавалі Дзмітрыя.

Здарылася гэта ў 1937 г. Дамоў Дзмітрый вярнуўся ў 1939 г. Гэта быў ужо аслаблы, хваравіты, з бяскроўным тварам чалавек. Ён з цяжкасцю рухаўся і пры кашлі сплёўваў згусткі крыві. Наш брат нікому нічога не расказваў.

Пражыў ён пасля гэтага некалькі гадоў. І толькі перад смерцю расказаў бацьку, што нехта напісаў на яго данос, быццам Дзмітрый нарыхтаваў шмат толу і збіраўся ўзарваць мост цераз раку Сож. На допытах яго білі, трымалі ў ледзяной вадзе па пояс цэлымі начамі, саджалі, распранутага, на вострае жалеза, прыкладвалі да цела распаленыя цвікі.

Усе катаванні мужна вытрымаў Дзмітрый і віны за сабой не прызнаў. Гэта каштавала яму жыцця. Жонка нашага брата Еўдакія памерла, так і не даведаўшыся аб яго рэабілітацыі.

А. Ашуркова.

ХАРЧЭЎНІКОЎ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1904 у Хоцімскім павеце, стралок на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1927. Рэабілітаваны ў 1928.

ХАРКЕВІЧ Сяргей Мацвеевіч, н. у 1919 у в.Глупікі, радавы Чырвонай арміі. Арыштаваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1957.

ХЛЯБАНАЎ Кірыла Захаравіч, н. у 1888 у в.Беразуйкі Мсціслаўскага раёна, рабочы на мелавым заводзе. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ХМАРА Цярэнцій Іванавіч, н. у 1878 у в.Вяжноўка Чарнігаўскай губерні, жыў у в.Каранец. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ХРАМЦОЎ Канстанцін Мікалаевіч, н. у 1897 у Гомельскай вобл., жыў у Крычаве, настаўнік. Арыштаваны ў 1933. Вызвалены ў тым жа годзе.

ХРУШЧОВА Ганна Платонаўна, жыла ў Крычаве. Арыштавана ў 1931.Рэабілітавана ў 1995.

ХРУШЧОВА Вольга Платонаўна, жыла ў Крычаве. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана 18.07.1995.

ХРУШЧОВА Кацярына Платонаўна, жыла ў Крычаве. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1995.

ХРУШЧОВА Надзея Дзям'янаўна, н. у 1891, жыла ў Крычаве.Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1995.

ХРУШЧОВА Ніка Платонаўна, жыла ў Крычаве. Арыштавана ў 1931. Рэабілітавана ў 1955.

ХРУШЧОЎ Пётр Платонавіч, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1995.

ХРУШЧОЎ Платон Яфімавіч, н. у 1890, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1995.

ЦАРКОЎ Дзмітрый Мінаевіч, н. у 1895 у в.Бель-2. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ЦАРОЎ Іван Нічыпаравіч, н. у 1909 у п.Луч, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1942. Рэабілітаваны ў 1962.

ЦАЦОХА Георгій Васілевіч, н. у 1925 у Крычаве, стралок 454-га асобнага ваенна-будаўнічага батальёна. Арыштаваны ў 1950. Рэабілітаваны ў 1955.

ЦЕХАНАВА Палагея Трахімаўна, жыла ў в.Прудок. Раскулачана. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1992.

ЦЕХАНАЎ Восіп Цітавіч, н. у 1884 у в.Прудок, механік на цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1938.

ЦЕХАНАЎ Сцяпан Платонавіч, н. у 1885 у Крычаве, рабочы спіртзавода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕХАНАЎ Стафан Платонавіч, н. у 1885 у Крычаве, пражываў у в.Прудок. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦІМАФЕЕЎ Іван Максімавіч, н. у 1889 у в.Каменка Смаленскай губерні, машыніст на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІТОЎ Іван Пракопавіч, н. у 1881 у в.Кашаны, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫБУЛЬКА Андрэй Панцялеевіч, жыў у Крычаве. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦЫГАНКОЎ Ягор Фёдаравіч, н. у 1874 у в.Бель, калгаснік калгаса «Чырвоны прамень». Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫНУНІН Васіль Сямёнавіч, н. у 1877 у в.Дзягавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1988.

ЦЭМБАЛІСТАЎ Дзмітрый Ільіч, н. у 1909 у в.Бель-1, вайсковец. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1943.

ЦЯРЭШЧАНКА Іван Карнеевіч, н. у 1896 у в.Стайкі Краснапольскага раёна, працаваў на Крычаўскім цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ЧАРНОЎ Васіль Паўлавіч, н. у 1892 у в.Бель-1, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1956.

ЧАРНОЎ Піліп Андрэевіч, н. у 1890 у в.Буда, жыў у Мсціславе, урач-хірург. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены і рэабілітаваны ў 1945.

ЧАВУСАЎ Захар Мацвеевіч, н. у 1890 у Крычаве, настаўнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1939.

ЧАВУСАЎ Фёдар Захаравіч, н. у 1900 у Крычаве, дзе і пражываў, загадчык вытворчасці райпрамкамбіната. Арыштаваны ў 1944. Вызвалены ў снежні 1944. Рэабілітаваны.

ЧЫЖ Васіль Міхайлавіч, н. у 1892 у в.Дарлівае, старшыня калгаса «Свабода». Асуджаны ў 1944 на 10 гадоў зняволяння ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ЧЫЖ Ларывон Міхайлавіч, н. у 1889 у в.Дарлівае, аб'ездчык у Крычаўскім лясніцтве. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1962.

ЧЫЖ Міхаіл Урбанавіч, н. у 1894 у в.Макаўё, кладаўшчык у калгасе. Арыштаваны і асуджаны. Рэабілітаваны ў 1962.

ЧЫЖ Павел Цітавіч, н. у 1890 у в.Дарлівае, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЫЖ Пётр Міхайлавіч, н. у 1900 у в.Дарлівае, старшыня калгаса. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЫЖЭЎСКІ Стафан Іванавіч, н. у 1898 у в.Іванаўка, калгаснік. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧУБАНАЎ Андрэй Селівестравіч, н. у 1905 у Крычаве, загадчык школы ў в.Кліны.Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

ЧУБКОЎ Пётр Іванавіч, н. у 1888, рымар на фасфарытным заводзе ў Крычаве. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1956.

ЧУМАКОЎ Сяргей Аляксеевіч, н. у 1907 у в.Лабковічы.Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ЧУНАЕЎ Павел Міканоравіч, н. у 1902 у в. Раманаў Вугал, калгаснік калгаса імя Сталіна. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧУПРУКОЎ Васіль Дзянісавіч, н. у 1878 у в.Прахораўка, працаваў на спіртзаводзе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

ЧУРАК Анісім Філімонавіч, н. у 1909 у Гродзенскай губерні, рабочы Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЭЧЫКАЎ Кузьма, жыў у в.Маляцічы. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

ЧЭЧЫКАЎ Малах Кузьміч, жыў у в.Маляцічы. Раскулачаны. Рэабілітаваны ў 1992.

ШАМАЎНЁЎ Пётр Ягоравіч, н. у 1884 у в.Асавец, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАМРО-МЕТМАН Надзея Максімаўна, н. у 1908 у в.Лукінец, жыла ў Крычаве.Арыштавана ў 1938. Рэабілітавана ў 1989.

ШАМРЫНА Марыя Васілеўна, жыла ў в.Зарубец. Раскулачана. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1992.

ШАМРЫН Максім Уласавіч, н. у в.Дзягавічы. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

ШАПАЧНІКАЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1882 у Чарнігаўскай губерні, урач на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1937.

ШАРЭЙКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1885 у в.Міхеевічы. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ШАРЭЙКА Андрэй Ільіч, н. у 1892 у в.Міхеевічы. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1960.

ШАТКІН Іван Палікарпавіч, н. у 1884 у в.Камароўка. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЎКУНОЎ Андрэй Усцінавіч, н. у 1889 у Крычаве, настаўнік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1939.

ШАЎКУНОЎ Стафан Несцеравіч, н. у 1890 у Крычаве. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

ШАЎЦОЎ Архіп Сідаравіч, н. у 1915 у в.Вародзькава. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1964.

ШАЎЦОЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1872 у в.Вародзькава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАХРАЙ Васіль Іванавіч, н. у 1877 у Крычаве, цясляр. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1938.

ШАХРАЙ Іван Васілевіч, н. у 1905 у Крычаве, цясляр у Крычаўскім райкамунгасе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫШКО Антаніна Іванаўна, н. у 1869 у в.Іванаўка. Арыштавана ў 1929. Рэабілітавана ў 1991.

ШЫШКО Мікалай Міхайлавіч, н. у в.Бацьвінаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1991.

ШЫШКО Міхаіл Антонавіч, н. у 1868 у в. Бацьвінаўка. Арыштаваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1991.

ШКУТ Аляксандр Кузьміч, н. у 1910 у в.Марока Лунінецкага раёна, муляр на Крычаўскім цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1953.

ШКУТ Праскоўя Іванаўна, н. у 1912, жыла ў Крычаве. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана ў 1993.

ШЫЛАВА Антаніна Елісееўна, н. у 1919 у Крычаве, рэгістратар у Крычаўскай амбулаторыі. Арыштавана ў 1944. Рэабілітавана ў 1946.

ШМАТКОЎ Віктар Яўхімавіч, н. у 1887 у в.Бель-2. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1956.

ШОКАЛЬСКАЯ Алена Аляксандраўна, н. у 1921 у Крычаве. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана ў 1994.

ШОКАЛЬСКІ Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1890. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1994.

ШОКАЛЬСКАЯ Антаніна Аляксандраўна, н.

у 1928 у Крычаве. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана ў 1994.

ШОКАЛЬСКАЯ Юлія Варнаваўна, н. у 1900. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана ў 1994.

ШУЛЬГА Аляксандр Лазаравіч, н. у 1896 у в.Жудзілава, жыў на ст.Крычаў, памочнік начальніка станцыі. Арыштаваны ў 1933. Апраўданы ў тым жа годзе.

ШУЛЬГА Барыс Васілевіч, н. у 1917 на Украіне, жыў у Крычаве, радыёмеханік у канторы сувязі. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1944.

ШУМАН Меер Ізраілевіч, н. у 1919 у в.Маляцічы, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1942. Рэабілітаваны ў тым жа годзе.

ШУНЬКО Сямён Іванавіч, н. у 1888 у в.Вепрын Чэрыкаўскага раёна. Арыштаваны ў 1932. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

ШУТКОЎ Парфён Яфімавіч, н. у 1902 у в.Плешчына, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1942.

ШУФЕР Ісай Самуілавіч, н. у 1923 у Крычаве, служыў у Чырвонай арміі. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1959.

ШЧАБРАКОЎ Аўрам Піліпавіч, н. у 1904 у в.Каранец, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЧАРБАКОЎ Пётр Восіпавіч, н. у 1894 у в.Шчарбачы, калгаснік калгаса імя Варашылава. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

ШЧУРЫН Канстанцін Ягоравіч, н. у 1912 у в.Лабковічы, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1943.

ШЭВЕЛЕЎ Сяргей Ферапонтавіч, н. у 1918 у в.Варанёва, бухгалтар. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1944.

ЮДЗЕНІЧ Кліменцій Уладзіміравіч, н. у 1874 у в.Бель, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРУНОВА Ксенія Арсенаўна, н. у 1900, жыла ў в.Касцюкоўка. Арыштавана ў 1930.

ЮРУНОВА Таццяна Андрэеўна, н. у 1923 у в.Касцюкоўка. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана ў 1993.

ЮРУНОЎ Андрэй Лукіч, н. у 1898, жыў у в.Касцюкоўка.Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1993.

ЯГАНСОН Эрнест Іванавіч, н. у 1891 на х.Пусташ Клімавіцкага раёна, жыў у в.Каранец, рабочы на Крычаўскім цэментным заводзе. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЗЕРСКАЯ Кацярына Паўлаўна, н. у 1911 у в.Сакольнічы. Раскулачана. Арыштавана ў 1932. Рэабілітавана ў 1992.

ЯЗЕРСКАЯ Ніна Яфімаўна, н. у 1924 у в.Макаўе, рабочая на ст.Лупалава-2. Арыштавана ў 1944. Вызвалена ў 1946. Рэабілітавана ў тым жа годзе.

ЯЗЕРСКАЯ Таццяна Яфімаўна, н. у 1903 у в.Макаўе. Арыштавана ў 1944 як здрадніца Радзімы. Рэабілітавана ў 1945.

ЯЗЕРСКІ Дзмітрый Паўлавіч, н. у 1904 у в.Сакольнічы. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1992.

ЯЗЕРСКІ Іван Дзям'янавіч, н. у 1878 у в.Макаўе, калгаснік. Арыштаваны і асуджаны. Рэабілітаваны ў 1962.

ЯЗЕРСКІ Ігнат Антонавіч, н. у 1881 у в.Макаўе, калгаснік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЗЕРСКІ Ігнат Антонавіч, н. у 1897 у в.Макаўе, калгаснік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЗЕРСКІ Ігнат Аляксандравіч, н. у 1936 у в.Макаўе. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1938.

ЯЗЕРСКІ Іосіф Браніслававіч, н. у 1887 у в.Макаўе, рабочы саўгаса «Перамога». Арыштаваны і асуджаны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1962.

ЯЗЕРСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1883 у в.Хацілавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны і асуджаны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1962.

ЯЗЕРСКІ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1891 у в.Макаўе, калгаснік калгаса «Прыгажосць». Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЗЕРСКІ Мікалай Пятровіч, н. у 1932 у в.Макаўе, чырвонаармеец. Арыштаваны ў 1942. Рэабілітаваны ў 1960.

ЯЗЕРСКІ Нічыпар Палікарпавіч, н. у 1899 у в.Макаўе, калгаснік калгаса «Прыгажосць» Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1939.

ЯЗЕРСКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1908 у в.Макаўе, калгаснік калгаса «Прыгажосць». Арыштаваны ў 1938. Апраўданы судом у 1939.

ЯКАЎЛЕЎ Ігнат Нічыпаравіч, н. у 1894 у в.Лабковічы, загадчык фермы ў калгасе. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУБЕНКА Андрэй Цімафеевіч, н. у 1887 у в.Паланіца, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУБЕНКА Піліп Карнеевіч, н. у 1888 у в.Паланіца. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1992.

ЯКУБЕНКА Цімафей Іванавіч, н. у 1894, селянін-аднаасобнік, жыў у в.Луты. Арыштаваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1992.

ЯКУБОВІЧ Максім Міхайлавіч, н. у 1912 у в.Вольна Лунінецкага павета, слесар Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУШАЎ Апанас Лаўрынавіч, жыў у в.Дзягавічы. Раскулачаны. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

ЯЛЕЦ Павел Апанасавіч, н. у 1888 у г.Мена Чарнігаўскай вобл., цясляр на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯНЧАНКА Лука Мацвеевіч, н. у 1886 у в.Вепрын Чэрыкаўскага раёна. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

ЯНЧАНКА Ціт Мацвеевіч, н. у 1887 у в.Вепрын Чэрыкаўскага раёна. Арыштаваны ў 1933. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

ЯПІХІН Іван Фёдаравіч, н. у 1891 у в.Камельчына Калужскай вобл., аглядчык вагонаў на ст.Крычаў. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1933.

ЯРМОЛІН Сцяпан Іванавіч, н. у 1906 у в.Ляхаўка Лунінецкага павета, муляр у рамонтна-будаўнічым трэсце Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1954.

ЯСЕЎ Даніла Андрэевіч, н. у 1895 у в.Прусіна, пуцявы абходчык на раз'ездзе Дарлівае. Арыштаваны ў 1938. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ЯСІНСКІ Герасім Харытонавіч, н. у 1883 у в.Стараселле, настаўнік Старасельскай школы. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯСІНСКІ Карл Восіпавіч, н. у 1885 у в.Вербы Барашэйскага раёна на Украіне, працаваў на ст.Крычаў. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯСІНСКІ Станіслаў Восіпавіч, н. у 1897 у в.Вербы Барашэўскага раёна на Украіне, працаваў у сельпо. Арыштаваны і рэабілітаваны ў 1935.

ЯСІНСКІ Ягор Харытонавіч, н. у 1880 у в.Стараселле, калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРМОЛІН Васіль Нічыпаравіч, н. у 1909 у в.Сітніца Лунінецкага павета, рабочы Крычаўскага цэментнага завода. Арыштаваны і асуджаны ў 1937. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1963.

ЯФІМАЎ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1903 у в.Крукава Рузаўскага павета Маскоўскай губерні, жыў у Крычаве. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1938.

ЯЎГЕНАЎ Аляксандр Ягоравіч, н. у 1911 у в.Каранец, жыў у Манчагорску, электраманцёр камбіната «Севераніkель». Арыштаваны ў 1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ЯЎГЕНАЎ Георгій Яўціхавіч, н. у 1886 у в.Ярмоленка Чарнігаўскай губерні, жыў у в.Каранец. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЎГЕНАЎ Ягор Яўціхавіч, н. у 1886 у в.Ермалейка, селянін-аднаасобнік, жыў у п.Крыстаполле. Высланы ў 1931. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

Падрыхтаваў В.Цітоў.

Лёс Ягора Яўгенава

У свае 45 гадоў Ягор Яўгенаў у пасёлку Крыстаполле лічыўся гаспадаром моцным. І не толькі ў сваім пасёлку, а ва ўсёй акрузе не адшукаць было больш працавітага мужыка. Акрамя дыхтоўнага дома-пяцісценкі, у яго гаспадарцы меліся гумно, лазня, хлеў, павеці, конь, 2 каровы, 5 авечак, 8 калодаў пчол. Былі свая веялка, малатарня, саламарэзка. Сям'я апрацоўвала 5 гектараў ворыва, мела 2 гектары сенажацяў, 3 гектары лесу, 2 гектары няўдобіцы. Але ж сям'я была немаленькая: гаспадар з жонкай Хрысцінай Пятроўнай і пяцёра дзетак. Старэйшаму, Аляксандру, споўнілася 19 гадоў і ён быў незаменным памочнікам у бацькі. Астатнія – Пятро, Васіль, Мікола і Надзя былі яшчэ малалеткамі. Пятрок у свае 14, як і ўсе вясковыя падлеткі, разам са старэйшым братам і бацькам і зямлю араў, і касіў, і сеяў.

Сям'я жыла калі і не ў вялікім дастатку, то ўсё ж не галадала. І калі паўстала пытанне аб уступленні сям'і ў калгас, Ягор Яўгенаў наадрэз адмовіўся абагульняць нажытую сваімі мазалямі і потам гаспадарку. Але ў той час улады з такімі, як ён, доўга не цырымоніліся. Па пастанове «тройкі» Ягора Яўгенава ў 1931 г. адправілі на 5 гадоў у лагер – будаваць Беламорска-Балтыйскі канал. А сям'ю яго выслалі ў Молатаўскую вобласць. Уся гаспадарка перайшла да мясцовага калгаса «Чырвоны партызан».

На будаўніцтве канала Яўгенаў праявіў сябе настолькі сумленным працаўніком, што яго датэрмінова вызвалілі. Вярнуўшыся ў родныя мясціны ў 1932 г., ён знайшоў сваю сям'ю, якая тулілася па чужых кутках. Ягор, як чалавек працалюбівы, хацеў пачаць жыццё з пачатку. Але такім, як ён, жылося цяжка: кулак, турэмшчык, антысаветчык.

5 гадоў дабіваўся справядлівасці Яўгенаў – звяртаўся да ўладаў з просьбай хаця б патлумачыць яму, за што так жорстка абышліся з ім і яго сям'ёй. Адказу ён так і не дачакаўся. А ў 1937 г. Ягора Яўгенава арыштавалі. На гэты раз прыгавор «тройкі» быў трагічны – расстраляць за антысавецкую прапаганду. Бязлітасна абышліся і са старэйшым сынам Аляксандрам, які ў гэты час даў-

но ўжо працаваў за тысячы кіламетраў ад дому, электраманцёрам у Манчагорску на камбінаце «Североникель». Яго арыштавалі 8.08.1937 г. і асудзілі на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў.

Вось такая доля спасцігла ў той жахлівы 1937 год сям'ю Яўгенавых. Толькі праз шмат гадоў бацьку і сына рэабілітавалі.

Час аднавіў яго добрае імя, але ўжо не для яго самога, а для нашчадкаў.

В. Цітоў.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

На мяжы жыцця і смерці

На досвітку 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор ад ненападзенні, пачала вайну супраць СССР.

Непасрэдна на Беларусь наступала нямецкая група армій «Цэнтр» (камандуючы ген.-фельдмаршал Ф.Бок). У яе склад уваходзілі дзве палявыя арміі (4-я і 9-я) і дзве танкавыя групы (2-я і 3-я) – усяго 50 поўнасцю ўкамлектаваных дывізій (у тым ліку 9 танкавых, 6 матарызаваных і 1 кавалерыйская) і дзве матарызаваныя брыгады. Групу армій падтрымліваў 2-і паветраны флот – 1600 самалётаў. Акрамя таго, ёй было прыдадзена больш за трэць усіх інжынерных і дарожна-будаўнічых войск і каля палавіны асобных артылерыйскіх, зенітных і супрацьтанкавых дывізіёнаў і батарэй рэзерву сухапутных сіл Германіі. Іх удар на граніцы прынялі на сябе арміі: 3-я (ген.-лейт. В.І.Кузняцоў), 10-я (ген.-маёр К.Дз.Голубеў) і 4-я (ген.-маёр А.А.Карабкоў). У палосе абароны 4-й арміі вораг меў больш як пяцікратную перавагу ў жывой сіле, амаль трохкратную ў танках, больш як трохкратную ў артылерыі і двухкратную ў авіяцыі. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне байцоў Чырвонай арміі, войскі Заходняга фронту не змаглі стрымаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія імкліва рваліся на ўсход.

Жыхары раёна мужна сустрэлі цяжкую вестку аб пачатку вайны. Адразу ж адбылося пасяджэнне бюро райкома партыі.

Партыйныя і камсамольскія работнікі раз'ехаліся на прадпрыемствы, у сельсаветы і калгасы, дзе правялі мітынгі і сходы з прычыны нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. На мітынгах яны растлумачвалі працоўным парадак правядзення мабілізацыі ў Чырвоную армію. У сваіх выступленнях рабочыя, калгаснікі, служачыя заяўлялі аб рашучасці са зброяй у руках абараняць Радзіму.

Уначы з 22 на 23 чэрвеня зноў адбылося пасяджэнне бюро райкома КП(б)Б. Было вырашана на прадпрыемствах, ва ўстановах горада і сельскіх Саветаў наладзіць кругласутачнае дзяжурства каля тэлефонаў, стварыць у горадзе і сельскай мясцовасці спе-

цыяльныя атрады па барацьбе з нямецкімі дыверсантамі. Таксама быў намечаны план абароны горада Крычава.

У першыя дні вайны жыццё ў горадзе і раёне ішло без мітусні. Усе прадпрыемствы і ўстановы працавалі як звычайна. Але трывожнае пачуццё ўжо нікога не пакідала. Праз горад з заходніх раёнаў нашай рэспублікі на ўсход рухаліся вялізныя калоны бежанцаў – старыя, жанчыны, дзеці. Яны ехалі на падводах, аўтамашынах, ішлі пешшу. Нямецкія самалёты пастаянна бамбілі і абстрэльвалі іх.

Райком партыі і выканком райсавета аказвалі бежанцам усялякую дапамогу. Быў створаны пункт па забеспячэнню эвакуіраваных у савецкі тыл людзей вопраткай, абуткам і прадуктамі харчавання. На чыгуначнай станцыі Крычаў для эвакуіраваных была абсталявана сталовая, дзе яны маглі атрымаць бясплатныя абеды.

У пачатку ліпеня 1941 г. у райком патэлефанаваў ваенны камендант станцыі Крычаў і папрасіў, каб на станцыю, у камендатуру, тэрмінова прыбыў сакратар райкома КП(б)Б. У гэты час у райком партыі зайшоў начальнік райаддзела ўнутраных спраў Нікіфараў і заявіў, што яго таксама выклікалі. І яны, Рэуцкі і Нікіфараў, разам паехалі на аўтамашыне на чыгуначную станцыю да ваеннага каменданта. Той заявіў, што іх выклікае Маршал Савецкага Саюза С.М.Будзённы, які ноччу прыехаў у Крычаў. Будзённы цікавіўся, як ідуць тут справы, чым займаецца раённая партыйная арганізацыя. Рэуцкі коратка далажыў аб абстаноўцы, аб запланаванай эвакуацыі на ўсход калгаснай жывёлы. Маршал даў указанне неадкладна прыступіць да эвакуацыі цэментнага завода і іншых прадпрыемстваў, а таксама ўсяго каштоўнага абсталявання, што мелася ў раёне. Сакратар райкома партыі папрасіў С.М.Будзённага накіраваць у Крычаў ваенных спецыялістаў – будаўнікоў абарончых аб'ектаў. Дарэчы, гэтыя спецыялісты ў той жа дзень прыбылі ў раён.

Узмацніліся работы па рыццю супрацьтанкавых ірвоў, устаноўцы надаўбняў і будаўніцтву эскарпаў па рацэ Сож. Пад кіраўніцтвам ваенных спецыялістаў вялося будаўніцтва часовых аэрадромаў для пасадкі ваенных самалётаў.

Характэрна, што за кароткі час жыццё ў горадзе і раёне было перабудавана на ваенны лад.

Актыўную работу праводзіў ваенкамат. Аператыўна быў праведзены прызыў у Чырвоную армію воінаў запасу. 11 ліпеня 1941 г. былі прызваны ў армію юнакі, якія нарадзіліся ў 1922–1923 гг. 12 ліпеня з прызыўнога пункта, які знаходзіўся ў лесе каля вёскі Прудок, калоны прызыўнікоў накіраваліся на ўсход, у горад Ялец Арлоўскай вобласці. Была праведзена пэўная работа па падрыхтоўцы да разгортвання падпольнай і партызанскай барацьбы ў выпадку акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Райком КП(б)Б падбіраў людзей для падпольнай работы, рыхтаваў явачныя кватэры, устанаўліваў паролі. Для разгортвання партызанскай барацьбы ў тыле ворага была створана група на чале з дырэктарам сярэдняй школы імя Сталіна, кандыдатам у члены партыі Іванам Рыгоравічам Бальшуновым. 11 ліпеня 1941 г. партызанская група была зацверджана на бюро райкома партыі, а 12 ліпеня адпраўлена ў раён Рослаўля для праходжання адпаведнай падрыхтоўкі. Інструкцыі даваў сакратар ЦК КП(б)Б Р.Б.Эйдзінаў.

...Нягледзячы на стойкае і мужнае супраціўленне савецкіх войск, вораг рваўся на ўсход.

Пасля захопу Магілёва 2-я танкавая група Гудэрыяна нанесла ўдар па правым крыле Цэнтральнага фронту ў напрамку Крычаў – Рослаўль. У сярэдзіне ліпеня войскі праціўніка прарваліся да р.Сож на ўчастку Прапойск (Слаўгарад) — Крычаў – Мсціслаў. 17.7.1941 г. захапілі Крычаў. Аднак фарсіраваць Сож з ходу і развіць наступленне ворагу не ўдалося. У раёне Крычава ўздоўж левага берага р. Сож абарону трымалі воіны 6-й (палкоўнік М.А.Папсуй-Шапко), 132-й (генерал-маёр С.С.Бірузоў), 137-й (палкоўнік І.Ц.Грышын) стралковых дывізій, 4-га паветрана-дэсантнага корпуса (генерал-маёр А.С.Жадаў), Ленінградскага камуністычнага батальёна і іншых часцей Заходняга, з 24.7.1941 г. Цэнтральнага фронту.

У ходзе абарончых баёў воіны ўсіх часцей Чырвонай арміі змагаліся з ворагам па-геройску, мужна і храбра, наносячы адчувальныя ўдары па гітлераўцах. 17.7.1941 г. пасля ўпартых баёў з пераважаючымі сіламі ворага савецкія воіны вымушаны былі пакінуць Крычаў, пераправіцца цераз р. Сож і заняць абарону ўздоўж берага. 6-я стралковая дывізія прыкрывала адыход 13-й арміі, вяла баі супраць 14-й нямецкай танкавай дывізіі. Калі варожыя танкі падышлі да ракі, артылерыя адкрыла агонь. Пасля першых выстралаў загарэліся галаўны танк і бронемашына праціўніка. Некалькі танкаў загрузлі ў балоце каля моста. Фашысцкія танкісты і аўтаматчыкі скіравалі агонь па гармаце, якая была замаскіравана ў жыце. Хутка з усяго яе разліку жывым застаўся наводчык старшы сяржант Мікалай Уладзіміравіч Сірацінін. Ранены, ён працягваў весці бой, прыкрываючы адыход таварышаў. У гэтым баі М.У.Сірацінін загінуў. Ён быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Яго імем названы вуліцы ў Крычаве і Арле (тут у 1921 г. нарадзіўся М.У.Сірацінін). Група байцоў 4-га паветрана-дэсантнага корпуса, якой камандаваў лейтэнант А. Савін, атакавала адну з калон праціўніка. З крыкамі «Ура» воіны кінуліся на ворага, завяршылі разгром праціўніка гранатамі. Фашысты не вытрымалі націску дэсантнікаў. А на полі бою палалі нямецкія грузавікі і аўтобусы. У руках дэсантнікаў апынуліся штабныя дакументы і сцяг варожага палка.

29 ліпеня група (1200 чал.) 4-га паветрана-дэсантнага корпуса пад камандаваннем В.С.Цімчанкі выбіла немцаў з горада і каля 2 сутак змагалася ў акружэнні з ворагам, які падцягнуў рэзервы. Часці Чырвонай арміі ўтрымлівалі фронт на р. Сож на ўчастку Мсціслаў – Крычаў да 1 жніўня, на ўчастку Крычаў – Прапойск да 8 жніўня, у акружэнні савецкія воіны працягвалі змагацца да 16.8.1941 г., чым скавалі значныя сілы праціўніка ў перыяд Смаленскай бітвы 1941 г.

У сваіх мемуарах Сяргей Сямёнавіч Бірузоў успамінаў:

«З паветра нас безупынна бамбілі фашысцкія самалёты. На зямлі цяснілі танкі... Многія толькі тут упершыню ўбачылі, як падаюць мёртвымі іх таварышы, скошаныя кулямі або асколкамі, як сыходзяць крывёю тыя, з кім яны зусім яшчэ нядаўна елі з аднаго кацялка, спалі побач, дзяліліся радасцямі і горам. Нямала мы ў той дзень перажылі, і кожны канчаткова зразумеў, што вайна – гэта жорсткая і бязлітасная барацьба, якая патрабуе

намаганння ўсіх маральных і фізічных сіл, найвялікшай стойкасці, вытрымкі і рашучасці ахвяраваць сабой у імя Радзімы».

Камандуючы 2-й танкавай групы войск Гудэрыян пісаў: «...Перед тем как перейти в наступление на Москву или предпринять какую-либо другую операцию, нам (2-й танковой группе) необходимо было предварительно выполнить еще одно условие: обеспечить свой правый фланг у Кричева, расположенный глубоким уступом назад. Очистка этого фланга от войск противника была необходима еще и для того, чтобы облегчить 2-й армии наступление на Рогачев... Оба штаба (группы армий «Центр» и командования танковой группы... — *Ред.*) считали, что основной нашей задачей должно явиться развитие наступления на Москву. Однако, несмотря на это, из штаба группы армий, очевидно под давлением ОК, все еще продолжали поступать неоднократные требования «перебросить некоторые танковые части на Пропойск (Славгород)». Все недоразумения, связанные с этими требованиями, были улажены решением генерала Гейера, желавшего избавиться от постоянного давления на свой правый фланг путем наступления на противника южнее Кричева в районе Милославичи. Я согласился с этим решением, получив также одобрение штаба группы армий, отказавшегося от своего требования послать танки в направлении на Пропойск (Славгород).

8 августа я направился в корпуса и дивизии, расположенные в Рославле и южнее, а 9 августа присутствовал при наступлении 24-го корпуса... 10 августа по неизвестным для меня причинам было получено приказание направить во Францию 2-ю танковую дивизию, которая до того находилась в резерве ОКХ.

Наступление на Гомель 2-й армии за последнее время задерживалось плохим состоянием дорог. К 14 августа успешно закончились бои, которые 24-й танковый корпус вел в районе Кричева. Захвачено было много пленных, артиллерийских орудий и других трофеев...

16 августа 3-я танковая дивизия овладела узловым пунктом шоссейных дорог городом Мглин...

17 августа правый фланг 24-го танкового корпуса сильно отстал в результате упорного сопротивления противника...».

Гудериан Гейнц. Воспоминания солдата. Перевод с немецкого. М., 1954. С. 180, 184–187, 189.

У кровапралітных баях за Крычаўшчыну страчвалі сілы савецкія войскі. Асобныя групы воінаў адступілі, а таксама працягвалі змагацца з ворагам на акупаванай тэрыторыі. Чырвонаармейцы, якія не выйшлі з варожага акружэння, уліліся ў партызанскія атрады, стваралі падполле.

На Крычаўшчыне, як на ўсёй Беларусі, наступіў новы этап у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў: разгортвалася партызанская вайна.

В.Ф. Куліненка.

Абаранялі Крычаўшчыну

АСТАШЭНКА Фёдар Апанасавіч. Нарадзіўся 19.6.1896 г. у в. Вял. Любшчына Віцебскага раёна. Генерал-лейтэнант. Герой Савецкага Саюза (1945). У

Чырвонай арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1938 г. закончыў курсы «Выстрал». У час абароны крычаўскага плацдарма ў ліпені—жніўні 1941 г. быў намеснікам камандзіра 6-й стралковай дывізіі. У 1942 г. скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. Камандзір 57-га стралковага корпуса 53-й арміі 2-га Украінскага фронту. Умела арганізаваў наступленне на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі. Пасля вайны працягваў службу ў арміі, працаваў старшым выкладчыкам Ваеннай акадэміі Генштаба. Узнагароджаны ордэнам Леніна (двойчы), ордэнам Чырвонага Сцяга (тройчы), ордэнам Суворава II ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 27.10.1976 г.

БІРУЗОЎ Сяргей Сямёнавіч. Нарадзіўся 21.8.1904 г. у г.Скопін Разанскай вобл. Маршал Савецкага Саюза (1955). Герой Савецкага Саюза (1958). У Чырвонай арміі з 1922 г. Скончыў Ваенную школу імя ВЦВК у 1926 г., Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе ў 1937 г.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Быў камандзірам 132-й стралковай дывізіі, якая вяла абарончыя баі ў раёне Крычава. Начальнік штаба арміі, затым — фронту. З кастрычніка 1944 г. камандуючы 37-й арміяй, галоўны ваенны саветнік пры балгарскай арміі.

Пасля вайны камандаваў войскамі Прыморскай ваеннай акругі, быў галоўнакамандуючым Цэнтральнай групы войск. З 1955 г. галоўнакамандуючы войскамі ППА – намеснік міністра абароны СССР. У 1962–1963 гг. – намеснік міністра абароны, галоўнакамандуючы ракетнымі войскамі стратэгічнага прызначэння. З 1963 г. начальнік Генштаба Узброеных Сіл СССР – 1-ы намеснік міністра абароны СССР. Член ЦК КПСС з 1961 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 2-га, 4—6-га скліканняў. Народны Герой Югаславіі. Узнагароджаны 5-ю ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга (тройчы), ордэнамі Суворава I і II ступені, Кутузава I-й ступені, Багдана Хмяльніцкага I ступені, медалямі, замежнымі ордэнамі.

Загінуў 19.10.1964 г. у авіяцыйнай катастрофе.

ГРЫШЫН Іван Ціханавіч. Нарадзіўся 16.12.1901 г. у в.Унукавічы Рослаўскага раёна Смаленскай вобл. Генерал-палкоўнік (1945), Герой Савецкага Саюза (1945). У Чырвонай арміі з 1920 г. Скончыў Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1936). З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах: камандзір 137-й стралковай дывізіі, начальнік штаба 50-й, потым 11-й гвардзейскай армій, з чэрвеня 1943 г. камандуючы 49-й арміяй. Удзельнік Смаленскай аперацыі 1943 г., Беларускай аперацыі 1944 г., Усх.-Прускай аперацыі 1945 г. Армія пад яго камандаваннем вызначылася

С.С. Бірузоў.

І.Ц. Грышын.

ў баях за вызваленне Магілёва, пры фарсіраванні Дняпра, Друці, Бярэзіны, удзельнічала ў ліквідацыі мінскага «катла». Пасля вайны на камандных пасадах у Савецкай арміі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (двойчы), 5-ю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава I ступені (двойчы), ордэнамі Кутузава I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 20.6.1951 г.

ЖАДАЎ Аляксей Сямёнавіч. Нарадзіўся 30.03.1903 г. у с.Нікольскае Свярдлоўскага раёна Арлоўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (1945), генерал арміі (1955). У Чырвонай арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1934), Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1950). З чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце – камандуючы 4-м паветрана-дэсантным корпусам, які вёў абарончыя баі на рубяжы Бярэзіна – Сож. Начальнік штаба 3-й арміі на Цэнтральным і Бранскім франтах. У кастрычніку 1942 – маі 1945 г. – камандуючы 66-й (з красавіка 1943 г. 5-я гвардзейская) арміяй, якая ўдзельнічала ў Курскай бітве ў 1943 г., у бітве за Дняпро ў 1943 г., у вызваленні Украіны, у Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацыях. Пасля вайны на адказных пасадах у Савецкай арміі. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1946–1950). Узнагароджаны ордэнам Леніна (тройчы), ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, 5-ю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава I ступені (двойчы), ордэнамі Кутузава I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, замежнымі ордэнамі.

Памёр 10.11.1977 г.

КАЗАНКІН Аляксандр Фёдаравіч. Ваяваў з басмачамі, удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне. У час абароны Крычаўскага ўмацаванага раёна быў начальнікам штаба 4-га паветрана-дэсантнага корпуса. У прадстаўленні да ўзнагароды ордэнам Чырвонага Сцяга паведамлялася: «В боях на р.Березина и под Кричевом своим непосредственным участием в частях и на поле боя обеспечивал управление частями корпуса в бою. Проявил исключительную силу и энергию для обеспечения выполнения задач, поставленных высшим командованием для наведения должного порядка в частях, непосредственного контроля и руководства действиями частей. За проделанную работу по руководству управлением корпуса в боях достоин награждения орденом Красного Знамени (ЦАМА РФ. Ф. 1033. Воп.1. Спр. 3. Л. 29).

Пасля вайны А.Ф. Казанкін працаваў на адказных пасадах у Міністэрстве абароны СССР.

Узнагароджаны 6-ю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Леніна (двойчы), ордэнам Суворава II ступені, ордэнам Багдана Хмяльніцкага, ордэнам Кутузава I ступені, медалямі.

Памёр 20.3.1955 г.

А.С. Жадаў.

А.Ф. Казанкін.

КОЦАР Максім Дзянісавіч. Нарадзіўся ў 1904 г. на Украіне.У Чырвонай арміі з 1926 г. У час абароны Крычаўшчыны ў званні капітана быў памочнікам начальніка аператыўнага аддзялення штаба 4-га паветрана-дэсантнага корпуса. У прадстаўленні камандавання да ўрадавай узнагароды адзначана, што «тов. Коцарь в течение войны выполнял ряд оперативных заданий командования корпуса по связи и управлению частями, пробираясь под артиллерийским и пулеметным огнем противника, взаимодействию авиации и диверсионных групп. В бою на р. Березине, Ослик и Сож тов. Коцарь всегда стремился быть на передовых позициях, проявлял исключительное упорство и энергию для лучшего выполнения задач частями по разгрому немецких фашистов. Им лично организован и подготовлен десант в 50 человек для разгрома немецких танков в г. Горках».

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф.1033. Воп.1. Спр.3. Л.27.

Ленінградскі камуністычны батальён

Прымаў удзел у абароне Крычаўскага ўмацаванага раёна (камандзір ст.лейтэнант Дз.Я.Пранішнікаў). Падпарадкоўваўся непасрэдна камандаванню 6-й стралковай дывізіі. У яго склад уваходзілі камуністы-добраахвотнікі, інжынеры, рабочыя ленінградскіх заводаў і фабрык, студэнты вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў горада. У выключна цяжкіх умовах разам з воінскімі падраздзяленнямі стралковай дывізіі яны адбівалі атакі ворага. Вось загарэўся адзін, другі, трэці нямецкі танк. Па некалькі разоў на дзень ішлі ў контратакі. Гінулі фашысты, але радзелі і рады добраахвотнікаў. Нямногім з батальёна ўдалося вырвацца з акружэння. Сам камандзір Дз.Я.Пранішнікаў, ураджэнец пас. Дабранка Чарнігаўскай вобласці, загінуў на Клімаўшчыне.

Дз.Я. Пранішнікаў.

ПАПСУЙ-ШАПКО Міхаіл Антонавіч. Нарадзіўся 23.2.1900 г. у г. Енакіева Данецкай вобл. Удзельнік абарончых баёў на Беларусі ў 1941 г. У Чырвонай арміі з 1918 г., удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў 14-ю пяхотную школу камандназа саставу ў Палтаве (1923), Ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе (1940). З сакавіка 1941-га – камандзір 6-й Арлоўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якая дыслацыравалася ў Брэсце. 22.6.1941 г. часці дывізіі пад камандаваннем палкоўніка Папсуй-Шапко ў

ліку першых сустрэлі праціўніка, потым стрымлівалі яго наступленне пад Жабінкай, Кобрынам, на подступах да Пінска. 12.7.1941 г. дывізія заняла абарону на Крычаўскім напрамку па р. Сож у раёне Чэрыкава. 14.7.1941 г. вылучаны з дывізіі атрад (у складзе 84-га сп і 3-га бат. 125-га сп) пад яго камандаваннем выйшаў на рубеж Хіславічы – Парадзіна (раён Мсціслава) і ў жорсткіх баях паспяхова адбіваў бесперапынныя атакі намнога большых сіл праціўніка. Тут Папсуй-Шапко загінуў. Пад Крычавам у гонар абаронцаў горада, у тым ліку байцоў, якімі камандаваў Папсуй-Шапко, пастаўлены помнік.

САНДАЛАЎ Леанід Міхайлавіч. Нарадзіўся 10.4.1900 г. у г. Вічуга Іванаўскай вобл. Генерал-палкоўнік (1944). У Чырвонай арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1934), Генштаба (1937). З верасня 1937 г. у БВА, удзельнік вызвалення Зах.Беларусі ў 1939 г. З 1940 г. начальнік штаба 4-й арміі, у ліпені – жніўні 1941 г. – Цэнтральнага фронту. У пачатку вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Баранавічаў, Прапойска (Слаўгарад), Крычава. У 1941 – 1945 гг. начальнік штаба Бранскага фронту, 20-й арміі, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Да 1953 г. на адказных пасадах у Савецкай арміі.

Узнагароджаны ордэнам Леніна (тройчы), 4-ма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава і Кутузава I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, а таксама замежнымі ордэнамі. Аўтар кніг: Погорело-Городищенская операция. М., 1960; Трудные рубежи. М., 1965; Пережитое. Изд. 2-е. М., 1966; На Московском направлении. М., 1970.

ЦІМЧАНКА Уладзімір Сяргеевіч. Нарадзіўся 30.6.1912 г. у г.Арджанікідзе (зараз Уладзікаўказ). У Чырвонай арміі з 1929 г. Скончыў Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1940). Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне. З красавіка 1941 г. – начальнік аператыўнага аддзела штаба 4-га паветранадэсантнага корпуса.

У адным з пісьмаў да жонкі Ганны Навумаўны ён пісаў:

«Знаходжуся ў паўакружэнні. Мне хацелася напісаць табе вельмі шмат добрых слоў, але цяпер не хапае сілы. Пятыя суткі не змыкаю вачэй. Акопы, дзесяткі забітых і пакалечаных гітлераўскай навалаччу людзей... Я пастараюся сваю галаву дарэмна не падстаўляць і танна не аддаваць. 27.6. Мар'іна Горка. Пісьмо, па ўсёй бачнасці, апусціць табе ў Маскве».

А вось другое пісьмо:

«Марудна пакуль пасоўваюцца нашы справы, але думаю, што ад адступлення перайшлі ўжо да абароны і хутка пачнём наступаць і біць акаянных. Ваюю цяпер у пяхоце і таму бачу ўсё на свае вочы. што адбываецца на

У.С. Цімчанка.

полі бою, што адбываецца ў паветры і самі адчуваем сваімі целамі, нервамі і крывёю. Хоць становішча нашае цяжкае, мы, парашутысты, прыкрываем разгортванне армій, б'ёмся як д'яблы, ахвяруем сваімі лепшымі людзьмі. У мяне самога ўжо ёсць страты ў людзях, ды і сам трапляў некалькі разоў у пераплёты. Але такая ўжо праўда вайны.

Калі будзе хоць невялічкая магчымасць, я прышлю табе яшчэ адно-два-тры пісьмы. Мы знаходзімся пад няспыннымі ўдарамі танкаў і авіяцыі праціўніка.

Калі пісьмо атрымаеш да 10–11.07, дасылай адказ: Магілёў, да запатрабавання. Лепш тэлеграму аб сваім здароўі. 7.7.41 г.»

У сярэдзіне ліпеня 1941 г. 4-ы паветрана-дэсантны корпус заняў абарону на рубяжы р. Сож пад Крычавам. У пісьме Цімчанкі да сястры Галіны ад 22 ліпеня гучыць аптымізм і надзея на перамогу, нягледзячы на цяжкія абставіны тых дзён. «Дзень добры, Галінка! Шлю табе гарачае прывітанне з фронту, з самых перадавых пазіцый. Я цяпер знаходжуся ў вельмі цяжкім становішчы: і тактычным, і аператыўным. Трэба прама сказаць, што першыя дні былі не вельмі вясёлыя. Але цяпер гэта ўжо прайшло. Нямецкіх лётчыкаў пачалі лупіць і на зямлі, і ў паветры, танкі – таксама.

Нямецкая мова мне спатрэбілася, дапытваў я іх ужо тут. Баяцца, навалач, смерці і ўсё расказваюць цалкам. Маральнае іх аблічча трэба сказаць, кепскае.

Цяпер знаходзімся і ў тыле праціўніка, і па яго флангах, і перад фронтам. Выконваем суворaўскую прымаўку: ні фланга, ні тылу — усюды фронт, дзе праціўнік.

Па ўсёй бачнасці, тая задача, якую мы выконваем, знаходзячыся ў непасрэдным кантакце з танкавай групай генерал-фельдмаршала Гудэрыяна, будзе хутка выканана, і тады на працяглы час я сыйду з гарызонта, бо буду працаваць у глыбокім тыле.

На днях захапілі нямецкую бронемашыну, я прыклаў руку да гэтай здабычы, адабраў «маўзер» у нямецкага афіцэра. Цяпер у мяне дабавілася зброі, з якой я буду дзейнічаць. Працую дзень і ноч. Сну, канешне, няма...»

Усе, хто ведаў Уладзіміра Сяргеевіча асабіста, хто змагаўся з ім плячо ў плячо, адзначалі яго незвычайную мужнасць і сапраўдны прафесіяналізм у ваеннай справе.

Вось як успамінаў пра яго ў той час камандзір 4-га ПДК А.Жадаў: «Героем баёў быў маёр Цімчанка. Мужнасцю гэтага чалавека можна было толькі захапляцца. Нягледзячы на вялікае скапленне каля Крычава сіл праціўніка, ён вырашыў атакаваць яго і, уварваўшыся ў горад са сваім зводным атрадам, нагнаў паніку на фашыстаў, нанёс ім вялікія страты. Не вытрымаўшы ўдару, гітлераўцы пакінулі Крычаў. Гэта было ноччу з 29 на 30 ліпеня 1941 г. Дзёрзкая атака на горад мела вялікі маральны фактар. Дэсантнікі прадэманстравалі вялікую сілу нашай зброі, храбрасць савецкіх байцоў. Прыклад мужнасці паказалі дэсантнікі В.І. Ляшчынін, Дз.Е. Палазкоў, М.А. Усатаў».

Па няпоўных дадзеных, усяго ў Крычаве фашысты страцілі да 500 салдат і афіцэраў забітымі, звыш 35 танкаў, 36 бронетранспарцёраў, 72 аўтама-

Прошло пять суток. Выпал снег, была оттепель. Нас построили в колонну. Всего в лагере было не более двухсот человек. Полицаи привели пленного, в шинели, без головного убора, и поставили перед колонной на расстоянии примерно тридцать метров. В это время подошло около 15 молодых немецких солдат с автоматами, стали между колонной и одиноким человеком, и начали бросать снежками в голову пленного. При каждом попадании в его голову фашисты радостно кричали.

Мы в колонне стали возмущаться.

— Стоять спокойно! – послышался голос майора из колонны. Я посмотрел и увидел, что мы были окружены фашистскими автоматчиками. В колонне все стояли так тихо, что было слышно биение сердца, а в жертву аккупанты все бросали и бросали снежки. Пленный упал, на него набросились с диким криком убийцы, засыпали снегом, топтали ногами. Наиздевавшись, фашисты ушли

Я посмотрел по сторонам и обратил внимание, что на вышках было по два пулеметчика, охранявших лагерь. «Будем потихоньку расходиться, чтобы не вызвать на себя огонь с вышек» – сказал майор. Потихоньку шагом разошлись на свои места.

На следующий день мы заметили в окно, что полицаи по одному пленному водят в комендатуру. После обеда забрали меня и еще двух. Привели в комендатуру и стали в лупу рассматривать рукава шинели и рубашки. Я не понимал, что они ищут. После тщательного осмотра рукавов, измерили сантиметром мою голову во всех направлениях. Спросили фамилию дедов по отцу и матери. Я сказал, что Яковлевич по отцу, Егорович по матери. Переводчик доложил немцу. «Век!»— сказал немец. Меня отпустили. Вслед за мной пришли двое, которые были взяты вместе со мною. Позже стало известно, что комиссаров по рукавам ищут, если бы были звезды, следы остались. По черепу головы евреев опознают, у них есть такая наука.

Возвратившись с завтрака в свою комнату на следующий день, мы увидели на стене портрет Гитлера. Один из пленных спросил: «Это кто?»— «Гитлер»— ответил человек, которого до этого не было с нами. Я, возможно и другие, не придали никакого значения появлению одновременно двух новых людей и портрета Гитлера. Постепенно завязался разговор про Сталина и Гитлера. О Сталине говорили скромно, Гитлера те двое хвалили и сравнивали с Наполеоном и даже ставили его в полководческом искусстве выше.

— Победит тот, у кого солдаты более морально устойчивые, кто борется за свою Родину,— ввязался я в разговор.—Русский солдат победил французов и ничего Наполеон сделать не смог. Так и Гитлер.

— Ты уверен, что русские победят?

— Да!—ответил я.

Полемика продолжалась спокойно, в скромных выражениях.

Часа за два до наступления темноты мы получили чай и всех построили в колонну. Я выпил свой чай, стоя в строю. Пришли гестаповец, полицай, переводчик и один из тех двух, что были в нашей комнате при разговоре о Сталине и Гитлере.

— Где он?— спросил полицай-переводчик у пришедшего с ними.

— Тот,— показал он на меня.

— Выйди из строя!— приказал мне полицай и указал место перед строем.

Гестаповец выступил с краткой злобной речью. Кто продал? За что? Я вспомнил, что в комнате появились два человека вместе с портретом Гитлера. Это были провокаторы. Гестаповец закончил речь. Переводчик перевел примерно так: «За оскорбление доблестной немецкой армии и оскорбление фюрера Адольфа Гитлера, повесить». И далее: «Господин капитан – человек очень гуманный, сочувствует русским пленным. Заменяет смертную казнь через повешение на заключение в мешок из колючей проволоки».

У меня опустились руки, ноги задрожали, на лице выступил холодный пот. Я стал совершенно безвольным и бессильным. Видел колонну людей в каком-то тумане. Меня взяли за руки и затолкали в мешок из колючей проволоки и закрыли дверцу мешка. Несмотря на мой малый рост и истощенность мешок колол меня со всех сторон. Можно было стоять только строго вертикально, при малейшем движении проволочные колючки врезались в тело. Постепенно стало смеркаться. Подошел к мешку полицай-переводчик, открыл дверцу и выбросил меня из мешка. Кормили баландой – что-то вроде мутной воды с запахом гнилого картофеля. От истощения люди стали умирать. Начались волнения пленных. Однажды мы все вышли на улицу с криком: «Хлеба! Хлеба! Хотим кушать». В ответ с вышек раздались пулеметные очереди. Много было раненых, убитых. Потом к раненым подошел полицай и сказал: «Потерпите, скоро прибудет немецкая спецкоманда и окажет помощь». Действительно, спецкоманда прибыла на автомашинах. Всех раненных военнопленных они расстреляли. В Кричевском концлагере я пробыл 10 дней, потом меня отправили в Могилев.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

Дакументы сведчаць

НЯМЕЦКА-ПАЛІЦЭЙСКІЯ ГАРНІЗОНЫ

В городе Кричеве – немцев 250–300, полицейских – 350–400.
Цементный завод, фосфоритный завод и ж.-д. мост – 450–500 человек.
Задобростянский винзавод – немцев 150, власовцев – до 250.
Комаровка – 30 чел.
Юрковка – 20 чел.
Разъезд Осовец – до 30 чел.
Гарнизон охраны ж.д. в нас. пункте Павловичи – 25 чел.
Гарнизон по охране разъезда Малятичи и ж.-д. моста на р. Черная Натапа — до 45 человек.
Местечко Малятичи – немцев 120–150 чел.
Гарнизон по охране Земского хозяйства Залесовичи – 18–20 чел.
Приговка – 15 немцев.
Костюшковичи – 70 чел.
Баевка – 60 чел.
Торфзавод «Дорогая» – 15–20 чел.
Земхоз Низки – 18 чел.
Поклады – 30 чел.
Гарнизон полицейских по охране моста на шоссе Москва—Варшава на р. Добрасть, Свадковичи – 18 чел.

Хотиловичи – гарнизон по охране мостов через р. Сож, складов с боеприпасами и горючим в лесу около Прудка – 125 чел.
Прохоровка ст.Кричев-2 – 150–170 немцев.
Разъезд Михеевичи – 25 немцев.
Торфзавод «Великий мох» – гарнизон 30 полицейских.
Дяговичи – 30 полицейских.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4332. Воп. 1. Спр. 1. Л. 25–26.

Падрыхтавала да друку Л.У. Ляховіч.

Дзяўчына ў лагеры смерці

Перада мной выдадзеная да Нюрнбергскага працэсу над фашысцкімі злачынцамі карта лагераў смерці ў Еўропе. Чорнымі кругамі на ёй адзначаны гіганцкія камбінаты смерці: Майданек, Бухенвальд, Маўтхаўзен, Равенсбрук, Асвенцым, Заксенхаўзен, Штутгоф... Побач ляжаць запісы з некаторымі імёнамі і маіх землякоў, якія былі ў лагерах смерці...

У вёсцы Сакольнічы ля Крычава жыў настаўнік Аляксандр Сяргеевіч Гурыновіч. У вайну ён кіраваў групай разведчыкаў і сувязных. Настаўніку дапамагалі яго вучні. Гурыновіча закатавалі гестапаўцы. Імем героя названа вуліца ў Крычаве.

Аднойчы, у пачатку акупацыі, Валя Свадкоўская спытала ў Гурыновіча:

— Што ж нам рабіць зараз?

— Чым можаш дапамагай Чырвонай арміі біць фашыстаў, набліжай перамогу.

Валя дапамагала палонным, расказвала аб пачутых навінах з фронту. А потым звязалася з групай партызан – маладых хлопцаў з вёскі Сакольнічы. Збірала звесткі аб руху фашысцкіх войск, перадавала партызанам вопратку, харчаванне.

Хутка Валя адчула, што за ёй сочаць. Трэба ісці ў лес. А як быць з мамай і двума малымі? Іх жа расстраляюць. 15 жніўня 1943 года ў дом уламіліся фашысты. Іх прывёў сын старасты з суседняга сяла Залесавічы.

Валя ні ў чым не прызналася. Яе прывезлі на станцыю Крычаў. Тут рыхтавалі эшалон для адпраўкі ў Германію. Пакутлівая дарога прывяла ў гарадок Дзершава, адтуль – у Данцыг, на танкавы завод. Пазнаёмілася з дзяўчатамі з Харкава – Дусяй Дэкала, Лідай Цеслер, Любай Панчанка. Працавалі побач і украінскія хлопцы Мікалай і Ваня. Хутка пасябравалі. Разам выводзілі са строю станкі, па магчымасці рабілі бракованыя дэталі.

Адзін з вязняў, Косця, трымаў сувязь з воляй. Ён паведаміў: за каналам высадзіўся савецкі дэсант. Сувязь праз некалькі асоб, па ланцужку, была ўстаноўлена. Двойчы Люся Дэкала і Валя Свадкоўская ўпотай ездзілі да канала, спрабуючы знайсці дэсантнікаў. Ад іх неўзабаве перадалі загад: завод узарваць. Узрыўчатка будзе дастаўлена. Неўзабаве была закладзена пад шэсць машын узрыўчатка. Трэба было камусьці ўключыць замініраваныя машыны. Валя сказала:

— Уключу я. Мне шаснаццаць гадоў, скажу, што нічога не ведала, што наогул мала разумею, бо з вёскі.

Назаўтра прыйшла ў цэх раней за ўсіх. Націснула на ўключальнік. Па-

чуўся аглушальны выбух. Дзяўчына кінулася бегчы. Але майстар дагнаў яе.

Пачаліся допыты ў гестапа. Валя гаварыла, што яна не разумее нічога. Адкуль яна магла ведаць, што машыны замініраваны? Яна з беларускай вёскі. Нечакана выклікалі на спатканне. Прыехаў яе дзядзька Аляксей Свадкоўскі, які працаваў у баўэра, а з ім Дуся Дэкала, Ліда Цеслер і Люба Панчанка. Валя папрасіла сяброў больш не прыязджаць.

Месяц яе трымалі ў камеры-адзіночцы. Адказы ўсе тыя ж: расла ў дзіцячым доме, не ведала, што машыны замініраваны, што майстар злуе на яе і нагаворвае. І зноў свісцела плётка са свінцовым наканечнікам. Допыты, допыты праз дзень. Прыгавор суда: пятнаццаць гадоў лагера смерці. Так Валя аказалася ў Штутгофе, у жаночым палітычным блоку.

Жанчыны пакутвалі ад фашысцкіх наглядчыц. Аднойчы Валя, жорстка збітая, сказала ім адно слова:

— Ідыёты!

За гэта яна двое сутак прастаяла ў карцэры ў ледзяной вадзе.

У ноч перад 27-й гадавінай Вялікага Кастрычніка жанчыны спявалі «Інтэрнацыянал».

У навагоднюю ноч у палітычным жаночым блоку таксама заспявалі. Нечакана расчыніліся дзверы. На парозе стаялі гестапаўцы. Пачулася каманда:

— Выходзь!

На галовы зняволеных пасыпаліся ўдары палак.

— Хто першы заспяваў?

Маўчалі зняволеныя. «Усе спявалі». Тады іх павялі ў крэматорый. Аддалі загад: калі праз дзве гадзіны не будуць выдадзены зачыншчыцы — усіх спаляць. Калі на плац вывелі ранiцай усіх астатніх зняволеных, яны заўважылі: жанчын з палітычнага блоку не было. Дзе яны? Адпраўлены ў крэматорый? Тады мужчыны з палітычных блокаў, і ў першую чаргу савецкія ваеннапалонныя, адмовіліся ісці на работы. Яны патрабавалі вызвалення жанчын. Фашысты былі прымушаны выпусціць іх.

Свадкоўскай запомнілася такое. На месцы для публічных пакаранняў, агароджаным калючым дротам, стаяў савецкі воін. Відаць, афіцэр. На яго выпусцілі сабак. Сабакі рвалі яго цела, а ён адбіваючыся і трацячы апошнія сілы, крычаў:

— Таварышы! Змагайцеся за Радзіму! Не падайце духам! Перамога блізка! Бывайце! Біце фашыстаў!

У пачатку 1945 года ў тую ж загародку кінулі групу савецкіх дэсантнікаў, таварышаў загінуўшага героя.

У лагер прывезлі дзяцей савецкіх афіцэраў. Вязні ведалі, што ў дзяцей бяруць кроў. Агульны пратэст лагера быў настолькі ўнушальным, што фашысты павезлі дзяцей з Штутгофа. Цяжка забыць і дзень, калі ў лагер прывялі сто нямецкіх маракоў у ланцугах. За што іх кінулі ў лагер смерці? Гэтага не ведаў ніхто.

Аднойчы наляцелі самалёты саюзнікаў. Бомба трапіла ў жаночы палітычны блок. Больш палавіны зняволеных загінула. Валянціна была паранена ў нагу. У канцы красавіка вязняў Штутгофа выгналі з лагера пад канвоем. Параненых і хворых таварышы неслі на руках. Фашысты ўжо баяліся знішчаць іх. Пагрузілі на баржы. Без святла, без ежы цярпелі ў турме да 9 мая. А ў дзень перамогі караблі англійскай эскадры захапілі баржы і параход. У становішчы вязняў апынуліся эсэсаўцы-вартаўнікі...

Пасля вызвалення Валянціна вярнулася ў родную вёску Свадкавічы і актыўна ўдзельнічала ў аднаўленні разбуранага фашыстамі краю.

М.Ф. Мельнікаў.

Магілёўская праўда. 1965г., 19 лютага.

НЕМЦА ЗАБІ, ЗАКАЛІ ЦІ ЗАРЭЖ,
ЗНІШЧЫ ЯГО – ЖЫЦЦЁ ЗБЕРАЖЭШ!

Моладзь мая, аднагодкі мае,
Хіба ў нас сілы ў грудзях не стае?
Ўспомні, удумайся, родны мой брат,
Чым табе грозіць раз'юшаны кат!
Вызваліць хоча цябе ён на век
З гордага звання твайго – чалавек.
Хоча цябе ён пазбавіць жыцця,
Брата, сястру дарагую забіць.
Каб на крыві чалавечай, касцях
Стада шчанятаў сваіх узрасціць.
Хоча цябе ён зрабіць дзікаром,
Парабкам вечным, слугою сваім.
Ці можаш аддаць ты нямецкім звярам
Тое, што вечна завеш дарагім?
Хто ж сваю волю святую і шчасце
Дасць разарваць гэтым злыдням на часці?
Выпрастай плечы і зброю вазьмі,
Шчасце сваё ты адстайвай грудзьмі!
Сцісні, таварыш, вінтоўку рукой,
Выйдзі на жорсткі, на праведны бой.
Хочаш быць вольным, шчаслівым, жывым, —
Куляй, гранатай, штыком баявым
Немца забі, закалі, ці зарэж,
Знішчыш яго – жыццё зберажэш!

Анатоль Астрэйка.

Лістоўка ЦК ЛКСМБ у гады вайны
(З асабістага архіва Дз.М. Марчанкі)

ANORDNUNG
über Sperrstunden

Mit Zustimmung des Reichskommissars für das Ostland setze ich die Sperrzeit im Generalbezirk Weissruthenien in den Städten auf die Zeit vom Dunkelwerden bis zum Hellwerden fest.

Zivilpersonen, die während der Sperrzeit ohne zwingende Gründe auf der Straße betroffen werden, werden sofort standgerichtlich erschossen.

Für die Besucher von Theatern und sonstigen kulturellen Veranstaltungen ergeht eine Sonderregelung.

Diese Anordnung tritt am 1. November 1941 in Kraft.

Der Generalkommissar für Weissruthenien
WILHELM KUBE

РАСПАРАДЖЭНЬНЕ
аб агранічэньні хаджэньня вячэрняю парою

Са згодай Дзяржаўнага Камісара Ўсходняга Абшару пастанаўляю агранічыць час хаджэньня ў гарадах Ганэральнай Акругі Беларусі ад сьцямненьня да разьвіднеьня.

Асобы цывільныя, якія ў агранічаным часе без уважлівай прычыны будуць спатканыя на вуліцы, будуць зараз-жа на месцы расстраляны.

Для адведваючых тэатр і іншыя культурныя ўстановы выйдзе асобнае распараджэньне.

Гэта распараджэньне ўваходзіць у сілу ад 1 лістапада 1941 г.

Генэральны Камісар Беларусі
ВІЛЬГЭЛЬМ КУБЭ

ROZPORZĄDZENIE
o ograniczeniu ruchu cywilnego w czasie od początku zmierzchu do świtania

Za zgodą Komisarza Rzeczy Ostlandu zarządzam ograniczenie czasu chodzenia po miastach Generalnego Okręgu Białorusi od zmierzchu do świtania.

Osoby cywilne, które w zabronionym czasie spotka się chodzące bez powodu na ulicy, będą natychmiast doraźnym sądem rozstrzelane.

Dla odwiedzających teatr i inne kulturalne imprezy wydane zostanie odrębne uregulowanie.

Rozporządzenie wchodzi w życie z dniem 1 listopada 1941 r.

Generalny Komisarz Białorusi
WILHELM KUBE

РАСПОРЯЖЕНИЕ
об ограничением хождении вечерней порой

С согласовся Государственного Комиссара Восточной Территории постановляю:

Ограничить время хождения в городах Генерального Округа Белоруссии от вечерних сумерок до рассвета.

Лица гражданские, которые в ограниченное время без уважительной причины будут встречены на улице, будут сейчас же Военным Судом расстреляны.

Для посещающих театр и другие культурные учреждения выйдет особый приказ.

Это распоряжение входит в силу с 1-го ноября 1941 г.

Генеральный Комиссар Белоруссии
ВИЛЬГЕЛЬМ КУБЕ

Адно з распараджэнняў акупацыйных улад аб абмежаванні знаходжання на вуліцах у гарадах вечарам і ноччу.

Паўсюль падсцерагала бяда

На парозе з'явіўся памочнік старасты і крыкнуў:

— Маруська, на лінію!

— Я не магу, хворая, вось глядзі, апухла нага, баліць.

Але яе слоў ён ужо не чуў, а можа і не жадаў чуць, бег у другую хату.

А Марыя задумалася. І было аб чым. У вёсцы Ратная, дзе жыла яна і яе сямігадовы сын, гаспадарылі паслугачы фашыстаў: староста і паліцаі. Яны заўзята выконвалі загады немцаў па навядзенню і падтрымцы «новага парадку, прымушалі сялян здаваць для арміі фюрэра прадукты харчавання, цёплае адзенне, выконваць «трудовую повинность». Вось и зараз атрымала нарад на лінію: уначы за кіламетр ад вёскі ахоўваць ад партызан чыгунку. А паспрабуй не пайсці ці чаго-небудзь не выканай – адразу ж паследуе кара, можа, і расстрэл.

«І калі ўсё гэта скончыцца, хутчэй бы гэтым свалачам прыйшоў канец. Ну, нічога, прыйдзе час, і не будзе тут гэтых гадаў. Не, не пайду на лінію. Няхай самі ахоўваюць.Ды і староста ведае, што я хворая, сам бачыў маю нагу. Ён жа чалавек, няўжо здасць мяне немцам?»—разважала яна.

А праз некалькі дзён у хату зайшлі двое салдат. Адзін з іх паглядзеў у паперку і запытаў:

— Хто ёсць Марыя Сцяпанаўна Пішчуліна?

— Я, — адказала Марыя.

— Мі цябе забірай, ком-ком.

І вось па вуліцы ідзе немец, за ім Марыя, за ёй другі немец з аўтаматам у руках. Тут жа і староста.

— Пан староста, скажы, куды мяне вядуць і за што?

— За нявыхад на лінію павязуць у Крычаў, а там будзе відаць

Арыштаваная з канвойнымі ўжо вышлі з вёскі, падыходзілі да лесу. За імі з плачам бег сын Марыі. Ён ужо надакучыў немцам. Спачатку яны яго адганялі жэстамі, потым адштурхоўвалі рукамі і нагамі. Але ўпарта ён зноў і зноў падбягаў да маці. І толькі пасля таго, як прагучала аўтаматная чарга, і перад яго нагамі кулі прастрачылі зямлю, ён уцёк у вёску.

Марыю прыканваіравалі на станцыю Асавец. Да адпраўкі ў Крычаў быў яшчэ час, і фельдфебель прымусіў яе нарыхтоўваць дровы, мыць бялізну немцам.

Яе цяжкія думкі прыпыніў голас:

— Дзень добры. Чаго ты тут?

Перад ёй стаяў настаўнік з вёскі Цінькаў Цімафей Сцяпанавіч Ткачоў.

— Ды вось так здарылася.

І яна расказала аб усім Цімафею Сцяпанавічу. Яны калісці разам раслі, хадзілі ў школу.

— Справы твае дрэнныя. Адсюль ты можаш трапіць у Крычаў, у «кнігарню» (да вайны гэта быў кніжны магазін, а пры акупацыі немцы ў ім зрабілі турму), а з «кнігарні» – за Сож, дзе ўжо многія знайшлі вечны пакой.

І пайшоў. А Марыя засталася са сваімі цяжкімі думкамі. Яна ўспомніла дзяцінства, раскулачванне бацькоў, перажытыя цяжкія гады. Толькі пачало жыццё паляпшацца, але вайна. Як там муж у арміі? І як без яе будзе жыць сын? І яшчэ ўспомніла аб тым, як у мінулым годзе немец ледзь не застрэліў яе за тое, што не давала яму малака.

А ў гэты час паміж фельдфебелем і Ткачовым, які соваў немцу ў жывот

(Ткачоў быў маленькага росту) аркуш паперы, адбываўся «гандаль». На траве стаяў кош з яйкамі.

— Пан фельдфебель! Гэта памылка, што арыштавалі гэтую жанчыну. Яе родных Савецкая ўлада выслала ў Сібір. Аб гэтым напісана вось у гэтай паперы. Яе падпісалі многія жыхары вёскі Цінькоў і прасілі перадаць Вам. Я перадаю паперу і вось гэты кош.

Невядома, які аргумент быў больш важкі – папера ці кош, аднак фельдфебель адпусціў Марыю дадому. А Цімафей Сцяпанавіч вымушаны быў прынесці яшчэ і кавалак сала.

Летам 1943 года партызаны ўзмацнілі дыверсіі на чыгунцы. Таму ўзмацнілі ахову чыгункі і немцы. У начны час праз кожныя 50 метраў чыгуначнага палатна яны ставілі вартаўнікоў з ліку жыхароў навакольных вёсак.

Марыю паставілі на чыгуначным пераездзе на дарозе з вёскі Ратная ў вёску Яноў.

Глухой ноччу перад ёй нячутна з'явіўся ўзброены мужчына.

— Прашу не крычаць і заставацца на месцы,— прашаптаў ён.

— Вам трэба на той бок чыгункі? Вы партызан? Праходзьце.

Партызан пайшоў назад, у лес. А праз некаторы час да пераезда падыйшла група партызан, на некалькіх драбінах везлі параненых. Вельмі хутка драбіны на руках (каб не было чутна грукату) былі перанесены цераз рэйкі. Атрад накіраваўся ў бок Янова.

М.С. Дамарацкая.

— Раніцай немцы заўважаць нашы сляды і вас за гэта расстраляюць. Мы павінны вас узяць з сабой,— сказаў той жа партызан.

— Але мне трэба забраць у вёсцы сына, ён там адзін.

— А гэта далёка?

— Крыху больш кіламетра.

— У нас няма часу чакаць, самі думайце, шукайце выйсця.

І вось сярод ночы на пераездзе загучалі песні, пачаліся танцы. Гэта Марыя з племянніцай Хальчыцкай Тамарай наладзілі «весялосць». Потым да іх далучыліся другія жанчыны. Зацікавіліся гэтым і немцы, двое з іх падыйшлі бліжэй, і адразу ж былі ўцягнуты ў танцавальны вадаварот. Да раніцы на пераездзе нічога не засталося ад слядоў партызан, аб якіх ведалі толькі Марыя і Тамара. Іншыя жанчыны здзіўляліся, што гэта «найшло» на Марыю, справіла сярод ночы ігрышча.

На пачатку кастрычніка 1943 года, пасля вызвалення вёскі Ратная ад фашыстаў, работнік дзяржбяспекі ў размове з Марыяй Сцяпанаўнай папрасіў больш падрабязна, чым ён ведаў, расказаць аб тым, як яе выдаў немцам памочнік старасты.

— А што расказаць,— адказала яна, ён жа зрабіў гэта па навучэнню старасты, ён жа яшчэ непаўналетні, дурны. Ну як яго судзіць?

— Пашкадавалі!? А ён Вас не шкадаваў.

— Можа яно і так.

— А нага сапраўды балела?

— Не, не балела. Я не павінна была і

не хацела ісці на чыгунку і папрасіла, каб мая цётка, спецыяліст па лячэнню травамі, прыклала да нагі якую-небудзь траву. Яна так і зрабіла.

Пасля вайны Марыя Сцяпанаўна працавала ў калгасе. Потым выйшла на пенсію, але працаваць у калгасе працягвала, бо нехапала рабочых рук.

У 1986 годзе яе не стала, але засталася ў землякоў аб ёй добрая памяць.

У.С. Пішчулін.

Дакументы сведчаць

СТРАТЫ КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Наименование с/с и насел. пункта	Кол-во накануне войны		Кол-во уничтоженных		Угнано в фаш. рабство	Возвр.	Погибло на фронтах ВОВ	Погибло в партизан. отрядах и подполье
	дворов	жител.	дворов	насел.				
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Ботвиновский с/с								
Ботвиновка	50	217	-	-	10	10	29	1
Малиновка	29	115	-	-	-	-	11	-
Концы	30	128	-	-	4	3	15	-
Мастицкая Слобода	25	109	-	1	2	2	6	-
Шутовка	25	87	-	1	-	-	5	-
Лучки	37	177	37	17	4	2	19	-
Прусино	50	227	-	-	12	10	20	-
Юрковка	45	265	45	-	7	5	21	-
Брянск	27	135	27	-	2	2	13	-
Зайцева Слобода	33	148	33	-	3	3	5	-
Ляды	12	48	12	-	-	-	6	-
Репище	23	95	23	2	-	-	3	-
Ратная	31	169	27	2	10	2	11	2
Вородьков-1	49	196	31	-	2	2	13	1
Вородьков-2	40	183	36	-	1	1	8	1
Вородьков-3	41	247	41	9	2	1	17	-
Тиньков	39	172	-	-	1	-	9	-
Верховцы	35	170	35	-	2	2	32	4
Даленщина	51	218	-	-	3	3	16	-
Осовец	69	230	-	-	3	2	17	-
Баевка-1	43	153	43	-	4	3	9	-
Баевка-2	44	181	44	-	3	3	13	-
Дружки	18	82	18	-	1	1	11	-
Весёлый	13	52	13	-	-	-	6	-
Сапуратовка	9	18	9	-	-	-	4	-
Губинщена	35	185	35	2	3	3	16	2
Сетное	23	154	-	-	1	1	20	1
Горки	36	161	36	3	2	2	13	-
Костюковка	37	142	37	-	-	-	13	-
Асинник	5	23	-	1	1	1	2	-
Асиновка	6	27	-	-	-	-	4	-
Буланый	12	57	12	-	-	-	6	-
Городок	6	19	-	-	2	2	1	-
Янов	27	71	-	-	2	1	10	2
Милятино	25	117	25	1	-	-	4	-

Працяг табліцы

1	2	3	4	5	6	7	8	9
Подудога	7	21	-	-	-	-	5	-
Красный Берег	8	29	8	-	-	-	6	-
Майский	13	52	13	-	-	-	9	-
Падубок	17	57	17	-	-	-	3	1
Сычик	40	206	38	-	4	3	26	-
Волчас	69	283	69	-	4	1	37	1
Кохонов	17	39	17	-	1	1	6	-
Гуркова Нива	21	75	-	2	2	1	8	-
Мальковка	19	57	19	-	1	1	20	-
Новки	32	151	32	3	2	1	25	-
Сечихи	39	167	18	-	3	2	17	-
Итого по с/с	1362	5904	919	44	104	77	570	17
Костюшковичский с/с								
Дорогая	64	256	1	2	6	6	34	-
Долгий Лог	10	48	-	-	1	1	6	-
Костюшковичи	78	318	76	5	13	11	52	7
Углы	19	79	18	1	3	3	10	-
Лущевинка	66	273	37	11	2	2	40	-
Залесовичи	84	356	62	-	-	-	37	-
Грушево	12	59	9	3	-	-	7	-
Победа	-	-	-	-	-	-	-	-
Маковье	58	287	53	-	8	7	36	-
Поклады	63	252	-	2	9	8	41	1
Прыговка	41	172	26	-	3	3	32	-
Свадковичи	38	193	37	1	4	4	29	-
Хатиловичи	87	362	73	3	6	6	52	-
Пушкари	10	53	10	-	-	-	6	-
Калинино	83	355	56	-	4	4	36	-
Первокричевский	31	124	24	2	-	-	17	-
Сокольничи	109	466	78	5	12	11	33	1
Дарливое	52	209	21	1	-	-	29	-
Комаровка	57	285	29	8	6	6	28	-
Ореховский	11	47	9	-	-	-	5	-
Сосновский	9	42	6	-	2	2	8	-
Калиновский	12	56	11	1	2	2	8	-
Лайковский	9	34	9	-	1	1	3	-
Гуриновский	8	37	-	-	-	-	5	-
Дубовский	13	65	11	-	3	3	7	-
Подъелецкий	10	46	10	2	-	-	6	-
Михеевский	9	37	-	-	-	-	2	-
Исаковский	11	53	11	-	1	1	5	-
Итого:	1054	4566	658	47	88	79	569	1
Краснобудский с/с								
Дяговичи	270	700	15	6	20	19	93	-
Нанасково	25	75	15	-	-	-	3	-
Зарубец	75	200	35	-	6	6	28	-
Первомайск	70	210	6	5	10	8	31	-
Егоровка	25	100	25	4	-	-	12	-
Красная Буда	38	25	31	7	2	2	27	2
Октябрьский с/завод	13	80	13	-	1	1	7	1
Красный Ручей	80	250	50	2	-	-	16	1
Красный Бор	8	32	6	-	-	-	1	-
Краснополье	30	75	15	-	-	-	14	-

Працяг табліцы

1	2	3	4	5	6	7	8	9
Коллективный Труд	20	200	20	4	-	-	2	-
Коренец	100	500	100	1	10	10	47	3
Красный Сад								
Михеевичи	120	310	85	-	7	7	48	-
Трудовой	10	10	2	-	-	-	5	-
Каменка	100	300	7	1	9	9	57	-
Прудок	30	90	-	-	-	-	5	-
Серебряный Ручей	17	54	8	-	2	2	7	-
Пушкино	12	50	11	-	2	2	5	-
Литвиново	20	100	15	-	2	2	11	-
Прохоровка	50	170	10	-	6	1	20	-
Кричев 2	1	8	2	-	-	-	-	-
Итого:	1116	3784	561	30	77	69	439	7
Лабковичский с/с								
Дубровка	22	87	8	-			19	-
Липовка	13	45	9				13	-
Ананичи	57	198	39				22	-
Кашаны	115	423	77		3	2	32	-
Бояры	23	82					19	-
Стаборщина	14	53					16	-
Староселье	52	200	26		4	2	30	-
Буньковщина	23	75			1	1	20	-
Лобковичи	137	523	35		5	5	70	-
Бель-3	57	230	20		2	1	34	-
Бель-2	120	397	96		2	2	49	-
Бель-1	112	429	67		3	3	66	-
Павловичи	35	120	27		2	2	11	-
Залесье	57	210	19		3	2	14	-
Песьковичи	21	75	2		2	2	9	-
Низки	40	140	18		3	1	23	-
Бережистое	64	195	16		-	-	22	-
Полоница	73	260	-		2	2	42	-
Ивановка	89	325	17		2	2	36	-
Подосинки	27	97			2	1	6	-
Горбатка	57	190			2	1	10	-
Вороново	57	210	21		4	4	10	-
Зуи	60	230	4	4	-	-	27	-
Глушнево	66	245	60	1	2	2	47	-
Итого:	1391	4979	562	5	44	35	655	
Малятичский с/с								
Слабуты	45	186	20	3	2	2	14	-
Сорочино	32	160			1	1	14	-
Малятичи	97	502	97	210	8	7	57	-
Шаевка	32	160	31				19	-
Щербачи	29	124	29		3	3	15	-
Ручье	16	71	16				7	-
Узкий	55	241	51		5	5	28	-
Мышковичи	56	301	17		6	5	30	-
Плещино	50	249	43	6	2	1	24	-
Красная Горка	14	74					2	-
Мшаны	18	85					4	-
Высокое	17	89					6	-
Мирная 1	41	167	2	3	7	7	16	-

Працяг табліцы

1	2	3	4	5	6	7	8	9
Мирная 2	37	120	4		4	4	15	
Дрожжиничи	20	121	1		3	3	10	
Луты	38	136	4				15	
Ермаковка	67	339	20				19	
Бродок	60	240	46		3	2	23	
Итого:	724	3365	387	222	44	40	328	
Антонаўка[1] (спалена і не адноўлена)	28	115	22	92				92

Нацыянальны архіў РэспублікіБеларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 767. Л. 137—138, 141, 147, 150, 153.

Падрыхтавала да друку Л.У. Ляховіч, кандыдат гістарычных навук.

ЗВЕСТКІ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ у г.КРЫЧАЎ

Наименование города, горпоселка (рабочего поселка)	К-во жителей до войны	К-во жителей, уничтоженных гитлеровцами	К-во жителей, вывезенных на каторжные работы в Германию	К-во погибших на фронтах ВОВ	К-во погибших в партизанских отрядах и в подполье
Кричев	10693	437	297	365	нет свед.

Председатель исполкома городского Совета депутатов трудящихся П. Силаков
Секретарь исполкома городского Совета депутатов трудящихся М. Айзенштат

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 767. Л. 134.

Падрыхтавала да друку Р.А. Чарнаглазава.

АКТ КРЫЧАЎСКАЙ ГАРАДСКОЙ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННЮ ЗЛАЧЫНСТВАЎ ГІТЛЕРАЎСКІХ АКУПАНТАЎ

29 ноября 1944 года, г. Кричев Могилевской области, БССР.

Материалами следствия, осмотром мест истребления и захоронения, а также медицинским исследованием останков трупов, Кричевская городская комиссия по содействию в работе Чрезвычайной Государственной комиссии по расследованию и установлению злодеяний немецко-фашистских захватчиков установила:

В течение всего периода временной оккупации на территории г. Кричева и его окрестностей немецко-фашистские захватчики проводили массовое истребление советских военнопленных и мирных граждан.

Они повесили, расстреляли и замучили советских военнопленных и мирных граждан около 24 тысяч человек, а также угнали в немецкое рабство советской молодежи 927 человек.

Комиссией при осмотре мест расстрела советских граждан в лесу в д. Прудок было обнаружено 50 могил, размером 3х2 метра. При раскопке могил было установлено, что они заполнены трупами расстрелянных граждан от 5 до 25 в каждой могиле, общим количеством более 1000 человек, в том числе около 30 женщин.

[1] Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995, с. 31.

На расстрел граждан возили на специально оборудованной закрытой машине под охраной немецких жандармов, подвозили к заранее подготовленным могилам, где раздевали до нижнего белья, ставили лицом к яме и расстреливали из пистолетов в затылок.

Подобные расстрелы производились большей частью днем, зимой и летом. В числе расстрелянных опознали при раскопке могил следующие лица: Окаемов Александр Иванович, Лузенин Геннадий Павлович – московские артисты, что подтверждается свидетельскими показаниями гражданки Терентьевой Екатерины Ильиничны, жительницы д. Прудок.

Свидетель, Зайцев Герасим Свиридович, 1894 года рождения – житель г. Кричева показал:

«В 1941 году с первых дней оккупации гитлеровцы стали творить издевательства и произвол над советскими людьми. В бывших общежитиях рабочих цементного завода они организовали лагерь для советских военнопленных, который обнесли тремя рядами колючей проволоки, высотой 3 метра.

На территории завода оборудовали каменный подвал, куда бросали расстрелянных, а также умерших от голода и болезней военнопленных. Потом трупы эти сжигали.

В лагере ежедневно умирало 60–70 человек.

Мне хорошо известно, что в лагере за весь период его существования содержалось около 35–40 тыс. человек. Пленных кормили шелухой от картофеля, выдавали в сутки по 100 грамм хлеба, а зачастую по 100 грамм муки из желудей. Один раз в сутки кормили супом из картофельной шелухи, который недоваривали, что вызывало массовое заболевание измученных непосильным трудом людей и ускоряло их смерть. Работать заставляли от темна до темна. Кто был слаб и не мог работать, избивали палками, травили собаками, а совершенно обессилевших расстреливали.

Я был очевидцем, когда вели партию военнопленных красноармейцев в лагерь и на моих глазах расстреляли 8 человек за то, что они не могли быстро двигаться, а трупы бросили под откос. Мне также было известно, что за весь период существования лагеря в подвале цементного завода было сожжено 8 тысяч трупов замученных и расстрелянных граждан.

Мне пришлось видеть, как немецкие изверги издевались над еврейским населением Кричева. Осенью 1941 года в город по приказу немецкого коменданта Бергера свезли еврейские семьи, их было около 30 человек, старики, женщины, дети. Им создавали невыносимые условия, кормили только водой, ежедневно выгоняли работать на ремонт шоссейной дороги. Слабых избивали палками. Так издевались в течение двух месяцев, а потом обессиленных привели на территорию цементного завода, заставили рыть могилы и всех расстреляли».

Подобные показания дали также свидетели: Куляко Семен Захарович и Олешко Лука Данилович.

Свидетель Вырво Евдокия Прокофьевна, 1921 года рождения, жительница города Кричева, показала:

«Осенью 1941 года я была арестована по подозрению, что еврейка. Когда обращалась к немцам о том, что я не еврейка и прошу освободить, меня били по голове палкой. Видела, как одну арестованную девушку по имени Соня, фамилии ее не знаю, гитлеровцы, подозревая в связи с партизанами, увели на допрос в гестапо, там ее пытали, ставя ногами на раскаленное железо, кололи иголками под ногти пальцев, избивали резиновыми палками, а потом раздели и расстреляли. Она ни в чем не призналась.

Всех арестованных евреев, после двухмесячных издевательств, отвели на цементный завод, где заставили их вырыть для себя могилы, и расстреляли. Я же по просьбе граждан Кричева была отпущена».

Свидетель Янушкова Мария Мартыновна, жительница Кричева, рассказала:

«В период оккупации города Кричева немецкими захватчиками я проживала все время в г.Кричеве и была свидетельницей немецко-фашистских злодеяний над советскими людьми. Видела, как в декабре 1942 года на площади Кричева были повешены 5 человек, захваченных немцами, партизан. Перед повешением их избивали, висели они трое суток, после чего немцы сняли и увезли по направлению д. Прудок. Я видела, как арестованных евреев немцы запрягали в телеги и заставляли их возить воду. Знаю также, что в октябре 1941 года немецкие изверги около льнозавода расстреляли 130 евреев: стариков, женщин и детей. Одна еврейка по фамилии Шуфер сумела уйти из-под расстрела, скрывалась около месяца, но была поймана полицией, посажена в подвал, где ее били, пытали, а затем расстреляли».

Свидетель Мельникова Татьяна Ивановна, 1899 года рождения, жительница Кричева показала:

«В 1941 году, когда немцы оккупировали Кричев, с первых же дней начали они зверски поступать с мирным населением, а также военнопленными – бойцами и командирами Красной

граждан вывели за деревню в болото и убили. Перед расстрелом всех разули и раздели, оставив в одном нательном белье. Трупы не разрешали закапывать около 5 дней.

19 декабря 1941 года немцы забрали в нашей деревне студентку сельскохозяйственного института Вертливу Зинаиду, увели ее в д. Шаевка на колхозный ток, где раздели и расстреляли. При раскопке ямы, где было расстреляно 18 человек, была обнаружена женщина, держащая на руках грудного ребенка, который не был убит, а закопан живым, у мальчика даже не были закрыты глаза и не имелось ран на теле».

Свидетель Вайлунов Семен Иванович, 1882 года рождения, житель д. Прусина Ботвиновского с/совета, показал:

«Я во время немецкой оккупации Кричевского района жил в деревне Прусино. В апреле 1942 года немцы собрали 7 человек, проживающих в нашей деревне, вывели их за окраину к заранее выкопанной яме и расстреляли. Трупы не разрешали закапывать в течение трех дней. Потом женщины нашей деревни их похоронили».

Немецкие захватчики разрушили цементный, фосфоритный, меловой, кирпичный заводы, лесокомбинат, винокурный завод, льнозавод, торфозавод, депо станции Кричев, уничтожили 6 мельниц, мастерские Сожстроя, взорвали четыре шлюза на реке Сож, разрушили баню, четыре больницы, 41 школу, педучилище, узел связи, банк, гвоздильный завод, радиоузел, редакцию и типографию райгазеты, школу тракторных бригадиров республиканского значения, хлебозавод, инкубаторную станцию, маслозавод, трикотажную мастерскую.

Оккупантами за период их хозяйничания в районе большой ущерб нанесен и коммунальному хозяйству. За этот период ими было сожжено по району 3699 жилых домов, в том числе в г. Кричеве 929.

Большой ущерб фашисты нанесли сельскому хозяйству района. Из колхозов забрали 129 быков-производителей, 2751 корову, 4 рабочих вола, 2212 голов молодого крупного рогатого скота, 132 хряка-производителя, 1161 свиноматку, 175 баранов-производителей, 3291 ягненка, 93 головы жеребцов-производителей, 1129 кобылиц, 2034 мерина, 1173 молодых лошадей, 9530 кур, 601 улей пчел. Всего на сумму 31127275 рублей.

Кроме того, уничтожили и увезли 6 автомашин, 2205 плугов, 2017 борон, 59 сеялок, 70 сенокосилок, 157 жаток, 65 граблей конных, 162 молотилки, 242 сортировки, 101 картофелекопалку, 6 льномялок, 146 соломорезок, 1760 повозок, 1015 саней, 3223 комплекта сбруи, пожарную машину. На сумму 2673200 рублей. Общая сумма убытков в результате причиненного ущерба немецкими оккупантами по Кричевскому району составляет 142759100 рублей.

Кричевская городская комиссия за все злодеяния и разрушения культурных и материальных ценностей, грабежей считает ответственными гитлеровское правительство, а также конкретных организаторов и исполнителей злодеяний:

Лейтенанта Кардека Вильгельма – начальника жандармерии, лично производившего расстрелы;

Обер-лейтенанта Шмидта – заместителя начальника жандармерии;

Лейтенанта Пасмана Ганса – руководителя СД;

Офицера Птака – начальника гестапо;

Обер-групп. Зоха – полевая почта 09359 д, который лично арестовывал и расстреливал членов ВКП(б) и партизан;

Старшего лейтенанта Леммера – следователя гестапо;

Старшего лейтенанта Шлеммепа – зам. начальника гестапо;

Киля Адольфа – зав.полит.частью Доротдела, который насильно угонял молодежь в немецкую каторгу;

Дюнга Петера, обер-групп. фюрера;

Виза из рабочего бюро;

Капитана Вердеба – коменданта города Кричева;

Геттаха – работника гестапо;

Фиккера – офицера шефа;

Капитана Фон Бока – заместителя начальника отдела 1-Ц начальника лагеря военнопленных цемзавода;

Обер-лейтенанта Кивеля – начальника СД;

Отто – следователя СД;

Ганца – следователя СД.

Члены комисси:

Реутский, Цыганков, Терентьев, Павлов, Воскобойников, Мурашов, Онуфриев.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

Савецкія грамадзяне яўрэйскай нацыянальнасці – ахвяры фашызму

г. Кричев

Могила уников гетто. Возле заводоуправления ПО «Кричевцементшифер». Осенью 1941 г. гитлеровцы и полицаи замучили и расстреляли 80 семей евреев, которые оказались неугодными гитлеровскому режиму. Их пытали, били, а затем заставили рыть себе могилы и всех расстреляли.

г. Кричев

Могила узников гетто. Около льнозавода, во рву. В октябре 1941 г. гитлеровцы и полицаи замучили и расстреляли 130 евреев. Одна из обреченных (Шуфер) сумела спастись и месяц скрывалась. Однако ее поймали полицаи, посадили в подвал, били и пытали, а потом расстреляли.

Кричевский район, Малятичский сельсовет, д.Антоновка

Братская могила евреев. Возле деревни. 14 ноября 1941 г. немецкие каратели собрали местных евреев, в том числе 90-летнего старика, женщин с детьми разного возраста, подвели к заранее выкопанной яме, заставили раздеться и расстреляли.

Кричевский район, Малятичский сельсовет, д. Антоновка

Братская могила евреев. Возле деревни, на болоте. 17 ноября 1941 г. немецкие каратели арестовали оставшихся в живых 12 евреев, вывезли за деревню. Перед расстрелом заставили раздеться, оставив в одном нательном белье, затем уничтожили. Трупы не разрешали закапывать 5 дней.

Кричевский район, Краснобудский сельсовет, д. Прудок

Братская могила евреев и других жертв фашизма. В 0,4 км на северо-запад от деревни. Гитлеровцами и полицаями замучено и расстреляно в 1941–1943 гг. свыше 1,2 тысячи человек – евреев и людей других национальностей, жителей Кричева и деревень района.

В 1982 г. на месте уничтожения людей установлен памятник – двухфигурная скульптурная композиция и мемориальный знак (скульптор Э. Астафьев, архитектор Н. Казаков).

Друкуецца па кн.: Ботвинник Марат. Памятники геноцида евреев Белоруссии. Мн., 2000, с. 300–301.

Фронт у тыле ворага

У жніўні 1941 г. у Магілёўскім абкоме КП(б)Б, які тады знаходзіўся ў г. Касцюковічы, адбылася гутарка сакратароў ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкі, І.П. Ганенкі, Р.Б. Эйдзінава і першага сакратара Магілёўскага абкома КП(б)Б І.М. Макарава з групай адказных партыйных і савецкіх работнікаў, якіх вырашана было пакінуць на акупаванай тэрыторыі для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы ў тыле ворага. На гэтай нарадзе прысутнічалі першы сакратар Крычаўскага райкома КП(б)Б Іван Паўлавіч Станкевіч, другі сакратар Крычаўскага райкома КП(б)Б Кузьма Андрэевіч Рэуцкі і першы сакратар Круглянскага райкома КП(б)Б Арсен Трафімавіч Банчыкаў, якія ў адпаведнасці з рашэннямі ЦК КП(б)Б павінны былі застацца ў Крычаўскім раёне для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. Старшыня Крычаўскага райвыканкома А.Т. Лаўрэнаў быў прызваны ў Чырвоную армію.

Пасля нарады яны накіраваліся ў Крычаўскі раён, куды прыйшлі 24 жніўня 1941 г. У той жа дзень каля

вёскі Плешчына яны спалілі нямецкі самалёт, які зрабіў вымушаную пасадку, а таксама падарвалі чыгуначную лінію на перагоне Маляцічы–Крычаў. 25 жніўня яны рашылі адшукаць пакінутую ў тыле ворага партызанскую групу на чале з І.Р. Бальшуновым, якая павінна была знаходзіцца ў Кашанскім лясным масіве. Але адшукаць яе сакратарам райкома КП(б)Б не ўдалося, бо яе ўжо там не было.

Праз два дні пасля прыбыцця на базу былі накіраваны для сувязі на цэмзавод У.І. Волкаў, Ф.М. Жураўкоў, Я.М. Вінакураў і М.Д. Белавусаў. Але яны не вярнуліся. Пазней стала вядома, што партызан высачыў нейкі здраднік, яны былі схоплены фашыстамі і расстраляны. Каля Кашанскага лесу гітлераўцы сталі часта наладжваць засады. І.Р. Бальшуноў і К.В. Валасевіч вымушаны былі пакінуць базу і пайсці ў лес, што знаходзіўся каля вёскі Паланіца. У жніўні 1941 г. не вярнуўся з разведкі К.В. Валасевіч. Пасля высветлілася, што ён ажаніўся з пляменніцай бургамістра і застаўся жыць у в. Паланіца.

Так распалася партызанская група І.Р. Бальшунова. сам ён пайшоў у Касцюковіцкі раён і там уступіў у партызанскую групу М.А. Нарчука, дзе камісарам быў С.П. Казлоў. У маі 1942 г. яна ўлілася ў партызанскі атрад «124-ы Касцюковіцкі». У жніўні 1942 г. гэты атрад увайшоў у партызанскую брыгаду «Уперад», якой камандаваў П.Р. Шамакін. Спачатку І.Р. Бальшуноў быў байцом, затым камандзірам аддзялення, групы падрыўнікоў, камсоргам разведвальна-дыверсійнай роты. У баях з фашысцкімі захопнікамі ён быў паранены. За падрыў 4 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай І.Р. Бальшуноў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Ён таксама ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені і медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

Высветліўшы, што групы Бальшунова больш не існуе, І.П. Станкевіч, К.А. Рэуцкі і А.Т. Банчыкаў пайшлі ў Клімавіцкі раён. 1 верасня 1941 г. рашылі выйсці за лінію фронту і адправіліся на ўсход. Аднак 9 верасня ў в. Папоўка Бранскай вобласці яны трапілі ў палон.Неўзабаве ім удалося ўцячы з лагера.

11 верасня 1941 г. К.А. Рэуцкі вярнуўся на Крычаўшчыну. Тут ён даведаўся, што А.Т. Банчыкаў пайшоў у Суражскі раён Віцебскай вобласці, а І.П. Станкевіч – у Магілёўскі. Там І.П. Станкевіч неўзабаве аказаўся ў партызан. Спачатку ён быў радавым, затым камандзірам атрада. Са жніўня 1943 г. па чэрвень 1944 г. сакратар Магілёўскага падпольнага райкома КП(б)Б.

На Крычаўшчыне К.А. Рэуцкі 27 верасня 1941 г. наладзіў сувязь з групай савецкіх воінаў у колькасці 12 чалавек, якія засталіся на акупаванай тэрыторыі. Камандаваў гэтай групай Мікалай Паўлавіч Вінаградаў (сапраўднае яго прозвішча Палякоў). Гэтая група размяшчалася ў пасёлку Істоміна Бацьвінаўскага сельсавета, у доме Клаўдзіі Аляксееўны Шынкаровай. У складзе групы былі камуністы і камсамольцы.

У доме К.А. Шынкаровай, пад падлогай, у яме, быў устаноўлены радыёпрыёмнік, па якому партызаны прымалі зводкі Саўінфармбюро. Гэтыя зводкі перапісвалі ад рукі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва. У вёсцы ў гэты час заставацца было небяспечна, бо акупанты ў буйных населеных пунктах пачалі ствараць паліцэйскія гар-

нізоны. К.А. Рэуцкі прапанаваў астаўвацца ў лесе. Недалёка ад вёскі Вародзькава, у лесе, была выкапана зямлянка, у якой размясцілася партызанская група Вінаградава. У ёй у гэты час налічвалася 22 чалавекі: 12 воінаў Чырвонай арміі і дзесяць мясцовых жыхароў.

Партызаны пачалі баявыя дзеянні. Мінёры падарвалі на дарозе Чавусы–Крычаў сем грузавых аўтамашын і адну легкавую з афіцэрамі. Знаходзячыся ў гэтай групе, К.А. Рэуцкі наладзіў сувязь з падпольшчыкамі цэмзавода і чыгуначнага вузла, прыняў меры па арганізацыі і ўзмацненню падпольнай барацьбы ў горадзе і сельскай мясцовасці. Для наладжвання сувязі накіроўваліся сувязныя Ігар Якаўлевіч Ракоўскі, Васіль Іванавіч Дварачэнка, Надзея Платонаўна Іванюшава і Іван Елісеевіч Ватага. З кіраўніком Бацьвінаўскай падпольнай групы Б.Е. Грыгор'евым неаднаразова сустракаўся асабіста.

У лістападзе 1941 г. карны атрад выявіў месца дыслакацыі партызанскай групы Вінаградава (Палякова) і акружыў яе. Завязаўся бой. Партызаны пакінулі зямлянку і перабраліся ў Даленшчынскі лес. Потым пайшлі ў бранскія лясы.

Аб далейшым лёсе гэтай партызанскай групы і яе кіраўніка Вінаградава ніякіх звестак няма.

Наступіў халодны снежань 1941 г. З К.А. Рэуцкім засталося 8 чалавек з мясцовых жыхароў.

У студзені 1942 г. К.А. Рэуцкі моцна захварэў. Ён лячыўся ў свайго старога знаёмага Васіля Іванавіча Банькоўскага з вёскі Стаборшчына, потым у Смаленскай вобласці. А калі папраўіўся, у лютым 1942 г. К.А. Рэуцкі вярнуўся ў Крычаўскі раён і зноў прыняўся за арганізацыю падпольнай і партызанскай барацьбы.

Падполле дзейнічала

Падпольная група на цэментным заводзе і чыгуначным вузле. З верасня 1941 г. на цэментным заводзе і чыгуначным вузле дзейнічала падпольная група, якая была арганізавана Аляксеем Лазаравічам Гаўрыленкам. Ён нарадзіўся ў 1913 г. у г. Данецку. Да 1939 г. працаваў тэхнікам аўтатрактаразбыту. У 1939 г. яго абралі сакратаром камсамольскай арганізацыі цэмзавода. У ліпені 1941 г. быў пакінуты райкомам КП(б)Б для арганізацыі падпольнай барацьбы на акупаванай тэрыторыі.

Першапачаткова ў гэтую падпольную групу, акрамя А.Л. Гаўрыленкі, ўваходзілі Сцяпан Рыгоравіч Маёраў і Андрэй Данілавіч Атрашкевіч. Яны былі камсамольцамі. Падпольшчыкі здабывалі звесткі аб нямецкіх эшало-

А.Л. Гаўрыленка.

нах з жывой сілай і тэхнікай, якія рухаліся на фронт, аб будаўнічых работах па аднаўленню цэментнага завода. Гэтыя звесткі цераз падпольшчыкаў Бацьвінаўскай групы І.Я. Ракоўскага і Б.Е. Грыгор'ева перадаваліся К.А. Рэуцкаму, які ў гэты час знаходзіўся ў партызанскай групе Вінаградава.

У сувязі з тым, што група была невялікая, а аб'ём работы ўзрастаў, К.А. Рэуцкі даў указанне А.Л. Гаўрыленку прыняць у групу новых патрыятычна настроеных людзей. Да канца 1941 г. група значна вырасла. У яе рады ўліліся Радзівон Філімонавіч Федасенка, Варвара Рыгораўна Маёрава, Мікалай Сямёнавіч Лацкевіч, Браніслаў Аляксандравіч Герман, Васіль Міхайлавіч Серабабаў, Фёдар Захаравіч Чаусаў, Іосіф Анісімавіч Казлоў, Лука Данілавіч Алекчанка, Мамон Емяльянавіч Рыжкоў, Валянцін Міхайлавіч Пільнікаў, Васіль Мікалаевіч Карпекін, Мікіта Данілавіч Белавусаў, Сяргей Адамавіч Карпушоў, Піліп Якаўлевіч Маёраў, Зінаіда Іонаўна Федасенка, Уладзімір Радзівонавіч Федасенка. Вялікую дапамогу ваеннапалонным аказваў урач А.П. Макараў, які таксама ўваходзіў у гэтую падпольную арганізацыю.

Цяпер група мела сваіх людзей у многіх нямецкіх арганізацыях. Яна была добра інфармавана аб намерах і дзеяннях гітлераўцаў. Падпольшчыкі не толькі займаліся разведвальнай справай. Яны праводзілі таксама палітычна-растлумачальную работу сярод насельніцтва. Група мела радыёпрыёмнік, які быў устаноўлены на кватэры С.Р. Маёрава. Падпольшчыкі прымалі зводкі Саўінфармбюро, перапісвалі іх і распаўсюджвалі сярод насельніцтва і ваеннапалонных крычаўскага лагера. Члены групы чыталі газету «Рабочий путь», якую дастаўляў В.М. Серабабаў ад смаленскіх падпольшчыкаў.

У верасні 1941 г. фашысцкія захопнікі, выкарыстоўваючы ваеннапалонных у якасці рабочай сілы, пачалі аднаўленчыя работы на цэментным заводзе. Былі завезены турбіны і пушчана ЦЭЦ. У кастрычніку былі ўстаноўлены рухавікі і помпы. Пачалася адкачка вады з крэйдавага кар'ера, вяліся падрыхтоўчыя работы да пуску печаў абпалу клінкера і яго размолу.

А.Л. Гаўрыленка атрымаў заданне сарваць аднаўленчыя работы на заводзе, не даць магчымасці фашыстам наладзіць вытворчасць цэменту.

У той час на заводзе працавалі падпольшчыкі Р.М. Штолік, А.Д. Атрашкевіч, Ф.З. Чаусаў. Гаўрыленка даў заданне майстру механічнага цэха Чаусаву вывесці са строю электрарухавікі. Р.Ф. Федасенка, фізік па адукацыі, параіў як гэта зрабіць. Чаусаў насыпаў іголкі ў рэастаты рухавікоў. У выніку атрымалася кароткае замыканне, згарэлі абмоткі і якары. Са строю выйшлі 35 электрарухавікоў. Пасля гэтага Чаусаў вымушаны быў пакінуць завод. Немцы вялі работы па рамонту корпуса і аднаўленню трансмісій. Сарваць гэтыя аднаўленчыя работы было даручна новаму начальніку механічнага цэха Р.М. Штоліку і слесару А.Д. Атрашкевічу, які ў ходзе мантажу трансмісій прывёў у непрыгодны стан падшыпнікі. Праз некаторы час былі прывезены новыя падшыпнікі, укладышы і рухавікі. Падпольшчыкі спецыяльна ўстанавілі валы з некаторым перакосам. У выніку завод так і не змаглі запусціць.

А.Л. Гаўрыленка праяўляў клопаты

аб забеспячэнні сем'яў падпольшчыкаў, партызан і воінаў Чырвонай арміі прадуктамі харчавання. Па яго заданню на нарыхтоўчую базу ўладкаваліся працаваць І.А. Казлоў і Р.Ф. Федасеенка. Восенню 1942 г., калі гітлераўцы прымушалі вяскоўцаў здаваць зерне акупацыйным уладам, Казлоў і Федасеенка выпісвалі падпольшчыкам квітанцыі за нібыта здадзенае зерне. З гэтай базы падпольшчыкі з дапамогай Федасеенкі, Казлова, Лацкевіча вывозілі ў горад, а таксама ў вёскі Бацьвінаўка, Касцюшкавічы, Баеўка муку, зерне, соль. Усё гэта раздавалася насельніцтву. Імі таксама рыхтаваліся прадукты для партызанскай групы, на аснове якой быў створаны 48-ы асобны крычаўскі партызанскі атрад.

Вялікую работу вялі падпольшчыкі на чыгуначным вузле. У пачатку 1942 г. па ўзгадненню з падпольнай групай на работу ў крычаўскае паравознае дэпо ўладкаваўся В.М. Пільнікаў, кандыдат у члены партыі. Праз некаторы час ён стаў тут інжынерам, збіраў звесткі аб эшалонах, якія рухаліся на фронт з жывой сілай і баявой тэхнікай. Такія данясенні да жніўня 1942 г. перадаваліся К.А. Рэуцкаму, пасля ўпаўнаважанаму Магілёўскага падпольнага абкома партыі Н. Нікіфараву.

У гэты час у дэпо працавалі В.М. Карпекін і Ф.Я. Маёраў. Яны зрывалі рамонт паравозаў, рабілі дыверсіі. У 1943 г. група замініравала 2 варожыя эшалоны, якія накіроўваліся на фронт. Адзін з іх падарваўся каля ст. Клімавічы, другі каля ст. Журбін.

Цэмзаводская падпольная група вяла значную работу сярод ваеннапалонных. Падпольшчыкі расказвалі ім аб абстаноўцы на франтах, дапамагалі ваеннапалонным вызваліцца з лагера смерці. За два гады падпольшчыкі з групы А.Л. Гаўрыленкі вызвалілі з лагера каля 900 чалавек. Актыўна дапамагалі ім у гэтым урачы лагернага шпіталю Аляксей Пятровіч Макараў і Сямён Васільевіч Алтаеў.

М. Патапенка.

Падпольная група ў г. Крычаве. З верасня 1941 г. да лютага 1943 г. у Крычаве дзейнічала падпольная група пад кіраўніцтвам кандыдата ў члены ВКП(б), былога тэхнарука камбіната Мацвея Рыгоравіча Каінава. У ліпені 1941 г. ён быў пакінуты райкомам КП(б)Б для вядзення падпольнай работы. У верасні ў гэтую групу ўступілі Марыя Сяргееўна Талкачова, Мікалай Цімафеевіч Янушкоў, Сяргей Кузьміч Дудзін, Любоў Лявонаўна Лазарава, Мікалай Рыгоравіч Зонтаў. У кастрычніку 1941 г. падпольшчыкамі сталі члены ВКП(б)Б Кліменцій Пятровіч Зенчык, Віталь Аляксандравіч Цыгуроў, Яўген Іосіфавіч Казлоў, Мікалай Іванавіч Куляшоў і Мікалай Кузьміч Дудзін. Усе яны былі воінамі Чырвонай арміі, якія трапілі ў акружэнне і засталіся на акупаванай тэрыторыі. У студзені–лютым 1942 г. уступілі ў падпольную групу Іван Васільевіч Мардовін і Анатоль Салаўёў – былыя ва-

М.Р. Каінаў.

еннапалонныя, а таксама Вера Сяргееўна Талкачова, Яўген Іванавіч Зонтаў, Леанід Кузьміч Дудзін і піянер Віктар Кузьміч Дудзін.

Гэтая група праз сувязных М.С. Талкачову і Л.Л. Лазараву падтрымлівала сувязь з сакратаром райкома КП(б)Б К.А. Рэуцкім, які даваў заданні і парады М.Р. Каінаву як лепш арганізаваць падполле. Рэуцкі двойчы сустракаўся з М.Р. Каінавым. Першая сустрэча адбылася каля вёскі Залесавічы, другая – недалёка ад вёскі Камароўка.

Каб ведаць аб намерах і дзеяннях акупантаў, Рэуцкі параіў Каінаву накіраваць для работы ў бургамістраце М.С. Талкачову, якая да вайны працавала бухгалтарам у ДЭУ-919.

Бургамістр П.З. Кісялёў, які да вайны быў настаўнікам, а пасля акупацыі горада стаў верным паслугачом нямецкіх фашыстаў, прыняў яе вельмі ветліва, як дачку рэпрэсіраванага, прызначыў справаводам у бургамістраце.

М.С. Талкачова, працуючы на гэтай пасадзе ў бургамістраце, вяла не толькі актыўную разведвальную работу. Яна праз работніка пашпартнага стала Лісюка даставала чыстыя бланкі пашпартоў з нямецкімі пячаткамі. Гэтыя пашпарты выдаваліся палонным салдатам і афіцэрам Чырвонай арміі, якія такім чынам вызваляліся падпольшчыкамі з нямецкага палону.

М.С. Талкачова наладзіла сувязь з Мікалаем Іванавічам Куляшовым, педагогам па адукацыі.

С 29 сентября по 18 октября в Кричевском районе взорвано 13 немецких автомашин, из них 2 легковые. Убито в этих операциях 90 немецких солдат и офицеров, ранено 39.

30 сентября казнен изменник Родины Езерский за выдачу людей, связанных с партизанами.

23 октября разоружена полиция в дер. Доленщина.

22 ноября карательный отряд сделал попытку окружить Доленский лес, однако операция провалилась. 4 полицейских убиты, 2 ранены.

30 февраля 1942 г. батальон немецкой пехоты атаковал отряд в Доленском лесу, окружив его в землянках. Однако в результате ответного огня немцы бежали.

30 марта – то же в Прибережском лесу.

2 мая был разбит отряд полиции в дер. Доленщина.

До 24 июня Доленщина находилась в руках отряда.

4 мая отряд разогнал полицию в дер. Ратная, захватив много трофеев.

12 мая – то же в дер. Верховцы.

14 июня был обстрелян двигавшийся по Верховскому шляху отряд немцев в количестве 150 человек (полевая жандармерия). Один жандарм был убит и 4 ранено.

24 июня карательный отряд в составе 800 немецких солдат и офицеров и 700 полицейских, вооруженный 1 танкеткой, 6 пушками 76-мм калибра, 11 станковыми пулеметами и 5 ручными, 13 автоматами, окружил партизанский отряд «Чапай» в Доленском лесу.

Отряд прорывался в трех направлениях. Первую группу вел Золотаренко, вторую – Китаев, третью – Ширкунов.

Отряд нарушил телефонную связь немцев. Это вызвало расстройство в рядах противника, и фашисты в панике бежали из леса. На другой день все три группы объединились в дер. Доленщина.

18 июля партизанами были захвачены и расстреляны полицейские.

2 августа на р. Волчас (Волчица), на перегоне Веремейки – Осовец был взорван железнодорожный мост, чем было остановлено движение на 2 недели.

7 августа в район действий отряда «Чапай» прибыли карательные отряды из Климович и Черикова, 9 августа – из Чаус и Климович, однако ничего не добились.

7 августа, потеряв 3 немцев и 4 полицейских, они отступили. 9 партизан устроили засаду. Каратели бежали, оставив на поле боя 2 автомашины, 8 убитых и 7 раненых.

14 августа отряд «Чапай» разбил в Сокольничах маслозавод. Командовал группой Якунов. В операции участвовали Горохов, Цигуров, Голетов, Будыкин и др.

27 августа в дер. Шаевка был разбит маслозавод.

30 августа на магистрали Москва – Варшава были обстреляны 2 автомашины, убито 6 немцев, 3 ранено. Одновременно был пойман и расстрелян начальник дорожного строительства.

За время действия отрядом было убито 158 немцев и 42 полицейских, ранено 96 немцев и 8 полицейских.

24 августа 1941 г. Реутский, Станкевич и Банчиков ушли в Кричевский район. Сожгли немецкий самолет, сделавший вынужденную посадку в дер. Плещино, взорвали ж.д. линию на перегоне Кричев – Малятичи.

После этого – переход опять в Климовичский район. 1 сентября отряд уходит к линии фронта. 9 сентября 1941 г. в дер. Поповка Орловской обл. попали в руки провокаторов – местных жителей. Станкевичу и Банчикову удалось бежать сразу. Реутский был пойман и после избиения ему удалось бежать в одном нижнем белье из-под расстрела.

17 сентября Реутский возвращается в Кричевский район. 27 сентября он связывается с группой окруженцев из 12 человек, которые проживали в дер. Истомин. Руководил группой инженер Виноградов Николай.

В период войны в Кричеве работал железнодорожный узел и депо. Из кустарных предприятий – гвоздильная артель.

Распущено 72 колхоза. Организовано 2 земских хозяйства в дер. Залесовичи и Низки.

Остальная земля роздана крестьянам из расчета 2 га на двор и 0,5 га усадьбы. Лошади розданы 1 на 3—4 хозяйства.

Поставки: 2 центнера с га зерновых, картофеля – 100 кг с души, 120 руб. в год налога, за корову 200 р., за лошадь – 400, за собаку – 120, 150 литров молока, 75 шт. яиц со двора, шерсть забирается вся.

На 3 сентября отряд состоял из 42 человек. Командир отряда до перехода и в период перехода Золотаренко Владимир Григорьевич, комиссар – Китаев Василий Петрович, начальник штаба – Якунов Юрий Тихонович.

Отряд имел на вооружении 6 ручных пулеметов, 2 автомата, 10 полуавтоматических винтовок и русских винтовок образца 1930 г. 13 штук.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1394. Воп. 1. Спр. 23. Л. 179.

Падрыхтавала да друку Л.У. Ляховіч.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА «АЛЕСЯ»

15 августа 1942 г. по предложению тов. Перовского силами группы в 24 человека совершен разгром маслозавода в дер. Сокольничи, единственного в Кричевском районе. Кроме того, было разгромлено здание волости, казнен бургомистр, его жена и брат (Пузыревские). Операция прошла без потерь. В операции по разгрому маслозавода

участвовали Константин Грибко и Ефремов Василий из отряда «Алеся» и пулеметчик Горох из отряда им. Чапаева. Группу по разгрому Сокольничской волости возглавляли комиссар отряда Кочубея тов Фурманов, командир отряда им. Чапаева тов. Якунов.

22 августа 1942 г. группой партизан из отрядов «Алеся» и Кочубея под командованием Перовского была взорвана железнодорожная линия в районе деревни Коренец, в результате чего было совершено крушение военного немецкого эшелона. Разбито 13 вагонов, убито 300 немцев, ранено 100, сгорело 11 цистерн с горючим материалом.

Под руководством тов. Перовского, при содействии Асмоловской Лидии, был захвачен немецкий офицер Эрнст фон Файт (26 июня 1942 г.), который 13 лет руководил в Москве шпионской организацией, был арестован, обменен на 2-х коммунистов.

Фон Файт во время своего пребывания в лагере дал важные показания, сообщил имена и звания шпионов, действующих на территории СССР. 10 агуста 1942 г. был расстрелян.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1394. Воп. 1. Спр. 23. Л. 175.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 3

17 декабря 1942 г. диверсионная группа из 6 человек – старший лейтенант Кириллов, бойцы Кругалев Матвей, Лукьянец Василий, Галисевич Алексей, Нехайчик, Арсеньев – была направлена командованием партизанского отряда № 3 на участок ж.д. Кричев – Климовичи. 21 декабря группа достигла места назначения и совершила взрыв эшелона из 10 классных вагонов с живой силой противника...

Охрана ж.д. (немецкая) в Кричевском районе – 1 немец на 1 км ж.д. Ночью проходила охрана патрулированием группой немцев с расчетом 3 человека на 0,5 км ж.д. Позже в ночное время стали использовать мирных жителей: на 50 м 1 крестьянин, в задачу входило наблюдение за участком. В случае минирования не обнаруживать своего присутствия, а запоминать место и докладывать немцам. В случае взрывов дороги немцами расстреливались целые группы крестьян, обвиненных в связи с партизанами.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1394. Воп. 1. Спр. 23. Л. 174.

Падрыхтавала да друку Л.У. Ляховіч.

Таццяна Гіндзіна

Бацька памёр рана. На руках маці засталіся дзеці. Таня – старэйшая. Яна хадзіла ў школу ў суседнюю вёску. Не так, здавалася, далёка ад Пакладоў да Сакольнічаў. Але былі зімовыя дні, калі над зямлёй круціліся моцныя завірухі. Тады нават смелыя хлапчукі не адважваліся пускацца ў дарогу. Толькі Таня не палохалася стыхіі. Закінуўшы за спіну торбу з саматканага палатна з кнігамі, яна рашуча накіроўвалася ў дарогу.

З усіх прадметаў у школе Тані найбольш падабаліся матэматыка і гісторыя. Матэматыка – за дакладнасць, гісторыя за тое, што настаўнік цікава расказваў пра мінулае нашай краіны.

Таня рана пакінула школу. Трэба было працаваць, дапамагаць маці, каб вучылася малодшая сястрычка Поля. Таня вельмі любіла машыны. Калі ў Пакладах з'явіўся першы трактар,

Т.М. Гіндзіна.

дзяўчына кожную вольную хвіліну праводзіла ля яго. Нават любімай у яе была песня пра трактарыста з далёкай Сібіры Дзікава Пятра, якога кулакі спрабавалі спаліць жывым.

«Пракаці нас, Пятруша, на трактары, за аколіцу нас пракаці», — звонка спявала Таня і дома, і ў полі.

І не выпадкова ў 1935 годзе 18-гадовай дзяўчынай Таццяна Гіндзіна села за руль трактара, скончыўшы курсы механізатараў у Крычаве. Рослая, фізічна вельмі моцная, яна працавала, не пакладаючы рук.

Дырэктар Крычаўскай МТС, ленінградскі рабочы Алфімаў, аднойчы сказаў Гіндзінай:

— Ты, Таня, часта замяняла брыгадзіра і спраўлялася з абавязкамі паспяхова. Ёсць думка накіраваць цябе ў школу брыгадзіраў. Згодна?

— Згодна.

У 1937 годзе Таццяна Гіндзіна скончыла рэспубліканскую школу брыгадзіраў. Хутка пра яе загаварылі, як аб лепшай трактарыстцы ў раёне. Яе выбралі дэлегатам на Усебеларускі з'езд перадавікоў сельскай гаспадаркі. Праз год Таццяну выбіраюць старшынёй Сакольніцкага сельсавета, а ў 1939 годзе вылучаюць на пасаду інструктара райвыканкома па калгаснаму будаўніцтву.

...Суровыя дні 1941 года. Вайна! Таццяна Гіндзіна выконвае многія даручэнні райкома партыі па эвакуацыі калгаснай маёмасці ў тыл краіны. Пасля эвакуіруецца сама з грудным дзіцём на руках. Пад Рослаўлем на эшалон напалі фашысцкія самалёты. Яны бязлітасна расстрэльвалі жанчын, дзяцей, старых. Не мінула куля фашысцкага пілота і маленькага сына Гіндзінай. Ён быў забіты на матчыных руках.

...У Маскву, у адну з ваенных арганізацый, ішлі і ішлі пісьмы. Таццяна Гіндзіна, эвакуіраваная ў Паволжжа, прасіла прызваць яе ў армію і накіраваць у варожы тыл. Яна гатова выканаць любое заданне. Ёй доўга адмаўлялі, а потым задаволілі просьбу.

Былы партызан-дэсантнік Мікалай Машкоў успамінаў, што Таццяна Гіндзіна хутчэй і лепш за іншых асвоіла цяжкую дэсантную службу. Мела яна і добрую палітычную падрыхтоўку. Таму перад адпраўкай у тыл ворага Таццяну прызначылі намеснікам камандзіра групы па палітычнай частцы.

Цяжкім аказаўся шлях групы ад блакітных азёр Віцебшчыны на Магілёўшчыну. Былі дробныя сутычкі і сапраўдныя баі з гітлераўцамі і паліцаямі. Неаднаразова даводзілася прабівацца з акружэння.

З кожным днём дэсантнікі набліжаліся да мэты. Таццяна хвалявалася. Яна хутка ўбачыць родныя мясціны. Будзе бязлітасна помсціць ненавіснаму ворагу за спаленыя гарады і вёскі Беларусі, за мукі і кроў савецкіх людзей.

...Напаткала бяда за Чэрыкавам. Меншая частка групы падыйшла да вёскі каля Вепрына. Пастукалі ў адну з хат. Адчыніла жанчына, муж якой быў паліцаем. Убачыўшы партызан, яна прапанавала:

— Пачакайце ў хаце, а я збегаю за прадуктамі.

Выбегла на вуліцу, села на каня і паімчала ў паліцэйскі гарнізон.

Адчуўшы нядобрае, дэсантнікі кінуліся ў лес. Але было позна. Ворагі насядалі. Таццяна Гіндзіна прыкрывала адыход групы. Першым звалілі напавал паліцая – мужа той жанчыны, у дом якой заходзілі партызаны. Пасля параніла яшчэ двух.

Сілы аднак аказаліся няроўнымі. Скончыліся і патроны. Паліцаі акружылі параненую партызанку, схапілі яе, доўга білі. Пасля пагналі яе босай у Чэрыкаўскае гестапа. На допыце Таццяна трымалася мужна. На грубасць адказвала грубасцю. У яе нават хапіла сілы запусціць чарнільным прыборам у фашыста-следчага.

Раніцой 19 лістапада 1942 года Таццяну Гіндзіну вынеслі на расстрэл. Ёй гестапаўцы пераламалі рукі і ногі, яна не магла ні рухацца, ні стаяць. Лежачы на краі яра, мужная патрыётка, сабраўшы апошнія сілы, прыўзняла галаву і заспявала: «Страна моя, Москва моя...». Гітлераўскі афіцэр выхапіў з рук салдата аўтамат і чэргамі адкрыў агонь па жанчыне.

Імя патрыёткі Таццяны Гіндзінай носіць адна з вуліц у г. Крычаў. Яе імем названа паляводчая брыгада вёскі Паклады калгаса «Запаветы Ільіча». Калгаснікі ўстанавілі бюст сваёй зямлячкі ў вёсцы Сакольнічы. Маладыя механізатары калгаса спаборнічаюць за права атрымаць прыз імя Таццяны Гіндзінай, гераіні працы і вайны, патрыёткі.

М.Ф. Мельнікаў.

Мужнасць журналіста

У штаб Мінскага партызанскага злучэння прыбыў самалётам з Масквы Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў, член бюро ЦК камсамола Беларусі, наш зямляк з вёскі Бель-3. Быў цяжкі для нашай краіны 1943 год.

Мінула некалькі дзён пасля гэтай падзеі, і ў партызанскіх атрадах атрымалі першыя нумары рэспубліканскай газеты «Звязда», а неўзабаве і камсамольскай «Чырвонай змены».

Выпуск адразу двух газет не на жарт занепакоіў фашысцкіх акупантаў. Агенты гестапа даносілі: партызаны даражаць газетамі не менш, чым патронамі і ўзрыўчаткай. З'яўленне газет актывізавала дзейнасць падпольшчыкаў у гарадах і вёсках Беларусі.

Самалёты праціўніка бамбілі тыя месцы, дзе, на думку гестапаўцаў, маглі знаходзіцца рэдакцыя і друкарня. Фашысцкія акупацыйныя ўлады вельмі зацікавіліся рэдактарам газет. Агенты гестапа атрымалі заданне знайсці і знішчыць бальшавісцкі партызанскі цэнтр, у тым ліку рэдактара. Але разведчыкі народных мсціўцаў своечасова выкрывалі варожых лазутчыкаў. Газеты выходзілі рэгулярна.

У пачатку 1944 года здарылася бяда: Міхаіл Парфёнавіч захварэў на тыф. Хворае сэрца не вытрымала хваробы. Незадоўга да смерці Барашкаў папрасіў партызан пахаваць яго ў палескім пасёлку Камсамолец, каля трох соснаў. Такія ж сосны раслі на яго радзіме ў вёсцы Бель-3.

Нядоўгае жыццё пражыў М.П. Барашкаў. Крыху больш за трыццаць, але многа змог зрабіць карыснага для люд-

М.П. Барашкаў.

зей. Быў важаком сельскіх камсамольцаў. У дваццаць гадоў стаў старшынёй прафсаюза рабочых зямлі і лесу Крычаўскага раёна. А пасля кіраваў тым жа прафсаюзам ва ўсёй Магілёўскай акрузе. Вучыўся ў камуністычным універсітэце Мінска, працаваў у рэдакцыях газет.

Вайну сустрэў на пасадзе рэдактара рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена». У час эвакуацыі ў тыл Міхаіл Парфёнавіч заехаў у родную вёску. Бацька строга спытаў сына:

— Многа ж вы, сынку, германцу сваёй зямлі аддалі. Хіба так ваююць?

— І ўсё ж, тата, перамога будзе за намі.

Наступіўшы час для Барашкава стаў перыядам выпрабаванняў. Хутка вярнуўся на акупаваную тэрыторыю Беларусі як упаўнаважаны ЦК камсамола па Віцебскай вобласці. Удзельнічаў у баях і паходах партызан, пабываў у многіх атрадах. Вярнуўшыся ў Маскву, працаваў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь». І вось зноў родная Беларусь, выпуск газет «Звязда» і «Чырвоная змена» у тыле ворага...

У Крычаве свята ўшаноўваюць памяць земляка-журналіста, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга Міхаіла Парфёнавіча Барашкава. Яго імя носіць адна з вуліц горада. Адзін са спартыўных мемарыялаў прысвечаны спаборніцтву на прыз імя Барашкава..

Была ў свой час мара мець у краязнаўчым музеі скульптурны партрэт журналіста-байца. І вось радасць: мінскі скульптар С. Адашкевіч па заданні нашага музея стварыў скульптурны партрэт М.П. Барашкава. Герой увасоблены ў той момант, калі ён узяў у рукі толькі што надрукаваны нумар «Звязды». Такім застаўся ён навекі ў памяці сяброў, такім увекавечыў яго скульптар.

М.Ф. Мельнікаў.

Пад варожымі бомбамі

У Чырвоную армію Анатоль Герасімавіч Грабскі быў прызваны ў 1940 годзе, вайна заспела яго на Украіне, у сяле Ляшкі Львоўскай вобласці. Полк адразу ўзнялі па трывозе і кінулі насустрач ворагу. Узбраенне было слабаватае – вінтоўкі, карабіны. Хіба гэтай зброяй пазмагаешся супраць танкаў, гармат і мінамётаў? Таму першая сутычка з гітлераўцамі не была пераможнай. Палова палка навечна засталася на полі бою, выжыўшыя адступілі ў горад Яварава, дзе трапілі ў варожае акружэнне. Спроба прарвацца не ўдалася. Толькі чацвёра вырваліся з акружэння, у тым ліку і Анатоль Герасімавіч.

Ішлі бязлюднай мясцовасцю, змарнелыя, галодныя, мокрыя ад поту. Урэшце ўліліся ў другую часць, якая таксама адступала. Грабскі трапіў у 180-ы запасны полк, які знаходзіўся ў Вінніцы. Хутка накіравалі на абарону Чаркас. Але ў баях пад Чаркасамі ўдзельнічаць не ўдалося, там паспешліва сфарміравалі часць і адправілі ў раён Канева. Анатоль Герасімавіч тут трапіў у часць, у задачу якой уваходзіла наладжванне пантонаў для пераправы цераз рэкі.

Ішлі баі, зноў адступалі. Цяжка было на душы, злосць і крыўда душылі салдат. Вораг таптаў нашу зямлю, займаў гарады і сёлы. Давялося Грабскаму дайсці да Дону.

У жніўні 1942 г. часць накіравалі ў Сталінград. Неабходна было аказваць дапамогу войскам, якія прыбывалі на абарону горада, перапраўляліся цераз Волгу. Шмат прыйшлося тут зведаць пакут. Над пераправай віселі варожыя самалёты. Пад бомбамі гінулі салдаты, ад выбухаў з вушэй цякла кроў, балела галава. Абстрэльвалі гітлераўцы пераправу і з гармат, і з мінамётаў. Снарады і бомбы разбуралі пантоны, іх трэба было зноў наладжваць. Асабліва цяжка было зімой. Ледзяная вада апякала цела, скалелыя рукі не слухаліся, пякуча калолі азяблыя ногі. Але работа па навядзенню пантонаў не спынялася.

Анатолю Герасімавічу пашанцавала выжыць пад Сталінградам. Здавалася, пасля такога пекла ўжо нічога не страшна. Але вайна працягвалася. Удзельнічаў Грабскі ў баях пад Харкавам, фарсіраваў раку Днепр, пад горадам Запарожжа санітары адшукалі яго, цяжка параненага, і даставілі ў шпіталь.

Падлячыўся Анатоль Герасімавіч і зноў пайшоў па франтавых дарогах. Удзельнічаў у вызваленні Польшчы, Германіі. Былі яшчэ раненні і кантузіі. Дэмабілізаваўся Грабскі ў 1946 годзе, праз год паступіў у Ленінградскі фінансава-эканамічны інстытут.

Анатоль Герасімавіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй» і іншымі.

К.Ф. Віктараў.

Адважны падводнік

У шостым нумары «Ваенна-гістарычнага журнала» за 1976 год (ст. 49) напісана: «У першай палове 1942 года на варожых камунікацыях дзейнічалі падводныя лодкі «ШЧ-213», «А-3», А-5» і іншыя».

Падводнай лодкай «А-5» камандаваў ураджэнец вёскі Антонаўка, што на Крычаўшчыне, старшы лейтэнант Рыгор Аронавіч Кукуй.

Нялёгка прыходзілася маракам. Гітлераўцы выкарыстоўвалі для барацьбы з падводнікамі самалёты, прыстасаваныя для гэтай мэты кацеры і мінныя загароды. Але падводныя лодкі Чарнаморскага флоту ўзорна выконвалі заданне камандавання: тапіць транспартныя караблі ворага, якія перавозілі ўзбраенне і салдат.

Аднойчы лодка «А-5» выйшла на баявое заданне. У раёне Адэсы маракі заўважылі караван гітлераўскіх караблёў. У суправаджэнні кацяроў аховы рухаўся транспартны карабель «Арузеаль». Што было рабіць? Рызыкоўна было нападаць, бо лодка знаходзілася не на надта вялікай глыбіні, гэта пазбаўляла падводнікаў магчымасці ўхіліцца ад атакі кацяроў аховы.

Рыгор Аронавіч раздумваў нядоўга. Нешматслоўны загад – і тарпеды панесліся ў бок варожага транспарта. Удачнай аказалася атака. «Арузеаль» пайшоў на дно. Нямецкія кацеры кінуліся на пошукі падводнай лодкі, загучалі выбухі глыбінных бомбаў. Лодку пашкодзіла, але маракі змаглі дабрацца да сваёй базы, якая ў той час знаходзілася ў абхазскім порце Ачамчыры.

Неяк лодка ішла баявым курсам. Недалёка ад Адэсы натрапілі на варожую якарную кантактную лінію. Ад моцнага выбуху заклініла вал, патухла святло, пашкодзіла рулі. У прабоіну хлынула вада. Здавалася, паратунку не было ніякага. Пяць сутак лодка ляжала на дне. Скончыліся прадукты, прэсная вада. Клікаць сваіх на дапамогу не было магчымасці: пашкоджана радыёстанцыя. Хоць лодка і ляжала нерухома на дне, але маракі не чакалі канца ў нямым здранцвенні. Пад камандаваннем Рыгора Аронавіча актыўна вялі рамонт. Пашкоджанні былі часткова ліквідаваны ў неверагодна цяжкіх умовах і лодка дайшла да базы.

За мужнасць, кемлівасць і гераізм Р.А. Кукуй быў узнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга. Няма сумнення ў тым, што грудзі Рыгора Аронавіча Кукуя ўпрыгожыла б яшчэ не адна баявая ўзнагарода, але 20 снежня 1942 года адважнага падводніка не стала, загінуў у баі.

М.Ф. Мельнікаў.

«Лячыў» самалёты

Калі Сяргей Іванавіч Кірпічоў прыйшоў працаваць у Крычаўскае лясніцтва егерам, спачатку нічым не вызначаўся. Хіба што толькі ўсім кідалася ў вочы тое, як дбайна і сумленна ён выконваў свае абавязкі. Любіў лес, беражліва адносіўся да звяроў і птушак.

Неяк на свята Перамогі ён зайшоў у лясніцтва, і ўсе ўбачылі на грудзях Сяргея Іванавіча медалі і ордэны. Здзіўлены былі сціпласцю егера: дагэтуль Кірпічоў нікому не гаварыў, што ён былы франтавік, ніколі не апавядаў пра ваенныя прыгоды.

...Пасля заканчэння школы ФЗН у Магілёве Сяргей нейкі час працаваў на заводзе «Чырвоны металіст», а ў 1931 г. па рэкамендацыі Магілёўскага абкома камсамола паступіў у Тамбоўскую лётна-тэхнічную школу грамадзянскага паветранага флота. Пасля заканчэння яго пакінулі працаваць пры школе авіятэхнікам.

У 1938 годзе за добрую работу Кірпічова ўзнагародзілі знакам «Выдатнік Аэрафлоту» і каштоўным падарункам. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Сяргея Іванавіча паслалі ў Казань, дзе фарміраваліся авіяцыйныя палкі. Ён трапіў у 5-ы авіякорпус генерала Ушакова на пасаду тэхніка звяна.

...Вораг імкнуўся захапіць Сталінград. І днём і ноччу грымела кананада, неба было густа задымлена. Воіны не ведалі адпачынку. Хапала работы ў лётчыкаў. Рабілі па некалькі баявых вылетаў за дзень і ўначы.

Вядома ж, хапала клопатаў і ў авіятэхнікаў. Самалёт павінен быць заўжды ў баявой гатоўнасці, у спраўным стане. Рамантаваць даводзілася пад дажджом і ветрам, пры лютых марозах, якія тады трашчалі пад Сталінградам. Добра выконвалі свой воінскі абавязак лётчыкі, гэтак жа працавалі і авіятэхнікі. І таму за ліквідацыю і ўзяцце ў палон 330-тысячнай арміі генерала Паулюса авіякорпусу было прысвоена званне гвардзейскага. Кірпічоў быў узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», « За абарону Сталінграда» і ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 1943 годзе корпус перакінулі на Паўночна-Каўказскі фронт. Ішлі за-

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ГОД ЗА ГОДАМ, ПАДЗЕЯ ЗА ПАДЗЕЯЙ

Скончылася злавесная ноч фашысцкай акупацыі, якая прынесла безліч пакут і няшчасцяў. Горад ляжаў у руінах, пад нагамі трашчала бітае шкло, вывернутыя з карэннем выбухамі мін і снарадаў усохлыя дрэвы перагароджвалі вуліцы, зейралі задымленымі прабоінамі ацалелыя дамы, і гарклява, задушліва пахла попелам.

Гітлераўцы разбурылі цэментны і фасфарытны заводы, увесь чыгуначны вузел, разрабавалі маёмасць 72 калгасаў, 2 МТС: спалілі ўсе жывёлагадоўчыя пабудовы, вывезлі калгасных кароў, коней, авечак і свіней. Яны спалілі 3695 жылых дамоў, што склала больш за 50 працэнтаў усёй жылой плошчы раёна. Акрамя таго, былі спалены або разбураны 52 школы, усе будынкі ўстаноў культуры, 9 урачэбна- амбулаторных пунктаў.

Увесь цяжар па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі ў першыя гады лёг на плечы жанчын, старых і падлеткаў. Акрыленыя вызваленнем ад фашысцкіх захопнікаў, пераможным наступленнем Чырвонай арміі, людзі працавалі з падвоенай энергіяй, рабілі ўсё магчымае для набліжэння доўгачаканай Перамогі.

У раёне адразу пасля выгнання акупантаў была адноўлена дзейнасць органаў савецкай улады, партыйных арганізацый, камсамола. Першым сакратаром райкома партыі быў выбраны К.А. Рэуцкі. Як успамінае Кузьма Андрэевіч, раённая партыйная арганізацыя на дзень вызвалення налічвала толькі 7 камуністаў, у канцы 1943 г. было 54 члены партыі і 20 кандыдатаў.

Для патрэб аднаўлення і развіцця гаспадаркі выдаткоўваліся значныя грашовыя сродкі. У раён завозілася прамысловае абсталяванне, трактары, аўтамабілі, будаўнічы матэрыял, буйная рагатая жывёла, коні.

Ужо ў пачатку кастрычніка 1943 г. на стале ў крычаўлян з'явіўся духмяны бохан хлеба, выпечаны адноўленай пякарняй. Хворых прыняла бальніца на 50 ложкаў з хірургічным, тэрапеўтычным, радзільным і інфекцыйным аддзяленнямі, пачала працаваць паліклініка. У вёсках Маляцічы, Бацьвінаўка, Паланіца і Зарубец неўзабаве адкрыліся амбулаторыі. У райцэнтры і вёсках паступова пачалі адчыняць дзверы магазіны.

Крычаўляне за год з нечым змаглі

ўзвесці каля 50 школ, пабудаваць нямала адміністрацыйных і жылых памяшканняў, поўнасцю ачысціць ад друзу горад, пачаць выпуск клінкеру на разбураным фашыстамі цэментным заводзе, пусціць у эксплуатацыю льнозавод, прывесці да ладу чыгуначныя пуці, засеяць і ўбраць ураджай збожжа і бульбы на палетках, навесці парадак на пашкоджаных вайной шасэйных дарогах і г.д. І тэта пры адсутнасці тэхнікі, недахопе рабочых рук і кваліфікаваных кадраў.

Развівалася і культурнае жыццё раёна. Аматараў мастацкай, дакументальнай і навукова-тэхнічнай літаратуры абслугоўвала гарадская бібліятэка, адкрыліся бібліятэкі і ў вёсках, пачалі дзейнічаць кінаперасоўкі, ствараліся калектывы мастацкай самадзейнасці. Пачала выдавацца раённая газета «Шлях сацыялізму», тыраж якой у 1944 г. складаў 900 экземпляраў.

Хоць ужо далёка ад Крычаўшчыны, але грымелі баі, працягвалася вайна. І аб гэтым памяталі жыхары раёна. Насельніцтвам у 1944 г. было нарыхтавана і перададзена для Чырвонай арміі 25950 пудоў зерня, 2964 - мяса і 132347 - бульбы, таксама атрымалі воіны гародніну і сена з Крычаўшчыны. Збіралі грошы для фронту. На другую Дзяржаўную пазыку было падпісана аблігацый на 11 мільёнаў рублёў. Жыхары раёна сабралі для будаўніцтва танкаў і самалётаў 2 мільёны рублёў. Неўзабаве ў неба ўзляцелі пабудава- ныя на гэтыя сродкі ІТО-2, якія назвалі «Чыгуначнік Крычава» і «Вызваленая Беларусь», паблісквaючы свежай афарбоўкай, рушылі ў бой новыя танкі.

Праяўляўся ў раёне клопат аб сем'ях франтавікоў, асірацелых дзецях. Добры плён даў праведзены ў раёне месячнік дапамогі пацярпелым ад вайны, у выніку якога каля трохсот чалавек атрымалі пэўныя грашовыя сумы, хлеб і бульбу. (Сабрана было 73680 рублёў, 295 пудоў хлеба і 1000 пудоў бульбы).

Зладжаны стук сякер і залівісты перазвон пілаў будзілі цішыню над вёскамі. Будавалі кароўнікі, канюшні, свірны і жыллё для сем'яў калгаснікаў. Створаныя будаўнічыя брыгады гірацавалі ад цямна да цямна. Толькі за 1944—1945 гг. будаўнікі ўзвялі 2192 дамы, падрыхтавалі 1238 зрубаў.

У 1944 г. пачалі працу 2 машынна-трактарныя станцыі, у якіх тэхнікі мелася небагата, але калгасы і саўгасы ўсё ж атрымлівалі неабходную і своечасовую дапамогу.

Урэшце надыйшоў незабыўна радасны дзень Перамогі. У горад і вёску пачалі вяртацца ўзмужнелыя воіны з ордэнамі і медалямі на гімнасцёрках, колішнія кавалі, слесары, шафёры, механікі, інжынеры. Прыток гэтых сіл аказаўся тым свежым і жыватворным струменем, што колькасна і якасна павялічыў працоўныя здабыткі як на прадпрыемствах, так і ў калгасах і саўгасах раёна.

І ўсё ж становішча заставалася цяжкім, асабліва ў сельскай гаспадарцы. Руплівай увагі патрабавала да сябе абязгноеная і запушчаная за гады вайны зямля. Спустошаныя і незасяваныя плошчы яе ўжо сталі пакрывацца маладымі асінкамі, бярозкамі і хвойкам!. Аратыя былі, але не хапала коней, не мелася і іншых, нават самых прымітыўных сельскагаспадарчых прылад. Свае соткі калгаснікі вымушаны былі араць на сабе. У плуг запрагаліся жанчыны, падлеткі, мужчыны. Гэтая пакутлівая праца знясільвала людзей, харчаванне якіх у той час складалі не заўсёды забелены малаком шчавель, по-

сны рэдзенькі бульбяны суп. Кавалак хлеба не заўсёды быў на сялянскім стале.

Тыя вяскоўцы, у каго мелася карова, спрабавалі выкарыстоўваць яе ў якасці цяглавай сілы. Буронка ўпарцілася, не хапала ў яе сілы цягнуць плуг, часта спынялася, зморана аддыхвала- ся, а скура цямнела ад поту. У калгасах і саўгасах аралі на конях, уручную высявалі пшаніцу, грэчку, ячмень, саджалі бульбу, жалі сярпамі, касілі, стагавалі. Тэхнікі, безумоўна, было мала.

Успамінае былая калгасніца калгаса «Іскра» (цяпер імя Карла Маркса) Матрона Аўрамаўна Старавойтава:

— Мой муж не вярнуўся з вайны. Пяцёра дзяцей засталося без бацькі. Хату немцы пры адступленні спалілі. Пагарэла і вопратка, і прадукты. Хоць ты ў вір галавой кідайся разам з дзяцьмі. Бедавала я, бедавала, усе слёзы выплакала. Галашу, а вочы сухія, расчырванелыя. Начамі думкі розныя не даюць заснуць. Асабліва даймала адна: узяць і пазбавіць жыцця сябе і дзяцей, навошта ім пакутаваць ад голаду і холаду? Без слёз нельга было глядзець на дзетак, схуднелыя яны, бедныя, тварыкі завастрыліся, сталі жоўта-белымі, а ручкі тонкія, бы тыя нітачкі. Кожную хвіліну просяць: «Мама, есці дай», а дзе ж я вазьму харчу? Наўрад ці выжыла б я з дзяцьмі, каб не аднавяскоўцы. Добрыя ў нас людзі, спагадлівыя, да чужой бяды чу- лыя. Хто прынясе збанок малака ці сы- раквашы, хто - акрайчык хлеба, а то і кавалачак сала. Хоць і хлеб той нярэдка быў ацеслівы, з мукі буйнога памолу на самаробных жорнах, але для дзяцей ён з'яўляўся найсаладзейшым ласункам.

Вясной ранняй, калі ў лагчынах ляжаў снег, хадзілі на поле збіраць памерзлую мінулагоднюю бульбу. Прынясеш дамоў цэлы кошык, аблупіш, абмыеш, патаўчэш і на патэльню. Са смакам і сама і дзеці ўпляталі «ташноцікі», трохі падманвалі голад. Цяжка прыходзілася зімой. Дроў не было, упражэшся ў саначкі і па снежнаму цаліку ў лес, насячэш арэхавага ці лазовага кустоўя і цягнеш кіламетры са тры. Папаліш, праз два дні зноў кіруй. Маразы з вятрамі так выстудзяць хату, што хоць ваўкоў ганяй у ёй, акрыцца не было чым, ціснуліся на астылай печы адзін да аднаго, гэтым і саграваліся.

На працу ў калгас хадзіла. Бывала, возьмеш з сабой збаночак калодзежнай вады на жніво, схаваеш яго ў снапы, а ён так нагрэецца, што губы, бы іскрынай, апякае. Намахаешся на спякоце за дзень сярпом, аж спіна дранцвее і ногі дрыжаць ад стомы, дамоў ледзь клыпаеш. І раптам хто-небудзь з жанок зацягне песню. На дапамогу ёй прыходзіць адзін голас, потым другі, трэці. Гладзіш, і ўсе пяюць, ды так зладжана, роўна, прыгожа. Быццам артысты... А песні то журботныя, то вясёлыя. І спяваючы, забываліся мы пра сваё гора, пра нястачу ў хаце, у вёску ўваходзілі пасвяжэлыя і быццам памаладзелыя. Лячыла нас песня ад скрухі, ой, як добра лячыла!

Расказвае пенсіянер, жыхар вёскі Кашаны Канстанцін Гаўрыленка:

—Некалі ў нас былі лугі заліўныя. Гэта цяпер іх сапсавала няўдалая меліярацыя, расце дзядоўнік ды крапіва. А тады вымахвалі травы да пояса чалавеку. Каштоўнае было сена. Духмянае, з мноствам рознакаляровых красак. Касілі, грэблі, скідалі ў стагі яго людзі ўручную. Бывала, толькі дзень пачне, яшчэ неба цёмнае, а на лузе ў тумане свішчуць косы. Спорна касіла-

ся з расічкай, лёгка. Покуль сонца ўзыйдзе, мужчыны спляжвалі ладныя кавалкі лугу. Цікава тое, што на сенакосе не назіралася гультайства, абыякавасці. У кожнага касца ад поту аж сарочкі прыліпалі да цела. Такая стараннасць мужчын і жанок, што сушылі і грэблі сена, дапамагала своечасова ўбраць травы, задоўга да надыходу жніва. Не ўпускалася, рупна выкарыстоўвалася кожная пагодлівая часіна: на лузе за якіх-небудзь два—тры тыдні выстрайвалася процьма стагоў, на якіх аж да самага адлёту ў вырай бавілі час буслы. Здзіўляе цяперашні час: у калгасах трактары і касілкі, хапае і іншай сенаўборачнай тэхнікі, а травы то няякасна ўбіраюцца, а то і на значных плошчах застаюцца няскошанымі. Каровам зімой сена выдаецца па жмені. І невядома каго ў гэтым вінаваціць: кіраўнікоў гаспадарак за ганебную бесклапотнасць ці механізатараў за нядбайныя адносіны да сваёй справы. Думаецца, што вінаваты і тыя, і другія. Няўжо прыгасла ў душах тая іскрын- ка, што прымушала і бадзёрыла людзей у нялёгкі пасляваенны час? Менавіта дзякуючы ёй мы дасягалі выдатных поспехаў.

За невыносна цяжкую пасляваенную працу хлебаробам налічваліся працадні. Паколькі ўраджай усіх сельскагаспадарчых культур быў даволі нізкі, а трэба было штогод разлічвацца з дзяржавай, засыпаць насенны фонд, то на аплату калгаснікам заставалася мізэрная колькасць прадукцыі. Так, у 1950-я гады ў калгасе «Іскра» глыбокай восенню на працадзень вяскоўцы атрымалі па 200 грамаў няякаснага збожжа і па 20 капеек грашыма.

Між тым час ішоў, пакрысе залечваліся нанесеныя вайной раны. Папаўняўся трактарны парк МТС, у гаспадарках павялічвалася колькасць цяглавай сілы, і тэта давала магчымасць расшыраць пасяўныя плошчы, больш дбайна апрацоўваць зямлю, скарачаць тэрміны пасяўных работ. У 1946 г. на ўзбраенні дзвюх МТС мелася ўжо 29 трактароў і два збожжаўборачныя камбайны, пабольшала і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Пасяўная плошча ў тэты час у раёне складала 16596 га, што на 20% было менш за даваенную. Паспяхова выконвалася і пастаўленая раённым кіраўніцтвам задача - найхутчэй перасяліць пацярпелых ад фашыстаў людзей з зямлянак у новыя хаты.

На старонках раённай газеты, з трыбун на розных сходах і мітынгах загучала прозвішча П.К. Малахава, трактарыста другой Крычаўскай МТС. Сапраўды, яго праца здзіўляла высокімі здабыткамі. Пры норме 300 га П.К. Малахаў на трактары ХТЗ выпрацоўваў за год па 600 га і больш мяккага ворыва. Адным з першых сярод сельскіх працаўнікоў раёна ён быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

У 1947 г. у Крычаве пачалі будаваць завод гумавых вырабаў, які ўжо ў 1949 г. выпусціў першую прадукцыю: жаночыя боцікі, галёшы, дзіцячыя цацкі. Будаўнікі заканчвалі аднаўленне цэментнага завода, у 1949 г. гэтае прадпрыемства было запушчана - выдала першыя 65 тон доўгачаканага ў краіне матэрыялу. Завод перасягнуў даваенныя магутнасці на 40%, што дало магчымасць калектыву ў кароткі тэрмін перавысіць паказчыкі выпускаемай прадукцыі за 1938-1940 гг.

У маі 1950 г. прынята пастанова ЦК ВКП(б) «Аб узбуйненні дробных калгасаў і задачах партыйных арганізацый у гэтай справе». Гэты працэс пачаўся і на Крычаўшчыне. Так, у 1950 г.

у адзін калгас «Камунар» аб'ядналіся сельгасарцелі «Камунар» (в. Дарагая), імя Карла Маркса (в. Лушчэвінка), «Свабода» (в. Дарлівая). Сельгасарцелі «Чырвонае Сормава» (в. Зару- бец), «Бор» (в. Ягораўка), «Чырвоны колас» (в. Першамайская) увайшлі ў калгас «Чырвоны колас».

Адбылося ўзбуйненне калгасаў, якія знаходзіліся ў вёсках Бель-1, Паўлавічы, Залессе, Паклады, Першы Крычаўскі пасёлак, Сарочына, Слабуты, Маляцічы, Стаборшчына, Баяры, Стараселле і іншых. У пасляваенны час налічвалася 71 гаспадарка, пасля ўзбуйнення іх стала 27.

Павышалася ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, узрастала пагалоўе жывёлы, расла эканамічная база калгасаў і саўгасаў. Калі ў 1953 г. у гаспадарках раёна налічвалася 1459 кароў, 2525 свіней, а валавая вытворчасць малака складала 14365 ц, то ўжо ў 1956 г. пагалоўе кароў узрасло да 2902, свіней - да 6959, а вытворчасць малака - да 26007 ц. Тады на 100 га сельскагаспадарчых угодзяў было атрымана 74,5 ц малака і 13,9 ц мяса. На грамадскіх палетках раёна ў тэты час працавала ўжо каля 60 трактароў. Да канца 1950-х Крычаўшчына перавысіла даваенны выпуск прадукцыі па ўсіх паказчыках.

Калі была ліквідавана разруха, запрацавалі адноўленыя прадпрыемствы, сталі тэхнічна ўзбройвацца калгасы і саўгасы, прыкметна пачаў узрастаць дабрабыт насельніцтва, непазнавальна стаў мяняць сваё аблічча горад, прыгажэлі вёскі. Некалі паміж цэнтральнай часткай Крычава і пасёлкамі цэментнікаў і чыгуначнікаўў ляжала неўрадлівае балоцістае поле, парослае чэзлымі бярозкамі ды ніцым лазняком. Цяпер па абодва бакі шашы красуюцца мікрараёны «Сож» і Камсамольскі, забудаваныя ў асноўным пяціпавярховымі дамамі. Тут працуюць магазіны, дашкольныя ўстановы, школы, стаматалагічная паліклініка, рэстаран на 120 месцаў, бібліятэка. Толькі за гады адзінаццатай пяцігодкі 1000 сем'яў атрымалі кватэры з усімі зручнасцямі. Пабудаваны мясакамбінат,

Мікрараён Камсамольскі ў г. Крычаў.



Забудова мікрараёна «Сож» у Крычаве.

разлічаны выпрацоўваць за змену 60 т мяса і субпрадуктаў першай катэгорыі і 6 т каўбасных вырабаў.

Увод у эксплуатацыю мясакамбіната прынёс палёгку не толькі гаспадаркам Крычаўшчыны, але і многіх суседніх раёнаў, бо значна зменшыліся расходы на транспарціроўку жывёлы, скараціліся чэргі пры здачы.

Першую прадукцыю выпусціла мэблевая фабрыка. Кухонныя гарнітуры спадабаліся не толькі крычаўлянам і жыхарам рэспублікі, іх з задавальненнем набывалі на Украіне, у Прыбалтыцы, Сярэдняй Азіі, у Маскве. У адзінаццатай пяцігодцы ў вёсках было пабудавана больш за 16 тыс. квадратных метраў жылля. На цэнтральных сядзібах гаспадарак з'явіліся новыя вуліцы, упрыгожаннем якіх сталі дабротныя і светлыя дамы з гаспадарчымі прыбудовамі. У дамы засяляліся механізатары, жывёлаводы, паляводы. Цэлыя вуліцы ўзнікалі ў вёсках калгасаў імя Суворава, «Запаветы Леніна», імя Карла Маркса, «Звязда», «Перамога» і іншых. Будаўнічыя арганізацыі горада таксама працавалі з творчым запалам, імі было выканана будаўніча-мантажных работ на 96,3 млн рублёў што на 4,3 млн больш планавага паказчыка. Аўтарытэт і павагу заслужылі тады брыгады цесляроў В.В. Раманятава, В.Н. Стражнікава, маляроў Т.М. Трацяковай (ПМК-118), комплексныя брыгады МЛ. Кавалёва і А.К. Івашкевіча (МПМК-115). Члены гэтых будаўнічых брыгад раней тэрміну і якасна выконвалі даручанаю работу, эканомілі матэрыялы.

Дзякуючы праведзенай рэканструкцыі на цэментна-шыферным камбінаце ўзрос выпуск прадукцыі. Калі ў даваенны час завод выпускаў за год

100 тыс. т цэменту, то цяпер - 1,2 млн т. Павялічваў свае вытворчыя ма- гутнасці і завод гумавых вырабаў, расшыраў асартымент, якасна абнаўляў прадукцыю.

З аддачай сіл, самаахвярна і зладжана працавалі крычаўскія чыгуначнікі. У многія куткі былога СССР адпраўляліся цягнікі з самымі разнастайнымі грузамі, у ліку якіх быў і крычаўскі цэмент, шыфер, гумавы абутак, мэбля і г.д. Вялі іх вопытныя машыністы Л.С. Баброў, А.Ф. Матылькоў, Н.Ф. Туркоў, В.І. Кірыенка. Калектыў чыгуначнага вузла паспяхова справіў- ся з выкананнем узятых абавязацельстваў на адзінаццатую пяцігодку, звыш плана перавёз мільёны тон неабходных гаспадарцы грузаў.

Насельніцтву горада і вёскі аказвалася каля 40 відаў паслуг рамонтна-будаўнічым упраўленнем, вытворчым аб'яднаннем жыллёва-камунальнай гаспадаркі, міжраённым упраўленнем газавай гаспадаркі, радыёатэлье, камбінатам бытавога абслугоўвання. Быў здадзены ў эксплуатацию Дом быту на 70 рабочих месц, двухпавярховы, з светлымі прасторнымі цэхамі, аснашчаны сучасным абсталяваннем. Бытавікі таксама ўносілі важкі ўклад у эканамічнае развіццё раёна. Нарыхтоўшчык верха абутку С.В. Васкабойнікаў, закройшчыца А.В. Курцянкова, эканаміст па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні В.А. Жарыкаў, прыёмшчык заказаў комплекснага прыёмнага пункта в. Дзягавічы Я.Ф. Сергіенка ўдастоены звання «Заслужаны работнік бытавога абслугоўвання насельніцтва». У адзінаццатай пяцігодцы аб'ём паслуг узрос у 1,4 раза ў параўнанні з папярэдняй.

Паспяхова развіваўся аўтобусны рух. Райцэнтр быў ім звязаны з усімі цэнтральнымі сядзібамі калгасаў і саўгасаў, абласным цэнтрам, суседнімі раёнамі, Масквой, Гомелем, Мінскам, Ро-



Новая вуліца ў Сакольнічах.

славам. Дзейнічала 11 гарадскіх, 9 прыгарадных і 6 міжгародніх маршрута.

У калгасе «Звязда» быў пабудаваны міжгаспадарчы комплекс па адкорму буйной рагатай жывёлы на 4800 галоў, а ў гаспадарцы «Запаветы Ільіча» дзейнічаў комплекс па вырошчванню нецеляў на 3000 галоў. Грамадскае пагалоўе жывёлы ўзрастала, статак рабіўся болып прадуктыўным.

У 1984 г. у гаспадарках раёна налічвалася 31906 галоў буйной рагатай жывёлы, 19973 галавы свіней.

Ураджайнасць збожжавых па раёну перавысіла дваццаціцэнтнеравы рубеж, у 1986 г. хлебаробы змагаліся за тое, каб атрымаць з кожнага гектара па 27 ц збожжавых і зернебабовых, 205 - бульбы, 10 - ільнавалакна, а на кожныя 100 га сельгасугоддзяў - па 450 ц малака і па 100 ц мяса. Канешне, у гаспадарках ураджайнасць сельгаскультур не была аднолькавай. Саўгасы «Дзягавічы», «Крычаўскі» не маглі штогод пахваліцца добрым зборам зерня, а такія калгасы, як «Сацыялістычны шлях», імя XXII з'езда КПСС, імя Суворава дасягалі 40 ц з гектара. Тут добра ўгнойвалі глебу, у сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні праводзілі пасяўныя работы, без страт убіралі вырашчаны ўраджай.

Плённая праца хлебаробаў не заставалася незаўважанай дзяржавай. Механізатару калгаса «Памяць Леніна» М.М. Аляксеенку была ўручана за высокія здзяйсненні Дзяржаўная прэмія СССР, атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР трактарыст калгаса імя XXII з'езда КПСС С.Ф. Лабушкін. Многіх працаўнікоў узнагародзілі ордэнамі і медалямі. Свінарка калгаса «Памяць Леніна» Г.В. Малатабойцава выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Разам з інтэнсіўным ростам пагалоўя жывёлы ў калгасах і саўгасах ра-

Уборка льну на Крычаўшчыне.

ёна прыкметна павялічвалася яе прадуктыўнасць. З кожным годам узрастала колькасць даярак, якія на кожную карову надойвалі па 3000 кг малака. Валянціна Налькоўская з калгаса імя Карла Маркса і Ніна Панцялеева з калгаса «Запаветы Ільіча» падыйшлі да чатырохтысячнага рубяжа. Некалькі год запар лідэрства ў раёне па адкорму буйной рагатай жывёлы цвёрда трымалі Леанід Кісялёў з жонкай Верай з калгаса імя Карла Маркса. Сярэднесутачныя прывагі жывёлы ў іх складалі каля кілаграма.

У 1986 г. у калгасах і саўгасах раёна налічвалася 5280 працаздольных. У 1986-1987 гг. на палетках раёна працавала дастаткова тэхнікі: 551 трактар, 276 аўтамашын, 240 збожжаўборачных камбайнаў, 44 бульбаўборачныя і 52 ільнаўборачныя камбайны.

Павялічвалася колькасць вывозімых на палеткі арганічных і мінеральных угнаенняў, і за такі безупынны клопат зямля шчодра адплочвала хлебаробам. У 1989 г. калгас «Сацыялістычны шлях» выйшаў пераможцам ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае выкананне плана эканамічнага развіцця гаспадаркі. Узначальваў калгас тады Барыс Якаўлевіч Белянкоў, вопытны, працалюбівы і патрабавальны кіраўнік, які строга адносіўся да выканання абавязкаў кожным працаўніком і ў той жа час не пакідаў без увагі калгаснікаў, аказаў ім неабходную падтрымку і дапамогу. Тады гаспадарка з кожнага гектара атрымала па 40 ц збожжа, 791 ц малака і 189 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў. Калгас «Сацыялістычны шлях» пад кіраўніцтвам Б.Я. Белянкова ў 1993 г. з кожнага гектара атрымаў па 45,6 ц збожжавых. Гэта яскравае

Пасля працоўнага дня ў калгасе «Памяць Леніна».

сведчанне таго, што крычаўская зямля можа даваць багатыя ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур, калі на ёй клапатліва і ўмела гаспадарыць.

Вядома, тармазіла справу існуючая ў тыя часы аднапартыйная камандна-адміністрацыйная сістэма, пры якой кіраўнікі гаспадарак амаль пазбаўлены былі самастойнага пошуку шляхоў развіцця калгасаў і саўгасаў, а выконвалі ўказанні «зверху».

Пасля распаду СССР і прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў раёне пачалася перабудова эканомікі і духоўнага жыцця. Была ажыццёўлена зямельная рэформа, праведзена інвентарызацыя зямель калгасаў і саўгасаў, створаны спецыяльны фонд мясцовых Саветаў. Хлебаробам былі павялічаны зямельныя ўчасткі да 1 гектара.

У пачатку рэформы зарадзіўся фермерскі рух. Цяпер у раёне налічваецца 10 фермерскіх гаспадарак, у іх карыстанні знаходзіцца 113 гектараў зямлі. Вырошчваюць яны капусту, бульбу, збожжа. Высокай ураджайнасцю сельскагаспадарчых культур пакуль што не могуць пахваліцца, і прычына гэтага - адсутнасць неабходнай тэхнікі, грашовых сродкаў на набыццё мінеральных тукаў.

Інтэнсіўны рост цэн на сельскагаспадарчую тэхніку, угнаенні, гаручазмазачныя матэрыялы адмоўна адбіўся на сацыяльна-эканамічным становішчы раёна ў перыяд пераходу да рыначных адносін. Ва ўмовах фінансавага банкруцтва гаспадаркі не могуць весці сельскагаспадарчыя работы адпаведна патрабаванням сучаснай агратэхнікі. І, як вынік, назіраецца ад-

Ветэраны вайны і працы.

Авіятары СВК «Бель»

чувальны недабор усіх культур у калгасах і саўгасах, пагаршаецца матэрыяльнае становішча гаспадарак. У раёне значна скарацілася пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней, знізілася прадуктыўнасць грамадскага статка. У 1997 г. гаспадаркі мелі на ўзбраенні 390 трактароў, 269 грузавых аўтамашын, 84 збожжаўборачныя камбайны, 33 бульбаўборачныя камбайны і шэсць ільнаўборачных агрэгатаў. Гэта менш, чым мелі калгасы і саўгасы ў папярэднія гады. Неабходна заўважыць, што трактары, камбайны і аўтамашыны, а таксама прычапны інвентар маюць значную зношанасць вузлоў і агрэгатаў і, з-за адсутнасці сродкаў на запчасткі, рамонт іх вядзецца нерэгулярна. Адсюль і прадукцыйнасць нізкая, спад сельскагаспадарчай вытворчасці, нізкая і культура земляробства. Невысокія эканамічныя паказчыкі гаспадарак раёна адмоўна ўплываюць і на заробкі механізатараў і жывёлаводаў. У выніку моладзь не жадае затрымлівацца ў вёсках, шукае сабе занятак у гарадах.

Цяжкасці пераходнага перыяду адбіліся і на прамысловых прадпрыемствах раёна. Складанасці ўзніклі ў працоўнага калектыва завода гумава-тэхнічных вырабаў. Дарагавізна сыравіны, якую даводзіцца набываць за межам! рэспублікі, зменшаны попыт на прадукцыю, адсутнасць матэрыяльных рэсурсаў парушылі звыклы рытм прадпрыемства. Пачаліся перабоі ў рабоце завода, затрымкі выплаты зарплаты, вымушаныя прастоі механіз- маў. З-за недахопу сыравіны такія праблемы і ў мясакамбіната, цяжкасці эканамічнага выжывання ў рыначных умовах адчулі на сабе працаўнікі цэментна-шыфернага камбіната.

Аднак у апошнія гады справа значна палепшылася як на прамысловых прадпрыемствах, так і ў аграпрамысловым комплексе раёна.

За 2002 г. прамысловымі прадпрыемствамі раёна атрымана прадукцыі на 52,2 мільярда рублёў. Тэмп росту склаў 9,5 працэнта да ўзроўню 2001 г. пры прагнозе 3 працэнты. Найбольшы прырост прадукцыі атрымалі ВРУП

«Крычаўцэментнашыфер», завод гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР, хлебазавод, спіртзавод «Чырванабудскі». Выпуск цэменту павялічыў- ся на 37 працэнтаў, гумавага абутку на 26,6, пладова-ягаднага віна на 29,6, а хлеба і хлебабулачных вырабаў на 12,3 працэнта.

На нарошчванне прадпрыемствамі аб'ёмаў вытворчасці аказала ўплыў павелічэнне інвестыцый у мадэрнізацыю і тэхнераўзбраенне вытворчасці, работа па павышэнню якасці прадукцыі. За 2002 г. уклад у мадэрнізацыю і тэхнераўзбраенне вытворчасці павялічыўся ў 3,5 раза ў параўнанні з 2001 годам. Многім прадпрыемствам удалося значна скараціць запасы гатовай прадукцыі шляхам яе рэалізацыі на рынках блізкага і далёкага замежжа.

А вось такія прадпрыемствы як ААТ «Крычаўскі мясакамбінат», ААТ «Крычаўскі маслазавод», Крычаўскі завод жалезабетонных вырабаў не могуць пакуль што пахваліцца высокімі працоўнымі здабыткамі. Яны не выканалі прагнозных паказчыкаў да ўзроўню 2001 г., знізілі аб'ём вытворчасці прадукцыі. Нявыкананы і паказчык па выпуску тавараў народнага спажывання.

Для працаўнікоў сельскай гаспадаркі 2002 г. аказаўся надзвычай цяжкім. Недахоп вільгаці адмоўна паўплываў на рост культур. Але, нягледзячы на тэта, у раёне павялічыўся валавы збор збожжа на 17 працэнтаў і склаў 30,8 тыс. тон. Хлебаробы атрымалі па 27,4 цэнтнера зерня з гектара. Паспяхова выкананы план продажу збожжа дзяржаве. А ў такіх гаспадарках, як «Бель», кожны гектар даў па 40 цэнтнераў збожжавых, імя Суворава - 33,4, «Звязда» - 31,2 цэнтнера.

Лепш, чым у 2001 г., папрацавалі і жывёлаводы раёна. Вытворчасць мяса павялічылася на 7 працэнтаў, а продаж яго дзяржаве - на 14 працэнтаў.

На развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы раёна за кошт усіх крыніц фінансавання выкарыстана 3952 мільёны рублёў інвеетыцый, што ў супастаўных цэнах на 3 працэнты болын, чым у 2001 г. Пабудавана 40 кватэр агульнай плошчай 4696 кв. м, у тым ліку на вёсцы 24 кватэры агульнай плошчай 2348 кв. м. Інтэнсіўныя работы вядуцца па добраўпарадкаванню горада, асфальтуюцца вуліцы, прыводзяцца да ладу скверы, выкладваюцца тратуары.

Павелічэнне аб'ёмаў укладання ў пераўзбраенне вытворчасці, работа па павышэнню якасці прадукцыі далі магчымасць прадпрыемствам забяспечыць рост экспарту на 29,2 працэнта да ўзроўню 2001 г. пры прагнозным паказчыку 5 працэнтаў. Экспарт вырас у 2 разы, гумавага абутку - на 26,4 працэнта. Агульная выручка ад экспарту склала 10,9 мільёна долараў ЗША.

Рэфармаванне раённай камунальнай уласнасці праводзіцца шляхам раздзяржаўлення і прыватызацыі асобных аб'ектаў. Было праведзена 10 аукцыёнаў па продажу аб'ектаў нерухомасці раённай камунальнай уласнасці. У выніку прададзены памяшканні: «Чэбурэчнай», «Піўбара», «Грыльбара», магазіна № 1 «Будматэрыялы», памяшканне былой школы №4. У мясцовы бюджэт пасгупіла звыш 131 мільёна рублёў.

Па стану на 1.1.2003 г. у раёне зарэгістраваны 722 індывідуальныя прадпрымальнікі, або ў 1,3 раза болып, чым у 2001 г. На працягу 2002 г. прадпрымальнікамі былі адкрыты 3 магазіны, дыска-бар «Піраміда», піўбар, 4 закусачныя, майстэрня па рамонту мэблі,

2 міні-рынка, 8 гандлёвых кіёскаў, 15 гандлёвых кропак, што дазволіла стварыць 307 рабочых месц. За 2002 г. плацяжы ў раённы бюджэт ад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва склалі 722,5 мільёна рублёў, або 5,9 працэнта ад даходнай часткі бюджэту.

Рэалізуецца ў раёне дзяржаўная маладзёжная палітыка. Колькасць моладзі ад 14 да 31 года - 9046 чалавек, што складае каля 23 працэнтаў усяго насельніцтва. У 2002 г. аднаразовую бязвыплатную субсідыю на паляпшэнне ўмоў жыцця атрымалі 10 маладых сем'яў на агульную суму 50270 тысяч рублёў. На льготных умовах выдадзены крэдыты на суму 70 мільёнаў рублёў (іх атрымалі 127 чалавек).

У раёне вялікая ўвага ўдзяляецца выхаванню падрастаючага пакалення. На пачатку 2001/2002 навучальнага года працавалі 10 сярэдніх, 2 базавыя школы, 13 дашкольных устаноў, 3 комплексы «школа-дзіцячы сад». Рашэннем выканкома ў 2002 г. 6 пазашкольных устаноў рэарганізаваны ў цэнтр пазашкольнай работы, што дазваляе болын плённа праводзіць работу гуртковў. Навучаннем і выхаваннем падрастаючага пакалення займаюцца 686 педагагічных работнікаў. Вышэйшую адукацыю маюць 419 выкладчыкаў.

Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік школы БССР» прысвоена болыд чым 20 педагогам, 48 узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі», 71 - ганаровымі граматамі

У дзіцячым садзе №4 г. Крычаў.

Міністэрства адукацыі БССР, а 89 атрымалі ордэны і медалі СССР. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны ЕЛ. Маніна вызначылася і на ніве народ- най адукацыі. Ёй было присвоена звание Героя Сацыялістычнай Працы за самаадданую педагагічную дзейнасць. Заслужанай павагай і аўтарытэтам карыстаюцца педагогі Л.М. Стаўская, В.К. Старавойтава, Н.Ф. Нікалаенка і іншыя.

У мэтах развіцця здольнасцей вучняў выкладчыкі ў сваёй рабоце широка выкарыстоўваюць такія элементы педагагічных тэхналогій, як «Дальтон-тэхналогія» (школа № 3), «Праблемнае навучанне» (СШ № 1), «Узроўневая дыферэнцыяцыя» (СШ №№ 1, 5 і інш.).

Для садзейнічання здольным вучням, падтрымкі ініцыятывы і творчасці таленавітай моладзі зацверджана раённая праграма «Развіццё здольнасцей», якая прадугледжвае правядзенне конкурсаў творчых работ, прадметныя алімпіяды і г.д.

Улетку 2002 г. была арганізавана работа лагераў з дзённым наведваннем на 670 вучняў у тры змены, праходзілі аздараўленне дзеці ў лагеры «Ластаўка» Магілёўскага раёна, на турыстычнай базе «Лосвіда» у Віцебскай вобласці, 110 вучняў адпачылі за мяжой нашай рэспублікі. 360 школь-

Будынак фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў мікрараёне г. Крычаў.

На прыёме ў старшыні Крычаўскага райвыканкома І.І. Пракопава.

нікаў і дашкольнікаў, што пражываюць на забруджанай радыенуклідамі мясцовасці, атрымалі санаторнае лячэнне ў абласных лекавых установах.

У мэтах умацавання вучэбна-матэрыяльнай базы толькі ў 2002 г. было набыта спартыўнага інвентару для школ раёна на суму 2173141 рублёў.

Паспяхова складваюцца выхаваў- чыя сістэмы ў школах. Так, у СШ № 3 асноўным накірункам работы ўзята патрыятычнае выхаванне вучняў, у СШ № 7 - фарміраванне здаровага ладу жыцця, у Сакольніцкім комплексе «школа-дзіцячы сад» - адраджэнне нацыянальных традыцый і культуры.

Сталі традыцыяй арганізацыя летняга адпачынку на базе цэнтра пазашкольнай работы для здольных дзяцей, лагера для сацыяльна неабароненых дзяцей, спаборніцтваў юных інспектараў дарожнага руху, творчых музычных фестываляў і г.д.

Адным з напрамкаў радыкальных пераўтварэнняў з'яўляецца вяртанне жыхароў горада і вёскі да сваіх гістарычных каранёў - духоўнай спадчыны. Прыярытэтным напрамкам у дзейнасці ўстаноў культуры стала работа па зберажэнні і адраджэнні здабыткаў нацыянальнай культуры. Працуюць гарадскі Дом культуры, 19 сельскіх клубаў, 23 бібліятэкі, 2 музычныя, мастацкая і спартыўная школы, раённы краязнаўчы музей.

Клубнымі ўстановамі раёна ў 2002 г. было праведзена 3228 культурна-масавых мерапрыемстваў. Упершыню ў тым жа годзе прайшоў раённы агляд-конкурс беларускага абраду. Паспяхова выступілі з цікавымі праграмамі Бацьвінаўскі, Сычыкаўскі, Іванаўскі і Лабковіцкі сельскія дамы культуры. Праведзены абласны агляд-конкурс прафесійнага майстэрства клубных работнікаў «Праз вучобу да майстэрства». Арганізаваны на гарадскім рынку кірмаш вырабаў народных умельцаў Крычаўшчыны. Пры дамах культуры, клубах працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. 6 самадзейных калектываў удастоены звания народнага. Яны часта выязджаюць з канцэртамі ў суседнія раёны як рэспублікі, так і Расійскай Федэрацыі.

У раённай бібліятэцы.

Навучэнцы дзіцячых музычных і мастацкіх школ прымаюць актыўны ўдзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Так, у рэспубліканскай экалагічнай акцыі 14 работ навучэнцаў дзіцячай мастацкай школы ўзнагароджаны дыпломамі, а навучэнка Чырванабудскага філіяла мастацкай школы Насця Пашкевіч стала лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Дом, у якім мы жывём». Дыпломамі на розных конкурсах адзначаны Юля Кузьміцкая, Ірына Гладкая, Мікалай Барысевіч і многія іншыя. Маша Дудзіна прымала ўдзел у заключным канцэрце нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу юных талентаў «Сузор'е надзей», які праходзіў у Мінску.

Зараз паслугамі бібліятэк раёна ка-

Урачы раённай бальніцы.

рыстаюцца 20172 чытачы. За 2002 г. фонд бібліятэк папоўніўся амаль на 6 тысяч кніг.

Важкі ўклад у развіццё культуры ўнеслі загадчык аддзела культуры райвыканкама Г.І. Міхееў (працуе на гэтай пасадзе каля 20 гадоў), выкладчыца музыкі І.У. Шчарбакова, бібліятэкар Лутаўскай бібліятэкі Г.А. Азарава, загадчыца аддзела мастацкай самадзейнасці раённага цэнтра культуры і кіраўнік народнага ансамбля «Штайне» Я.С. Разікава і іншыя.

Вялікая ўвага надаецца развіццю аховы здароўя, бытавому абслугоўванню насельніцтва.

В.Ф. Куліненка.

Крычаўшчына спартыўная

Як у райцэнтры, так і ў сельскай мясцовасці спорт знаходзіцца ў вялікай пашане, развіццю яго ўдзяляецца сур'ёзная ўвага.

У горадзе маюцца два стадыёны («Цэментнік» - 1500 месц, гарадскі - 3000 месц), 22 спартыўныя залы, 3 стралковыя ціры, 2 хакейныя пляцоўкі, 2 тэнісныя корты, 1 міні-басейн і шэраг іншых спартыўных збудаванняў. Работу па фізічнаму аздараўленню людзей вядуць 67 спецыялістаў з адпаведнай адукацыяй (45 выкладчыкаў фізічнай культуры, 10 трэнераў, 12 інструктараў-метадыстаў па спорту).

У раёне праводзіцца штогод 49 фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў з агульнай колькасцю ўдзельнікаў 6890, у тым ліку 19 - сярод дзяцей і падлеткаў. Праводзяцца спартакіяды сярод працоўных калектываў (11 відаў спорту), сельскіх пасялковых Саветаў (9 відаў спорту), кіруючых работнікаў (5 відаў спорту), школьнікаў (8 відаў спорту). Традыцыйнымі сталі спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў: па хакеі «Залатая шайба», футболу «Скураны мяч», шахматах «Белая ладдзя» і г.д., а таксама спартыўныя спаборніцтвы сярод інвалідаў і людзей сталага ўзросту.

Рэгулярна праводзяцца спартыўныя святы, прысвечаныя знамянальным датам у жыцці рэспублікі, арганізоўваюцца турыстычныя паходы па славутых мясцінах раёна, вобласці, краіны. Шмат збіраюць удзельнікаў спаборніцтвы, прысвечаныя памяці героя-воіна М. Сірацініна (валейбол), генерала арміі, двойчы Героя Савецкага Саюза І. Гусакоўскага (вольная барацьба), Г. Лузеніна і А. Акаёмава (лёгкаатлетычны крос), воіна-інтэрнацыяналіста Л. Краўцова (міні-футбол).

У студзені 2001 г. у горадзе быў створаны фізкультурна-спартыўны клуб «Ювента». Наведвальнікамі яго сталі як дзеці, так і дарослае насельніцтва. Тут працуюць 8 трэнераў па валейболу, футболу, шахматах і іншых відах спорту. У першы год свайго існавання клуб заняў 1-е месца па міні-футболу сярод цэнтраў і спартыўных клубаў па месцы жыхарства, 2-е - па культурызму ў чэмпіянаце Магілёўскай вобласці. Значны ўклад у развіццё фізічнай культуры ўносіць нядаўна створаны клуб «Патрыёт», дзе ў розных спар- тыўных секцыях займаюцца болын як 200 дзяцей і падлеткаў

На працягу апошніх гадоў Крычаўскі раён займае першае месца ў абласной спартакіядзе сярод дзіцячаюнацкіх спартыўных школ, а таксама заваёўвае прызавыя месцы па футбо-

Выступаюць юныя баксёры.

лу і хакею з шайбай. У 2001 г. крычаўскія спартсмены занялі 2-е месца ў рэспубліканскай спартакіядзе «Здароўе чалавека».

У 1982 г. у гарадской ДзЮСШ была адкрыта секцыя па вольнай барацьбе (трэнеры - кандыдат у майстры спорту М.М. Іваноў і майстар спорту СССР А.М. Іваноў). Імі падрыхтаваны 9 майстроў і 31 кандыдат у майстры спорту. Выхаванец гэтай секцыі Яўген Куралёнак у Канадзе стаў чэмпіёнам свету сярод моладзі. Неаднаразова займалі прызавыя месцы ў абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах і іншыя вучні трэнераў Івановых.

Вось ужо 20 гадоў каманда раёна па хакеі з шайбай знаходзіцца ў прызёрах абласной спартакіяды школьнікаў (трэнеры І. Курбака, В. Емяльянаў). Некаторыя яе ігракі ўваходзілі ў зборныя рэспублікі і вобласці.

Лідзіруючае становішча ў абласных спаборніцтвах сярод школьнікаў на працягу апошніх 10 гадоў займае і каманда па лёгкай атлетыцы (трэнер Э. Прыгонікер). Нямала творчых намаганняў унёс у развіццё шахматнай гульні дырэктар ДзЮСШ, кандыдат у майстры спорту Л. Шматкоў. Сярод яго выхаванцаў дзесяткі майстроў, кандыдатаў у майстры, а С. Ліпнік у 1984 г. стала чэмпіёнкай Украіны, яна міжнародны гросмайстар.

Адным словам, шчырая і мэтанакіраваная праца выкладчыкаў фізкультуры, трэнераў прыносіць свой плён. Няхай не ўсе ўдзельнікі розных секцый змогуць пахваліцца калі-небудзь спартыўнымі дасягненнямі сусветнага ці рэспубліканскага маштабу, але відавочная карысць у тым, што ў жыццё яны ўступаюць фізічна і духоўна загартаванымі.

Карыстаецца на Крычаўшчыне вялікай папулярнасцю і футбол. У 1965 г. каманда раёна выйграла кубак ЦК ЛКСМБ «Юнацтва». Неаднаразова станавілася прызёрам у абласных спаборніцтвах. Любяць крычаўляне сваю каманду, ахвотна прыходзяць «пахварэць» за яе на стадыён, узнагароджваюць спартсменаў гарачымі апладысментамі.

Вядома, што дасягнутыя поспехі ў пэўных відах спорту, масавасць у фізкультурным руху не прыйшлі самі па сабе. Шмат сіл і намаганняў уклалі ў свой час у выхаванне моладзі М.І. Зайцаў, М.С Балотнікаў, В.З. Бабкоў,

В.Ф. і Г.У. Краснапрошыны, М.С. Трынчанка і многія іншыя выкладчыкі фізкультуры і трэнеры. Зараз іх традыцыі з той жа любоўю да сваёй справы плённа працягвае маладзейшае пакаленне.

В.А. Емяльянаў.

За газетным радком

Па старонках раённай газеты «Ленінскі кліч»

1965 г., 20 красавіка

ЗАНЕСЕНЫ НА ДОШКУ ПАШАНЫ

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за першы квартал 1965 года пастановай бюро райкома КПБ і выканкомаўраённагаі гарадскога Саветаўдэпутатаў працоўныхна раённую Дошку пашаны занесены:

Цэментна-шыферны камбінат (дырэктар АЛ. Ставер, сакратар партарганізацыі В.А. Ушкевіч), калектыў якога мае найболын высокія паказчыкі ў краіне па выкарыстанні вытворчых магутнасцей новых вярчальных печаў і выканаў план па выпуску валавой прадукцыі на 104,4 працэнта, па таварнай - на 101,5, па прадукцыйнасці працы - на 102,8 працэнта. Зніжаны сабекошт выпускаемай прадукцыі на 0,2 працэнта. Камбінату прысуджаны пераходны Чырвоны снят РК КПБ, гарсавета.

Птушкакамбінат (дырэктар П.Н. Савінаў, сакратар партарганізацыі Л.Н. Янушкоў), які план па валавой прадукцыі выканаў на 117,9 працэнта, па таварнай - на 118,3, па прадукцыйнасці працы - на 110,1 працэнта.

Саўгас «Крычаўскі» (дырэктар А.М. Калачоў сакратар партарганізацыі С.П. Баранаў), які атрымаў на сто гектараў сельгасугоддзяў па 32 цэнтнеры малака і па 13 цэнтнераў мяса, у тым ліку свініны на сто гектараў ворыва па 6,2 цэнтнера.

Калгас «Перамога» (старшыня В.Я. Жукаў, сакратар партарганізацыі І.Н. Кандрашоў), які атрымаў на сто гектараў сельгасугоддзяў па 48,4 цэнтнера малака і па 12,7 цэнтнера мяса, у тым ліку свініны на сто гектараў ворыва па 9,6 цэнтнера.

1965, 9 мая

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ

Мне давялося прыняць удзел у абароне Крычава ў грозны 1941 год. Цяжкі тэта быў час. З-пад Масквы мы трапілі сюды ў самы разгар баёў. Сілы аказаліся няроўнымі і наша дывізія аказалася ў акружэнні.

Мы неслі вялікія страты, але ніхто з чырвонаармейцаў не думаў здавацца. Вера ў перамогу давала нам сілы. І мы прарвалі ланцуг акружэння, каб у другім месцы зноў сустрэць ворага агнём.

Як ветэран вайны, віншую працоўных Крычаўскага раёна з 20-годдзем Дня Перамогі. Жадаю кожнаму здароўя, шчасця і радасці ў жыцці.

С.Г. Мялёшын.
Жытомірская вобласць,
г. Радамышль

1965 г., 20 мая

ВЫСОКАЯ АПЛАТА СВІНАРКАМ

Добрых поспехаў у свінагадоўлі дабіліся сёлета свінаркі калгаса імя Суворава Кацярына Астапенка і Паліна Казлова. У першым квартале ад свінаматак яны атрымалі і гадавалі да двухмесячнага ўзросту па 9—11 парасят. Вага кожнага парасяці пры ад'ёме - 10—13 кілаграмаў.

За добрую працу атрымана і добрая аплата. За сакавік на працадні і за лік дадатковай аплаты К. Астапенка атрымала 275 рублёў, а П. Казлова - 306 рублёў 30 капеек.

1965 г., 23 кастрычніка

КАБ УТУЛЬНЫМ ПРЫВАБНЫМ БЫЎ ГОРАД

Дамы і вуліцы нашага горада з кожным годам усё болын і болын хваюцца ў зялёным голлі дрэў. У Крычаве ёсць чатыры паркі і два скверы агульнай плошчай 48,4 гектара. Азелянёны многія вуліцы. Толькі сёлетняй вясной сіламі калектываў арганізацый і ўстаноў, грамадскасцю горада было пасаджана каля 6 тысяч дэкаратыўных і пладовых дрэў і больш за 15 тысяч кустарнікаў.

1965 г., 25 лістапада

ЗА КАРОТКІ ТЭРМІН

У 6-й брыгадзе калгаса «Запаветы Леніна» сваімі сіламі пабудаваны кароўнік на 200 галоў. У памяшканні абсталяваны станкі для цялят.

Дзякуючы стараннай працы калгасных цесляроў Л. Літрэева, В. Глушанкова, М. Якіменкі, Е. Міцяніка і іншых усе будаўнічыя работы выкананы за тры месяцы. На зіму грамадскі статак пераведзены ў прасторнае памяшканне.

1968 г., 1 студзеня

РАПАРТЫ ПРАЦОЎНЫХ ПЕРАМОГ

Рабочыя цэментна-шыфернага камбіната план па выпуску асноўных відаў прадукцыі перавыканалі. Звыш плана краіна атрымала больш 7 мільёнаў умоўных плітак шыферу, каля 14 тон цэменту.

Калектыў завода гумавых вырабаў гадавую праграму па выпуску валавой прадукцыі выканаў 7 снежня. Звыш задания выпушчана каля 200 тысяч пар гумавага абутку.

Больш за 3 тысячы цяжкавагавых составаў правялі ў юбілейным годзе паравознікі дэпо станцыі Крычаў.

Паспяхова справіліся са сваімі задачамі рабочыя маслазавода. Атрымана 159 тон цэльнамалочнай прадукцыі звыш плана.

Работнікі райпрамкамбіната яшчэ 1 кастрычніка адрапартавалі аб выкананні гадавога плана па выпуску мэблі.

Значных поспехаў дабіліся ў 1967 годзе калгасы і саўгасы раёна. Яны перавыканалі гадавыя планы продажу дзяржаве мяса, малака, зерня, яек, ільнасемя, ільнавалакна, бульбы.

Вытворчасць мяса на 100 гектараў сельгасугоддзяў узрасла за 11 месяцаў на 9,6 цэнтнера і склала 49,6 цэнтнера. Вытворчасць малака ў такім жа разліку павялічылася на 20,5 цэнтнера і склала 257,3 цэнтнера.

1975 г., 1 студзеня

ДАТЭРМІНОВА

Калектыў завода гумавых вырабаў, выконваючы ўзятыя на сябе сацыялістычныя абавязацельствы, атрымаў выдатную працоўную перамогу. Д атэрмінова, па стану на 27 снежня 1974 года, выкананы гадавы план выпуску прадукцыі. Дадаткова да задания выпушчана 50 тысяч пар гумавага абутку.

Добра папрацавалі ў мінулым годзе рабочыя цэха № 2. Аб датэрміновым выкананні гадавога плана яны рапартавалі 25 снежня. У гэтым калектыве 420 чалавек з'яўляюцца ўдарнікамі камуністычнай працы.

1975 г., 1 студзеня

Ударна папрацавалі ў 1974 годзе работнікі лакаматыўнага дэпо станцыі Крычаў. План перавозак народнагаспадарчых грузаў яны выканалі амаль на паўмесяца раней. Удвая перавыканана сацыялістычнае абавязацельства па перавозцы грузаў звыш нормы ў цяжкавагавых цягніках.

Лепшага выніку ў спаборніцтве дабіўся машыніст Е. Чэрнікаў. На яго рахунку 67 цяжкавагавых цягнікоў і 15 тысяч 266 тон грузаў, перавезеных звыш нормы.

1975 г., 1 студзеня

Цэментна-шыферны камбінат план выпуску будаўнічых матэрыялаў выканаў датэрмінова, 30 снежня. Звыш плана выпушчана шэсць тысяч тон цэменту, каля 500 тысяч умоўных плітак шыферу. Дадаткова дадзена працаўнікам палёў 18 тысяч тон вапнавай мукі.

1975 г., 1 студзеня

Найлепшых паказчыкаў у спаборніцтве дабіліся пастухі калгаса «Запаветы Леніна» М.Ф. Чыгілаў і А.В. Дворнікаў. Надоі на карову ў іх статку перавысілі 3200 кілаграмаў малака.

1975 г., 1 студзеня

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ПЕРАВЫКАНАЛА

Прайшоўшы год прынёс мне вялікую радасць. Я стала пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва сярод жывёлаводаў нашага калгаса і раёна. Надаіла ад кожнай каровы амаль 4000 кілаграмаў малака. Перайшоўшы трохтысячны рубеж, я датэрмінова выканала сваё сацыялістычнае абавязацельства і знайшла новыя рэзервы павышэння росту надояў малака. Гэта дазволіць мне сёлета ўзяць чатырохтысячны рубеж па надоях малака.

Н.Я: Прыднікава.
Даярка калгаса «Запаветы Леніна».

1975 г., 23 студзеня

ПРАДУКЦЫЯ ФАБРЫКІ

Мэблевая фабрыка спецыялізуецца на выпуску кухонных гарнітураў. У гарнітур уваходзіць абедзенны стол, тры навясныя шафы, тры рабочыя тумбачкі, чатыры табуэткі. Першыя партыі гарнітураў, якія паступілі ў гандлёвую сетку, сведчаць аб тым, што яны карыстаюцца попытам. Іх хутка раскупілі жыхары горада. Сёлета фабрыка выпусціць 3800 такіх гарнітураў.

Апрача нашага раёна, вобласці і рэспублікі, гарнітуры будуць пастаўляцца ў Расійскую Федэрацыю, Казахстан і Кіргізію.

1977г., 4 студзеня

УЗНАГАРОДЫ ЛЕПШЫМ

Напярэдадні новага года ў райсельгасупраўленні групе працаўнікоў вёскі былі ўручаны медалі ВДНГ СССР і каштоўныя падарункі, Ганаровыя дыпломы Міністэрства сельскай гаспадаркі і нарыхтовак.

Сярэбранымі медалямі ўзнагароджаны даглядчык жывёлы І.Я. Стралецкі і свінарка Р.К. Іконская з калгаса «І Іамяць Леніна», бронзавымі - брыгадзір калгаса «Сацыялістычны шлях» Г.Ф. Свадкоўскі, камбайнер калгаса імя Суворава В.І. Дружанкоў, даярка саўгаса «Крычаўскі» Т.Е. Верхатурава, працаўнікі калгаса «Памяць Леніна» - звеннявая М.С. Фядосенка, даглядчык жывёлы І.І. Мырза, палявод В.В. Яўсееў. Яны ж атрымалі і каштоўньм падарункі. Р.К. Іконскай, напрыклад, уручаны дыван.

Дзесяць чалавек узнагароджаны Ганаровымі дыпломамі.

1977 г., 27 студзеня

ЛЕПШЫЯ ПРАЦАЎНІКІ

За высокія паказчыкі ў выкананні індывідуальных сацыялістычных абавязацельстваў занесены на раённую Дошку гонару, узнагароджаны Ганаровай граматай райкома КПБ і райвыканкома з уручэннем бясплатнай пудёўкі ў санаторый і прысвоена ганаровае званне:

Лепшая даярка раёна - Дворнікавай В.Р. з калгаса «Памяць Леніна», якая надаіла 3503 кілаграмы малака на карову.

Лепшы механізатар раёна - Капылову І.П. з калгаса «Звязда», які выпрацаваў на трактары МТЗ-50 1350 эталонных гектараў і ўбраў бульбу з плошчы 186 гектараў.

Лепшая свінарка раёна - Іконскай Р.К. з калгаса «Памяць Леніна», якая атрымала і вырасціла па 22 парасяці ад кожнай свінаматкі.

Лепшая цялятніца раёна - Кутарковай Г.А. з калгаса «Ударнік», якая вырасціла 70 цялят і забяспечыла 724 грамы сяроднесутачнай прывагі.

Лепшы пастух раёна - Анціпенка В.Л. з калгаса «Памяць Леніна», які забяспечыў атрыманне надою малака па 2952 кілаграмы на карову.

Лепшы палявод раёна - Пятроўскай М.Н. з калгаса «Вялікі Кастрычнік».

1977 г., 10 лютага

У ДАМАХ АДПАЧЫНКУ І САНАТОРЫЯХ

Многія рабочыя саўгаса «Дзяіавіч ы» штогод адпачываюць у дамах адпачынку і санаторьмх. Так, у мінулым годзе ў дамах адпачынку пабывалі каваль Пётр Расееў, трактарыст Андрэй Куцапалаў, бухгалтар Вера Цыганкова, а ў санаторыях - цялятніца Марьи Цупрукова, сталяр Антон Аўраменка і іншыя.

1977 г., 22 лютага

ПРЫГАЖЭЕ СЯЛО

Саўгасу «Крычаўскі» уручаны дыплом трэцяй ступені ВДНГ за добраўпарадкаванне цэнтральнай сядзібы - вёскі Чырвоны Ручай. Бронзавымі медалямі выстаўкі ўзнагароджаны дырэктар саўгаса А. Калачоў, рабочыя-будаўнікі А. Клімянкоў, А. Лагуноў, Д. Курыленка.

Вёска Чырвоны Ручай - адна з самых прыгожых у раёне. Яна нагадвае сабой добраўпарадкаваны пасёлак гарадскога тыпу. Шматкватэрныя цагляныя жылыя дамы, двухпавярховы Дом культуры, гандлёвы цэнтр, Дом быту. Вуліцы заасфальтаваны, дзейнічае вадаправод. Летам вёска патанае ў зеляніне.

1977 г., 17 сакавіка

ПЕРАМОЖЦА ПА ВЫТВОРЧАСЦІ ЗБОЖЖА

Бюро абкома КПБ, выканком абласнога Савета дэпутатаў працоўных, прэзідыум абласнога Савета прафесіянальных саюзаў і бюро абкома ЛКСМБ разгледзелі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў, калгасаў, саўгасаў, брыгад, звенняў і перадавікоў сельскай гаспадаркі вобласці па павелічэнні вытворчасці збожжа і іншых прадуктаў земляробства ў 1976 годзе.

Пераможцам у сацыялістычным сгіаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак збожжа прызнаны сярод раёнаў, аднесеных да другой трупы - Крычаўскі.

У калгасах і саўгасах раёна сабраны ўраджай збожжавых і зернебабовых культур па 27,4 цэнтнера з гектара, або на 15 цэнтнераў болыы, чым у папярэднім годзе. З кожнага бала- гектара атрымана па 0,25, і на адзін кілаграм дзеючага рэчыва мінеральных угнаенняў - 5,8 кілаграмазбожжа. План вытворчасці збожжа выкананы на 133,7 і продажу - на 105,4 працэнта.

1996 г., 17 студзеня

УРУЧАНЫ ПАДАРУНКІ

Гарадскі выканком зрабіў навагоднія падарункі дзецям-інвалідам. У сем'ях пабывалі старшыня гарвыканкома А.К. Яленскі, яго намесніца С.К. Сімага, загадчыца аддзела сацыяльнай абароны насельніцтва Т.В. Заблоцкая, якія павіншавалі дзяцей-інвалідаў з Новым годам, уручылі падарункі.

1996 г., 31 студзеня

КАРЫСТАЮЦЦА ПОПЫТАМ

Крычаўскія пакупнікі з задавальненнем набываюць у гарадскіх магазінах макароны, якія вырабляюць на хлебазаводзе.

—Гэтая прадукцыя пачала выпускацца на нашым прадпрыемстве летась, — расказвае начальнік вытворча-тэхнічнай лабараторыі Ж.В. Кустрэй. - У 1995 годзе мы адправілі ў магазіны 4 тоны макаронаў. Сёлета ёсць намер вырабіць болып.

Зараз выпускаецца ў дзень 1120 кілаграмаў гэтай неабходнай прадукцыі.

1996 г., 3 лютага

НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ ПРА ПЕНСІЯНЕРАЎ

У калгасе «Запаветы Леніна» не забываюць пра тых, хто ўжо шмат год назаслужаным адпачынку, пра тых, хто прысвяціў усё жыццё сяляпскай справе. У пераліку паслуг, якія аказвае ім калгас, і бясплатнае выдзяленне зерня, бульбы, малака, і забеспячэнне палівам, і замена кароў, калі яны ў селяніна захварэлі і перасталі даваць малако.

1996 г., 29 мая

«КРОК» НА КРЫЧАЎШЧЫНЕ

На працягу чатырох дзён у нашым раёне працавала здымачная трупа праграмы «Крок» беларускага тэлебачання на чале з каментатарам Андрэем Шпегам. Крычаўшчыне будзе прысвечаны цыкл з трох перадач. Праз два—тры тыдні жыхары горада і раёна змогуць убачыць на экранах тэлевізараў свой родны куг, наша паўсядзённае жыццё, працу і адпачынак. Пачуюць яны і вясёлыя прыпеўкі ў выкананні Тамары Дземчанкі.

2000 г., 15 сакавіка

КАЛЕКТЫЎ ВЫЙШАЎ ПЕРАМОЖЦАМ

Штогод Беларуская чыгунка падводзіць вынікі спаборніцтва за званне лаўрэатаў прэміі імя В.А. Яцкевіча. Лаўрэатамі становяцца калектывы, якія дабіліся высокіх вынікаў па забеспячэнню руху цягнікоў і тэхнікі бяспекі.

І вось вынікі спаборніцтва падведзены. Кіраўніцтва Беларускай чыгункі, прафсаюз вызначыў пераможцу. Гэта Крычаўская дыстанцыя пуці. Калектыў пуцейцаў узнагароджаны прэміяй у памеры 880 тысяч рублёў.

2000 г., 27 мая

ЗА ЗДАРОЎЕМ У «КОЛАС»

Рашэннем аблвыканкома з лістапада 1998 года аздараўленчаму комплексу «Колас» нададзены статут санаторыя. Тут папраўляюць здароўе пераважна дзеці з забруджаных рыдыенуклідамі раёнаў.

А з першага чэрвеня санаторый «Колас» прыме і юных крычаўлян. Справа ў тым, што з пачатку лета санаторый пачынае дзейнічаць як летні аздараўленчы лагер санаторнага тыпу на 120 месцаў з кругласутачным знаходжаннем. За лета запланавана арганізаваць чатыры заезды па 20 дзён.

У « Коласе» будуць адпачываць дзеці з нашага горада і раёна, а таксама з Мсціслаўскага, Клімавіцкага раёнаў і нават з Магілёва. Кошт пуцёўкі 80 тысяч рублёў, 40 тысяч - даплата з фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, 10% кошту павінны ўнесці бацькі, а астатняе даплочвае прадпрыемства ці арганізацыя, дзе бацькі працуюць.

Па рашэнню аблвыканкома 498 дзяцей і падлеткаў нашага раёна, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС, павінны былі прайсці аздараўленне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Гэта вучні Сакольніцкай, Касцюшкавіцкай, Бацьвінаўскай, Асавецкай школ, а таксама дзеці перасяленцаў.

Ужо 470 дзяцей з забруджаных тэрыторый прайшлі аздараўленне. Адпачывалі яны ў санаторыях «Бурштын», «Кіравец», «Фандок», «Шыннік», «Свіслач», якія знаходзяцца ў нашай вобласці, а таксама ў санаторыі «Белая Русь», што ў Туапсэ.

2002 г., 22 лютага

У ЛІКУ ПЕРАМОЖЦАЎ

Падведзены вынікі абласнога спаборніцтва па эканамічнаму і сацыяльна-культурнаму развіццю гарадоў і раёнаў вобласці ў 2001.годзе. У сферы прамысловай вытворчасці першынство заняў Бабруйск. Крычаву прысуджана другое месца. Пераможцы спаборніцтва ўзнагароджваюцца пераходнымі сцягамі аблвыканкома і грашовымі прэміямі ў памеры 1200 мінімальных зарплат.

Падрыхтаваў В.Ф. Куліненка.

2003 г., 14 сакавіка

НАМ-25, А НАМ-50

Дзіцячым музычнай і мастацкай школам споўнілася адпаведна 50 і 25 гадоў. І калі творчая біяграфія гэтых устаноў пачыналася даволі сціпла, дык зараз навыкам ігры на розных музычных інстру ментах і творчасці ў жывапісу вучацца больш за 700 навучэнцаў.

... Крычаўская дзіцячая музычная школа расчыніла свае дзверы ў 1952/1953 навучальным годзе ў пасёлку цэментнікаў у прыстасаваным для гэтых мэт памяшканні. Узначаліла школу выпускніца Магілёўскага музычнага вучылішча Валянціна Шуганава. Менавіта пад яе кіраўніцтвам пачыналася станаўленне музычнай адукацыі ў нашым горадзе.

Дзіцячая мастацкая школа была заснавана ў 1977 годзе. Першым дырэктарам школы быў Анатоль Герашчанка - чалавек высокага прафесійнага і інтэлектуальнага ўзроўню, з вялікімі арганізатарскімі здольнасцямі. А пачыналася мастацкая школа з маленькай студыі выяўленчага мастацтва ў СШ № 1, затым гуртка пры Доме піянераў і школьнікаў, гарадской студыі на базе РЦК, якой потым было присвоена ганароваезвание «Народная».

У вялікай зале раённага цэнтра культуры на свята сабраліся настаўнікі абедзьвюх школ, навучэнцы, іх бацькі, былыя выпускнікі, госці. А пачалося яно з музычнага прывітання ў выкананні аркестра народных інструментаў. Потым аб людзях, што працавалі і працуюць зараз у музычнай і мастацкай школах, аб іх дасягненнях, аб саміх навучальных установах расказаў загадчык аддзела культуры Г. Міхееў. А расказваць і сапраўды ёсць аб чым. У нас у раёне зараз дзве музычныя школы, якія маюць філіялы на вёсцы. Мастацкая школа таксама мае свае філіялы. Усяго ж за 50 гадоў музычную адукацыю атрымалі больш за 1300 навучэнцаў, мастацкую за 25 гадоў - больш за 500. У школах працуюць 78 выкладчыкаў. Прычым 54 - выпускнікі гэтых школ. У Д МШ №№ 1,2 ёсць свае харавыя калектывы, дзіцячы фальклорны ўзорны калектыў «Вашчылкі», ансамбль народных інструментаў, аркестр народных інструментаў і г.д. Навучэнцы школ прымаюць актыўны ўдзел у абласных, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсах і выставах, дзе атрымліваюць дыпломы рознай ступень..

А. Гаўрыленка.

2003 г., 19 сакавіка

ГАРАНТАВАНА ДОЎГАЕ ЖЫЦЦЁ

Калі рэгіён забудоўваецца, развіваецца - адкрываецца новая вытворчасць, не прыходзяць у заняпад, а рэканструююцца старый будынкі, рамантуюцца дарогі... — значыць, яму гарантавана доўгае жыццё. І Крычаўшчына, думаю, на такім шляху.

Важная для горада падзея адбылася на гэтым тыдні - установа адукацыі «Тэхнікум эканомікі, права і кіравання» пераехала ў новае памяшканне (былы буданак базавай школы № 4). І няхай наваселле справілі пакуль напалову - капітальна адрамантаваны другі паверх, прычым, па мерках еўрастандарту, — першы, важкі крок зроблены. Як запэўніў прарэктар па будаўніцтву В. Далганаў, сёлета ў тэту справу яшчэ будзе ўкладзены не адзін дзесятак мільёнаў рублёў. У перспектыве плануецца ўзвесці надбудову пад інтэрнат на больш чым 100 месцаў, завяршыць капрамонт першага паверха, цалкам аднавіць фасад, правесці добраўпарадкаванне тэрыторыі. Планы вялікія, і яны здзейсняцца, бо ўзначальвае ўстанову энергічны, вопытны кіраўнік - З. Скачкова, якая з'яўляецца, вобразна кажучы, першапраходцам, бо менавіта яна распачынала работу па адкрыццю ў нашым горадзе тэхнікума. Зінаіда Міхайлаўна шчыра падзякавала кіраўніцтву раёна за падтрымку пры стварэнні і адкрыцці гэтай навучальнай установы, гомельскім будаўнікам, якія паказалі сапраўдны ўзор адносінаў да справы, калектыў педагогаў, які ва ўсім быў побач.

Т. Іўкіна.

2003 г., 25 красавіка

ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Ад дзелам па справах моладзі райвыканкама праводзіўся творчы конкурс «Дэбют» сярод моладзі раёна, прысвечаны 867-й гадавіне Крычава і 60-годдзю вызвалення горада ад фашызму. На конкурсе былі прадстаўлены апавяданні, вершы, паданні, малюнкі, работы з гліны і лазы.

Пераможцай стала Вольта Жывіцкая, карэктар райгазеты «Ленінскі кліч», за сачыненне « Усё толькі пачынаецца» ёй уручаны Дыплом першай ступень Дыпломы другой і трэцяй ступені ўручаны Вікторыі Быкавай, навучэнцы абласнога ліцэя № 4 г. Крычава за сачыненне «Я і прырода». Трэцімі сталі Ян Клюеў (абласны ліцэй № 4) за апавяданне «Крыжы і купалы» і Аляксей Грахоўскі, вучань СШ № 1 - за сачыненне.

Сярод юных паэтаў першым стаў Дзмітрый Кудраўцаў (абласны ліцэй № 4), другой была Кацярына Аўсяннікава (СШ № 6), трэцімі - Павел Чыж (СШ № 5) і Святлана Чыжз гэтай жа школы.

За малюнкі першае і другое месцы прысуджаны адразу двум вучням Сакольніцкага комплексу «школа-сад» Таццяне Каваленка і Дзянісу Сімагу. Трэцяе месца не прысуджана.

За фотаздымкі аб прыродзе, родных месіцах і жыцці месцы размеркаваны паміж Аленай Івановай, педагогам-арганізатарам Маляціцкай сярэдняй школы, Святланай Цымбаліставай, вучаніцай Бацьвінаўскай СШ, і студэнтам установы адукацыі «Тэхнікум эканомікі, права і кіравання» Анатолем Мацвеенкам.

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве першай стала Вікторыя Літвінчук, вучаніца Дзягавіцкай СШ. Яна займаецца ў філіяле дзіцячай мастацкай школы ў Святланы Касаткінай. Другое месца прысуджана Кацярыне Анішчанка з абласнога ліцэя № 4 і трэцяе - Варвары Марозавай, вучаніцы СШ № 1.

Дыпломы і грашовыя прэміі пераможцам уручыў загадчык аддзела моладзі райвыканкама Валерый Жывіцкі.

В. Бысаў.

2003 г., 2 верасня

СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ

У гарадской бібліятэцы мікрараёна Камсамольскі адбылася сустрэча вучняў 11 класа СШ № 3 з пісьменнікам Віктарам Карамазавым. Цікавая гутарка ішла аб яго нядаўна надрукаванай кнізе «З вясной у адным вагоне». Тэта аповесці, эсэ і дзённік лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі В. Карамазава аб славутых беларускіх жывапісцах В. Бялыніцкім-Бірулі, С. Жукоўскім, Г. Вашчанку, А. Бараноўскім і А. Бархаткове, а таксама пра сустрэчы Левітана і Чэхава, жыццё Льва Талстога. Цяпер у Мінску рыхтуецца да выдання новая кніга пісьменніка «Чырвоная брама». Яна таксама пра мастака Гаўрылу Вашчанку.

В. Карамазаў - наш зямляк. Вучыўся ў сярэдняй школе № 1 пасля вайны. Працаваў у Крычаўскай «раёнцы», потым у Чэрыкаве, Магілёве, у «Звяздзе» ў Мінску. Ён аўтар дзесяткаў кніг, па яго сцэнарыях зняты кінафільмы «Путча», «Крыж на зямлі і поўня ў небе» аб мастаку В. Бялыніцкім-Бірулі. Пісьменнік часты госць у нашым горадзе. Бывае ў школах, бібліятэках, сустракаецца з людзьмі на прадпрыемствах.

В. Бысаў.

Падрыхтавала да друку Г. А. Кірпічова.

З ГІСТОРЫІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА УНІТАРНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «КРЫЧАЎЦЭМЕНТНАШЫФЕР»

У снежні 1929 г. урад БССР зацвердзіў тэхнічны праект будаўніцтва цэментнага завода ў Крычаве. Месца было выбрана невыпадкова. Тут меліся запасы якаснай сыравіны.

Спачатку планавалася заводу выпусціць за год 700 тыс. бочак цэменту, а потым давесці колькасць гэтай прадукцыі да 1400 тыс. (бочка - 80 т). На будаўніцтва завода разам з электрастанцыяй было выдзелена 7220 тыс. рублёў.

У красавіку 1930 г. недалёка ад рэчкі Сож распачалося будаўніцтва завода. На працу сюды прыехалі людзі з розных куткоў краіны. Разам з жыхарамі Крычаўшчыны ўзводзілі завод ураджэнцы Смаленскай, Бранскай абласцей, а таксама жыхары Украіны. Тут былі створаны і плённа працавалі брыгады крычаўскіх, клімавіцкіх, касцюковіцкіх, хоцімскіх, магілёўскіх і іншых будаўнікоў. На будаўніцтва завода прыбыла нават група палітычных эмігрантаў з Заходняй Беларусь На станцыю Крычаў няспынным патокам прыбывалі з розных месц краіны вагоны з будаўнічымі матэрыяламі.

Нялёгкім аказалася ў той час узвядзенне прадпрыемства. Амаль усе работы даводзілася весці ўручную. Лес, цэглу, цэмент, што разгружаліся на станцыі Крычаў, падвозілі на конях.



Вытворчае унітарнае прадпрыемства «Крычаў-цэментнашыфер».

У пачатку будаўніцтва не хапала і рабочай сілы. Так, на 15 ліпеня 1930 г. з патрабуемай колькасці 900 чалавек працавала толькі 386.

За два з паловай месяцы было ўзведзена тры склады, сталоўка, чатыры домікі для жылля на 480 месц, драўляны воданапорны вянец вышынёй 16 метраў, клуб, пажарнае дэпо, кузня, магазін, пракладзена 700 м водаправода. З 1932 г. будаўнікі завода пачалі чытаць шматтыражку «За цэмент», у якой расказвалася пра леншых людей, іх метады працы, ускрываліся недахопы і крытыкаваліся бракаробы, гультаі, прагульшчыкі. Трэба адзначыць, што мясцовае друкаванае слова адыграла важную ролю ў барацьбе за паскарэнне тэмпаў будаўніцтва, за якасць выконваемых работ.

10 мая 1933 г. было закончана будаўніцтва ТЭЦ, а ў кастрычніку таго ж года будаўнікі завяршылі мантаж першай вярчальнай печы. Неўзабаве падрыхтавана была да выпуску прадукцыі і другая вярчальная печ. 23 лістапада 1933 г. Дзяржаўная камісія падпісала акт аб здачы ў эксплуатацыю цэментнага завода.

Завод рос з кожным годам, набіраў вытворчыя магутнасці. Дружна і арганізавана працавалі людзі, няўхільна павышалі сваё майстэрства, паступова рос і іх дабрабыт.

У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі ператварылі завод у лагер для ваеннапалонных.

Адступаючы пад націскам савецкіх войск,

Перадавікі вытворчасці прадпрыемства.

фашысты зруйнавалі прадпрыемства. Горы раструшчанай цэглы ляжалі на месцы былых карпусоў. Такі малюнак назіраўся не толькі ў Крычаве, ён быў усюды, дзе пабывалі гітлераўскія ваякі. Неабходна было адбудоўваць гарады і вёскі, краіне патрабаваўся цэмент.

Будаваць цэментны завод гірыйшлі ветэраны, якія працавалі тут да пачатку вайны, прыехала шмат моладзі. Дапамагаць крычаўцам прыбылі вопытныя інжынерна-тэхнічныя работнікі з Масквы, Бранска, Кіева. І зноў жа, пры недахопе тэхнічных сродкаў, рабочых рук, будаўнікі прадэманстравалі найвышэйшы працоўны энтузіязм.

У 1980 г. на базе Крычаўскага цэментна-шыфернага камбіната створана вытворчае аб'яднанне « Крычаўцэментнашыфер». Уключае заводы: цэментны (галаўное прадпрыемства) і шыферны. У 1963 г. далучаны завод вапнавай мукі. Сыравіна: крэйда з радовішча Каменка (Крычаўскі раён), гліна з радовішча Пушча (Віцебскі раён), прывазныя калчаданавыя агаркі, гіпс і іншыя дамешкі. Асноўная прадукцыя (1998): портландцэмент розных марак, шыфер 8-хвалевы, шыфер плоскі непрасаваны.

У перыядычным друку рэспублікі шырока асвятляўся ход будаўніцтва Крычаўскага цэментнага завода. Вось што пісаў часопіс «Чырвоная Беларусь». (1932 г. № 4).

ЦЭМЕНТ

Нарыс

Новыя карпусы, заводы, фабрыкі, новыя масты, электрастанцыі, якія з кожным днём вырастаюць на неабсяжных прасторах Савецкага Саюза, патрабуюць для сябе многа будаўнічых матэрыялаў. Адным з такіх будаўнічых матэрыялаў з'яўляецца цэмент.

Цэментныя заводы, якія існуюць цяпер, не могуць задаволіць цэментам у дастатковай ступені таго гіганцкага будаўніцтва, што разгортваецца ў краіне. Патрэбны новыя цэментныя заводы, з мільёнамі новых бочак цэменту.

Адзін з такіх заводаў будуецца ў Крычаўскім раёне - Крычаўскі цэментны волат. 1 мая 1930 года ў гліністую глебу, недалёка ад мястэчка Крычаў, упершыню ўрэзалася жалезная грабарская рыдлёўка, расчышчаючы месца для падмурка новага завода.

1 мая 1930 года на станцыі Крычаў загулі гудкі чорных шчукінскіх паравозаў, якія прывезлі эталоны жалеза, цэглы, сталі, цэменту, дошак для новага завода. Закіпела работа на пустым, аплаканым вятрамі і зарослым быльнягом полі: заварушыліся людзі, застукалі тапары, зазвінела жалеза. Аб будаўніцтве новага завода радыёхвалі разнеслі весткі па ўсім СССР. Весткі дайшлі да чарнігаўцаў, да кіяўлян. На будаўніцтва новага завода пачалі з'язджацца людзі з усіх канцоў Савецкага Саюза. Ехалі з Поўдня, ехалі з Поўначы, цераз Воршу, цераз Гомель, і ўсе з'язджаліся на невялікую станцыю Крычаў.

Крычаўскія, касцюковіцкія, ходасаўскія калгаснікі, беднякі з сераднякамі таксама прыйшлі на завод, прыйшлі з сякерамі, з рыдлёўкамі, з ламамі будаваць новы волат. 1100 рабочых распачалі працу.

І пачалі вырастаць рыштаванні, а разам з рыштаваннямі рос завод. Паўтара года кіпела работа, і вырас сярод поля, недалёка ад чыгункі, велізарны завод-волат з электрастанцыяй, воданапорнай вежай і рабочым пасёлкам.

Бетон і жалеза - вось асноўны матэрыял, з якога будаваўся завод. Спачатку сцяну выводзілі дошкамі ў два рады, устаўлялі паміж дошак тоўсты жалезны дрот і потым залівалі бетон. Так выраслі сцены, так выраслі коміны і печы. Канструкцыя завода ўся жалезабетонная, магутная, велічная.

Калі прыязджаеш цяпер на ст. Крычаў, дык у першую чаргу кінецца ў вочы велізарны 75-мятровы цагляны комін, які ўзвышаецца над усім заводам. Комін такі патрабаваўся для таго, каб была вялікая цяга з печаў абпалу, у якіх будзе абпальвацца гліна і крэйда і ператварацца ў цэмент. Завод будзе працаваць на мясцовай сыравіне, якую хавае ў сабе шчодрая крычаўская зямля. У год завод будзе даваць 750 тыс. бочак цэменту. Цэмент, які будзе выпрацоўваць Крычаўскі завод, паводле заяў спецыялістаў, будзе першай якасці.

Будаўніцтва завода скончана. Скончана будаўніцтва і электрастанцыі магутнасцю ў 5200 кілават энергіі. Электрастанцыя будзе абслугоўваць не толькі цэментны завод, яна будзе абслугоўваць і мястэчка Крычаў, станцыю Крычаў і фасфарытны завод, што знаходзіцца недалёка ад цэментнага. Да завода пракладзена чыгунка, па якой будуць адвозіць гатовую прадукцыю...

Мантаж абсталявання будзе скончаны да 1 мая 1932 года.

Каля завода, прытуліўшыся да зямлі, стаяць рабочыя баракі. У гэтых бараках жывуць будаўнікі завода.

Усё ж нельга не спыніцца на тых прарывах, якія былі на будаўніцтве. 6 умоў т. Сталіна, якія забяспечваюць перамогу, не былі рэалізаваны ў дастатковай ступені на заводзе. І Ірагрэсіўна-здзельная аплата працы таксама не была ўведзена. Да гэтых пытанняў надзвычай нядбайна адносіліся гаспадарчыя і ішафсаюзныя арганізацыі завода.

Прагулы - гэты злейшы вораг будаўніцтва - часам займалі досыць значнае месца на будаўніцтве. Былі месяцы, калі прагулы займалі каля 18 працэнтаў. Гэта вынік таго, што сярод рабочых не праводзілася ніякай культмасавай работы. Слаба былі разгорнуты сацыялістычныя метады працы — спаборніцтва і ўдарніцтва. Камсамол - акумулятар працоўнай энергіі, застрэльшчык спаборніцтва, слаба змагаўся за сацыялістычныя метады працы на будаўніцтве. Дрэнныя бытавыя ўмовы рабочых значна адбіліся на будаўніцтве. У выніку і прагулы, і спазненні. Прафарганізацыя слаба адчувалася на будаўніцтве - не вяла барацьбы за здаровы і чысты барак, не змагалася з прагуламі, спазненнямі, п'янкай.

Тэта было тады, калі стракаты і разнастайны склад рабочых не згрунтаваўся, не стаў маналітным, не пераварыўся ў працоўным катле, не загартаваўся ў барацьбе за прамфі нплан, за своечасовы пуск завода.

Цяпер завод хуткімі тэмпамі рыхтуецца да пуску. Партыйны і камсамольскі калектывы рашуча ўступілі ў бой з тымі прарывамі, якія былі на будаўніцтве. Тэта дало надзвычайныя вынікі: павялічыліся прадукцыйнасць рабочай сілы, палепшаны бытавыя ўмовы рабочых, шырока разгарнуўся ўдарніцкі рух.

Жалезная ўпартасць да працы рабочых пад кіраўніцтвам парткалектыву забяспечыць своечасовы пуск завода.

— Завод будзе пушчаны ў тэрмін, — заяўляе начальнік будаўніцтва т. Бэрхман.

Адным з тармазоў будаўніцтва з'яўляецца нясвоечасовае выкананне заказу для абсталявання заводу і электрастанцыі.

Цяпер рабочыя жывуць у бараках. А праз паўгода яны будуць жыць у трохпакаёвых чыстых і светлых дамах, пабудаваных уласнымі рукамі. Рабочы пасёлак, які вырас разам з заводам, хутка закіпіць рабочым жыццём, жыццём ударнікаў і іх сем'яў.

У рабочым пасёлку будзе бальніца, школа, клуб. У школе будуць вучыцца дзеці, каб замяніць сваіх бацькоў, працягваць іх гераічныя справы. У клубе, пасля 7-гадзіннай працы, якая стала справай гонару, рабочы знойдзе культурны адпачынак, знойдзе кніжку, газету.

1 мая 1932 года будзе пушчаны завод. Загудуць урачыста і радасна гудкі цэмзавода і электрастанцыі. Закруцяцца печы абпалу, застукаюць цэментныя млыны і пацячэ ў бочкі сівы цэмент, які так патрэбны для будаўніцтва новых фабрык і заводаў, які так патрэбны для паспяховага заканчэння пяцігодкі.

Ус. Шыркоўскі.

Гартаючы старыя падшыўкі газет і часопісаў

Рэдакцыя Магілёўскай абласной газеты «За Радзіму» не засталася ў баку ад аднаўлення Крычаўскага цэментнага завода. Тут быў створаны журналісцкі пост. Выязная рэдакцыя на заводзе рэгулярна выпускала газету для цэментнікаў, у якой шырока асвятлялася будаўніцтва, ускрываліся недахопы.

У 1949 годзе

Мы обратились к некоторым рабочим и инженерно-техническим работникам завода и строительно-монтажных организаций с вопросом: «Над чем они будут работать в 1949 году». Ниже приводим ответы этих товарищей.

Работать и учится

«Я решил в 1949 году получить без отрыва от производства среднее образование. Посещаю десятилетку. Совмещение учебы с работой не только не мешает в моей производственной деятельности, а наоборот, помогает, ободряет, вдохновляет. В школе я успеваю по всем предметам. На производстве выполняю свои задания на 130-150 процентов».

Так заявил нам токарь механического цеха, член ВКП(б) тов. Кастричко.

Будем монтировать вторую очередь

Бригадир монтажной бригады строймехмонтажа тов. Писарев сказал:

«В 1949 году нам предстоят огромные по объему работы по монтажу оборудования второй очереди завода. На монтаже первой очереди я получил большой опыт, буду в дальнейшем ширить и совершенствовать его. Моя бригада была одной из первых и в дальнейшем сохранит свое первенство».

Буду обучать молодых

Старый опытный производственник тов. Лапшинов заявил:

«Важнейшее значение для производственных цехов имеют хорошо подготовленные кадры. Кадры у нас молодые, не имеют достаточного практического опыта. Я беру шефство над группой молодых рабочих и в 1949 году подготовлю из них хороших производственников».

Строить прочно, хорошо

Молодой каменщик строительного участка, бывший выпускник школы ФЗО тов. Скребков сказал:

«В прошлом году я и мои товарищи по бригаде только еще приобрели практические навыки. Но уже к концу года моя производительность достигла 160 процентов. В 1949 году доведу свою выработку до 250 процентов. Буду строить прочно и хорошо».

«За Радзіму», 1949 г., 1 студзеня.

НАШЫ НАЙБЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ

С пуском первой очереди завода перед коллективом цехов основного производства стала задача - быстрее освоить введенные в строй производственные мощности, обучить обслуживающий персонал на его рабочих местах, строго соблюдать технологическую дисциплину во всех звеньях производства, начиная с карьерного цеха и кончая складом готовой продукции, бороться за экономию топлива. Государственный план должен выполняться каждым цехом, каждой сменой.

Коллектив строителей и монтажников должен к дню открытия XIX съезда КП(б) Белоруссии сдать в эксплуатацию вторую технологическую нитку, а также котлы № №3 и 4 на ЦЭС, установить на фундамент второй турбогенератор.

По производственным цехам необходимо: закончить электровозную откатку с мелового карьера, начать укладку узкоколейного пути и электролиний на глиняные карьеры, установить три шламмболтушки в сырьевом цехе. Включить в работу шламмбассейны №№ 2, 4, и 6, закончить установку опор на печи и холодильники, а также их клепку, смонтировать угольную мельницу № 2. Смонтировать кран угольного склада. Установить дробилку для угля и добавок, пустить в работу новую компрессорную.

По ЦЭС предстоят не менее важные работы. Нужно закончить водозабор и установку циркуляционных насосов, установить эстакаду второго подъема торфа в бункерную галерею, сдать в эксплуатацию котлы №№ 3 и 4.

Для того, чтобы выполнить эти работы в самые короткие сроки, монтажные организации, которыми руководят тов. Маркин, Коротченко и Якушев должны немедленно преодолеть свое отставание и взяться за дело со всей энергией, проявить максимум инициативы.

За достойную встречу XIX съезда КП(б) Белоруссии сейчас борются и имеют значительные успехи коллективы строителей и монтажников, возглавляемые т.т. Ведьмедем, Лазаренко, Стрелецким, Рабандировым, Дорошенко, Бородулиным, Шаповаловым. В социалистическое соревнование имени XIX съезда КП(б) должны вступить все коллективы строителей и монтажников, все рабочие и ИТР основного производства.

Коллектив строителей и монтажников нашего завода уже имеет достаточный опыт в проведении монтажно-строительных работ, и нет сомнения в том, что поставленные задачи будут успешно решены.

В. Коновалов, директор завода.

«За Радзіму», 1949 г., 21 студзеня.

ЛЕПШЫЯ ЛЮДЗІ ПЯЧНОГА ЦЭХА

Обжигальщик Колычев

Обжигальщик - ведущая профессия в печном цеху. От его работы зависит многое. Тов. Колычев работал на заводе еще до Великой Отечественной войны. Это технически грамотный, инициативный человек. Он хорошо готовит печь к розжигу, внимательно следит за обжигом, доброкачественно делает намазку, предохраняющую футеровку. Тов Колычев требователен к себе и к другим рабочим. Соблюдение правил технологического режима - для него первейший закон.

Тов. Колычев неустанно обучает молодых рабочих, передает им свой богатый производственный опыт.

Мельник Емельяненко

Тов. Емельяненко - старый кадровый рабочий завода. Его не раз отмечали как передового, аккуратного в выполнении своих производственных обязанностей человека.

После Великой Отечественной войны на заводе установлено новое сложное оборудование. Тов. Емельяненко быстро освоил его. Он тщательно следит за подачей горячего воздуха и равномерным питанием мельницы углем, за работой всех агрегатов и узлов. Он установил постоянный контроль за рабочими, осуществляющими подачу и шихтовку угля.

Своим самоотверженным трудом тов. Емельяненко обеспечивает бесперебойную работу угольной мельницы.

«За Радзіму», 1949 г., 25 студзеня.

Падрыхтавала З. Скачкова.

Віктар Карамазаў

Тэты нарыс я пісаў амаль пяцьдзесят гадоў таму, яшчэ студэнтам універсітэта, калі вучыўся на журналіста і меў творчую практыку ў крычаўскай раённай газеце «Шлях сацыялізму», і яшчэ тады апублікаваў яго ў часопісе «Советская Отчизна», які мы сёння ведаем як часопіс «Неман». Цяпер, даючы згоду змясціць нарыс у «Памяці», кнізе роднага мне раёна, ужо як пэўны дакумент далёкага ўсё ж часу, я перачытаў яго і, шчыра кажучы, разгубіўся: ці варта перадрукоўваць багацце газетных стылёвых ды моўных штампаў? Але разам з тым, чытаючы, чуў і бачыў дзе ў радках, дзе паміж радкоў той пасляваенны час, тое жыццё, яшчэ з ка- лецтвам вайны, тых людзей, нядаўніх франтавікоў, знаёмых мне цэментнікаў, бачыў сябе сярод іх, маладога, захопленага цэментава-шэрымі пейзажамі роднага краю, і адчуваў, што не пусціць усё тэта, усіх іх, у кнігу з-за браку літаратурнага стылю будзе непавагаю да людзей, да таго жыцця. І я адважыўся на публікацыю, нічога не мяняючы ў сваім першым на- рысе. Адно зрэдку колькі радкоў дадаю - сённяшнім днём надуманага, успомнена- га. Як і гэтыя радкі на пачатку.

Час і людзі

Утром, в восемь часов, над городком вскрикивает гудок. Он погромче, чем тот, который дает по ночам приземистый маневровый паровоз, отходя от силосных баков комбината с груженными цементом вагонами. Его легко отличить и от тонкого пронзительного крика электрички, что неутомимо тащит из карьера сырье. Гудок этот густой и торжественный.

... По улицам и переулкам Кричева уже спешат рабочие, сходятся на перекрестках в общий единый поток. В этом потоке твердым широким шагом идет, ссутулившись, Николай Фомич Дудыко. Двадцать пять лет встает по этому гудку ветеран комбината, четверть века ходит он в этом строю. Рядом идут Михаил Захарович Жарин, Иван Иванович Могилевцев, Шая Израилевич Левит - старая кадровая гвардия. И тут же молодежь, те, что совсем недавно пришли на цементный: Коля Ткачев, Владимир Новиков, Онни Ваннэ - крепкая, надежная смена.

Все они - и старые опытные рабочие, и еще совсем молодые, но горячие и неутомимые - передовики производства, мастера по цементу. Их именами гордится комбинат.

Двадцатипятилетние

... 1933 год. На всю жизнь отложился он в памяти Николая Фомича. Он получил свидетельство об окончании технического училища и поступил в монтажную бригаду завода.

... Вспоминается погожий осенний день десятого ноября. На территории завода собрались рабочие. Вокруг кумач знамен, транспарантов, лозунгов. На возвышении стоит первый директор новорожденного завода Борис Александрович Тимофеев. Невысокого роста, в рабочей куртке, он слегка щурит темные глаза под густыми, нависшими бровями, смахивает с крутого лба упрямые черные волосы. Поздравив строителей и рабочих с пуском завода, он поднимается по лестнице к вращающейся печи обжига и там, над многоголовой толпой, разрезает заранее натянутую перед лазовым люком красную ленточку.

Запели заводские гудки. Долго и торжественно дрожали они в воздухе. Не может забыть Николай Фомич этих первых гудков: ими открывалась летопись завода, ими начиналась и его личная производственная биография.

... До самой войны шел кричевский цемент на стройки страны. Им скрепляли кирпич новых заводов Донбасса, на него ложился мрамор колонн и сводов московского метрополитена. Его делали вчерашние ученики, выпускники местного технического училища, вчерашние разнорабочие и строители.

Николай Фомич в 1935 году был уже мастером механического цеха. Он руководил работами по изготовлению запасных частей к разнообразным машинам, а чаще своими руками ремонтировал цеховое оборудование, начиная со сложных печей и мельниц и кончая маленькими сырьевыми вагонами. Со своим неизменным спутником - инструментальным ящиком - Николай Фомич ежедневно обходил завод, хозяйским взглядом осматривал каждый механизм. Здесь он чувствовал себя хозяином: знал дыхание каждой машины, каждую гайку заворачивал своими руками. Потому сдержанно улыбается он сейчас, вспоминая довоенные годы.

— Вам не приходилось на шахтах бывать? - спрашивает Николай Фомич, впиваясь в собеседника острым взглядом.—У нас в карьере работали раньше, как в шахте. Глины копали лопатами, а которые потверже, так те киркой или обушком били, по-шахтерски. Гикали днем и ночью коногоны, таская по узкоколейке вагонетки с глинами.

Так было и до войны. И другое помнит Николай Фомич, помнит, как год от года становилось на ноги хозяйство завода. Уже перед самой войной паровоз выжил конную тягу.

В первые же дни войны Николай Фомич простился с родным заводом. Мастер по цементу, он стал старшим орудийным мастером.

Несколько строк из истории пережитой войны. «В ночь с 30 сентября на 1 октября 1943 года наши войска, форсировав реку Сож, с боем овладели городом и железнодорожным узлом Кричев», — сообщало Совинформбюро.

... В ту осеннюю ночь глухой, поросшей полынью и репьем улицей, спотыкаясь от усталости, шел человек. Он спешил, быстрый шаг сменял иногда на тяжелый бег. А когда забежал в тупик и уперся в поваленную на землю изгородь, то остановился и отступил назад. Свет идущих стороной машин пробивал тьму, и тогда перед взглядом человека выделялись черные беспорядочные силуэты разрушенных зданий. Человек стоял долго и неподвижно. Потом вскинул повыше винтовку, поправил на плечах ремни вещевого мешка и пошел. На взгорбленном руинами пустыре осторожный голос остановил его:

—Кто вы?

Человек обернулся. Перед ним стояла женщина.

—Я ищу Шмыглевскую... Вы не скажете, где ее дом?

Женщина подошла вплотную к незнакомому солдату, вгляделась в его лицо.

—Здесь нет дома Шмыглевской.

Человек снова хотел идти, но женщина подбежала к нему.

—Зачем вам Шмыглевская?

—Я до войны на квартире у нее жил.

Женщина быстрым движением скрести-

ла на груди руки, пытливо заглянула солдату в глаза.

—Ты, Микола?—И повисла на крепких солдатских плечах,—Не опознала я...

Так встретил старший сержант Николай Фомич Дудыко старушку Шмыглевскую, или просто «мамашу», как звал ее.

—А вы почему не спите?

—Разве можно? Вот ходила на шоссе, солдатам молоко отнесла. А дом мой немцы сожгли. И завод-то наш вчера взорвали, перед отступлением.

—Видел, мамаша. Только что был там...

Светало. По Мстиславльскому шоссе войска двигались на запад. Туда шла и противотанковая бригада, которую догонял Николай Фомич. Он уже выходил за город, когда увидел у обочины огромную сутулую фигуру человека в полушубке и узнал в нем кузнеца механического цеха старого Луку Даниловича Олещенко. Николай Фомич остановился, окликнул бывшего сослуживца.

—Значит, освободил нас? Ну, благодарствуем тебе, дорогой,— говорил Олещенко, обнимая Николая Фомича,—На завод приходи, как войну победой закончите. Вместе завод поднимать будем...

Так оно и случилось: демобилизовавшись, Николай Фомич пришел на родной завод. Было то в 1946 году.

Восстановление завода начали с цеха обжига. Из частей двух разбитых вращающихся печей собрали одну печь, а когда перешли на монтаж сушильных барабанов, то обнаружили, что изнутри они заминированы. Мины были и в опорных колодцах, и в разбитых цементных мельницах. Работать приходилось осторожно.

Генеральный план восстановления завода предусматривал одновременную его реконструкцию. Было решено перевести работу завода на замкнутый цикл. Это означало слияние сырьевого и угольного отделений с цехом обжига, а сушильного отделения с помолом. Не нужны были сушильные барабаны: помол угля для топлива и его сушка осуществлялись одновременно в угольных мельницах. Вместо довоенных 65-метровых вращающихся печей были установлены 82-метровые печи. Производительность каждой из них в час увеличилась на 4 тонны клинкера.

ЖУКАВА Аляксандра Васілеўна, настаўніца пачатковых класаў Крычаўскай СШ № 5.

ІВАНОВА Клаўдзія Фёдараўна, настаўніца пачатковых класаў Крычаўскай СШ № 5.

ІВАНЬКОВА Лідзія Дзянісаўна, настаўніца пачатковых класаў васьмігадовай школы пасёлка торфазавода.

КАВАЛЬКОЎ Віктар Пятровіч, загадчык Юркаўскай пачатковай школы.

КІЯВІЦКАЯ Капіталіна Мікалаеўна, загадчыца навучальнай часткі Крычаўскай СШ № 5.

В.С. Банадысева.

К.Ф. Іванова.

КОТАВА Ефрасіння Архіпаўна, выхавальніца дзіцячага сада.

КУРЦІКАЎ Міхаіл Сямёнавіч, дырэктар Крычаўскай СШ № 1.

ЛАЗАРЭТАВА Еўдакія Васілеўна, загадчыца раённага аддзела народнай адукацыі.

ЛЫЧОВА Наталля Цімафееўна, настаўніца пачатковых класаў Крычаўскай СШ № 3.

МАНЕЎСКАЯ Наталля Малахаўна, загадчыца навучальнай часткі Бүдзянскай СШ.

МАЦВЕЕНКА Ганна Іванаўна, настаўніца Гарбатскай пачатковай школы.

НІКАЛАЕВА Ксенія Рыгораўна, загадчыца аддзялення пачатковай школы Крычаўскага педагагічнага вучылішча.

РАЕНТАВА Надзея Пятроўна, выкладчыца рускай мовы і літаратуры Паланіцкай СШ.

РОСЯ Альбіна Захараўна, загадчыца метадкабінета РАНА.

ЧАРКАСАВА Ірына Нічыпараўна, дырэктар Бацьвінаўскай СШ.

ШАШЭНЬКА Фёдар Амяльянавіч, загадчык раённага аддзела народнай адукацыі.

ШЫНКАРОВА Галіна Рыгораўна, выкладчыца Чавускай СШ № 2.

ШЫНКАРОЎ Павел Андрэевіч, выкладчык матэматыкі Крычаўскай СШ № 7.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

ПАНЦЯЛЕЕВА Ніна Аляксееўна, даярка калгаса «Запаветы Ільіча» (1985).

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

КАВАЛЬЧУК Аркадзь Пятровіч, машыніст экскаватара вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1983).

КАЦАПАЎ Андрэй Паўлавіч, брыгадзір футароўшчыкаў вярчальных печаў вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1981) .

СЯМЁНАЎ Аляксандр Віктаравіч, машыніст вярчальных печаў вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер».

М.Д. Бараболкін

ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК

БАРАБОЛКІН Мікалай Давыдавіч, машыніст цэментных млыноў вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1972).

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ТРАНСПАРТУ

КОЛЫЧАЎ Іван Кузьміч, машыніст вярчальных печаў вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1960).

ТРЭЙДА Віктар Лявонавіч, машыніст лістафармовачнай машыны вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1962).

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМБУДМАТЭРЫЯЛАЎ

КАРАЧЭЎСКІ Міхаіл Іванавіч, машыніст крана транспартнага цэха вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1980).

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ

МЕЛЬНІКАЎ Міхаіл Фёдаравіч, нарадзіўся 16.5.1921 г. у г. Крычаў, беларускі краязнавец. Заслужаны работнік культуры БССР (1979). Вучыўся ў БДУ. У 1939 г. - настаўнік у г. Гудаута (Абхазія). Без падстаў рэпрэсіраваны ў 1940 г. У 1950 г. вярнуўся на радзіму, працаваў у Сакольніцкай бібліятэцы, дырэктарам Дома культуры ў Крычаве. На базе сабраных ім матэрыялаў у Крычаве 15.10.1961 г. быў адкрыты краязнаўчы музей. З 1961 г. па 1982 г. ён яго дырэктар. Аўтар кніг «З сям'і сакалінай» (1973), «Апякунчае юнацтва» (1980), «Ішоў край наш

шляхам стагоддзяў» (1987), сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Барацьба і творчасць» (1967), «Песню вялі на расстрэл» (1968), артыкулаў пра выдатных дзеячаў, герояў беларускага народа ў зборніках «У рэдакцыю не вярнуўся...» (1964), «Мы не забылі вас, хлопцы» (1968), «Пабрацімы Матросава» (1984). Адзін з аўтараў «Нарысаў гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі» (1968). Напісаў больш за 250 артыкулаў пра гісторыю роднага краю ў цэнтральныя, рэспубліканскія, абласныя і раённыя газеты.

Памёр 30.6.1993 г.

«Мельников, мир с вами теснее!»

Много лет прошло, но и сегодня помню первое, заочное знакомство с Мельниковым. Я чувствовал себя героем: на районной олимпиаде по истории набрал для своей школьной команды максимум очков, рассказывая о событиях 1825 года. Домой возвращался победителем! И вот по дороге в автобусе развернул газету. Взгляд сразу выхватил заголовок: «Декабрист Игнатий Ракуза». Читал... и заливался краской; оказывается, наша деревня Ракузовка свое название получила от имени героя-декабриста, разжалованного из офицеров в солдаты, а впоследствии казненного за участие в восстании Черниговского полка... А я-то, считавший себя эрудитом, победитель районной олимпиады, об этом и не слыхивал. И стало мне стыдно от такого непростительного, кощунственного незнания своей родословной. Под статьей стояла подпись: «М. Мельников, краевед».

М.Ф. Мельнікаў

Урок запомнился навсегда. Многому научил.

Годы спустя, когда я познакомился с Михаилом Фёдоровичем лично и поведал эту историю, он сказал:

–Вот-вот, те победные очки ты «нащелкал» на широко известных, расхожих фактах. К сожалению, подобное изучение истории родного края с низким коэффициентом полезного действия нередко бытует и сегодня. Часто, например, приходится слышать такое горделивое: «У нас в школе создан музей!». Но каково содержание того музея? Репродукции, плакаты, фотографии, книги, которые легко можно купить в местном магазине. Вот и появляются музеи-близнецы и в Ракузовской, да и в столичных школах. Главное же – местный поиск. А про него забывают... Хватает безликих комнат боевой и трудовой славы и на заводах, фабриках, и в колхозах. Но на школе вина особая, за то вина, что плохо учит она, что история (всемирная история!) оставила свои следы не только в виде далёких величественных пирамид Хеопса, но и в привычно неприметных курганах за околицей родной деревни, на чердаке старой хаты, в памяти земляков. Гражданин, патриот формируется с детства...

Тому примером жизнь – сложная, трудная жизнь самого Михаила Фёдоровича.

В далекие тридцатые годы отец его работал техником по сельскому хозяйству и брал сынишку в частые поездки. Тогда уже любознательный мальчонка заметил: что ни деревня, то всегда в ней есть свое, неповторимое. А история творилась на его глазах: как раз шла коллективизация. Время было суровое, всякое случалось – в Малятичах, например, кулаки покушались на жизнь отца. Классовая борьба продолжалась. А об истоках ее рассказывала, например, случайно найденная церковно-приходская книга. Сколько ярких примеров борьбы кричевских крестьян за социальную справедливость нашел он в ней. Уже тогда вместе со школьными товарищами Н. Кривоносовым и Г. Смоляковым Михаил задумал создать музей. Начали собирать документы, экспонаты.

Война перечеркнула планы. Погибли

друзья: Николай под Ленинградом, Григорий в Прибалтике. Самому Михаилу Федоровичу суждено было вернуться домой только в пятидесятом. Однако мечта о создании музея в родном городе не оставляла. Тогда-то и услыхал Мельников поразившую его историю. Рассказывали, будто во время оккупации кумир довоенных мальчишек, столичный певец Александр Окаемов (первый исполнитель знаменитой песни «Орленок») сотрудничал с гитлеровцами. Вместе с ним называли и имя главного хормейстера Московской филармонии Геннадия Лузенина.

... Не может быть! Сердцем чувствовал Михаил Федорович, что клевета замарала память честных художников. И он решил докопаться до истины. Так начался долгий, упорный поиск, один из многих, которым посвятил годы краевед Мельников.

Нелегко было восстановить правду. Но постепенно картина прояснилась.

Отыскал Михаил Федорович и оригинал стихотворения, написанного за час до казни подпольщиком Иваном Денисенко, журналистом и поэтом. Те страстные строки с комментарием Мельникова напечатала газета «Правда». Начиналось стихотворение так:

Если имя твое солдат,
До конца будь солдатом, брат.

А вот как заканчивалось:

Сделал я для Отчизны, что мог,
От врагов ее счастье берег,
За нее я стоял средь огня,
И она не забудет меня.

Да, Родина не забыла своих верных сыновей: А.И. Окаемов, Г.П. Лузенин, И.Ф. Денисенко были посмертно удостоены медалей «За отвагу», их именами названы улицы в Кричеве. А в трех километрах от города, на месте гибели артистов-патриотов, возведен памятник.

Таков итог лишь одного поиска краеведа. Лишь одного... Сегодня в Кричеве каждая четвертая улица названа фамилиями героев революции, войны и труда, материалы о которых Михаил Федорович искал вместе с активистами музея. Активно сотрудничали с кричевскими краеведами старые большевики О.Б. Лепешинская, В.А. Радус-Зенькович, К.М. Кривоносов, маршалы С.С. Бирюзов, А.И. Еременко, М.В. Захаров... А сколько местных жителей!

Современный краевед, убежден Михаил Федорович, не замкнутый в себе Пименлетописец; краеведение – огромная воспитательная сила, радиус которой должен все время расширяться, вовлекая в свою сферу все новых и новых людей. Поэтому Мельников постоянно повторяет, что сама по себе экспозиция не имеет цены, обладай она даже самыми редкостными реликвиями, если вокруг нее не ведется работа, пропаганда с помощью документов, экспонатов. Вот почему так заинтересованно, безотказно помогает он энтузиастам из окрестных деревень, школ, колхозов, предприятий, где созданы либо создаются музеи.

Страстной любовью к истории Михаил Федорович зажег и своих детей. Наталья, например, недавно заменила отца, заслуженного работника культуры БССР, персонального пенсионера, на ответственном посту директора музея. Чему учится она у Михаила Федоровича?

–... Прежде всего, – говорит Наталья Михайловна, – работе с экспозицией, пропаганде собранных богатств. По-хорошему завидую его умению писать: у отца множество статей в различных газетах и журналах, два сценария документальных фильмов, есть сборник очерков о наших знаменитых земляках. А как он ведет экскурсии!

Я и сам видел: первый вопрос, который Михаил Федорович задает посетителям, — про то, откуда они. А далее всю экскурсию строит на материалах о связях истории Кричева, Восточной Беларуси с историей той области, республики, а то и страны, откуда приезжают экскурсанты. Вот и появилось в книге отзывов восхищенное: «Мельников, мир с вами теснее!». И причина тому – выдающаяся эрудиция краеведа, великолепная экспозиция музея, собранного постоянными заботами этого неугомонного подвижника и его помощников.

В одном из академических журналов говорится о Кричевском музее: «Экспозиция музея оказывает большое воздействие на посетителей, а некоторые собранные в нем

документы были использованы в научных журналах».

Добавим: не только в них. Так, когда Михаил Федорович восстановил имя воина, который один сражался против танковой колонны гитлеровцев в течение нескольких часов, известный белорусский поэт Алексей Пысин написал стихотворение «Артиллерист», посвященное подвигу Николая Сиротина. Или такой пример: во время постановки областным драмтеатром пьесы о подполье Мельников организовал для актеров встречу с былыми подпольщиками и узниками лагеря смерти. А после премьеры драмы о народном восстании на Кричевщине под руководством Ващилы прозвучала такая фраза: «Если Юрий Семеняко – музыкальный отец пьесы, то Михаил Мельников – исторический...» Зал встал и зааплодировал.

Несмотря на нездоровье, немалые уже годы, Михаил Федорович в поиске, в работе. Во время одной из наших встреч я спросил:

–Какие тайны истории занимают вас сейчас?

–Поле истории необозримо. В моем досье более четырехсот папок. В них факты о людях и событиях. Работаю одновременно над многим: завершаю документальную хронику о чекистах послевоенного времени, ищу убедительные доказательства, подтверждающие некоторые мои гипотезы. Например, что путешественник Афанасий Никитин умер на могилевской земле под Славгородом, что Микола Гусовский – уроженец наших мест... Одним словом, замыслов много, дала бы судьба их осуществить. Поисковая деятельность и работа с людьми, пропаганда собранных богатств – вот два крыла краеведения. На них и держусь...

Смерть разрушила все замыслы.

А. Улитенок

Советская культура. 1986 г., 13 марта.

ЗАСЛУЖАНЫ РАЦЫЯНАЛІЗАТАР

ШАПАВАЛАЎ Іван Паўлавіч, майстар электрацэха вытворчага аб'яднання «Крычаўцэментнашыфер» (1968).

ЗАСЛУЖАНЫЯ УРАЧЫ

БЯЛЯЎСКІ Мікалай Восіпавіч, загадчык аддзялення пералівання крыві (1975).

РАДЗЕЦКІ Іван Андрэевіч, урач-хірург (1966).

ЗАСЛУЖАНЫ МЕДЫЦЫНСКІ РАБОТНІК

СКАРАХОДАВА Ніна Паўлаўна, фельчар здраўпункта Крычаўскага завода гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР.

ЗАСЛУЖАНЫ ЮРЫСТ

ПАСТРЭВІЧ Іван Пракопавіч (гл. раздзел «Генералы»),

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

КРЫВАНОСАЎ Міхаіл Пятровіч, н. 1.5.1929 г. у г. Крычаў. Беларускі спартсмен і трэнер па лёгкай атлетыцы (кіданне молата). Заслужаны майстар спорту СССР (1954). Заслужаны трэнер БССР (1965), заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР (1971). Кандыдат педагагічных навук (1971). Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры (1953). З 1976 г. прарэктар па навучальнай рабоце Беларускага інстытута фізічнай культуры. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў (1956, Мельбурн, Аўстралія). Чэмпіён Еўропы (1954, Берн). Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы (1958, Стакгольм). Чэмпіён СССР (1952, 1954–58). Аўтар навучальных дапаможнікаў па лёгкай атлетыцы.

М.П. Крываносаў

ЛАЎРЫНЕНКА Наталля Пятроўна, нарадзілася ў 1978 г. у г. Крычаў. Чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь 1995–2000 гг. у складзе васьмёркі па грэблі. Бронзавая прызёрка Алімпійскіх гульняў у Атланце 1996 г. Заслужат майстар спорту Рэспублікі Беларусь па грэблі.

Яны нарадзіліся на Крычаўшчыне

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

КІСЯЛЁУ Кузьма Венядзіктавіч, нарадзіўся 1.11.1903 г. у в. Лабковічы. Дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат. Кандыдат медыцынскіх навук (1936). Скончыў Варонежскі універсітэт (1928). З 1928 г. на навуковай рабоце. З 1937 г. нарком аховы здароўя БССР. У 1938–1940 гг. старшыня Савета народных камісараў БССР. З 1940 г. намеснік дырэктара Інстытута эксперыментальнай медыцыны, дырэктар дзяржаўнага медыцынскага выдавецтва (Масква), старшыня Ульянаўскага аблвыканкома. З снежня 1943 г. 1-ы намеснік старшыні СНК БССР, з сакавіка 1944 г. намеснік старшыні СНК БССР (да 1958) і міністр замежных спраў БССР. У 1966–1977 гг. саветнік СМ БССР. Член бюро ЦК КПБ у 1938–1940 гг., 1947–1949 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1937–1958 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1938–1967 гг.

Памёр 4.5.1977.

Н.П. Лаўрыненка.

М.М. Мяшкоў.

МЯШКОЎ Мікалай Максімавіч, н. 11.5.1922 г. у г. Крычаў. Дзяржаўны дзеяч БССР. Кандыдат гістарычных навук (1953), прафесар (1969). Скончыў БДУ (1949), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1953). Удзельнік Айчыннай вайны. З 1942 г. на грамадскай і партыйнай рабоце ў Таджыкістане. З 1953 г. намеснік дырэктара, дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, загадчык аддзела навукі, навучальных устаноў і школ ЦК КПБ, дырэктар Мінскай вышэйшай партыйнай школы. З 1958 г. міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага савета БССР, членам ЦК КПБ. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ

АЛЯКСЕЕНКА Міхаіл Міхайлавіч, нарадзіўся 16.10.1949 г. у вёсцы Дарагая. Скончыў Бацьвінаўскую сярэднюю школу, Мсціслаўскае СПТВ. Працаваў трактарыстам у калгасе «Памяць Леніна», звеннявым па вырошчванню льну. За самаадданую працу яму была прысуджана ў 1978 г. Дзяржаўная прэмія СССР.

ЛАБУШКІН Сяргей Фёдаравіч, нарадзіўся 10.05.1930 г. у вёсцы Бель 1-я. Вучыўся ў Бельскай няпоўнай сярэдняй школе. З 1944 г. палявод у мясцовым калгасе. У 1946 г. скончыў курсы механізатараў пры Крычаўскай МТС, стаў працавадь трактарыстам у калгасе імя XXII з'езда КПСС, потым узначаліў механізаванае звяно па вырошчванню льну.

За выдатныя паказчыкі ў працы двойчы ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973, 1982), ордэнам Леніна (1986). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1978).

М.М. Аляксеенка.

С.Ф. Лабушкін.

НАВУКОЎЦЫ, ТВОРЦЫ

АНЦІПЕНКА Лявон (Леанід Міхайлавіч), нарадзіўся 25.01.1935 у в. Цінькаў. Закончыў Бацьвінаўскую СШ (1953), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага – гісторыка-філалагічны факультэт (1959). Потым тры гады працаваў дырэктарам Ракашыцкай школы Уздзенскага р-на. З 1963 г. – літаратурны супрацоўнік, загадчык сельгасаддзела шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт». З 1965 г. працуе намеснікам рэдактара, з 1975 г. – рэдактарам гэтай жа газеты. Жыве ў Шклове. Член СЖ РБ.

Першыя свае байкі надрукаваў у чэрыкаўскай раённай газеце (20 мая 1954 «Мядзведзь і самакрытыка»). Потым яго байкі, сатырычныя і лірычныя вершы, пародыі, апавяданні друкаваліся ў газетах «Магілёўская праўда», «Звязда», «ЛіМ», «Чырвоная змена», у часопісах «Вожык», «Полымя», «Беларусь» і іншых перыядычных выданнях. Сааўтар калектыўных зборнікаў «Вожык» у дарозе» (1966), «Беларуская байка» (1986), «Асцюкі за каўняром» (1989), «Ранішняя дарога» (1990) і інш. Выдаў зборнік вершаў, эпіграм і пародый «За лугамі, за ракою» (1994).

Мядзведзь і самакрытыка
(Байка)

У гушчары
Сабраліся звяры.
Як наступіла цішыня на зборы,
Мядзведзь сказаў: – Сябры мае,
Зайцы мне скардзіліся ўчора –
Ім Воўк праходу не дае.
Ён крыўдзіць іх на кожным кроку,
Няма спакою ім – бяда!
Я так мяркую: зараз Воўку
Дадзім мы слова, грамада,
Няхай сябе пакрытыкуе наймацней,
Каб самакрытыка яго прабрала да касцей.

...І ў гушчары
Аж да зары
Ваўчуга кляўся,
Зайцоў не крыўдзіць даў зарок.
Назаўтра ж зноў сваім заняўся –
Ваўком застаўся Воўк.

Кіраўнікоў я ведаю такіх,
Што не прымаюць мер крутых
Да тых,
Што у грахах клянуцца,
А выпраўляць іх – не імкнуцца.

БУГАЁЎ Дзмітрый Якаўлевіч, нарадзіўся 12.1.1929 г. у в. Сычык. Беларускі крытык і літаратуразнавец. Член саюза беларускіх пісьменнікаў. Кандыдат філалагічных навук (1960). Прафесар (1987). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1952). Пасля вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1952–1955), выкладаў беларускую літаратуру ў Мазырскім педагагічным інстытуце (1955–1959), з'яўляўся навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР (1959–1964). З 1964 г. працуе ў Белдзяржуніверсітэце. Выйшлі кнігі: «Шчодрае сэрца пісьменніка» (1963), «ПаэзіяМаксімаТанка» (1964, 2-е выданне 2003), «Удадзімір Дубоўка» (1965), «Максім Гарэцкі (1968, 2-евыданне 2003), «Шматграннасць» (1970), «Талент і праца» (1979), «Праўда і мужнасць таленту» (1995), «Спавядальнае слова» (2001) інш., аўтабіяграфія «Жыццём ідучы...» (1995). Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа ў 1984 г. за кнігу крытычных нарысаў «Талент і праца».

Згадваючы бацьку...

Мой бацька быў звычайным селянінам, зусім непісьменным. Але ў афіцыйных паперах яго называлі, як якога-небудзь цара, Бугаёў Якаў Якімавіч Першы. У іх сям'і былі яшчэ Іван, Куліна і Яшка. Так звалі ў побыце самага малодшага з сыноў майго дзеда па бацькавай лініі. Але па дакументах Яшка таксама ішоў як Якаў Якімавіч, але ўжо не Першы, а Другі. Два ж Якавы ў адной сям'і атрымалася таму, што імя давалі тады строга па царкоўным календары. Дык Якаў воляю лёсу дастаўся і майму бацьку, і ягонаму брату.

Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Дзмітрый Бугаёў.

78. Зак. 808.

Дарэчы сказаць, Яшка, хоць, па прызнанні вяскоўцаў, ён быў самым недалёкім з братоў, адзін уцалеў пры бальшавіцкіх рэпрэсіях і памёр ужо зусім старым і нямоглым на руках у сваіх сямейнікаў.

Вельмі нялёгкая доля выпала і бацькавай сястры Куліне, казалі, надта падобнай наяго. Гэтая сардэчная, надзвычай спагадлівая жанчына (па мужу яна стала Логінавай) у цяжкія часы часта адведвала нас, хоць жыла далекавата – у вёсцы Гарадок, размешчанай кіламетраў за дзесяць ад нашых мясцін. Куліна заўсёды прыносіла кожнаму з малых пляменнікаў, якія сталі бязбацькавічамі, нейкі гасцінец – цукерку, пернік (тады ў вёсках тэта было рэдкасцю), колькі яблыкаў і вельмі смачных ігруш-дуляў. Мне асабліва запомніліся вялікія, падобныя на мужчынскія, рукі цёткі Куліны, амаль заўсёды чырвоныя ад пастаяннага працоўнага напружання.

Але вярнуся да Яшкі. Яго я добра ведаў у розныя часы, а таму магу ўпэўнена сцвярджаць, што пры ўсёй праставатасці хітраваць і прыстасоўвацца ён умеў. Відаць, якраз гэтага ўмення нестава ла ні майму бацьку, ні яго брату Івану, які таксама быў рэпрэсаваны і згінуў недзе ў гулагаўскіх нетрах.

А.А. Бугаёва.

Абставіны склаліся так, што свайго бацьку я ведаў мала, ва ўсякім разе, далёка не так, як таго Яшку. І дакладныя даты, звязаныя з бацькам, узяў не з памяці, а з судовай справы, якая захоўваецца ў Магілёўскай абласной пракуратуры. Пазнаёміцца з гэтай справай я атрымаў магчымасць толькі ў 1994 годзе. Там я вычытаў, што нарадзіўся бацька ў 1885 годзе. Дзень і месяц нараджэння мне невядомы і цяпер. Але дакладна ведаю, што нарадзіўся ён у вёсцы Губіншчына. У даваенныя гады (маю на ўвазе вайну Айчынную) яна належала да Горкаўскага сельсавета Чэрыкаўскага раёна. У перыяд хрушчоўскіх перакройванняў, калі Чэрыкаўскі раён далучаўся да Крычаўскага, Горкаўскі сельсаветзліваўся з суседнім Бацьвінаўскім, ужо на Крычаўшчыне. З цягам часу Чэрыкаўскі раён быў адноўлены, але сельсавет у Горках не аднавілі. Таму і Губіншчына засталася ў Крычаўскім раёне.

Некалі гэта была вялікая вёска. Адным сваім канцом яна выходзіла да маляўнічай і паўнаводнай тады ракі Воўчас (прыток Сажа). Старая Губіншчына адчувала перанаселенасць. Калі здараўся пажар, дык ён вынішчаў у губіншчанцаў не адну хату і гаспадарку. Аднойчы гарэў і набытак маіх бацькоў. Я сам гэтага не памятаю (мусіць, тое было яшчэ да майго з'яўлення на свет), але ведаю пра тую бяду з матчыных успамінаў.

У 20-я гады мінулага стагоддзя мясцовыя ўлады ў адпаведнасці з агульнай бальшавіцкай палітыкай заахвочвалі стварэнне хутароў і пасёлкаў. Сталі падавацца на болын вольны прастор і многія губіншчанцы. Так узніклі пасёлкі Асінаўка, Падабак, Ліпкі, Майскі, Чырвоны, Сычык і іншыя. Усе яны ствараліся перасяленцамі і Губіншчыны, а сама яна паступова страчвала сваю прэстыжнасць, якая патроху, але няўхільна пераходзіла да Сычыка. І ўрэшце ён перарос у вёску на пяцьдзесят з лішнім двароў, бо стаў цэнтрам калгаса. Пасля Айчыннай вайны там ужо быў і магазін, у які прыходзілі і жыхары старой Губіншчыны, бо свайго магазіна (лаўкі) у іх не стала. Пасля Чарнобыльскага

выбуху і Губіншчына, і Сычык, і ўся Чэрыкаўшчына, як і болынасць раёнаў Магілёўшчыны, сталі зонай экалагічнага бедства, пра што я ведаю больш з гаворак сваякоў ды нешматлікіх знаёмых, якія дажываюць свой век у пакутах, бо ў родных мясцінах нахапаліся радыяцыі.

Жыццё маіх бацькоў памятаецца мне не па Губіншчыне, у якой я нарадзіўся, а па невялікім пасёлку Быкоўка. Увогуле, у маім пашпарце і ў біяграфічных даведках, якія змяшчаліся ў друку, пазначана, што я паявіўся на свет у вёсцы Сычык. Маці ж казала (так запісана і ў маіх метрыках, выдадзеных у 1936 годзе), што я нарадзіўся ў вёсцы Губіншчына. Мая дзіцячая памяць ніякіх уражанняў ад Губіншчыны не захавала. І гэта не выпадкова – бацькі пакінулі Губіншчыну ў хуткім часе пасля майго нараджэння. Разам з сем'ямі япічэ пяцярых губіншчанцаў яны ў тым жа 1929 годзе стварылі пасёлак Быкоўку, якая праіснавала толькі адно дзесяцігоддзе. У 1939 ці 1940 годзе пасёлак быў ліквідаваны, а яго жыхароў перасялілі ў вёску Сычык.

Пасёлак Быкоўка быў размешчаны каля маляўнічага балота, у якім яшчэ і на маёй памяці вадзіліся качкі, кулікі (у нас іх называл! дзікімі баранамі), зрэдку пракідаліся журавіны. Побач быў добры лес. У ім раскашавалі магутныя дубы і вельмі прыгожыя клёны, якія давалі дужа смачны сок – кляновік. Гэтыя дрэвы падыходзілі да самых хат, а ў Яшкі раслі і на двары. (Ягонае селішча было крайнім ад лесу). Памятаю таксама тоўстыя бярозы, ад якіх ранняй вясной набіралі поўныя вёдры бярозавіку. Восенню чырванелі вялікімі гронкамі ладныя рабіны. У розныя поры года радаваў вока гаманлівы асіннік, вусцішна шумеў пры ветраным надвор'і змрочны ельнік. Мясціны былі багатыя на грыбы, у тым ліку на баравікі. На сонечных прагалах расло шмат суніц.

Пазней усё гэта знікла. Бо лес бязлітасна вынішчылі. Спрабавалі асушаць і балота. Ваду спусцілі ў лагчыну пад назвай Яросвін. Але ўрадлівага поля на месцы былой балотнай раскошы чамусьці не атрымалася. Нават добрая трава там не хацела расці. Буяла толькі грубая асака, якую не жадалі есці ні коні, ні каровы, ні авечкі. Скошаная, гадзілася яна толькі на подсціл жывёле ды зрэдку ішла на сечку, калі з нармальным сенам станавілася тугавата.

У Быкоўцы, яшчэ не спаган «най людской прагнасцю, і прайшло маё дзяцінства, шчодрае толькі на ўражанні ад прыроднага хараства навакольных мясцін, якое, мусіць, заўсёды будзе хваляваць жывую чалавечую душу.

Засмучала ў гэтых адносінах , здаецца, толькі адно – што ў бацькі не было сапраўднага саду. Думаю, што ён з мужыцкай практычнасцю бярог зямлю і на прысядзібным пляцы для больш рацыянальных патрэб – для бульбы, канопляў і, вядома, гародніны.

Каля самай хаты і гаспадарчых пабудоў ды каля плоту, якім адгароджвалася сядзіба ад дарогі праз пасёлак, расло некалькі вялікіх і вельмі ўраджайных кустоў іргі (яе часам завуць беларускім вінаградам), радавалі вока шэраг слiў і тры моцныя ігрушы-паўдзічкі, надта прыгожыя ў шчодрай квецені вясною. Яны таксама кожнае лета давалі багата пладоў, якія станавіліся прыдатнымі для яды пасля дорбрай лёжкі. А яшчэ іх можна было сушыць, што маці заўсёды і рабіла. Сялянская печ для гэтага вельмі падыходзіла. Зімою тыя сушаныя грушы былі ці не найболыпымі нашымі прысмакамі.

З Быкоўкі нам, аднак, давялося пераязджаць.

Загад аб перасяленні маці ўспрыняла як вестку пра вялікую бяду і не адзін раз паўтарала, што ўсяго два перасяленні роўныя пажару. Трэбы ж было перацягваць на новае месца і знізу падгнілую хату, і таксама не новыя гаспадарчыя пабудовы. Ды і зямля на новым месцы няўгноеная. Колькі гадоў яна будзе радзіць слаба. А самае галоўнае, што ўвесь цяжар перасялення клаўся на матчыны плечы, бо ў нас тады ўжо не было бацькі.

Не захавалася ў нас ад яго самога і якіх-небудзь дакументаў. Нават ягонай фотакарткі не было і ў даваенныя гады. Маці казала, што быў ён светлавалосы. Сама яна ў маладосці мела чарнявае аблічча. З дзяцей да сталага ўзросту дажыло шасцёра (цяпер засталіся толькі я ды адзіная ў нас сястра Лена). Бацькаву знешнасць атрымалі зноў жа я ды старэйшы за мяне брат 1923 года

нараджэння Іван. Астатнія чацвёра пайшлі па маці.

Але ў пэўным сэнсе мы ўсе раслі і выбіваліся ў людзі як матчыны, Гапкіны, калі казаць зусім дакладна, дзеці. Гапкай вяскоўцы называлі нашу маці, якая і ў маіх метрыках, выдадзеных для паступлення ў школу ў 1936 годзе, запісана як Бугаёва Гапка Антонаўна. Афіцыйнае ж імя – Агаф'я. Яна нарадзілася ў 1889 годзе, памерла ў 1967-м. такім чынам, яна пражыла 78 гадоў, зведаўшы цяжкасці неймаверныя.

Вядома, сам час, які выпаў на яе долю, аказаўся вельмі скрушлівым, поўным вялікіх грамадскіх катаклізмаў. Але гэта бяда агульная. Для маёй маці яе шматразова ўзмацніў горкі бацькаў лёс.

Але спачатку і ён нічога благога не прадвяшчаў. Бацька ўдзельнічаў у першай сусветнай вайне, вярнуўся з яе жывым (ніякіх канкрэтных падрабязнасцей пра яго ўдзел у той вайне не ведаю).

Як і абсалютная большасць сялянства, мой бацька да калектывізацыі паставіўся насцярожана. Але ўсё ж у 1931 годзе ў калгас уступіў. Настаяла маці, якая лепш за бацьку разумела, што іншага выйсця няма.

19 красавіка 1933 года бацьку арыштавалі, паставіўшы маці ў становішча жахлівае. На яе руках заставалася куча дзяцей. І ўсе, за выключэннем самага старэйшага сына, малалеткі. Івану было дзесяць гадоў, Мішу, які загіне на фронце ў Айчынную вайну, – сем, мне – чатыры, Лене – адзін год. А небарака Аляксей увогуле яшчэ ляжаў у калысцы, бо нарадзіўся ў тым жа 1933 годзе, незадоўга да арышту бацькі.

Страшна такое ўспамінаць, але маці пад старасць казала, што ад роспачы яе адольвала спакуса прыдушыць апошняга сына, паклаўшы яму падушку на галаву. Ды кожны раз перамагала боязь узяць на душу непапраўны грэх. А хіба ж яна, наша вялікая гаротніца, не любіла сваіх дзяцей? Яшчэ як любіла! Яна маладая выйшла замуж, доўга чакала першынца, потым некалькі хлопцаў і дзяўчатак пахавала (часта згадвала іх у сваіх малітвах), а ўжо тых, што выжылі, старалася ўсяляк берагчы. І раптам такая навала, якая магла раздушыць каго хочаш. А потым беды сыпаліся адна за другой, як з рога. Дык ці трэба дзівіцца, што неаднойчы ўзнікала і думка пра самагубства, ды маці яе адганяла, зноў жа баючыся граху перад Богам.

Тыя, што арыштоўвалі невінаватага чалавека, асуджаючы на пакуты яго сям'ю, Бога не баяліся. Яны выслалі бацьку на пяць гадоў «за агитацию и вредительство в колхозе». Гэта цытата з бацькавай судовай справы, той, што захоўваецца ў магілёўскай абласной пракуратуры.

Пра тое, у чым заключалася шкодніцтва і якую канкрэтна агітацыю праводзіў непісьменны чалавек, у судовай справе нічога не гаворыцца. Але маці была пераканана, што яго пагубіў уласны жарабок, набыты незадоўга да калектывізацыі, як быццам лепшы ва ўсім навакольлі. Бацька вельмі ганарыўся ім, не хацеў аддаваць у калгас, але мусіў гэта зрабіць. Відаць, ён увогуле захапляўся коньмі, бо ў калгасе атрымаў пасаду конюха. «Свайго» жарабка ён, сцвярджалі самыя пільныя зайздроснікі, даглядаў лепш, чым іншых кагласных коней. У гэтым і было ўсё шкодніцтва.

Пакаранне бацька адбываў у Дзмітраўскім ВПЛ. Разам са сваім братам Іванам, які ў судовай справе памылкова названы пляменнікам, будавалі яны канал Масква – Волга.

27 чэрвеня 1936 года пастановай Асобай нарады НКУС прысуд у дачыненні да бацькі быў перагледжаны. Тэрмін высылкі яму зменшылі «до отбытого срока». Так бацька апынуўся на волі.

Я добра памятаю, як аднойчы пахмурным летнім ранкам, які адразу зрабіўся для нас святочным, ён прыйшоў дамоў. Мы не маглі нацешыцца ад усведамлення, што цяпер і ў нас ёсць бацька. Цэлы дзень (і можа не адзін) ішлі людзі, вялі з бацькам доўгія гамонкі. З тых гамонак мне запомніліся словы пра канал і яшчэ пра тое, што бацьку выклікаў Галадзед, які, як вядома, у той час яшчэ ўзначальваў беларускі ўрад. Як удалося выйсці на Галадзеда, я не ведаю. Не памятаю і таго, ці ўпамінаў бацька ягоную пасаду. Але само гэтае прозвішча засела ў маёй памяці назаўсёды.

Святочны настрой, прынамсі для мяне, трымаўся, аднак, нядоўга. У хуткім часе бацька зноў стаў дагладаць калгасных коней.

Мясцовыя кіраўнікі не пабаяліся яшчэ раз даручыць такую справу «шкодніку». Відаць, добра ведалі сапраўдную цану тым абвінавачванням...

Догляд у летнюю пару заключаўся галоўным чынам у тым, што коней трэба было пасвіць. Статак быў даволі вялікі. І бацька ў якасці свайго памочніка ўзяў мяне. Тады мне было ўжо сем гадоў. А па вясковых звычках гэта самы час падключацца да сур'ёзнага занятку. Але падпасак з мяне атрымаўся далёка не ідэальны. Залюбаваўшыся якой-небудзь прыроднай з'явай, я мог не заўважыць, як найбольш збродлівы конь падаваўся ў шкоду. За такія міжвольныя прамашкі і ўвогуле за любую нядбаласць бацька караў жорстка, без скідкі на дзіцячы ўзрост і маю прыроджаную ўражлівасць. Сырамятная пуга, разлічаная на тоўстую конскую скуру, хадзіла па маіх голых лытках так, што я не аднойчы з крыўдай думаў: «А навошта нам такі бацька?» Спрабаваў скардзіцца маці, тая ўшчувала бацьку, але ён ад свайго не адступаўся. Мабыць, у гэтым праяўлялася не толькі сялянская натура, нязвыклая да сентыментальнасці, але і суровая жыццёвая школа, пройдзеная ў заняволенні.

Які не быў бацька строгі, але жыццё з яго прыходам палепшылася. У вельмі ўраджайным 1937 годзе мы атрымалі з калгаса на працадні шмат збожжа (адзін раз на маёй памяці). Яно дасушвалася ў нас на печы. Дык я добра памятаю тое багацце. Аднак бацьку спажываць зроблены ў асноўным ім самім хлеб не давялося – яго зноў арыштавалі. На гэты раз, як сведчыць судовая справа, 1 верасня 1937 года.

Арыштоўваць прыйшоў раніцай міліцыянер у форме. Бацькі дома не было. Ён быў пры конях і яшчэ не вярнуўся з начлегу. Знайсці месца начнога выпасу калгаснай жывёлы ў ладных лясных абшарах узяўся Маскалёў Іван. Ён, напэўна, мог бы па-суседску сказаць бацьку пра небяспеку і тым самым дапамагчы яму неяк уратавацца, але не зрабіў гэтага, а здаў міліцыянеру.

І бацьку свайго мы больш не ўбачылі. А ратунак быў, здаецца, рэальнай справай. Ва ўсякім разе, людзі, якія падлягалі арышту, але перахаваліся ў час таго «хапуна», потым адкрыта жылі дома. І іх ужо не чапалі.

А можа, бацька сам не захацеў хавацца, усё яшчэ верыў у нейкую справядлівасць? Гэткая думка ўзнікла, калі я прыгадаў, што маці, як бы прадчуваючы нешта нядобрае, раіла бацьку ў хуткім часе пасля вяртанйя з Дзмітраўскага лагера не ісці ў калгас, а з'ехаць некуды, хоць бы і ў Крычаў, напрыклад, на цэментны завод – там заўсёды патрэбны былі рабочыя рукі. Але бацька адмовіўся. Ён некалі быў вельмі моцным чалавекам, калі меркаваць хоць бы па сундучку, які служыў яму ў высылцы замест чамада- на і застаўся ў нас пасля паўторнага арышту. Той сундучок, зроблены не з фанеры, а з танкаватых дошак, і пусты важыў нямала. А бацька ж насіў яго не пустым. Ён хаваў там усе свае «зэкаўскія» набыткі. Відаць, шмат здароўя адабраў канал. Во я і сам чуў, як бацька ноччу цішком скардзіўся маці, што ў яго пачынаюць пухнуць ногі...

А можа, спрацавала славутая беларуская талерантнасць, якая на практыцы вельмі часта ператвараецца ў абыякавасць да ўласнага лёсу?

Увогуле, бацькава справа выклікае цэлы шэраг пытанняў. Пачну з таго, што ордэр на арышт быў выдадзены чэрыкаўскімі ўладамі яшчэ вясною, у красавіку месяцы. А сам арышт, як я ўжо казаў адбыўся 1 верасня. Значыць, некалькі месяцаў міліцыя дабіралася з Чэрыкава да Быкоўкі. А гэта ўсяго нейкіх 18 кіламетраў... Чаму так доўга цягнулі з арыштам? Нехта спрабаваў да апошняга моманта ратаваць бацьку? А можа ўлічвалі, што ў калгасе вясною шмат працы, дык з-за гэтага знарок не спяшаліся арыштоўваць? Ці вельмі вялікая нагрузка была на карныя органы?..

Судзіла бацьку ў 1937 годзе тройка НКУС БССР у складзе ... двух чалавек. 5 лістапада яна прызнала, што бацька быў кулаком, выступаў «против мероприятий партии и правительства», і пастанавіла: «заключить в исправительный лагерь сроком на десять лет».

Тэрмін вылічаўся з 1 верасня, г. зн. з дня арышту.

Ужо ў той дзень (1.9.37) бацька быў дастаўлены ў магілёўскую турму. У віну яму зноў ставілі контррэвалюцыйную агітацыю, маўляў, гаварыў што ў калгасе працуюць

толысі дурні, сам працаваў, але заявы ў калгас не падаваў, сцвярджаў, што хутка будзе вайна і савецкая сістэма разваліцца, заклікаў не падпісвацца на абаронную пазыку. Гэта запісвалася са слоў крывадушных сведкаў.

У адзіным пратаколе допыту, які адбыўся 6 і 7 лістапада, рабіўся закід, нібыта яшчэ да калектывізацыі ён, Бугаёў Якаў, трымаў парабкаў. Непісьменны селянін добра зразумеў, куды хіліць такі закід, і запярэчыў, што быў толькі адзін парабак на час сезонных работ і не ў яго самога, а ў ягонага бацькі.

На абвінавачванне, што «умышленно выводил колхозных коней из строя зимой 1936 г.», бацька зноў запярэчыў: «верно, работал на лесовозе, но коней колхозных из строя не выводил».

Нашы сяляне сапраўды кожную зіму мусілі выконваць цяжкую павіннасць: некалькі тыдняў цягаць з Васілеўшчыны да сплаўных пунктаў на Сажы будаўнічы лес, які ішоў у розныя куткі краіны, у тым ліку ў Данбас. Называлася гэта ехаць у калоды, бо там, на лесавывазцы, сяляне ўвесь тэты час і жылі, адарваныя ад сем'яў. Здаралася, што і гінулі. А цяпер гэтае шчыраванне на дзяржаву паварочвалі як абвінавачванне!

Ды бацька прызнаў сябе вінаватым толькі ў тым, што ў 1933 годзе быў «судим по подозрению в агитации».

Прачытаўшы гэтыя радкі пратакола, запісаныя са слоў непісьменнага бацькі, я ажно сцепануўся: такая мужнасць і непахіснасць ужо ў 1937 годзе! Нездарма адзін наш вясковец пасля смерці Сталіна і, вядома, без сведкаў, казаў, што бацька быў не толькі вельмі працавіты, але і надта сумленны, справядлівы чалавек. Гэты вясковец – Кастусь Палякоў.

Вяртаючыся да бацькавай судовай справы, не магу не сказаць, што 16 снежня 1940 года яна пераглядалася. Людзі, якія ажыццяўлялі гэты пераглад, ніякіх няўвязак у ёй не ўбачылі. І вырашылі «жалобу оставить без удовлетворения».

Такая фенаменальная слепататагачасных юрыстаў выпадковай быць не магла. Яна, відаць, азначала, што бацькі тады ўжо не было на гэтым свеце. Ягоны прысуд на дзесяць гадоў лагернага зняволення ці не суправаджаўся не зафіксаваным на паперы дадаткам – «без права переписки», якім тады па-фарысейску камуфліраваўся расстрэл?.. Ва ўсякім разе, мы ніякіх звестак ад свайго бацькі пасля другога прысуду ўжо не мелі. А пасля першага арышту і высылкі лісты, як казала маці, вельмі рэдка, але прыходзілі.

І яшчэ адно пытанне ўзнікае. Якая скарга разглядалася ў 1940 годзе? Хто тады мог скардзіцца на «самы справядлівы ў свеце савецкі суд»? Гэта таксама быў бы яўны крымінал. А вось прашэнне аб памілаванні бацькі сапраўды было. Яно пісалася на імя самога Сталіна і так падавала трагедыю сям'і, пазбаўленай кармільца, што, здавалася, магло расчуліць і халодны камень. Гэтае прашэнне доўга шліфавалася рознымі людзьмі і таму неаднойчы зачытвалася ў прысутнасці ўсіх нас. І мы кожны раз плакалі пры гэтым горкімі слязьмі.

А плакаць было ад чаго. Маці заставалася ў вёсцы з пяццю дзецьмі. Старэйшаму з іх, Івану, праўда, было ўжо 14 гадоў, але ён жа яшчэ мусіў хадзіць у школу. Затое самаму малодшаму, Аляксею, тады споўнілася толькі чатыры гады. Дарэчы, у матэрыялах справы яму, а таксама сястры Лене і мне ўзрост завышаны, кожнаму на год. Выпадковая памылка? Не ведаю.

Зусім не ўпамінаецца ў гэтых матэрыялах матчын першанец Яфім (маці называла яго Аўхімам). Ён нарадзіўся ў 1914 годзе. Ад нас з'ехаў калі не да, дык адразу пасля першага бацькавага арышту. Мабыць, асцерагаўся, каб не «замялі» і яго. А таму шукаў нейкага свайго заробку ў сталіцы. З цягам часу паступіў у Мінскі медінстытут, які закончыў толькі пасля вайны. У час вучобы (у даваенныя гады) працаваў у медінстытуце лабарантам нейкай фізічнай ці радыёфізічнай лабараторыі. Колькі-небудзь істотнай дапамогі сям'і ён аказваць не мог, хоць зрэдку летам, калі мы жылі яшчэ ў Быкоўцы, дамоў прыязджаў. Прывозіў кожнаму з нас нейкі падарунак.

Пісьмы дамоў Яфім прысылаў зрэдку. 1 заўсёды без зваротнага адрасу, які маці трымала ў строгім сакрэце. Відаць, баялася, каб хто з вясковых актывістаў не настукаў на хлопца ў сталіцу.

У прашэнні аб памілаванні бацькі пра

існаванне Яфіма нічога не гаварылася. Гэта ўжо была маленькая хітрасць, падказаная тымі, хто параіў звярнуцца да самаго ўладара краіны.

Дужа жаласнае пасланне «вялікаму правадыру» (так і яшчэ з многімі іншымі пашанотнымі вызначэннямі называўся ў тым пасланні Сталін) пісалася, вядома, не ў канцы 1940 года, а намнога раней, відавочна, у хуткім часе пасля вынясення другога прысуду. Мы лічылі, што яна ўвогуле бясследна знікла, бо афіцыйнага адказу, здаецца, не было. Але да мяне ўскосная вестка пра тое пасланне дайшла, лічы, праз 57 гадоў – у час знаёмства з бацькавай справай...

З гэтай жа справы я даведаўся, што па прысуду 1937 года бацька афіцыйна рэабілітаваны 26 верасня 1989 года. Спрацавала пастанова аб рэабілітацыі ўсіх, хто быў асуджаны асобымі нарадамі і рознымі тройкамі.

Прысуд, вынесены тройкай 19 красавіка 1933 года, адменены 25 лістапада 1958 года вызначэннем судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Судовая справа супроць бацькі тады была спынена «за недаказанасцю абвінавачвання». Пра гэта мне паведамілі з пракуратуры Магілёўскай вобласці 17 лютага 1995 года. Раней ні я, ні хто іншы з нашай сям'і, у тым ліку і маці, пра гэтую акалічнасць нічога не ведалі.

Да поўнай бацькавай рэабілітацыі маці і ўвогуле не дажыла...

Дз.Я. Бугаёў.

БЯЛЯЦКІ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1963 г. у Крычаве. Кандыдат медыцынскіх навук. Скончыў Віцебскі медінстытут. Аўтар 27 навуковых прац. Жыве і працуе ў Віцебску.

ВЯРЖБІЦКІ Васіль Гаўрылавіч, нарадзіўся 14.3.1906 г. у в. Сакольнічы. Доктар гістарычных навук (1965). Скончыў БДУ (1929). У 1924–1929 гг. настаўнік, выкладчык педтэхнікума ў Лепелі, Барысаве. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. - выкладчык Ваенна-палітычнай акадэміі імя Леніна. У 1957–1962 гг. прадаваў у Цэнтральным музеі Савецкай арміі. З чэрвеня 1962 г. па 1972 гг. – дырэктар Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

ГРЫГОР'ЕЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, нарадзіўся 4.01.1949 г. у г. Крычаў. Доктар гістарычных навук (2000). У 1972 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. У 1972–1974 гг. працаваў сакратаром Крычаўскага РК ЛКСМБ. З верасня 1974 г. па 1994 г. служыў у Савецкай арміі. У 1987 г. скончыў ваенна-палітычную акадэмію ў Маскве. З верасня 1995 г. – дацэнт кафедры сацыяльнай педагогікі Беларускага педуніверсітэта імя М. Танка. З 2002 г. – прафесар, працуе на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій БГПУ. Аўтар больш за 100 кніг, брашур, навуковых артыкулаў.

ДАНІЛЕНКА Валерый Мікалаевіч, нарадзіўся ў Крычаве ў 1947 г. Доктар біялагічных навук (1996). Скончыў МДУ імя Ламаносава (1970), у 1974 г. – аспірантуру на кафедры генетыкі біялагічнага факультэта МДУ. З 1975 г. малодшы, а з 1979 г. – старшы навуковы супрацоўнік Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута генетыкі і селекцыі прамысловых мікрааранізмаў. У 1983 г. узначаліў лабараторыю генетычнай біятэхналогіі Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута антыбіётыкаў Мінмедпрама СССР. З кастрычніка 1991 г. загадвае лабараторыяй Дзяржаўнага навукова-даследчага інстытута генетыкі ў Маскве. Пад яго кіраўніцтвам 10 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

ДУКТАЎ Уладзімір Уладзіміравіч, нарадзіўся 28.12.1953 г. у г. Крычаў. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1994). Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта (1971–1976). У 1986–1987 гг. вучыўся ў Мінскай вышэйшай партыйнай школе. З 1976 г. працаваў карэспандэнтам Клімавіцкай раённай газеты «Новае жыццё». З 1977 г. – лектар, з 1979 г. намеснік загадчыка аддзела, з 1980 - загадчык аддзела Магілёўскага абкома камсамола. З 1982 г. на партыйнай рабоце. З 1987 г. рэдактар магілёўскай раённай газеты «Прыдняпроўская ніва».

З 1970 г. выступаў ў друку і па радыё. Аўтар

А.Дз. Грыгор'еў. У.У. Дуктаў.

І.С. Жарыкаў.

кніг прозы «Дзякуй і даруй» (1993), «Трэцяя асоба» (1997), «Смешкі-пацешкі» (1998).

ЖАРЫКАЎ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1921 г. у в. Хацілавічы. Заслужаны дзеяч навукі БССР. Кандыдат біялагічных навук (1962). Доктар ветэрынарных навук (1976). Скончыў Маскоўскую ветэрынарную акадэмію (1951). Працаваў выкладчыкам у Клімавіцкім зааветтэхнікуме, інструктарам сельгасаддзела ЦК КПБ, у Беларускім навукова-даследчым ветэрынарным інстытуце. З 1968 г. – дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі. Аўтар больш як 100 навуковых прац. Сярод іх 6 манаграфій.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», у мірны час – ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку».

Н.М. Марозава.

ЖЫРКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 1.10.1899 г. у в. Залесавічы. Беларускі моваznавец, заслужаны дзеяч навукі БССР (1951), кандыдат педагагічных навук (1944). Скончыў БДУ. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Працаваў настаўнікам, выкладчыкам у Магілёўскім педінстытуце (1933–1941), у БДУ (1943–1969). У 1953–1968 гг. загадчык кафедры беларускай мовы ў Белдзяржуніверсітэце.

Аўтар падручнікаў для сярэдніх і васьмігадовых школ, шматлікіх прац па пытаннях беларускай літаратурнай мовы. Памёр 13.08.1984 г.

ЗАБАЛОЦКАЯ (САЛАМАХА) Людміла Васілеўна, нарадзілася 27.12.1949 г. у г. Крычаў. Скончыла ў 1968 г. Крычаўскае медыцынскае вучылішча, у 1974 г. філалагічны факультэт БДУ. Друкуецца з 1968 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Сакавік» (1974), «Радаводны васілёк» (1981), «Свяйтло палыну» (1989), «Струны ламяці» (1991). Жыве і працуе ў Мінску.

КАРАМАЗАЎ Віктар Філімонавіч, нарадзіўся 27.6.1934 г. у г. Чэрыкаў у сям'і настаўнікаў. Беларускі пісьменнік. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990), Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2003). Яго бацька, Філімон Сяргеевіч, больш за пяцьдзесят гадоў выкладаў у школах і Крычаўскім педвучылішчы беларускую і рускую мову і літаратуру, маці, Ганна Анісімаўна, працавала настаўніцай пачатковых класаў у Крычаўскай чыгуначнай школе. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям'я эвакуіравалася з Крычава на Волгу і жыла ва Ульянаўскай вобласці, у вёсцы Тургенева. Па заканчэнні вайны сям'я вярнулася ў Крычаў. тут Віктар Карамазаў і яго сястра Людміла вучыліся ў сярэдняй школе імя Карла Маркса. У 1952 г. будучы пісьменнік закончыў школу і паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна на аддзяленне журналістыкі. Закончыўшы універсітэт, працаваў у чэрыкаўскай раённай газеце «Сацыялістычная перамога», а праз год, пераехаўшы ў Крычаў, у мясцовых газетах «Шлях сацыялізму» і «Новае жыццё», уласным карэспандэнтам «Магілёўскай праўды» па Крычаўскім, Клімавіцкім і Мсціслаўскім раёнах. У 1964 г. пераехаўз Крычава ў Мінск.

Сваё першае апавяданне «Сыны» Віктар Карамазаў апублікаваў у часопісе «Советская Отчизна» ў 1957 г. яшчэ студэнтам, напісаўшы яго па матывах паездкі ў Казахстан на ўборку цаліннага ўраджаю, а першая кніга апавяданняў «Падранак»

Віктар Карамазаў з маці Ганнай Анісімаўнай каля роднай хаты, 1992 г.

выйшла праз дзесяць гадоў і пачыналася апавяданнем пра родны дом у Крычаве, пра бацьку ды маці, прыезд у госці вясковага чалавека, які будаваў настаўніку дом, пра скрыпачоў, гаспадара дома і яго госця, і музыку. Ужо першая кніга пісьменніка выявіла галоўны напрамак яго творчага шляху – тэму роднай зямлі, роднай прыроды. На старонках апавяданняў «Букініч», «Запозненыя паязды», «Зялёныя тоні», «Па слончыну песню», «Ліменскі сшытак», «Мне сніцца бой ласёў» чытачы пазналі лясныя ваколіцы Крычава ды Чэрыкава, куточкі Сажа, мясцовых леснікоў ды егераў. Роднаму краю аўтар не здрадзіў і пазней, беручы сюжэты і вобразы для аповесці «Пагоннік», рамана «Пушча», новых апавяданняў, эсэ, нарысаў. Лірычныя вобразы роднага краю напоўнілі яго кнігі «Па талым снезе», «Вясёлка сярод зімы», «Дома», «Дзень Барыса і Глеба», «Дзяльба кабанчыка». Пісьменнік рашуча сцвярджаў галоўны прынцып свае творчасці: пісаць тое, што перажыта, што ў сэрцы, у думках, што ўражвае і хвалюе. Ен шмат падарожнічае па родным краі і не блізкім, а часам і далёкім, свеце. З падарожжаў нараджаюцца аповесці-эсэ «Глядзіце ў вочы лемуру», «Руны мараны», «Векавое». Пісьменнік жыве ў памораў на Белым і Баранцавым марах - піша пра іх; з суровай таежнай поўначы Урала прывозіць і публікуе эсэ пра катаржнае жыццё свайго дзеда Максіма; бярэ ўдзел у выпрабаваннях 130-тонных БелАЗаў у жалезарудных басейнах Крывога Рогу – стварае аповесць «Спіраль» пра выпрабавальнікаў машын.

Аналізуючы прозу пісьменніка, глыбокі і бліскучы ў слове М. Стральцоў пісаў: «Карамазаў– празаік надзвычай сучасны, і самае дарагое ў гэтай ягонай рысе... тое, што ён падрыхтаваны, як не кожны сённяшні празаік, да творчай трансфармацыі сучаснага матэрыялу ўсім сваім жыццёвым і асабовым вопытам: выхаваннем, уласцівасцямі ўражлівай, артыстычнай паводле складу свайго натуры, любоўю да чалавечага ўмельства...» І ў той жа час, маючы свой, з маленства, вопыт вайны, пісьменнік зноў ды зноў вяртаецца ў творчасці да ваеннага мінулага. Асвойваючы тэму вайны спачатку ў жанры апавядання, ён піша шматпланавы раман» Бежанцы», у аснову якога кладзе пуцявіны ўласнага блукання па прасторах вайны. І ў той жа час выходзіць з друку яго новая кніга «Проста ўспомніў я цябе», складзеная з вандроўных падарожжаў і літаратурных эсэ пра пісьменнікаў, жыццём і творчасцю блізкіх аўтару, – Аляксея Пысіна, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, Анатоля Кудраўца, Міхаіла Шолахава, Леаніда Ляонава, якіх ён ведаў і адкрываў па-свойму, сэрцам, то як сяброў, то як творцаў удзячны старэйшым майстрам літаратуры. За гэтую кнігу ён першы ў беларускай літаратуры атрымоўвае Дзяржаўную прэмію імя Кастуся Каліноўскага.

Як толькі на бацькаўшчыну пісьменніка абвальваецца чарнобыльская бяда, ён адразу ж, у першыя яе дні, прыязджае сюды, на Сож, жыве ў любай сэрцу Ліменскай пушчы, перажывае бяду разам са сваімі сябрамі-землякамі і піша з жывых назіранняў за нечакана зламаным жыццём аповесць «Краем Белага Шляху», апавяданні «Супраць неба – на зямлі», «Час ваўкоў», «Галуба», старонкі мастацкіх дзённікаў, што некалькі гадоў друкуюцца ў часопісе «Неман». У той жа час пісьменнік выходзіць на новую для сябе і для ўсёй беларускай літаратуры тэму – мастацкім словам даследуе жыццё і творчасць выдатных беларускіх мастакоў В. Бялыніцкага-Бірулі, С. Жукоўскага, А. Бархаткова, Г. Вашчанкі, А. Бараноўскага. Пра іх жыццё ў мастацтве адна за адной у друку з'яўляюцца аповесці «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «Мой брат духоўны...», «Чырвоная брама», эсэ «Зачараваная душа» і «Жавароначкам бласлаўлёнае». На радзіме Бялыніцкага-Бірулі пісьменнік рэалізуе сваю даўнюю ідэю правядзення пленэраў мастакоў-пейзажыстаў і сам кожны год прымае ў іх удзел і як пісьменнік, прапагандыст творчасці Бялыніцкага-Бірулі, і як мастак-пейзажыст. Творы пра мастакоў і свой дзённік-роздум, напісаныя на пленэрах, ён выдае і асобнымі творамі, і кнігай «З вясною ў адным вагоне», якая атрымала прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

В. Карамазаў шмат працуеў кінематографе. Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкія фільмы «Пушча» (дзве серыі па раману «Пушча»), «Зялёныя фрэгаты», «Крыж на зямлі і поўня ў небе» (па аднайменнай аповесці), а таксама шэраг дакументальных фільмаў.

Дз. Т. Дудзінская.

Мая Радзіма

З эсэ В. Карамазава

Бацькоўская субота перад Раданіцай. У царкве святога Мікалая памянуў маму, гэтай зімою памерлую, бацьку, якога няма ўжо сорак гадоў, сястру Люду, якая адышла раней за бацьку, яшчэ ў маладыя студэнцкія гады. Дадому вяртаўся берагам Сажа. Ідучы, углядаючыся ў наваколле, зноў ды зноў спыняўся. То пазнаўшы лазенку, у якой, калі

вучыліся ў школе, жыў Толік Шпак, наш надзейны футбольны варатар; то старую вярбу, пад якою ў забоіне трымаў сваю лодку Барыс Зуеў, мой школьны сябра, і з якім два апошнія гады сядзелі за адной партай. А тут па начах, таемна ад рыбнагляду, закідалі ў Сож брэдзень, выцягвалі з травой і рыбай. А на тым беразе ўлетку, як цямнела, варылі юшку. Спыніўся каля старога броду, успомніўшы, як тут з мамай пераходзілі Сож, ідучы ў луг па шчаўе ці яшчэ далей у лес па маслякі, рыжыкі. Ішоў далей – насустрач старая: сышла са сцежкі, мне ўступіўшы, спынілася, павіталася. І я спыніўся павітаўся. Пытаецца: «Зноў прыехалі на радзіму?» – «Зноў», – кажу. «Радзіма не забываецца?» – «А як жа яе забудзеш?..» Тады яна - мне: «Дай Бог вам здароўечка...» – Ды і пайшла сваёй дарогай. А я гляджу ёй услед і думаю: хто такая?.. Бо кранула сэрца яе дабрыня: «Дай Бог здароўечка...» – за тое, што я не забываю свой родны бераг?.. І ўжо ішоў, у думках паўтараючы крыху запозненае сваё, ёю пачутае: «Дай Бог і табе, матуля, здароўечка...» А дома, як вярнуўся з Сажа, падумаў і пра Зуева, і пра Шпака, і пра Жорку Марозава, і пра іншых цудоўных хлопцаў з берага, сяброў маленства: дзе яны ўсе? Хто жывы? Пасля школы, як раз'ехаліся па той, што была, агромністай савецкай краіне – ані гуку. І зноў – пра старую падумаў: можа, яе сын таксама некалі з'ехаў у далёкі свет і не вярнуўся? Можа, адсюль і ласка да чалавека, што свой бераг не забывае, тая матчына ласка, якою б яна хацела сустрэць роднага сына, калі б вярнуўся?..

І так мне зажадалася яе спаткаць яшчэ аднойчы, каб ходзь словам, як мог, суцешыць.

На сустрэчах з пісьменнікам чытачы часта пытаюцца пра яго радзіму: дзе нарадзіўся, хто бацька ды маці, дзе школа, у якой вучыўся, якія творы напісаў пра родны край? Нядаўна ў школе малады чалавек, дзесяцікласнік, спытаў: «А што вам бачыцца, калі падумаеце пра сваю радзіму?» Я здзівіўся: цікава, па-свойму, ад душы спытаў. І раней, як на пытанне адказаць, убачыў сваю зялёную тару ў Крычаве, на ёй, за брамай, хату, у сцяне – два акны, перад імі на лаўцы – маму і бацьку, маму ў злінялай шарсцянай кофце, бацьку ў белым палатняным пінжачку. Мама глядзіць на мяне ды ўсміхаецца, а бацька глядзіць на маму і ёй усміхаецца, а твары ў абаіх светлыя, добрыя, у цёплым пачуцці вельмі адно на адно падобныя, і такія сціплыя ў сваім шчасці, па-боску чыстыя. Іх убачыўшы, убачыў вакол кусты ружаў, белыя ды чырвоныя, і ружы далей, каля ганка,і за ганкам ружы, і яшчэ далей, па сцежцы ў сад, абапал сцежкі, маму ў садзе паміж кустоў ружаў, як яна іх высаджвае, абразае, акучвае, абпырсквае ад дробнай зялёнай тлі, пачуў яе голас «восемдзесят шэсць гатункаў адных ружаў...» (не кустоў – гатункаў!). Больш, яку мамы, у Крычаве ружаў ні ў каго не было, але гэта здзіўляла людзей чужых, не мяне, бо я бачыў як яна працавала ў садзе, бачыў пасылкі з каранямі кветак, якія да нас прыходзілі з Рыгі, з Мікіцкага батанічнага сада ў Крыме, з Львова ад мае стрыечнай сястры Клары, з Драгобыча ды Івана-Франкоўска ад мамінай сястры Таццяны. Цяпер каму пра гэта скажаш – пытаюцца: прадавала? А мы нічога ніколі не прадавалі і не бралі задарма, толькі куплялі, як было за што, у той час у Крычаве наогул ніхто кветак не купляў і не прадаваў. Кветкі маці пачала разводзіць у пяцьдзесят другім годзе, як памерла Люда, яшчэ такая маладая ды прыгожая. Ёй на магілку насіла, ледзь не кожнага дня. І дарыла людзям, каб Люду, як казала, на тым свеце адарыў Гасподзь. І вось гэтакія, як яна, да нас кожнага дня заходзілі жанчыны – сама дабрыня. Усе, з кім сябравала, любілі кветкі, разводзілі іх, бралі ўдзел у гарадскіх выставах кветак: настаўніца Ірына Нічыпараўна Карачун, Матрона Ларывонаўна Зямлянская, таксама настаўніца, суседка Ганна Сяргееўна Гузікава, маці майго сябра Арнольда. Матрона Ларывонаўна доўга і цяжка хварэла, беспамылкова адчувала ў апошнія гады свой блізкі канец жыцця, але самоты ў яе твары ніхто не бачыў, з кветкамі ішла ў царкву, з гасцінцамі да людзей, заўсёды бачыла, чым чалавеку пасобіць, і вельмі часта заходзіла да нас, да маці, ужо старэнькай, як завітае – святлее ў хаце. Аднойчы я завітаў да яе і Віктара Паўлавіча, яе мужа, баявога лётчыка, які ўсю вайну адваяваў на крылах знішчальніка, якраз на Спаса, з яблыкамі, селі за стол, пагаварылі, і тады я

ўпершыню ўбачыў у яе вачах слёзы. Яны, старыя, у той час пахавалі сына, што жыў з імі, і сама Матрона Ларывонаўна дажывала апошнія дні. Але дзіўныя ў яе і тады былі слёзы. Яна так не хацела мне іх паказаць, і хавала за ўсмешкай, за жартаўлівым слоўкам. Якая мужнасць!

Выходжу з хаты ў сад, стаю, гляджу на кветкі, якія першую вясну без мамы, гляджу на яблыні ў кволай ад халадоў квецені, кожную чую сэрцам, бо кожная так шмат расказвае мне пра дарагіх людзей – не толькі пра маму ды бацьку. Вось уэлс – дзіва з дзіваў, яблык на яблынцы кожны год як ягад на гронцы вінаграднай, і кожнае густа-чырвонае, гарыць рубінам, салодкае, адзін раз адкусіш - поўны рот соку, пакінеш назіму - пералежыць і антонаўку, і любое іншае яблыка, і сок да лета не страціць. Адкуль яблынька? Памятаю, як яе прынёс танклявым саджанцам бацькаў былы вучань ляснічы Карпушэнка (шкада, што ўжо не памятаю, як зваць, хоць і заглядаў ён да нас часта), як садзілі яе і ён, і Ліда, мая маладая тады жонка, і я. А далей, дзе не зарадзіла бульба, стаяла пепінка: яблычка жоўценькае, нібы бурштын, сонцам налітае. Тое дрэўца нам прынесла Ірына Нічыпараўна Карачун. Як памерла, дык і яблынка, нібы ад гора па ёй, счарнела. Я яе выкарчаваў, але на тым месцы ўжо нішто не радзіла, што ні пасодзіш – змарнее. І ландышы, якія ў другім канцы саду, прынёсшы з лесу, разам з зямлёю, камякамі, пасадзіла Ірынушка, як яе мама называла, ліхтарык, як называлі яе мае малыя дзеці, цяпер разрасліся, кожную вясну як зацвітуць – водар па ўсёй тары. І манжурскі арэх яе. Закараніўся – ніякім жалезам з зямлі не выб'еш. Ды і навошта выбіваць? Арэхаў не дае, але ж памяць пра светлага чалавека даражэйшая. Ці белы наліў – дзве дзеравіны. Яблыка не ўлежнае, зняў ды з'еў, аднаго пня было б даволі, але як адно з двух пакінеш, калі Арнольд, цудоўны сусед ды сябра, пасадзіў два? Была ў маім садзе і яблынка Гарасіма Іванавіча Зубарава з Хацілавіч, вёскі пад Крычавам. Ён нам клаў хату з братам Ахрэмам і пасадзіў рэпачку, яблыкі былі што мёд і на смак, і водарам, пчолы па ёй раямі пасліся, яблыка з-за іх было не ўзяць з яблыні. А як памерла мая сястра – яблынка пачала ўсыхаць. Памёр Гарасім – зусім высахла. Толькі музыка ад Гарасіма і засталася ў вушах звінець. Часта, бывала, прыязджаў з вёскі да нас на сівым калгасным коніку. Пад вокнамі паставіць на гары, пасак адпусціць, хамут рассупоніць, кіне з воза сена каню і ў хату – да скрыпкі. Бацька іграў па памяці, і па нотах, болын Чайкоўскага ды Бетховена, класіку, а Гарасім – свае вясковыя танцы ды песні, франтавыя. З тых яго прыездаў і цяпер бачу асобныя малюнкі пад скрыпку...

Вось – за акном каля плота сівенькі конік хрумстае сена ці саломку на сакавіцкай праталіне. У салодкай млосці вочы то заплюшчыць, то расплюшчыць. Аў вачах нявымытыя сонейкам зімовыя слёзы. На конскай спіне варушыцца вясновы прыпарачак. Верабейка скача па ўгрэтае холцы, выдзёўбвае з падшэрстку зімовую каросту. Конік хрумстае, не варушачы ні вухам, ні хвастом, каб дробную птушачку не спужнуць, каб яна яшчэ і да костачак дадзяўблася.

А там, угары, пад лапінкай жыцця зямного, блакіт вясны – таксама мацярык...

А тут...

Тут – бацька. Стаіць у паліто наросхрыст і без шапкі – шапку ў руках камечыць. У старых амерыканках-чаравіках – у лужыне, якую, пэўна, не бачыць і не чуе пад сабою. Загледзеўся на каня, на вераб'я, жмурыцца, каб не спужнуць і птушачку, і радасць конскую, і само сонейка вясновае, і штосьці зусім сваё, таемнае.

Ад брамы на гару падымаецца Гарасім – з крамы. На плячы – мех. У мяху – буханкі хлеба, які чакаюць у вёсцы, бо вёска хоць хлеб і вырошчвае, але на стале свайго не мае.

Я рады, як у хату ідзе Гарасім. Бо ведаю, што тут ён скіне з плячэй світку, з галавы – шапку, зломкам грабянца расчэша чарнявыя вал асы і папросіць у бацькі скрыпку...

Сустрэчы з найдабрэйшым і найчысцейшым душою селянінам Гарасімам мяне калісці вельмі ўражвалі і шмат давалі для душы, для разумения жыцця вясковага чалавека, яго прыроднага таленту, і не выпад - кова самая першая мая кніга «Падранак» пачынаецца апавяданнем «Нязгаснае» – пра родную хату, пра бацьку, маму, Гарасіма, пра скрыпку і яе душу, якую так умелі будзіць і

Гарасім, і бацька, нават і пра сівога коніка пад акном. І не выпадкова пазней, уключаючы апавяданне ў іншыя зборнікі прозы, я называў яго больш канкрэтным і блізкім да мае душы словам – «Дома».

Чую, як хтоські кажа: «Ты нарадзіўся ў Чэрыкаве, які за дваццаць кіламетраў ад Крычава, і там, напэўна, твая радзіма?» Так і не вельмі так. Так – я нарадзіўся ў Чэрыкаве. Але наконт радзімы – тут у мяне свае і думкі, і адчуванні.

У тым годзе, калі я нарадзіўся, наша сям'я жыла то ў Мінску, то ў Астрашыцкім Гарадку пад Мінскам. Час быў цяжкі, і мама, каб падарыць мяне свету, прыехала ў родны Чэрыкаў. Тут яе чакалі два ўтульныя дамы. У адным, дзе яна і нарадзілася, і вырасла, пасля смерці бацькі жыў са сваёй сям'ёй старэйшы брат Грыгорый, а ў доме на гарадскім возеры жылі дзядзька Станіслаў і цётка Марыя Іванаўна, дзяцей у іх не было, а маму і яе сям'ю яны вельмі любілі – у іх доме мама і спынілася. Тут я і нарадзіўся. Тут мяне Марыя Іванаўна і ахрысціла. У той час хрысціць дзяцей было найстрога забаронена, а ў сям'і настаўнікаў пра тэта падумаць было жахліва. Але аднойчы ўвечары, як сцямнела, калі ў доме не было нікога, акрамя мяне і яе, мае на той час нянькі, яна загарнуля мяне ў коўдру, вынесла, каб ніхто не бачыў, за вароты і вуліцаю бегма праз два дамы да дома Старадомскага, бацюшкі – хутчэй на ганак ды ў хату. Старадомскі, якога ў Чэрыкаве вельмі паважалі, мяне і ахрысціў, пра што не ведала нават мама. Неўзабаве пасля гэтага бацюшку арыштавалі, і мама бачыла, як яго ў нас пад вокнамі вялі на штыху, пад канвоем. Забралі і ўсю яго сям'ю. А я, цяпер пра гэта думаючы, чую ў сабе, як боль, удзячнасць і бацюшку, які паклаў на мяне першы Гасподні крыж, і бабулі Марыі Іванаўне, кланяюся ім за тую, у рупнасці пра маю душу, мужнасць.

З Чэрыкава мама са мною вярнулася ў Мінск, а праз гады тры мы з Мінска пераехалі жыць у Крычаў. Быў год, здаецца, трыццаць сёмы. Бацька і маці пачалі настаўнічаць у чыгуначнай школе.

Аднойчы я вызначыў межы, хоць і адносныя, маёй малой радзімы, і яны пралеглі як па Чэрыкаўшчыне, так і па Крычаўшчыне, ніякіх адносін да межаў адміністрацыйных не маючы: праз вёскі Мірагошч, Лімень, Гронаў Вепрын, Паклады, Лабковічы, Маляцічы, Дарагую, Волчас, Хацілавічы, Лабанаўка. У гэтым коле былі, вядома, і Чэрыкаў, і Крычаў, і, ад Мірагошчы да Лабковіч, Сож – мая найпершая і наймілейшая на зямлі рака. Тэта круг майго найшчаслівейшага жыцця, самых дарагіх для душы захапленняў і ці не больший паловы маіх літаратурных матываў, вобразаў, сюжэтаў. А неўзабаве, думаючы пра гэтую сваю краіну, жыццё ў ёй не толькі маё, але і блізкіх мне людзей, я здзівіўся і яшчэ аднаму нечаканаму адрыццю: гэты круг вымаляваў яшчэ дзед Анісім, мамін бацька Анісім Раманавіч Шаблоўскі, калі мяне на свеце не было, і я, як атрымоўвалася, сваім лёсам паўтарыў круг дзеда. Дзіўна, як мы з ім размінуліся на гэтым крузе? Дакладна мама не памятала, калі ён памёр, але ці не гадоў за чатыры-пяць да маіх народзінаў. З яе казанняў я бачу дзеда Анісіма буйным, прыгожа-вусатым, самавітым, годным, даволі разумным і культурным чалавекам. Ён меў сямёра дзяцей, матэрыяльнай спадчыны не меў, адзін зарабляў на ўсю сям'ю, жонку, маю бабулю, пахаваў рана, у дзесятым годзе, узяў у дом сваю і жончыну маці, але ўсім змог даць жыццё не толькі ў поўным матэрыяльным дастатку ды ў радасцях маленства, але яшчэ да рэвалюцыі ўсіх вывучыў і выдатна выхаваў. А працаваў, можна сказаць, мазалём, жыў з рамёстваў: купляў і вырабляў скуры, на сырамяць, шыў з яе конскую вупраж, хамуты, шляі, сядзёлкі, усім вырабам даваў мастацкую аздобу, шыў і боты, і чаравікі з хрому, ягдташы паляўнічым, аздобу даваў і колерам, і металёвым наклёпам, варыў алей ды фарбы, распісваў ды рэстаўраваў княскія ды панскія палацы, саборы, іканастасы, крыў золатам саборныя купалы, крыжы. У Мірагошчы працаваў у князя Абаленскага, у Лімені ды Вепрыне – у паноў Васілеўскіх, якія былі братамі, пад Крычавам у Нізках даводзіў палац яшчэ аднаму Васілеўскаму, брату ліменскага ды вепранскага паноў, і ўсюды, дзе працаваў, яго цанілі і паважалі. У Нізках сышоўся з Аніскай, дачкою ахмістрыні пана Васілеўскага і стаў з ёю пад шлюбны вянец у Крычаве ў царкве Святога

Міколы. Аніска была ад пана, які выгледзеў Параску, яе маці, у вёсцы, тая была сялянкаю, і, не ўзяўшы з ёю шлюб, які не дазвалялі саслоўныя каноны, узяў у свой палац гаспадыняю на кухні, ахмістрыняю. Пра Аніску, сваю маці, мая мама ведала мала, амаль не памятала, бо тая памерла, як маці было тры гадкі, ведала ад бацькі, сваіх старэйшых братоў і сясцёр, як апошняя ў сям'і з дзяцей, але часта пра яе думала, вобраз яе ў сабе насіла з вялікай пашанаю і любоўю, і ў думках,сэрцам з ёю часта гаварыла ў малітвах перад іконаю Маці Божае, асабліва ў апошнія гады жыцця, перад смерцю. А бабулю, маці Аніскі, добра памятала і расказвала, якая яна была заўсёды чысценькая, ласкавая, як спявала, як курыла, павучаная гэтаму ў панскім двары. Тое, што маміным дзедам па маці быў Васілеўскі з Нізкаў, у нашым доме было вялікай таямніцаю, але ў апошнія гады жыцця мама, калі мы заставался ўдваіх, у хвіліны шчырых размоў за вячэрняй гарбатаю, спрабавала мне пра тэта паведаць, хоць і гублялася ў гэтакай размове, нечага асцерагалася, як і хацела, каб я ведаў пра свой род, і нештаяе стрымлівала. А калі памерла, я атрымаў ліст ад стрыечнай сястры з Івана-Франкоўска, якая тое самае чула ад свае маці, што была з маёю роднымі сёстрамі, і мне напісала. Дзед Анісім прывёз Аніску ў Чэрыкаў і там за адно лета пабудаваў добры дом на беразе Сажа, а калі рэвалюцыя разагнала паноў і пазнішчала іх палацы, ён прывёз у свой дом і Параску з крычаўскіх Нізкоў. Яна ў яго жыла да самай смерці.

Круг жыцця дзеда Анісіма на Крычаўшчыне ды Чэрыкаўшчыне я паўтарыў па-свойму. З маленства маючы стыхійныя выхады на дзедавы сцежкі-дарожкі, а то і свядомыя, ад успамінаў мамы і бацькі, найбольш абжыў тэты круг, як вярнуўся на радзіму з Мінска, закончыўшы універсітэт і працуючы то ў Чэрыкаве, то ў Крычаве ў раённых газетах, то карэспандэнтам «Магілёўскай праўды» ў родным краі на Сажы, то пасля, жывучы ў Мінску, але часта прыязджаючы сюды, у хату, і жывучы тут падоўгу. У гэтыя гады я глядзеў на сваю і дзедаву зямлю ўжо як журналіст, пісьменнік, мастак, даследчык, і пісаў, жывучы ў Мірагошчы ды Лімені, раман «Пушча», апавяданні «Апошняе паляванне з лайкай», «Букініч», «Час ваўкоў», «Зялёныя тоні», жывучы ў Гронаве, ганяючы па Сажы плыты з Гронава на Гомель яшчэ па-старому, шастом ды кацярынкаю на перакатах, пісаў аповесць «Пагоннік», у Пакладах, у калгасе «Запаветы Ільіча», заначаваўшы аднойчы на пашы з пастухамі, знайшоў сюжэт і напісаў апавяданне «Сцяпан, Дзіч і Цырля», за Дарагою ў спарахнелай хатцы сустрэў старую, якую тут звалі галубаю, і апісаў яе надзвычай драматычнае жыццё ў апавяданні «Галуба». У Крычаве, па жывых уражаннях ад мясцовага жыцця, была напісаная і аповесць «Аброчны крыж», якая мела выйсце ў свет яшчэ і пад назваю «Краем Белага Шляху».

Жыццё і праца ў родным краі на зялёнай горцы, у сваім доме ледзь не кожны дзень пераконваюць, што роднае – гэта не толькі тое, што родным адчуваеш сам, але і тое, што родным адчувае цябе. Тады і атрымоўваецца, што не толькі сам знаходзіш для душы і працы думкі, словы, матывы, вобразы, сюжэты, але гэта табе дае твой край, яго людзі, яго прырода, дораць як свайму чалавеку, цябе ведаючы і табе давяраючы свае глыбіні, таямніцы.

Ёсць у мяне апавяданне «Сямёнаўна». Яно якраз з тых, якія не шукаеш, якія нечакана прыходзяць да цябе самі.

Колькі стаяла на зялёнай горцы наша хата, столькі стаяла і малая шэрая хацінка насупраць цераз вуліцу, і ў ёй увесь тэты час жыла Сямёнаўна з унучкай Святланай. Мужа Сямёнаўны не памятаю, бо ён, як казалі, памёр ад франтавых ран у хуткім часе пасля выйны. Сямёнаўна працавала на пошце і старэла, а Святлана, як скончыла школу ды недзе яшчэ падвучылася, пераехала жыць у Мінск. Састарылася Сямёнаўна ў сваёй хатцы адна, але ўнучка яе не забывала, прыязджала, чым магла, пасабляла. Жыла суседка ціха, і ніхто пра яе жыццё нічога не ведаў. І вось захацелася ўжо старой Сямёнаўне зрабіць з нейкай нагоды Святлане падарунак. Пайшла па крамах і ўбачыла ў райпмагу дыванок – вельмі ён ёй спадабаўся. Вярнулася дадому, дастала з-пад падушкі панчоху, вытрасла з яе назбіраныя грошы, палічыла – на дыванок хапала. Прыйшла ў

магазін, каб купіць, а прадаўшчыца – на смех: ці ты баба, герой вайны: Паказвай дакументы. І вярнулася старая дадому ў слязах. А тут і я зайшоў: што за слёзы? Аказалася, дыванок мог купіць толькі ўдзельнік вайны. Я кажу: ідзіце ў ваенкамат і вазьміце паперку на мужа – ён у вас за вайну колькі меў ордэнаў ды раненняў? Дак жа ён памёр? Ну і што? Удава ветэрана! Пайшла. А ў ваенкамаце, шукаючы дакументы на Сямёна, знайшлі і на яе паперкі, пагарталі: вы ж самі ўсю вайну былі на франтах? Узнагароды, нават баявая Чырвоная Зорка – ордэн? Вярнулася дадому – даведку ўзяць пасаромелася: які ж я, кажа, ветэран вайны? Ну, працавала на паштовым поездзе, пошту на фронт і з фронта, на фронт і з фронта, бамбілі нас, гарэў наш поезд, хавала ў дарогах сяброў, салдацікаў, але ж які я герой?.. Баба, як усе бабы... І па дыванок не пайшла. Пасекла сваіх курэй, склада ў сумку і паехала да Светкі ў Мінск.

Зноў спускаюся са свае зялёнае горкі, пераходжу вуліцу, спыняюся, гляджу ў вокны дома Сямёнаўны. Цяпер тут жывуць іншыя людзі. І ў доме суседнім – іншыя. Некалі жылі Марозавы, стары і старая, дом прадалі, а самі паехалі да дзяцей аж у Сібір. І з другога боку ад дома Сямёнаўны, у доме, дзе жыў стары Карагодаў, людзі новыя, настаўніца з дзяўчынкаю. Нікога, што за людзі, не ведаю. Але ж некалі і Сямёнаўну не ведаў, пакуль выпадкова не адкрылася. Думаў: баба і баба, а як адкрылася – колькі ахвярнасці, сціпласці, мужнасці! Гэтак кожны раз: прыедзеш на сваю радзіму, ідзеш па ёй ад дома да дома, і кожны дом, кожнае ў ім акно, кожнае дрэва мала сказаць – знаёмае, яно – сваё, блізкае, і на кожным кроку можаш чакаць, як зараз табе хтосьці ці штосьці адкрыецца, як адкрылася аднойчы Сямёнаўна – нечаканым слоўкам, пачуццём, вобразам, сюжэтам, як свайму чалавеку. Гэтакае бывае толькі на радзіме.

Праўда, яшчэ нядаўна нас усіх вучылі, што радзіма ў нас ад мора да мора, ад Калінінграда да Уладзівастока. І мы гэтаму верьте І растрэслі па той вялікай краіне, што называлася СССР, вельмі шмат сваіх сыноў І дачок. Цяпер падыйдзеш да свае былой школы, паглядзіш на яе вокны, як у жывыя вочы, успомніш, які вялікі быў у нас клас, за трыццаць дзяўчат і хлопцаў, як усе, хто хацеў, паканчалі універсітэты, акадэміі, інстытуты, вышэйшыя вайсковыя вучэльні – дзе яны? Большасць – там, у нязмераных прасторах СССР. Жывыя ці мёртвыя?..

Ведаю і я ці не ўсе куточкі СССР, пабываў і на Далёкім Усходзе, і на Поўначы, і ў Сібіры, на Урале, у Сярэдняй Азіі, дзе толькі не вадзіла мяне мая журналісцкая ды пісьменніцкая душа. І ўсюды, забыўшы, што казалі мне мае настаўнікі, я адчуваў, што Сібір – радзіма для сібірака, Чукотка – для чукчы, Якуція – для якута, Волга – для рускага чалавека, а ў мяне, беларуса, радзіма адна – Беларусь, а ў Беларусі самае любае і святое месца тое, дзе нарадзіўся і вырас, дзе мой бацькоўскі дом і дзе магілы мамы і бацькі.

ЛЯХОВІЧ Ларыса Уладзіміраўна, нарадзілася 13.6.1968 г., кандыдат гістарычных навук (2001). Працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Выйшлі з друку яе навуковыя працы па эканамічных, палітычных і культурных сувязях Беларусі і Францыі. Займаецца навукова-метадычнай распрацоўкай вучэбных дапаможнікаў і метадычнай літаратуры для сярэдняй і вышэйшай школы. Вядзе навукова-даследчую работу па гісторыі сваёй «маладой радзімы» – Крычаўшчыны. У гэтай кнізе змешчаны шэраг матэрыялаў аб падпольным і партызанскім руху ў раёне, які выявіла і падрыхтавала да друку Л .У. Ляховіч.

МАЗАЛЬКОЎ Яўген Сямёнавіч, нарадзіўся 17(30).9.1909 г. у Крычаве. Крытык,

Л.У. Ляховіч.

перакладчык і літаратуразнавец. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1968). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Скончыў 1-ы Маскоўскі універсітэт (1930). У Вялікую Айчынную вайну рэдактар выдання на рускай мове часопіса «Беларусь». У 1948–1969 гг. старшыня камісіі, потым савета па беларускай літаратуры пры праўленні СП СССР. Друкаваўся з 1924 г. Аўтар прац пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, К. Чорнага, М. Танка, П. Броўкі, А. Куляшова, К. Крапівы. На рускую мову пераклаў творы Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі. За кнігу «Янка Купала» (1949) Дзяржаўная прэмія СССР (1950).

Памёр 15.12.1969 г.

МАСКАЛЕЎ Канстанцін Васілевіч, нарадзіўся ў 1963 г. у Крычаве. Кандыдат медыцынскіх навук. Дацэнт. Жыве і працуе ў Віцебску.

НАЗДРОЎСКІ Сцяпан Андрэевіч, нарадзіўся ў 1888 г. у Крычаве. Калі яму споўнілася 9 гадоў, бацькі адправілі сына вучыцца ў Пецярбург, у гімназію. Скончыўшы яе, Сцяпан паступіў на фізіка-матэматычны факультэт сталічнага ўніверсітэта. Але ён марыў стаць лётчыкам. Спачатку пайшоў працаваць на самалётабудаўнічы завод у Пецярбургу. Там асвоіў слясарную і такарную справу, а таксама зборку самалётаў. Потым паступіў у авіяцыйную школу Усерасійскага авіяклуба.

Пройдзе не так ужо шмат часу, і вучань авіяцыйнай школы Сцяпан Наздроўскі ў час экзаменацыйнага палёту на Каменданцкім аэрадроме пад Петраградам зробіць пяць «васьмёрак» на працягу шасці з паловай хвілін. Гэта сусветны ракорд. Аб ім з захапленнем пісалі расійскія газеты.

У жніўні 1913 г. Наздроўскі атрымаў дыплом пілота-авіятара за № 164. Здольнага лётчыка пакінулі ў школе інструктарам. Сваё майстэрства Сцяпану Андрэевічу не ўдалося перадаць маладзейшым калегам – грымнула першая сусветная вайна. Наздроўскі пакінуў школу і пайшоў добраахвотнікам на фронт.

На вайне Сцяпан Андрэевіч удзельнічаў у розных аперацыях. Яго баявыя разведвальныя палёты, што праходзілі ў глыбокім варожым тыле і пад інтэнсіўным артылерыйскім агнём, увайшлі ў манаграфіі і падручнікі паветранай разведкі таго часу. Пра яго гераізм, ваенную кемлівасць сведчаць узнагароды. Ён кавалер чатырох салдацкіх Георгіеўскіх Крыжоў, аднаго афіцэрскага Георгіеўскага Крыжа І ступені і ордэна святога Уладзіміра з мячамі і бантам IV ступень

У жніўні 1917 г. камандзір 10-га авіяатрада знішчальнікаў капітан Наздроўскі прызначаны начальнікам Каменданцкага аэрадрома. У студзені 1918 г. Сцяпан Андрэевіч узначаліў авіяцыйную школу Казанскага аэраклуба, пазней працаваў тэхнічным кіраўніком авіяцыйнай Пятай Чырвонай арміі.

Пасля грамадзянскай вайны ў 1920 г. у Маскве быў створаны навукова-вопытны аэрадром, на тэрыторыі якога размясцілася лабараторыя аэранавігацыі. Узначаліў яе С. А. Наздроўскі. Ён стаў адным з найбольш вядомых спецыялістаў у галіне аэранавігацыі, выдаў шэраг кніг: «Пытанні аэранавігацыйнай практыкі», «Тэорыя навігацыйных прыбораў», «Агульная тэорыя і методыка разліку вымяральных прыбораў» і шмат іншых.

У Вялікую Айчынную вайну С.А. Наздроўскі ўзначальваў у Ваенна-паветранай акадэміі кафедру на штурманскім факультэце. Пасля вайны працаваў старшым выкладчыкам кафедры механічных прыбораў у Маскоўскім авіяцыйным інстытуце. Памёр ў 1950 г.

Н.М. Марозава.

С.А. Наздроўскі

ПАЛІТЫКА Апанас (Панас) Паўлавіч, нарадзіўся 5.2.1935 г. у вёсцы Бродак. У 1951 г. скончыў у Кіеве рамеснае вучылішча. Працаваў на машынабудаўнічым заводзе «Бальшавік» (1951–1954). У 1954 г. паехаў на асваенне цалінных зямель у Акмолінскую вобласць (Казахстан). Рабіў прычэпшчыкам на ферме Балкашынскага племсаўгаса, трактарыстам зернесаўгаса «Калінінскі» (1954–1955). Служыў у Савецкай арміі (1955–1957). Быў электраслесарам шахты «2-Паўднёвая» (горад Шахты, Растоўская вобласць). З 1959 г. жыў у Крычаве, працаваў слесарам на птушкакамбінаце, цесляром у саўгасе «Вялікі Кастрычнік». У 1960 г. скончыў сярэднюю школу рабочай моладзі, у 1967 г. філалагічны факультэт Мапл ёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў выхавальнікам школы-інтэрната ў Крычаве (1967–1969), загадчыкам сельгасаддзела крычаўскай раённай газеты «Ленінскі кліч». З 1975 г. карэспандэнт-арганізатар, загадчык аддзела інфармацыі і радыёвяшчання газеты «Ленінскі кліч». Член СП СССР з 1981г.

Першы верш апублікаваў у 1960 г. (газета «Магілёўская праўда»). Аўтар кніг «Маўчанне навыперадкі» (гумар і сатыра, 1980), «Свой хлопец» (сатырычныя аповесці і апавяданні, 1985), «Праверка» (сатырычныя апавяданні, 1990).

РЫЖЭВІЧ Рэма Пятроўна, нарадзілася ў 1941 г. у Крычаве. Член Саюза музычных дзеячоў Беларусь Скончыла Белдзяржкансерваторыю. Выкладчык па класу фартапіяна. Загадвала харавым аддзяленнем Рэспубліканскага музычнага каледжа.

СВАДКОЎСКІ Іван Фаміч, нарадзіўся ў в. Мірнае. Скончыў гарадское пачатковае вучылішча, Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Удзельнічаў у першай сусветнай вайне. Скончыў школу прапаршчыкаў, атрымаў званне малодшага афіцэра. Пасля люцтаўскай рэвалюцыі І.Ф. Свадкоўскі – камісар штаба трэцяй арміі і рэдактар газеты «Голас трэцяй арміі». Потым лёс закінуў яго ў Ніжні Ноўгарад. У Казані ён трапіў у палон да белагвардзейцаў, але неўзабаве ўцёк з палону і каля году вёў рэвалюцыйную работу ў тыле калчакаўскай арміі. Пазней працаваў у сібірскім Бюро ЦК партыі. Ён рэдагаваў часопіс «Чырвонаармеец». З 1923 г. І.Ф. Свадкоўскі – студэнт і сакратар партарганізацыі Акадэміі камуністычнага выхавання. Пісаў працы па гісторыі педагогікі. У 1926 г. вывучаў школьную справу ў Амерыцы, чытаў там лекцыі, працаваў у Акадэміі педагагічных інстытутаў.

У Вялікую Айчынную вайну І.Ф. Свадкоўскі працаваў дырэктарам трох дзіцячых дамоў у Омскай вобласці. Аб гэтым часе ён цікава расказвае у сваёй кнізе «Выхаванне працавітасці» з 1960 па 1964 гг. рэдагаваў часопіс «Сям'я і школа».

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», адзначаны вышэйшай педагагічнай узнагародай – медалём імя К.Дз. Ушынскага.

Н.М. Марозава.

СТАРАВОЙТАЎ Іван Мацвеевіч, нарадзіўся 25.05.1903 г. ў в. Горкі. Беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, доктар медыцынскіх навук (1958), прафесар (1966), заслужаны дзеяч навукі БССР (1966). У 1929 г. скончыў БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1937 г. на кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага медыцынскага інстытута. З 1958 г. загадчык кафедры.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Карпавіч, нарадзіўся ў 1947 г. у в. Прыгаўка. Скончыў Валгаградскі політэхнічны і Паволжскі сацыяльна-політэхнічны інстытуты. Доктар хімічных навук. Доктар эканомікі і менед-

А.П. Палітыка.

І.М. Старавойтаў.

жменту. Доктар тэхнічных навук. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР. З 1993 г. Генеральны дырэктар ААТ «Волжскі аргсінтэз». Аўтар больш як 100 навуковых прац, патэнтаў і вынаходніцтваў.

ТОКІН Барыс Пятровіч, нарадзіўся ў 1900 г. у Крычаве. Вучоны-біёлаг. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Скончыў у 1929 г. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Прафесар Томскага (1936–1947) і Ленінградскага (з 1949) універсітэтаў. Аўтар шарага работ у галіне эксперыментальнай эмбрыялогіі, па пытаннях рэгенерацыі, клетачнага дзялення. Ён паклаў пачатак вывучэнню імунітэту эмбрыёнаў. У 1942–1955 гг. працаваў у Інстытуце эксперыментальнай медыцыны, потым у Акадэміі медыцынскіх навук СССР.

ТРУХАНОЎСКІ Уладімір Рыгоравіч, нарадзіўся 15.7.1914 г. у в. Бацьвінаўка. Член-карэспандэнт АН СССР (1964). Скончыў педінстытут імя М.Н. Пакроўскага (1940), Вышэйшую дыпламатычную школу МЗС СССР (1941). У 1941–1953 гг. – на дыпламатычнай рабоце, з 1947 г. – загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, затым гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі СССР Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін. У 1953 – 1957 гг. – намеснік дырэктара інстытута гісторыі АН СССР. З 1960 г. – рэдактар журнала «Вопросы истории».

Узнагароджаны 3 ордэнамі СССР.

ШЭМЕТАЎ Віктар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1930 г. у в. Гуркова Ніва. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Скончыў у 1955 г. Мінскі медыцынскі інстытут. Працаваў у Быхаве ўрачом, галоўным урачом райбальніцы, асістэнтам у Гродзенскім медыцынскім інстытуце, галоўным педыятрам Гродзенскага аблздраўаддзела, загадчыкам кафедры Смаленскай дзяржаўнай медыцынскай акадэміі. Аўтар 107 навуковых прац.

В.П. Шэметаў.

ГЕНЕРАЛЫ

ДУБАСАЎ Мікалай Філімонавіч, нарадзіўся ў вёсцы Лабковічы. Генерал-маёр міліцыі. Працаваў сакратаром Кашанскага сельскага савета, у 1951–1958 гг. – на камсамольскай рабоце. З 1958 па 1975 г. – інструктар Магілёўскага абкома КПБ, 2-і сакратар Шклоўскага, першы сакратар Клімавіцкага райкомаў партыі, загадчык аддзела Магілёўскага абкома КПБ. Больш 10 гадоў узначальваў упраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкома, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, Магілёўскага абласнога Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі.

ПАСТРЭВІЧ Іван Пракопавіч, нарадзіўся ў 1919 г. у Крычаве. Генерал-маёр юстыцыі. Скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, працаваў народным суддзёй Заслаўскага р-на Мінскай і Круглянскага р-на Магілёўскай абласцей. У1938 г. прызваны ў Чырвоную армію, служыў ваенным следчым і памочнікам ваеннага пракурора. У Вялікую Айчынную вайну займаў адказныя пасады ў органах ваеннай пракуратуры Заходняга і 3-га Беларускага франтоў. Пасля вайны – пракурор Туркестанскай ваеннай акругі. З 1968 па 1973 гг. працаваў пракурорам Беларускай ССР. Выбіраўся членам ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, двойчы – Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Ганаровыя грамадзяне

ГУСАКОЎСКІ Іосіф Іракліевіч (Гл. раздзел «Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Крычаўшчыны).

ЖАДАЎ Аляксей Сямёнавіч (Гл. раздзел «Абаранялі Крычаўшчыну).

МАКСІМЦАЎ Міхаіл Данілавіч, нарадзіўся ў 1909 г. у Варонежскай вобласці. Генерал-маёр. Скончыў Варонежскі індустрыяльны тэхнікум, працаваў на будоўлі, служыў у Чырвонай арміі. У 1941 г. скончыў ваенна-інжынерную акадэмію імя Куйбышава. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам 559-га асобнага батальёна 229-й стралковай дывізіі 50-й арміі, потым – начальнікам штаба інжынерных войск гэтай арміі. Удзельнік баёўзавызваленне Калужскай, Тульскай, Бранскай абласцей, фарсіраваў рэкі Дзясну, Сож, Днепр, Віслу, Одэр, Эльбу. У 1951 г. скончыў акадэмію Генеральнага штаба, служыў начальнікам інжынерных войск Закаўказскай ваеннай акругі. Звольнены ў запас у 1955 г.

Падраздзяленні, якімі камандаваў М.Д. Максімцаў, вызвалялі Крычаў.

РЭУЦКІ Кузьма Андрэевіч (Гл. «З успамінаў былога сакратара Крычаўскага падпольнага райкома партыі К.А. Рэуцкага).

САВІН Алег Яўгенавіч, нарадзіўся ў 1912 г. у Яраслаўскай вобласці. Палкоўнік, камандзір 572-га Крычаўскага артылерыйскага палка. У 1933 г. скончыў Ленінградскую артылерыйскую школу, служыў камандзірам агнявога ўзвода, начальнікам разведкі дывізіёна, камандзірам батарэі. Удзельыгік савецка-фінляндскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Удзельнічаў у баях пад Масквой, Віцебскам, Оршай. У 1945 г. лужыў у Манголіі, у г. Дальні. Звольніўся ў запас у 1958 г. Падраздзяленні, якімі камандаваў А.С. Савін, вызвалялі Крычаў.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Карпавіч (Гл. раздзел «Навукоўцы»).

СУПРУНОЎ Мітрафан Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1903 г. у Белгарадскай вобласці. Генерал-маёр, камандзір 385-й Крычаўскай стралковай дывізіі. У 1929 г. скончыў Сярэднеазіяцкую ваенную школу імя Леніна, у 1939 г. – ваенную акадэмію імя Фрунзе. З 1940 г. выкладаў у ваеннай акадэміі. У

М.Д. Максімцаў.

А.Я. Савін.

М.К. Старавойтаў.

М.Ф. Супруноў.

гады вайны быў на аператыўнай рабоце ў штабе арміі, з 1943 г. – камандзір 385-й стралковай дывізіі. Пасля заканчэння вайны служыў у ГДР, быў ваенным саветнікам у КНР.

Дывізія, якой камандаваў М.Ф. Супруноў, вызваляла Крычаў.

Падрыхтавала да друку Н.М. Марозава.

Яны ўзнагароджаны

«МЕДАЛЁМ МАЦЯРЫНСТВА» І ступені

АЎСЯННІКАВ А Галіна Аляксандраўна, калгасніца калгаса « Звязда».

ЕЛІСЕЕНКАВалянціна Іванаўна, хатняя гаспадыня.

ЖАЛУДЗЁВА Ганна Іванаўна, супрацоўніца дзіцячага сада № 9.

КУЧУК Надзея Пятроўна, даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік».

ЛАБАР Валянціна Уладзіміраўна, лаба-

рантка цэментна-шыфернага камбіната. Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступені.

МАРОЗАВА Ганна Раманаўна, супрацоўніца аўтапарка.

ПАЛЯКОВА Раіса Емяльянаўна, рабочая саўгаса «Крычаўскі».

ПАУЛАВА Клара Пятроўна, калгасніца калгаса «Запаветы Леніна». Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступені.

СВІРЫДЗЕНКА Вера Яўхімаўна.

ФРАЛЯНКОВА Ніна Рыгораўна, рабочая мясакамбіната.

ЦЯМНІЦКАЯ Тамара Мікалаеўна. Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступень

ШАЎМЕРАВА Раіса Гаўрылаўна, калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

ШУПО Любоў Рыгораўна, рабочая саўгаса «Дзягавічы».

«МЕДАЛЁМ МАЦЯРЫНСТВА» II ступені

АЗАРАВА Вера Дзмітрыеўна, калгасніца калгаса «Вялікі Кастрычнік».

АСТАПЕНКА Тамара Мікалаеўна, калгасніца калгаса «Савецкая Беларусь»

БЕЛЯНКОВА Тамара Мікалаеўна, калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

БОЛАТАВА Галіна Васілеўна, рабочая станцыі Крычаў.

ВОЛІКАВА Раіса Васілеўна, даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік».

ВЯРЖБІЦКАЯ Кацярына Дзмітрыеўна, калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

ГАЛАУНЁВА Раіса Мікалаеўна, даярка калгаса «Звязда».

ГАРБІЦКАЯ Ніна Міхайлаўна, калгасніца калгаса «Перамога».

ГРЫСЯНКОВА Людміла Уладзіміраўна, тэхнолаг піўзавода.

ДВАРАЧЭНКА Галіна Аляксееўна, даярка калгаса «Бель».

ДЗЕТЦЕЛЬ Ніна Пятроўна, работніца аўтапарка.

ДРАЧОВА Марыя Іванаўна, калгасніца калгаса «Паямць Леніна».

ДУБРОВІНА Ніна Аляксееўна, даярка калгаса « Перамога».

ЗАЙЦАВА Галіна Андрэеўна, калгасніца калгаса «Ленінскі прызыў».

ЗАРАНКІНА Галіна Фадзееўна, калгасніца калгаса імя Карла Маркса.

ІСАЧАНКА Валянціна Рыгораўна, калгасніца калгаса «Бель».

КАВАЛЬЧУК Вольта Паўлаўна, даярка калгаса імя Карла Маркса.

КАЗАКОВА Таццяна Мікалаеўна, рабочая саўгаса «Дзягавічы».

КАЮМАВА Раіса Аляксееўна, рабочая аддзела пазаведамаснай аховы.

КРАСПАМОВЕЦ Марыя Пятроўна, рабочая завода гумавых вырабаў.

КРАЎЦОВА Тамара Пятроўна, рабочая завода гумавых вырабаў.

МАЛАШАНКА Валянціна Віктараўна, інспектар раённага камітэта ДТСААФ.

МІХНІКАВА Валянціна Рыгораўна, калгасніца калгаса «Бель».

НЕСЦЕРАВА Любоў Восіпаўна, работніца мясакамбіната.

НІЖЭВІЧ Тамара Васілеўна, даярка калгаса «Бель».

ПАЛУШЫНА Марыя Іванаўна, даярка саўгаса « Крычаўскі».

ПАЎЛЮЧЭНКА Надзея Міхайлаўна, рабочая завода гумава-тэхнічных вырабаў.

ПАЧАЧУЕВА Любоў Мікалаеўна, рабочая саўгаса «Крычаўскі».

ПЯТРОВАВалянціна Захараўна, рабочая хлебапякарні станцыі Крычаў.

ПЯТРОВА Ніна Дзмітрыеўна, калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

РАГОЎСКАЯ Аляксандра Пятроўна, даярка калгаса імя Суворава.

РАЗІКАВА Тамара Елісееўна, калгасніца калгаса «Звязда».

РАМАНЕНКА Ганна Васілеўна, калгасніца калгаса імя Суворава.

РАЎКОЎСКАЯ Марыя Ягораўна, рабочая цэментна-шыфернага камбіната.

РУДКЕВІЧ Галіна Міхайлаўна.

РУДНІЦКАЯ Ніна Канстанцінаўна, калгасніца калгаса «Перамога»

РЫШТАКОВА Зоя Іванаўна, загадчыца клуба вёскі Сычык.

САЛАШЭНКА Ганна Паўлаўна, хатняя гаспадыня, вёска Зарубец.

САЎЧАНКА Тамара Сяргееўна, калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

СКАЧКОВА Галіна Пятроўна, выхавальніца Маляшцкай СШ.

СЛУЧКОВА Тамара Мікалаеўна, калгасніца калгаса «Звязда».

СЦЕШАКОВА Людміла Уладзіміраўна, калгасніца калгаса «Перамога».

ЦІМАШЭНКА Тамара Уладзіміраўна, калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

ЦІХАНЕНКА Вера Паўлаўна.

ЦЮКАЛАВА Вольга Рыгораўна, калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

ЧУНАЕВА Зоя Дзмітрыеўна.

ЧЫЖ Галіна Апанасаўна, калгасніца калгаса «Камунар».

ЧЫСЛОВА Валянціна Мікалаеўна, рабочая мясакамбіната.

ШЫЛКІНА Любоў Міхайлаўна, калгасніца калгаса «Сацыялістычны шлях».

ОРДЭНАМ «МАЦЯРЫНСКАЯ СЛАВА» III ступені

ВАЛАДЗЬКО Надзея Максімаўна.

КАСАНОЎСКАЯ Лідзія Спірыдонаўна.

МЫРЗА Яўгенія Восіпаўна, калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

МАНУЛЕНКА Ганна Яўгенаўна, даярка калгаса імя Суворава. Узнагароджана таксамі «Медалём мацярынства» I ступені, «Медалём мацярынства» II ступені.

МЯНЦЯННІК Любоў Віктараўна, даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік». Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» I ступені.

ШЭПШАЛЁВА Марыя Лаўрэнаўна.

ШЭПШАЛЁВА Таццяна Лаўрэнаўна, калгасніца калгаса «Вялікі Кастрычнік».

ОРДЭНАМ «МАЦЯРЫНСКАЯ СЛАВА» II ступені

КУПЦОВА Ганна Раманаўна, работніца цэментна-шыфернага камбіната.

ОРДЭНАМ МАЦІ

КАЗЛОВА Галіна Мітрафанаўна, паштальён Лабковіцкага аддзялення сувязі.

МІХНЕВІЧ Вольга Уладзіміраўна, паштальён Асавецкага аддзялення сувязі.

ПАУЛАВА Валянціна Пятроўна, даярка калгаса «Перамога».

СВЯТКІНА Любоў Леанідаўна, санітарка-буфетчыца райбальніцы.

ШЭДКО Таццяна Андрэеўна.

След Чарнобыля

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС, якая здарылася 26 красавіка 1986 г., прынесла бяду. Звыш 70% радыяцыйнага попелу высыпалася на тэрыторыю нашай рэспублікі. З геаграфічнай карты краіны знікла мноства вялікіх і малых па колькасці насельніцтва вёсак, жыхары якіх з болем і горыччу вымушаны былі пакінуць сваё жытло і перасяліцца ў іншыя мясціны. З землекарыстання ў рэспубліцы выключана 264000 га забруджанай радыенуклідамі зямлі.

Пакінула свой злавесны след Чарнобыльская катастрофа і на Крычаўшчыне.

У вёсках Бацьвінаўскага сельсавета Бранск, Вародзькава-1, Вародзькава-3, Даленшчына, Зайцава Слабада, Канцы, Лучкі, Малінаўка, Асавец, Бацьвінаў- ка, Масціцкая Слабада, на чыгуначнай станцыі Асавец, Прусіна, Цінькава, Янаў забруджанне глебы цэзіем-137 складае ад 1 да 5 кюры на кв. км.

Аналагічнае становішча і ў вёсках Гуркава Ніва, Доўгі Лог, Дарагая, Лушчэвінка, Макаўе, Паклады, Пушкары, Свадкавічы, Сячыхі, Хацілавічы Касцюшкавіцкага сельсавета.

У Бацьвінаўскім сельсавеце ёсць вёскі, у якіх забруджанасць радыенуклідамі складае ад 5 да 10 кюры на кв. км: Буланы, Вярхоўцы, Вародзькава-2, Горкі, Губеншчына, Касцюкоўка, Меляціна, Падудага, Ратнае, Сетнае, Юркаўка.

Чорны след Чарнобыля.

Такі ж узровень забруджання і ў вёсках Касцюшкавіцкага сельсавета – Волчас, Малькаўка, Касцюшкавічы, Ноўкі, Прыгаўка.

Некалькі гадоў пасля аварыі ўтойвалася ад людзей праўда аб небяспецы, што нясуць радыенукліды. Такое недаравальнае замоўчванне прынесла шкоду: вырас узровень захворваемасці, асабліва дзяцей.

Зараз раённыя ўлады робяць усё магчымае для таго, каб стварыць нармальныя ўмовьг пражывання ў зонах з дапушчальным узроўнем радыяцыі. Праводзіцца пашпартызацыя ўсіх падворкаў на ступень радыенукліднага забруджання, распрацавана спецыяльная сістэма кантролю за чысцінёй прадуктаў харчавання, якія вытвараюцца ў раёне і ўвозядца з іншых месц. Раённым цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі наладжаны кантроль за ўтрыманнем радыенуклідаў у пітной вадзе, сельгаспрадуктах, у грыбах і ягадах з мясцовых лясоў, у выпускаемай прадукцыі мясакамбінатам і маслазаводам.

Медыцынскія ўстановы раёна праводзяць агляды насельніцтва. Лячэбна-дыягнастычная дапамога аказваецца вучням Бацьвінаўскай, Касцюшкавіцкай і Сакольніцкай школ. Там арганізавана двухразовае харчаванне. 5680 школьнікаў, якія пражываюць у зоне перыядычнага кантролю, аздаравіліся па пуцёўках у незабруджаных радыенуклідамі мясцінах. 1152 санаторныя пуцёўкі былі выдадзены рай-

комам прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу для аздараўлення дарослага насельніцтва, якое пражывае ў зоне бедства.

Пабудавана і адрамантавана 384 км дарог, за кошт сродкаў ЧАЭС у калгасах узведзена 19 дамоў. У райцэнтры, у 70-кватэрным доме, пацярпелым ад катастрофы выдзелены 19 кватэр з усімі бытавымі зручнасцямі, у вёсцы Касцюшкавічы праведзена дэзактывацыя тэрыторыі дзіцячага садка.

В.Ф. Куліненка.

Мох, наш мох

из школьного сочинения на чернобыльскую тему

Я родился 16 декабря 1979 года, и мне тогда было чуть больше шести лет. Я вспоминаю отрывки своего детства.

Утро. Влажная дымка не дает пробиться солнцу. Мы с отцом вышли на огород: готовились к севу. Выглянуло солнце, и мы целый день радовались ему. Сначала работали, а после обеда всей семьей поехали на «москвиче» в лес. Через день опять – за березовым соком. Мы разожгли костер, жарили сало, пили сок. Было интересно и радостно. Сок привезли домой, угощали знакомых и друзей. Поставили его в погреб и пили все лето.

Солнечный день был и 1 Мая. Вокруг красным-красно от флагов. Все улыбаются, радуются. Мы проходим мимо трибуны и кричим: «Ура! Слава КПСС!».

9 мая к нам в Кричев приехали ветераны-освободители. Им вручали цветы и подарки. На Кургане Славы много детей и взрослых. После митинга был концерт и ярмарка.

Целое лето мы с родителями ездили под Чериков, собирали возле озера чернику, землянику, грибы. Купались в Соже, загорали.

Осенью я пошел в первый класс. В нашей школе выступали ветераны войны и труда. Проходили уроки мира. Позже все готовились отмечать 850-летие Кричева. Снова в городе был праздник. И снова красные флаги, красивые речи и песни.

О Чернобыле нам стало известно в 3-4 классах. Говорили, что реактор взорвался от нас далеко. И ни слова о том, что пострадали от взрыва и наши район, город. Об этом вскоре мы сами стали догадываться. Два-три года молчали о том, что нельзя было собирать в лесах ягоды и грибы. Мы пили чернобыльский березовый сок. Ели отравленные цезием, стронцием и плутонием грибы и ягоды. Загорали на радиоактивном солнце и купались в насыщенных радиацией реках и озерах.

Со мной училась Алеся Мельникова. Ее родители построили новый деревянный дом. Жили в нем три года, а потом Алеся заболела. Вызвали санстанцию. Когда измерили уровень радиации, он оказался выше нормы. Как выяснилось, дом поставили на холоблинском мху – он был радиоактивный. Позже за счет Госкомчернобыля им построили новый дом, а Алесе дали путевку в санаторий. Но не одна Алеся болела и болеет.

За последние годы я и мои одноклассники отдыхали в Нальчике и Витебске. А в прошлом году вместе с ребятами из Ботвиновки, Осовца и Сячика, где большой уровень радиации, побывали в Германии. За два с половиной часа самолет доставил нас в город Гютерсло (земля Северный Рейн). Поселили в немецких семьях, тоже имеющих детей. Мы хорошо понимали друг друга, да и переводчиков было много: ведь там жили беженцы – немцы из Казахстана и России.

Меня поселили в красивый деревянный дом Мехтхильды и Вильгельма Гроферов, у которых трое детей – мальчики Макс, Тило и Ян. Нас возили на концерты, в цирк и музей военной техники. Гуляли в парках, катались на каруселях. Самое яркое впечат-

ление произвел бассейн с винтовой лестницей, по которой можно было скатиться сверху в воду. Купались, сколько хотели. Знали, что дома такое нам и не присниться. Жили вместе с детьми в одной комнате, ели тоже вместе. Ездили на велосипедах на прогулки. Я с хозяйкой Мехтхильдой, кроме того, ездил часто в продовольственный магазин. Там изобилие! Такое можно увидеть только во сне.

Немецкие друзья подарили каждому из нас плейеры, кассеты, джинсы и куртки, красивые спортивные сумки, шоколадки и конфеты. Хоть там нам было хорошо, я немного соскучился по своему городу, друзьям и природе, какая у нас.

Возвращались на автобусе «Мерседес» через Германию, Польшу. Дома написали письма немецким друзьям. Осенью они прислали нам посылки и письма. Вот что написал отец Макса, Тило и Яна – Вильгельм:

«Посылаем посылку и фотографии. У нас все хорошо и вам этого желаем. Из печати узнали, что Чернобыльская АЭС еще полностью не заглушена и выделяет радиацию. Мы просим и молимся Богу за всех вас, чтобы Чернобыль снова не повторился. Молитесь Богу и вы за нас».

По решению Всемирного Совета Мира в августе ежегодно проводится Неделя действий по запрещению ядерного оружия и солидарности с жертвами атомных бомбардировок. Не только осиротевшие хиросимцы и их соотечественники – все человечество повторяет в этот день клятву. Она высечена на каменном надгробье в хиросимском Парке мира: «Спите спокойно, это не повторится!».

Хочется, чтобы люди не забывали о Чернобыле, об этой трагедии. Чтобы помнили, как запрещали говорить правду! Как обманывали и выводили на солнечные кумачовые демонстрации. И назвали имена и фамилии тех, кто замалчивал преступление против белорусов, россиян и украинцев. Правду нельзя спрятать, нельзя закопать в землю.

В нашей школе в последние годы проводится «День Чернобыля». Горят свечи, мы вспоминаем учеников, учителей, всех знакомых, кто умер после аварии. Сейчас мы открыто говорим о Чернобыле, хоть кому- то это и не нравится. Я знаю это от взрослых.

Земля у американцев, японцев, немцев, белорусов одна, и мы должны дорожить ей. Она – наш дом. Беречь ее надо всем вместе.

Виктор Бысов ученик 8-го класса СШ №4 г. Кричев

Друкуецца паводле кн.: «След черного ветра», Мн,, 1995 г.

Дрэва дружбы

В далёкой Японии в Нагасаки есть парк Мира, который посвящён памяти жертв Хиросимы и Нагасаки. Дети и взрослые со всех концов страны съезжаются в этот парк, чтобы почтить память жертв атомной бомбардировки, приносят с собой разноцветных бумажных журавликов, которых оставляют на ветвях деревьев. Ведь журавль – символ мира и дружбы. Круглый год весь парк увешан такими разноцветными гирляндами. Побывав с отцом в Японии, мы были удостоены великой чести посадить дерево дружбы – сакуру – в этом самом парке возле самого постамента, посвящённого жертвам. Подобной чести не удостаивались даже высокопоставленные лица бывшего СССР. Нашим друзьям из комитета «Помощь Чернобылю» потребовалось приложить немало усилий, чтобы получить на это разрешение. И вот частичка Беларуси теперь осталась в Стране восходящего солнца. И о нас с вами будут вспоминать не только по-

Дрэва Дружбы.

тому, что Японию и Беларусь объединяет память о погибших в результате страшной силы атома, а и потому, что в парке Мира растёт наше дерево дружбы.

Виктор Бысов. Кричев.

Советская Белоруссия, 2002 г., 24 жнгўня.

Злавесныя сляды вайны ў Афганістане

Вайна ў Афганістане не абмінула і Крычаўшчыну. Семдзесят адзін юнак удзельнічаў у баявых аперацыях у чужой краіне. Ніхто з іх не трапіў у палон, усе ўзорна выконвалі свой воінскі абавязак, маюць урадавыя ўзнагароды. Адны вярнуліся з таго пекла здаровымі, другія – інвалідамі, сем нашых землякоў загінулі. Іх мужнасць і вернасць воінскаму абавязку назаўжды застануцца ў памяці народнай.

Загінулі ў Афганістане

ВАЛЧКОЎ Віктар Генадзьевіч, нарадзіўся 27.11.1964 г. у г. Крычаў. У 1980 г. скон- чыў 8 класаў сярэдняй школы № 1, у 1983 г. – Крычаўскае ПТВ №112. У 1983 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Малодшы сяржант В.Г. Валчкоў загінуў 10.07.1984 г. пры выкананні баявога задания. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Пахаваны у г.Крычаў.

З пісьма В.Г. Валчкова бацьку.

Май 1984 г.

... Вот уже больше месяца служу в ДРА, пока служба идёт нормально...

... А сейчас здесь очень жарко, 60 градусов, 2 человека чуть не умерли от теплового удара, еле спасли. На счёт воды здесь очень плохо...

... Вот получил от тебя письмо, знаешь чуть не заплакал. Так захотелось дома побыть, хоть денёк. Такая тоска, как всё равно 1 месяц в армии. Ну ничего, мне ещё полтора года осталось...

ГАЛАЎНЁЎ Юрый Мікалаевіч, нарадзіўся 4.01.1962 г. у г. Крычаў. У 1979 г. скончыў сярэднюю школу у г. Чарнаўцы (Украіна), у 1983 г. – Камянец-Падольскае ваенна-інжынернае каманднае вучылішча. Служыў на Урале. У маі 1986 г. быў накіраваны ў Афганістан. Старшы лейтэнант Ю.М. Галаўнёў загінуў 13.11.1986 г. Пахаваны ў Мінску на Паўночных могілках. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

В. Г. Валчкоў.

ДУБРОВІЧ Сяргей Міхайлавіч, нарадзіўся 26.06.1967 г. ў саўгасе «Бальшакоўскі» Любанскага раёна Омскай вобласці. У 1982 г. скончыў 8 класаў у 1985 г. – Любанскае ПТВ № 43. У 1986 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Ваенную службу праходзіў у Афганістане. Яфрэйтар С. М. Дубровін памёр ад ран 19.10.1988 г., пахаваны ў вёсцы Даленшчына. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАРПАЎ Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся 27.08.1960 г. у г. Крычаў. У 1975 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы №3 г.Крычава, потым паступіў у Крычаўскі філіял Мінскага індустрыяльнага тэхнікума. Пасля яго сканчэння працаваў у гарадскім аўтапарку. З 1978 завочна вучыўся ў Рослаўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме Смаленскай вобласці. У красавіку 1979 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы У.С. Карпаў загінуў у баі



Ю.М. Галаўнёў. У.С. Карпаў.

3.08.1980 г. Пахаваны ў г. Крычаў, Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Лырвонай Зоркі.

КРАЎЦОЎ Леанід Віктаравіч, нарадзіўся 26.02.1964 г. у вёсцы Касцюшкавічы. Скончыў Макаўскую васьмігадовую школу, а ў 1982 г. – Крычаўскае ПТВ №112 па спецыяльнасці электразваршчык. У верасні 1982г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы Л.В. Краўцоў загінуў 1.02.1983 г. пры выкананні баявога задания. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў вёсцы Пушкары.

З пісьма камандавання часці маці Л.В. Краўцова.

... За время прохождения службы в нашей части Леонид зарекомендовал себя смелым, мужественным, исполнительным и трудолюбивым солдатом, хорошим товарищем. За организованность и дисциплину, высокое боевое мастерство, инициативу, проявленную при выполнении боевых заданий, неоднократно поощрялся командованием.

1 февраля 1983 года, выполняя боевое задание, верный военной присяге, проявив стойкость и мужество, Леонид погиб. Мы потеряли хорошего друга и солдата. Память о нём навсегда останется в наших сердцах. За мужество и отвагу, проявленные при выполнении своего последнего задания, Леонид представлен к правительственной награде.

Уважаемая Тамара Антоновна, не замыкайтесь в своём горе, пишите нам. Помните что, у вас есть боевые друзья и товарищи Вашего сына, всегда готовые придти к Вам на помощь словом и делом.

С большим уважением к Вам все сослуживцы Леонида и командир войсковой части

Е.М. Мещеряков.
Начальник политического отдела части
С.В. Ткаченко.

ЛУГАВЫ Сяргей Аляксандравіч, нарадзіўся 13.03.1965 г. у г. Крычаў. Ў 1980 г. скончыў васьмігадовую школу №4 у г. Крычаве, а ў 1983 г. – Крычаўскае ПТВ №112. У 1983 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы С. А. Лугавы загінуўу баі 4.06.1985 г. За мужнасць і адвагу пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў г. Крычаў.

МАСЛЯНКОЎ Ігар Віктаравіч, нарадзіўся 14.02.1966 г. у г. Крычаў. У 1983 скончыў сярэднюю школу №6 г. Крычава і паступіў у Магілёўскі машынабудаўшчы інстытут. У 1984 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл райваенкаматам г. Магілёва. Служыў у Афганістане. Радавы І.В. Маслянкоў загінуў 19.01.1986 г. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў г. Крычаў.

... У той дзень І.В. Маслянкоў вылецеў на задание ў складзе группы, якая праводзіла паветраную разведку пустынных раёнаў. Верталёт, у якім знаходзіўся Ігар і яго баявыя таварышы, быў збіты каля г. Лашкаргах...

З пісьма І.В. Маслянкова родным.

2 студзеня 1986г.
Лашкаргах, ДРА.

... Наконец-таки получил от вас письмо с радостным известием. У Ирины родилась дочь, жалко, что не мальчик, я бы, конечно, со Славиком хотел иметь мужика. Ну ладно, главное, что Иринка

Л.В. Краўцоў.

С.А. Лугавы.

І.В. Маслянкоў.

Погода нас не балует, начало холодать. На задание я пока не хожу, машина сломалась уже надолго...

стала матерью и всё неплохо обошлось. Это известие я получил 31 декабря 1985 г. в 16 ч. 30 мин., т.е. под Новый год. Я чувствовал повзрослевшим не на 1 год, а на несколько, что входит в понятие дяди.

Мам, а ты ж у меня теперь бабушка, и такая молодая, тебе скоро всего 43 года будет. А бабуся с дедом вообще ужо прабабуля и прадед. Так что, как видите, Новый год я встретил в великолепном расположении духа, что очень хорошо. Ну, а в общем мы отметили праздник очень неплохо. Накупили в магазине сладостей разных. Почти целый день смотрели телевизор, даже Снегурочка приходила поздравлять. Не сомневаюсь, что и вы хорошо провели праздники...

ГАЗЕТА 10-й АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ «БЕЙ ВРАГА», 1943,2 КАСТРЫЧНІКА.

Крычаўскія вайсковыя злучэнні і часць. За вызваленне горада (29.09.1943) у ходзе Бранскай аперацыі 1943 г. загадам ВГК ад 30.09.1943 г. ганаровыя найменні «Крычаўскіх» нададзены злучэнням і 1 часці Бранскага фронту.

Злучэнні і часць, якім нададзены ганаровыя найменні «Крычаўскіх»: 212-я (палк. А.П. Мальцаў) і 385-я (палк. М.Ф. Супруноў) стралковыя дывізіі, 572-і нушачны артылерыйскі полк (палк. А.Я. Савін). Тэта быў першы загад ВГК у сувязі з вызваленнем гарадоў БССР ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

М.І. Камінскі.

ГОНАР ВОІНАЎ

З асабістага архіва В.В. Міхайлава

Нашей части присвоено наименование Кричевской. Это слово вечно будет сиять на ее боевом знамени, а мы - с гордостью будем вспоминать о том, как освободили город Кричев и вступили на землю родной Белоруссии.

Не один жаркий бой выдержали мы на подступах к городу Кричев. Враг не хотел отдать этот важный узел железных и шоссейных дорог, он цеплялся за каждую высотку, за каждый овраг. Ломая сопротивление врага, мы шли вперед. Однажды мое подразделение получило приказ - обходным маневром взять укрепленный немцами населенный пункт. Мы выполнили приказ. И когда немцы пошли в контратаку, ни один наш солдат не отступил ни на один шаг. Важная позиция осталась в наших руках. Пользуясь этим, вся наша часть решительно двинулась вперед.

Много геройства и доблести проявили рядовые, сержанты и офицеры нашей части в боях за город Кричев. Его имя теперь навсегда связано с нашей частью. Оно - наша воинская гордость.

Капитан Куренков.

ВІНШАВАННЕ, НАКІРАВАНАЕ ГРАМАДСКАСЦЮ РАЁНА НА АДРАС ВОІНАЎ 385-Й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ З НАГОДЫ ГАДАВІНЫ ПРЫСВАЕННЯ ЁЙ ЗВАННЯ «КРЫЧАЎСКАЙ»

Радавым, сяржантам і афіцэрам

Трудящиеся города Кричева и Кричевского района шлют пламенный братский привет своим освободителям - воинам нашей славной 385 Кричевской стрелковой дивизии в день годового праздника.

Каждый трудящийся нашего района носит в своем сердце горячую благодарность, признательность, с волнением вспоминает 30 сентября - день, когда вы с боями освободили наш город. Мы гордимся вашими боевыми делами!

Великий Сталин присвоил вам имя нашего города. Мы уверены, что с мужеством и отвагой вы будете освобождать города и села родной Белоруссии, с честью пронесете знамя дивизии во всех боях с немецкими захватчиками.

Мы приложим все силы, чтобы помочь вам в окончательном разгроме ненавистного врага.

Да здравствует 385 Кричевская стрелковая дивизия, ее славные рядовые, сержанты и офицеры!

Да здравствует свобода и независимость нашей Родины!

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

АДКАЗ ВОІНАЎ 385-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ГРАМАДСКАСЦІ КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА

Сакратару Крычаўскага райкома КП(б)Б, старшыні райсавета дэпутатаў працоўных

Дарагія таварышы! Байцы, сяржанты і афіцэры дывізіі, якая носіць назву вашага горада, шлюць працоўным Крычава і Крычаўскага раёна гарачае баявое прывітанне!

Каля года назад мы, громячы ненавіснага ворага, вызвалілі ваш горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы бачылі попел пажарышчаў і варварскія разбурэнні, прычыненыя Крычаву гітлераўскімі мярзотнікамі. За гэтыя раны, якія нанесены вашаму савецкаму гораду, мы жорстка помсцілі і помсцім разбойнікам.

За час, які прайшоў пасля вызвалення Крычава, наша дывізія прайшла вялікі і слаўны шлях, памнажаючы славу савецкай зброі. З часу апошніх наступальных баёў на Крычаўшчыне дывізія з баямі прайшла каля 800 кіламетраў, вызваліўшы ад ворага тысячы населеных пунктаў, вызваліўшы з-пад фашысцкага прыгнёту дзесяткі тысяч савецкіх людзей.

Дывізія нанесла ворагу вялікі ўрон у жывой сіле і тэхніцы, захапіла багатыя трафеі і 4500 палонных, у тым ліку аднаго генерала, камандуючага армейскім корпусам, разам з яго штабам.

За баявыя поспехі мы ўдастоены вялікага гонару - Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'явіў нам падзяку, а ўрад узнагародзіў дывізію ордэнам Чырвонага Сцяга.

Зараз дывізія знаходзіцца ўжо за межамі нашай Радзімы і, працягваючы граміць нямецка-фашысцкага звера, набліжаецца да граніц яго чорнай бярлогі. Будзьце ўпэўнены, таварышы, што воіны Чырвонай арміі з гонарам выканаюць не толькі першую, але і другую задачу, даб'юць параненага нямецкага звера ў яго ўласнай бярлозе.

Наступаючы, громячы ворага, мы паўсядзённа адчуваем найвялікшыя клопаты аб нас. Ваша самаад даная праца ў тыле, вашы працоўныя подзвігі натхняюць нас на новыя перамогі. Мы сочым за работай працоўных вызваленых раёнаў, і асабліва Крычаўскага раёна, што аднаўляюць разбураную гітлераўскімі варварамі гаспадарку. Вашы поспехі напаўняюць нашы сэрцы гордасцю. І вось мы, жадаючы дапамагчы вам у аднаўленні гаспадаркі і ў знак непарушнай дружбы фронту і тылу вырашылі ўручыць працоўным Крычаўскага раёна падарунак - двух племянных жарабцоў...

Жадаем Вам новых працоўных поспехаў.

Няхаў жывуць працаўнікі тылу!

Камандзір Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі, палкоўнік Супруноў.

Начальнік палітаддзела Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі, палкоўнік Міхайлаў.

11 жніўня 1944.

«Шлях сацыялізму», 20 жніўня 1944 г.

ВІНШАВАННЕ, НАКІРАВАНАЕ ГРАМАДСКАСЦЮ РАЁНА НА АДРАС ВОІНАЎ 385-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ З НАГОДЫ УЗНАГАРОДЖАННЯ ДЫВІЗІІ ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

Камандзіру Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі палкоўніку Супрунову.
Начальніку палітаддзела Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі палкоўніку Міхайлаву.

Дарагія нашы вызваліцелі!

Ад імя калгаснікаў, рабочых і інтэлігенцыі горада і раёна мы шчаслівы віншаваць вас, заслужыўшых падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна, з гераічнымі баявымі поспехамі і з узнагароджаннем дывізіі ордэнам Чырвонага Сцяга.

Разам з віншаваннем прыміце нашу падзяку, нашы родныя, дарагія героі-воіны, за вашы баявыя дзеянні, за вашу слаўную франтавую гераічную працу і вашы клопаты аб аднаўленні і развіцці конегадоўлі ў раёне.

Ваш падарунак - двух племянных жарабцоў - перадалі лепшым калгасам раёна «Май» і «Маяк».

Героі нашы родныя! Працоўныя раёна не забываюць вас і ўсю нашу слаўную Чырвоную армію. Ды ці можна забыць сваіх збавіцеляў ад гітлераўскай чумы!

І тэта гераічнае лета калгаснае сялянства, стаўшы ўноў гаспадаром сваёй зямлі, сваіх калгасаў, у тэрмін выканала план веснавой сяўбы, багаты ўраджай вырас на вызваленай калгаснай зямлі. Калгасы раёна ў тэрмін убралі азімыя, прыступілі да абмалоту, ужо здалі дзяржаве 1204 пуды хлеба.

Па-ваеннаму працуе калгаснае сялянства. Рабочыя аднаўляюць прамысловасць. Ідзе падрыхтоўка да новага навучальнага года, будуем і рамантуем школы.

Працоўныя раёна падпісаліся на трэцюю Дзяржаўную Ваенную пазыку на суму 3845000 рублёў і ўнеслі наяўнымі 1592000 рублёў.

У гэтым годзе ўсе слаі насельніцтва раёна працуюць па аднаўленню народнай гаспадаркі і культуры, як яшчэ ніколі не працавалі.

Запэўніваем вас, а ў вашай асобе ўсіх воінаў Чырвонай арміі, што працоўныя вызваленага горада і раёна, імя якога носіць ваша дывізія, у будучым не пашкадуюць сіл і сродкаў для дапамогі фронту, для дапамогі сваім родным героям, сваім вызваліцелям і да гадавіны свайго вызвалення закончыць уборку калгаснага ўраджаю, здачу дзяржаве хлебанарыхтовак, выканаюць план сяўбы азімых.

Жадаем вам і ў будучым гераічных подзвігаў!

Няхай жыве наша слаўная ўсеперамагаючая Чырвоная армія, армія-вызваліцельніца!

Старшыня выканкама Крычаўскага райсавета дэпутатаў працоўных А. Цыганкоў.
Сакратар Крычаўскага РК КП(б)Б Беларусі К. Рэуцкі.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

РУ ЧНІК СТАЎ РЭЛІКВІЯЙ

Савецкія войскі паспяхова фарсіравалі раку Сож і 29 верасня 1943 г. з баямі ўвайшлі ў Крычаў.

Наперад прарваўся 1-ы батальён 669-га стралковага палка пад камандаваннем капітана К. Жукава, які разам з таварышамі вызваляў дзесяткі гарадоў і вёсак. Усюды іх радасна сустракалі мірныя жыхары.

Ледзь падступілі байцы да Крычава, як убачылі мясцовых жыхароў, якія накіроўваліся да іх. Напарадзе ўрачыста крочыла пажылая жанчына і несла на прыгожа вышытым ручніку хлеб-соль. Яна падыйшла да капітана. Камандзір батальёна Б.І. Гальперын падаў каманду: «Батальён, смірна!»

—Вазьміце, дарагія нашы вызваліцелі, хлеб-соль, - не хаваючы слёз, сказала жанчына.

Жукаўузяў дарунак і нізка пакланіўся: «Дзякуй, маці!».

—Мы так чакалі вас, так чакалі і вось дачакаліся. Вялікі дзякуй вам, родненькія нашы!

Жукаў паспытаў хлеба і солі, а потым перадаў іх афіцэрам і салдатам, якія стаялі побач.

А прыгожы ручнік аддаў жонцы, медсястры Наташы Навасадавай. На грудзях маладой жанчыны ззялі ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалі...

3 таго часу прайшло 30 гадоў. Жыхары Крычава на кургане Славы віталі ветэранаў 10-й і 50-й армій, воіны якіх вызвалялі іх родную зямлю. Хвалюючай была сустрэча былых воінаў.

Пачаўся мітынг. Успаміналі ветэраны бой за Крычаў, нялёгкія франтавыя дарогі. Уважліва слухалі прысутныя Наталлю Дзмітрыеўну Навасадаву, удзельніцу вызвалення Крычава. Муж яе, Канстанцін Жукаў, загінуў у Прыбалтыцы. Наталля Дзмітрыеўна дастала з сумачкі прыгожа вышыты ручнік і падаравала яго супрацоўнікам музея. Той самы ручнік, які жанчыны-крычаўлянкі падаравалі яе мужу разам з хлебам-соллю ў дзень вызвалення. Ручнік вярнуўся на родную зямлю, цяпер ужо ў якасці дарагой рэліквіі...

М. Мельнікаў.

АБ ЧЫМ ПІСАЛА РАЁННАЯ ГАЗЕТА «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ»

На станцыі Крычаў

Пры адступленні гітлераўцы дашчэнгу зруйнавалі чыгуначны вузел. На станцыі не засталося ні аднаго цэлага будынка. Былі ўзарваны рэйкі, стрэлачныя пераводы, вадакачка, мост цераз р. Сож. Рабочыя-чыгуначнікі неадкладна пасля выгнання немцаў узяліся за аднаўленне вузла.

Тэмпамі ваеннага часу працуюць рабочыя. Так, брыгада т. Карпекіна за адзін дзень 12 кастрычніка ўклала 700 нагонных метраў чыгуначнай лініі. Брыгада т. Бубнова за тэты ж дзень уклада 600 нагонных метраў і ўстанавіла адзін стрэлачны перавод. 26 рабочых брыгады т. Рубчынскага перашылі за дзень 1000 пагонных метраў лініі і ўстанавілі 3 стрэлачныя пераводы. Не адстае і брыгадат. Рубчынскага Г, якая перашыла 200 пагонных метраў лініі, ачысціла лінію на працяжэнні 800 пагонных метраў і падрыхтавала рэек з абломкаў на 400 пагонных метраў. Сіламі рабочых на станцыі пабудавана кузня і арганізавана работа па ўстанаўленню водазабеспячэння станцыі.

Смалякоў.

На калгасных сходах

Днямі адбыліся агульныя сходы калгаснікаў Міхеевіцкага сельсавета.

У рэзалюцыях сходаў калгаснікі выражаюць сваю ўдзячнасць слаўнай Чырвонай арміі, якая вызваліла з-пад гнёту нямецка-фашысцкіх бандытаў. Абязуючыся ўсімі сродкамі дапамагаць Чырвонай арміі гнаць заклятага ворага далей на Захад, працоўныя сельсавета заяўляюць: «Да 26-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі мы абяцаем умацаваць нашы калгасы, закончыць пасеў азімага кліна, поўнасцю завяршыць уборку ўраджаю, арганізаваць сытную і цёплую зімоўку жывёле калгасаў...»

З пратаколаў агульных сходаў калгаспікаў.

Кіно ў Крычаве

У г. Крычаве пачалася дэманстрацыя кінафільмаў. Упершыню пасля двухгадовага паднявольнага жыцця мы з захапленнем прагледзелі новыя савецкія кінафільмы:«Арлоўская Бігва», «Паветраны рамізнік» і «Народныя мсціўцы». Асабліва спадабалася нам кінакарціна «Народныя мсціўцы», якая адлюстроўвае гераічную барацьбу партызан супраць нямецкіх акупантаў. Вялікае ўражанне засталося ў нас пасля прагляду «Арлоўскай бітвы», якая наказвае магутнае наступление Чырвонай арміі.

В. Мазалькова, З. Цёханава.

Першыя пісьмы

Адразу ж пасля вызвалення Крычаўскага раёна ад гітлераўскіх бандытаў распачала работу раённая кантора сувязі. За кароткі час абсталяваны невялікі радыёвузел, а таксама тэлсфонная станцыя. Пры сельсаветах адчынена 9 паштовых аддзяленняў. Пачаўся рэгулярны абмен карэспандэнцыямі. 3 4-га па 13-е кастрычніка адпраўлена 1996 пісем на фронт і ў розныя гарады Савецкага Саюза. 13 кастрычніка прыбыла першая пошта і ў Крычаў. Былі дастаўлены цэнтральныя газеты і пісьмы.

Адным з першых атрымаў пісьмо з Масквы ад сына-лётчыка жыхар г. Крычава Сямён Кандратавіч Зуеў. Сын віншуе бацькоў з вызваленнем роднага горада ад нямецкіх акупантаў.

В.В. Палянскі.

«Шлях сацыялізму», *1943, 16 кастрычніка.*

Іх пазнаёміла вайна

Вызвалены ад фашыстаў Крычаў ляжаў у руінах. Усюды чарнелі выбітыя снарадамі ямы, ляжалі кавалкі раструшчанай цэглы, панура стаялі абгарэлыя хаты. А раённыя ўстановы ўжо працавалі. У цеснаваты пакойчык бюро ЗАГС раніцай зайшоў малады афіцэр з ордэнамі і медалямі на старанна адпрасаванай гімнасцёрцы і дзяўчына.

— Хочам зарэгістраваць шлюб, — сказаў афіцэр, дастаючы дакументы.

Гэта быў Уладзімір Акімавіч Сілкін, ураджэнец Крычава. Ён закончыў Пензенскае артылерыйскае вучылішча перад самай вайной. Першы бой маладому афіцэру давялося прыняць пад Белай Царквой на Кіеўшчыне. Байцы адбівалі бясконцыя атакі фашысцкіх танкаў, якія, пры падтрымцы пяхоты, ірваліся наперад. Мужна змагаліся нашы воіны, трапнымі стрэламі падпальваючы танкі. У тым баі з узво- да жывым застаўся толькі Уладзімір Сілкін. Артылерысты цаной свайго жыцця выканалі загад камандавання, не адступілі і да апошняга стрымлівалі рух варожай калоны.

Потым Уладзімір Сілкін удзельнічаў у абароне Сталінграда, ваяваў на Курскай дузе, вызваляў Беларусь ад акупантаў. Нямала пройдзена было нялёгкіх франтавых дарог і над пякучым сонцам і ў завейныя, марозныя часіны.

У час бітвы на Курскай дузе лёс звёў яго з маладой дзяўчынай, медсястрой Вольгай. Спадабалася Сілкіну яе мужнасць, увішнасць, ласкавае абыходжанне з ранеными. Нарадзілася яна ў г. Дзяржынску Горкаўскай вобласці, дабраахвотна пайшла на фронт. Каханне прыйшло да абодвух, хоць ва- кол былі смерць, гора і боль.

Баі ўжо ішлі пад Рагачовам. Даведаўшыся, што Крычаў вызвалены ад чужынцаў, Уладзімір папрасіў у камандавання кароткатэрміновы вод- пуск, каб прыехаць на радзіму і зарэгістраваць шлюб. Просьбу яго задаволілі. Уладзімір і Вольга атрыма- лі шлюбнае пасведчанне №1. Гэта была першая сямейная пара, зарэгі- страваная Крычаўскім бюро ЗАГС пасля вызвалення горада ад фашыстаў.

Стаўшы мужам і жонкай, Уладзімір і Вольга зноў вярнуліся на фронт. Вайна працягвалася, вораг аказваў жорсткае супраціўленне. Сябры цёпла па-

віншавалі маладых пад посвіст куль і выбухі снарадаў.

На Крычаўшчыну Уладзімір і Вольта вярнуліся ў 1945 годзе. Грудзі артылерыйскага маёра ўпрыгожвалі два ордэны Айчыннай вайны, два - Чырво- най Зоркі, ордэн Аляксандра Неўска- га, медалі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» і шмат іншых. Паблісківалі ўзнагароды і на грудзях яго жонкі, адважнай і руплівай медыцынскай сястры. У пасляваенны час Уладзімір Акімавіч і Вольта Пятроўна працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі. За самаадданую працу Вольта Сілкіна была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

З.М. Качкова.

У нашай памяці навечна

Я не памятую свайго прадзеда. Але пра яго мне расказаў бацька, машыніст лакаматыўнага дэпо.

Мой прадзед, Віктар Сяргеевіч Паўлаў, пайшоў на вайну ў 1941 годзе. Быў выпускны баль. А раніцай наступнага дня, пасля выпускнога, пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ён вучыўся з аднагодкамі ў той жа школе, што і я цяпер. І школьныя класы і калідоры памятуюць пра вучняў тых год. Ён быў музыкантам, пасля гарачых баёў браў трубу і на прывалах граў. Звала яго труба і ў бой з ворагам. Прадзед дайшоў да Берліна. Ён узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна». Быў кантужаны і лячыўся ў шпіталі. Вярнуўся з вайны інвалідам вайны III трупы. Пасля Перамогі над фашыстамі працаваў у лакаматыўным дэпо загадчыкам хімічнай лабараторыі. А пасля работы ішоў у клуб чыгуначнікаў, дзе кіраваў духавым аркестрам. Да яго ішлі вучыцца і вучні школ, і рабочыя. Духавы аркестр быў самым маладым у горадзе. Дзеці гралі сваім бацькам на святах. Аркестр праводзіў у апошні шлях ветэранаў чыгункі. Чароўныя гукі духавога аркестра звалі вечарам на танцпляцоўку. Духавы аркестр нёс людзям весялосць і радасць, імкненне і жаданне жыць.

Няма ў жывых прадзеда. Але напамінаюць аб ім ноты, яго дыпломы, фотаздымкі тых часоў, баявыя ўзнагароды. Ён скончыў Ленінградскі хімікатэхналагічны інстытут і інстытут культуры. Адыходзяць з кожным годам ветэраны. Яны адлятаюць ад нас, нібы тыя журавы ў вырай. Але памяць аб іх застаецца назаўсёды.

Я кожны год 9 мая іду на Курган Славы. Іду на сустрэчу са сваім прадзедам. Бачу яго сяброў, ветэранаў, якія таксама змагаліся з фашыстамі за наша жыццё. І калі чую гукі духавога аркестра, то ўпэўнены,што дзесьці побач і мой прадзед грае на трубе. Я бачу, як граюць яго вучні. Музыка духавога аркестра, як і памяць аб чалавеку, — вечная. Няхай заўсёды грае духавы аркестр майго прадзеда... Ён нясе мелодыі тых ваенных часоў, Перамогі 1945 года!

Саша Васіленка,
вучань 5 «Б» класа школы №4 г. Крычава.

Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Крычаўшчыны

ГУСАКОЎСКІ Іосіф Іракліевіч, нарадзіўся 25.12.1904 г. у вёсцы Вародзькава. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), генерал арміі (1968). У Чырвонай арміі з 1928 г. Скончыў кавалерыйскую школу (1931), Ваенную акадэмію Генштаба (1948). 3 ліпеня 1941 г. на Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах: начальнік штаба танкавага палка, танкавай брыгады, з 1943 г. камандзір танкавай брыгады. Удзельнік Маскоўскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Польшчы, баёў за Берлін. Вызначыўся пры знішчэнні бродскай групоўкі праціўніка ў час Львоўска-Сандамірскай аперацыі 1944 г.

За ўмелае кіраўніцтва брыгадай і мужнасць, праяўленую ў ходзе гэтай аперацыі, палкоўнік Гусакоўскі быў удастоены звания Героя.

У ходзе Вісла-Одэрскай аперацыі брыгада атрымала загад выступіць перадавым атрадам. Атрад пайшоў да ракі Піліца, у раёне Новэ-Мяста. Аднак з ходу яе фарсіраваць не змог, бо пераправы былі ўзарваны, а лёд аказаўся тонкім. Гусакоўскі прыняў рашэнне ўзарваць лёд і перайсці раку па дну ноччу. Плацдарм быў захоплены, пераправа галоўных сіл корпуса забяспечана.

Прарваўшыся ў тыл Мезярыцкага ўмацаванага раёна, брыгада на праця- гу двух сутак, у адрыве ад галоўных сіл корпуса, утрымлівала захоплены раён. Танкісты 44-й гвардзейскай брыгады вялі напружаныя абарончыя баі да падыходу галоўных сіл корпуса, і 6 красавіка 1945 г. камандзір брыгады гвардыі палкоўнік 1.1. Гусакоўскі стаў двойчы Героем Савецкага Саюза.

У сям'і Гусакоўскіх, акрамя Іосіфа, было яшчэ 5 сыноў і 2 дачкі. Усе браты Гусакоўскія былі абаронцамі Радзімы. Старэйшы, Адам Іракліевіч Гусакоўскі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне, вучыўся ў ваеннай акадэміі імя Фрунзе. Памёр у Маскве ва ўзросце 34 гадоў. Палкоўнік запаса, ваенны ўрач Фёдар Іракліевіч Гусакоўскі, удзельнік

Парад партызан у Крычаве, кастрычнік 1943 г.

грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ваенным мараком-афіцэрам стаў Яўген Іракліевіч Гусакоўскі. Усю Вялікую Айчынную правёў на перадавой лініі начальнік аператыўнага аддзела авіядэсантнай дывізіі Аляксандр Іракліевіч Гусакоўскі. Загінуў 17.03.1945 г. у Венгрыі. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне Георгій Ірак- ліевіч Гусакоўскі. Быў цяжка паранены.

Пасля вайны І.І. Гусакоўскі на камандных пасадах. Камандаваў танкавай дывізіяй, аб'яднаннем, войскамі Прыбалтыйскай ваеннай акругі, быў начальнікам Галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны СССР. З 1970 г. у Трупе генеральных інспекта- раў Міністэрства абароны СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1962—1970 гг. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу Радзіме ва Ўзброеных сілах СССР» III-й ступені, а так- сама замежнымі ордэнамі. Памёр 20.02.1995 г. У Крычаве яго імем названа вуліца, у Магілёве пастаўлены бюст. Аўтар кнігі «Помніце - вы сяржант» (М., 1961).

І.І. Гусакоўскі.

А.І. Смалякоў.

СМАЛЯКОЎ Абрам Яфімавіч, нарадзіўся 29.05.1908 г. у вёсцы Ермакоўка. Герой Савецкага Саюза (1943). Скончыў курсы Вышэйшай партшколы ў Кіеве. Знаходзіўся на партыйнай рабоце ў Ташкенце. У Чырвонай арміі з 1930 г. На фронце з 1941 г. Намеснік камандзіра на палітчастцы знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка маёр Смалякоў вызначыўся ў Курскай бітве на Белгарадскім напрамку. Полк, у саставе якога знаходзіўся А.Я. Смалякоў, 6—7.07.1943 г. знішчыў 89 танкаў праціўніка.

30.09.1943 г. пераправіўся цераз Дняпро каля Канева і заняў абарону.

3.10.1943 г. у контрнаступленні вораг пацясніў нашы стралковыя часці. А.Я. Смалякоў удзельнічаў у адбіцці атак праціўніка, асабістым прыкладам натхняў артылерыстаў на выкананне баявой заданы. У час бою вёў агонь з гарматы, разлік якой выйшаў са строю. Некалькі танкаў было падбіта, знішчаны дзесяткі гітлераўцаў. У гэты дзень ён загінуў.

Звание Героя прысвоена пасмяротна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалём «За адвагу». Ііахаваны ў сяле Ляплява Канеў- скага раёна Чаркаскай вобл. Яго імем названа вуліца ў Крычаве.

У Крычаўскім краязнаўчым музеі захоўваецца надпіс на фотаздымку, які А.Я. Смалякоў паслаў сыну 17 верасня 1941 года: «На памяць роднаму сыну Вове. Памятай, сынок, калі твай- му бацьку давядзецца загінуць у Айчыннай вайне, памерці за радзіму ў барацьбе супраць заклятых ворагаў - гітлераўскіх сабак, ты, сынок, будзь патрыётам сваёй Айчыны. Помсці, колькі будзеш жыць, за кроў тых, хто

загіне ў барацьбе з крывавым фашыз- мам. Гартуйся як сталь. Будзь непрымірымым да ворагаў. Твой бацька А. Смалякоў».

СТАЛЯРОЎ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся 20.05.1919 г. у г. Крычаў. Герой Савецкага Саюза (1943). З дзяцінства жыў у Ленінградзе. Скончыў 7 класаў школы № 35, школу ФЗН, працаваў на суднабудаўнічым заводзе. У Чырвонай арміі з 1938 г. Скончыў Чугуеў- скае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1940). З пачатку вайны ў Закаўказскай ваеннай акрузе, потым на Сталінградскім, Калінінскім, Паўднёва-Заходнім, 2-м Украінскім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі 629-га знішчальнага авіяцыйнага палка лейтэнант М.І. Сталяроў вызначыўся ў баях пад Сталінградам. За час вайны зрабіў 310 баявых вылетаў, правёў 67 паветраных баёў.

Аднапалчанін М. Сталярова пал- коўнік М. Астапчук успамінаў: «Мікалай Сталяроў не толькі лятаў вядучым, але і арганізоўваў баі эскадрыллі, выконваючы самыя адказныя даручэнні па разведцы тылу праціўніка. Нягледзячы на супрацьдзеянне гітлераўскіх зенітак, лейтэнант Сталяроў на сваёй чырвоназорнай машыне прарываўся ў раёны станіц Бокаўская, Марозаўская, Чарнышэўская, і здабытыя дадзеныя аб нямецка-фашысцкіх войсках своечасова дастаўляў камандаванню, што мела вялікае стратэгіч- нае значэнне».

За час вайны зрабіў 310 баявых вылетаў, правёў 67 паветраных баёў, збіў 6 самалётаў праціўніка, 4 у трупе. Да 1960 г. у Савецкай арміі, палкоў- нік, потым да 1970 г. на адміністратыўнай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I ступені, 2 ордэнамі Чырвонай зоркі, медалямі. Памёр 14.08.1985 г.

Поўны кавалер ордэна Славы

КАРНЕЕНКА Уладзімір Якаўлевіч, нарадзіўся 15.07.1924 г. у вёсцы Губіншчына. Поўны кавалер ордэна Славы. На фронце з 1943 г. Камандзір кулямётнага разліку ст. сяржант У.Я. Карнеенка вызначыўся пры вызваленні Беларусі і Полынчы: 28.02.1944 г. у в. Янава Быхаўскага раёна знішчыў кулямёт і каля 20 гітлераўцаў, паране- ны працягваў бой; у ліпені 1944 г. у баі на тэрыторыі Смалявіцкага раёна прабраўся з разлікам у тыл праціўніка, агнём пасеяў паніку, гэтым памог савецкім падраздзяленням прарваць нямецкія пазіцыі. У студзені 1945 г. на тэрыторыі Польшчы ўдзельнічаў у адбіцці 5 варожых атак.

М.І. Сталяроў.

У.Я. Карнеенка.

Мужнасць кулямётчыка

Наступіў 1943 год.

Познім зімовым вечарам з адной хаты вёскі Губеншчына выйшаў на вуліцу юнак, апрануты ў ватоўку, з туга напакаванай палатнянай торбачкай за плячыма. Ён пастаяў нейкі час на бязлюднай дарозе, прыслухоўваючыся, потым рашуча пакрочыў у бок недалёкага лесу.

Мароз памякчэў, цёпла дыхнуў паўднёвы вецер, і снег, абліты святлом поўні, страціў сваю настылую рыпліваць. Юнак спяшаўся хутчэй праскочыць поле і з палёгкай уздыхнуў, калі апынуўся пад хваёвымі шатамі змрочнага лесу. Гэта быў Уладзімір Карнеенка, трымаў ён шлях у лясы пад Прапойскам, дзе, як яму расказалі, змагаўся з гітлераўцамі партызанскі атрад «13» пад камандаваннем Сяргея Уладзіміравіча Грышына. Менавіта туды хацелася Карнеенку трапіць і менавіта там ваяваць.

Ісці па снезе было цяжка. Дарогі ў лесе не трапляліся, усюды ляжаў некрануты сыпкі снег, у які глыбока правальваліся ногі. На палявыя сцяжыны выходзіць было небяспечна, выпадкова можна напароцца на немцаў ці паліцаяў.

Світанак заспеў Уладзіміра за Чэрыкавам. Днём юнак рашыў не рухацца, забіўся ў лясны гушчар, наламаў на подсціл лапніку, расклаў з усохлага галля агеньчык, падсілкаваўся і лёг адпачыць. Вечарам зноў рушыў у дарогу.

У Прапойскія лясы Карнеенка трапіў на трэція суткі. Яны яго сустрэлі нязвыклай цішынёй і бязлюддзем. Куды падацца, дзе шукаць партызан?

Між тым торбачка з харчам прыкметна апусцела, заставалася некалькі цыбулін і падмерзлы кавалачак хлеба. Хацелася ад стомы піць, і Уладзімір прагна глытаў снег. Ён пайшоў напрасткі, борам. Сцямнела, на небе высыпал! буйныя зоркі. Уладзімір спыніўся, з усіх бакоў яго акружала чарна- та. Зноў наламаў лапніку, уладкаваў- ся адпачываць. Недзе згаладала вылі ваўкі. Юнак намацаў у кішэні пісталет. Праўда, патронаў было мала, усяго шэсць штук.

Раніцай рашыў падацца ў другі бок. Невыносным агнём пякло здарожаныя ногі, па целе разлівалася слабасць. Здрадліва хіліла да сну, але Уладзімір ведаў: засні, заплюшчы вочы і акале- еш на марозе. Таму імкнуўся рухацца, не здавацца зморы.

Толькі на чацьвёртыя суткі Карнеенку, згаладалага, знясіленага, абмарожанага, знайшлі разведчыкі з атрада Сяргея Уладзіміравіча Грышына і прывялі ў атрад. Так ён стаў партызанам. У той час Залатая зорка Героя Савецкага Саюза ўпрыгожвала грудзі камандзіра атрада «13». Гэта быў адважны і вопытны партызанскі важак.

Мара Карнеенкі збылася, ён пачаў ваяваць з фашыстамі ў складзе атрада Грышына. Партызаны рабілі засады на шасэйных дарогах, узрывалі чыгуначныя маеты, нападалі на ўмацаваныя гарнізоны, пускалі пад адхон варожыя эталоны з жывой сілай і тэхнікай. І ва ўсіх гэтых баявых аперацыях самы актыўны ўдзел прымаў Уладзімір Якаўлевіч Карнеенка.

Правакатары высачылі месца знаходжання лагера народных мсціўцаў і данеслі аб гэтым нямецкаму камандаванню. У аперацыі па ліквідацыі партызан былі задзейнічаны дзве фашысцкія дывізіі, узброеныя танкамі, гарма-

тамі, мінамётамі і новымі самалётамі. Між тым у партызан мелася толькі стралковая зброя.

Закіпелі цяжкія баі недалёка ад вёсак Рабінаўка, Рабвічы, Лясная на Прапойшчыне. Была восень, днём бязупынна лілі дажджы, а раніцамі размоклую зямлю выбельваў іней. Сілы былі няроўныя. Ворагу ўдалося акружыць атрад Грышына. Пачалася Боўская блакада. Васемнаццаць дзён і начэй не змаўкала ў лясах страляніна, парахавы дым, нібы туман, заслаў наваколле.

Гітлераўцы ўжо бачылі блізкую перамогу. Для іх не было сакрэтам тое, што ў партызан не засталося харчу і канчаюцца боепрыпасы, яны чакалі, што вось-вось народныя мсціўцы з'явяцца перад імі з узнятымі рукамі. Становішча партызан было сагіраўды цяжкім. Камандаванне рашыла ісці на прарыў блакады. Было тэта рызыкоўна, аднак іншага выйсця не існавала.

Глухой цёмнай ноччу партызаны бясшумна падпаўзлі да варожых пазіцый і напалі на гітлераўцаў. Заспелыя знянацку, немцы адкрылі страляніну і пачалі мітусіцца. Гэтую неразбярыху ў стане ворага і выкарысталі партызаны, паспяхова прарваўшы шчыльнае кальцо акружэння. Гітлераўцы не змаглі адразу пусціцца за партызанамі ў пагоню. Адарваўшыся ад ворага, народныя мсціўцы зрабілі нядоўгі пры- пынак, перавязалі раненых і рушылі далей.

Хутка атрад Грышына сустрэўся з часцямі Чырвонай арміі, што гналі чужынцаў з захопленай тэрыторыі. Гэта была незабыўная сустрэча.

Уладзімір Карнеенка з партызанскага атрада трапіў на фронт, стаў кулямётчыкам. Пачаліся нялёгкія франтавыя будні. У роце ваявалі людзі розных нацыянальнасцей: малдаване, украінцы, армяне, азербайджанцы. Былі тут воіны як маладога, так і сталага ўзросту, спрактыкаваныя і вопытныя абаронцы Радзімы.

... Люты 1944 года выдаўся снежным, марозным і завейным. Уначы чырвонаармейцы фарсіравалі раку Днепр і захапілі вышыню кіламетраў за 11 ад Быхава. Фашысты скаціліся ўніз, ачомаліся ад імклівага ўдару наших войск і зразумелі, што страцілі важную стратэгічную пазіцыю. Рашылі адваяваць любой цаной вышыню і замацавацца на ёй.

Кулямётная рота, у якой ваяваў Уладзімір Карнеенка, заняла абарону. Завязаўся гарачы бой. Буйныя сілы немцаў штурмавалі вышыню, іх падтрымлівала артылерыя. Снарады разрывал! мёрзлую зямлю, асколкі з шумам прашывалі паветра. Вырыць акопчык Карнеенка не паспеў, ляжаў у сыпкім снезе і вёў прыцэльны агонь па ворагу. Байцы адбілі адну контратаку, але цішыня пастаяла над наваколлем нядоўга: фашысты зноў пайшлі на штурм вышыні. Ствол кулямёта рабіўся малінавым, і Уладзімір ахалоджваў яго снегам.

ГІа тым, як радзеў кулямётны агонь, Карнеенка зразумеў, што многія яго сябры цяжка паранены або забіты. Яго «максім» працаваў бесперапынна. Галоўнае - не даць гітлераўцам узняцца для атакі, не даваць ім магчымасці паўзці, набліжацца да занятых пазіцый. Раптам штосьці балюча апякло нагу. Перавязаць рану не было часу: фашысты ўпарта лезлі ўперад, толькі прыцэльны і бесперабойны агонь стрымліваў іх.

Пяць контратак давялося адбіць у той дзень абаронцам вышыні. Шмат гітлераўцаў засталося ляжаць пад ёй.

Калі падыйшла дапамога, і гітлераўцы пакаціліся ад вышыні прэч, Уладзімір звярнуў увагу на параненую нагу. Яна здранцвела, апухла. Камандзір роты адправіў байца ў медсанбат.

Пасля гэтага бою Карнеенку ўзнагародзілі ордэнам Славы III ступені. Ён знішчыў болын за 40 гітлераўцаў і варожы кулямётны разлік.

Нашы войскі вызвалялі ад захопнікаў беларускія гарады і вёскі. Людзі з радасцю сустракалі салдат, частавалі іх яйкамі, свежым малаком, салам, шчыра дзякавалі за вызваленне.

У сакавіку 1944 года дывізія, у якой ваяваў Карнеенка, ужо дзейнічала на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Цёплым веснавым днём чырвонаармейцы выбілі ворага з пароспай дробным ядлоўцам вышыні каля вёскі Красніца. Фашысты рашылі адваяваць страча- ныя пазіцыі, згрупавалі сілы і пайшлі ў наступление. Засакаталі кулямёты, забухкалі выбухі снарадаў. Першая атака гітлераўцаў была адбіта. Яны залипли, праз некалькі хвілін зноў паўзлі ў бок вышыні пры падтрымцы артылерыйскага агню.

Карнеенка размясціўся са сваім «максімам» ля раскідзістага куста ядлоўцу, які хаваў яго ад варожага вока. Але кулі, бы раззлаваныя пчолы, пагрозліва гулі над галавой. Раптоўны боль у руцэ прымусіў Уладзіміра на момант адарвацца ад кулямёта. Набрыняў крывёй рукаў шыняля, рана крывавіла. Адна куля прайшла руку навылёт каля пляча, другая - ніжэй локця. Рука зрабілася быццам не сваёй, адзервянела і бездапаможна павісла.

У тэты час немцы зноў кінуліся ў атаку. Што рабіць? Не было ні страху, ні разгубленасці. Кулямёт Карнеенкі клаў фашыстаў у снег, прымушаў іх адпаўзці. Страляў воін адной рукой. Амаль двое сутак штурмавалі гітлераўцы вышыню. І двое сутак паранены і аслабелы Уладзімір не пакідаў сваёй пазіцыі. Калі фашысты адступілі, страціўшы надзею захапіць перакапаную мінамі і снарадамі вышыню, Карнеенку знайшлі санітары...

За і'эты бой Уладзімір Якаўлевіч быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступень Потым была яшчэ адна ўрадавая ўзнагарода. За воі некую кемлівасць, мужнасць і гераізм камандзір стралковага палка асабіста прымаца- ваў да гімнасцёркі Карнеенкі ордэн Чырвонай Зоркі.

У ліпені 1944 года акружаныя наінымі войскамі на подступах да Мінска, у Лагойскім раёне, 10 нямецкіх дывізій спрабавалі вырвацца з акружэння. Мала даводзілася адпачываць у гэтыя дні нашым воінам. У Карнеенкі пажаўцеў твар, слязіліся вочы. Але баец адганяў стому. Кулямётчыкі адбівалі шматлікія танкавыя атакі ворага, вытрымлівалі артабстрэл, рассейвалі варожую пяхоту. У баях за знішчэнне нямецкай групоўкі войск Уладзімір Якаўлевіч паказаў сапраўдны гераізм, умение арыентавацца ў самых складаных абставінах, вытрымку. За баі на Лагойшчыне Уладзімір Якаўлевіч атрымаў ордэн Славы I ступень

У цяжкіх баях на тэрыторыі Польшчы мужны кулямётчык быў паранены, лячыўся ў шпіталі. Пасля выздараўлення апынуўся ля сцен Кёнігсберга, дзе прымаў удзел у штурме варожай цытадэлі. Давялося Карнеенку пабываць і на Далёкім Усходзе, ваяваць з японскімі мілітарыстамі.

У родную вёску Губіншчына Уладзімір Якаўлевіч вярнуўся ў 1945 годзе. Ідучы па вуліцы, уважліва агля-

даў напоўразбураныя хаты вёскі, спаленыя фашыстамі і зарослыя непралазнай крапівой дварышчы і думаў аб тым, колькі сіл трэба ўкласці ў аднаўленне роднага селішча. Партызана і франтавіка чакалі нялёгкія працоўныя будні.

З.М. Скачкова.

Баявы шлях артылерыста

Шасцю ордэнамі адзначаны баявы шлях маёра-артылерыста Уладзіміра Акімавіча Сілкіна. Ён ваяваў усю Вялікую Айчынную вайну, з першага і да апошняга дня. Тры гады і восем месяцаў на перадавой. А пачынаў салдатам у далёкім 1939-м. За плячыма было 8 класаў Крычаўскай сярэдняй школы і 2 курсы фізкультурнага тэхнікума.

Спартсмен, удзельнік Усесаюзнага парада фізкультурнікаў 1939 года, Уладзімір цалкам адпавядаў патрабаванням, якія прад'яўляліся да курсантаў ваеннага вучылішча, таму і быў накіраваны ў адно з іх пасля года службы ў 27-м горна-кавалерыйскім палку, які базіраваўся ў Самаркандзе.

Вучыцца ў Пензенскім артылерыйскім вучылішчы трэба было два гады, але вайна скараціла гэты тэрмін удвая. У самым пачатку ліпеня 1941 года з ліку курсантаў адабралі 20 чалавек, якія да паступлення ў вучылішча служылі ў арміі, прысвоілі ім званне «лейтэнант» і накіравалі ў баявыя часці. Сярод іх быў і Сілкін. Так 85-ы полк 100-й стралковай дывізіі Паўднёва-Заходняга фронту папоўніўся маладым камандзірам супрацьтанкавай батарэі. Баявое хрышчэнне Уладзімір прыняў на Украіне, над Белай Царквой.

— Бітва была цяжкай і кровапралітнай,— успамінае ветэран. — З-за клубаў дыму і пылу не было бачна сонца. Стрэлы і выбухі чуліся з усіх бакоў. Варожая пяхота пры падтрымцы танкаў бесперапынна лезла на нашы пазіцыі, а ў тыле дзейнічалі атрады дыверсантаў. Выстаяць супраць такой навалы было немагчыма, і першы бой закончыўся акружэннем...

Сем сутак блукаў лейтэнант па варожых тылах, далёка абыходзячы цэнтральныя дарогі і буйныя вёскі, аднак сорак байцоў сабраў і да лініі фронту вывеў. І трэба ж было так здарыцца - трапіў якраз у свой полк.

—Другі раз з акружэння выходзілі на працягу ўсяго снежня ў складзе трох палкоў. Цяжка было, але вырваліся. А 19 студзеня 1942 года паблізу невялікага украінскага сяла мая батарэя была разбіта,—кажа Уладзімір Акімавіч. - Засталіся дзве гарматы і чалавек восем байцоў. Я атрымаў кулявое і асколачнае раненні. Слабаватымі аказаліся нашы «саракапяткі» супраць танкавых гармат. У шпіталь трапіў туды, дзе пачынаў службу - у Самарканд. Пасля выздараўлення, як і ўсе афіцэры 100-й дывізіі, якая першай атрымала ганаровае званне гвардзейскай, паехаў у Маскву за назначэннем. Накіравалі ў 416-ы асобны артылерыйска-кулямётны батальён 115-га ўмацаванага раёна, байцоў якого пра- звалі смертнікамі. Стаялі пад Масквою, у Падольску. А як толькі пачалі- ся баі пад Сталінградам, нас кінулі туды. Я атрымаў батарэю гармат калібру 76 мм. Гэта ўжо была салідная зброя, з ёю можна было процістаяць нямецкім танкам.

Іх мы сустрэлі на Мамаевым кургане. Загад абвяшчаў: «Ні крону назад! За Волгаю для вас зямлі няма!» Баі былі жорсткімі, работы для маіх гармат хапала. Вораг таксама не драмаў, рабіў за дзень на 500 самалёта-вылетаў і скідваў на нашы пазіцыі сотні тон смертаноснага грузу. Бамбіў з нямецкай пунктуальнасцю з 8 да 18 гадзін. Спрабаваў уздзейнічаць і на псіхіку байцоў, скідваючы з самалётаў парожнія бочкі з-пад паліва і кавалкі чыгуначных рэек, якія з прарэзлівым завываннем ляцелі на зямлю. Але байцы хутка прывыклі да гэтай «музыкі».

Нашы гарматы стаялі за 200 метраў ад нямецкіх акопаў - так было бяспечней, бо палова скінутых с іхніх самалётаў бомбаў трапляла на галовы іхніх жа салдат. Паміж нашымі і варожымі дзотамі было каля 50 метраў, і байцы перакідваліся гранатамі. Здаралася, што немцы знаходзіліся зусім побач, у суседнім пакоі занятага дома. Спрабавалі мы і атрымліваць ад немцаў «падарункі». Справа ў тым, што акружаную нямецкую групіроўку забяспечвалі ўсім з паветра з надыходам цемры. Куды скідваць, ворагі паказвалі ракетамі. Нашы байцы хутка сцямілі, у чым справа, і таксама пачалі выстрэльваць ракеты, як толькі чулі ў паветры гукі мататаў. А потым збіралі мяшкі з каўбасой і кантэйнеры з кансервамі, шакаладам і вітамінамі. Аднойчы немцы скінулі нам ажно 8 пасылак.

Пяць месяцаў мы адбылі ў самым пекле і, як ні дзіўна, батарэя не страціла ніводнага чалавека, нават параненых не было. Усе салдаты і афіцэры былі ўзнагароджаны. Ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў і я, разам з выклікам у сталіцу. Там мне даручылі фарміраванне артдывізіёна 506-га асобнага артылерыйска-кулямётнагабатальёна, які потым атрымаў назву «Гомельскі»...

Напярадзе была Курская дуга, потым вызваленне роднай Беларуси Артдывізіён старшага лейтэнанта Сілкіна прымаў непасрэдны ўдзел у аперацыі «Баграціён».

—Агнявую пазіцыю займалі пад Рагачовам, — працягвае свой расказ ветэран. У час падрыхтоўкі аперацыі я змог пабываць у Крычаве, сустрэцца з роднымі: два дні даў мне на тэта камбат. Пасля сустрэчы і ваяваць стала лягчэй.

Аперацыя «Баграціён» пачалася артпадрыхтоўкай, якая працягвалася каля дзвюх гадзін. Глыбокаэшаланіраваная абарона фашыстаў была ўзламана, і наша войска перайшло ў імклівае наступление. Лета 1944-га было, як дзве кроплі вады, падобнае на лета 1941-га, толькі адступалі ўжо немцы...

Беларусь была вызвалена, а на кіцелі афіцэра-артылерыста заззяў ордэн Аляксандра Неўскага. За фарсіраванне Віслы ён быў адзначаны ордэнам Айчыннай вайны II ступени

— Па Полылчы і Усходняй Прусіі салдаты ўжо не ішлі, а ехалі, хто на чым, — кажа Уладзімір Акімавіч, — Машыны, матацыклы, павозкі, веласі- педы адзінай лавінай рухаліся на Берлін, і спыніць гэту лавіну было не- магчыма. Здаралася, што раптам на дарогу выходзіла ўзброеная варожая калона, і тады ўспыхваў кароткі бой...

Так артдывізіён Уладзіміра Акімавіча прайшоў да ўзбярэжжа Балтыкі і спыніўся насупраць Шчэціна, закрыўшы выхад з заліва ў мора. Прыцэльным агнём гармат было патоплена пяць варожых бранякатэраў і адзін параход. За тэта храбры афіцэр, які яшчэ ў школьныя гады, не задумваючыся, мог

выступіць і супраць пяці крыўдзіцеляў, атрымаў ордэн Айчыннай вайны I ступені. А дывізіён перакінулі на раку Нейсе. 2 мая 1945 года байцы прайшлі міма Берліна і накіраваліся да ракі Эльбы.

Цяжкая і кровапралітная вайна закончылася доўгачаканай перамогай над ворагам. Салдаты і афіцэры раз'ехаліся па дамах, іх чакалі фабрыкі, заводы і калгасныя палеткі, а Уладзімір працягваў служыць да 1957 года. У 1947 годзе яго знайшоў яшчэ адзін ордэн Чырвонай Зоркі, а другі ордэн Айчыннай вайны I ступені Уладзіміру Акімавічу ўручаны ўжо ў наш час.

Ёсць у ветэрана і болын дзесятка медалёў, у іх ліку «За абарону Сталінграда», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

А. Балдоўскі.

Дарогі салдацкія

Сямён Васілевіч нарадзіўся ў вёсцы Чырвоная Буда. Тут закончыў сельскую школу. У 1936 годзе быў прызваны ў Чырвоную армію. Служыў у гарадах Вялікія Лукі і Ленінградзе. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супраць белафінаў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, М.І. Калінін уручыў яму медаль «За адвагу». Сямёну Васілевічу Тарасенку тады ж было прысвоена званне лейтэнанта.

У Вялікую Айчынную вайну Тарасенка з першых дзён на фронце, на ленінградскім напрамку. Фашысты ўпарта наступалі Артылерысты не мелі перадышкі. Пад Ленінградам Сямён Васілевіч атрымаў цяжкае ранение, у асаджаным горадзе яму зрабілі аперацыю і па Ладажскім возеры пераправілі ў Свярдлоўскі шпіталь.

Калі раны былі залечаны, Тарасенку прапанавалі нестраявую службу ў тыле. Але не згадзіўся лейтэнант. Ён піша рапарт за рапартам аб адпраўцы на фронт. Настойлівасць узяла верх. Сямёна Васілевіча прызначылі каман- дзірам батарэі 373-га стралковага палка дывізіі войск НКВД. Байцы дывізіі грамілі гітлераўцаў на Арлоўска-Курскай дузе, вызвалялі ад акупантаў старажытны рускі горад Ноўгарад-Северскі, беларускія гарады Гомель і Жлобін, украінскія гарады Сарны і Ковель. Дывізія першай уварвалася ў польскі горад Люблін. Змагалася под Браціславай, брала германскія гарады Кюстрын, Патсдам, Берлін. І на ўсіх гэтых франтавых дарогах, фарсіруючы вялікія і малыя рэкі, у дождж і завіруху, у спёку і лютыя маразы агнём падтрымліваў пяхоту артылерыйскі дывізіён С.В. Тарасенкі.

15 студзеня 1945 года артылерысты Тарасенкі прынялі ўдзел у рэйдзе па тылах ворага. Цяжкім быў гэты рэйд. Але салдаты выканалі пастаўленую перад імі задачу.

— Наступіў сакавік 1945 года, — успамінае С.В. Тарасенка. - Фарсірава- на рака Одэр у раёне Кюстрына. Удар быў настолькі моцным і нечаканым, што гітлераўцы адкаціліся ўглыб на 8 кіламетраў пры шырыні прарыву ў 20 кіламетраў. Але апамятаўся вораг. Яго контратакі следавалі адна за другой. Пазіцыі нашы аказаліся нявыгаднымі. Балоцістая мясцовасць не дазваляла глыбока акапацца. Нягледзячы на гэта, мы працягвалі ўтрымліваць плацдарм. У красавіку гітлераўцы падцягнулі да

плацдарма вялікія сілы пяхоты і танкаў. Яны рашылі адным ударам пакончыць з намі. Дні і ночы не змаўкала кананада. І хоць нас засталося мала, вораг не прайшоў.

Маёр Тарасенка ўдзельнічаў у аперацыі па акружэнню Берліна і закончыў вайну на беразе ракі Эльба.

Радзіма высока ацаніла баявыя подзвігі Сямёна Васілевіча Тарасенкі. Ён узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, ордэнамі Айчыннай вайны ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Н.М. Марозава.

Аб чым пісала раённая газета «Шлях сацыялізму»

Апраўдаем аказаны гонар!

У гарачы жнівеньскі дзень, у самы разгар работы, калгаснікі сельгасарцелі «Шлях да камунізму» пачулі радасную вестку - за паспяховае заканчэнне жніва азімых іх калгас, а таксама пяць лепшых калгасніц-жней, занесены на раённую Дошку Гонару. З гэтай весткай да іх прама на поле прыйшлі старшыня калгаса Новікава і настаўніца-агітатар Паўлоўская.

Тут жа адбыўся мітынг. Адна за другою выступалі калгасніцы, прозвішчы якіх былі занесены на Дошку Гонару. У сваіх выступленнях жней-ударніцы заявілі: «Памножым свае сілы і энергію, каб даць краіне і фронту больш прадуктаў харчавання. Зробім усё, што залежыць ад нас, каб наблізіць дзень сканчэння вайны. Высокі гонар, аказаны нам, мы апраўдаем!».

Пасля заканчэння мітынгу калгасніцы з яшчэ большим энтузіязмам узяліся за работу.

М. Язерская, калгас «Шлях да камунізму» Касцюшкавіцкага с/с. 1944 г., 20 жніўня.

Першы хлеб - дзяржаве

Сельгасарцелі Паланіцкага сельсавета адначасова з жнівом і малацьбой шырока разгарнулі продаж хлеба дзяржаве. Калгас «Ленінскі прызыў» не толькі ліквідаваў сваё часовае адставанне па жніву, але і здаў ужо дзяржаве 6 тон збожжа новага ўраджаю. Калгас «Чырвоны май» завёз на прыёмачны пункт 8 цэнтнераў зерня, сельгасарцель «2-я пядігодка» - 500 кг, «Новае жыццё» - 500 кг. Прыступілі да продажу хлеба дзяржаве і іншыя калгасы сельсавета.

Усяго па сельсавету ўжо прададзена болын 9 тон зерня.

Т. Кубека, старшыня Паланіцкага сельсавета, 1944 г., 20 жніўня.

Камісар дывізіі

Гэтага ветэрана са шматлікімі ўзнагародамі на пінжаку можна было ўбачыць у Крычаве пад час усіх знамянальных для горада дат. Быў ён на яго 850-годдзі, завітаў на 50-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Адкуль у масквіча, палкоўніка ў адстаўцы Аляксея Міхайлавіча Міхай- лава такая навага да Беларусі і любоў да аднаго з яе райцэнтраў?

Былы начальнік палітаддзела 385-й гвардзейскай Чырванасцяжнай ордэна СуворавaIIступені стралковай дывізіі разам з байцамі і афіцэрамі ў 1943-1944 гадах вызваляў беларус-

кую зямлю ад нямецка-фашысцкай навалы, а Крычаў быў першым горадам на іх шляху. Вось і парадніўся з таго часу ветэран з райцэнтрам. Ён дапамог членам клуба інтэрнацыянальнай дружбы СШ № 6 і яго адказнаму арганізатару З.А. Усацікавай стварыць у школе пакой баявой славы дывізіі. Вялікая дапамога аказана ім і краязнаўчаму музею.

... Усяго два месяцы спатрэбілася камандаванню, каб сфарміраваць у 1941-м годзе ў сонечнай Кіргізіі 385-ю стралковую дывізію. Яна была сапраўды інтэрнацыянальнай. Таджыкі, туркмены, узбекі, казахі і кіргізы мужна змагаліся побач з рускімі, украінцамі і беларусамі. Былі таксама прадстаўнікі іншых народаў, бо бяда была агульнай і вораг для ўсіх адзіны. Ад Фрунзе да Эльбы прайшла дывізія, пакрыўшы свой сцяг нязгаснай славаю. Стала гвардзейскай, была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонага Сцяга і Суворава II ступені, а за вызваленне нашага горада атрымала ганаровае найменне «Крычаўская».

Вось у гэтую дывізію ў чэрвені 1943 года і быў накіраваны Міхайлаў для праходжання службы ў якасці начальніка палітаддзела. Яму, кадраваму ваеннаму, тады было 30. У арміі служыў з 1936 года. За плячыма - Ваенна-палітычная акадэмія імя У.І. Леніна. На фронце з першых дзён вайны: камісар, начальнік палітаддзела.

385-я дывізія трымала абарону каля г. Людзінава, што ў Калужскай вобласці. Менавіта адтуль прайшоў Аляксей Міхайлавіч да Эльбы - за мужнасць атрымаў высокія ўрадавыя ўзнагароды: тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Айчыннай вайны I і II ступеням Чырвонай Зоркі і шматлікія медалі.

Былы камандзір узвода малодшы лейтэнант Ф.А. Кандраценкатак характарызуе палкоўніка: «...Усе, каму даводзілася сустракацца з начальнікам палітаддзела дывізіі, вельмі паважалі яго. Гэты валявы чалавек заўсёды гаварыў праўду. Ён умеў пераконваць людзей, усяляць упэўненасць і надзею. Тактоўны і заўсёды добразычлівы з дысцыгілінаванымі салдатамі, ён быў строгі з тымі, хто парушаў дысцыпліну. Байцам падабалася, што ён быў заўсёды бадзёры, чыста паголены і ў акуратнай форме. Ужо адзін выгляд камісара, не кажучы пра асабістую дысцыплінаванасць, выклікаў у чырвонаармейцаў павагу, яны былі гатовы ісці за ім у любое пекла. Палкоўнік мог паказаць уласным прыкладам, як трэба выконваць нялёгкую ваенную справу, бо меў не толькі вышэйшую ваенную адукацыю, але яшчэ і вялікі баявы вопыт.

Аднойчы ў час перапынку паміж баямі байцы заўважылі, што на ўзлеску спыніўся бронетранспарцёр. Праз некалькі хвілін у траншэі апынуўся начальнік палітаддзела. Ён прывітаўся і адразу пачаў цікавіцца здароўем, настроем байцоў, распытваць пра абстаноўку на ўчастку. Толькі пагаварыць па душах не давялося - перашкодзілі немцы. Яны каторы раз запар пайшлі ў атаку. Тады палкоўнік падышоў да супрацьтанкавага ружжа і пачаў, не спяшаючыся, умела абстрэльваць варожыя бронемашыны з пяхотай. Вёў агонь з намі, пакуль атака не захлынулася».

Праз усю Беларусь прайшла «Крычаўская», вызваляючы яе гарады і вёскі. Толькі пад Чавусамі давялося затрымацца на цэлых 9 месяцаў. Спроба фарсіраваць раку Проня 2 кастрычніка 1943 года поспехам не завяршылася, і быў аддадзены загад перайсці

да назіцыйнай абароны. Так званыя баі мясцовага значэння працягваліся да 25 чэрвеня 1944 года. У тэты дзень Чавусы ачысцілі ад захопнікаў.

Пасля Беларусі дывізія ступіла на польскую зямлю. Яна штурмавала гарады і крэпасці Асавец, Астраленка, Ломжа. Пачынаючы з чэрвеня 1944 года да канца вайны Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'яўляў ёй падзякі 12 разоў.

... Апошнюю кропку ў той кровапралітнай вайне палкоўнік Міхайлаў паставіў на Эльбе. Там наша 385-я гвардзейская сустрэлася з амерыканскай 82-й іаветрана-дэсантнай дывізіяй. Колькі бало радасці. Байцы і афіцэры абедзьвюх дывізій частавалі адзін аднаго. На адным з прыёмаў камандаванне саюзнікаў уручыла групе савецкіх афіцэраў воінскія ўзнагароды ЗША. Сярод узнагароджаных быў і Міхайлаў, які атрымаў ордэн Вышэйшага афіцэрскага гонару. Гэты пяцікантовы крыж знайшоў сваё месца сярод шматлікіх узнагарод афіцэра, як пацвярджэнне яго баявых заслуг.

А. Балдоўскі.

Штурман бамбардзіроўшчыка

В августе 1940 года в Харьковское авиационное училище прибыла группа ребят из города Кричева и района. Они только что окончили среднюю школу и были призваны в Красную армию. Приехал и Михаил Кустрей из деревни Сокольничи, окончивший среднюю школу в д. Хотиловичи. Всего белорусов было восемьдесят три человека.

Прошел трудный, напряженный год ускоренной боевой подготовки. Армейская служба помогла Михаилу стать настоящим солдатом. С детства он много работал с отцом и в поле и дома. 8 июля 1941 года, когда уже шла Великая Отечественная война, отличник боевой подготовки Михаил Захарович Кустрей стал штурманом дальнего бомбардировщика, старшим сержантом 285-го скоростного бомбардировочного полка. Полк тогда располагался в знаменитых гоголевских местах, в Миргороде.

Пришел приказ вывезти из Полтавы двадцать пять летчиков, вышедших из вражеского окружения. Они были нужны армии. Итак, двадцать пять товарищей по оружию, да еще пять членов экипажа бомбардировщика. Самолет прибыл в срок и точно туда, где его ждали. Молодой штурман М. Кустрей свое дело знал отлично. Но только взлетели, как столкнулись с фашистскими истребителями. Прикрыть бомбардировщик было некому. Гитлеровцы расстреляли машину на взлете. Самолет развалился пополам и загорелся. Михаил Кустрей и еще несколько человек спаслись чудом, но у них были сильные ожоги и тяжелые ранения. Лечили Михаила в Харькове. Врачи сами не очень надеялись на успех лечения. Мучило и тяжелое ранение в руку - вынули кость от кисти до локтя. Рана заживала медленно. Поправился, стал выходить на прогулку. Однажды встретилась на пути женщина-военврач. Знакомое лицо. Остановился. И сказал ей:

— Я Михаил Кустрей из Сокольнич. А Вы доктор Киселёва из Кричева? Узнал свою землячку.

—Да, я доктор Ольга Киселёва.

Военврач Киселёва помогла Михаилу попасть в один из военных госпиталей в Рубцовске на Алтае. Снова больничная палата. Потом пришел день, когда его выписали как инвалида. Посоветовали искать работу по силам. Михаил пошел к медицинскому начальству. Объяснил, что он знает, что такое война и хорошо изучил авиационное дело, любит его и не желает уходить из авиации. Генерал, начальник медицинской службы, посмотрел на старшего сержанта с удивлением: ведь фактически без руки. Какая тут боевая авиация.

И все-таки в авиаотряде появился старший сержант М.З. Кустрей, которому поручили преподавать штурманское дело. Преподавал успешно, хотя и не имел офицерского звания. Потом пришлось летать на машинах, выполнявших особые задания. Совершал полеты из Москвы на фронт с пассажирами, за которыми охотилась и фашистская разведка и гитлеровские летчики-истребители. Например, во время Ясско-Кишиневской битвы штурман М. Кустрей прокладывал курс для самолета, на котором летели из столицы на юго-запад командующие фронтов И.С. Конев и Ф.И. Толбухин, маршал С.К. Тимошенко, представитель Ставки. Конечно, впереди и над ними шли истребители прикрытия. Но все равно ответственность на штурмана ложилась огромная. Нельзя было допустить малейшей ошибки - точно по курсу должен идти самолет. С ним летал из Москвы в Берлин первый комендант поверженной фашистской столицы — Берлина — генерал Н.Э. Берзарин. В «полетной книжке» штурмана М.З. Кустрея, которую он подарил Кричевскому краеведческому музею, записаны сотни часов особо важных полетов и вылетов по специальному заданию.

Однажды командир части сказал Михаилу Захаровичу, что нужно срочно доставить в Будапешт известного писателя и поэта, военного корреспондента. Пассажир подошел к самолету и подал руку:

—Константин Симонов, специальный корреспондент «Красной Звезды».

Человеком он был интересным. Много спрашивал, сам кое-что рассказывал. Его интересовали полеты дальнего бомбардировщика, отдельные эпизоды.

После победы Михаил Захарович вернулся в родные Сокольничи. Работал в этой деревне сельским библиотекарем. Потом стал отличным преподавателем военного дела в школе. Его труд отметило Почетной грамотой командование Белорусского военного округа.

М.Ф. Мельников.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

К.М. Сіманаў.

Лісты з фронту

У фондах нашага краязнаўчага музея захоўваюцца рэліквіі ваеннага часу - лісты з фронту. Частка іх была апублікавана ў раённай газеце ў 1943- 1944 гадах. Вось некаторыя з іх.

З фронту землякам

Я, стары салдат, удзельнік трэцяй вайны, у дзень гадавіны вызвалення горада і раёна ад гітлераўскіх захопні- каў дасылаю гарачае прывітанне зем-лякам-крычаўцам.

Азіраючыся назад, сёння міжволі ўспамінаю 1941 год, калі гітлераўскія рабаўнікі, як саранча, накінуліся на нашу краіну. З болем у сэрцы пакідалі тады мы, воіны Чырвонай арміі, родную старонку. Але верылі, што пройдзе час - мы вернемся. Нялёгкую школу, вялікі шлях прайшоў я за гэтыя гады. У многіх баях прымаў удзел, шмат чаму навучыўся і заўсёды верыў у перамогу. Калі радыё прынесла вестку аб вызваленні роднага горада ад гітлераўскай навалы, сэрца маё напоў- нілася радасцю, яшчэ з большим імкненнем ірваўся я ў бой.

Ззаду засталіся квітнеючыя палі і сады Украіны. Наперадзе - абрабаваная, прыгнечаная Чэхаславакія, народы якой чакалі нашай дапамогі, а за ёю - фашысцкае логава. Хутка будзе ён трымаць адказ за ўсе свае злачынствы.

П.С. Ільін.

Яфрэйтар Баларчанка

Ішоў бой за вышыню над перапра-вай. Немцы напружвалі ўсе сілы, каб спіхнуць нашых байцоў у раку. Паранены камандзір узвода і кулямётчык Сцебуноў які ляжыць побач.

—Памрэм, а вышыню не здадзім! - крыкнуў яфрэйтар Баларчанка. Ён прыняў на сябе камандаванне ўзводам і лёг за кулямёт.

Немцы ўсё бліжэй. Але нашы бай- цы маўчаць. Толькі тады, калі гітлераўцы падыйшлі на 50 метраў, застрачыў кулямёт Баларчанкі. Яго дружна пад-трымалі ўсе байцы. Фашысты пачалі падаць на зямлю адзін за другім. Тады падняўся Баларчанка і скамандаваў:

—Узвод, наперад, у атаку! Ура!

Байцы лавінаю панесліся на немцаў. Гітлераўцы пачалі разбягацца. Баларчанка дагнаў варожага афіцэра і захапіў яго ў палон.

Сяржант А. Смірноў.

Перадрукавана з газеты «Баявы сцяг». Яфрэйтар І.К. Баларчанка - калгаснік сельгасарцелі «Ударнік Крычаўшчыны».

Падрыхтавала да друку
Н.М. Марозава.

З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.

Франтавыя шляхі камандзіра-танкіста

Слаўны баявы шлях прайшоў Сяргей Цімафеевіч Стызік. Сем разоў за гады вайны ўпаміналася яго прозвішча ў загадах Вярхоўнага Галоўнакаман-дуючага.

Сяргей Цімафеевіч нарадзіўся ў мястэчку Крычаў у 1905 г. Сям'я была вялікая і асаблівым дастаткам не вы-значалася. Гэта дрэнна адбілася на здароўі дзяцей. У сям'і Цімафея Піліпа- віча іх памерла чацвёра.

Адна бяда не ходзіць. У 1913 г. зга-

рэла сядзіба, потым быў смяротна паранены на паляванні бацька.

У 1917 г. Сяргей закончыў царкоўнапрыходскую школу і паступіў у гімназію імя Гардзеевай. Яна праіснавала да восені 1918 г., затым была ператворана ў школу, якой надалі імя Чэхава. У восьмым класе хлопец уступіў у камсамол, у 1924 г. скончыў 10 класаў. Спачатку дапамагаў сям'і па гаспадарцы, пазней уладкаваўся працаваць тэхнічным сакратаром райкома. У 1927 г. яго прынялі ў партыю і перавялі на пасаду загадчыка сакрэтнай часці акруговага выканкома.

Работа патрабавала болын грунтоўных ведаў, і Сяргей вырашыў ехаць у Маскву, паступіць на рабфак. Не пастушу Вярнуўся дамоў і ўладкаваўся на будаўніцтва чыгункі Асіповічы—Рослаў. Працаваў слесарам, арматуршчыкам, дзяжурным памочнікам механіка на кесоннай станцыі. У кастрычніку 1928 г. быў прызваны ў армію, у восьмую авіябрыгаду, якая дыслацыравалася ў Гомелі. У арміі атрымаў званне малодшага тэхніка.

ГПасля дэмабілізацыі Сяргей паехаў у Днепрапятроўск і стаў працаваць на заводзе «Камінтэрн» слесарам. Тут жа закончыў рабфак і атрымаў накіраван- не на першы курс Днепрапятроўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута. Але вучыцца ў ім не ўдалося. Лёс крута павярнуў у іншы бок. Сяргей скончыў Арлоўскае танкавае вучылішча, паступіў у Акадэмію матарызацыі і механізацыі Чырвонай арміі. У 1939 г. Сяргей Цімафеевіч стаў камандзірам батальёна танкавай брыгады, прымаў удзел у паходах на Заходнюю Украі- ну, у Букавіну і Малдавію, ваяваў у Фінляндыі.

Раніцай 22 чэрвеня 1941 г. 20-я танкавая дывізія была паднята па трыво- зе і рушыла ў раён г. Луцка. На наступ- ны дзень яна сустрэлася з варожымі часцямі. У чэрвені-жніўні дывізія вяла цяжэйшыя баі пад Луцкам, Роўна, Бродамі, Ноўгарад-Валынскім, Оўру- чам і Чарнігавам. У сярэдзіне верасня дывізію расфарміравалі. Сяргей Ціма- феевіч быў накіраваны пад Харкаў, дзе фарміравалася 14-я танкавая брыгада.

З дня стварэння брыгада вяла баі пад Харкавам, Чугуевам і Купянскам, ваявала на курскім напрамку. Сяргей Цімафеевіч Стызік камандаваў ёй з ліпеня 1942 г. Пасля Курскай дугі ён стаў намеснікам камандуючага 27-й арміі па бранятанкавых войсках. На гэтай пасадзе і закончыў вайну 5 мая 1945 года ў Аўстрыі.

На цяжкім баявым шляху камандзіра было шмат паспяховых апера- цый. Аб гэтым сведчаць шматлікія ўзнагароды палкоўніка: ордэн Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Суворава II ступені, два ордэны Айчыннай вайны I ступені, два - Чырвонай Зоркі, ордэны Кутузава II ступені, Багдана Хмяльніцкага II ступені і два ордэны Венгерскай Народнай Рэспублікі, а таксама болып за 10 медалёў.

Н.М. Марозава.

Адплата

Ранняй вясной 1945 года ва Усходняй Прусіі ішлі жорсткія кровапралітныя баі. Гітлераўцы не аддавалі без бою ніводнага населенага пункта.

Бясстрашна змагаўся з ворагамі наш 17-ы гвардзейскі кавалерыйскі полк, у якім я быў кулямётчыкам. Аднойчы нашы пазіцыі атакавалі нямец-

кія самалёты. Скідвалі бомбы, стралялі з кулямётаў. Камандзір кулямётнага разліку старшы сяржант Косцін падаў каманду схавацца пад сценамі цагельнага завода. Мы кінуліся туды. Уваход аказаўся замураваным, прыйшлося паспешліва разбіраць перашкоду. Раскідалі дэментавыя палы, убеглі на тэрыторыю завода і ўбачылі страшную карціну.

Тэрыторыя завода была густа набіта цывільнымі людзьмі. Жанчыны, дзеці рознага ўзросту. Схуднелыя і знясіленыя, яны сустрэлі нас радаснымі крыкамі. Выразна чулася і мая родная беларуская мова. Гэта былі ўгнаныя немцамі ў няволю мірныя жыхары. Многія з іх не маглі ад слабасці рухацца і гаварыць.

Мы ўжо не думалі аб тым, як ратавацца ад бамбёжкі. Твары байцоў спахмурнелі, гнеўна заблішчэлі вочы. Кавалерысты імкліва кінуліся ў атаку і занялі горад Алынтайн. Гітлераўцы не чакалі нападу, мала каму з іх удалося ўцячы ад расплаты. Такой была наша помета ворагам за здзекі над мірнымі людзьмі.

П.І. Налівайка.

Подзвіг сувязіста

У сакавіку 1944 года ішлі крывапралітныя баі на рацэ Проня пад Чавусамі. Цяжка даводзілася нашым байцам. Шмат работы было ў сувязістаў.

Працавалі і рацыі. Але варожыя пеленгатары засякалі радыстаў, і на ўчастак, дзе яны знаходзіліся, абрушваўся шквал артылерыйскага і мінамётнага агню.

У 3-й роце 718-га стралковага палка 139-й Рослаўскай дывізіі служыў наш зямляк Мікалай Галенка. У адзін з дзён, калі немцы вялі інтэнсіўны агонь, Мікалай рашыў папярэдзіць таварышаў з другой роты сувязі, каб яны, перадаўшы паведамленне па рацыі, неадкладна мянялі месца. Прибег Мікалай на НП другой роты, дзе працавала рацыя, выкрыкнуў: «Хутчэй у запасны акоп! Нас засёк пеленгатар!». Пяць сувязістаў ледзь паспелі дабрацца да запаснога ўкрыцця. А месца, дзе яны толькі што знаходзіліся, накрылі фашысцкія міны.

Трэба было знайсці парыў на лініі, аднавіць тэлефонную сувязь. І Мікалай пабег уздоўж лініі, хаця немцы працягвалі весці агонь. Адчуў, як нешта моцна ўдарыла ў галаву, кроў заліла вочы. Дзе ўсё ж парыў? Хутчэй бы яго знайсці! Нарэшце знайшоў. Трацячы прытомнасць, Мікалай злучыў правады, і сувязь аднавілася.

Санітары знайшлі яго і адправілі ў медсанбат. Лячыўся ў шпіталях у Верамейках, Рославе, Новасібірску. Ранение аказалася сур'ёзным. У Новасібірску Мікалай Галенка атрымаў пісьмо ад свайго аднапалчаніна, які пісаў, што пра яго подзвіг быў артикул у франтавой газеце і што ён прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

Узнагарода знайшла салдата праз 25 гадоў. У 1969 годзе Мікалаю Галенку, жыхару вёскі Дрождженічы Маляціцкага сельсавета, уручылі медаль «За адвагу».

Н.М. Марозава.

Не спалохалася смерці

9 мая 1945 года. Сонечны дзень, духмяны пах квецені, маладой лістоты і травы, бязвоблачнае, ціхае і цёплае неба. У тэты дзень медсястра Таццяна Пракопаўна Цімафеева знаходзілася на дзяжурстве ў шпіталі на тэрыторыі Германіі.

У палатах весяліліся. Нехта з раненых узяў у рукі гармонік, пачаліся танцы, загучалі песні. Ва ўсіх былі радасныя твары, іскрыліся вочы.

А за будынкам шпіталя ляжала заміраванае поле. Спяшаючыся дабіць немцаў, вайскоўцы не паспелі ачысціць яго ад смяротнай начынкі. І вось у самы разгар святочнага вясельля раптоўна грымнуў выбух. «Нехта падарваўся» - жахнулася адна з медсясцёр. Таццяна Пракогіаўна выскачыла на вуліцу. «Вярніся, там міны,» - крычалі ёй услед. Але яна не звяртала ўвагі на ўстрывожаныя галасы калег. Не палохаючыся варожых мін, падскочыла да акрываўленага байца і прынесла яго да сцен шпіталя.

Медаль «За баявыя заслугі» знайшоў Таццяну Пракопаўну Цімафееву ў Крычаве праз некалькі гадоў, калі яна працавала загадчыцай дзіцячых ясляў № 16.

Д.Л. Юдзянкоў.

След вайны

Маладыя, бязвусыя юнакі, старыя і малыя, жанчыны і мужчыны, — усе сталі на абарону Айчыны ў тым далёкім 1941-м. Сярод абаронцаў быў і Іван Данілавіч Барысенка, які ваяваў у складзе 1-га батальёна 212-й стралковай дывізіі і прымаў удзел у вызваленні Крычава.

— 29 верасня быў моцны дождж, а затым ярка засвяціла сонца. Нашы войскі ўступілі ў Дзягавічы, Прахораўку, а затым у ноч на 30 верасня фарсіравалі Сож. Каля ваенкамата быў вялікі бой - успамінае І.Д. Барысенка.

Многае забываецца, але радасць удзячных крычаўлян ад сустрэч сваіх вызваленцаў назаўсёды засталася ў памяці франтавіка.

— Жыхары сустракалі нас з радасцю, дзеці падносілі кветкі, — працягвае размову Іван Данілавіч. — І гэта радасць з нашай перамогай дапамагала выжыць байцам, надавала сілы.

Цяпер і самі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай ужо болын спакойна, не так усхвалявана расказваюць пра гады ліхалецця. А тады кожны бой для байца быў барацьбой за жыццё — бегчы, паўзці, ісці, але любой цаной перамагчы і выжыць, дапамагчы свайму таварышу.

Ваеннае сяброўства — святое. З гадам! забываюцца аднакласнікі, забываюцца тыя, з кім калісьці разам працаваў. А тыя, з кім прайшоў доўгія вёрсты вайны, застаюцца ў памяці і ў сэрцах франтавікоў да апошняга дня жыцця. У Івана Данілавіча была добрая памяць на твары. І праз 10, 20 і больш гадоў камандзір батальёна І.С. Мыцык дасылаў на Крычаўшчыну, у пасёлак Літвінава, лісты з фотаздымкамі сваіх былых байцоў ад іх родных,

якія жадалі хоць нешта праведаць пра сыноў, братоў, мужоў, якія прапалі без вестак або загінулі. І даведаліся. Іван Данілавіч падрабязна пісаў пра былых аднапалчан. Успаміны на працягу многіх гадоў усё вярталі і вярталі яго ў ваенныя будні.

Зноў і зноў ён нраходзіў доўгімі ваеннымі дарогамі, нанова перажываў жорсткія баі, губляў сяброў...

—Трапілі мы ў акружэнне. Камандзір палка загадвае камандзіру батальёна: «Падбяры хлопца, які арыентуецца на мясцовасці, каб правёў абоз». Камсорг роты тады звярнуўся да мяне: «Сынок, трэба любой цаной правесці абоз». І я пабег. Пакуль збіралі абоз, немцы змянілі пазіцыю і атрымалася так, што мы нарваліся на іх. «Здраднік! Ён нас падвёў», — што толькі не гучала ў мой адрас. А я тады малады зусім быў, не вытрымаў і заплакаў, — прыгадвае Іван Данілавіч. - Але правёў абоз без страт. Камандзір пацалаваў мяне, а я зноў-такі не вытрымаў, плакаў і расказваў, як усё адбылося. Тады заступіўся за мяне камсорг.

На грудзях маладога байца заззяў медаль «За адвагу».

Мужнасць, адвага, барацьба за жыццё - усё было. І.Д. Барысенка вярнуўся з вайны з узнагародамі - атрымаў два медалі «За адвагу», ордэн Славы III ступені, ордэн Вялікай Айчын- най вайны I ступені, а затым яшчэ медаль «За вызваленне Варшавы».

Праз многа гадоў без утойвання, не саромячыся, шчыра адказаў на пытан - не:

— Страшна было. Жудасна. Пасля аргпадрыхтоўкі першай ішла пяхота. Ішла пад кулі. А перад атакай інпіыя трэсліся, а ў мяне мова аднімалася... Было ўсяк: вось бег чалавек - і раптам няма яго, загінуў, а ты бяжыш далей.

Напаткала варожая куля і Івана Данілавіча. Параненага накіравалі ў шпіталь. Там пазнаёміўся з медсястрой Ганнай.

— Чатыры з паловай гады мне пісьмы пісаў. Затым прыехаў — ні ён не знайшоў сабе пары, ні я, — далуча- ецца да размовы Ганна Сямёнаўна.

Мірнае жыццё пачалі разам. Двух сыноў і дачку выгадавалі Барысенкі. Цяпер у іх шасцёра ўнукаў. 36 гадоў Іван Данілавіч адпрацаваў на цэмент- ным заводзе, дзе былога франтавіка паважалі.

Т.П. Іўкіна.

Змагаўся ў французскім Супраціўленні

«Ураджэнец в. Зарубец Крычаўскага раёна Казлоў Міхаіл Васілевіч, 1925 года нараджэння, у 1943 годзе быў арыштаваны гестапа і вывезены ў канцлагер на тэрыторыю Латвіі і Літвы. У 1944 годзе адпраўлены на тэрыторыю Бельгіі, дзе працаваў на шахце чорнарабочым, адкуль уцёк, і з 3 сакавіка 1944 года да 18 чэрвеня 1945 года знаходзіўся ў Францыі ў партызанскім атрадзе імя Чапаева...»

З даведкі нам. начальніка ўпраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці В. Арцыкова

Нядаўна Міхаіл Васілевіч Казлоў атрымаў адразу дзве ўзнагароды за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў Вялікую Айчынную вайну. Спачатку з далёкага Парыжа прыслалі ветэрану ордэн «За заслугі ў партызанскім руху Францыі», а следам за ім - медаль «За адвагу» з Масквы. А ўсяго некалькі

гадоў назад яго нават не лічылі ўдзельнікам вайны, і ён страціў надзею на тое, што калі-небудзь зможа гэта даказаць...

Калі пачалася вайна, Мішу Казлову было 16 гадоў. Ён марыў стаць паэтам, а яшчэ вельмі любіў разам з сябрамі бегаць на «варшаўку» - дарогу, што злучала Брэст з Варшавай і Масквой. Хлапчукі глядзелі на аўтамабілі, якія ў даваеннай вёсцы былі нячэ рэдкай з'яваю.

Калі пачалася вайна, «варшаўка» стала аб'ектам пільнай увагі падлеткаў па інвіай прычыне. Па ёй адступалі нашы салдаты пад націскам гітлераўцаў, там стралялі. На кожным кроку валялася разбітая, абгарэлая тэхніка, можна было знайсці зброю і боеприпасы.

Удзел Мішы ў вайне і начаўся з таго, што ён разам з аднагодкамі збіраў аўтаматы і вінтоўкі, патроны. Хлопцы надзейна хавалі іх, каб потым перадаць у партызанскі атрыад. Аднойчы ён нават дапамог захапіць нямецкую танкетку, якая аказалася вельмі дарэчы народным мсціўцам. Але ўсё тэта было не так ужо і страшна. Самыя вялікія выпрабаванні пачаліся пасля таго, як Мішу выдаў гестапа мясцовы правакатар.

За чарговую перадачу зброі партизанам Міша быў схоплены і зняволены ў Крычаўскай турме. Там яго білі і катавалі. Маці, калі принесла сыну перадачу і ўбачыла яго, страціла прытомнасць. Начальнік турмы Лядаў жорстка распраўляўся з вязнямі.

Юнага падполынчыка вывезлі з Крычаўскай турмы ў канцлагер «Провінішкі» ў Літве. Калі маці ў чарговы раз прыйшла адведаць сына, ёй сказалі, што Міша забіты. З той пары яе вочы былі поўныя слёз, але ў сэрцы была надзея, што ён жывы. І сын вярнуўся ў жніўні 1945 года. Вось толькі дарога да дому даўжынёй у два гады была цяжкай і страшнай...

З канцлагера ў Літве ён быў вывезены ў Бельгію, а потым у Францию, у канцлагер Ерувіль. Там Міхаіла чакала катаржная праца ў шахтах. Але юнак не змірыўся са становішчам раба. За калючым дротам ён прабыў усяго каля трох тыдняў, а потым уцёк разам з двума таварышамі.

Адзін з уцекачоў адразу ж быў забіты ахоўнікамі. Яго імя Міхаіл Васілевіч, на жаль, не памятае. Самому ж Казлову і Вікгару Прусаву, які зараз жыве пад Кіевам і з якім яны засталіся сябрамі на ўсё жыццё, удалося выратавацца. Уначы ляснымі сцежкамі яны дабраліся да адной вёскі, дзе сустрэлі ўдзельнікаў французскага Супраціўлення.

Так ён апынуўся сярод суайчыннікаў. Камандзірам партызанскага атрада, які насіў імя Чапаева, быў расіянін Ташкін. Атрад складаўся з байцоў розных нацыянальнасцей. Французаў было каля 300, а рускіх, беларусаў, украінцаў - 50 чалавек.

Мішу часта даводзілася хадзіць на баявыя заданні. Насіў у вёскі лістоўкі, удзельнічаў у дыверсіях на чыгунцы. Ён насыпаў пясок у буксы цягнікоў, што прыводзіла да пажару ў час руху. У партызанскім атрадзе Казлоў знаходзіўся да 18 чэрвеня 1945 года, атрымаў пасведчанне добраахвотніка-удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Францыі ў другую сусветную вайну.

З Францыі ў СССР Міша вярнуўся 25 ліпеня 1945 года. Аднак на радзіме атрыманы дакумент не быў узяты пад увагу. Нашых суайчыннікаў, якія змагаліся ў французскім Супраціўленні,

чамусьці да ўдзельнікаў вайны не адносілі.

Крыўдна, канечне, было Міхаілу Васілевічу, але ён ніколі не шкадаваў аб тым, што не выкарыстаў магчымасць пасяліцца ў Англіі ці ў ЗША. Ён хацеў жыць у той краіне, дзе нарадзіў- ся, дзе чакала яго маці, Васіліса Піліпаўна, чакала, нягледзячы на тое, што ўсе лічылі яе сына забітым.

Некалькі гадоў таму ў «Известиях» М. Казакову трапіла на вочы публікацыя, аўтар якой заклікаў адгукнуцца ўдзельнікаў французскага Супраціў- лення. Міхаіл Васілевіч адгукнуўся і атрымаў статус удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. Яму прадаставілі кватэру ў Брэсце, у Доме ветэранаў.

Атрымаў ветэран пісьмо і пасылку ад нямецкіх антыфашыстаў з арганізацыі «Максіміліян Колбе». Яны прасілі дараваць за тое гора, што фашысцкая Германія прынесла беларускаму народу і яму асабіста. І гэта пакаянне - найбольная ўзнагарода ветэ- рану.

І. Варапаеў.
Член Савета ветэранаў г. Брэста.

Герой Аджымушкая

У Аджымушкайскіх каменяломнях здзяйсняў свой штодзённы подзвіг і наш зямляк Мітрафан Мікалаевіч Карпекін.

Нарадзіўся ён у 1908 г. у в. Варанёва. Рос у сялянскай сям'і, шмат дапамагаў бацькам па гаспадарцы. У 1924 г. у Крычаве пачалося будаўніцтва чыгункі, і сялянскі юнак становіцца будаўніком. Пасля завяршэння будоўді ён некалькі гадоў працаваў на чыгунцы - рамонтным рабочым, грузчикам. Пасля службы ў Чырвонай арміі вярнуўся на радзіму. І зноў уладкаваўся на будоўлю, разам з землякамі ўзводзіў Крычаўскі цэментны завод. На будаўніцтве праявілася творчая энергія, арганізацыйныя здольнасці М. Карпекіна.

Памятным быў 1932 год - яго накіравалі на вучобу ў рэспубліканскую партыйную школу. Неўпрыкмет праляцелі два гады вучобы. Мітрафана Мікалаевіча выбралі сакратаром партбюро Крычаўскага цэментнага завода, а ў 1935 г. - дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета.

Яго паважалі, з ім раіліся. У 1938 г. М.М. Карпекіна абралі першым сакратаром Крычаўскага райкома КПБ. На пачатку 1941 г. ён стаў сакратаром Магілёўскага абкома партыі па кадрах. На гэтай пасадзе яго і заспела вайна.

М. Карпекін у першыя дні вайны шмат зрабіў для стварэння падпольных груп і партызанскіх атрадаў, жадаў застацца ў тыле ворага і змагацца з фашыстамі. Але атрымалася інакш. Па распараджэнню ЦК Кампартыі Беларусі ён быў накіраваны на курсы ваенных камісараў у ваенную акадэ- мію імя Фрунзе, а ў сакавіку 1942 г. быў ужо на фронце. Яго прызначылі начальнікам аддзела кадраў танкавых войск Крымскага фронту. Пад час абароны Керчы ён быў у званні батальённага камісара.

У маі 1942 г. каля 10 тысяч абаронцаў Керчы спусціліся ў каменяломні і там працягвалі змагацца з ворагам. Пераадольваючы холад і голад, задыхаючыся ад атрутных газаў, каля 6 месяцаў байцы і камандзіры Чырвонай арміі вялі баі з фашыстамі.

Душой і арганізатарам гэтай барацьбы называлі выжыўшыя абарон- цы Аджымушкая Мітрафана Мікалаевіча Карпекіна. Як успамінаў старшы лейтэнант Паважны, ніхто не ведаў, калі ён адпачываў. Ён думаў толькі аб людзях, падтрымліваў іх маральна, падбадзёрваў. Пад яго кіраўніцтвам асаджаныя рабілі дзёрзкія вылазкі, наносілі ворагу ўдары.

Надышоў голад. Мізэрныя порцыі прадуктаў аддаваліся толькі паране- ным і хворым. Прыкладам у гэтым стаў батальённы камісар Карпекін.

Голад, хваробы і баі штодзень уносілі шмат жыццяў Людзей станавілася ўсё меней і меней. 13 кастрычніка 1942 г. памёр М.М. Карпекін. Знясіле- ныя абаронцы Аджымушкая ціха, без баявога салюту пахавалі яго ў адным з куткоў пячоры. Так абарвалася жыццё выдатнага чалавека і мужнага байца. Імя М. Карпекіна носіць адна з вуліц Крычава, а матэрыялы аб жыцці камісара захоўваюцца ў Крычаўскім краязнаўчым музеі.

Н.М. Марозава.

Пад бамбёжкай, у пякельным агні

У час вайны я працавала ў ваенным шпіталі на Другім Беларускім фронце. У маі 1944 года атрымалі загад перабазіравацца з Калугі ў Беларусь. Накірунак - Магілёўская вобласць, станцыя Крычаў.

Разгортваць шпіталь давялося ў вёсцы Зуі, кіламетры за 2 ад станцыі. Хаткі ў вёсцы невялікія, параскіданыя ўсцяж ракі Сож. У іх ледзь расмясцілі аптэку, лабараторыю, склады і асабісты састаў.

А куды падзець раненых? Мы атрымалі паведамленне, што трэба іх наступления чакаць у самыя бліжэйшыя дні. Марудзіць было нельга. Трэба шукаць выйсце. Рашылі тэрмінова будаваць баракі. З чаго? Матэрыялаў няма і ўзяць недзе - вайна ж.

І надумалі. Лаза, гліна - вось з чаго можна зляпіць «карпусы». На сялянскіх лодках плавалі па рацэ Сож і секлі хмызняк. З яго плялі каркасы і абмазвалі глінай. Такім чынам за кароткі тэрмін узвялі тры вялікія баракі. Пакрылі іх саломай, брызентам. Унутры навялі чысціню і парадак. Устанавілі двухярусныя нары, замест дзвярэй навесілі коўдры.

Пачалі паступаць раненыя. Іх прымалі, аперыравалі, перавязвалі, размяшчалі па «палатах».

Па начах ляталі фашысцкія самалёты. Навешвалі на парашутах асвятляльныя ракеты, і вёсачка Зуі пад іх асляпляльным святлом у страху заміра- ла. Але ўсё неяк абыходзілася. Па ўсёй бачнасці шпітальныя баракі, падобныя на сельскагаспадарчыя службы, не прыцягвалі ўвагі.

А вось у ноч на 6 ліпеня не абышлося. Варожыя самалёты па сігналах лазутчыкаў атакавалі станцыю Крычаў, дзе ўсе пуці былі забіты эшалонамі з гаручым для авіяцыі, складамі боепрыпасаў, двума шпіталямі, саставамі бежанцаў, якія вярталіся ў вызваленыя раёны.

Нейкім цудам давялося адкаціць ад станцыі на некалькі кіламетраў эшалон з гаручым. Астатняе ўсё палыхала ў агні. Чуліся надрыўныя крыкі людзей, рык жывёлы. А дапамагчы людзям не было магчымасці. Станцыю ахапіла

мора агню, з грукатам ірваліся снарады, разлятаючыся далёка ад склада.

Аглушальныя выбухі шматтонных бомб страсалі наваколле. Валіліся вывернутыя з каранямі дрэвы. Станцыя ператварылася ў сапраўднае пекла.

Салдаты і афіцэры, якія наглядзелі- ся за вайну ўсялякага гора, згаджалі- ся, што такое ўбачыш не часта.

Усю ноч і наступнага паўдня гарэла станцыя Крычаў. Перад раніцай, калі бамбёжка спынілася, медыцынскі персанал нашага шпіталя прыступіў да аказання дапамогі пацярпелым. Выжыўшых везлі ў шпіталь. Там, у нацягнутай палатцы-перавязачнай, аперыравалі, перавязвалі. Месц у бараках не хапала, размяшчалі параненых прама на траве. Цяжка перадаць і забыць усё гэта.

У агні, ратуючы людзей ад смерці, загінуў начальнік матэрыяльнай часткі шпіталя Пенязь. Ён пахаваны на могілках у вёсцы Зуі.

В. Літвінава.

Аб ім напісана ў кнігах

Мікалай нарадзіўся ў Крычаве, у сям'і тэхніка-будаўніка. Ен быў адным з лепшых спартсменаў у нашым горад- зе. Самымі любімымі відамі спорту былі для яго бег на доўгія дыстанцыі і бокс. На рэспубліканскіх спаборніцтвах баксёраў займаў прызавыя месцы.

Пасля школы Мікалай у Віцебску закончыў політэхнікум. Неўзабаве грымнула вайна.

... На адным з прыфрантавых аэрадромаў лётчык гутарыў з двума сваімі пасажырамі. Гэта былі савецкія разведчыкі. Задание іх было вельмі цяжкім. Безабаронны транспартны самалёт маглі перахапіць гітлераўскія сцярвятнікі, але лётчык справіўся выдатна. Два чэкісты, маёр і лейтэнант, былі перакінуты ў тыл ворага. Ім неабходна было прайсці вялікі шлях, ісці даводзілася толькі ноччу. Арыентаваліся па компасу і зорках. На чацвёртую ноч яны разышліся ў розныя бакі.

Аднойчы на перадавыя пазіцыі наглых войск выйшаў малады нямецкі афіцэр. На чыстай рускай мове ён папрасіў, каб яго неадкладна даставілі ў штаб фронту.

Прайшло шмат гадоў, і ў Мінску зноў сустрэліся былы маёр і былы лейтэнант, толькі лейтэнант стаў ужо падпалкоўнікам. Гэта быў той хлопец, які ў форме гітлераўскага афіцэра адправіўся за лінію фронту. Гэта ён быў адным з удзельнікаў аперацыі па адпраўцы з Мінска ў партызанскі лагер, а затым у Маскву, акадэміка М. Нікольскага. Выконваў разведчык і шмат іншых складаных заданняў. Ордэн Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, іншыя ўзнагароды сведчылі аб слаўных справах гэтага чалавека.

У 1976 годзе выдавецтва «Беларусь» выпусціла кнігу вядомага разведчыка І. Груздзева, выканаўшага ў вайну шэраг важных заданняў у тыле ворага на Віцебшчыне. Двойчы ў гэтай кнізе «У гады суровых выпраба- ванняў» упамінаецца імя лейтэнанта дзяржбяспекі Мікалая Фёдаравіча Мельнікава. Вось што расказваецца на старонках 56—60: «Вяржбіцкі быў накіраваны ў вёску Даўгавічы Смаленскай вобласці, куды з Савіна перабралася кіраўніцтва Віцебскай аператыўна-чэкісцкай трупы. Там на працягу

трох дзён з ім працаваў вопытны чэ- кіст, лейтэнант дзяржбяспекі Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў. Ён даручыў Вяржбіцкаму разам з С.П. Бурлаковым арганізаваць у Віцебску дыверсійную трупу і вывесці са строю шэраг аб'ектаў ворага, у тым ліку склад боепрыпасаў на Маркаўшчыне, а таксама па- дабраць і падрыхтаваць сувязных з асоб, што працуюць ва ўстановах акупантаў.

Весткі, атрыманыя ад Вяржбіцкага, былі выкарыстаны кіраўніцтвам рэспубліканскай аператыўна-чэкісцкай трупы пры састаўленні дакладной запіскі камандуючаму войскамі Заходняга фронту Г.К. Жукаву. Да дакладной запіскі прыкладаліся тапаграфічныя карты і планы гарадоў, на якіх указваліся аб'екты ворага, выяўленыя разведчыкамі.

У кнізе пісьменніка І. Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» ёсць словы і аб аператыўным работніку Барысу. Прыведзена яго сапраўднае імя - Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў.

Спартыўная падрыхтоўка часта выручала Мікалая ў час выканання важнага задания. Каля польскага горада Ломжа Мікалаю Фёдаравічу давялося болын за суткі праляжаць у замярзаючым балоце, але задание было выканана.

Летам 1944 года Мікалай Фёдаравіч працаваў намеснікам начальніка контрразведкі 5-й арміі. З войскамі гэтай арміі раней, 30 верасня 1943 года, ён вызваляў родны Крычаў.

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй Мікалай Фёдаравіч быў прызначаны начальнікам абласнога ўпраўлення КДБ у Гродна, удзельні- чаў у барацьбе з ляснымі бандамі.

12 мая 1953 года, у 38 гадоў, падпалкоўнік Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў памёр. Далі знаць аб сабераны, падарванае здароўе на вайне. Ен пахаваны на могілках у Гродне.

Н.М. Марозава.

Наш зямляк штурмаваў рэйхстаг

Раніца 30 красавіка 1945 года ўступіла ў свае правы. Дым і полымя вялікай бітвы ахапілі весь Берлін. Палкі 171-й стралковай дывізіі ўзялі штурмам некалькі дамоў на Альзенштрасэ. І калі салдаты праніклі ў дом, вокны якога выходзілі на Каралеўскую плошчу, адразу ўбачылі рэйхстаг. Аб гэтым марылі мільёны савецкіх воінаў і ля сцен Сталінграда, і пад Новарасійскам, у Карэліі і пад Старай Русай, пад той самай Русай, дзе пачынаўся бая- вы шлях 171-й стралковай дывізіі, перадавыя падраздзяленні якой толькі што прарваліся на Каралеўскую плошчу.

Камандаванне 525-га стралковага палка пачало фарміраваць штурмавую групу. Галоўнай задачай групы быў не толькі прарыў да рэйхстага. Неабходна было ўзняць на ім перамоганосны сцяг. Увесь дзень нашы войскі спрабавалі прабіцца да рэйхстага. Але вораг адкрыў такі шквал агню, што нават танкі не маглі далёка прасунуцца па плошчы. Тады камандзір штурмавой трупы, старшы лейтэнант Коршунаў сфарміраваў спецыяльную трупу, якая павінна была данесці і ўзняць сцяг над рэйхстагам. У яе ўвайшлі камсорг другой стралковай роты Мікалай Белянкоў, сяржант Павел Смірноў і радавы

Леанід Сомаў. Было вырашана, што калі загінуць Белянкоў і Смірноў, сцяг павінен данесці да рэйхстага Сомаў. Першыя няўдачы не пахіснулі баяво- га духу салдат. Штурм жа апошняга прыстанішча ворага - ганаровае задание, ім даручылі ўзняць баявы сцяг над рэйхстагам.

Наступіў вечар. Кожны ўспамінаў баявы шлях, успамінаў Мікалай сваю вёску Глушнева, што раскінулася на высокім правым беразе Сажа, кровапралітныя баі на роднай зямлі.

Успомніліся і ўпартыя баі ў Беларусь Прыбалтыцы, Полынчы, цяжкі шлях ад Одэра да Берліна. У Полынчы Мікалая цяжка параніла. Паўтара месяца давялося лячыцца ў шпіталі. Потым зноў баі. Вязло, двойчы ў баях пад Берлінам загінулі ўсе яго сябры па кулямётным разліку, а ён працягваў ваяваць.

... Камандаванне накіравала на дапамогу штурмавой трупе два танкі. Артылерысты занялі новую пазіцыю, каб біць па рэйхстагу прамой наводкай. Здавалася, што час цягнецца вельмі марудна. І вось 30 красавіка 1945 года, 18 гадзін. І плошча, і рэйхстаг, і прылеглыя вуліцы ўздрыгнулі ад магутнага залпа арудзій і мінамётаў. У гэтую сімфонію залпаў упісаліся чэргі кулямётаў і аўтаматаў. Рэйхстаг ахутаўся дымам.

Пехацінцы пад прыкрыццём танкаў пайшлі ў атаку. Сярод іх былі Мікалай Белянкоў і Павел Смірноў са сцягам у руках. Нечакана адзін танк прыпыніўся ад прамога пападання снаряда. Мікалай мінуў яго і кінуўся наперад. Усё бліжэй і бліжэй рэйхстаг. Амаль побач яго каланада. Белянкоў збег па лесвіцы. Сцяг ужо ў руках Сомава. Ён ускочыў на плечы Белянкову і сцяг хутка ўзняўся на калоне.

Гітлераўцы не ўтрымалі перадавую трупу, але яны не маглі адсекчы Ураганным агнём астатнія падраздзяленні штурмуючых. З другога боку рэйхстага прасачыліся воіны 150-й стралковай Ідрыцкай дывізіі. Рэйхстаг гарэў. Але воіны прабіваліся наперад. Уначы 1 Мая над рэйхстагам узняўся сцяг Перамогі. Яго ўстанавілі былы беларускі партызан Міхаіл Ягораў і воін з Грузіі Мелітон Кантарыя. У самым памяшканні рэйхстага працягваўся бой. Хутка афіцэр Берэст з 150-й Ідрыцкай дывізіі прад'явіў ультыматум гітлераўцам. Фашысты нарэшце здаліся.

За подзвіг, здзейснены пры штурме рэйхстага, Мікалай Цімафеевіч Белянкоў быў узнагароджаны ордэнам Славы I ступені.

У публікацыях удзельнікаў штурму Берліна ўпамінаецца імя Мікалая Белянкова. Мы звярнулі ўвагу на характэрнае для нашай мясцовасці прозвішча. У вёсках Глушнева, Бель 1-я, Бель 2-я, Бель 3-я шмат Белянковых. Пачалі высвятляць месца нараджэння ўдзельніка штурму рэйхстага. З дапамогай аднавяскоўца Мікалая Цімафеевіча, калгаснага механізатара, і краязнаўцаў школы з вёскі Паляцічы, атрымалі адрас земляка. М.Ц. Белянкоў даслаў пісьмо з Бярдычава, дзе ён працягваў служыць у Савецкай арміі. Паведаміў, што ваяваў як усе. Потым ён прыязджаў у Маляцічы, сустракаўся са школьнікамі, следапытамі Крычава. Выступаў у школах, клубах. На адной з сустрэч яму было зададзена пытанне: «Чаму на калонах рэйхстага няма Вашага подпісу, хто з Вамі яго штурмаваў?».

Адказ быў простым і зразумелым кожнаму ўдзельніку сусутрэчы.

—Шаноўныя, мы проста не думалі

аб гэтым. Не важна, што нашы імёны не засталіся на калонах рэйхстага. Галоўнае мы зрабілі - выканалі свой доўг перад Радзімай як маглі, рэйхстаг узялі.

М.Ф. Мельнікаў.

Не ўсе раны зажываюць

Леаніду Крываносаву не споўнілася і сямнаццаці гадоў, калі пачалася вайна. Гітлераўцы набліжаліся да Крычава. Адным з першых ён адгукнуўся на заклік райкомаў партыі і камсамола дапамагчы эвакуіраваць жывёлу ў тыл.

Нялёгкі тэта быў шлях. За суткі даводзілася пераадольваць па 45—50 кіламетраў лясістай, узгорыстай дарогі. Але галоўная бяда заключалася не толькі ў тым, што ў цяжкай дарозе пакідалі сілы. За статкамі кароў і людзьмі палявалі нямецкія самалёты. Кідалі бомбы, абстрэльвалі з кулямётаў. Некалькі чалавек атрымалі ра- ненні. Іх везлі на калёсах. Прыходзілася рухацца ноччу, а днём хавацца ад варожага вока ў лясах.

І ўсё ж статак дагналі да Арла, потым жывёлу эвакуіравалі ў калгас імя Молатава Саснова-Саланецкага раёна Куйбышаўскай вобласці. Пакуты скончыліся, можна было адпачываць, тым больш, што тут не раўлі над галавой гітлераўскія самалёты, не бухалі выбухі снарадаў. Аднак юнак не думаў пра адпачынак.

Леанід пайшоў у ваенкамат. Прыпісаў сабе два гады і трапіў у армію. Яго залічылі курсантам вайсковага пяхотнага вучылішча ў Куйбышаве. А па заканчэнні прызначылі камандзірам стралковага ўзвода 18-й Чырванасцяжнай гвардзейскай дывізіі 16-й арміі.

Малады, нявопытны, як кажуць, неабстраляны юнак узначаліў узвод. А ва ўзводзе салдаты старэйшыя ўзростам, якія панюхалі пораху і не раз глядзелі смерці ў твар. Спачатку не надта паважалі яны свайго камандзіра. Павага і любоў байцоў да свайго камандзіра прыйшлі паступова. Ён у баях праяўляў пэўныя камандзірскія здольнасці, не даваў бязглуздых загадав шкадаваў воінаў і сам кідаўся ўперад, не хаваючыся ў цяжкім баі ад куль. Кулі нібы паважалі такую адвагу.

Масква—Старая Руса—Арлоўскі накірунак—Курская дуга. Такім баявым шляхам прайшла дывізія. І ўсюды баі, цяжкія, кровапралітныя. Пасля кожнай сутычкі з ворагам узвод недалічваўся некалькіх байцоў. Капалі магілы з маўклівай злосцю, са спахмурнелымі тварамі. А потым зноў баі.

Пасля першага ранения Леанід адляжаўся ў шпіталі і зноў вярнуўся ў строй. Другое ранение прымусіла забыць аб арміі. Крываносаў страціў шмат крыві, яго падабралі санітары. Лічылі, што не выжыве, але з дапамогай урачоў Леанід перамог смерць. Каля года лячыўся ў Томску. Вярнуўся ў Крычаў у 1946 годзе, пра- цаваў выкладчыкам ваеннай справы ў сярэдняй школе № 1. Любілі і паважал! яго вучні, як і некалі салдаты на фронце. За дабрыню, дысцыплінаванасць, душэўную чысціню, спагадлівасць.

Даўно ўжо закончылася вайна. Цішыня гаспадарыла ўсюды. Але не для яго. Сляды вайны жылі ў яго целе,

болем напаміналі аб сабе атрыманыя раны. Памёр Леанід Сідаравіч Крыванасаў. Не ўсе раны зажываюць.

На пахаванні сябры неслі ордэн Чырвонай Зоркі і чатыры медалі, сярод якіх быў медаль «За адвагу».

А споўнілася яму ў той час усяго 41 год.

Наш апошні бой

З успамінаў Я. Бяспалава, былога камандзіра гарматнага разліку

Да Эльбы заставалася кіламетраў шэсць. Стралковы батальён каштана Папова рухаўся па лясной дарозе калонай. За батальёнам следаваў артылерыйскі ўзвод палковай батарэі старшага лейтэнанта Камарова.

Лес маўчаў. Галоўныя і бакавыя дазоры падавалі сігналы, што праціўніка няма.

Канчаўся цёплы дзень 7 мая 1945 года. Лясное паветра пахла смалою. Аб вайне напаміналі рэдкія разрывы снарадаў дзесьці справа, за лесам. Наша дальнабойная артылерыя маўчала. Быў загад: за Эльбу не страляць, там саюзнікі - амерыканцы.

Старшы лейтэнант Камароў сказаў камандзіру разліку Іванову:

—Цішыня не да спадобы мне.

—Можа, фашысты да амерыканцаў драпанулі, — адказаў той.

—Не маглі паспець. На світанку бой трымалі.

—Тады дзесьці прытаіліся.

—Гэта найбольш верагодна.

Галава калоны батальёна сутыкнулася з варожай засадай нечакана. Толькі выйшлі на паляну, як з густога ельніку застракаталі кулямёты. Пра- шыты шасцю кулямі, упаў капітан Папоў. Усю вайну прайшоў чалавек. А тут, ля Эльбы, напаткала храбрага камандзіра смерць. Пехацінцы рассыпался па ўскрайку паляны, завязалі бой.

Ездавыя галаўнога гарматнага разліку не паспелі павярнуць упражкі пад ахову тоўстых хваін, як коней зрэзала кулямётная чарга. Камандзір разліку Іваноў нажом абрэзаў пастромкі і разлік развярнуў гармату ў бок ворага. Кулямёт фашыстаў стаяў насупраць дарогі, паліваў яе выхад на паляну доўгімі чэргамі.

Фугасным снарадам наводчык з першага стрэлу прымусіў змоўкнуць варожы кулямёт. Разлік другой гарматы таксама адкрыў агонь па абароне праціўніка. Адна за другою змаўкалі варожыя агнявыя кропкі, слабеў агонь аўтаматчыкаў. Асколачныя снарады дзвюх гармат змяталі іх з абароны. Справа і злева забухалі гранаты, прагучала «ура». Батальён перайшоў у атаку.

Цяпер стралкі і аўтаматчыкі батальёна ішлі па лесе шырокім ланцугом. Перастрэлка ўспыхнула і тут жа затухла. Перад выхадам з лесу зноў завязаў- ся жорсткі бой. Фашысты ўпарта не пускалі нашых байцоў да перапраў. Камандзір палка прыслаў батальёну падмацаванне - палкавую роту аўтаматчыкаў і другі ўзвод батарэі. Перад заходам сонца супраціўленне ворага было зломлена. Аўтаматчыкі захапілі ў палон восем фашыстаў. З васьмі толькі адзін аказаўся немцам, астатнія былі рускія, з фарміравання «Паліцай- СС». На рукавах шынялёў - злавесная фашысцкая свастыка і чэрап з касця- мі. Калі падыйшоў камандзір палка падпалкоўнік Манузін, паліцаі сталі перад ім на калені і пачалі прасіць літасці.

—Позна, — сказаў кампалка. - Ды я вас у палон не браў. У салдат прасіце.

Здраднікаў расстралялі.

Ноччу выйшлі да Эльбы. На супрацьлеглым беразе амерыканскія дазоры пускалі ракеты. Пуставалі перакінутыя цераз раку пантонныя масты. Густа стаялі па-над берагам кінутыя ворагам аўтамабілі, цягачы, бронетранспарцёры, танкі, павозкі, гарматы. Яны напаміналі магільнікі грознай яшчэ ўчора фашысцкай тэхнікі.

Раніцай 8 мая ў напрамку Эльбы рухалася вялікая калона гітлераўцаў. Нашы прад'явілі ультыматум на здачу ў палой. Генерал адхіліў гірапанову і даў каманду да бою. Ён спадзяваўся прабіцца да пераправы і здацца амерыканцам. Але не паспелі фашысты прыняць баявы парадак, як шквальным агнявым ударам артылерыйскіх і мінамётных батарэй з калонай было пакончана. Генерал-фашыст застрэліўся. Хто застаўся ў жывых, палічыў за лепшае здацца ў палон нашым салдатам.

Тэта быў апошні бой артылерыстаў батарэі старшага лейтэнанта Камарова на цяжкіх дарогах Вялікай Айчыннай вайны.

Яны прайшлі дарогамі вайны

Горад КРЫЧАЎ

АБЛАКАЗАЎ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1919, радавы. Ваяваў на Сталінградскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АБУХОВІЧ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1919, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АВЕТЧАНКА Адам Аляксандравіч, н. у 1924, сяржант. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

АГАПАЎ Аляксандр Іванавіч, н. у 1918, мал. сяржант. Ваяваў на Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «Заадвагу», «За перамогу над Германіяй».

АГЕЕНКА Антон Паўлавіч, н. у 1914, радавы. Ваяваў на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЗАРАВА Юлія Адольфаўна, н. у 1920, радавая. Ваявала на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

АЗАРАЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1919, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Масквы», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АЗАРАЎ Мікалай Фёдаравіч, н. **у 1923,** яфрэйтар. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЗАРАЎ Сцяпан Апанасавіч, н. у 1918, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АКІМАЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЛДОХІН Мікалай Раманавіч, н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «Заўзяцце Кёнігсберга», «Заўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АЛПЕЎ Асад Гайдаравіч, н. у 1923, сяржант. Ваяваў на Сцяпным, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

АЛЯКСЕЕНКА Алена Пятроўна, н. у 1917, медсястра. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

АНГЕЛЬЦАЎ Васіль Гаўрылавіч, н. у 1923, мал. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНДРУШЧАНКА Міхаіл Іванавіч, н. у **1913,** радавы. Ваяваў на Заходнім фронце.

АНДРЭЕЎ Васіль Андрэевіч, н. у **1**926, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНДРЭЕУ Іван Харытонавіч, н. у 1914, сяржант. Ваяваў на Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АНДРЭЕЎ Пётр Навумавіч, н. у 1902, яфрэйтар. Ваяваў на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНІКЕЕЎ Леанід Паўлавіч, н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце.

АНІКЕЕЎ Пётр Фаміч, н. у 1922, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За ад вагу», «За перамогу над Германіяй».

АНІСІМАЎ Рыгор Гаўрылавіч, н. у **1917,** радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За ад вагу», «За перамогу над Германіяй».

АНІШЧАНКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1920, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АНОШКА Гвідон Людвігавіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АНПІЛАЎ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1914, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНТАНКАЎ Якаў Маркавіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНТОНАЎ Васіль Мікалаевіч, н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНТОНЕНКА Рыгор Фаміч, н. у 1922, мал. сяржант. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АНТУСЕЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1922, сяржант. Ваяваўна Сталінградскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

АПАЛКА Барыс Іванавіч, н. у 1922, яфрэйтар. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АРЦЁМАУ Васіль Іосіфавіч, н. у 1923, мал. сяржант. Ваяваў на Калінінскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АСМАЛОЎСКІ Герасім Герасімавіч, н. у 1903, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АСМАЛОЎСКІ Зміцер Яўхімавіч, н. у 1920, радавы. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АСМАЛОУСКІ Іван Іванавіч, н. у 1926, старшына. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

АСМАЛОЎСКІ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АСТАНКЕВІЧ Рыгор Дзям'янавіч, н. у 1921, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АСТАПАВА Валянціна Сцяпанаўна, н. у 1924, удзельніца партызанскага руху.

АСТАПАЎ Фёдар Апанасавіч, н. у 1914, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

АСТАПЕНКА Міхаіл Данілавіч, н. у 1918, радавы. Ваяваў на Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АСТАПЕНКА Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1924, ст. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

АСТРАВ УХАЎ Аляксандр Філіпавіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЎДЗЕЕНКА Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1926, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЎРАМЕНКА Іван Андрэевіч, н. у 1915, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

АЎЧЫННІКАЎ Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1919, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АФАНАСЕНК А Аляксандр Восіпавіч, н.у 1924, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «Заўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

АФАНАСЬЕЎ Міхаіл Аксёнавіч, н. у 1925, мал. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

АХАРЦАЎ Віктар Міхайлавіч, н. у 1911, старшына. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАБАРЫКІН Іван Сцяпанавіч, н. у 1919, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах.

БАДЗЕЕЎ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1917, старшына. Ваяваў на Цэнтральным, 1-м Украінскім

франтах. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАДРОЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1914, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БАЖКОЎ Міхаіл Ермалаевіч, н. у 1915, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАЗЫЛЕВІЧ Ганна Флягонтаўна, н. у 1922, радавая. Ваявала на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

БАЗЫЛЕЎ Павел Адамавіч, н. у 1922, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце.

БАКУЛЕНКА Мікалай Мікалаевіч, н. у 1904, радавы. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАКУТАЎ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1922, мал. сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі»ъ«За перамогу над Германіяй».

БАЛДЭСАЎ Віктар Фядосавіч, н. у 1924, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАЛДУЕЎ Іван Іларыёнавіч, н. у 1923, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй».

БАЛКУЗАЎ Георгій Мікалаевіч, н. у 1921, радавы. Ваяваў на Сцяпным, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БАЛОННІКАЎ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1923, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАНДАРЭНКА Міхаіл Пятровіч, н. у 1918, сяржант. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, Бранскім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАНДАРЭНКА Пётр Міхайлавіч, н. у 1913, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАНДАРЭНКА Таццяна Іванаўна, н. у 1922, медсястра. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

БАРАБАШ Іван Міхайлавіч, н. у 1914, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАРАБОШКІН Павел Ільіч, н. у 1928, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАРАВІКОЎ Аляксей Іванавіч, н. у **1917,** ст. сяржант. Ваяваўна Паўднёва-Заходнім, Бранскім, 1- м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАРАВІКОЎ Ілля Макаравіч, н. у 1920, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАРАВІКОЎ Канстанцін Цімафеевіч, н. у 1913, радавы. Ваяваў на Прыбалтыйскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БАРАНЦАЎ Аляксандр Ілліч, н. у **1910,** старшына. Ваяваў на Заходнім, Сталінградскім, 2- м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За абарону Сталінграда», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

Больш увагі сталі людзі ўдзяляць і навядзенню ўнутранага хатняга парадку. У каго была дашчаная падлога, рэгулярна мылі яе, сцены ўпрыгожвалі адбеленымі і вышытымі ручнікамі, сталы імкнуліся засцілаць прыгожа вытканымі сурвэткамі. У агародчыках, пад вокнамі садзілі бэз.

Канешне, ні ў якім разе нельга параўнаць хату сённяшняга вяскоўца з жыллём людзей таго часу. Бо тады хата з'яўлялася не толькі надзейным сховішчам ад халадоў і дажджоў, але і служыла сваеасаблівым складам для захоўвання харчовых прадуктаў. Пад падлогай, у выкапанай яме, знаходзілася бульба, буракі, рэдзька, дзе-небудзь у вуглу ляжалі гарбузы, на зіму ўкочвалі сюды і бочку з салёнымі гуркамі і квашанай капустай, ратуючы ад маразоў.

Крэслы не былі ў пашане ў сельскіх жыхароў Крычаўшчыны таго часу. Пэўна, з-за высокай, не кожнаму даступнай цаны іх замянялі лаўкі, што стаялі ўсцяж сцен, і кароткія ўслоны.

Абедзенны стол стаяў у куце пад іконамі. Есці заўсёды садзіліся сям'ёй. Калі хто-небудзь прыпазняўся, чакалі, і стравы даставаліся з печы толькі з яго з'яўленнем. Елі з адной місы па некалькі чалавек. Місы былі гліняныя, глыбокія і шырокія. Ашчадна адносіліся да хлеба. Нават дзеці, калі крошкі са скібы падалі на стол, падбіралі іх і адпраўлялі у рот. Падсілкаваўшыся, усе дзякавалі Богу за сняданак, абед ці вячэру і разыходзіліся, каб заняцца сваёй справай.

Спалі на сшытых з ільнянога палатна матрацах, набітых саломай. Такія ж былі і падушкі. Калі салома праціралася як не на мякіну, яе вытрасалі і набівалі свежай. Навалачкі, коўдры былі толькі з даматканай матэрыі, пасцельнымі рэчамі фабрычнага вырабу вяскоўцы не карысталіся.

Доўгі час хаты асвятляліся лучы- най. Пры такім мізерным святле людзі ўмудраліся і ткаць, і прасці, бо выконвалася гэта праца пераважна зімовымі вечарамі, калі дзень кароткі, а ноч бясконца доўгая. Потым на змену лучы- не прыйшла газавая лямпа. Спачатку яна з'явілася ў багацейшых вяскоўцаў, потым на яе набыццё сталі адкаштоўваць грошы і беднякі.

Да кожнай хаты прыбудоўвалі крычаўляне сенцы. Памер іх залежаў ад матэрыяльнай магчымасці гаспадара.

У сенцах гаспадыня таўкла бульбу, рабіла мешанку свінням, мыла посуд і

бялізну, рыхтавала да заквашвання капусту, саліла агуркі, памідоры. Тут жа захоўваліся і неабходныя рэчы дамашняга ўжытку, а таксама некаторыя харчовыя прадукты.

Пачалі сяляне з цягам часу і ўпрыгожваць мясціны каля сваіх хат. Садзілі рабіны, бярозы і вярбу. Невядома чым упадабалася крычаўлянам вярба, можа тым, што ў песнях часта тэта дрэва падаецца сіратой, сумнай і пакрыўджанай, але ў болыпасці вёсак на вуліцах растуць менавіта вербы. Тоўстыя, раскідзістыя. Каля іх днём гарэзавалі дзеці, а вечарамі збіраліся хлопцы і дзяўчаты. Да пазна рыпаў гармонік, гучалі песні.

З.М. Скачкова.

Вопратка і абутак

Няцяжка ўявіць, што за абутак і вопратка былі ў напхых старажытных продкаў, бо майстравалі яны іх, каб абараніць цела ад холаду, укусаў змей. Паступова чалавечы разум падказваў спосабы ўдасканальвання вопраткі, абутку ў бок практычнасці, надзейнасці і прыгажосці.

Вось якую вопратку на крычаўлянах убачыў Андрэй Меер у XVIII стагоддзі.

«... Одежда здешних крестьян состоит летом в пеньковых касталонах или, по-российски, балахонах, а на переплетённых оборами наподобие латышей ногах носят они сплетенные из одного только лыка плоские с петлями каверзни или из пяти лык – пятирники: сверх своих касталонов носят они зимою белые домоткального сукна свиты или окрашенные из спагож синие кафтаны из собственной своей, два раза в год, то есть весной и осенью, с овец состригаемой шерсти.

Летом прикрывают они свои головы валеными из белой шерсти наподобие русских больших от шляп тулей колпаками. Большая их от других отличность состоит в кожаных на таковых же ремнях сумках.

Женщины летом носят пёстрые из домоткального сукна паниовы и каразейные передники, а зимою шталты, или род безрукавных корсетов. Оные состоят обыкновенно либо из каразея, либо из домоткального сукна, а иногда из шёлку, и обшиваются холстиною... сверху покрываются оне мужскими свитами.

Женщины волосы свои наподобие российских плетут в две косы, которые, покрывая зборником с рожками, увивают последние белою из четырёх аршин холстиною нометкою, коей конусы оставляются на зади наподобие лопастей.

Девки головы убирают на еврейский образец, заплетёнными вверх двумя косами и завязанными на перед бантом: чело покрывают разных метарий белыми повязками, а шеи свои с бабами наравне украшают состоящими из окрашенных из воску кралей ожерельями, в середине коих навешивают иногда вырезываемые из верезубовой гортани, которые оправляют в медные кольцы. У еврейских жён переняли.

В местечках живущия достаточные женщины только тем отличаются, что богатые одежды носят и головы свои польскими черными из плису или бархата повязками одевают. Сии повязки большей частью обшиты бывают

либо шёлковым кружевом, либо золотою сеткой, и носятся сверх каптура или рода русских древних с ушками шапочек. Мещане отличаются носимою ими на польский шляхетский образец одеждою». Мейер Андрей. Описание Кричевского графства. Могилёвская старина. Выпуск II. Могилёв, 1901 г. С. 96.

XIX і пачатак XX ст. унеслі значныя карэктывы ў адзенне і абутак як крычаўлян, так і насельніцтва ўсёй Беларусь Гэтаму паспрыяў тэхнічны прагрэс, з'яўленне дробных і буйных фабрык па выпуску розных тканін, па пашыву вопраткі і абутку, усюды гандлявалі мануфактурай незвычайна яркіх і прыгожых колераў. Скуру таксама пачалі вырабляць больш якасна. Для тых, хто меў грошы і любіў элегантна апрануцца, тэта з'явілася святам. Мануфактурныя тавары сталі даступнымі. Але сяляне засталіся вернымі традыцыйнаму строю. Па-ранейшаму перавагу аддавалі яны рэчам надзейным, цёплым і не асабліва далікатным ва ўжытку.

Жанчыны насілі сарочкі, спадніцы з даматканага, добра адбеленага палатна. Каўняры сарочак і рукавы да локцяў упрыгожваліся вышыўкамі. Многія паверх сарочак надзявалі безрукаўкі, якія зашпільваліся на гузікі, іх называлі кабатамі. Кабаты стараліся мець вабна зіхоткага колеру, і шылі іх з крамнай (фабрычнай) тканіны.

Насілі жанчыны і андаракі. Сукно на іх шыццё ішло ўласнай вытворчасці, колер таксама падбіраўся кідкі, ужываўся як у паўсядзённым, так і ў святочным строі фартух. Шылі фартухі са стараннем, з тонкага самаробнага палатна, па-майстэрску аздаблялі ўсялякай вышыўкай. Шырокія, у большасці аж у тры паласы, фартухі з'яўляліся часткай строю крычаўлянак. Фартухі насілі паўсюль, у іх хадзілі ў царкву, з'яўляліся на пагулянках.

У летні час асноўным мужчынокім адзеннем былі штаны і кашуля. Іх надзявалі і ў святочныя дні. Кашулі былі як белага колеру, так і квацістыя. Шыліся з даматканага палатна, з тканіны фабрычнай вытворчасці. Звычайна каўняры рабіліся стаячымі, нярэдка іх упрыгожвалі вышыўкай. Кашулі шы- ліся доўгімі, ледзь не да кален, таму іх абавязкова падпяразвалі поясам з кутасамі. Паясы былі вязаныя, тканыя, плеценыя і служылі не толькі ўпрыгажэннем мужчынскага строю, але і дапаможным сродкам. Людзі пажылога ўзросту падвешвалі на іх кісеты з самасадам, крэсіва.

Калі ў крамах з'явіўся шырокі выбар тканін фабрычнай вытворчасці, у вёсках пашырылася кола мясцовых краўцоў. І, трэба адзначыць, без працы яны не засталіся. Бо з самаробнага палатна многія сяляне шылі сабе вопратку самі, а з фабрычнага – заказвалі добраму спецыялісту.

Зімой мужчыны насілі світкі, пашытыя з сукна і паўсукна дамашняга вырабу. Калі з'явілася ў продажы шмат фабрычных фарбавальнікаў, то і світкі сталі фарбаваць у розныя колеры. Пераважаў звычайна цёмны, карычневы. На вялікія маразы шылі кажухі. Іх насілі нетолькі мушчыны, але і жанчыны, дзяўчаты.

Аўчыны фарбавалі ў дубовай, альховай кары, часам абыходзіліся без афарбоўкі. Шылі кажухі і паўкажухі. У такой вопратцы не даймаў ні вецер, ні мароз. Галаву ў халады пакрывалі шапкай-вушанкай. Зроблена яна была з аўчыны, меху труса, зайца. Не па кішэні былі сялянам галаўныя ўборы з бабровага, лісінага і кунічнага меху,

такія шапкі насілі багацеі. У летні час мужчыны карысталіся кёпкамі і картузамі.

Жанчыны насілі хусткі, касынкі. Летам – лёгкія, з тонкай тканіны, пераважна фабрычнага вырабу, усялякага колеру афарбовак, зімой – цёплыя, шарсцяныя ці суконныя.

Доўгі час асноўным абуткам крычаўлян з'яўляліся лапці. Дралі лыка з кары ліпы або лазы, сушылі, а потым плялі. Няхітрая на першы погляд работа патрабавала ўмення і спрыту. Не кожны мог яе рабіць. У лапцях мужчыны, жанчыны, дзяўчаты летам упраўляліся па гаспадарцы, хадзілі на сенажаць, наведвалі царкву і з'яўляліся на пагулянкі. Кожны назапашваў для сябе некалькі пар ануч, для будзённага дня і свята. Для кожнага дня на анучы выкарыстоўвалі самаробную палатнянаю тканіну, а на святы – пяшчотную, дбайна адбеленную, мяккую і чыстую. Каб лапці не так хутка стоптваліся, іх падшывалі сырамятнай скурай, лямцам. Спрабавалі многія насіць і чуні – абутак накшталт лапцяў толькі сплецены не з лыка, а з тонкіх вяроўчын.

З наступлением маразоў сяляне абувалі валёнкі. Паколькі займець галёшы не кожны мог з-за іх высокай цаны, то на валёнкі надзявалі лапці.

Паступова ў быт сялян пачаў уваходзіць скураны абутак. Боты, туфлі, чаравічкі, як жаночыя, так і мужчынскія. Скураны абутак саматужнай і фабрычнай вытворчасці лічыўся каштоўнай рэччу і да яго адносіліся беражліва. Трэба, скажам, селяніну трапіць у горад. А да яго пятнаццаць вёрст. Узнімаецца чалавек досвіткам, адзяецца і – ў дарогу. Прастуе басанож, ногі халадзіць раса, а боты на плячы вісяць. Ля першых дамоў горада абувае іх селянін і рухаецца далей. Парабіўшы свае справы, ён выходзіць з горада і разуваецца, зноў боты на плячо ўскідвае. Дома іх старанна выцірае ад пылу і на шасток падвешвае. Такім жа самым чынам паступалі і жанчыны, ашчаджаючы свой скураны абутак.

Нярэдка здаралася, што паміраў чалавек, а купленыя некалькі дзесяткаў гадоў таму боты ці чаравічкі мелі выгляд быццам толькі з крамы.

Усе тэта сведчанне таго, што большасць сельскага насельніцтва Крычаўшчыны ў канцы XIX – пачатку XX ст. мела нізкі узровень жыцця, не дастатак, а нястача гаспадарыла ў хатах працаўнікоў палёў.

Нельга сказаць, што ў тэты час гараджане раскашавалі. Багацеі багацелі, а дробныя рамеснікі так-сяк зводзілі канцы з канцамі. Ім было не да баляў шыкоўных, не да моднай і дарагой вопраткі.

Як адзначалі святы

Поры году ўяўляліся нашым предкам як жывыя багі і багіні, якія па чарзе прыходзяць на зямлю і ўладараць над ёй пэўны тэрмін. Вясну яны называлі дзяўчынай гожай і добрай, лета – малойцам прыгожым і багатым, восень лічылі падобнай на жанчыну старую, але багатую і шматдзетную, а зіму – бязлітаснай жонкай, мачахай.

Адным з самых цікавых і, напэўна, найважнейшым быў цыкл веснавых святаў. Вясной абуджалася прырода, пачыналіся клопаты аб будучым ураджаі, ад таго, наколькі цёплай будзе яна, залежалі дабрабыт і лад жыцця чалавека. І таму гуканню вясны крычаў- ляне надавалі сур'ёзную увагу.

25 сакавіка (на Благавешчанне)

моладзь збіралася на грудах ці ўзгорках за сялом. Дзяўчаты спявалі пеені, так званыя вяснянкі. Актыўна ўдзельнічалі ў абрадзе жанчыны і дзеці. У некаторых вёсках раскладвалі вогнішчы, спальвалі непатрэбныя старыя рэчы. Гэта сімвалізавала «праклён» холаду, голаду, злу, смерці і ўслаўленне пачатку абнаўлення жыцця.

Дзяўчаты спявалі:

Благаславі, маці,
Вясну загукаці.
На новае лета,
На густое жыта!

Памажы, Божа,
Нам вясну гукаці!
Зарадзі, Божа,
Лета цеплыя!

Песні выконваліся розныя. Але ў кожным тэксце прысутнічала традыцыйнае пажаданне добрага ўраджаю, ад якога і палі, і пуні, і клеці поўныя, а гэта значыць у хатах пануе сытасць і весялосць.

А святое Благавешчанне,
Благаславі, Божа.
Благаславі, Божа,
Дай, Божа, вясну-красну.
Дай, Божа, вясну-красну
Ды на цеплыя лета,
Ды на цеплыя лета,
Ды на густыя жыта.
На густыя ядраністыя,
Коласам каласістыя!
А ў полі капамі,
А ў клеці кырабамі.
А ў клеці кырабамі
А на стале пірагамі.

У напеве чуюцца спаконвечныя замоўна-заклікальныя інтанацыі, звязаныя са старадаўнімі магічнымі абрадамі заклікання добрага надвор'я, шчодрага намалоту і г.д. Людзі да вясны звяртаюцца як да адухоўленай асобы і спадзяюцца, што іх просьбы не застануцца без увагі. Цыкл веснавых песень уяўляе сабою цэласную лагічную сістэму, дзе кожны элемент надзяляецца асаблівым сэнсам.

Вясна-красна,
Што ты нам прынесла?
– Малым дзеткам –
Па яечку,
Старым бабкам –
Па кіёчку,
Маладым жонкам –
Па сыночку,
Красным дзеўкам –
Па вяночку,
Маладым хлопцам –
Па канёчку.

Песні-вяснянкі прывабліваюць яскравай паэтычнасцю, непаўторнай манерай выканання, асаблівай меладычнасцю і эмацыянальнасцю. Абрад гукання вясны праходзіў весела, займальна, людзі нібы прачыналіся пасля зімовых халадоў, узбадзёрваліся, жвавелі. Вось што пішаў кнізе «Календарно-песенная культура Белорусии» (Мн., 1985г. с 23) З.М.Можейко: «Из всего календарного цикла поэзия весенних праздников, пожалуй, в наибольшей степени сохраняет элементы древних анимистических представлений. Их следы можно усмотреть и в весеннем сближении человека с природой, когда все обряды, обычаи и песни выносятся на открытый воздух (на волю), а главной действенной силой песенной обрядности становятся переклички человеческих голосов с голосом природы».

Пасля абраду гукання вясны не за гарамі ўжо і Вялікдзень. Да гэтага свята рыхтаваліся старанна. Мылі падлогі, бялілі печы, убіралі смецце адусюль, куды яго панакідалі гнілая восень і марозная зіма. Агонь выкарыстоўваўся з практычнай і магічнай мэтай: зга-

рала смецце і разам з ім усё благое, што дастаўляла непрыемныя клопаты гаспадарам.

У «чысты чацвер» вуліцы вёсак засцілаў смалісты дым, які густа цёк з кожнай лазні. Крычаўляне мыліся ў лазнях да ўсходу сонца. Вада ачышчала, давала сілы, бадзёрасць, засцерагала гаспадарку ад мору, благога вока і іншага ліха, змывала ўсё кепскае.

На Вялікдзень у кожнай хаце сталы былі накрыты па-святочнаму. На кожным сямейніку красавалася святочная вопратка. Да страў, якія елі ў вялікодныя дні, фарбаваных яек, хлеба (караваю), шматлікіх страў са свініны – ставіліся як да абрадавых атрыбутаў. Ужыванне гэтай ежы прыраўноўвалася да магічных дзеянняў. Іх прызначэнне – забяспечыць урадлівасць зямлі, добры ураджай, даць зда- роўе, сілу земляробу і яго сям'і. У пер- шы дзень Вялікадня ў печах не палілі і нічога не гатавалі, харчаваліся загадзя прыгатаванымі і асвячонымі да свята прадуктамі.

Пірагі, булкі, караваі, выпечаныя з вялікім майстэрствам, (так званая паска) паўстаюць як сімвал сонца, як родапачынальнік, захавальнік дастатку. З іх дапамогай на Вялікдзень клікалі не толькі новы ураджай, але рабілі спробу вызначыць, які ён будзе. Для гэтага каравай неслі ў поле і клалі сярод парасткаў жыта. Калі парасткі перакрывалі каравай, ураджай чакаўся добры, калі не – кепскі.

Яйка таксамса займала пачэснае месца ў святочнай ежы. Каб зямля радзіла, яйкі клалі ў зямлю. Іх таксама качалі па могілках сваякоў, а потым закопвалі, у продкаў прасілі заступніцтва і дапамогі ў барацьбе за ўраджай. Даволі распаўсюджанай на Вялікдзень была гульня яйкамі ў біткі.

Вялікдзень немагчыма было ўявіць без валачобнікаў. Збіраліся яны па некалькі чалавек, выбіралі запявалу. Ён павінен быў мець добры голас, ведаць шмат песен і, як кажуць, не лезці ў кішэню за словам. Валачобнікі абыходзілі двары аднавяскоўцаў, віншавалі гаспадароў са святам, спявалі ім валачобныя песні і атрымлівалі за гэта фарбаваныя яйкі, пірагі, мяса, сала, каўбасу і іншы харч. Часта валачобнікаў зазывалі ў хату і частавалі святочнымі прысмакамі.

Звычайна падыходзілі валачобнікі да хаты і адзін з удзельнікаў абходу пытаўся ў гаспадара: «Ці можна са святам павіншаваць?». Атрымаўшы станоўчы адказ, зацягвалі песню.

Дай жа, Божа, гаспадару,
Жыці-быці, сто бочак жыта намалаціці,
Паўбочкі прадаці, валачобнікам даці.

Валачобны рэпертуар даволі багаты. Тут і пажаданні гаспадарам багацця, любоўная і шлюбная тэматыка, зычанне шчаслівай долі, здароўя дзецям, а таксама росту і прыплоду хатняй жывёле. Адспяваўшы ў хаце ці пад яе вокнамі загадзя падрыхтаваныя для кожнага гаспадара песні, атрымаўшы за гэта пачастунак, валачобнікі звычайна развітваліся:

А на дварэ стаіць дубок,
Хрыстос васкрэс, сын божы!
А на дубку сінь галубок.
Выйшау, выйшау млады Йванька,
Меціў стрэліць у галубка.
- Не бі мяне, не страляй мяне,
Я ж табе прыгаджуся,
А як будзеш жаніціся,
Як будзеш браць за гарамі,
За гарамі, за марамі,
Будзеш прасіць піравозчыкаў,
Будзеш прасіць, не ўпросішся,
А я ж цябе піравязу:
Цябе з Марынкай на хрыпточку,
А радзінку на хвасточку.

Закончыўшы абход двароў аднавяскоўцаў, валачобнікі ішлі дзяліць сваю здабычу і рабілі гэта з гумарам і святочным ажыўленнем.

Калі на Вялікдзень крычаўляне лічылі за вялікі грэх убіць цвік у сцяну, то на Раданіцу гаспадары з раніцы займаліся рознымі хатнімі справамі. Гаспадыні рыхтавалі ежу. Потым апраналіся ва ўсё святочнае і кіраваліся на могілкі. Засцілалі магілкі сваякоў квяцістымі абрусамі, ставілі на іх пачастунак, але нейкі час да ежы і выпіўкі не дакраналіся. Потым першую чарку налівалі нябожчыку і ставілі на магілку.

На сёмым тыдні пасля Вялікадня святкавалася Тройца. Тройца – царкоўна-хрысціянская назва, прымеркаваная да язычніцкіх святаў. У самой назве «Тройца» заключаецца адзін з асноўных дагматаў хрысціянскай праваслаўнай веры – трыадзінства Бога-айца, Бога-сына і Святога Духа (Духаў дзень).

Напярэдадні Тройцы вяскоўцы старанна прыбіралі ў хатах, а потым адпраўляліся ў лясы, на рэчку, ірвалі явар, секлі маладыя дрэўцы: бярозку, клён, ясень, ліпу, або наламвалі з гэтых дрэў цэлае бярэма галінак. Дрэўцы ставілі ля парогаў хат, а галінкамі ўпрыгожвалі сцены хат, гаспадарчыя пабудовы, явар рассыпалі па падлозе. Цэрквы таксама аздабляліся зелянінай.

Траецкія абрады станавіліся сапраўдным святам маладой, але ўжо акрэплай зеляніны. Ёй прыпісвалі магічныя ўласцівасці. Галіны дрэў, асабліва асіны, павінны былі засцерагчы ад усялякай нечысці. Абаранялі ад злых сіл палын, любістак. Галінкі дрэў, кветкі і травы, якія асвячаліся на тройцу і захоўваліся на працягу года, павінны былі прадухілць навальніцу і градабой: «при наступлении грозовых туч (их) жгут на медленном огне для отвращения грозы» (П.Шейн. Материалы быта и языка русского населения северо-западного края. Т. 1-3. СПБ, 1887 г. Т 1. 4.1 С. 185). Сабраным на Духаў дзень кветкам і травам адводзілася роля лекавых. Імі «абкурвалі» хворых, карысталіся ад перапуду і сурокаў.

Расправа з бярозай давала нашым продкам веру, што пакінутая на полі ці кінутая ў ваду яна павінна перадаць сваю раслінную сілу зямлі, садзейнічаць росту хлябоў, засцерагчы пасевы ад стыхійных бедстваў.

Крычаўляне цвёрда верылі ў павер'е, што разам з веснавым абуджэннем прыроды ажываюць і душы памерлых, якія трэба падтрымліваць ежай, піццём і цяплом некалькі разоў у год. У знак любові і павагі да сваіх сямейных продкаў наладжваліся памінальныя сталы – «дзяды». «Дзяды» спраўляліся вясной і восенню.

Веснавыя дзяды праводзіліся ў суботу, напярэдадні Тройцы. Гаспадыня прыбірала ў хаце, гаспадар наводзіў парадак на двары. Перад правядзеннем абраду сям'я абавязкова мылася у лазні. Колькасць страў якія гатаваліся для святкавання, павінна быць няцотнай. І да гэтага часу у вёснах гатуюць на пахаванні і «дзяды» «канон» – з хлеба, мёду, вады, салодкі напітак. «Канон» пілі па чарзе, па тры лыжкі кожны чалавек. Снедалі моўчкі, кожны адкладваў у прызначаную міску для памерлых кавалак якой-небудзь ежы, а потым гэту пасудзіну пакідалі на стале. І пры гэтым гаварылі: «Няхай са святыми пачивают, а нам хлеба-соли засылают» (Н.Никольский. Дохристианские верования и культы днепровских славян. М., 1929.

С. 23). Жывыя спадзяваліся, што іх памерлыя сваякі будуць усяляк аказваць дапамогу, таму і звярталіся да «дзядоў» з запрашэннем да сямейнай трапезы.

Купальскае свята з'яуляецца адным з самых паэтычных і маляўнічых, насычаных рознымі паданнямі і легендамі. Быццам бы ў гэтую ноч расцвітае папараць а дванаццатай гадзіне, і той, хто знойдзе яе кветку, будзе шчаслівым. Яму стануць падуладны ўсе схаваныя ў зямлі клады, ён стане разумець мову дрэў звяроў, птушак.

У купальскую ноч дрэвы нібы пераходзяць з месца на месца, рэкі свецяцца дзівосным святлом і адбываецца разгул нячыстай сілы, шабаш вядзьмарак.

Святкавалі Купалу крычаўляне ўрачыста, весела. Выбіралі ўзвышанае месца, а нярэдка і берагі рэк ці азёр, распальвалі там вечарам вогнішча. Чым вышэйшым будзе вогнішча, тым болын ураджайным жыта. Вядомы рускі філолаг А. Пацябня пісаў: «Купальские и другие им подобные огни имеют силу давать урожай и прогонять смерть не сами по себе, а потому, что олицетворяют солнце» (О некоторых символах в славянской народной поэзии». Харьков, 1914. С. 163).

Кожны прысутны абавязкова пераскокваў цераз вогнішча. На агні спальвалі «май» – засохлую зеляніну, якая вывешвалася у хатах на Тройцу. Тэты дым лічыўся ачышчальным і гаючым, ім не толькі акурвалі дзяцей, хворых, але нярэдка вакол вогнішча абводзілі жывёлу. У некаторых месцах кідалі ў агонь усялякія прадметы і прыгаварвалі: «Каб гадавалася скаціна», «Зарадзі, жыта», «Зарадзі, лён». Каб ахаваць ураджай ад вядзьмарак і ведзьмакоў, у жыта кідалі галавешку з купальскага вогнішча.



У купальскую ноч.

Дзяўчаты пускаюць на ваду вяночкі.

Хлопцы і дзяўчаты ды людзі пажылога ўзросту спраўлялі абавязковае купанне ў раках, азёрах ці вадаёмах. Бо купальская вада, па паданню, валодае жыватворнай, гаючай і пладаноснай сілай, ад яе людзі робяцца прыгожымі.

Дзяўчаты плялі вянкі і пускалі на ваду. Глядзелі, куды яны паплывуць, у той бок дзяўчына пойдзе замуж. Калі ж вянок патоне, гэта прадвяшчала няшчасце. Гучала шмат песень, тэматычна-разнастайных, але непасрэдна звязаных са святам.

Шла Купалка сялом, сялом,
Ай, рана, на Йвана.
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
Сталі людзі дзівіціся,
Стала Купалка сварыціся:
- Ідзіце туды дзівіцеся,
Дзе будзе Іванька жаніціся.
Ён сам едзець у вазочку,
Дзявочка яго – у вяночку.
Ён сам сядзіць, як жар гарыць,
Дзявочка яго, як мак цвіціць.

***

Сягоння Ян, заўтра Іван
Дзеўкі зёлкі збіралі.
Што за зёлкі, не зналі
І да цара паслалі.
А цар зёлак не пазнаў,
Да царэўны ён паслаў.
А царэўна пазнала,
Усю праўдачку сказала.
Гэты зёлкі – купалінкі,
Гэты дзеўкі – паненкі.

У пажылых жанок песні гучалі так:

У Купалачкі тры дачкі.
Купала на Йвана!
Адна дачка тонка, высока.
Купала на Йвана!
Другая дачка бела, румяна.
Купала на Йвана!
Трэцяя дачка тоўста, гарбата.
Купала на Йвана!

Або:

Купалка Йвана на вулку звало.
- Ні маю часу, Купалачко
Пайду ў жытнае жыта глядзеці,
Каб міня ведьма ні вітала,
У жыці калосся ні зрывало.
У кароў малокі не адбірало.

Вядома ж, у купальскую ноч моладзь не толькі ўдзельнічала ў рытуальным абрадзе, але і сваволіла. Разбіралі масткі, затыкалі анучамі каміны хат, падпіралі дзверы, каб ніхто з жытла не мог выйсці, зносілі на дарогу пліты і г.д.

У купальскую ноч, як і ў ноч на Ка-

ляды, дзяўчаты, жанчыны і хлопцы варажылі на сваіх суджаных, замужнія – аб сваім будучым жыцці. Пад ложак у галовах ставілі пасудзіну з вадой і замыкалі яе замком. Чакалі, што ў сне прыдзе суджаны і адамкне замок ключом. Або на пасудзіну з вадой клалі прадмет, які быў падобны на масток. Суджаны павінен быў у сне прайсці ці праехаць цераз тэты масток.

Харчаваліся на купальскія ўрачыстасці таксама па-святочнаму. Смажылі яешню, пяклі бліны, варылі верашчаку, кулагу (каша з талакна ці ячменю).

Канешне, абавязковай на кожным стале была і чарка гарэлкі.

У заключэнне хочацца сказаць; што на Купалу даволі рана прачыналіся вяскоўцы. Яны ішлі на пагоркі і назіралі за ўсходам сонца, глядзелі як яно «іграе», свавольна скача і разыходзіцца радужнымі кругамі.

Купальскі абрад не памёр. Ён, пераасэнсаваны, працягвае жыць і цяпер, з'яўляецца жаданым святам для людзей, якія яго адзначаюць паважліва і весела.

В. Ф.Куліненка.

«Мяне замуж выдавалі...»

Вясельная абраднасць крычаўлян мала чым адрозніваецца ад такой жа абраднасці ў іншых мясцінах усходняй Беларусі. Спачатку да нявесты накіроўваліся сваты. Бацька, маці жаніха, яго родныя. Абавязкова ў лік сватоў уключалі якога-небудзь аўтарытэтнага ў вёсцы ці горадзе чалавека, звычайна заможнага і гаспадарлівага.

Бралі з сабой гарэлку, віно. Закускі выстаўлялі бацькі нявесты. Першая частка запоін праходзіла весела, асабліва, калі галоўны сват, перавязаны ручніком з багатай вышыўкай, быў на язык востры, схільны да гумару (такога ўсе імкнуліся выбраць). Ён шчодра сыпаў прымаўкамі, забаўнымі анекдотамі і пацяшаў тых, хто сабраўся за сталом.

Потым пераходзілі да справы. Дабіўшыся згоды бацькоў аддаць дачку замуж, пачыналі дэталёва абмяркоўваць дату вяселля, месца жыхарства маладых, памеры пасагу, які выдзеляць абодва бакі для падтрымкі новай сям'і. Развітваліся сваты з бацькамі нявесты ўжо як сваякі: абдымаліся і цалаваліся.

Вядома, кожныя бацькі жадалі выбраць сабе зяця ці нявестку з багатага двара, і калі такое здаралася, былі надта задаволенымі.

Звычайна маладыя паміж сабой згаворваліся да сватання. Але здараліся і выпадкі, калі жаніх і нявеста ў вочы не бачылі адзін аднаго. Сустракаліся толькі ў час сватання. Ажаніць іх дамаўляліся бацькі.

Маладых вянчалі ў царкве. Вяселле не гулялі ў Піліпаўскі, Велікодны, Пятроўскі, Спасаўскі пасты. Выбіралі такія часы для гульбішчаў, калі з поля было ўсё вырашчанае звезена і абмалочана і сена назапашана, а ў хлявах сыта рохкалі ўкормленыя вепручкі, у паграбах упарадкавана стаялі дары агарода. Вось тады марознае паветра далёка разносіла голас вясельных званочкаў.

У дзень вянчання бацькі жаніха благаслаўлялі яго да шлюбу, потым сябры і радня садзіліся на сані (летам – на калёсы), і святочна ўпрыгожаныя коні неслі іх да дома нявесты. Яна, прыбраная да шлюбу, ужо чакала з сяброўкамі жаніха: нявесту трэба было

«выкупіць» у сяброваk. «Торг» вялі сябры жаніха. Звычайна «аплочвалі» нявесту смачным віном, цукеркамі, якімі-небудзь дзявочымі ўпрыгажэннямі. Потым маладых благаслаўлялі хлебам і соллю маці, бацька і хросная маці нявесты. Адсюль вясельны поезд браў кірунак да царквы.

Дрэннай прыкметай лічылася, калі святочны картэж сустрэнецца з пахавальнай працэсіяй, дарогу перабяжыць чорная кошка ці пройдзе хто з пустым вядром.

Пасля вянчання вярталіся ў дом нявесты. Ля варот маладых сустракалі бацька і маці нявесты. Падносілі ім хлеб з соллю і налівалі па чарцы гарэлкі, якую яны два разы вылівалі цераз плячо назад (гэтым усё нядобрае ад сябе адкідвалі), а трэці раз выпівалі Потым жаніха і нявесту абсыпалі жытам, каб яны мелі хлеб і да хлеба, і вялі іх у хату, садзілі ў кут пад абразы.

Нагуляўшыся, выпраўляліся ў дом да жаніха. Нявеста абавязкова брала з сабой пасцельныя рэчы: коўдру, падушкі, прасцірадлы, ручнікі, абрусы. Тут ужо свёкар са свякрухай сустракалі хлебам і соллю. Вяселле гулялі па два-тры дні.

Нараджэнне дзіцяці

Усім, вядома, хочацца каб дзіця нараджалася не толькі прыгожым, здаровым, разумным, але каб і лёс яго напаткаў добры, удачлівы. На гэта і былі накіраваны традыцыйныя рытуалы, звязаныя з паяўленнем немаўляці на свет.

Адразу пасля нараджэння дзіцяці ва ўзгалоўі маці клалі прадмет, які павшей быў уберагчы жанчыну ад сурокаў (часцей за ўсё гэта быў бярозавы венік). Над нованароджаным бабка-павітуха чытала спецыяльную замову: «Першим разом, лепшим часом, поможи ме, Господзи, подзйўкі зговорици з (імя дзіцяці), з гэтага стану, з черных очей, з шыроких плечей, з синих жил, з жоўтой косьци, з румяного лица, з чорного волоса. Мо вы подуманные, мо вы погаданные, мо вы женоцкіе, мо вы дзевоцкіе, мо вы поробацкіе, мо вы свитальные, мо вы змеркальные, мо вы паўночные, мо вы утренніе, – по косьцях же вы ходзіце, косьцей не ломице, личка не хмурице. Досюль же вы кололи и пороли, ек мойго духу не чули, – цепер же полюбице мой дух мой дух: легеньки и цёпленьки. Я ж вам прошу, молю, ссылаю и зговораю, за сухія леса, на ницые лозы, гдзе вецер не вее, гдзе сонца не грее, гдзе людзи не ходзюць, гдзе пташки не летаюць». (П. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1893. Т.2 С. 534.)

Праз некалькі дзён пасля нараджэння дзіцяці бацькі павінны былі выбіраць хросных. Хросны бацька не пакідаў без увагі хрэсніка на працягу ўсяго жыцця і займаў у яго лёсе важнае месца. Хросная маці таксама клапацілася аб сваім падапечным.

У хросныя бацькі звычайна запрашалі людзей заможных, аўтарытэтных, запрашэнне ў хросныя лічылася вялікім гонарам, адмовіцца ад якога было нельга. У дзень прызначэння для хрэсьбін у доме бацькоў нованароджанага збіраліся госці. Хросная маці, увайшоўшы ў хату, выказвала добрыя пажаданні, клала на стол бохан хлеба і адорвала падарункам сваю куму, маці дзіцяці.

Хрысціць дзіця везлі ў другой палове дня, перад выхадам бласлаўляючы хлебам. Выносячы дзіця з, дому, кум станавіўся правай нагой на сякеру дзі грэбень. Хросным у дарозе забаранялася размаўляць, каб дзіця не было крыклівым. Калі праязджалі цераз мост, яны павінны былі злезці з калёсаў ці саней і прайсці па ім пешшу, трымаючы дзіця на руках. Потым, абвярнуўшыся, плюнуць на мост тры разы і кінуць на яго жменю сена. Пасля хрышчэння на дзіцяці апраналі кашульку ці кавалак палатна з дзіркай для галавы. Гэта служыла талісманам у далейшым, засцерагала ад падзення з дрэва. Спавівалі дзіця ў пялёнкі, якія дарыла яму хросная маці.

У доме бацькоў першай хросных з хрэснікам сустракала баба-павітуха, апранутая ў аўчынны кажух, вывернуты поўсцю наверх. Яна пыталася, якое імя атрымаў новонароджаны, адносіла дзіця да маці, а сама з гасцямі ішла ў лазню, дзе крапіла ўсіх вадой. Калі да гэтага ў сямейнай пары дзеці паміралі, хрэсніка падавалі праз акно.

Сталы для святочнага абеду ставіліся ў адну лінію, каб жыццё дзіцяці было доўгім і бязбедным. Гасцей рассаджваў гаспадар. Самымі ганаровымі лічыліся баба-павітуха, кум і кума. Іх садзілі ў кут. Колькасць страў была ўнушальнай, але рытуальнай лічылася каша. Яе варыла або баба-павітуха, або кум з кумою.

Кашу падавалі ў канцы абеду, у гліняным гаршку, накрытым талеркай. Талерку здымалі і ў яе клалі хто грошы, хто яйкі – выкуплялі кашу. Сабраны выкуп належаў бабцы-павітусе, але часта яна дзялілася ім з новонароджаным, давала «на мыла». Потым кум павінен быў адным ударам разбіць гаршчок аб стол, «каб шчаслівым рос новонароджаны» і з чарапка даць паспытаць усім кашы. Заканчвалася звычайна застолле тым, што гаспады- ня дарыла хросным пірагі, так звайыя «кумавікі», і ўсе разыходзіліся па дамах.

Збіраліся госці і на другі дзень. Выпівалі, закусвалі ў хаце новонароджанага. У канцы абеду бабку-павітуху закручвалі ў тканіну і спявалі абрада- выя песні:

Дзякуй таму кавалю, а што здзелаў
нам гульню.
Ён і ручачак ні хукаў, малаточкам ня
стукаў.
Бяз молату, бяз кувадла, паглядзі: дзіця
ладна.

***

А ў саду явар зілянюсенькі,
На куце кумок маладзюсінькі.
А ў саду вішня зілянюсінька
На куце кума маладзюсінька.
Над тарой верба сукуватая,
На куце бабка шой гарбатыя.
Йна й гарбатыя, йна й багатыя:
А ў бабы кабат – сто рублей аддат,
А ў кумы каралі – тысічу ўсталі,
А ў кума штаны – ім німа цаны,
Ай, ля варота, дый ўсёй золата.

***

А кум куме рад, павёў куму ў сад,
Пасадзіў куму ў садзе на цвяток:
– Еж, кумка, ягодкі, каторыі салодкі,
Каторы горкі – длі маёй жонкі.

І запрашайця, і запрагайця,
А дзвінаццаць сабак, а дзвінаццаць сабак,
А павязём, а павязём
Мы бабулю ў кабак, мы бабулю ў кабак.
Наша бабуля, наша бабуля
А паязды любя, а паязды любя.
А іна нам, а іна нам

Гарэлачкі купя, гарэлачкі купя.

Потым мужчыны праносілі барану, павернутую зубамі ўверх, садзілі на яе бабку-павітуху і на сабе цягнулі ў карчму. Там працягвалі весяліцца.

В.Ф.Куліненка.

Кірмашы

Кірмашы здаўна лічыліся своеасаблівымі святамі, іх адкрыцця з хвалюючай нецярплівасцю чакалі і дарослыя, і дзеці. Тут не толькі прадавалі і куплялі, а сустракаліся разлучаныя адлегласцю сябры і сяброўкі, заводзілі новыя знаёмствы як людзі пажылыя, так і маладыя. У апошніх тэта нярэдка заканчвалася вяселлем.

Вось як выглядаў у Крычаве кірмаш напярэдадні першай сусветнай вайны, паводле ўспамінаў старажылаў.

Цэлую ноч перад адкрыццём грукочуць на вуліцах цяжка гружаныя фурманкі, рыкаюць каровы, бляюць авечкі, падаюць спалоханы голас куры, парохкваюць у калёсах вепручкі. Едуць з усіх бакоў людзі, імкнуцца раней трапіць на кірмашовы пляц і заняць там зручнае месца.

Ажывае ў такія часіны Крычаў, скідае з сябе зацятую журбу і маўклівасць, прыкметна маладзее, весялее і святлёе ад святочных убораў прыехаўшых, іх гоману, песень, музыкі. Паветра робіцца духмяным ад разнастайных пахаў, спакусліва-смачным, аж хмяліць галаву.

І чаго толькі не папрывозілі людзі на продаж! На лавах ляжыць цыбуля, морква, часнок, буракі, у бочках водарна жаўцее квашаная капуста, абсыпаная калінавымі ягадамі, зелянеюць буйныя, таксама квашана-салёныя памідоры і агуркі, красуецца ганарыста рэпа, рэдзька і капуста ў качанах, тугіх і вялізных. Жаўцее гарох, сінее боб, бурштынава высвечвае пахучы мёд, кліча да сябе масла, свежае і жоўтае, тварог, смятана, курыныя, качыныя і гусіныя яйкі. Чакаюць пакупніка ўсялякіх памераў серабрыстыя шчукі, ляшчы, ментузы, акуні, стаіць у кадушках і рыба дамашняга пасолу, просіцца ў рукі вэнджаная.

Далей ідуць грыбы – марынаваныя, сушаныя. За імі крамяна ўзвышаюцца кавалкі сала, свежага мяса, каўбасы, падсохлыя і пахкія, вэнджаныя кумпякі. Мяса – свіное, качынае, курынае, гусінае, а таксама цяляціна і бараніна. Усяго ў дастатковай колькасці, можна выбіраць не баючыся, што цябе нехта апярэдзіць і перахопіць тавар.

Воддаль ад прадуктовых лавак прадаецца жыўнасць: каровы, коні, свінні, парасяты, авечкі, гусі, куры, качкі, цяляты. Збоку ад іх, на ўтульным грудку выставілі свае вырабы ганчароўскія майстры-саматужнікі. Тут місы розных памераў, гарлачы, гаршкі, збаны, лыжкі. Посуд адменны, аж звініць, калі да яго дакранешся, прадукцыя крычаўлян з Ганчароўкі карыстаецца попытам за межамі мястэчка.

Побач з ганчарных спраў майстрамі сяляне прапаноўваюць пшаніцу, ячмень, авес, жыта, каноплю, бульбу, ільнасемя, гарбузы. Далей гандлююць тканінамі яркіх афарбовак прамысловай вытворчасці і даматканым адбеленым палатном. Прадаюць і гатовыя вырабы: прыгожа вышытыя ручнікі, кашулі, фартухі, штаны, хусцінкі, кофты, пінжакі і абутак. Багата было на кірмашы тавараў гаспадарчага ўжытку. Зіхоткія ад сонечнага святла косы, сякеры, цвікі, сталярны інструмент, пілы, абцугі і г.д.

Наогул за час работы кірмашу, адведзеная пад яго плошча робіцца як бы маляўнічым паселішчам з вулачкамі і завулкамі. У ім нават падвыпіўшыя мужыкі-вяскоўцы блукалі, не ў стане адшукаць свайго воза і гаспадыню.

Няма сэнсу далей перлічваць тавары, што прапаноўваліся на кірмашы пакупнікам. Іх была процьма і ўсе неблагой якасці. Галоўнае, што тут гаспадарыла весялосць, гучалі жарты, песні, не змаўкала музыка. Чэргі назіраліся толькі за хлебным, сунічным, малінавым і бруснічным квасам, які так хораша бадзёрыў і асвяжаў засмяглае нутро, наталяў смагу і быў надзвычай смачным.

Людзі не толькі набывалі неабходныя сабе рэчы або гандлявалі рознымі таварамі, яны і адпачывалі ў гэтай вясёлай тлумнай мітусні, свяжэлі душой, забываючыся на нейкі час на жыццё- выя нягоды.

Тое, што на кірмашы было шмат усялякіх харчовых тавараў, зусім не сведчыць пра высокі ўзровень жыцця сялянства і рамеснікаў Крычаўшчыны. Для болынасці беднякоў не было штата шляху атрымаць нейкія грошы, так яму патрэбныя, як прадаць што-небудзь. Таму, часта застаючыся самі без запасаў, везлі на кірмаш выгадаванага парсюка, цяля, курэй або гусей, а выручаныя грошы пускалі на гаспадарчыя патрэбы. Іншага выйсця не было. Багацейшыя ж мелі з кірмашовага гандлю немалый прыбыткі і, вывучаючы попыт пакупнікоў, штогод імкнуліся гэтыя прыбыткі памножыць.

Кірмашовыя святы працягваліся некалькі дзён. Добра на іх было не толькі дарослым, але і дзецям. 1х там чакала шмат забаў і ласункаў: цукерачныя і пернікавыя мядзведзі, вавёркі, пеўнікі, прыгожыя цацкі, дудачкі, свісцёлкі і інш.

В.Ф. Куліненка.

Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці раёна

Народны самадзейны калектыў народнай песні і танца «Вітанне» пры раённым цэнтры культуры арганізаваны ў 1992 г. Званне народнага было прысвоена ў 1994 г. Мастацкі кіраўнік Я.С. Разікава. Выступленні самадзейных артыстаў слухалі і глядзелі жыхары гарадоў Смаленска, Валгаграда, Волжскага, Мінска, Рэспублікі Малдова. За час свайго існавання ўдзельнікі ансамбля далі болын за 100 канцэртаў. Усіх іх аб'ядноўвае гарачая любоў да песні, да самабытнага народнага танца. У рэпертуары ансамбля беларускія народныя песні, танцы, творы кампазітараў блізкага і далёкага замежжа. Салістамі ансамбля з'яўляюцца Аляксандр Карэцкі, Ала Вінаградава, Сяргей Карнееў, Тамара Дземчанка, Ганна Свадкоўская.

Узорны дзіцячы фальклорны калектыў «Вашчылкі» створаныў 1991 г. на базе першай музычнай школы. Звание народнага прысвоена ў 1992 г. Кіраўнік Г.Я. Бацвіннік. У рэпертуары беларускія народныя песні, іх апрацоўкі. Ансамбль прымаў удзел у другім Міжнародным фестывалі «Голас дзяцінства» ў 1992 г. у Мінску, у першым Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцячай творчасці «Музычная вясёлка» ў 2001 г. у Валгаградзе, дзе атрымаў дыплом першай ступені.

Народны аркестр духавых інструментаў пры Доме культуры «Цэментнік» свораны ў 1998 г., звание народнага прысвоена ў 2002 г. Кіраўнік А.М. Сурман. Удзельнікі калектыва – рабочыя прадпрыемства, студэнты навучальных устаноў, настаўнікі. У

Народны ансамбль песні і.танца «Вітанне».

Духавы аркестр г. Крычаў.

Хор ветэранаў вайны і працы г. Крычаў.

рэпертуар аркестра ўваходзяць творы розных жанраў: танцавальная музыка, а таксама творы замежных, рускіх і беларускіх аўтараў, уласныя інструментоўкі ўдзельнікаў аркестра. Адзін з асноўных напрамкаў творчасці калектыву – вакальнае выкананне ў суправаджэнні аркестра. Аркестр прымаў удзел у 2001 г. у абласным фестывалі «Па галоўнай вуліцы з аркестрам...», у рэгіянальным аглядзе мастацкай самадзейнасці, выступаў у многіх гарадах рэспублікі.

Хор ветэранаў. Сярод самадзейных мастацкіх калектываў раённага цэнтра культуры важнае месца займае хор ветэранаў. У ім удзельнічаюць каля 20 чалавек. Зараз у праграме хору болыл як 30 твораў: старадаўнія песні, беларускія, рускія, украінскія народныя песні, песні сучасных аўтараў.

Народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Крэчуты». Створаны

Народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Крэчуты».

«Кубанскія казакі» на мяжы з Расіяй.

ў 1998 г., звание народнага присвоена ў 2001 г. Кіраўнік В.В. Талтонава. У рэпертуар калектыва ўваходзяць беларускія народныя песні розных жанраў: жартоўныя, лірычныя, сямейна-бытавыя, каляндарна-абрадавыя. Творчая біяграфія калектыва батата на падзеі. Ансамбль быў удзельнікам фестывалю славянскай пісьменнасці ў 1999 г. ў Рослаўлі, у 2002 г. стаў лаўрэатам міжнароднага фестывалю «Порубежье», які праходзіў у г. Шумячы Смаленскай вобласці. Часта выступав з канцэртамі перад гараджанамі і вяскоўцамі Крычаўшчыны.

Народная студыя выяўленчага мастацтва пры раённым цэнтры культуры створана у 1974 г. А.Р. Герашчанкам. Звание народнай студыя атрымала ў 1998 г. Многія студыйцы сталі прафесійнымі мастакамі. Гэта Аляксандр Фралоў, Сяргей Давідовіч, Уладзіслаў Малахаў, Уладзімір Ерафееў.

У 1982 г. студыю ўзначаліў М.П. Гарбуноў. За час існавання многія ўдзельнікі студыі выяўленчага мастацтва адзначаліся дыпломамі, Ганаровымі граматамі на раённых, абласных і рэспубліканскіх выстаўках. Іх дасягненні адзначаны дыпломам ВДНГ СССР, двойчы дыпломам газеты «Красная звезда», дыпломам Міністэрства культуры СССР, ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры, ЦК прафсаюзаў работнікаў сельскай гаспадаркі і нарыхтовак.

Народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свістулька».

Створана пры раённым цэнтры культуры ў 1995 г. Асноўная ўвага ў яе рабоце ўдзяляецца кераміцы, выву-

чэнню традыцый народных промыслаў і рамёстваў, збору этнаграфічнага матэрыялу. І тэта не выпадкова. Крычаў – старажытны цэнтр ганчарства ў нашым краі. Вырабы нашых майстроў былі вядомыя далёка за межамі Беларусі яшчэ у XV–XVII ст. На жаль, старажытнае рамяство з цягам згасла. Студыя «Свістулька» займаецца яго адраджэннем. Тут вырабляюцца традыцыйная падняпроўская і крычаўская гліняныя цацкі. Гэта фігуркі людзей, звяроў, бразготкі, свістулькі. Яны захавалі свой даўні выгляд і форму – стылізаваныя фігуркі конікаў, вершнікаў, розных птушак, баранчыкаў, драконаў і іншае. Кіруе дзіцячай студыяй з дня яе стварэння Вячаслаў Якавенка. Зараз у калектыве займаецца 40 дзетак узростам ад 9 да 16 гадоў. Аднак у студыю з задавальненнем заглядваюць выпускнікі, бацькі дзяцей, дапамагаюць ім ляпіць ды і самі вучацца. У цяперашні час студыйцы вырабляюць не толькі цацкі, а і ўсялякія сувеніры: падстаўкі для алоўкаў, кнопачніцы, папяльніцы, падсвечнікі... А яшчэ яны адрадзілі традыцыйныя беларускія музычныя інструменты – дудачкі, акарыны, парняты (двайныя дудачкі), навучыліся таксама рабіць сірынгу, вадзяную свісцёлку «Салавейка» і шмат іншага. Напрыклад, адрадзілі такую цацку як «Сыч», або «Філін». Дунеш у яе і пачуеш сапраўднае філінавае «У-у-у-у». У рабоце студыйцы прымяняюць ангоб, паліву, гуаш, засвоілі тэхніку абварнай і задымленай керамікі.

Сустрэча артыстаў ансамбля.

Пачынаючы з 1996 г. калектыў «Свістулькі» бярэ ўдзел у розных раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах: фестывалі аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (в.Вяззе Асіповіцкага раёна), фестывалях «Вечназялёная дрэва рамёстваў» (Мінск) і «Беларусь – мая песня» (Магілёў), Міжнародным дзіцячым фестывалі «Залатая пчолка» (Клімавічы), фестывалі сямейнай творчасці «Сузор'е талентаў» (Глуск), свяце славянский пісменнасці (Рослаў), «Дажынках-2000» (Шклоў), «Славянскім базары» у Віцебскў, фестывалях, прысвечаных 55-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (Валгаград і Волжск). Вось далёка не ўвесь пералік творчага шляху дзіцячай студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якой у 1999 г. было прысвоена высокие званне народнай.

Работы студыйцаў па кераміцы

Дзіцячы народны калектыў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свістулька».

прымалі ўдзел у выставах у Расіі, Германіі, Нарвегіі, Галандыі, Бельгіі, Малдове, на Украіне.Народны калектыў мае шмат дыпломаў, ганаровых грамат, удзячных лістоў з розных краін свету, Болынасць выхаванцаў маюць таксамі асабістыя ўзнагароды, дыпломы, граматы. У прыватнасці, Кацярына Анішчанка адзначалася ў Беларусі, Расіі, Галандыі, Бельгіі, Чэхіі, Малдове. Пералічыць лепшых проста цяжка. Сярод іх Ірына Каладкова, Каця Гатоўчык, Юля Свецік, Юля Будагоўская, Каця Карнеева, Аня і Вольга Шаўцовы, Дар'я Сапранецкая, Аліна Купцова, Ганна і Алена Чарнавусавы, Андрэй Давыдзенка, Іван Зубко, Арцём Пастрэвіч, Віка і Аксана Быкавы і іншыя.

Кіраўнік студыі В.Якавенка распрацаваў некалькі фальклорна-этнаграфічных і тэатральных кампазіцый – «Крычаўскія ганчары», «Ганчарная майстэрня» і іншыя, сцэнарыі дзіцячых гульняў, напрыклад, «Адгадай цацку па гуку», «Гарлачыкі» і г .д. На 9-м абласным аглядзе-конкурсе прафесійнага майстэрства народных промыслаў і рамёстваў у 2001 г. яго аўтарская праграма заняла першае месца. У 2001 г. В.Якавенку запрашалі ў Каралеўства Нідэрланды. Там ён выступаў з дакладам, чытаў лекцыі, праводзіў гутаркі па культуры, мастацтву і экалогіі Беларусі, даваў урокў жывапісу, кампазіцыі і культуры, Арганізаваў 3 асабістыя і 7 дзіцячых выстаў керамікі і малюнкаў у сталіцы і іншых гарадах Каралеўства.

Народны калектыў «Свістулька» –

з'ява унікальная. Яго выхаванцы не толькі робяць цацкі і музычныя інструменты, але і самі граюць на іх. Яны адраджаюць фальклорную спадчыну нашай Крычаўшчыны.

С.Д. Дыннікаў.

Народны ансамбль «Народнай песні, музыкі і танца «Чабарок»

Створаны ў 1995 г. У аматарскім калектыве налічвалалася 14 чалавек. У верасні 2003 г. стаў народным. Першым мастацкім кіраўніком была Л.А. Мазалькова, харэографам – Т.М.Дубяга. Зараз у калектыве 18 чалавек. Ансамбль выконвае беларускія, рускія і украінскія песні. З 1998 г. ансамблем кіруе Т.В.Баранава, харэограф І.М. Вярэніч. Самадзейныя артысты выступалі з канцэртамі ў гарадах Беларусі і Расіі. Удзельнічалі ў конкурсах і фестывалях: «Беларусь – мая песня» (г.Касцюковічы), «Дружба – без мяжы» (Расія), на свяце славянскай пісьменнасці (Расія).

Г. А. Кірпічова.

Чароўныя гукі музыкі

У Крычаве працуюць дзве музычныя школы. Кожная з іх мае па тры філіялы ў буйных вёсках раёна. У 1999 г. у абедзвюх школах навучаліся 544 хлопчыкі і дзяўчынкі. Тут можна пачуць меладычныя галасы скрыпкі, баяна, віяланчэлі, домры, цымбал, балалайку кларнета, трубы, гармоніка,

На занятках у музычнай школе.

флейты і іншых музычных інструментаў. Дзеці не толькі спасцігаюць сакрэты музычнай культуры, але і набытыя ў школе веды дэманструюць Дарослым, выступаючы перад імі з канцэртамі. Удзельнічаюць вучні школ і ў рэспубліканскіх і абласных конкурсах, нярэдка прывозяць адтуль дыпломы за добрае выкананне музычных твораў. Далёка за межамі раёна ведалі ансамбль «Вашчылкі» першай дзіцячай музычнай школы (кіраўнік Г.Я. Бацвіннік). Яго выступленні пакарылі італьянцаў.

Многія выпускнікі школ сталі прафесіянальнымі музыкантамі. А тыя, хто такімі не сталі, захавалі ў душы пяшчотную павагу да музычнай культуры, праніклiся гарачай любоўю да чароўных гукаў, якія цудадзейна ўплываюць на чалавека, лечаць яго ад самоты, уціхамірваюць гнеў, робяць чалавека лепшым.

Вучні абедзвюх музычных школ з удзячнасцю гавораць пра педагогаў Н.Г. Федасенку, С.І. Багданаву, І.А. Трацэўскую, А.Н. Уласаву, С.А. Рыбчынскага і іншых. Педагогі шчодра аддаюць свае веды дзецям, робяць усё неабходнае для таго, каб яны не засталі- ся абыякавымі і чужымі ў свеце чароў- ных гукаў. Многія з іх, а таксама з былых выпускнікоў школы, памятаюць і былога дырэктара школы, Валянціну Артураўну Шуганаву, якая аддала шмат сіл, намаганняў і любві школе, яе педагогам і навучэнцам.

Далучэнне да прыгожага

Дзіцячая мастацкая школа пачала працаваць з 1 кастрычніка 1977 года. Першым дырэктарам яе быў Анатоль Рыгоравіч Герашчанка, чалавек, да самазабыцця ўлюбёны ў мастацтва.

Сюды ахвотна прыходзяць дзеці на заняткі. З удумлівымі і засяроджанымі тварамі прагна ловяць яны кожнае слова педагогаў, і ў такія часіны чуйная цішыня пануе ў класах. Вучняў школы можна часта ўбачыць на ціхіх, атуленых зелянінай ліп, вішань, сліў вулачках Крычава, або ў іншых маляўнічых мясцінах Прысожжа, дзе яны рупна імкнуцца адлюстраваць на ватманаўскіх лістах навакольную прыгажосць.

Педагагічны калектыў зараз узначальвае Міхаіл Пракопавіч Гарбуноў. Міхаіл Пракопавіч піша карціны, якія вядомы не толькі крычаўлянам, але і жыхарам Магілёва і іншых рэгіёнаў рэспублікі. Плённа аддаюць навучэнцам свае веды М.М. Шарыхіна, В.М. Гарбуноў, Г.В. Саковіч, А.М. Марозава, Т.А. Салаўёва.

Вучні школы пастаянна бяруць удзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. 8 карцін вучняў школы экспануюцца ў міжнародным дзіцячым музеі ў гарадах Осла, Нью-Йорк.

Дзіцячая мастацкая школа ў Крычаве мае 7 сваіх філіялаў на вёсцы. Няхай не ўсе навучэнцы стануць славутымі мастакамі, але ў душы кожнага з іх застанецца след ад далучэння да чароўнага свету мастацтва, яго таямніц. І тэты след будзе дапамагаць заўважаць і цаніць усё прыгожае ў жыцці.

Музеі раёна

Крычаўскі краязнаўчы музей. Заснаваны і адкрыты ў 1961 г. у г.Крычаў на базе экспанатаў, сабраных М.Ф. Мельнікавым. Пл.экспазіцыі 318 м^2, болын за 15,4 тыс. экспанатаў асноўнага фонду (1997). Сярод экспанатаў матэрыялы археалагічных раскопак Крычаўскага замка, калекцыі манет часоў ВКЛ, Рэчы Паспалтіай, Расіі, зброі XIV ст., матэрыялы пра Грунвальдскую бітву 1410 г., Паўночную вайну 1700-21 гг., пра Крычаўскае паўстанне 1743 – 44 гг., Крычаўскую суднаверф, пра дзейнасць народнікаў Р.П. Ісаева, С.П. Каваліка, М.К. Судзілоўскага, рэвалюцыянераў У.Дз. Бонч-Бруевіча, П.М. Лепяшынскага, В.А. Радус-Зяньковіча, падзеі рэвалюцыі 1905-1907 гг. Экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, размешчана на пл. 50 м^2. Экспануюцца матэрыялы аб пачатковым перыядзе вайны: карта-схема лініі фронту ў раёне Крычава ў ліпені – жніўні 1941г., рэшткі самалёта лётчыка А.В.Гуменнікава, на якім ён здзейсніў паветраны таран над роднай вёскай Бель, схема бою каля в.Сакольнічы, фатаграфіі, дакументы, асабістыя рэчы, зброя ўдзельнікаў баёў на Крычаўшчыне, у т.л. генерал-маёра П.П. Корзуна, камандзіра 20-га стралковага корпуса С.І. Яроміна, артылерыста М.У.Сірацініна і інш.; аб узнікненні і разгортванні

У Крычаўскім краязнаўчым музеі.

Удзельнікі ўсесаюзнага злёту «Арляня» у Крычаўскім краязнаўчым музеі.

падполля і партызанскім руху ў раёне – матэрыялы пра Крычаўскае партыйна-камсамольскае падполле, у т.л. пра ўдзельнікаў гэтага падполля артыстаў А.І. Акаёмава і Г.П. Лузеніна, журналіста А. А. Гардзіевіча, фатаграфія членаў Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б, друкарскі станок, лістоўкі, якія выпускаліся ў 48-м асобным партызанскім атрадзе, выданне «Раздавім фашысцкую гадзіну» за 1942- 43гг., фатаграфіі і дакументы партызан атрада «Анатоля», «Алеся», 3-га, 48-га і інш. Расказваецца аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне. Матэрыялы аб вызваленні горада і раёна, аб 212-й і 385-й стралковых дывізіях і 572-м пушачна-артылерыйскім палку, якія атрымалі ганаровыя найменні «Крычаўскіх», фатаграфіі і асабістыя рэчы воінаў-вызваліцеляў; аб земляках – удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Фатаграфіі, асабістыя рэчы двойчы Героя Савецкага Саюза І.І. Гусакоўскага, Герояў Савецкага Саюза А.Я. Смалякова і М.І. Сталярова, поўнага кавалера ордэна Славы У.Я. Карнеенкі і інш. Экспануюцца карціна «Там, за Сожам Беларусь» (маст. В.Бялоў), бюсты лётчыка А. Гуменнікава (скульпт. С.Адашкевіч) і рэдактара падпольнай газеты «Звязда» і «Чырвоная змена» М.П. Барашкава.

Н.М. Марозава.

Краязнаўчы музей Сакольніцкай сярэдняй школы. Створаны ў 1991 г. па ініцыятыве піянерважатай К.М. Пузырэўскай і выкладчыцы гісторыі Т.М. Жывіцкай. Разам з вучнямі яны збіралі дадзеныя пра гісторыю сваёй вёскі, славутых землякоў, пра барацьбу крычаўлян з фашысцкімі захопнікамі. Цікавыя экспанаты пра жывёльны і раслінны свет рэгіёна размешчаны ў двух пакоях. Музей наведваюць не толькі школьнікі. Тут часта бываюць

У музеі Сакольнідкай сярэдняй школы.

і дарослыя. Адшукваюцца новыя экспанаты, расшыраецца экспазіцыя. Плённа вядуць у гэтым напрамку работу выкладчыкі гісторыі У.Я. Янкоўскі, С.С. Белавусава.

Пакоі і куткі баявой і працоўнай славы дзейнічаюць у Бацьвінаўскай, Дзягавіцкай, Маляціцкай і іншых школах раёна.

Хто пабудаваў палац у Маляцічах?

Неяк у адным з старажытных выданняў па гісторыі Магілёўшчыны давялося прачытаць паведамленне аб тым, што ў Маляцічах у канцы XVIII ст. быў пабудаваны палац – у 32 разы паменшаная копія вядомага сабора св. Пятра ў Рыме. Паўтарэнне цуда італьянскай архітэктуры ў беларускай вёсцы! Гэтаму было цяжка паверыць.

І вось у 1959 г. ў Крычаў прыйшло пісьмо з Вільнюса. Яго аўтар, адзін з вядомых літоўскіх архітэктараў і знаўца гісторыі архітэктуры Літвы і Беларусі Э.С. Барэйка прасіў даведацца ў старажылаў Маляцічаў аб копіі сабора св.Пятра.

Потым у Крычаў прыехаў сам Эдуард Сцяпанавіч Барэйка. Ён паказаў нам нумар літоўскага навуковага часопіса з ілюстрацыяй палаца ў Маляцічах. Глядзіш на копію і думаеш: няўжо ў вёсачцы на Крычаўшчыне быў створаны такі цуд? Пад карцінай надпіс на лацінскай мове: Касцёл Станіслава ў Маляцічах, пабудаваны Станіславам Сестранцэвічам-Богушам. У

левым кутку чытаем: «Напісаў Лаўрэнці Гуцявічус».

Нам і раней было вядома імя Богуша-Сестранцэвіча, кіраўніка каталіцкай царквы ў Расіі пры Кацярыне II. Мы ўжо былі знаёмы з дзённікамі гэтага буйнога феадала. Тэта на суконнай фабрыцы ў Буйнічах, у Магілёўскай друкарні, у вёсках Маляцічы, Баеўка, Добрае, Сарочын, Мышкавічы тысячы беларусаў гнулі спіны на Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. У сваіх дзённіках ён піша толькі аб колькасці сукна, аб купленых вінах, аб пакаранні сялян, аб гандлёвых справах сваіх вотчын. Сасланы імператрыцай Кацярынай II на Магілёўшчыну, ён жыў у Буйнічах і Маляцічах. У Маляцічах у яго быў палац і касцёл Св. Станіслава, сажалкі, поўныя рыбы, засекі хлеба, бочкі мёду.

Імя Сестранцэвіча знаёма. А вось імя архітэктара Лаўрэнція Гуцявічуса толькі ўпамінаецца ў Вялікай Савецкай энцыклапедыі. Эдуард Сцяпанавіч Барэйка, вялікі знаўца творчасці Гуцявічуса, расказваў многа цікавага.

У 1753 г. ў сям'і прыгоннага селяніна Сіманаса Стуока нарадзіўся сын. Ён рана праявіў вялікія здольнасці да малявання. Хлопчыка ўдалося ўладкаваць у школу ў горадзе Палявене, потым у Панявежыс. У 1773 г. Лаўрэнцій ужо ў Вільні. Ён вучыўся ў манастырскай школе, потым у Віленскім універсітэце.

Вядома, Лаўрэнцій не быў нашчадкам нейкага Гуцявічуса. Проста яго сябры склалі такую біяграфію дзеля таго, каб выключна таленавіты юнак дабіўся ажыццяўлення запаветнай мары і стаў дойлідам. Поспехі юнака здзівілі прафесара, і сын прыгоннага ў 1777 г. атрымаў права на творчую паездку ў Парыж і Рым. Там ён пазнаёміўся з творчасцю вялікіх архітэктараў Еўропы.

Вярнуўшыся ў Літву, малады архітэктар стварыў шэраг цудоўных бу~дынкаў: Віленская ратуша, Вяркайскі палац і іншыя.

Сын прыгоннага літоўскага селяніна, горадабудаўнік Літвы і Беларусі, Лаўрэнцій Стуока-Гуцявічус бываў у нашых краях, дзе таленавітыя майстры-будаўнікі пад кіраўніцтвам архітэктара стварылі здзіўляючы па прыгажосці будынак. Касцёл быў пабудаваны ў 1974 г.

М. Ф. Мельнікаў.

Свята вуліц

Традыцыя ў Крычаве – праводзіць свята вуліц. Карысць ад такога мерапрыемства відавочная. Бо вуліца, рыхтуючыся да ўрачыстасці, непазнавальна мяняе свой выгляд. На ёй не ўбачыш ні смецця, ні дзядоўніку і іншага пустазелля.

Так, напярэдадні 200-годдзя з дня нараджэння рускага паэта А.С.Пушкіна было праведзена свята Пушкінскай вуліцы і завулка імя Пушкіна. Ветэранам вайны і працы, якія пражываюць на гэтых вуліцы і завулку, былі ўручаны сувеніры і грашовыя ўзнагароды, для кожнага з іх самадзейныя спевакі выконвалі песні. Адзнакі павагі былі выказаны М.П.Кавалёву, М.Ф. Чубараву, Е.С. Бугаёвай, У.П. Турчыну, Т.П. Кавалёвай за іх ваенны і працоўны гераізм.

Таццяна Паўлаўна Кавалёва, хата якой першай з'явілася на Пушкінскай вуліцы ў 1946 годзе, расказала аб цяжкасцях пасляваеннага жыцця і гісторыі ўзнікнення завулка і вуліцы. Яе ўспаміны прысутныя з цікавасцю пас-



М.Ц. Ганчурына з калгаса «Запаветы Ільіча».

К.А. Леўдзікава з в. Зарубец, 100 год.

лухалі. Прысутнічалі на святе і самыя старэйшыя жыхары гэтых мясцін. Гэта Алена Мікалаеўна Гарбатоўская, якой споўнілася 100 гадоў, і трохі маладзейшыя за яе Настасся Маркаўна Клімянкова і Вольга Васілеўна Зімкова. Ім былі ўручаны сувеніры.

Адзначаны на святе былі і сямейныя пары, якія ў згоде пражылі 50 і болын гадоў, падарункамі і сувенірамі. Іх атрымалі сем'і Чубаравых і Сіраковых. Самай шматдзетнай на вуліцы і завулку аказалася сям'я Краўцовых. Яны гадуюць 5 сыноў і дачок. Ім таксама ўручаны памятныя падарункі.

Людміла і Міхаіл Сырнікавы ў свой адрас выслухалі словы пахвалы. Дом іх быў прызнаны самым акуратным і рупна дагледжаным. Дбайныя гаспадары атрымалі ўзнагароду за чысціню і ўзорны парадак.

Займальна і весела прайшло свята. Цікавасць выклікала імправізаваная выстава вырабаў з саломкі, гліны, нітак, самаробныя дываны і ручнікі з адмысловай вышыўкай і іншыя ўзоры народнай творчасці. Іх дэманстравалі таленавітыя умельцы, што жывуць на Пушкінскай вуліцы і завулку Пушкіна.

Не сумавалі на ўрачыстасці дзеці. Для іх правялі конкурс на лепшы малюнак на асфальце. Тэмамі малюнкаў сталі героі неўміручых казак А.С. Пушкіна. Ахвотнікаў паказаць сваё майстэрства аказалася шмат, бо пераможцаў чакалі салодкія пачастункі.

Святы вуліц праходзяць у шматлікіх вёсках. Як правіла, запрашаюць на іх паважаных старажылаў, знакамітых людзей.

Помнікі гісторыі і архітэктуры Крычаўскага раёна

Г.КРЫЧАЎ

Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных. Вул. Камуністычная, у скверы, каля будынка клуба цэментна-шыфернага камбіната. Пахаваны ваеннапалонныя, загубленыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941–1943 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптурныя выявы воіна і партызанкі.

Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных. Вул. Працоўная. Пахаваны вязні Крычаўскага лагера ваеннапалонных, закатаваныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941 –1943 гг. Колькасць пахаваных не ўстаноўлена. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік - скульптура жанчыны ў жалобе.

Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных. Вул. Ціміразева. Пахавана болын за 30 вязняў Крычаўскага лагера ваеннапалонных, якіх у 1941–1943 гг. загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура жанчыны са сцягам.

Брацкія магілы савецкіх воінаў. Вул. Набярэжная, на Забялышынскіх могілках. У 2 магілах пахаваны воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. і ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – воіны 4-га паветрана-дэсантнага корпуса. У 1947 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Вул. Сірацініна, каля будынка райваенкамата. Пахаваны 40 воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ў 1944 г. ад ран. Сярод пахаваных – М.У. Сірацінін. У 1951 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і ахвяр фашызму. Каля чыгуначнай станцыі Крычаў. Пахаваны воіны і мірныя грамадзяне, якія загінулі 5.07.1944 г. ў час налёту фашысцкай авіяцыі на чыгуначную станцыю. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і ваеннапалонных. Вул. Фрунзе. Пахаваны ваеннапалонныя (колькасць не ўстаноўлена), якія загінулі ў лагеры, створаным у 1941 г. гітлераўцамі на тэрыторыі былога цэментнага завода, а таксама 15 воінаў што загінулі ў час вызвалення Крычава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у канцы верасня 1943 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стала і скульптура воіна.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, падполынчыкаў, ваеннапалонных і ахвяр фашызму. У скверы «60 гадоў Кастрычніка». Пахавана болын за 50 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў а таксама падполынчыкаў, ваеннапалонных і мірных жыхароў, загубленых гітлераўцамі ў час акупацыі горада.

Курган Славы. У мікрараёне Сож, каля будынка хлебазавода. Насыпаны у 1968 г., з нагоды 50-годдзя БССР і на ўшанаванне памяці больш як 2 тыс. землякоў што загінулі ў барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады, а таксама ў грамадзянскую і Вялікую Айчынную войнах. На вяршыні Кургана ўстаноўлены абеліск. У яго падножжы замураваны спісы загінуўшых і пісьмо нашчадкам.

Магілы савецкіх ваеннапалонных. Вул. Заводская, каля адміністрацыйнага будынка цэментна-шыфернага камбіната. У 3 магілах пахаваны вязні (колькасць не ўстаноўлена) Крычаўскага лагера ваеннапалонных, закатаваныяу 1941–1943 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1967 г. на магілах пастаўлены абеліскі.

Мемарыяльная дошка савецкім воінам-вызваліцелям. Вул. Ленінская, 25, на будынку кінатэатра «Радзіма». Устаноўлена ў 1960 г.

У ходзе летне-асенніх аперацый 1943 г. войскі 10-й і 50-й армій выйшлі ў канцы верасня 1943 г. на рубеж р.Сож каля Крычава. У ноч з 29 на 30 верасня 1943 г. вайсковыя падраздзяленні 369-й Карачаўскай стралковай дывізіі фарсіравалі Сож паблізу вёсак Прудок і Каменка. Амаль адначасова воіны 212-й і 385-й стралковых дывізій пры падтрымцы 572-га артылерыйскага палка фарсіравалі Сож на поўнач ад Крычава, авалодалі чыгуначнай станцыяй і з боку в.Варанёва атакавалі горад. 30.09.1943 г. Крычаў быў поўнасцю вызвалены ад нямец-

ка-фашысцкіх захопнікаў. У баях за вызваленне горада ўдзельнічалі партызаны 13-й Касцюковіцкай брыгады (камандзір С.А. Мазур, камісар Дз.Я. Савельеў).

Мемарыяльная дошка Талкачовай Марыі Сяргееўне. Вул. Талкачовай, 22. Устаноўлена у 1973 г. на доме, дзе падпольнічыца жыла ў Вялікую Айчынную вайну.

Мемарыяльная дошка ў гонар 50-годдзя заснавання цэментна-шыфернага камбіната. Вул. Зялёная, на адміністрацыйным будынку камбіната. Устаноўлена ў 1980 г. у памяць аб закладцы 1.5.1930 г. першага каменя на будаўніцтве цэментнага завода (з 1957 г. цэментна-шыферны камбінат). Першую прадукцыю даў 10.11.1933 г.

Мемарыяльная дошка ў гонар вызвалення горада. Вул. Ленінская, на будынку дзіцячага сада №1. Устаноўлена ў 1980 г. 30.9.1943 г. часці 10-й арміі Заходняга і 50-й арміі Бранскага франтоў вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіхзахопнікаў. Баец 369-й стралковай дывізіі А. Бязроднаў узняў над будынкам сучаснага дзіцячага сада чырвоны сцяг.

Месца антыфеадальнага паўстання XVIII ст. У Крычаўскім старостве ў 1743–1744 гг. адбылося буйнейшае на Беларусі антыфеадальнае ўзброенае выступленне сялян.

Свята-Мікалаеўская царква. Вул. Сожавая, 45, на высокім левым беразе р. Сож. Пабудавана ў канцы XIX – пачатку XX ст. з дрэва. Кампазіцыя трохзрубная. Выцягнуты прамавугольны ў плане асноўны зруб накрыты двухсхільным дахам з залобкамі на тарцах. Над вільчаком узвышаецца двух'ярусная вежачка з галоўкай. Да асноўнага зруба прылягаюць роўны з ім па вышыні невялікі прамавугольны бабінец і больш нізкая пяцігранная алтарная апсіда. З паўднёвага боку прыбудавана рызніца, з паўночнага – тамбур дадатковага ўваходу. У дэкоры фасадаў выкарыстаныя ліштвы, гарызантальная шалёўка з вылучэннем цокальнай часткі і фрыза. Інтэр'ер зальны, столь плоская, падшыўная.

Царква – помнік драўлянага дойлідства.

Палац. Вул.Ленінская, 59. Пабудаваны у 1778–1787 гг. з цэглы для князя Р.А. Пацёмкіна. У сярэдзіне XIX ст. рэканструяваны.

Палац – двухпавярховы п-падобны ў плане будынак з цэнтральным рызалітам на галоўным фасадзе. У цэнтры абодвух паверхаў вялікія круглыя залы. З-за асноўнага аб'ёму будынка ў бок двара выступае паўкруглы эркер. Галоўны фасад фланкіраваны гранёнымі пілонамі, якія завершаны зубцамі. Вокны цэнтральнага рызаліту стральчатыя, бакавых фасадаў – з стральчатымі сандрыкамі. Планіроўка анфіладная (зменена у 1950-я гады). На 1-м паверсе па цэнтральнай восі знаходзілася парадная трупа памяшканняў: вестыбюль з лесвіцай і авальная зала. Памяшканні мелі багаты ляпны дэкор, кафляныя печы.

Каля палаца пейзажны парк (зберагліся асобныя дрэвы). За палацам размешчаны п-падобны ў плане будынак стайні, фасады якой апрацаваны аркатурай, і пладовы сад з фрагментамі пасадак ліп.

Палац – помнік архітэктуры класіцызму з пазнейшымі напластаваннямі элементаў псеўдагатычнага стылю.

Паштовая станцыя. Вул. Ленінская, 76. Пабудавана ў сярэдзіне XIX ст. Абслугоўвала паштовую дарогу Масква – Брэст – Варшава. Цяпер тут база дарожна-эксплуатацыйнай службы.

Станцыя – комплекс будынкаў, размешчаных вакол прамавугольнага плане двара. Галоўны будынак мураваны, прамавугольны ў плане, аднапавярховы, з дваровай і пазнейшай тарцовай прыбудовамі. Павернуты галоўным фасадам да дарогі, яго цэнтральная частка і вуглы вылучаны пілястрамі з гатыганымі арачнымі нішамі. Прамавугольныя вокны ў ліштвах з прафіляванымі сандрыкамі ў выглядзе стральчатых арак. Планіроўка будынка сіметрычная. Сцены памяшканняў аперазаны прафіляванымі карнізамі.

Паштовая станцыя – помнік неагатычнай архітэктуры.

Помнік падпольшчыкам. Вул. Зялёная. Побач з адміністрацыйным будынкам цэментна-шыфернага камбіната.

У Вялікую Айчынную вайну ў акупаваным нямецка-фашысцкімі захопнікамі пасёлку былога цэментнага завода дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў даваенны сакратар камітэта камсамола завода А.Л. Гаўрыленка.

У 1980 г. у памяць аб дзейнасці падпольнай трупы ўстаноўлена стала.

Помнік савецкім ваеннапалонным. На вул. Фрунзе, у пасёлку цэментна-шыфернага камбіната.

У 1941 г. на тэрыторыі цэментнага завода нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі лагер для ваеннапалонных. Тэрыторыя лагера была абнесена калючым дротам у 3 рады, узмоцнена ахоўвалася. Вязні размяшчаліся ў драўляных бараках без даху, на цэментнай падлозе. Ад голаду і хвароб тут штосуткі паміралa 60 –70 чалавек. Фашысты катавалі, расстрэльвалі палонных. Да верасня 1943 г. у лагеры загінула больш за 18 тыс. чалавек.

У 1981 г. наўшанаванне памяці ваеннапалонных пастаўлены помнік – мемарыяльная сцяна, да якой прымацаваны 2 дошкі з надпісамі-прысвячэннямі. Побач, на пастаменце, валун з рэльефнай выявай рукі вязня лагера, што разрывае калючы дрот.

Помнік у гонар абаронцаў горада. За 1,5 км на ўсход ад горада, каля аўтамабільнай дарогі Крычаў – Рослаў. У 1960 г. ўстаноўлена стала.

Радзіма Кісялёва Мацвея Сямёнавіча, героя грамадзянскай вайны.

Радзіма Мазалькова Яўгена Сямёнавіча, перакладчыка, крытыка і літаратуразнаўца.

Радзіма Смалякова Абрама Яўхімавіча, Героя Савецкага Саюза.

БАЦЬВІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСАВЕЦ

Помнік землякам. У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Перамога». На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура жанчыны і параненага воіна.

ВЁСКА БАЦЬВІНАЎКА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Каля клуба. Пахаваны 11 воінаў якія загінулі ў верасні – кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі, што размяшчаўся ў пачатку 1944 г. у вёсды. Сярод пахаваных – воіны 385-й стралковай дывізіі. У 1968 г. намагіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

ВЁСКА ГУБЕНШЧЫНА

Помнік землякам. На могілках. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1978 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА КАНЦЫ

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 11 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ці памерлі ад ран у шпіталі. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА СЫЧЫК

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 112 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна.

КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОЛЧАС

Помнік землякам. У парку. На ўшанаванне памяці 115 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1980 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з дзіцем.

ВЁСКА КАМАРОЎКА

Помнік землякам. Наўшанаванне памяці 146 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1984 г. пастаўлены помнік – скульптурный выявы 2 жанчын у жалобе.

ВЁСКА КАСЦЮШКАВІЧЫ

Помнік землякам. У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Памяць Леніна». На ўшанаванне памяці 165 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна.

Помнік першым калгаснікам-трактарыстам. Каля будынка праўлення калгаса «Памяць Леніна». У 1981 г. у сувязі з 50-годдзем гаспадаркі і ў гонар першых трактарыстаў калгаса ўстаноўлены трактар «Універсал» на пастаменце.

ВЁСКА САКОЛЬНІЧЫ.

Помнік савецкаму воіну Сірацініну Мікалаю Уладзіміравічу. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля дарогі Чэрыкаў–Крычаў.

Помнік савецкай разведчыцы Гіндзінай Таццяне Міхайлаўне і землякам. Каля будынка праўлення калгаса «Запаветы Ільіча».

Савецкая разведчыца Т.М. Гіндзіна нарадзілася ў 1916 г. у в. Барысавічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1937 г. У 1935 г. скончыла курсы трактарыстаў. Першая жанчына-трактарыст у раёне, брыгадзір трактарнай брыгады Крычаўскай МТС, з 1938 г. старшыня Сакольніцкага сельсавета, з 1939 г. інструктар Крычаўскага раённага выканкома па калгасным будаўніцтве. У Вялікую Айчынную вайну дооораахвотна пайшлаў Чырвоную армію. Скончыла спецшколу. Восенню 1942 г. накіравана ў тыл ворага, намеснік камандзіра разведвальна-дыверсійнай трупы. У лістападзе 1942 г. трупа была выяўлена ворагамі. Т.М. Гіндзіна прыкрывала адыход разведчыкаў была цяжка паранена і захоплена ў палон. 19.11.1942 г. расстраляна фашыстамі ў г. Чэрыкаў. Яе імем названа вуліца ў Крычаве.

У 1976 г. на ўшанаванне памяці Т.М. Гіндзінай устаноўлены бюст, побач – стэла з імёнамі 135 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА СВАДКАВІЧЫ

Радзіма Каваліка Сяргея Піліпавіча, аднаго з кіраўнікоў народніцкага руху 1870-х гадоў.

ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЁСКАБЕЛЬ

Помнік на магіле Гуменнікава Аляксандра Васілевіча. Савецкі лётчык малодшы лейтэнант А.В. Гуменнікаў (1916 года нараджэння) загінуў 13.07.1941 г. у паветраным баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў над роднай вёскай. Яго імем названа вуліца ў Крычаве.

ВЁСКА ІВАНАЎКА

Помнік землякам. Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 131 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1984 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з вінтоўкай, абапал – дошкі з імёнамі загінуўшых. Запалены Вечны агонь.

ВЁСКА ЛАБКОВІЧЫ

Помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса імя Карла Маркса. На ўшанаванне памяці 384 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1982 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна, абапал яе дошкі з імёнамі загінуўшых.

Радзіма дзяржаўнага дзеяча БССР Кісялёва Кузьмы Венядзіктавіча.

ВЁСКА ПАЛАНІЦА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 93 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Лабковіцкага сельсавета ў 1941 і 1943 гг. ці памерлі ад ран у шпіталі. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

МАЛЯЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛУТЫ

Помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса. На ўшанаванне памяці 155 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптурная кампазіцыя: жанчына з хлопчыкам.

ВЁСКА МАЛЯЦІЧЫ

Помнік землякам. У скверы. Наўшанаванне памяці 330 землякоў з вёсак Маляціцкага сельсавета, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з дзідем. Побач дошка з імёнамі загінуўшых.

ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАРУБЕЦ

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На мотілках. Пахаваны воіны Ленінградскага ка-

муністычнага батальёна і Тамбоўскіх камуністычных рот, якія загінулі ў абарончых баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1941 г. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ДЗЯГАВІЧЫ

Помнік землякам. Каля будынка канторы саўгаса «Дзягавічы». Наўшанаванне памяці 220 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1982 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ПРУДОК

Помнік на месцы загубы савецкіх ваеннапалонных, падпольшчыкаў, мірных жыхароў.

За 0,3 км на паўночны захад ад вёскі. Тут у гады акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі праводзілі масавыя расстрэлы савецкіх грамадзян. 15.02.1943 г. яны расстралялі 280 ваеннапалонных з Крычаўскага лагера, 21.02.1943 г. – удзельнікаў Крычаўскага падполля спевака А.І. Акаёмава і галоўнага дырыжора Маскоўскай абласной філармоніі Г.Н.Лузеніна. За час акупацыі гітлераўцы загубілі тут больш за 1200 чалавек - жанчын, старых, дзяцей.

У 1982 г. на месцы загубы пастаўлены помнік – двухфігурная скульптурная кампазіцыя (скульпт. Э.Астаф'еў, арх. Ю.Казакоў) і мемарыяльны знак. Запалены Вечны агонь.

ПАСЁЛАК ЧЫРВОНЫ БОР

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. У цэнтры пасёлка. Пахаваны 15 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–1943 гг. Сярод пахаваных – воіны 1270-га стралковага палка 385-й стралковай дывізіі. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ БУДА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля будынка канторы саўгаса «Крычаўскі». На ўшанаванне памяці 396 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

Помнік падпольшчыкам. У цэнтры вёскі, злева ад шашы Крычаў–Рослаў. У студзені 1942 г. у в. Міхеевічы Чырванабудскага сельсавета была створана падпольная група, якую ўзначаліў камсамолец А.М. Крупадзёраў. У групу ўваходзілі камуніст А.М. Штолік, камсамольцы У.І. Абабкін, В.С. Берахаў І.П. Брыкаў, А.С. Віцюгоў, Р.Л. Нікалайчанка (Нікалайкаў). Падпольшчыкі збіралі зброю і перапраўлялі яе на месца базіравання 48-га асобнага партызанскага атрада, распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі. Патрыёты падарвалі варожы поезд з 2 платформамі, вывелі са строю поезд з майстэрнямі па рамонту пуцей, чыгуначнае палатно на лініі Крычаў – Клімавічы, пашкодзілі мост Маскоўскай шашы. 29 – 30.07.1943 г. падпольнчыкі былі арыштаваны (пазбег арышту толькі А.М. Штолік) і загінулі ў фашысцкіх засценках.

У 1979 г. у памяць аб дзейнасці падпольнай групы пастаўлена стэла з выявамі полымя і мяча, на дошцы – надпіс-прысвячэнне.

Паводле кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., С. 272—283. Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга. Мн., С. 452-454.

Падрыхтавала да друку
З.Г. Дзямешка.

З гісторыі населеных пунктаў

Г. КРЫЧАЎ

Крычаў, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл., нар.Сож. За 104 км ад Магілёва. Вузел чыгунак на Оршу, Магілёў, Унечу і Рослаў, на аўтадарозе Бабруйск – Масква. 31,1 тыс. ж. (2004).

Упершыню згадваецца ў 1136 г. ва Устаўнай грамаце смаленскага князя Расціслава Мсціславіча пад назвай Крэчут. Старажытным цэнтрам Крычава быў Крычаўскі замак. У XIV–XVIII ст. існавалі Крычаўскія ўмацаванні. У XII – XIII ст. у Смаленскім, з 1-й паловы XIV ст. ў Мсціслаўскім княствах, з 2-й паловы XIV ст. ў ВКЛ. З канца XV ст. цэнтр Крычаўскай воласці, уладанне вялікага князя ВКЛ, кіраваўся яго намеснікамі. З сярэдзіны XVI ст. ў Мсціслаўскім ваяводстве. Пад 1592 г. упамінаецца ў Баркулабаўскім летапісе. 23.8.1653 г. атрымаў магдэбургскае права і герб (у чырвоным полі выява залатога крыжа і сярэбранага мяча). З XVII ст. Крычаў – цэнтр Крычаўскага староства, уладанне Радзівілаў. У Паўночную вайну 1700–1721 гг. летам 1708 г. пад Крычавам быў лагер расійскіх войск на чале з Пятром I. У час Крычаўскага паўстан- ня 1743–1744 гг. у студзені 1744 г. каля Крычава адбыўся бой паміж сялянамі і шляхецкім войскам. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Крычаўу Расійскай імперыі, мястэчка ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У студзені 1776 г. Кацярына II падаравала Крычаўскае староства (14 247 чал.) графу Р.А.Пацёмкіну. У 1779 г. у Крычаве 1594 жыхароў, 470 двароў. У канцы XVIII ст. ў Крычаве дзейнічалі Крычаўская суднаверф, Крычаўскія мануфактуры, а таксама вінакурны, цагельны, шкляны, гар- барны, медналіцейны заводы, млыны. У 1847 г. у Крычаве 630 двароў, 6 цэркваў, касцёл, малітоўная школа, праводзіліся 3 кірмашы на год. У 1897 г. мястэчка, цэнтр воласці, 6221 жыхар, 972 двары, 3 гарбарныя і мылаварны заводы, 4 крупадзёркі, 4 маслабойні,
2 народных вучылішчы, паштова-тэлеграфная кантора, хлебазапасны магазін, 125 крам,
7 цэркваў, касцёл, 5 сінагог, 5 заезных дамоў,
4 кірмашы на год. 3 мая 1919 г. у складзе Гомельскай губерні РСФСР, з 20.8.1924 г. у БССР, цэнтр Крычаўскага раёна Калінінскай, з чэрвеня 1927 г. Магілёўскай акруг, з лютага 1938 г. у Магілёўскай вобл. З 17.12.1931 г. – горад. З 17.7.1941 г. да 30.9.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія загубілі ў горадзе і раёне каля 24 тыс. чалавек. Дзейнічала Крычаўскае патрыятычнае падполле. У 1962 – 1965 гг. у Мсціслаўскім раёне. У 1972 г. – 26,5 тыс. жыхароў. У 2003 г. 28,5 тыс. жыхароў

Прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў («Крычаўцэментнашыфер», завод жалезабетонных вырабаў), Крычаўскі завод гумавых вырабаў, мэблевая фабрыка, мясакамбінат, маслазавод, хлебазавод і інш. Крычаўскі краязнаўчы музей. Брацкія магілы савецкіх воінаў, ваеннапалонных і ахвяр фашизму, курган Славы. Помнікі архітэктуры: Крычаўскі палац (1778–1787), паштовая станцыя (XIX ст.), Мікалаеўская царква (канец XIX – пачатак XX ст.). Збярогся звон, адліты ў 1748 г. для царквы Параскевы Пятніцы. Помнікі археалогіі: гарадзішчы Гарадзец (ранняга жалезнага веку, V– VII ст. і эпохі Кіеўскай Русі) і Замкавая гара (эпохі Кіеўскай Русі).

БАЦЬВІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСАВЕЦ, вёска, цэнтр калгаса «Перамога», за 29 км на паўночны захад ад Крычава, 75 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавецналініі Крычаў – Магілёў.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 46 двароў, 202 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. вёска і фальварак у складзе маёнтка Верхаўцы, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У1926 г. – 57 двароў 394 жыхары. У 1928 г. для школы, якая дзейнічала ў вёсцы, пабудавана новае памяшканне. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога», які з 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС, у 1932 г. аб’ядноўваў 47 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Непада-

лёку ад вёскі на участку чыіункі Верамейкі – Асавец партызаны 12.09.1943г. пусцілі пад адхон варожы эшалон, у выніку чаго быў разбіты паравоз, 17 вагонаў і платформаў з аўтамабілямі і іншай тэхнікай. На 1.1.2003 г. 85 двароў 225 жыхароў.

БАЕЎКА, вёска, за 22 км на паўночны захад ад Крычава, 82 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў – Магілёў. Праз вёску цячэ р. Мяртвіца (прыток р.Чорная Натапа).

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. як вёска ў складзе маёнтка Маляцічы Мсціслаўскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1737 г. дзейнічала царква. У 1772 г. сяло, 9 двароў, 36 жыхароў, у складзе Расіі, у Мсціслаўскім ваяводстве. У 1780 г. сяло (8 двароў, 116 жыхароў) і вёска (26 двароў, 194 жыхары) у Чэрыкаўскім павеце. У 1834 г. вёскі Баеўка-1 і Баеўка-2, 429 жыхароў. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1860 г. меў 238,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. сяло, у склад якога ўвайшла вёска, 109 двароў, 715 жыхароў, 1 аднайменны фальварак, 2 двары, 9 жыхароў, у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1905 г. пра- цавала казённая вінная лаўка. У 1912 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у вясковай працоўнай школе 1-й ступені, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было 85 вучняў. Школу наведвалі дзеці з вёсак Баеўка, Баранец, Асавец, пасёлкаў Езуфоўка, Высокае і навакольных хутароў. Меліся хата-чытальня, а затым Народны дом, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Працавалі кузня і млын. У 1926 г. 177 двароў 892 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгасы «Краі- на Саветаў», «Чырвоны Кастрычнік», меліся кузня і ваўначоска. У верасні 1943 г. фашисты спалілі 67 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана і з 1959 г. знаходзіцца ў складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 26 двароу 65 жыхароў.

БАЦЬВІНАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Звязда», за 18 км на захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 1 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

На паўднёвым захадзе ад вёскі, на левым і правым берагах р. Жукаўка, захаваліся 3 курганныя могільнікі, якія сведчаць аб заселенні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вядома 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 30-я гады XVIII ст. дзейнічала царква. У 1780 г. сяло ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Тут мелася 9955 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, смалакурна-шкіпінарны завод, 2 карчмы. У 1885г. 21 двор, 147 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. сяло, 39 двароў, 255 жыхароў карчма, царква, адзін раз у год – 9 мая – праводзіўся кірмаш. Фальварак Бацьвінаўка (ён жа Галынка), 1 двор, 10 жыхароў 1 хутар Бацьвінаўка, 10 двароў, 75 жыхароў. У 1906 г. адкрыта школа ў наёмным памяш- канні. У 1917 г. 67 двароў 400 жыхароў. 3 1212 га зямлі, якія былі ў вёсцы, 696 га належала 6 мясцовым багацеям, памешчыку і царкве.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. Жыхар вёскі Я.Я. Ісачкін быў выбраны старшынёй сельсавета. У грамадзянскай вайне ўдзельнічала больш за 20 вяскоўцаў 2 з іх загінулі. На 1925 г. у Бацьвінаўскім сельсавете 2 хаты-чытальні, 5 школ, 3 кузні. У 1925 г. у працоўнай школе 1-й ступені, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было 54 вучні. Дзейнічала школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, 1 хата-чытальня. У 1926 г. 113 двароў, 586 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгасы «Зара» і імя К.Я.Варашылава, якія ў 1932 г. аб'ядналіся ў адзін калгас «Маяк». Дзейнічала амбулаторыя. У 1936 г. пабудаваны сельмаг. У 1938 г. пачатковая школа ператворана ў сямігадовую. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы дзейнічала падпольная трупа, якую ўзначальваў Б.Я. Грыгор'еў. У 1946 г. сямігадовая школа ператворана ў сяроднюю.

З 1950 г. вёска – цэнтр калгаса імя Леніна. У1954 г. да яго далучана гаспадарка «Барацьбіт». «Звязда» – такая назва мясцовага калгаса зараз. На 1.1.2003 г. 125 двароў, 373 жыхары.

БРАНСК, вёска, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцьй Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў кал гас. У 1940 г. 27 двароў, 135 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравананямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 4 двары, 8 жыхароў.

ВАРОДЗЬКАЎ-1 , вёска, за 25 км на паўночы захад ад Крычава. 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Магілёў–Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1653 г. маёнтак Вародзькава Мсціслаў- скага ваяводства. У 1684 г. сяло, дзейнічаў млын на р. Воўчас. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1844 г. пабудавана драўляная царква. Па- мешчык меў тут у 1845 г. 212 дзесяцін зямлі. У 1846 г. 10 двароў, 71 жыхар, у складзе аднайменнага маёнтка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, дзяржаўная ўласнасць. У 1858 г. 17 двароў 85 жыхароў. У 1862 г. сяляне правялі масавую высечку памешчыцкага лесу. У1897 г. у сяле 6 двароў, 30 жыхароў у вёсцы Вародзькаў-1 31 двор, 190 жыхароў. Побач быў таксама фальварак Вародзькаў

У 1899 г. адкрыта школа, адно памяшканне для якой пабудавана ў 1899 г., другое – у 1910 г. У школеў 1902 г. навучаліся 74 хлопчыкі і 16 дзяўчынак. У 1926 г. 46 двароў, 246 жыхароў. У1930 г. арганізаваны калгас «На варце», мелася кузня. 26.07.1934 г. выязная рэдакцыя палітаддзельскай газеты Крычаўскай МТС і рэдакцыя калгаснай насценнай газеты выпусцілі друкарскім спосабам аб'яднаны нумар газеты, чым быў пакладзены пачатак першай у Беларусі калгаснай шматтыражнай газеце. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 20 двароў 43 жыхары.

ВАРОДЗЬКАЎ-2 , вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў– Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1858 г. 9 двароў, 32 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1926 г. 52 двары, 292 жыхары. У 1925 г. адкрыта школа. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Зорка». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 36 двароў. З 1962 г. у складзе калгаса «Перамога». Радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза, генерала арміі І.І. Гусакоўскага. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 45 жыхароў

ВАРОДЗЬКАЎ-3, вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Побач з вёскай, на правым беразе р.Воўчас, захаваўся старажытны могільнік, які сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XIX ст. Непадалёку быў маёнтак. У 1858 г. 2 двары, 16 жыхароў, уласнасць памешчыка. З 1882 г. дзейнічалі царква і касцёл, пабудаваны з дрэва. У 1926 г. 52 двары, 267 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвонаармеец». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 9 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1962 г. у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 19 двароў, 43 жыхары.

ВЯРХОЎЦЫ, вёска, за 32 км на паўночны захад ад Крычава, 72 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў. З 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. сяло (2 двары, 7 жыхароў) і фальварак (7 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, а ў 1876 г. паявіўся яшчэ адзін, гаспадар якога валодаў 543 дзесяцінамі зямлі. Дзейнічала царква (з 1882), пабудаваная з дрэва. Меліся пастаялы двор, царква і царкоўна-прыходская школа. Частка вяскоўцаў займалася бандарным рамяством. У вясковай школе, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было ў 1925 г. 49 вучняў. Па перапісу насельніцтва ў 1926 г. у вёсцы і навакольных хутарах 78 двароў, 397 жыхароў. У жніўні

1929 г. арганізаваны калгас «Бальшавік». У 1940 г. 35 двароў, 170 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разгромілі паліцэйскі ўчастак, які размяшчаўся ў вёсцы. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ВЯСЁЛЫ, пасёлак, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша–Клімавічы.

Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях, у 1931 г. арганізаваны калгас «Вясёлы шлях», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 17 гаспадарак. У 1940 г. 13 двароў, 52 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 7 двароў, 9 жыхароў.

ГОРКІ, вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

За 0,4 км на захад ад вёскі, за ровам, дзе цячэ ручай, захавалася гарадзішча XIV– XVI ст. Насупраць, на схілах левага берага р. Любавічка (прыток р. Воўчас) размешчана селішча XIV–XVII ст. Гэтыя археалагічныя помнікі сведчаць аб засяленні тутэйшых мясцін у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. 67 двароў, 477 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1921 г. створана працоўная школа 1-й ступені, у якой было 84 вучні. З 1920 г. пачала дзейнічаць школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. З 24.06.1960 г. далучана да Бацьвінаўскага сельсавета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шляхсацыялізму», працавала кузня. У 1940 г. 36 двароў, 161 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вызвалення адбудавана. З 1958 г. у калгасе «Радзіма», з 1960 г. у складзе калгаса імя Суворава. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 39 жыхароў.

ГУБЕНШЧЫНА, вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1749 г. сяло, 22 двары, у Мсціслаўскім ваяводстве. Мелася карчма. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у складзе Раей. Уваходзіла ў Чэрыкаўскаю акругу Магілёўскай губерні. У 1810 г. заснавана сукнавальня. У 1816 г. 60 двароў, 347 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. цэнтр маёнтка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога у 1860 г. меў у вёсках Губеншчына і Міляцін 648 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. У 1880 г. 67 двароў, 487 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім, сталярным, кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1897 г. сяло (99 двароў 723 жыхары), маёнтак (1 двор, 7 жыхароў) і сядзіба (1 двор, 7 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучаліся 53 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У студзені 1906 г. сяляне на сваім сходзе вырашылі працаваць у памешчыкаў з 1 лютага толькі пры ўмове больш справядлівай аплаты. У 1909 г. у сяле 117 двароў, 813 жыхароў, на сядзібе 1 двор, 7 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 7 жыхароў і на хутарах 4 двары, 20 жыхароў. Вёска была ў складзе Воўчаскага праваслаўнага прыходу. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 72 вучні, дзейнічала хата-чытальня, якая размяшчалася ў нацыяналізаваным будынку. У верасні 1923 г. арганізавана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства, у 1930 г. калгас імя І.В. Сталіна, мелася кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 35 двароў, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1950 г. у калгасе імя Калініна, які ў 1965 г. перайменаваны ў калгас імя А.В.Суворава.

Радзіма поўнага кавалера ордэна Славы У.Я. Карнеенкі. Вёсказнікла на 1.1.2003г.

ДАЛЕНШЧЫНА, вёска, за 35 км на паўночны захад ад Крычава, 69 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. вёска, 14 двароў, 76 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1816 г. уласнасць памешчыка. У 1848 г. у складзе маёнтка Беліца. У1897 г. 26 двароў, 110 жыхароў, у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. адкрыта земская школа, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. На базе дарэвалюцыйнай створана была працоўная школа 1 -й ступені, у якой у 1925 г. было 38 вучняў, а ў 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 52 двары, 249 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя С.М. Будзённага. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разграмілі створаны акупантамі ў вёсцы паліцэйскі ўчастак. Гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. З 16.07.1954 г. у Бацьвінаўскім сельсавеце, з 1962 г. у Мсціслаўскім, з 1965 г. зноў у Крычаўскім раёне. 31957 г. у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 26 двароў, 51 жыхар.

ДРУЖКІ, вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Заснавана ў 1920-х гг. на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1940 г. 18 двароў, 82 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 25 двароу, 48 жыхароў.

ЗАЙЦАВА СЛАБАДА, вёска, за 18 км на захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1834 г. 37 жыхароў, уласнасць памешчыка, у 1847 г. у складзе маёнтка Бацьвінаўка Чэрыкаўскага павета. Памешчык Цялушкін меў у 1849 г. у вёсках Зайцава Слабада (яна ж Галынка) і Дарлівае 100 дзесяцін зямлі. У 1897 г. вёска (18 двароў, 113 жыхароў) і 2 аднайменныя хутары (20 двароў, 136 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 38 двароў 227 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». З 1937 г. у вёсцы размяшчалася 2-я Крычаўская МТС (рэарганізавана 31.03.1958 г.). У 1938г. МТС мела 23 трактары і іншую тэхніку. У 1940 г. 33 двары, 143 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г.да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы разрабавалі маёмасць і ў верасні 1943 г. поўнас- цю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 16 двароў, 46 жыхароў.

КАНЦЫ, вёска, за 23 км на паўночны захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. Спачатку гэта быў пасёлак у Бацьвінаўскім сельсавеце. У 1930-х гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На могілках пахаваны 11 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць гітлераўцаў. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 27 двароў, 67 жыхароў.

КАСЦЮКОЎКА, вёска, за 30 км на захад ад Крычава, 72 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) – у Расіі. У 1780 г. 7 двароў, 65 жыхароў, у 1858 г. 10 двароў, 101 жыхар, уласнасць памешчыка. З 1928 г. дзейнічала маслабойня, у 1930 г. арганізаваны калгас «Новы шлях». У 1940 г. 37 двароў, 142 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня

1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЛУЧКІ, пасёлак, за 16 км на паўночны захад ад Крычава, 88 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У дарэвалюцыйных выданнях і архіўных дакументах населены пункт з такой назвай не сустракаецца. У 1940 г. 37 двароў, 177 жыхароў, У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 18 двароў 30 жыхароў.

МАЛІНАЎКА, вёска, за 23 км на паўночны захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 17 жыхароў.

МАСЦІЦКАЯ СЛАБАДА, вёска, за 17 км на паўночны захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. Сяло Слабада Чэрыкаўскай акругі Магілёўскай губерні. У 1835 г. в. Масціцкая Слабада перайшлаў валоданне памешчыка А.А. Маскевіча. У 1897 г. 21 двор, 158 жыхароў, Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 21 двор, 160 жыхароў. У 1926 г. 59 двароў, 217 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых і хата-чытальня. У 1931 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна (у 1932 г. аб'ядноўваў 39 гаспадарак), з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1964 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 15 двароў, 32 жыхары.

МІЛЯЦІН, вёска, за 27 км на захад ад Крычава, 77 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў-Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XIX ст. У 1838 г. вёска (14 рэвізскіх душ), уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1860 г. меў у вёсках Міляцін і Губеншчына 648 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. У 1926 г. дзейнічалі хата-чытальня і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К.Я. Варашылава. У 1940 г. 25 двароў, 117 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 2.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Зараз у складзе калгаса імя А.В.Суворава. На 1.1.2003 г. 2 двары, 4 жыхары.

ПАДУДАГА, пасёлак, за 23 км на захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У дарэвалюцыйных крыніцах звестак не выяўлена.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя А.В.Суворава. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

ПРУСІНА, вёска, за 17 км на паўночны захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай увайшлаў склад Раей. У 1779 г. сяло, 24 двары, 158 жыхароў, у Крычаўскім старостве Клімавіцкага павета, уласнасць памешчыка. У1781 г. цэнтр староства ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, дзяржаўная ўласнасць. Непадалёку быў маёнтак, гаспадару якога ў 1862 г. належала 596,5 дзесяціны зямлі. У 1876 г. з'явіўся яшчэ адзін маёнтак, гаспадар якога валодаў 231 дзесяцінай зямлі. Дзейнічала школа граматы (адкрытане пазней 1880г.). У 1897 г. вёска Прусін (53 двары, 363 жыхары), пастаялы двор (1 двор, 7 жыхароў), фальварак Прусін (ён жа Паўладар, 1 двор, 4 жыхары) і яшчэ адзін

фальварак Прусін (1 двор 10 жыхароў). У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучалася 69 хлопчыкаў і 6 дзяўчынак. У 1909 г. вёскі Прусін-1 (19 двароў 148 жыхароў) і Прусін-2 (33 двары, 260 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні.

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 40, у 1926 г. 56 вучняў з вёсак Прусіна, Масціцкая Слабада, пасёлка Лучкі і навакольных хутароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Бязбожнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 53 гаспадаркі, абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вызвалення адноўлены калгас, вёскі аб'ядналіся ў адну. З 1950 г. у калгасе імя Леніна, з 1954 г. у складзе калгаса імя Леніна, з 1964 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 18 двароў, 38 жыхароў.

РАТНАЯ, вёска, за 30 км на захад ад Крычава, 74 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў—Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніцах XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. 7 двароў, 40 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У1858 г. 7 двароў, 44 жыхары, уласнасць памешчыка.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1926 г. 23 двары, 125 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Камсамолец». У 1940 г. у вёсцы 31 двор, 169 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разгромілі нямецка-паліцэйскі ўчастак, які акупанты размясцілі ў вёсцы. Гітлераўцы спалілі 27 двароў. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 15 жыхароў.

РЭПІШЧА, вёска, за 16 км на захад ад Крычава, 88 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў сярэдзіне 1930-х гг. у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў. У 1940 г. 23 двары, 95 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1964 г. у складзе калгаса «Звязда».

СЕТНАЕ, вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 76 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вёска ў дарэвалюцыйных крыніцах з такой назвай не сустракаецца. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шлях сацыялізму». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 10 жыхароў.

СЫЧЫКІ, вёска, цэнтр калгаса А.В. Суворава, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У1930 г. арганізаваны калгас імя М.І. Калініна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. аку піравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы у верасні 1943 г. спалілі 38 двароў. З 1950 г. уваходзіла ў калгас імя Калініна, з 1965 г. – цэнтр калгаса імя Суворава.

Радзіма беларускага крытыка і літаратуразнаўцы Дз.Я. Бугаёва. На 1.1.2003 г. 120 двароў, 324 жыхары.

ЦІНЬКАВА, вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 1 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў– Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. З 1857 г. побач быў фальварак, 8 жыхароў, уласнасць памешчыка, і маёнтак, гаспадар якога ў 1836 г. меў 582 дзесяціны зямлі, млын і сукнавальню. У 1897 г. вёска Цінькаў (яна ж Янаўка) у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1926 г. 15 двароў, 79 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камуніст», дзейнічаў вадзяны млын (збудаваны ў 1908 г.). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана ня-

мецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у калгасе «Перамога». На 1.1.2003 г. 28 двароў, 48 жыхароў.

ЮРКАЎКА, вёска, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1762 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць, меўся млын. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1816 г. 19 двароў, 216 жыхароў, уласнасць памешчыка. Апрача земля - робства, вяскоўцы займаліся кавальскім, кравецкім і іншымі промысламі. У 1897 г. сяло (43 двары, 266 жыхароў) і выселак (1 двор, 7 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У снежні 1918 г. адкрыта школа, у якой у 1920-х гадах навучаліся дзеці з вёскі Юркаўка і пасёлкаў Фермы, Селішчы, Бранскі. У 1926 г. 64 двары, 345 жыхароў. У сакавіку 1930 г. арганізаваны калгас «Барацьбіт». З 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У 1932 г. калгас аб'ядноўваў 67 гаспадарак, мелася кузня. У 1940 г. 45 двароў, 265 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі 42 двары. Пасля вайны адбудавана. З 25.12.1962 г. у Мсціслаўскім, а з 6.01.1965 г. зноў у Крычаўскім раёне. З 1954 г. у калгасе імя Леніна, з 1963 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 19 двароў, 34 жыхары.

ЯНОЎ, вёска, за 36 км на захад ад Крычава, 68 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. сяльцо ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1857 г. 833 дзесяцінамі зямлі, меў вадзяны млын і сукнавальню. У 1858 г. 6 двароў, 36 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1897 г. побач з вёскай быў фальварак (1 двор, 8 жыхароў), увахо-дзіла ў Камаровіцкую воласць Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Мелася карчма. У 1909 г. вёска Янава Слабада (11 двароў, 72 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У вясковай працоўнай школе 1-й ступені ў 1926 г. было 23 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Ударнік». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1965 г. у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ВОЛЧАС, вёска, за 18 км на захад ад Крычава, 76 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

За 3 км на захад ад вёскі захавалася гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур, за 350 м на захад ад вёскі – селішча эпохі Кіеўскай Русі і сярэднявечча, за 250 м на поўнач ад вёскі – старажытны могільнік, што сведчыць аб засяленні тутэйшых месц у глыбокай старажытнасці. У пісьмовых крыніцах упершыню вёска ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1768 г. меўся маёнтак. У1782 г. цэнтр Стара-Воўчаскага староства, у Чэрыкаўскім павеце, меліся фальварак, царква, вінакурня, 2 карчмы. У 1780 г. 18 двароў, 131 жыхар.

Памешчык меў тут у 1875 г. 154, у 1879 г. –166 дзесяцін зямлі. У 1875 г. адкрыта школа, з 1882 г. дзейнічала пабудаваная з дрэва царква. У 1885 г. 22 двары, 132 жыхары, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. вёска Воўчас-1 (6 двароў, 32 жыхары) і сяло Воўчас-2 (49 двароў, 35 жыхароў, царква, царкоўнапрыходская школа), фальварк Воўчас (1 двор, 9 жыхароў) і маёнтак Воўчас (ён жа Сячыха, 1 двор, 14 жыхароў).

На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 97 вучняў. Дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна. У1940 г. 69 двароў 283 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 21–22 лютага 1942 г. каля вёскі партызаны атрада «Анатоля» вялі цяжкія баі супраць гітлераўскіх карнікаў. У ве-

расні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. З 1959 г. – цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 37 двароў 94 жыхары.

ГРУШАВА, пасёлак, за 7 км на паўночны захад ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Заснаваны у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. – 12 двароў 53 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 9 двароў загубілі 3 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. Цяпер у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 14 двароў 27 жыхароў.

ГУРКАВА НІВА, вёска, за 17 км на захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1897 г. выселак (8 двароў 66 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

ДАРАГАЯ, вёска, за 12 км на захад ад Крычава, 92 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. вёска (9 двароў 47 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У канцы 90-х гадоў XIX ст. частка вяскоўцаў перасялілася на жыхарства ў Амурскі край. У 1897 г. 28 двароў, 210 жыхароў у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Меўся пастаялы двор. У 1908 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1909 г. 29 двароў 164 жыхары. У 1923 г. на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якая размясцілася ў былым маёнтку Лушчэвінкі. У1925 г. у школе былі 33 вучні. У выніку перасялення часткі вяскоўцаў паблізу былі ўтворaны ў 1923 г. пасёлкі Доўгі Лог, Новая Дарагая, Ферма, Бранскі, Цэнтральны, Смолішча, большасць з якіх зараз не існуе. У1926 г. 61 двор, 315 жыхароў. У лютым 1931 г. арганізаваны калгас «Камунар», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 60 гаспадарак, працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 10 двароў, 45 жыхароў.

ДАРЛІВАЕ, вёска, за 9 км на паўночны захад ад Крычава, 95 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. З 1772 г. у складзе Раей. У 1777 г. Дарлівае ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 10 двароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1834 г. уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1849 г. у вёсках Дарлівае і Зайцава Слабада 100 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 33 двары, 208 жыхароў у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета.

15.10.1918 г. адкрыта школа, якая першапачаткова размясцілася ў наёмным, затым у нацыяналізаваным царкоўным будынку, а ў 1923 г. для школы пабудавана новае памяшканне. У 1925 г. у школе было 45 вучняў. У вёсцы дзейнічала хата-чытальня, меўся ветраны млын. У 1926 г. 57 двароў 257 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Свабода», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 47 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 10 двароў 45 жыхароў.

ДОУГІ ЛОГ, пасёлак, за 10 км на захад ад Крычава, 94 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Крычаў–Магілёў

Узнік у 1923 г. у выніку перасялення сюды часткі жыхароў з в. Дарагая. У 1926 г. 8 двароў 36 жыхароў. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 12 жыхароў.

ДУБОЎСКІ, пасёлак, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Утворaны ў 1920-х гадах на былых па-

мешчыцкіх землях. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У 1940 г. 13 двароў, 69 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 11 двароў. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

ЗАЛЕСАВІЧЫ, вёска, за 5 км на паўночны захад ад Крычава, 99 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVII ст. У 1604 г. у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. Увахо дзіла ў Чэрыкаўскую акругу Магілёўскай губерні. У 1780 г. сяло, 10 двароў, 55 жыхароў. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1859 г. 150 дзесяцін зямлі. З 1882 г. дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1883 г.). Дзейнічала царкоўнапрыходская школа. З 26.04.1919 г. у Чэрыкаўскім павеце Гомельскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Дарліўскім сельсавеце.

На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 32 вучні, дзейнічаў драматычны гурток і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 90 двароў, 425 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новае Сормава», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 42 гаспадаркі, працавалі кузня, сталярная і цяслярная майстэрні. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе імя Леніна (пазней «Памяць Леніна»), з 1967 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 72 двары, 191 жыхар.

КАЛІНІНА (да 1938 г. Задабрасць), вёска, за 5 км на поўдзень ад Крычава, 109 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы. У в. Задабрасць і Крычаве памешчык меў у 1878 г. 1588 дзесяцін зямлі, 3 вадзяныя млыны, піцейны дом і вінакурны завод. У 1897 г. побач з сялом быў фальварак (5 двароў, 29 жыхароў), у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічалі вінакурны завод і вадзяны млын. У 1909 г. сяло Нова-Сакольнічы (Бачкі), 35 двароў, 313 жыхароў і маёнтак Задабрасць (1 двор, 2 жыхары). У 1915 г. адкрыта земская школа. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 46 вучняў. Дзейнічала хата-чытальня. У 1926 г. 55 двароў, 328 жыхароў. У 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны шлях». Працавалі вінакурны завод і кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 29 двароў, 255 жыхароў.

КАМАРОЎКА, вёска, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. вёска (50 двароў, 379 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1897 г. 68 двароў, 463 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У лютым 1900 г. вяскоўцы правялі ў маёнтку Дзяржа самавольную высечку лесу. Меліся школа граматы, ветраны млын (пабудаваны ў 1904 г.), казённая вінная лаўка. У1911 г. адкрыта земская школа, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 62 вучні. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці дарослых. У 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1926 г. 125 двароў, 725 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгасы «Авангард» і «Новае жыццё», былі ветраны млын і кузня. Абслугоўвала калгасы Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі вёску. 22.02.1942 г. каля вёскі адбыўся бой паміж 7-ю партызанамі і гітлераўцамі. З 1981 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 62 жыхары.

КАСЦЮШКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 21.08.1925 г.) і калгаса «Памяць Леніна», за 9 км на захад ад Крычава, 95 км ад Магілёва, 14 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1560 г., як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная

ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у Расіі, сяльцо Касцюшкавічы. У 1827 г. мястэчка, 152 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1866 г. 170 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 46 двароў, 333 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася шавецкім рамяством. У 1908 г. адкрыта земская школа. У 1909 г. у вёсцы 46 двароў, 397 жыхароў, у ваколіцы 13 двароў 93 жыхары.

У 1919 г. створаны камітэт беднаты, які ўзначаліў вясковец А.Ф.Свадкоўскі. Працавала школа, для якой у 1924 г. пабудавана памяшканне. У 1925 г. займалася больш за 50 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці дарослых. У 1926 г. 86 двароў, 495 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна (старшыня А.Ф. Свадкоўскі). У 1932 г. калгас аб'ядноўваў 62 гаспадаркі. З сярэдзіны 1930-х гадоў дзейнічаў фельчарскі пункт, у 1937 г. пабудаваны магазін. У 1940 г. у вёсцы 78 двароў, 318 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 71 двор, загубілі 5 жыхароў. Вызвале- на 1.10.1943 г. Пасля вайны адбудавана. У 1962 г. калгас атрымаў назву «Памяць Леніна». У гонар першых трактарыстаў калгаса і 50-годдзя гаспадаркі ў 1981 г. у цэнтры вёскі на пастаменце пастаўлены трактар «Універсал». На 1.1.2003 г. 139 двароў, 411 жыхароў.

КЛІНОЎСКІ, пасёлак, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у канцы 1930-х гадоў у выніку перасялення сюды сялян з бліжэйшых хутароў. Уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У 1940 г. 32 двары, 56 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 11 двароў. Пасля вайны адбудаваны. Цяпер у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 32 двары, 99 жыхароў.

ЛУШЧЭВІНКА, вёска, за 15 км на захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.

Памешчык тут меў у 1861 г. 417 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 13 двароў, 84 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася бандарствам. У 1897 г. вёска (23 двары, 159 жыхароў) і фальварак (2 двары, 12 жыхароў), у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У пачатку XX ст. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучалася 56 хлопчыкаў і 13 дзяўчынак. У 1926 г. 68 двароў, 335 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя К. Маркса. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 66 двароў, 134 жыхары.

МАКАЎЕ, вёска, за 8 км ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. сяльцо (6 двароў, 12 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1897 г. 26 двароў, 174 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. З 1909 г. дзейнічала школа (народнае вучылішча). Пры Савецкай уладзе на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, дзейнічала бібліятэка. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Л.Б. Красіна, мелася кузня. У 1940 г. 58 двароў, 289 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 53 двары. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 8 двароў, 8 жыхароў.

МАЛЬКАЎКА, вёска, за 19 км на захад ад Крычава, 85 км ад Магілёва, 9 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. З 1772 г. у складзе Расіі. У Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1816 г. 8 двароў 9 жыхароў, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1879 г. меў 2260 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 16 двароў 127 жыхароў у Камаровіцкай воласці Чэрыкаў-

скага павета. Была адкрыта школа граматы. У1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пераможнік». Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1940 г. 19 двароў 57 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У розныя гады ўваходзілаў калгасы імя Леніна, «Савецкая Беларусь». З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

НОВІКІ (да 30.07.1964 г. Балванаўка), вёска, за 14 км на захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У1768 г. вёска Балванаўка і аднайменны маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 15 двароў, 91 жыхар. У 1834 г. вёска і фальварак, уласнасць памешчыка, які меў у 1846 г. 139 дзесяцін зямлі. У1897 г. 21 двор, 161 жыхар, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1919 г. з в. Лушчэвінка сюды пераведзена школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні, у 1925 г. было 24 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас. У 1940 г. 32 двары, 151 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 3 жыхароў На 1.1.2003 г. 11 двароў, 16 жыхароў.

ПАД'ЯЛЕЦКІ, пасёлак, за 13 км на паўночны захад ад Крычава, 91 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. Уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У 1940 г. 10 двароў 46 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні,1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

ПАКЛАДЫ, вёска, за 7 км на поўдзень ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі захавалася селішча жалезнага веку і часоў сярэднявечча, на паўднёва-усходняй ускраіне, уздоўж правага берага р.Сож, – старажытны могільнік (11 насыпаў), на паўночным усходзе – старажытны курган, што сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая уласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. сяльцо, 9 двароў 45 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.

У 1919 г. у былым маёнтку створана арцель «Брацкая праца». У 1926 г. 31 двор, 168 жыхароў. Дзейнічала працоўная школа 1-й ступені (37 вучняў) і дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К.Я. Варашылава. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Да вайны ў вёсцы жыла Т.М. Гіндзіна, першая ў раёне жанчына-трактарыстка, з 1937 г. брыгадзір трактарнай брыгады, затым старшыня Сакольніцкага сельсавета. У час Вялікай Айчынай вайны – дэсантніца. Загінула ў лістападзе 1942 г. ля в. Сакольнічы.

На паўднёва-заходняй ускраіне радовішча крэйды Забялышанскае поле (разведаныя запасы – 37,9 млн т.).

Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 51 двор, 128 жыхароў.

ПЕРШАКРЫЧАЎСКІ, пасёлак, за 6 км на поўдзень ад Крычава, 110 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

За 0,5 км на паўночны ўсход ад пасёлка захаваўся старажытны курганны могільнік (7 насыпаў), які сведчыць ад засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Сучасны пасёлак узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1926 г. 37 двароў 186 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя В.К. Блюхера. У Вялікую Айчынную

Вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 25 двароў, 63 жыхары.

ПРЫГАЎКА, вёска, за 6 км на паўднёвы захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1811 г. бдвароў 16 жыхароў мужчынскага полу, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 14 двароў 112 жыхароў у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета.

На пачатку 1920-х гадоў адкрыта працоўная школа 1-й ступені, дзе навучаліся дзеці з вёсак Прыгаўка, Свадкавічы і навакольных хутароў. У 1926 г. 49 двароў 185 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вясковец Г.Ю. Давыдзенка быў камісарам партызанскага атрада №8 імя М.Н. Селіваненкі брыгады імя А.Ф. Данукалава, якая дзейнічала ў Віцебскай вобласці. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 21 двор, 54 жыхары.

ПУШКАРЫ, пасёлак, за 6 км на захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

У 1940 г. 10 двароў, 53 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча».

САКОЛЬНІЧЫ, вёска, цэнтр калгаса «Запаветы Леніна», за 4 км на паўднёвы захад ад Крычава, 100 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Бытуе легенда, што ў час Паўночнай вайны (1700–1721) вызначыўся генерал Сакалоў якому за геройскія здзяйсненні была выдзелена зямля каля Крычава. Генерал падзяліў зямлю паміж 7 сестрамі, які сталі тут жыць. Так узнікла невялікае паселішча Сакольнічы. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. у складзе Расіі.

Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882). У 1897 г. ваколіца (96 двароў, 623 жыхары, вадзяны млын) і вёска Нова-Сакольнічы (33 двары, 227 жыхароў) у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1905 г. адкрыта царкоўнаприходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. Ураджэнец вёскі А.І. Попель удзельнічаў у штурме Зімняга палаца ў Петраградзе ў 1917 г. і стаў вядомы тым, што даставіў У.І. Леніну пакет аб узяцці Зімняга. Загінуў у 1918 г. пад Архангельскам.

У пачатку 1918 г. па ініцыятыве вясковага хлопца У.Ц. Кашуры створаны камітэт сялянскай моладзі. Крычаўскі валасны Савет выдзеліў членам камітэта дзесяціну зямлі, якую яны апрацоўвалі сумесна, а прыбытак ад гаспадаркі накіроўваўся на дапамогу Чырвонай арміі. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені. На пачатку 1925 г. у Сакольніцкім сельсавете працавалі 2 хаты-чытальні, 3 пачатковыя школы, кааператыўная лаўка, сельгасарцель, камуна, 3 вадзяныя млыны, кузня. Дзейнічала камсамольская ячэйка, якой кіраваў Я. Васілевіч (у 1930-х гадах працаваў начальнікам палітаддзела Крычаўскай МТС). У 1925 г. у вёсцы створаны першы ў раёне піянерскі атрад (22 піянеры), а ў школе ў гэты час было 26 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 132 двары, 684 жыхары. Ваколіца Сакольнічы была ліквідаванаў 1918 г. У 1931 г. арганізаваны калгас «Запаветы Ільіча» (у 1932 г. – 60 гаспадарак) і імя І.В. Сталіна (у 1932 г. – 50 гаспадарак), якія ў 1934 г. аб'ядналіся ў адзін калгас «Запаветы Ільіча». Працавалі 2 кузні. Дзейнічаў фельчарска-акушэрскі пункт. У Вялікую Айчынную вайну з сярэдзіны 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Каля вёскі 17.07.1941 г. вёў цяжкі бой супраць гітлераўскіх танкаў савецкі артылерыст, старшы сяржант М.У. Сірацінін. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля шашы Крычаў–Чэрыкаў у 1961 г. узведзены помнік адважнаму артылерысту. У 1942 г. партызаны разгромілі ўправу акупантаў і маслазавод, якія размяшчаліся ў вёсцы. У 1943 г. гітлераўцы

спалілі вёску. З 1954 г. у Касцюшкавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары; 3 жыхары.

САСНОЎСКІ, пасёлак, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1930-х гадах у выніку перасялення сюды сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. Зараз у складзе калгаса «Бель». На 1.1.2003 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

СВАДКАВІЧЫ, вёска, за 5 км на паўднёвы захад ад Крычава, 99 км ад Магілёва, 9 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVI ст. У 1560 г. сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1768 г. тут быў маёнтак, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. 13 двароў, 73 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1817 г. у фальварку, што быў побач з сялом, заснавана сукнавальня. З 1813 г. працаваў вінакурны завод. У 1875 г. гаспадар маёнтка меў 485 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. Дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. У 1897 г. 22 двары, 121 жыхар, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 36 двароў, 157 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.У 1930 г. арганізаваны калгас «Новы шлях», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 34 гаспадаркі, працавала кузня. У 1940 г. 38 двароў, 193 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 37 двароў загубілі 1 жыхара. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча».

Радзіма аднаго з кіраўнікоў рэвалюцыйнага народніцкага руху ў 70-х гадах XIX ст. С.П.Каваліка. На 1.1.2003 г. 34 двары, 77 жыхароў.

СЯЧЫХА, вёска, за 15 км на захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) увайшла ў Расію. У 1870 г. 23 двары, 107 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1847 г. 10 двароў, 43 жыхары, у складзе маёнтка Воўчасы, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1853 г. 108 дзесяцін зямлі. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. У 1897 г. сяло (30 двароў, 202 жыхары) і фальварак (2 двары, 10 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 34 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С.М.Будзённага. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 12 двароў, 21 жыхар.

ХАЦІЛАВІЧЫ, вёска, за 6 км на паўднёвы захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1663 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі, вёска ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. еяльцо (22 двары, 119 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце, належала Галынскім. У 1869 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1897 г. 59 двароў, 403 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Побач была аднайменная ваколіца (4 двары, 20 жыхароў). У 1909 г. у вёсцы 65 двароў 533 жыхары, у ваколіцы 4 двары, 43 жыхары, у Крычаўскім праваслаўным прыходзе. З 26.04.1919 г. у Чэрыкаўскім павеце Гомелькай губерні РСФСР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1924 г. вяскоўцы пабудавалі памяшканне (у 1926 г. 70 вучняў). Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. у вёсцы 98 двароў, 519 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Сталінскі заклік», працавала ваўначоска. У 1940 г. 87 двароў, 362 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі 73 двары, загубілі 3 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 67 двароў, 125 жыхароў.

ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

АНАНІЧЫ, вёска, за 13 км на поўнач ад Крычава, 127 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) увайшла ў склад Расіі. У 1780 г. 31 двор, 285 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце. У 1848 г. у складзе дзяржаўнага маёнтка Кашаны. У 1875 г. сяляне зрабілі самавольную высечку лесу, а ў верасні 1879 г. самавольна выкарысталі ў сваіх мэтах нарыхтаваны памешчыцкі лес. У 1909 г. 60 двароў, 355 жыхароў, 630 дзесяцін зямлі. У 1910 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1926 г. 94 двары, 171 жыхар. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 75 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. З пачатку 1930-х гадоў арганізаваны калгас «Пралетарскі араты». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ураджэнка вёскі Ф. Калбеева былаўдзельніцай Мінскага камуністычнага падполля. З 1962 г. вёска ў складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 11 жыхароў.

БАЯРЫ, вёска, за 18 км на поўнач ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1. На поўнач ад вёскі цячэ р. Чорная Натапа (прыток р.Сож). За 1 км на поўдзень знаходзіцца найвышэйшы пункт раёна (193 м).

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1872 г. у вёсках Баяры і Адбыткі 116 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 9 двароў 64 жыхары, кузня і аднайменная ваколіца.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На валасным сходзе 18.06.1919 г. вяскоўцы заявілі аб сваёй гатоўнасці па Першаму закліку рабоча-сялянскай улады выступіць на абарону савецкай рэспублікі. У 1926 г. 31 двор, 189 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя В.М. Молатава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 30 сялянскіх гаспадарак, працавала кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г.акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у складзе калгаса імя К. Маркса.Ла 1.1.2003 г. 6 двароў 7 жыхароў.

БЕЛЬ (да 1976 г. Бель-1), вёска, цэнтр калгаса імя XXII з'езда КПСС, за 9 км на поўнач ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

З 1772 г., пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, у складзе Расіі. У 1780 г. сяло Бель (62 двары, 344 жыхары), сяльцо Бель (25 двароў, 135 жыхароў) і вёска Бель (10 двароў, 122 жыхары), у ведамстве казённай палаты. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1874 г. валодаў 1150 дзесяцінамі зямлі, меў вадзяны млын, карчму, вінакурны завод. З 1882 г. дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. У 1884 г. у в. Бель-1 адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1897 г. 113 двароў, 819 жыхароў. У 1908 г. адкрыта школа ў в.Бель-3, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. У тым жа годзе была адкрыта школа і ў в.Бель-2. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1909 г. вёскі Бель-1 (130 двароў, 834 жыхары), Бель-2 (70 двароў 775 жыхароў), Бель-3 (39 двароў 355 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Царкоўны будынак быў перададзены для школы у в. Бель-1, у якой у 1925 г. быў 101 вучань. Дзейнічалі школы і ў вёсках Бель-2, Бель-3, а таксама пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У першай палове 1920-х гадоў у выніку перасялення часткі вяскоўцаў былі паблізу ўтвораны пасёлкі Зара, Горскі, Галсееўскі, Залескі, Гарадок, хутары Зарэчны, Лісічка, якія зараз не існуюць. У 1925 г. створана закупачна-збытавое таварыства. У 1926 г. у в. Бель-1 211 двароў, 1282 жыхары, у в. Бель-2 98 двароў, 598 жыхароў, у в.Бель-3 72 двары, 410 жыхароў. У1929 г. арганізаваны калгас «Шлях да сацыялізму» (у 1932 г. аб'ядноўваў 40 гаспадарак) і імя І.В. Сталіна (у 1932–34 гаспадаркі), якія з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 31.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На вясковых могілках пахаваны ўраджэнец вёскі, лётчык А.В. Гуменнікаў які 13.07.1941 г. загінуў у паветраным баі над роднай вёскай. З 16.07.1954 г. у Лабковіцкім сельсавеце. У 1976 вёскі

Бель-2, Бель-3 далучаны да в. Лабковічы.

Радзіма актыўных удзельнікаў свеабаргскага паўстання балтыйскіх маракоў у 1906 г. М.Бабровіча, А.Стэльмахава і В. Гуменькава, беларускага вучонага, Героя Сацыялістычнай Працы М.А. Цытовіча. На 1.1.2003 г. 155 двароў, 408 жыхароў.

БЕРАЖЫСТАЕ, вёска, за 10 км на поўнач ад Крычава, 94 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. З 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. 8 двароў, 68 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У першай палове 1920-х гадоў у выніку перасялення часткі вяскоўцаў паблізу ўтварыліся пасёлкі Варанёва, Старана, Іванава, Зусьчына, хутары Юзэфава і Леніна, якія зараз не існуюць. У 1926 г. 51 двор, 288 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Малады ударнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 21 гаспадарку. У Вялікую Айчыннуювайнузліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Камінтэрн», з 1959 г. – імя Сталіна. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 33 двары, 61 жыхар.

БУНЬКАЎШЧЫНА, пасёлак, за 20 км на поўнач ад Крычава, 124 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Узнік у 1923 г. у выніку перасялення на былыя памешчыцкія землі часткі сялян з в.Старасселле. У 1926 г. Бунькаўшчына-1 (16 двароў, 81 жыхар) і Бунькаўшчына-2 (8 двароў, 31 жыхар) у канцы 1930-х гадоў аб'ядналіся. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя К. Маркса. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 37 жыхароў.

ГАРБАТКА, вёска, за 8 км на поўнач ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Раей, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1858 г. 30 двароў, 220 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1874 г. памешчык меў у в. Гарбатка і Бель 150 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, карчму і вінакурны завод, заснаваны ў 1862 г. У1880 г. 35 двароў, 210 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1897 г. вёска (43 двары, 297 жыхароў) і аднайменны фальварак (7 двароў, 54 жыхары, вінакурны завод) у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічала аднакласная школа. У1926 г. 76 двароў, 396 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «XII з'езд Саветаў». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік». Зараз у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 28 двароў 49 жыхароў.

ГЛУШНЁВА, вёска, за 9 км на поўнач ад Крычава, 113 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Маёнтак Глушнёва ў Мсціслаўскім ваяводстве Крычаўскай дзяржавы ўпамінаецца ў судовых актах 1601 г.. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Раей. У 1780 г. сяльцо, 9 двароў, 55 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1912 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якая размясцілася ў маёнтку Языпава, у былым памешчыцкім доме і ў 1925 г. налічвала 40 вучняў. У 1926 г. 61 двор, 318 жыхароў. У1930 г. арганізаваны калгас імя Кірава. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 60 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік», з 1981 г. – «Сацыялістычны шлях». На Г 1.2003 г. 44 двары, 94 жыхары.

ДУБРАЎКА, пасёлак, за 16 км на поўнач ад Крычава, 120 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядомы па пісьмовых крыніцах з XIX ст. Гаспадар маёнтка, які быў тут, валодаў у 1851 г. 352 дзесяцінамі зямлі. У 1897 г. вёскі Дуброўка-1 (2 двары, 13 жыхароў), Дуброўка-2 (3 двары, 18 жыхароў) і ваколіца (2 двары, 11 жыхароў). У 1909 г. засценак Дуб-

роўка-1 (5 двароў, 43 жыхары) і засценак Дуброўка-2 (4 двары, 61 жыхар) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Уваходзілі ў Кашанскі праваслаўны прыход. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

ЗАЛЕССЕ, вёска, за 13 км на поўнач ад Крычава, 177 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

У 1923 г. у выніку перасялення на былыя памешчыцкія землі жыхароў з в. Бель-1 былі ўтвораны пасёлкі Залескі-1 і Залескі-2. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С.М. Будзённага, які з 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У канцы 1930-х гадоў пасёлкі аб'яднаны ў в. Залессе. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 23 жыхары.

ЗУІ, вёска, за 8 км на поўнач ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1604 г. сяло Зуі Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1747 г. 8 двароў, меліся карчма, млын, дзяржаўная ўласнасць, у Крычаўскім старостве. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) ў складзе Расіі. У 1779 г. 15 двароў, 67 жыхароў. У 1926 г. 37 двароў, 205 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны араты». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фапіысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік». З 1981 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 87 двароў, 208 жыхароў.

ІВАНАЎКА (да 1919 г. Свіная), вёска, цэнтр калгаса «Сацыялістычны шлях», за 8 км на поўнач ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1604 г. як вёска Свіная Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. З 1667 г. у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У выніку ваенных дзеянняў вайны 1654 –1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай была спустошана. У 1709 г. з меўшыхся ў вёсцы 3 валок зямлі апрацоўвалося толькі 1/3 частка. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1909 г. 29 двароў 268 жыхароў і ваколіца (52 двары, 544 жыхары). Побач быў маёнтак Прысмыцкага, якому належала большая частка вясковай зямлі. Меліся школа і карчма.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1918 г. на ўшанаванне памяці ўраджэнца вёскі – данецкага шахцёра Івана Лазаравіча Паршукоўскага, які ў 1907 г.за рэвалюцыйную дзейнасць у Кацярынаславе быў расстраляны, вёску назвалі Іванаўкай. На будынку клуба ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць аб рэвалюцыянеру-земляку. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 180 вучняў. Дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 125 двароў 725 жыхароў. У 1931 г. быў арганізаваны калгас «Чырвоны араты», працавалі 2 кузні.

У снежні 1953 г. вёскі Іванаўка, Гарбатка, Зуі, Глушнёва, Варанёва (не існуе) увайшлі ў калгас «Ленінскі заклік». На 1.1.2003 г. 175 двароў, 438 жыхароў.

КАШАНЫ, вёска, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1. На поўнач ад вёскі цячэ р. Чорная Натапа (прыток р.Сож).

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1777 г. вёска ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. сяло (52 двары, 308 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1804 г. адбылося хваляванне еялян. У 1854 г. пабудавана царква. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882 г.). У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1902 г. навучалася 100 хлопчыкаў. У 1909 г. 75 двароў, 529 жыхароў 754 дзесяціны зямлі, у Кашанскім сельскім таварыстве ў Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. На валасным сходзе 18.06.1919 г. вяскоўцы заявілі аб гатоўнасці па першаму закліку рабоча-сялянскай улады выступіць на абарону савецкай рэс-

публікі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені,у якой у 1925 г. быў 61 вучань з вёсак Кашаны, Баяры, пасёлкаў Зялёная Дубрава, Зялёны Гай, Падбаяры, Паддуб'е, Зялёны Дуб, Дубраўка і навакольных хутароў. Дзейнічала бібліятэка. У 1926 г. 124 двары, 660 жыхароў. У тым жа годзе створана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства. У 1930 г. арганізаваны калгас «Іскра», працавалі кузня і ваўначоска, дзейнічаў фельчарска-акушэрскі пункт. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя К.Маркса. На 1.1.2003 г. 24 двары, 64 жыхары.

ЛАБКОВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 16.07.1954) і калгаса імя К. Маркса, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілё- ва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XV ст. Князь Юрый Мсціслаўскі падараваў у першай палове XV ст. «бабровыя гоні ад Малатамлі да Лабкоўскага рубяжу» Андрыеўскаму манастыру. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1701 г. у Мсціслаўскім ваяводстве. У XVII–XVIII ст. сяло ў Крычаўскім старостве. У Паўночную вайну разрабавана і спустоша- на шведамі. У 1709 г. з наяўных 20 надзелаў зямлі апрацоўваліся толькі тры. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1779 г. 32 двары, 242 жыхары, у Крычаўскім старостве. З 1810 г. да адмены прыгоннага права (1861) ваеннае (аракчэеўскае) пасяленне, а вяскоўцы – ваенныя пасяленцы, з якіх камплектаваліся вайсковыя часці. У 1880 г. 50 двароў 329 жыхароў. Апрача земляробства, жыхары займаліся кравецкай справай. Мелася кузня. У 1902 г. пабудаваны будынак і пачала дзейнічаць царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. 85 двароў 774 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1923 г. у выніку перасялення часткі жыхароў гэтай вёскі былі паблізу ўтвораны пасёлкі Клевер, Прагрэс, Нікалаеўка, Слабада, якія зараз не існуюць. У вясковай школе ў 1926 г. было 72 вучні, а ў вёсцы – 57 двароў, 730 жыхароў. У1931 г. арганізаваны калгасы імя М.С.Будзённага, «Ударнік» і «Парыжская камуна», якія ў 1934 г. аб'ядналіся ў адну гаспадарку «17-ы партз'езд». З 1930 г. у вёсцы працаваў вапнавы завод імя В.М. Молатава (5 рабочых). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў 1943 г. амаль поўнасцю спалілі вёску. Вызвалена 30.09.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. На ўшанаванне памяці 384 жыхароў вёсак сельсавета, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе, у 1982 г. у цэнтры вёскі пастаўлены абеліск з імёнамі загінуўшых.

Радзіма дзяржаўнага дзеяча БССР К.В. Кісялёва і аднаго з актыўных кіраўнікоў камсамола Беларусі ў гады Вялікай Айчынай вайны, рэдактара падпольных газет «Звязда» і «Чырвоная змена», журналіста М.П. Барашкава. На 1.1.2003 г. 295 двароў, 695 жыхароў.

ЛІПАЎКА, пасёлак, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1930-х гадах у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіў у Кашанскі сельсавет Крычаўскага раёна. Пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

НІЗКІ, вёска, за 12 км на паўночны захад ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 1 двор, 8 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Памешчык меў у 1876 г. у вёснах Нізкі і Міхалін 2000 дзесяцін зямлі. З 1897 г. фальварак, 7 двароў, 65 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1909 г. пасёлак (20 двароў, 112 жыхароў) і маёнтак (34 жыхары), 400 дзесяцін зямлі, належаў У.У.Васілеўскаму, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічала 4-класная школа. У 1926 г. 43 двары, 281 жыхар. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камінтэрн», працавалі кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару і маслазавод. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да

1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 24 двары, 57 жыхароў.

ПАДАСІНКІ, пасёлак, за 8 км на паўночны захад ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гадах вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1981 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 43 жыхары.

ПАЛАНІЦА, вёска, за 12 км на паўночны захад ад Крычава, 92 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Па пісьмовых крыніцах вядомаз 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, валоданне шляхціча. Мелася царква. У 1586 г. сяло Мсціслаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1678 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 38 двароў 228 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1816 г. 35 двароў, 204 жыхары. У 1882 г. пабудавана з дрэва царква. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882). У 1898 г. пачала працаваць царкоўнапрыходская школа, памяшканне для якой пабудавана ў тым жа годзе. У 1909 г. 60 двароў 356 жыхароў, 430 дзесяцін зямлі, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені імя У.І. Леніна, у якой у 1925 г. было 65, а ў 1926 г. 96 вучняў з вёсак Паланіца, Брадок і навакольных хутароў. З 1925 г. дзейнічалі хата-чытальня і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У вёсках Паланіцкага сельсавета працавалі 3 пачатковыя школы (акрамя Паланіцкай), 3 ветраныя млыны, кааператыўная лаўка. У 1926 г. 92 двары, 511 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны май», працавала кузня. Абслугоўвала калгас Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Камінтэрн». З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 14 жыхароў.

ПЕСЬКАВІЧЫ, вёска, за 11 км на поўнач ад Крычава, 93 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1604 г. як сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1747 г. 2 двары, у Крычаўскім старостве. У 1780 г. сяльцо, 10 двароў, 55 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Мясцовы памешчык меў тут у 1841 г. 120 дзесяцін зямлі. У 1926 г. 18 двароў, 105 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы стварылі калгас. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Лабковіцкім сельсавеце. З 1950 г. у калгасе імя Сталіна, зараз у складзе гаспадаркі імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 30 жыхароў.

ПАЎЛАВІЧЫ, вёска, за 10 км на поўнач ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. З 1811 г. у Чэрыкаўскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. З 1880 г. непадалёку ад вёскі былі 2 невял ікія маёнткі. У 1897 г. 24 двары, 195 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 39 вучняў. У 1926 г. 41 двор, 223 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны прамень», які з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 24 жыхары.

СТАБОРШЧЫНА, вёска, за 24 км на поўнач ад Крычава, 128 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р.Чорная Натапа захаваўся старажытны могільнік, за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі – старажытны курган, якія сведчаць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. Непадалёку з 1850 г. быў маёнтак. У 1897 г. вёска (4 двары, 25

жыхароў) і ваколіца (7 двароў, 45 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Уваходзіла ў Кашанскі праваслаўны прыход. У 1926 г. 18 двароў, 109 жыхароў, у 1930 г. арганізаваны калгас «Праца». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя К.Маркса. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

СТАРАСЕЛЛЕ, вёска, за 22 км на поўнач ад Крычава, 126 км ад Магілёва, 17 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1708 г. 40 двароў, 287 жыхароў, належала казённай палаце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1897 г. у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1926 г. адкрыта школа (41 вучань). У 1931 г. арганізаваны калгасы «Камінтэрн» і імя К. Маркса, якія ў хуткім часе аб'ядналіся ў адну гаспадарку – імя К. Маркса, мелася кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Цяпер у складзе калгаса імя К. Маркса. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 29 жыхароў.

МАЛЯЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БРОДАК, вёска, за 18 км на паўночны захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 12 двароў, 145 жыхароў. У1897 г. 42 двары, 279 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 68 двароў, 342 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Звязда», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 54 гаспадаркі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 39 жыхароў.

ВУЗКАЯ, вёска, за 20 км на паўночны захад ад Крычава, 84 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша – Клімавічы.

Заснавана ў 1920-х гадах перасяленцамі з суседніх вёсак. У 1930-х гадах вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1940 г. 55 двароў, 241 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы ў верасні 1943 г. спалілі 51 двор. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 34 двары, 51 жыхар.

ЕРМАКОЎКА, вёска, за 18 км на паўночны захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст., у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 20 двароў, 88 жыхароў. У 1834 г. 140 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 31 двор, 159 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. 39 двароў, 274 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні.

У 1919 г. адкрыта працоўная школа 2-й ступені, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у школе было 30 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. У 1926 г. 65 двароў, 275 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ленінскія дні», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 46 гаспадарак, абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У ноч з 25 на 26 жніўня 1942 г. партызаны атрада «Алеся» непадалёку ад вёскі ўзарвалі варожы эталон. Быў знішчаны паравоз і 13 вагонаў, 350 гітлераўцаў. Вызвалена 30.09.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. Зараз у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». Радзіма Героя Савецкага Саюза А.Я. Смалякова. На 1.1.2003 г. 51 двор, 126 жыхароў.

ЛУТЫ, вёска, цэнтр калгаса «Вялікі Кастрычнік», за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 129 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша—Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай

(1772) у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1890 г. 8 двароў, 78 жыхароў. У1834 г. 111 жыхароў уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1877 г. валодаў 100 дзесяцінамі зямлі, меў карчму. У 1897 г. 21 двор, 143 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1918 г. у былым маёнтку створана камуна «Рассвет». У 1919 г. адкрыта школа (у 1926 – 52 вучні), а ў 1925 для яе пабудавана памяшканне. У 1926 г. 49 двароў 228 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Вялікі Кастрычнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 26 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

МАЛЯЦІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924) і калгаса «Запаветы Леніна», за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 129 км ад Магілёва, 16 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1643 г. як сяло Малецічы, уласнасць памешчыка, меўся касцёл. У 1639 г. 13 двароў, 28 жыхароў дзяржаўная ўласнасць. У 1684 г. цэнтр маёнтка і воласці, у пачатку XVIII ст. мястэчка ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У Паўночную вайну ў канцы жніўня 1708 г. непадалёку ад вёскі, на р.Чорная Натапа, расійская армія пад камандаваннем М.М. Галіцына разграміла авангард шведскай арміі. Шведы страцілі 3 тыс. забітымі, 3 тыс. параненымі. Гэта была першая перамога рускіх войск над шведамі, а праз месяц шведскія войскі былі разгромлены пад Лясной. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) цэнтр воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Належала архіепіскапу, потым мітрапаліту Станіславу Сестранцэвічу-Богушу, затым удаве генерал-маёра Багушэўскага. Упамінаецца як мястэчка ў статыстычным апісанні губерні ў 1784 г. У 1780 г. 40 двароў, 255 жыхароў. У 1797 г. дзейнічаў дамініканскі кляштар, у валоданні якога было сяло Людагошч. У 1811 г. мястэчка, уласнасць касцёла. Прыкметным архітэктурным збудаваннем таго часу быў пабудаваны з цэглы на сродкі ўладальніка мястэчка Сестранцэвіча касцёл, які ўяўляў сабой копію вядомага сабора Св. Пятра ў Рыме, паменшаную ў 32 разы. У 1835 г. гэты касцёл пераўтвораны ў праваслаўную царкву. У Айчынную Вайну 1812 г. мястэчка часткова спалена. У 1848 г. 32 двары, валоданне каталіцкага архіепіскапа. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, у якім у 1858 г. 29 двароў 92 жыхары. Памешчык меў у 1859 г. 1334 дзесяціны зямлі, вадзяны млын, піцейны дом. У 1863 г. у мястэчку налічвалася 213 жыхароў. У 1879 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1889 г. навучалася 55 хлопчыкаў і дзве дзяўчынкі. У 1880 г. у мястэчку 62 двары, 327 жыхароў (155 мужчынскага, 172 жаночага полу), у тым ліку 188 праваслаўных, меліся вадзяны млын, сукнавальня, лячэбніца (адкрыта не пазней 1880 г.), 10 лавак, мураваная царква, малітоўная школа. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. у мястэчку 61 двор, 386 жыхароў, паштовая станцыя, хлебазапасны магазін, 34 лаўкі, у сяле 39 двароў, 270 жыхароў, у фальварку 3 двары, 33 жыхары, вадзяны млын. Штогод 29 чэрвеня, у дзень Св. Пятра і Паўла, у мястэчку праводзіўся кірмаш. У час першай расійскай рэвалюцыі адбываліся ў 1905 г. сутычкі сялян з паліцыяй.

У 1918 г. створаны партыйная ячэйка і камбед. На базе дарэвалюцыйнай адкрылася ў сяле працоўная школа 2-й ступені, у мястэчку – працоўная школа 1-й ступені. Панская зямля была падзелена паміж сялянамі, дом мясцовага памешчыка Палонскага быў аддадзены пад Народны дом, а затым – пад школу. У ліпені 1918 г. адкрыты дзіцячы сад і 4 дзіцячыя пляцоўкі. У 1921 г. адкрыта хата-чытальня. 21.02.1921 г. створана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства, а 2.11.1923 г. – кааператыўнае таварыства. У 1923 г. у мястэчку і сяле 844 жыхары. У 1924 г. адкрыта бальніца. У 1925 г. пачалі дзейнічаць аддзяленне сувязі і ветэрынарны пункт, у сямігадовай школе навучаліся дзеці з вёсак Маляцічы, Шчарбачы, Шаеўка, Сарочына, Славуты, пасёлкаў Швецкая Горка, Цалавальнік і навакольных хутароў, а таксама лясніцтва. У 1926 г. у сяле 78 двароў, 379 жыхароў, у мястэчку 84 двары, 320 жыхароў. У1928 г. адкрыты школьны інтэрнат. У пачатку 1930-х гадоў арганізаваны калгасы «Новае жыццё» (у 1932 г. аб'ядноўваў 32 гаспадаркі) і «Чырвоны араты» (у

1932 г. аб'ядноўваў 31 гаспадарку). У 1935 г. працавалі конная крупарушка (заснавана ў 1923 г.), 3 кузні, 2 ваўначоскі, шавецкая арцель. У 1936 г. пабудаваны сельмаг. У 1940 г. 97 двароў, 502 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1942 г. гітлераўцы загубілі 75 жыхароў а ў верасні 1943 г. спалілі вёску, знішчылі 210 жыхароў. Вызвалена 1.10.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. Пасля вайны адбудавана. На 1.1.2003 г. 176 двароў, 402 жыхары.

МІРНАЯ (да 30.07.1964 г. Глупікі-1 і Глупікі-2), вёска, за 20 км на паўночны захад ад Крычава, 84 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) адыйшла да Расіі. У 1758 г. маёнтак і вёска Глупікі ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У 1780 г. сяльцо Глупікі (17 двароў 77 жыхароў) і сяльцо Глупікі Каменскіх (21 двор, 120 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1834 г. 184 жыхары, уласнасць памешчыка, непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1850 г. 176 дзесяцін зямлі, аў 1872 г. 160 дзесяціну вёсках Глупікі і Ануфрыева. Дзейнічаў хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882 г.). У 1897 г. вёскі Глупікі-1 (45 двароў, 289 жыхароў) і Глупікі-2 (28 двароў, 161 жыхар) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Меліся 4 ветраныя млыны. У 1909 г. у в. Глупікі-1 50 двароў, 241 жыхар, а ў в. Глупікі-2 30 двароў 184 жыхары. У фальварку Глупікі 1 двор, 8 жыхароў. У 1909 г. адкрыта школа (народнае вучылішча).

Пасля ўстанаўлення Савецкай ўлады на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, якая атрымала нацыяналізаваны будынак (у 1925 г. 64 вучні). У 1926 г. у в.Глупікі-1 58 двароў, 334 жыхары, в. Глупікі-2 58 двароў, 331 жыхар. У 1931 г. арганізаваны калгасы «Чырвоная Горка» (у 1932 г. 13 гаспадарак) і «Чырвоны Барацьбіт» (у 1932 г. 52 гаспадаркі). Працаваў заснаваны ў 1923 г. паравы млын. Абслугоўвала калгасы Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вайны ў калгасе імя Кірава, з 1959 г. у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». На 1.1.2003 г. 87 двароў, 216 жыхароў.

МЫШКАВІЧЫ, вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 16 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. вёска і маёнтак Мышкавічы ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. у вёсцы Вялікія Мышкавічы 20 двароў, 92 жыхары, належала архіепіскапу, потым мітрапаліту С. Сестранцэвічу-Богушу, у пачатку XIX ст. – памешчыку С.Р. Мацкевічу, затым яго жонцы. Памешчык меў у 1881 г. 208 дзесяцін зямлі. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. вёскі Вялікія Мышкавічы (28 двароў, 176 жыхароў), Малыя Мышкавічы (3 двары, 32 жыхары) і ваколіца Мышкавічы (3 двары, 17 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Была створана працоўная школа 1-й ступені (у 1921 г. 48 вучняў). Вёскі Мышкавічы Вялікія і Мышкавічы Малыя ў першай палове 1920-х гадоў зліліся ў адну вёску. У школе навучаліся дзеці з вёсак Мышкавічы і Антонаўка. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. у вёсцы – 51 двор, 276 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 25 двароў 35 жыхароў.

ПЛЕШЧЫНА, вёска, за 17 км на поўнач ад Крычава, 121 км ад Магілёва, 12 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. як вёска ў складзе маёнтка Маляцічы, у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 14 двароў, 81 жыхар, належала С. Сестранцэвічу-Богушу. У 1834 г. 68 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1858 г. 12 двароў, 71 жы-

хар, уласнасць памешчыка. Дзейнічаў вадзяны млын. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. 20 двароў, 143 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1918 г. адкрыта школа, у якой у 1925 г. было 47 вучняў з вёскі Плешчына і пасёлкаў Селішча, Ліпаўка, Малееўка, Ракаўка. У 1926 г. 38 двароў, 205 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны лётчык». У 1940 г. 50 двароў, 249 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 43 двары, загубілі 6 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. Да 1962 г. у складзе калгаса «Іскра». З 1962 г. у калгасе «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 9 двароў, 12 чалавек.

САРОЧЫНА, вёска, за 26 км на паўночны захад ад Крычава, 78 км ад Магілёва, 18 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. сяло Сарочын, уласнасць памешчыка. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) увайшла ў склад Расіі. У 1816 г. 8 двароў, 20 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце, у 1847 г. у складзе маёнтка Слабут Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Гаспадар маёнтка меўу 1850 г. у вёсках Сарочына і Слабуты 200 дзесяцін зямлі. У 1897 г. сяло (27 двароў, 212 жыхароў) і хутар (1 двор, 14 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1927 г. пабудавана памяшканне. У 1926 г. 45 двароў, 238 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Савецкая Беларусь», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 16 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна».

СЛАБУТЫ, вёска, за 27 км на паўночны захад ад Крычава, 77 км ад Магілёва, 20 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., фальварак, меўся млын. У 1780 г. сяльцо, 14 двароў, 138 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. З 1772 г. у складзе Раей. У 1847 г. цэнтр маёнтка Слабут у Чэрыкаўскім павеце, гаспадар якога меў у 1850 г. 200, а ў 1858 г. – 274 дзесяцін зямлі. У студзені 1931 г. арганізаваны калгас імя І.В. Сталіна, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 29 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ДЗЯГАВІЧЫ, вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст., сяло ў Крычаўскім старостве Мсціслаўскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1779 г. 48 двароў, 257 жыхароў, у Крычаўскім старостве Клімавіцкага павета, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1830 г. урозных месцах 9341,5 дзесяцін зямлі, меў 2 вадзяныя млыны. У 1850 г. 68 двароў, 179 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1885 г. 82 двары, 530 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Побач быў аднайменны фальварак (1 двор, 11 жыхароў). У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. 128 двароў, 843 жыхары, у фальварку 2 двары, 9 жыхароў, 1689 дзесяцін зямлі. Уласнасць І.С. Галынскага. Мелася карчма. У 1912 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у вясковай школе было 63 вучні: дзеці з вёсак Дзягавічы, Нанаскаў, бліжэйшых хутароў. У 1926 г. 208 двароў, 1335 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы арганізавалі калгас «Май», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 64 гаспадаркі. Працавалі ветраны млын (з 1922 г.), рымарная майстэрня, кузня. У 1939 г. з бліжэйшых хутароў у вёску было сселена 132 двары. У Вялікую

Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы А.І. Манінай. На 1.1.2003 г. 102 двары, 475 жыхароў.

ЗАРУБЕЦ, вёска, за 19 км на паўночны ўсход ад Крычава, 123 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1880-х гадах вядомы маёнтак, 6 мясцовых памешчыкаў мелі тут у 1878 г. 872 дзесяціны зямлі. У 1897 г. латышскае пасяленне Зарубец (яно ж Навіна) налічвала 17 двароў 115 жыхароў, уваходзіла ў Хатовіжскую воласць Клімавіцкага павета. Побач быў фальварак Зарубец (1 двор, 19 жыхароў, ветраны млын). У 1914 г. яшчэ 36 сем'яў з Магілёўскай і Чарнігаўскай губерняў у пошуках лепшага жыцця аселі ў тутэйшых мясцінах.

У 1921 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавалі памяшканне, а ў 1925 г. было 48 вучняў. Першым старшынёй сельсавета быў У. Маталыгін. У першай палове 1920-х гадоў адкрыты магазін, хата-чытальня. У 1926 г. 66 двароў, 415 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгасы «Новае жыццё» і «Чырвонае Сормава» (у 1923 г. аб'ядноўваў 42 гаспадаркі). З 1931 г. калгасы абслугоўвала Крычаўская МТС. Пазней калгасы аб'ядналіся ў адзін з назвай «Чырвонае Сормава». Была амбулаторыя. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.2003 г. 70 двароў, 143 жыхары.

КАЛЕКТЫЎНЫ ТРУД, вёска, за 18 км на ўсход ад Крычава, 177 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. У 1926 г. калектыўная гаспадарка, 18 двароў, 132 жыхары. У 1930-я гады каля вёскі працавала торфапрадпрыемства (у 1940 г. 189 рабочых), якое забяспечвала палівам Крычаўскі цэментны завод. У 1940 г. 20 двароў, 200 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 4 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». У 1948 г. абсталяваны радыёвузел, вёска была радыёфікавана, а крыху пазней электрыфікавана. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 8 жыхароў.

КАМЕНКА, вёска, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XIX ст. У 1816 г. вёска (22 двары, 178 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 32 двары, 240 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Меліся 2 ветраныя млыны. У 1914 г. адкрыта школа граматы. На базе дарэвалюцыйнай была адкрыта працоўная школа 1-й ступень У 1926 г. 75 двароў, 371 жыхар. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Сцяг», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 78 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце. З 1957 г. у складзе саўгаса «Крычаўскі».

Недалёка ад вёскі знаходзіцца радовішча крэйды і мергелю (разведаныя запасы 46 млн т), якое распрацоўваецца Крычаўскім цэментна-шыферным камбінатам. На 1.1.2003 г. 22 двары, 32 жыхары.

КАРАНЕЦ, вёска, за 11 км на ўсход ад Крычава, 115 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1897 г. 70 двароў 376 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1901 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1909 г. 136 двароў, 992 жыхары. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 65 вучняў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. 17.09.1922 г. створана саматужна-прамысловая арцель «Пралетарый», 11.06.1923 г. арганізавана закупачна-збытавое таварыства, а 24.11.1924 г. – сельгаставарыства, якое забяспечвала сялян насеннем траў, вяло на-

рыхтоўку сельскагаспадарчых прадуктаў, абслугоўвала 2 вёскі, 15 пасёлкаў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны партызан», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 64 гаспадаркі. Мелася кузня, працаваў торфазавод «Калектыўная праца». У 1940 г. 100 двароў, 500 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудавалася. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 22 двары, 33 жыхары.

КРАСНАПОЛЛЕ, пасёлак, за 12 км на ўсход ад Крычава, 116 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Заснаваны у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 34 жыхары.

ЛІЦВІНАВА, вёска, за 8 км на паўночны ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Узнікла ў 1930-х гадах у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіла ў Міхеевіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 30 двароў, 47 жыхароў.

МІХЕЕВІЧЫ, вёска і чыгуначная станцыя на лініі Орша – Клімавічы, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1586 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. Выхадцы з вёскі былі ў XVII ст. вядомымі майстрамі пушкарскай справы. У 1779 г. 36 двароў 240 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. Недалёка быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1830 г. 9341,5 дзесяціны зямлі, меў 2 вадзяныя млыны. У 1834 г. 58 двароў, 249 жыхароў. У 1857 г. заснавана суконнавальня. У 1880 г. 62 двары, 341 жыхар. Частка вяскоўцаў займалася калёсным рамяством. У 1897 г. 81 двор, 506 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета. Меліся вадзяны млын, школа граматы, піцейны дом, у аднайменным фальварку, што быў побач, 10 двароў, 115 жыхароў. У 1904 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. На базе дарэвалюцыйнай школы адкрыта школа I-й ступені, у якой у 1926 г. было 56 вучняў. У 1926 г. 110 двароў 686 жыхароў. У 1927 г. для школы пабудавана новае памяшканне. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Колас», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 62 гаспадаркі. У час калектывізацыі кулакі загубілі камсамолку Д. Пасканную. З сярэдзіны 1930-х гадоў працавала хлебапякарня, дзейнічаў фельчарскі пункт. У 1940 г. 120 двароў 310 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 85 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана.

Недалёка ад вёскі знаходзіцца радовішча цэментнай крэйды (разведаныя запасы 85,6 млн т). На 1.1.2003 г. 93 двары, 191 жыхар.

НАНАСКАВА, вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У1811 г. 3 двары, 18 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1850 г. 5 двароў, 26 жыхароў. У 1897 г. 12 двароў, 81 жыхар, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні.

У пачатку 1920-х гадоў адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 24 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 24 двары, 127 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Асцёр», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 10 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1959 г. у Чырванабудскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

ПРАХОРАЎКА, вёска, за 9 км на паўночны ўсход ад Крычава, 113 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1747 г. 11 двароў, дзяржаўная ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1779 г. 19 двароў, 130 жыхароў уласнасць памешчыка. Частка вяскоўцаў займалася калёсным і кавальскім рамёствамі. У 1897 г. 35 двароў, 256 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні.

1.1.1925 г. адкрыта чатырохгадовая школа, у якой было 45 вучняў, а ў 1927 г. для школы пабудавана памяшканне, мелася бібліятэка. На пачатку 1925 г. у вёсках Прахораўскага сельсавета працавалі 5 школ, 4 кааператыўныя лаўкі, вадзяны і 3 ветраныя млыны, 3 кузні і прыватная лаўка. У 1926 г. 67 двароў, 409 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ударнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 32 гаспадаркі.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

За 2,2 км на паўднёвы захад ад вёскі знаходзіцца радовішча пясчана-жвіравога матэрыялу (разведаныя запасы 503 тыс. м^3). На 1.1.2003 г. 26 двароў, 52 жыхары.

ПРУДОК, вёска, за 4 км на ўсход ад Крычава, 108 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1816 г. 13 двароў, 77 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1873 г. заснавана сукнавальня. У 1897 г. 9 двароў, 54 жыхары,у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Меліся вадзяны млын і сукнавальня. У 1930 г. арганізаваны калгас «Ударнік», які з 1933 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За 0,9 км на паўночны захад ад вёскі гітлераўцы загубілі звыш 1200 савецкіх грамадзян – вязняў Крычаўскага лагера смерці, партызан і дзяцей-заложнікаў (каля 100 чалавек). У ліку ахвяр удзельнікі Крычаўскага падполля: вядомы спявак А.І. Акаёмаў і галоўны хормайстар Маскоўскай філармоніі Г.П. Лузенін. Зараз вёска ў складзе калгаса «Крычаўскі». За 0,8 км на паўночны ўсход ад вёскі знаходзіцца радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу (разведаныя запасы 276 тыс.м^3). На 1.1.2003 г. 24 двары, 57 жыхароў.

СЯРЭБРАНЫ РУЧАЙ (да 1937 г. Круты Роў), пасёлак, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 1 двор, 4 жыхары.

ЧЫРВОНЫ БОР, пасёлак, за 10 км на ўсход ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1924 г. адкрыта 4-гадовая школа, у якой у 1925 г. было 35 вучняў. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 1 жыхар.

ЧЫРВОНАЯ БУДА (да 1935 Жыдава Вуда), вёска, цэнтр сельсавета з 16.07.1954 і саўгаса «Крычаўскі», за 10 км на ўсход ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў—Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. як сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, мелася карчма. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1816 г. 24 двары, 92 жыхары, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. Недалёка быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1874 г. у вёсках Жыдава Буда і Сярэбраны Ручай 300 дзесяцін зямлі, млын. Тут дзейнічалі дзягцярна-бяроставае прадпрыемства і лаўка. У 1883 г. 32 двары, 159 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета. У 1897 г. 26 двароў 189 жыхароў. У 1904 г. заснаваны вінакурны завод. Побач быў фальварак (1 двор, 25 жыхароў). У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, якой быў пера- дадзены памешчыцкі дом (у 1926 – 45 вучняў). У 1926 г. 54 двары, 332 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Буда», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 36 гаспадарак. У 1940 г. 38 двароў, 250 жыхароў. У Вя-

лікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы ў верасні 1943 г. спалілі 31 двор, загубілі 7 жыхароў. У час акупацыі дзейнічала камсамольская антыфашысцкая трупа пад кіраўніцтвам А. Крупадзёрава. У цэнтры вёскі, каля шашы Крычаў – Рослаў у 1979 г. пастаўлена стэла ў памяць аб юных падпольнчыках трупы, якія ў 1943 г. загінулі ад рук фашыстаў. 3 1950 г. у калгасе «Чырвоны партызан», з 1957 г. у саўгасе «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 325 двароў, 707 жыхароў.

ЧЫРВОНЫ САД, пасёлак, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Заснаваны у 1920-х гадах перасяленцамі з суседніх вёсак. 3 20.08.1924 г. у Міхеевіцкім сельсавете Крычаўскага раёна. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 13 жыхароў.

ЯГОРАЎКА, вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

За 4 км на ўсход ад вёскі, на нізкім забалочаным поплаве левага берага р. Асцёр захавалася гарадзішча ранняга жалезнага веку і позняга сярэднявечча, за 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі – старажытны могільнік (7 насыпаў), што сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1880 г. вёска Слабодка-Ягораўка, 12 двароў, 84 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася ганчарным рамяством. У 1897 г. 19 двароў, 111 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1926 г. 22 двары, 133 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Бор», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 17 гаспадарак. У 1940 г. 25 двароў, 100 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 4 жыхароў. Пасля вызвалення адбудавана. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 7 жыхароў

Падрыхтаваў да друку
У.У.Бянько.

Аб старадаўнім Крычаве

Нядаўна ў выдавецтве «Беларуская навука» выйшла кніга А.А. Мяцельскага «Старадаўні Крычаў» (гісторыка-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст.). Гэта работа – важкі ўклад даследчыка ў беларускую гістарыяграфію. Вельмі карысна, што аўтар прысвяціў сваю кнігу аднаму з «малых» гарадоў сярэднявечча – Крычаву. Кожны, хто пазнаёміцца з выданнем, адкрые для сябе шмат цікавага. Каштоўнасць манаграфіі ў тым, што аўтар упершыню ўводзіць у навуковы абарот разнастайныя крыніцы па гісторыі такіх невялікіх гарадскіх цэнтраў, як Крычаў. А такія працы, безумоўна, дапамагаюць нам даведацца аб сапраўднай гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

У выданні 5 раздзелаў. Пачынаецца з археалагічных помнікаў Крычава. А.А. Мяцельскі коратка абагульняе даследаванні вучоных у нашым краі, паведамляе, дзе, у якіх крыніцах можна знайсці інфармацыю аб горадзе.

У 1987–1988, 1995–2000 гг. раскопкі археалагічных помнікаў Крычава вёў аўтар. Аб гэтых даследаваннях ідзе гаворка ў выданні.

Комплекснае вывучэнне пісьмовых крыніц, рэтраспектыўны аналіз плана Крычава 1778 г. з далучэннем

археалагічных дадзеных дазваляе ў агульных рысах прасачыць развіццё планіровачнай структуры горада на працягу XII–XVIII ст. Падрабязна расказваецца аб матэрыяльнай культуры, палітычнай гісторыі, аб тэрыторыі, адміністратыўна-гаспадарчым падзеле воласці Крычава з XII ст. да XVIII ст. Вельмі карысна, як заўважае аўтар у заключэнні, што «наша праца не завяршае, а толькі падводзіць вынікі пэўнага этапу ў шматгадовым вывучэнні Крычава. Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы хаваюць яшчэ шмат таямніц, якія, спадзяемся, дазволяць болын грунтоўна паказаць гісторыю гэтага горада.

Г.А. Кірпічова.

ЗМЕСТ

Да чытача.....17
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна.....19

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ –1917

Сляды далёкага мінулага.....21
Археалагічныя помнікі Крычаўшчыны.....40
Адкуль пайшла назва горада Крычаў.....43
Героі Грунвальдскай бітвы.....45

У складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.....
Крычаў – горад з правам магдэбургскім.....59
Супраць шведскіх заваёўнікаў.....79
Прыгнёт і бяспраўе сялян.....80
Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гг.....82
Дакументы сведчаць.....93
Крычаўскія дзяржаўцы.....

У складзе Расійскай Імперыі
Дакументы сведчаць.....101
Крычаўская суднаферф.....101
Дакументы сведчаць. Вуліцы Крычава.....103
Славутыя землякі.....106
Іх шлях пралёг.....107
А.К. Меер аб Крычаўшчыне.....109
Вачыма расійскіх падарожнікаў.....110
Ваенныя пасяленні ў Беларусі.....111
Дакументы сведчаць.....113

У паслярэформенны час
Дакументы сведчаць.....121
Шлях да ведаў.....125
Ахова здароўя.....127
Дакументы сведчаць.....127
Рэвалюцыйныя падзеі на Крычаўшчыне.....131
Змагаўся на барыкадах.....132
Юныя крычаўцы.....133
Дакументы сведчаць.....135

Змест

1917–1941

На крутым павароце гісторыі

Камбеды на вёсцы 145
У фонд Чырвонай арміі 146
Партызанскі полк 146
Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны 150
Загартаваны ў баях 154
Клятва ў Маляцічах 155
Першыя камсамольцы 157
Яны змагаліся за ўладу Саветаў 158
Дакументы сведчаць 160
Вёска ў надзвычайных умовах 168
Насуперак цяжкасцям 174
Газеты Крычаўшчыны 175
Дакументы сведчаць 176
Аб чым пісала раённая газета «Сацыялістычны шлях» 179
Удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве ў 1940 г. 188
Крычаў перадваенны 190
Браты Грыгор'евы 191
Вернутыя імёны 192

1941–1945

Ішла вайна народная

На мяжы жыцця і смерці 217
Абаранялі Крычаўшчыну 220
Бой у небе над роднай вёскай 229
Свая зямля ратавала, давала сілы 230
У баях здабывалі славу 239
Не шкадуючы жыцця 244
Не колькасцю, а ўменнем 248
На берагах ракі Сож 250
Дакументы сведчаць 255
Акупацыйны рэжым 256
Дакументы сведчаць 260
У мяшку з калючага дроту 261
Дакументы сведчаць 263
Дзяўчынаў лагеры смерці 264
Паўсюль падсцерагала бяда 267
Дакументы сведчаць 269
Звесткі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў ў г. Крычаў 272
Акт Крычаўскай гарадской камісіі па расследаванні злачынстваў 272
Фронт у тыле ворага 276
З успамінаў былога сакратара Крычаўскага падпольнага
райкома партыі К.А. Рэуцкага 286

З успамінаў В.М. Пільнікава, члена Крычаўскага падполля 287
З успамінаў В.С. Талкачовай (Сенчыла), удзельніцы Крычаўскага падполля 289
З успамінаў В.І. Дварачэнкі, члена Бацьвінаўскай падпольнай групы 290
З успамінаў П.В. Недасека, жонкі І.П. Брыкава 291
З успамінаў С.К. Дудзіна, члена Крычаўскага падполля 293
З успамінаў І.С. Віцюгова, брата А.С. Віцюгова 294
Бясстрашная падпольшчыца 296
Мы не забудзем цябе, Марыя! 298
Аня Калабашнікава 299
Няскораныя 301
З пачуццём выкананага абавязку 309
Дакументы сведчаць. Партызанскія фарміраванні,
якія дзейнічалі на тэрыторыі Крычаўскага раёна 313
Са справаздачы камандавання 48-га партызанскага атрада 319
З даведкі аб партызанскім атрадзе «Анатолія Таіра» 323
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада «Чапай» 326
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада «Алеся» 327
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада № 3 328
Таццяна Гіндзіна 328
Мужнасць журналіста 330
Пад варожымі бомбамі 331
Адважны падводнік 332
«Лячыў» самалёты 333
ВЫЗВАЛЕННЕ 334
З успамінаўЛ. Анціпенкі, жыхара вёскі Цінькавa 335
Ордэн за дапамогу 336
Назаўсёды ў памяці 337
Сцяг над горадам 338
Не ведаў страху 341
Выжыў салдат 342
Мацярынскі пацалунак 343
Пільнасць разведчыка 344
Дакументы сведчаць 344
Іх пазнаёміла вайна 355
У нашай памяці навечна 356
Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Крычаўшчыны 357
Поўны кавалер ордэна Славы 359
Мужнасць кулямётчыка 360
Дарогі салдацкія 365
Аб чым пісала раённая газета «Шлях сацыялізму» 366
Камісар дывізіі 366
Штурман бамбардыроўшчыка 368
Лісты з фронту 370
Франтавыя шляхі камандзіра-танкіста 370

Змест

Адплата……371
Подзвіг сувязіста……372
Не спалохаліся смерці……373
След вайны……373
Змагаўся ў французскім супраціўленні……374
Герой Аджымушкая……376
Пад бамбёжкай, у пяпельным агні……377
Наш зямляк штурмаваў рэйхстаг……379
Не ўсе раны зажываюць……381
Апошні бой……382
Яны прайшлі дарогамі вайны……383

Ахвяры вайны
Воіны Чырвонай арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў іпахаваны на яго тэрыторыі……466
Партызаны і падпольшчыкі, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі……472
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941–1945 гг……473

1945 – ДА НАШЫХ ДЗЁН

Год за годам, падзея за падзеяй……545
За газетным радком……563
Прадпрыемствы Крычаўшчыны……581
З гісторыі школ……587
Вызначыліся працай……590
Героі Сацыялістычнай Працы……590
Яны ўзнагароджаны……598
Заслужаныя работнікі Рэспублікі. Беларусь……611
Яны нарадзіліся на Крычаўшчыне……616
Ганаровыя грамадзяне……634
Загінулі ў Афганістане……641

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ……643
З гісторыі населеных пунктаў……677

Раённая камісія па стварэнні Хронікі выказвае шчырую ўдзячнасць грамадскасці раёна, якая прымала ўдзел у зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі, а таксама кіраўніку арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Б.В. Ульянку за выяўленне дадатковых архіўных дакументаў, літаратурных крыніц і дапамогу ў складанні Хронікі «Памяць. Крычаўскі раён».

Каляровыя здымкі В. Бысава і І. Косціна, а таксама здымкі з фондаў рэдакцыі раённай газеты, з раённага краязнаўчага музея, грамадскіх і асабістых архіваў.

Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Крычаўскага раёна. – Маладзечна: П 15 УП «Друкарня «Перамога», 2004. 711 с.: іл.
ISBN 985-6541-42-5

У кнізе асвятляецца гісторыя Крычаўшчыны ад старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра цікавыя падзеі, што адбываліся тут, пра знакамітых людзей, якія былі звязаны лёсам з гэтым кутком беларускай зямлі. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы партызан, падполыпчыкаў, воінаў Чырвонай арміі, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору, землякоў, якія прайшлі франтавымі дарогамі. Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, што сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій. Асобны раздзел прысвечаны матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, гісторыі населеных пунктаў.

УДК 94.7.6 ББК
633 (4 Беи)